МОСКОВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
имени М. В. Ломоносова
ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

МОСКОВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
имени М. В. Ломоносова
ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

[105]

# ТРУДЫ ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА МГУ

## СЕРИЯ II
## ИСТОРИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ
## (58)

Р е д а к ц и о н н ы й   с о в е т:
академик РАН, д.и.н., проф. С.П. Карпов (со-председатель);
д.иск., проф. И.И. Тучков (со-председатель);
член-корреспондент РАО, д.и.н., проф. Л.С. Белоусов; д.и.н. проф. Н.С. Борисов;
член-корреспондент РАН, д.и.н., проф. Л.И. Бородкин; д.и.н., проф. А.Г. Голиков;
д.и.н., проф. С.В. Девятов; д.и.н., гл.н.с. Л.В. Кошман; д.и.н. А.Р. Канторович;
академик РАН, д.и.н., проф. Ю.С. Кукушкин;
д.и.н., проф. Л.С. Леонова; к.и.н. Н.В. Литвина;
д.фил.н., проф. О.В. Раевская; д.и.н., проф. Г.Ф. Матвеев;
д.и.н., проф. С.В. Мироненко; д.и.н., член-корреспондент РАН, проф. Е.И. Пивовар;
д.и.н. А.В. Подосинов; к.и.н., доц. Ю.Н. Рогулев;
д.и.н. С.Ю. Сапрыкин; д.и.н., проф. В.В. Симонов;
д.иск., проф. В.В. Седов; к.и.н. О.В. Солопова;
к.и.н. А.А. Талызина; д.и.н. проф. Д.А. Функ

МОСКВА
2017

МОСКОВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
имени М. В. Ломоносова
ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

ЛАБОРАТОРИЯ ИСТОРИИ ДИАСПОР ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА
МГУ ИМЕНИ М.В. ЛОМОНОСОВА

РЕГИОНАЛЬНАЯ ОБЩЕСТВЕННАЯ ОРГАНИЗАЦИЯ
«НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНАЯ АВТОНОМИЯ «БЕЛОРУСЫ МОСКВЫ»»

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ИМЕНИ Ф. СКАРИНЫ»

ЖИТКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# История диаспор и миграций.

## Бюллетень Лаборатории истории диаспор исторического факультета МГУ имени М.В. Ломоносова

**№4(7) август 2017 года**

«С ЛЮБОВЬЮ К РОДНОЙ ЗЕМЛЕ…»

Том I
«Пад песні задуменныя Палесся...». Народная духоўная культура
Жыткаўшчыны

в рамках Межнационального проекта «Вера и верность»

работа по сбору материала и подготовке научного сборника велась по заказу
Житковичского районного исполнительного комитета

ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ МОСКОВСКОГО УНИВЕРСИТЕТА
2017

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт
імя М.В. Ламаносава
гістарычны факультэт

Лабараторыя гісторыі дыяспар гістарычнага факультэта
МГУ імя М.В. Ламаносава

Рэгіянальная Грамадская Арганізацыя
«Нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Масквы»

Установа Адукцыі «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны»

Жыткавіцкі раённы выканаўчы камітэт

# Гісторыя дыяспар і міграцый.

## Бюллетень Лабараторыі гісторыі дыяспар гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава

**№4(7) жнівень 2017 года**

«З любоўю да роднай зямлі…»

Том I
«Пад песні задуменныя Палесся...». Народная духоўная культура Жыткаўшчыны

в межах Міжнацыянальнага праекту «Вера и вернасць»

работа по зборы матэрыялу і падрыхтоўцы навуковага зборніку праводзілася па замове Жыткавіцкага раённага выканаўчага камітэта

Гістарычны факультэт Маскоўскага Універсітэта
2017

УДК 822 (476) - 93
ББК 63.3 (4 Беи) +63.3 (2) 622

*Печатается по решению Ученого совета исторического факультета МГУ имени М. В. Ломоносова от 06.09.2017 г. (протокол №5)*

Рецензенты:
Г.И. Касперович – ведущий научный сотрудник отдела народоведения ГНО "Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси", доктор исторических наук;
А.В. Морозов – заведующий кафедры межкультурных коммуникаций ОО "Белорусский государственный университет культуры и искусств", доктор филологических наук, профессор.

Ответственные редакторы:
*В.С. Новак; О.В. Солопова, А.А. Кострица; В.К. Шинкаренко*

Технический редактор:
А.В. Козополянская, Е.Б. Роева

Авторский коллетив:
д.фил.н., проф. *В.С. Новак*; д.фил.н., доц. *В.К. Шинкаренко*, председатель Гомельского областного отделения ОО "Союз писателей Беларуси" *В.М. Гаврилович*, к.фил.н., доц. *А.А. Кострица*, к.фил.н., доц. *С.А. Вяргеенко*, к.фил.н., доц. *Н.А. Богомольникова*, к.фил.н., доц. *А.М. Полуян*, к.филн., доц. *А.М. Воинова*, к.фил.н., доц. *В.А. Бобрик, Н.М. Панкова, И.В. Глушэц, Л.Г. Мельникова, Т.М. Дубяк, Т.В. Крученко*, к.и.н., доц. *О.В. Солопова* и др.

**История диаспор и миграций. Бюллетень Лаборатории истории диаспор исторического факультета МГУ имени М.В. Ломоносова №4(7) август 2017 года. Сборник "С любовью к родной земле…" Том I. "Пад песні задуменныя Палесся..." : народная духоўная культура Жыткаўшчыны / отв. ред. В.С. Новак, О.В. Солопова, А.А. Кострица, В.К. Шинкаренко. – М., Исторический факультет Моск. Ун-та, 2017. – 710 стр. – (Труды исторического факультета МГУ, вып. 105. Сер. II, Исторические исследования 58).**

В книге собраны фольклорно-этнографические и мифологические материалы, записанные в ходе полевых экспедиций на территории Житковичского района с сохранением особенностей местной речи, охарактеризованы локально-региональные особенности существования фольклорно-этнографических и мифологических традиций, а также представлены отдельные литературно-публицистические материалы и охарактеризованы языковые особенности этой местности.
В сборнике использованы фотографии из архива отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Житковичского районного исполнительного комитета, редакции газеты "Новае Палессе".

© Исторический факультет МГУ, 2017
© УО «Гомельский государственный университет им. Ф. Скарины», 2017

УДК 822 (476) - 93
ББК 63.3 (4 Беи) +63.3 (2) 622

*Друкуецца па вырашэнни Вучонага савета гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава ад 06.09.2017 г. (протокол №5)*

Рэцэнзенты:
*Каспяровіч Галіна Іванаўна* – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”, доктар гістарычных навук
*Марозаў Аляксандр Уладзіміравіч* – загадчык кафедры міжкультурных камунікацый УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар філалагічных навук, прафесар.

Адказныя рэдактары:
*В.С. Новак; О.В. Солопова, А.А. Кастрыца; В.К. Шынкарэнка*

Тэхнічныя рэдактары:
А.В. Казапалянская, Е.Б. Роева

Аўтарскі калектыў:
д-р. філал.навук, проф. *В.С. Новак*; д-р.філал. навук, дац. *В.К. Шынкарэнка*, старшыня Гомельскага абласнога адзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі” *У.М. Гаўрыловіч,* канд.філал.навук, дац. *А.А.Кастрыца*, канд.філал.навук, дац. *С.А. Вяргеенка*, канд.філал.навук, дац. *Н.А Багамольнікава,* канд.філал.навук, дац. *А.М. Палуян*, канд.філал.навук, дац *А.М. Воінава*, канд.філал.навук, дац. *У.А. Бобрык, Н.М. Панкова, І.В,. Глушэц Л.Г. Мельнікава, Т.М. Дубяк, Т.В. Кручэнка,* канд. гістар. навук, дац. *А.В. Солапава* і інш.

**Гісторыя дыяспар і міграцый. Бюлетень Лабараторыі гісторыі дыяспар гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава №4(7) жнівень 2017 года. “З любоўю да роднай зямлі…” Том I. “Пад песні задуменныя Палесся...” : народная духоўная культура Жыткаўшчыны / адк. рэд. В.С. Новак, А.В. Солапава, А.А. Кастрыца, В.К. Шынкарэнка. – М., Гістарычны факультэт Моск. Ун-та, 2017. – XXX стр. – (Працы гістарычнага факультэт МДУ, вып. 105. Сер. II, Гістарычныя даследванні 58).**

У кнізе змешчаны фальклорна-этнаграфічныя і міфалагічныя матэрыялы, запісаныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі, ахарактарызаваны лакальна-рэгіянальныя асаблівасці бытавання фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных традыцый, а таксама прадстаўлены асобныя літаратурна-публіцыстычныя матэрыялы і ахарактарызаваны моўныя з’явы гэтай мясцовасці.
Выкарыстаны фотаздымкі з архіва аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жыткавіцкага раённага выканаўчага камітэта, рэдакцыі газеты “Новае Палессе”.

©Гістарычны факультэт МДУ, 2017
© УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны», 2017

# НАША БАГАЦЦЕ – ЛЮДЗІ…

Жыватворнай духоўнай крыніцай для народа з'яўляецца яго спадчына: мова, культура, гісторыя, фальклор.

Жыткавіцкая зямля –гэта глыбінка Палесся, дзе захавал1іся некранутыя пласты традыцыйнай беларускай культуры. Але яна яшчэ мае і ўласную этнічную ўнікальнасць.

Наш рэгіён адметны сваімі мясцовымі традыцыямі і фальклорам, цікавымі абрадамі. Мы маем добра захаваную аснову самабытнай культуры – абрадавую традыцыю, у першую чаргу, каляндарную, з многімі гадавымі святамі. Да нашага часу ўраёне бытуюць земляробчыя абрады. Багата разнастайнымі звычаямі і сямейная абраднасць.

Унікальнасць нашага раёна яшчэ і ў тым, што на яго тэрыторыі існуюць два мікрарэгіёны: левабярэжжа і правабярэжжа Прыпяці, якія маюць свае этнічныя адметнасці. Яны – у размове жыхароў, у забудовах вёсак, звычаях, святах народнага календара і сямейных традыцыях, у рамёствах і нават у народных касцюмах. Асабліва багата Жыткавіцкая зямля таямнічымі паданнямі, самабытнымі абрадамі і непаўторнай песеннай творчасцю, карані і вытокі якой у глыбінях старажытнасці.

Мы ганарымся тым, што дзве нематэрыяльныя, духоўныя гісторыка-культурныя каштоўнасці раёна ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У 2004 годзе абраду "Юр'я", які штогод праводзіцца ў в. Пагост, першаму ў нашай краіне нададзены гэты статус. Удзельнікі фальклорна-этнаграфічнага калектыву "Міжрэчча" Пагосцкага клуба-бібліятэкі захоўваюць і перадаюць моладзі мноства абрадаў сваёй мясцовасці.

У 2016 годзе Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь нададзены статус нематэрыяльнай каштоўнасці "Спеўнаму стылю Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі", які прадстаўлены традыцыйнымі абрадавымі і пазаабрадавымі творамі аграгарадка Рычоў. Ён з'яўляецца адным з лакальных песенных стыляў арэала Цэнтральнага Беларускага Палесся. Прапагандуе гэты асаблівы стыль выканання народных песень народны фальклорны ансамбль «Дубравіца» Рычоўскага цэнтра традыцыйнай культуры.

Хочацца адзначыць, што наш раён надзвычай багаты на аматараў фальклору і спрадвечнай абраднасці, людзей, якія нясуць праз усё жыццё любоў да роднага слова, роднай песні, мясцовых звычаяў і абрадаў. І не толькі нясуць самі, але і імкнуцца перадаць гэту багатую духоўную спадчыну маладому пакаленню.

У раёне зафіксавана 89 носьбітаў аўтэнтычнага фальклору.

Багаты раён і на ўмельцаў-майстроў, якіх налічваецца каля 200. Яны праяўляюць свае шматгранныя таленты ў звыш 20 відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асноўны ўнёсак у захаванне, прапаганду і перадачу моладзі самабытнай мастацкай культуры нашага рэгіёна робяць калектывы мастацкай самадзейнасці, што працуюць ва ўстановах культуры.

У раёне дзейнічае 211 калектываў мастацкай самадзейнасці. У іх з вялікім задальненнем займаюцца 1828 аматараў творчасці (з іх 101 – дзіцячыя калектывы, якія наведваюць звыш 860 хлопчыкаў і дзяўчынак).

А гонарам – 41 калектыў, які мае найменні "заслужаны", "народны" і "узорны".

87 цікавых самадзейных мастацкіх калектываў прапагандуюць песенную творчасць сваёй мясцовасці, сярод іх– 12 дарослых і 7 дзіцячых фальклорна-этнаграфічных гуртоў.

Статыстыка сведчыць, што ў нашым раёне вусная народная творчасць – з'ява жывая, а не адрэстаўраваная, і яна будзе жыць і надалей.

Мясцовая ўлада заўсёды падтрымлівае цікавасць да самабытнай культуры і побыту нашага непаўторнага сваёй прыгажосцю, багатага на гістарычную спадчыну Жыткавіцкага краю.

Дзмітрый Сцяпанавіч Гайкевіч,
старшыня Жыткавіцкага райвыканкама

# ЛЕГЕНДАМІ АВЕЯНЫ КРАЙ

Жыткаўшчына – знакаміты і ўнікальны культурны цэнтр Палесся, дзе жыве фальклорная традыцыя даўніны. Гэта край цікавых легенд і паданняў, край цудоўнай беларускай прыроды, яркай гісторыі, якая адыграла сваю ролю ў фарміраванні эпахальных падзей. Гэта яшчэ і край духоўнага багацця, зафіксаванага ў шматлікіх фальклорных жанрах, што засталіся ў народнай памяці.

Жамчужынамі Палесся лічацца азёры Чырвонае і Белае. Сінявокая Прыпяць са сваімі прытокамі, вялікія і маленькія рэчкі па-ранейшаму радуюць вока. Тут ёсць і запаведныя мясціны ў Нацыянальным парку "Прыпяцкі", шматлікія заказнікі, помнікі прыроды. Жыткавіцкі раён уваходзіць у турыстычны маршрут "Залатое кальцо Гомельшчыны", Палеска-Тураўскую турыстычную зону. Гэтая старажытная зямля прываблівае сёння шматлікіх аматараў сівой мінуўшчыны не толькі з Беларусі, але і з далёкага замежжа. Але галоўнае багацце гэтага краю – яго людзі: таленавітыя, працалюбівыя, адкрытыя, шчырыя, адданыя сваёй любімай справе. Яны любяць сваю старонку, агульнымі намаганнямі ўслаўляюць родную зямлю, беражліва захоўваюць народную спадчыну.

Жыткаўшчына – маленькая радзіма вядомых людзей. Менавіта тут, у палескай глыбінцы, нарадзіліся выдатныя дзеячы культуры, навукі, ваеннай справы, эканомікі, палітыкі, спорту.

Жыткаўшчына жыве і развіваецца. Невыпадкова, што на гэтай зямлі пад эгідай Міністэрства культуры неаднаразова праводзіліся тэатралізаваныя святы па абрадавай творчасці палешукоў, а ў старажытным Тураве штогод ладзяцца святы ў гонар асветніка Кірылы Тураўскага, так званага "Златавуста, які ярчэй за ўсіх зіхацеў на Русі" і заклаў асновы праваслаўнай царквы на Беларусі.

Гэты край здаўна прыцягвае ўвагу многіх вучоных, асабліва фалькларыстаў, этнолагаў, археолагаў і гісторыкаў. Расце іх цікавасць да народных традыцый і культурных каштоўнасцей Жыткавіцкага раёна, дзе прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці ўстаноў культуры стала работа па вывучэнні, адраджэнні, захаванні і прапагандзе традыцыйнай культуры гэтага самабытнага рэгіена. Тут ёсць жывы асяродак традыцый, наладжана работа з іх носьбітамі, добра арганізаваны працэс перадачы фальклорнай спадчыны падрастаючаму пакаленню.

На філалагічным факультэце ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны" склалася адметная традыцыя збору, вывучэння, сістэматызацыі і выдання лепшых узораў вуснай народнай творчасці Гомельшчыны. Падчас летніх фальклорных экспедыцый у розныя раёны вобласці выкладчыкі, аспіранты і студэнты-філолагі становяцца сведкамі цікавых народных абрадаў у жывым бытаванні, занатоўваюць непаўторныя скарбы духоўнай культуры жыхароў палескага краю. Сабраныя імі каштоўныя матэрыялы публікуюцца ў фальклорна-этнаграфічных зборніках, якіх на сённяшні дзень ужо налічваецца 14. А зараз вы трымаеце у

руках чарговае выданне, у якім запісаны і сістэматызаваны звесткі пра каляндарныя і сямейныя абрадавыя святы, зафіксаваны песні, легенды і паданні, прыкметы і павер'і, прыказкі, прымаўкі і загадкі Жыткавіцкага раёна –"краю, павітага рэкамі, закалыханага хвалямі азёр". Гэта кніга – вынік шматгадовай плённай працы не толькі выкладчыкаў і студэнтаў, але і работнікаў устаноў культуры, мясцовых энтузіястаў-носьбітаў фальклорнай традыі і збіральнікаў скарбаў вуснай народнай творчасці – будзе карыснай не толькі для саміх жыхароў, але і для ўсіх тых, хто зацікаўлены ў захаванні і адраджэнні народнай духоўнай культуры нашай краіны.

А.М.ДЗЕМІДЗЕНКА,
*прарэктар па навуковай рабоце*
*УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны", доктар тэхнічных навук, прафесар*

## МЕЖНАЦИОНАЛЬНЫЙ ПРОЕКТ «ВЕРА И ВЕРНОСТЬ» - ОТ ИДЕИ ДО РЕАЛИЗАЦИИ

Уже более трех лет члены Региональной общественной организации «Национально-культурная автономия «Белорусы Москвы», их партнеры и единомышленники осуществляют работу по реализации Межнационального проекта «Вера и верность», направленного на укрепление дружбы между братскими народами России и Беларуси, сохранение и приумножение исторических, культурных, христианских и патриотических традиций.

Одно из основных направлений работы в рамках Проекта – это увековечивание памяти жертв фашизма, погибших и пострадавших во время Великой Отечественной войны. 22 августа 1941 года в деревне Погост Житковичского района Гомельской области Беларуси в ходе карательной операции «Припятские болота» нацистскими войсками было расстреляно и сожжено 69 местных жителей, из 198 домов уцелело 19. За время войны на фронтах, оккупированной территории, в концлагерях и на принудительных работах в Германии погибло около 200 жителей деревни (в настоящее время точное число погибших уточняется).

В 2014-2015 годах московские белорусы, офицеры запаса ВС РФ, провели большую работу в деревне Погост Житковичского района Республики Беларусь. На их личные средства был заменен иконостас, проведен косметический ремонт и обновлено внутреннее убранство Кресто-Воздвиженской церкви, установлены памятные знаки в деревне на месте массовой гибели людей в годы Великой Отечественной войны. Инициативная рабочая группа осуществляла поисковую и научную деятельность, выявила в архивах Российской Федерации и Республики Беларусь неопубликованные документы о боевых действиях в Полесье.

В 2016 году деятельность рабочей группы была оформлена в Межнациональный проект «Вера и Верность» Региональной общественной организации «Национально-культурная автономия «Белорусы Москвы»», поддержанный руководителями Гомельского облисполкома и Житковичского райисполкома Республики Беларусь.

Презентация проекта «Вера и верность» и Житковичского района Беларуси в столице России прошли в рамках Первого московского общегородского национального праздника Купалье, проводившегося «Белорусами Москвы» в июле 2016 года при поддержке Департамента национальной политики, межрегиональных связей и туризма города Москвы, Посольства Республики Беларусь в Российской Федерации и Министерства культуры Республики Беларусь.

В школах города Москвы при поддержке Департамента образования города Москвы была организована и проведена акция, в ходе которой московские учащиеся подготовили для белорусских школьников серию картин и рисунков на военную тему «Пока мы живы, будем помнить. Пока мы помним, будем жить». Выставка этих работ также прошла в Москве в рамках Национального белорусского праздника Купалье (июль 2016 года), а

затем картины и рисунки московских школьников были переданы в дар Погостскому клубу-библиотеке.

С 19 по 21 августа 2016 года в городе Турове и деревне Погост Житковичского района Гомельской области Республики Беларусь состоялась Международная (российско-белорусская) научно-практическая конференция «Навечно в памяти народной. Патриотизм в системе обеспечения безопасности Союзного государства России и Беларуси» и цикл мероприятий Проекта.

Организаторами конференции выступили: с российской стороны – Региональная общественная организация «Национально-культурная автономия "Белорусы Москвы"», лаборатория истории диаспор исторического факультета МГУ имени М.В. Ломоносова, «Российский союз ветеранов», МГОВ РВСН; с белорусской стороны –Институт истории Национальной академии Беларуси, Житковичский райисполком, Озеранский сельский совет, ОО «Туровское научно-просветительское общество». К участию в качестве слушателей были приглашены жители города Туров и деревни Погост.

В день 75-летия трагических событий, произошедших в годы Великой Отечественной войны в деревне Погост, состоялась торжественная церемония открытия Памятника погибшим в годы войны жителям деревни Погост и Митинг-реквием «Вспомним всех поименно…». В мероприятиях участвовали представители районной администрации, участники конференции и Проекта, жители деревни Погост и близлежащих деревень.

В этот же день в Кресто-Воздвиженской церкви деревни Погост Житковичского района Гомельской области Республики Беларусь были отслужены литургия и панихида в память о жителях деревни, погибших в годы Великой Отечественной войны, прошел Крестный ход.

20 августа 2016 года в рамках Проекта в Погостском клубе-библиотеке деревни Погост Житковичского района Гомельской области Беларуси состоялось открытие:

- Уголка памяти «Пока мы живы, будем помнить. Пока мы помним, будем жить», посвящённого героическому подвигу русского и белорусского народов и жителей деревни Погост в годы Великой Отечественной войны, и куда в рамках проекта были переданы ксерокопии архивных документов, собранных участниками проекта в архивах России и Беларуси;
- выставки декоративно-прикладного искусства жителей деревни Погост и Озеранского районного центра ремёсел;
- выставки картин и рисунков школьников города Москвы, переданных в деревню Погост Департаментом образования города Москвы в рамках проекта «Вера и верность»
- персональной выставки картин члена рабочей группы Проекта, члена РОО «НКА «Белорусы Москвы», Члена Союза художников Российской Федерации и Международного Союза художников, полковника в отставке, кандидата педагогических наук, доцента П.П. Крамаренко.

Также в Погостском клубе-библиотеке прошёл Праздничный концерт, в котором участвовали народные фольклорные ансамбли Житковичского района и состоялась премьера песни-гимна «Погост», написанной членами РОО «НКА «Белорусы Москвы» певцом и композитором В.И. Патрушевым и поэтом, членом Союза писателей России, полковником в отставке, кандидатом военных наук В.Д. Ловчиковом.

Деятельность участников рабочей группы и волонтеров Проекта, всесторонняя поддержка представителей районной администрации были отмечены наградами Общероссийского общества ветеранов «Российский союз ветеранов».

В настоящее время работа по реализации Межнационального проекта «Вера и верность» продолжается и развивается.

6 мая 2017 года в рамках Дня белорусской культуры, подготовленного РОО НКА «Белорусы Москвы» в Московском дворце пионеров на Воробьевых горах, состоялось открытие выставки белорусской аутентичной вышивки и ткачества «Белорусские узоры», которую составили работы Е.А. Панчения, жительницы деревни Погост Житковичского района Гомельской области Республики Беларусь, и произведения мастеров Озеранского районного Центра народных промыслов Житковичского райисполкома Гомельской области Республики Беларусь.

Одним из ключевых направлений Проекта является научно-исследовательская работа по истории края: Житковичского района, Туровщины, Полесья. Данный сборник является результатом многолетней подвижнической деятельности ученых и учащихся, работников учреждений культуры, фольклористов, «общественников» – участников проекта, первой книгой из запланированного пятитомного труда «С любовью к родной земле», основанного на широкой документальной базе из архивов Республики Беларусь и Российской Федерации, материалах, предоставленных местными жителями, их воспоминаниях.

Эта работа является общественной инициативой, ярким, позитивным примером международного российско-белорусского сотрудничества, который подтверждает неразрывное духовное, историческое и культурное единство народов России и Беларуси.


О.В.СОЛОПОВА,<br>
*руководитель лаборатории истории диаспор исторического факультета*<br>
*МГУ имени М.В. Ломоносова, Председатель РОО «НКА «Белорусы Москвы»,*<br>
*заместитель Председателя Совета ФНКА «Белорусов России»,*<br>
*доцент, кандидат исторических наук,*<br>
К.М. ГОЛОД,<br>
*член РОО «НКА «Белорусы Москвы»,*<br>
*со-руководитель Межнационального проекта «Вера и верность»,*<br>
*полковник запаса ВС РФ*<br>
А.В. КОЗОПОЛЯНСКАЯ,<br>
*м.н.с. исторического факультета МГУ имени М.В. Ломоносова*<br>
*член Совета РОО «НКА «Белорусы Москвы»,*<br>
*член Совета ФНКА «Белорусов России»*

## КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫ ФАЛЬКЛОР

### *Новак В.С. Лакальныя асаблівасці каляндарна-абрадавага фальклору Жыткавіцкага раёна*

Вывучэнне фальклорна-этнаграфічных традыцый асобных раёнаў як адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак надзвычай важна, калі мець на ўвазе рэалізацыю канцэпцыі “культурнага ландшафта”. Несумненна, што атрыманыя такім чынам вынікі даследавання мясцовых асаблівасцей традыцыйнай народнай культуры дазволяць зрабіць абагульненні як рэгіянальнага, так і агульнаэтнічнага характару.

Каб пераканацца ў тым, што, сапраўды, фальклор як від мастацтва бытуе і функцыянуе непасрэдна на рэгіянальным (лакальным) узроўні, звернемся да характарыстыкі асобных відаў каляндарна-абрадавай паэзіі Жыткавіцкага раёна. Засяродзім увагу на характарыстыцы калядна-навагодняга абрадавага комплексу, асноўнымі структурнымі кампанентамі якога з’яўляюцца абходныя шэсці калядоўшчыкаў (шчадроўнікаў), абрад ваджэння казы (каня, бусла і інш.), рытуальны дыялог, звязаны з закліканнем марозу, прыкметы і павер’і, варажба, агульнакалядныя, песні пад назвай “каза” і ўласна калядна-шчадроўныя велічальна-віншавальныя песні, адрасаваныя гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну. Прааналізуем спачатку мясцовыя асаблівасці калядна-навагодняй абраднасці. На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, як сведчаць экспедыцыйныя матэрыялы, шырока адзначаліся Каляды. Паводле сведчанняў жыхароў, “это вельмо старажытны празнік. От людзі раньшэ говорылі про Каляды так: “Калядкі спраўляюць для таго, коб було ў дастатку ўсего. Празнік Каляд, коб буў у хаці лад” (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.). Вялікае значэнне надавалі палешукі працэсу падрыхтоўкі да калядных святкаванняў. Асобнай увагі заслугоўваюць этнаграфічныя звесткі пра святкаванне першай куцці. Напрыклад, у в. Дуброва рыхтавалі абрадавую страву (кашу), якую “варылі з ячных круп, можна мёдам падсаладзіць”. Як адзначылі мясцовыя жыхары, на стол абавязкова клалі жыта, “каб у хаце було шчасце” (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Жыхары в. Верасніца таксама пацвердзілі, што “на стол клалі солому і сено, шоб быў добры ўрожай, шоб хватало еды ўсім: і собе, і жывёлі, шоб добрэ зерновые выраслі” (запісана ад Бобрык Таццяны Максімаўны, 1937 г.н.). З першай куццёй была звязана аграрна-магічная варажба, паводле якой прагназавалі, якім будзе ўраджай на ніве: “Можна було гадаць. Хазяйка выцягвала з-пад скацерці сцябліну сена: калі яна була доўгая, то будзе высокі лён. Хазяін выходзіў на вуліцу і глядзеў на неба, калі многа зорак, значыць, будзе многа грыбоў і прыплод у хазяйстві. Калі була мяцеліца, будуць раіцца пчолы” (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Як паведаміла інфармант, “куццю варылі ў тым жа гаршку, што і тыя дзве”.

Абрад калядавання выконвалі ва ўсіх вёсках Жыткавіцкага раёна. Напрыклад, устойлівасцю захавання адрозніваецца абрад калядавання,

падчас якога ў в. Хільчыцы ўдзельнікі каляднай світы пераапраналіся ў казу, мядзведзя, чорта, каня ці кабылу, гандляра, нячыстую сілу, цыгана. Цэнтральнае месца адводзілася абрадавым дзеяннем, звязаным з казой. Варта адзначыць, што "абрад ваджэння "казы" ў тым выглядзе, у якім ён дайшоў да нас, прадстаўляе сабой не столькі абрадавае дзеянне, колькі бытавую гульню, забаву" [1, с. 22]. Абавязковай у в. Хільчыцы была просьба да гаспадароў дазволіць пакалядаваць. Паводле ўспамінаў Марыі Пятроўны Шруб, 1926 г.н. з в. Хільчыцы, "от, ек подходзімо до хаты, то путаем: "Добры вечор, пані господыня, пан господар! Ці можна Вам песню проспяваць, Ваш дом повеселіць? Ек з хаты получаюць дозвол, то заходзяць у хату. Коза ўбегае першою ў хату, падае на серэдзіну, быццам умерла. Пры гэтым спявалі:

Пусць каза ўпала,
Здохла, пропала.
Гасподзь ідзе,
Каляду нясе,
А гаспадыня ідзе,
Каляду нясе.
На рожанькі
Два піроженькі,
А на хвасток –
Сала кусочак.

У прыведзеным тэксце знайшлі адлюстраванне матывы ахвярнай смерці казы і яе ажывання. Даследчыца Р.М. Кавалёва засяродзіла ўвагу на семантыцы скокаў, смерці і ажывання казы, уважліва праанілізавала тэксты калядных песень ("тэксты павышанай семантычнай нагрузкі"), структуру абраду ваджэння казы і зрабіла наступныя вывады: "Адметнасць абраду надаюць наступныя моманты:

– ахвярапрынашэнне казы ў сапраўднасці не адбываецца, яно перажываецца сімвалічна. Смерць казы імітуе пераапрануты чалавек;

– забойства казы ўспрымаецца як рэальнае, але мяркуецца, што яно адбылося не тут, не цяпер, а ў мінулым і без удзелу калядоўшчыкаў;

– віна за забойства, як у буфоніях, мядзведжых святах і падобных да іх абрадах, пераносіцца на ўмоўных злачынцаў;

– сучаснае "хаджэнне" – гэта рытуальны абыход сядзібаў казой, якая ажыла і набыла магічную здольнасць дабратворна ўплываць на ўрадлівасць палёў" [2, с. 36].

Яскрава выражаны матыў заклёну ўрадлівасці нівы ў другой частцы песеннага фрагмента звязаны з магічнай функцыяй казы, якой у міфалагізаванай свядомасці нашых продкаў адводзілася прадуцыравальная роля. Як слушна адзначыла Л.В. Пакроўская, "носьбітамі ідэі ўрадлівасці і цыклічнасці ў прыродзе ва ўяўленнях старажытных земляробаў выступалі і жывёлы: бык, каза, свіння, конь і інш." [3, с. 71]. Прыведзены тэзіс знаходзіць пацвярджэнне ва ўспамінах пра Каляды жыхаркі в. Сямурадцы

Марыі Сяргееўны Клімовіч, 1936 г.н.: "Это ж, калі з казою ўваходзяць у хату, то коза ўродзе бы ў хату прыносіць ураджай вялікі".

Калі калядавалі ў в. Боркі, то, па мясцоваму звычаю, "раздавалі насенне жыта. Давалі па два-чатыры ў руку. Або сыпалі зерне ў хату. Гэта для таго, каб жыць добра было" (запісана ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.).

У в. Хільчыцы святкавалі і Шчадрэц, вечар напярэдадні старога Новага года. Мясцовай адметнасцю абраду шчадравання з'яўлялася пераапрананне хлопцаў: "У нас тожэ шчадравалі, дзеўкі гадалі. От пока мы гадалі, то хлопцы перэпраналіса адзін другога мудрэй. Робілі козу, ек на Коляды, выбіралі мехоношу, а шчэ робілі "шчадраца", на его цэплялі лахмоцце старое, косы рабілі з лёну, горба. Да после ўся гета компанія шла шчадраваць по селу з песнямі, музыкой. От подходзяць к хаці, путаюць дозволу, шоб песню заспеваць. А ек з хаты скажуць: "Вольно!", то почынаюць спеваць:

Ой, по моры, по сінему,
Шчодры вечор Васілю!
Там ластаўка купаласа,
Купаласа, умываласа,
На берэжку сушыласа.
Вуйшла Галя – дзівіласа,.
Прыйшла дамоў, хваліласа:
– Ой, мамонька, я бачыла
Дзіво дзіўнэ, чудо чуднэ,
То по моры по сінему
Там ластаўка купаласа.
– Это, доню, не ластаўка,
То Прычыста рызы мула (запісана ад Кацэвіч Праскоўі Андрэеўны, 1909 г.н.).

Прыведзены песенны тэкст, як адзначыла інфарматар, выконваўся ў в. Хільчыцы толькі "на Шчадрэц", "астатнія песні спявалі тыя ж самыя, што і на Коляды". Гэты факт пацвердзілі і ў в. Запясочча Жыткавіцкага раёна: "Песні спевалі на Шчодрэц, як і на Коляды. Одно казалі: "Шчодры вечор!" (запісана ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.) Лакальнай асаблівасцю ў абрадзе шчадравання ў в. Запясочча з'яўляецца звычай абвязваць саломай сад: "13 января–шчодры вечар, бралі кочэргу, бохан хлеба, які пеклі к Рождству, і ездзілі на кочэрзе обвязваць сад соломой або сеном, пры гэтым казалі: "Едзе Радзівон на сівом коне, везе белы цвет і красные вішні" (запісана ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.). Заўважым, што ў славян быў вядомы звычай "абвязваць Д.п. (дрэва пладовае – В.Н.) саламянымі або гарохавымі перавясламі, каб Д.п. лепш пладаносіла, не баялася марозу, каб справакаваць завязванне пладоў на Д.п." [8, с. 73]. "Прадукавальны сэнс рытуалаў з саломай у складзе каляндарнай абраднасці даволі празрысты: салому з каляднага стала неслі ў поле, абвязвалі вакол садовых дрэў, падпярэзвалі ёю бясплодных жанчын" [9, с. 448]. У в. Пагост, каб паспрыяць ураджайнасці садавіны, падыходзілі да

яблыні і прамаўлялі: "Дзерэво, здрыгніса – Ісус Хрыстос народзіўса" (запісана ад Маркевіч Валянціны Пятроўны, 1939 г.н.).

У гурце калядоўшчыкаў, якія хадзілі ў вёсках Жыткавіцкага раёна ад хаты да хаты, былі пераапранутыя не толькі у казу, але і ў каня, бусла [4, 705]. Як адзначыла Надзея Іванаўна Папко, 1928 г.н., з в. Пухавічы, "насілі ў нас каня замест звязды". Жыхарка гэтай вёскі Купрацэвіч Ганна Пархомаўна, 1939 г.н., удакладніла, што "робілі коня, сільно кросіво одзевалі коня, да звонцэ повезаюць, да збрую зроб'яць. … З конём коза ходзіла, а звязда отдзельно". Паводле сведчанняў Кацярыны Аляксееўны Панчэні, 1941 г.н , у в. Пагост "вадзілі козу, бусла, мядзведзя і сароку. Як вялікі снег, сарока ж не можэ скакаць на двух нагах, то хлопцы насілі яе і гармошку, і барабан". Адзначым, што ў в. Пагост старанна рыхтаваліся да святкавання другой куцці, якую называлі багатай, а абрадавая страва "куцця" "была галоўным блюдам у гэты вечар" (запісана ад Купрыян Еўдакіі Валер'еўны, 1932 г.н.). Менавіта з навагодняй куццёй быў звязаны рытуальны іншасказальны дыялог заклікання марозу (знайшлі адлюстраванне народныя вераванні, звязаныя з духамі памерлых) на вячэру, калі "бралі ложку, набіралі ў яе куцці і падыходзілі да вакна. Стукалі ложкай у вакно і гаварылі: "Мароз, мароз, хадзі да нас куццю есці!" (запісана ў в. Пагост ад Купрыян Еўдакіі Валер'еўны, 1932 г.н.). Факт заклікання марозу на другую куццю пацвердзілі і жыхары г. Жыткавічы, пры гэтым у славеснай магічнай формуле, якая гучала падчас звароту да марозу, меў месца матыў пагрозы: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці, а летам не ідзі, бо будзем пугамі секці" (запісана ад Смоляр Клаўдзіі Міхайлаўны, 1944 г.н.). Адзначым, што матыў "заклінання" марозу не шкодзіць гаспадарцы гучыць у рытуальным дыялогу, звесткі пра які запісаны ў в. Запясочча: "Мороз, мороз, ходзі куццю есці. Да не поморозь нашых цяляток, ягняток" (запісана ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.).

Заўважым, што ў в. Пагост абавязковымі былі абходныя шэсці калядоўшчыкаў са "звяздой". На пытанне, чаму "насілі зорку", мясцовыя жыхары паведамілі, што гэта было звязана з нараджэннем Ісуса Хрыста: "Яшчэ расказвала мая маці, што калі нарадзіўся Хрыстос, то на небе загарэлася звязда яркая, таму ў гэты шчодры вечар рабілі звязду, пасярэдзіне ікона была і свечка. Сама яна павінна была быць яркая, у восем канцоў, і цаплялі яе на длінную палку. Насілі па хатах і ўслаўлялі Бога і Хрыста, сына ягонага" (запісана ў в. Пагост ад Купрыян Еўдакіі Валер'еўны, 1932 г.н.). У в. Чэрнічы, як адзначылі інфарманты, таксама "колядуюць з казою, з звяздою. Звязда на Коледу обязацельно трэбо шоб була. Патаму шо гэта азначае, шо пад звяздою радзіўся Ісус Хрыстос" (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). Са "звяздой" хадзілі калядаваць і ў в. Буразь, звычайна "сабіраюцца дзяўчаты і хлопцы хадзіць па вёсцы, спяваць рождзественскія песні. Робяць звязду вялікую, у сярэдзіне якой запальваецца свечка, і ідуць пад вокны хат, а хто захоча, той заве ў хату" (запісана ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н., Пятрычыц А.).

З другой куццёй была звязана шлюбная варажба, звесткамі пра якую шчодра дзяліліся мясцовыя жыхары. Паводле іх сведчанняў, каб даведацца

пра будучаё замужжа і свой лёс, варажылі, выкарыстоўваючы розныя прадметы (бліны, люстэрка, дровы, абутак, свечкі, грэбень, мужчынскія штаны, сала і інш.), прыцягваючы да выканання рытуалаў варажбы жывёл (сабаку, курыцу, пеўня, каня). Шматлікія ўзоры варажбы, якія добра захоўваюцца ў людской памяці, – яскравае сведчанне народнай мудрасці, глыбіннай жыццёвай філасофіі нашых продкаў.

У в. Града падчас калядных святкаванняў гулялі ў народную гульню “Олея”, сутнасць якой заключалася ў тым, што хлопец знаходзіўся ў сярэдзіне карагода і выбіраў сабе ў якасці ахвяры прыгожую дзяўчыну: “Дзевочкі робілі корогод і спявалі:

Цяпло, цяпло, Олею,
Пад дубовай карою.

Олей атвечаў:

Курна, курна, дзевачкі,
Пад дубовай карою.

Дзевочкі ему говорылі:

Дык бяры сабе, Олею,
Красну панну Волечку.

Олей браў сабе з карагоду дзеўчыну ў круг і адказваў:

Дзякуй, дзякуй, дзевачкі,
За красну Волечку” (запісана ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.).

У абрадзе калядавання звычайна прымалі ўдзел розныя полаўзроставыя гурты: дарослыя, моладзь, дзеці. Варта адзначыць, што гаспадары заўсёды чакалі калядоўшчыкаў, якія былі самымі жаданымі на кожным падвор’і, і выказвалі крыўду, калі яны не заходзілі ў якую-небудзь хату: “Калядавалі доўга, не мінаючы ні аднае хаты, бо як, не дай Бог, мінеш чыю-небудзь хату, то на другі дзень так ужо абганяць, так абідзецца, што ўродзе бы мінулі” (запісана ў в. Сямурадцы ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.). Як адзначыла інфармант, “а калі ў сяле бывалі памерлыя, то ўжо ў гэту хату не заходзілі, абміналі, таму што цэлы год там ляжаў пахаронны звычай” (запісана ў в. Сямурадцы ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.). Акрамя выканання велічальна-віншавальных песень, адрасаваных гаспадарам і іх дзецям, у в. Запясочча “робілі з бумагі звязду, у серэдзіне запальвалі свечку, бралі сані і ходзілі. На санях возілі тэ, шо ім давалі: пірогі, сало, коўбасы. Спевалі песню, у якой славілі Хрыста:

Рожество Хрістово, ангел прілецел.

Он лецел по небу, людзям песні пел.
Все людзі, лікуйце, всей дзень торжэствуйце,
Есць Хрістово Рождзество.
Пастушкі в пешчеру первымі прішлі,
В яслях на соломе Господа нашлі" (запісана ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.).

Вышэйпрыведзены песенны тэкст у больш поўным варыянце выконвалі на Шчадрэц у в. Рычоў, дзе ў гэты час "насілі звязду, выдзялялі аднаго чалавека для гэтага і дзелалі свечкі. Звычайна спявалі мужчыны, прыходзілі ў хату са звяздой і пыталі дазволу заспяваць" (запісана ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.). На "Шчадрэц", 13 студзеня, у гэтай вёсцы вадзілі казу, ролю якой выконвала жанчына (запісана ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.). Сутнасць семантыкі прадметнай атрыбутыкі (сена, грошы, соль), звязанай з другой куццёй, жыхары тлумачылі наступным чынам: грошы клалі, каб "яны заўсёды вяліся ў хаце, соллю пазней мазалі цяля, каб карова пасля злізала, гэта рабілі, каб у каровы старое і молодое малако было добрае" (запісана ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.).

У в. Кольна адзначалі тры куцці: "Первая куцця была на Ражство і была бедная, но ўрачыстая, другая куцця была багатая і варылі з 13 на 14 (стары Новы год), і трэцяя куцця была галоднай і варылі яе на Хрышчэнне" (запісана ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.). З першай куццёй былі звязаны такія міфалагічныя ўяўленні вяскоўцаў: забаранялася каштаваць кашу ў той час, калі яна варылася; пад сена падкладвалі грошы, каб "у хаце цэлы год грошы вяліся"; "скарынку з куцці" аддавалі курам, каб "вяліся добра"; не садзіліся за калядны стол, пакуль "першая зорачка на небе не з'явіцца".

У в. Кольна абрад шчадравання, у якім удзельнічала ў асноўным моладзь, быў звязаны з другой куццёй. Адметным быў той факт, што ў гэтай вёсцы не толькі вадзілі казу, але і насілі ёлачку ("хадзілі з ёлкаю, а на той ёлкі свечкі былі"). Чаму прысутнічаў менавіта гэты абрадавы атрыбут – ёлка, жыхары в. Кольна не змаглі растлумачыць, аднак можна выказаць меркаванне аб невыпадковасці выкарыстання гэтага дрэва, міфалагічныя ўласцівасці якога звязаны з ахоўнай магіяй, культам продкаў, з ідэяй захавання жыцця ("… у беларускай традыцыі існуе ўяўленне пра елку як пра дрэва "свянцонае" (асвечанае)" [9, с. 159].

Трэцюю куццю, якую называлі вадзяной, святкавалі, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, перад "Крашчэннем" (Вадохрышчам). Асвячэнне вады і маляванне крыжыкаў на сценах хаты і дзвярах – важныя рытуалы, якія імкнуліся выканаць, каб засцерагчыся ад нячыстай сілы, захаваць здароўе: "Трэцяя куцья бедная. Яна была перад Крашчэннем на Водопосцье. Тожэ не елі ўвесь дзень до вечора. Прыходзілі з цэрквы, гэтую куцью даставалі, помоліліса Богу. Хазяін первы пачынаў гэтую куцью і благослаўляў. Дзень наступны Крашчэнне. Перад Крашчэннем прыходзілі з цэрквы после вечернее і рысавалі крэсцікі на дзверах у хату, у хлеў. Оберог од усякіх злых духоў" (запісана ў 2017 г. у в. Буразь ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н., Пятрычыц А.). У в. Рычоў вечар напярэдадні святкавання трэцяй куцці, якую

называлі “халоднай”, беднай, таксама меў назву “водопосцье (“дзень не едзяць, ідуць у цэркву, поп’юць свечанае воды і толькі тады едзяць куццю”) (запісана ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў в. Запясочча, у іх мясцовасці вечар “перад Крэшчэннем” называлі “першэ водосвяцце і не елі нічого, покуль не нап’юцца” (запісана ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.). Апырскванне пасвечанай вадой хаты – важны рытуал у святкаванні трэцяй куцці ў в. Пухавічы: “Хату людзі брызгалі свечоною водою, коб хто не прыробіў чаго ці злые вочы не зурочылі” (запісана ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.). У в. Пагост на Вадохрышча (“Крэшчэнне”) абавязкова на рэчцы “вырубалі” з лёду крыж, “обольюць его бурачным соком і нараджаюць лентамі з бумагі ўсякага цвету” (запісана ад Маркевіч Валянціны Пятроўны, 1939 г.н.).

Як бачым, зімовая каляндарна-абрадавая паэзія Жыткавіцкага раёна, якая з’яўляецца арганічнай часткай фальклору і рэгіёна, і беларускай вуснай народнай творчасці ў цэлым, мае адметнае ў кожнай мясцовасці песеннае суправаджэнне. У агульнатрадыцыйным абрадзе ваджэння казы ў в. Хільчыцы абавязковай была прысутнасць антрапаморфнай маскі (яркая лакальная спецыфічная асаблівасць) – апранутага ў “лахманы” “шчадраца”, які выразна асацыіраваўся з прадстаўніком духаў продкаў. Каляднікі, якія здзяйснялі абход двароў, успрымаліся як небяспечныя агенты “свету іншага, здольныя прыносіць дабрабыт, калі іх адпаведным чынам надарыць” [5, с. 160]. Адметным быў звычай абвязваць саломай сад, што спрыяла, паводле мясцовых вераванняў, яго пладаноснасці (в. Запясочча). Узоры лакальных варожбаў узнаўлялі народныя матывы вызначэння лёсу.

Як сведчаць запісы, надзвычай распаўсюджаным святам на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна была Масленіца. У в. Града быў вядомы масленічны звычай пад назвай “калодка”: “дзе жыў стары халасцяк, дзевачкі часто падпіралі ему дзверы калодай”. У мясцовай традыцыі гэты звычай меў не толькі значэнне асуджэння, але боязі дзяўчат выйсці замуж за нялюбага: “кеб не мог вылезці з хаты, таму што бояліса папасціся ў замужжа за старога ды нялюбага” (запісана ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.). Абрад “калодка” выконвалі таксама і ў в. Сямурадцы. З’яўленне гэтага звычаю інфарматары звязваюць з мясцовай традыцыяй забароны адмаўляць у шлюбе хлопцу, які прыходзіў сватацца ў дзень Масленіцы: “а ў дзень Масленіцы буў такі обычай, шо як прыйдзе хлопец у хату к дзеўцы, она не імее права яму адказаць, таму што пойдзе праклящце на ўсю сям’ю” (запісана ад Лой Ганны Пятроўны). Сярод мясцовых масленічных рытуалаў можна адзначыць і наступныя: катанне на санках з гары засватанай пары, спальванне старых “сеннікоў” (“бо ў іх оставаласа і хвароба, не добрэ шо було за зіму”), шлюбная варажба з блінамі (“ото напекуць бліноў, да з самага ранку, шчэ як не світае, дзеўка бярэ ў мацеры бліна, да пойдзе, да кіне гэтага бліна дзе-нібудзь, на якіх росходніх дорогах, да ўжэ стоіць да карауліць, чый сабака ўхопіць того бліна”).

У в. Чэрнічы, як і ў в. Сямурадцы, было прынята “спускаць з горкі першым блін”, прычым рабілі гэта дзяўчаты з мэтай хутчэй выйсці замуж: “А

дзеўкі стараліся, пака хлопцы не ўстануць, забегчы на тую коўзалку і пусціць первага бліна па той коўзалцы, маслам памазанага, шоб ето скарэй замуж выйсці" (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). З ідэяй ачышчэння, засцярогі ад хвароб і зла быў звязаны рытуал спальвання саламянага пудзіла або "старых саломенных сельнікаў, набітых саломай" (запісана ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.). Раскідванне попелу па полі, паводле народных уяўленняў, павінна было садзейнічаць урадлівасці глебы, а значыць, і ўраджайнасці.

Сярод структурных кампанентаў у сістэме абраднасці гукання вясны вылучаюцца такія, як пошукі высокага месца для выканання песень-вяснянак, падрыхтоўка абрадавага печыва, распальванне вогнішча, ваджэнне карагодаў, выбар дзяўчыны на ролю вясны, гушканне на арэлях. На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна гукалі вясну, пачынаючы ад Масленіцы і завяршаючы Дабравешчаннем (Благавешчаннем). У в. Буразь, калі ішлі гукаць вясну (звычайна "молодые дзеўкі, хлопцы і дзеці"), то бралі з сабою выпечаных "жавороночкоў" і вузлікі з ежай (яйкі, сыр, масла). Затым "на сено просцілалі скацерць, роскладвалі кожны свой вузелок і гукалі весну песнею" (запісана ў в. Буразь ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н. Лой Г. П.).

Абрад гукання вясны ў в. Хільчыцы Жыткавіцкага раёна адбываўся "на масленом, тыжні после месоеда, выбіралі вяснянку, дзеўку на ўсе рукі масцярыцу і рабілі для яе вялікі вянок". Цікавай лакальнай адметнасцю з'яўлялася тое, што гэты вянок дзяўчына-"вяснянка" павінна была павесіць на самую лепшую бярозу, вакол якой вадзілі карагод. У песні, якую выконвалі ў карагодзе, гучыць шлюбны матыў вянка, які ў дадзеным выпадку прадказваў нешчаслівы сямейны лёс:

Ой, венчэ, мой венчэ,
Да зялёны бярвенчэ,
Ек я цебе звіла
Шчэ ўчора звячора
Да й на вішэньку аднесла,
А мая маці шла
Да мой венчык знайшла,
Да нелюбаму аддала (запісана ад Шруб Кацярыны Авакумаўны, 1926 г.н.).

Адметным кампанентам у структуры абраднасці гукання вясны ў в. Хільчыцы з'яўляецца падкідванне кожным з удзельнікаў карагода "кусочкаў сыру, масла, яец уверх" з наступным прыгаворам: "Гу, весна, гу, красна! На табе яечка, сыра, маслечка, шоб быстрэй лето принесла, сонцэ прывела", а после только ўжэ емо. Потом зноў спеваем, танцуем аж да самого ранку" (запісана ад Шруб Кацярыны Авакумаўны, 1926 г.н.). Абрад гукання вясны ў в. Хільчыцы суправаджаўся карагодамі і выкананнем вяснянак на сюжэты

“Гу, вясна, гу, красна, што ты нам принесла?”, “Травушка-муравушка, зялёнай лужок, ой!”

У в. Кольна, паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў, гукалі вясну на ўзгорку, дзе абавязкова раскладвалі вогнішча, вакол якога вадзілі карагоды, спявалі песні-вяснянкі, а таксама “каталіся на арэлях” (запісана ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.). У лакальнай структуры абраду гукання вясны важнае месца адводзілася і абрадаваму печыву ў выглядзе птушак: “выпеквалі птушачак маленькіх і давалі іх дзеткам ці крашылі і падкідвалі ўгору: зазывалі, каб хутчэй птушачкі прыляцелі і з сабой цяпло, вясну прыняслі” (запісана ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.).

У в. Чэрнічы гукалі вясну 1 сакавіка, “на Оўдакею”, бо ад яе, лічылі, залежыў будучы ўраджай. Рыхтаваліся да святкавання старанна ў кожнай сям’і: выпякалі абрадавыя піражкі, рабілі сыр, варылі яйкі. Кожнаму дзіцяці па-асобку “складалі ежу ў вузлікі, шоб не сварыліся, сколькі було ў сям'і дзяцей, столькі маці гатовіла вузлікаў” (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). Мясцовы абрад гукання вясны ўключаў такія абрадавыя элементы, як выхад на высокі бераг ракі, выбар прыгожай дзяўчыны на ролю вясны, распальванне хлопцамі вогнішча, скокі цераз агонь, выкананне песень-вяснянак (“Ой, вясна, мая вясняначка, // Ты прыйдзі да нас, красняначка”; “Угу, вясна, угу, красна, // Шо ты нам прынясла? // Ці по яечачку, ці по піражэчачку, // Угу, вясна, угу, красна, // Шо ты нам прынясла? // Ці сырца кусок, ці масла брусок, // Угу, вясна, угу, красна” (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.), абрадавая трапеза каля вогнішча, карагоды і гульні (“закопвалі обучно сталба ды хлопцы лазілі, хто вышэй залезе. Ну, ім трэба було пахваліцца около дзявок, якія яны спрытнейшыя ды лоўкія” (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). У гэтай вёсцы дзеці выконвалі рытуал падкідвання ўгору выпечаных птушак з цеста.

У в. Рудня гукалі вясну 9 сакавіка (на Саракі), “павінны былі пераламаць 40 дошчачак альбо перарваць 40 вяровачак” (запісана ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.). Семантыку вышэйназваных дзеянняў жыхары звязвалі з “надыходам цяпла, абуджэннем прыроды”.

На абумоўленасць спецыфічных матываў тураўскіх песень-вяснянак абрадавай практыкай масленічнага тыдня звяртае ўвагу Т.А. Агапкіна, якая падкрэслівае спецыфічнасць матыву “вясна прыносіць сыр і масла”, уласцівага для вясенніх закліканняў у арэале Тураўскага і часткова Пінскага Палесся, а таксама на канкрэтных запісах, зробленых у в. Дзякавічы, пацвярджае важнасць традыцыйнай масленічнай стравы (сыру, масла, малака) у абраднасці гукання вясны: “И кликали весну на Масленицы. Я и сама лезла, озероды таки были. А шчэ на ту масленку едим сыры. Сыры брали и с сыръми в руках на озероды лезли. И весну ту поём на озеродах” [6, с. 53].

Вядомае на ўсёй тэрыторыі Беларусі юраўскае свята ў Жыткавіцкім раёне, як адзначаў даследчык К.П. Кабашнікаў, “набывае сваю адметнасць і нечым нагадвае звязанае з Вялікаднем валачобніцтва” [4, с. 705].

Непаўторнымі рысамі адрозніваецца юраўскі карагод у в. Хільчыцы. Адзначым, што карагодам тут называлі бохан хлеба або каравай, які спецыяльна рыхтавалі жанчыны і дзяўчаты: "Збіраліса дзеўкі, жонкі у одну компанію да спеком корогода (каравая), нарадзімо его веткамі, цветамі, лентамі да и становімо на веко. А наражаного корогода, перш чым з ім шлі, подымалі тры разы ўверх і прыгаворвалі:

Каравай, каравай, мы цябе праслаўляем
І шчасцем, і долей.
Дай, Божэ, нам усё маці
І зноў усім Юр 'я згуляці" (запісана ад Казак Надзеі Архіпаўны, 1932 г.н.).

Акрамя каравая, важным прадметным атрыбутам з'яўляліся граблі, да якіх прывязвалі два фартухі. Калі адбывалася шэсце па вуліцы, то імі "махалі ў вокны". Як паведаміла Надзея Архіпаўна Казак, "ек у хаці траур, то махалі белым фартухом, а ек не, то красным". Спачатку ўдзельнікі абраду ішлі на поле, спераду працэсіі – хлопец з "корогодам" (караваем), затым – жанчына з граблямі, а за ёй – усе астатнія, выконваючы песню, асноўнымі матывамі якой з'яўляліся забеспячэнне дабрабыту і шчасця сялянскай сям'і, пажаданне добрага ўраджаю:

Веду, веду карагод, карагод,
Усе дзевочкі наперод, наперод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.
Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.
У нашага карагода
Быў сын-ваявода.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,
А дзе не бувае,
Там жыто ўлегае.
У нашага карагода
Быў сын-ваявода.
Ідзе, ідзе карагод,
Усе дзевачкі наперод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.

Абрад працягваецца на полі, прычым удзельнікі пытаюць дазволу гаспадара: "Ці дазволіце карагод вадзіць, поле ўслаўляць, Юр'я заклікаць?" Вадзілі карагод вакол хлопца з караваем, які знаходзіўся ў цэнтры, і спявалі:

Эй, у карагода
Сын-ваявода,
То й дзе карагод ходзіць,
Там Бог жыто родзіць.
А й дзе ж да не бувае,
Там жыто да ўлегае.
Зародзі, Божэ, жыто
Да на новое лето,
Шчо на жыто, на пшэніцу,
На ўсяку пашніцу.
Да подай, маці, ключа,
Што б небо отворыці
Да росіцу спусціці.

Пасля таго як паводзяць карагод на полі, жанчыны і дзяўчаты накіроўваюцца назад у вёску і гуртам абходзяць кожную хату, жадаючы кожнай сям'і плёну, шчасця, дабрабыту: "Выйдзі, гаспадар, за вароты ды стрэчай Юр'я, бо ён йдзе, землю адмыкае, росу выпускае":

Да подай, маці, ключэ,
Да ня мужу отворыці,
Да росою спусціці,
Зародзі, Божэ, жыто,
Да на новэ лето,
Да на жыто, на пшаніцу,
Да на ўсяку пашніцу:
Шоб і ўнізу карэністэе,
У серэдзіне ядроністэе,
А до верху колосістэе.
Велі дзеўкі карагод,
Сам Бог наперод.
А ў карагода сын воеводы,
А ў коромыслі добрые мыслі.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыто Бог родзіць,
А дзе не бувае, там улегае,
Дзе карагод уецца,
Там жыто ўдаецца,
А дзе не бувае, там улегае.

Удзельнікаў карагода частавалі, як калядоўшчыкаў, а пасля таго, як быў завершаны абход сяла, наладжвалася калектыўнае гулянне на тым полі, дзе раней вадзілі карагод. Як бачым, галоўная функцыя юраўскага карагода – аграрна-магічная, асноўныя ж складовыя часткі – выпечка каравая, абход усіх двароў вёскі, шэсце па вуліцы з караваем і граблямі, выхад у поле,

ваджэнне карагодаў, выкананне юраўскай карагоднай песні, калектыўнае частаванне. Адзначым, што адрозненні і спецыфічнасць рытуалаў юраўскага карагода датычаць даволі істотных момантаў, што дазваляе меркаваць аб самастойным характары гэтай мясцовай традыцыі. Можна пагадзіцца з У.П. Анікіным наконт таго, што “лакальнасць можа перарасці ў рэгіянальнасць – самастойнасць, суаднесеную з аўтаноміяй мясцовых фальклорных традыцый” [7, с. 358].

Структура юраўскай абраднасці ў в. Чэрнічы мае падабенства да юраўскай традыцыі, лакалізаванай у в. Хільчыцы. Гэта падрыхтоўка жанчынамі каравая (“перад гуканнем Юр’я збіраліся жанкі ў адной хаце, учынялі коровая, ставілі на веко дзежкі, обсыпалі под веком дзежкі зерном”), упрыгожванне галінак вішні або слівы кветкамі і лентамі, калектыўнае шэсце з караваем у поле, царкоўны малебен на полі (“поп чытае сваю малітву, спявае бажэственную песню, заклінае Юр’я і Госпада Бога, штоб дождычак прайшоў, шоб пшаніца не повяла, шоб яна добра расла”), ваджэнне карагода ў полі вакол хлопца з караваем і граблямі, выкананне песні “Да падай, маці, ключэ”, вяртанне ў сяло (“карагод ідзе спераду, а граблі ўжо пераварочваюць красным фартухом, а як ішлі ў поле, то няслі граблі з зялёным фартухом”), ваджэнне карагодаў на кожным падвор’і (перад тым як выконваць гэты рытуал, пыталі дазволу, што адпаведна выражалася наступнай формулай: “Юр'я прыйшло, свята прынясло, // Адчыні дварыцу, выпусці расіцу. // Ці можно, гаспадар, карагод павадзіць, // Юр’я паспяваць і гаспадароў паслоўляць” (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.), адорванне гаспадарамі ўдзельнікаў карагода, калектыўнае абрадавае частаванне.

У вёсках Пагост, Старажоўцы, Сямурадцы, выганяючы карову на пашу, давалі ей абрадавае печыва “хрэшчык”, які “пяклі на Крашчэнне”. Каб зберагчы ад злых духаў, каля дзвярэй клалі замок з цэпам, “краец хлеба з палаценцам”. У в. Старажоўцы, перш чым выгнаць карову з хлява, гаспадыня “працягвала перад дзвярыма ланцуг, а на парозе клала замок ці якую-небудзь жалезку”, акрапляла пасвечанай вадой, абцірала тканым ручніком, прамаўляючы: “Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай маці пакланюся. Прачыстая Божая маці з прыстолу ўстала, маю кароўку Рабку ў чэрэду ўганяла. Ідзі, кароўка, у чэрэду, а сам Госпад поперэду, сперэду прыпуняе, ззаду падганяе, злога духа не падпускае. Ідзі, кароўка, у чэрэду, травіцу паедай, вадзіцу папівай, а после чэрэды дадому ідзі” (запісана ў в. Старажоўцы).

З вялікай радасцю мясцовыя жыхары чакалі надыходу Вялікадня. Асноўныя рытуалы велікоднай абраднасці, якіх прытрымліваюцца і сёння жыхары Жыткаўшчыны, – гэта фарбаванне яек (“Красіць яйца ў красны цвет пашло яшчэ здаўна. Красны цвет – ета цвет жызні, пабеды жызні над смерцю. Ён напамінае кроў Хрыста, якая была праліта радзі пасення людзей”); асвячэнне яек і “паскі (“У суботу раненько ішлі ў цэркву свеціць яйца, паску, соль, воду, масла і яшчэ што-небудзь”); гульня ў біткі (“З яйцамі гулялі ў біткі. Для гульні выбіралі самыя добрыя яйца”) і качанне яек з горкі (“А шчэ яйца качалі з горкі. Чыё яйцо первым скоціцца, той і пабядзіў”);

распальванне вогнішча, скокі і гульні каля яго (“А вечэром усе збіраюцца: і маладыя, і старыя і ідуць паліць агонь”) (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Яўгеніі Мітрафанаўны, 1056 г.н.). Звернем увагу, што назіранне за ўзыходам сонца – таксама важны момант у структуры велікоднай абраднасці, што пацвярджаецца ўспамінамі інфармантаў: “Раніцай выходзілі на вуліцу, калі ўзыходзіла сонца, і глядзелі на яго. Казалі, што сонца, мабыць, іграе на ўсходзе, пераліваецца рознымі промнямі. Калі сонца грала, то казалі, што гэта к дабру, цёпламу лету, з шчаслівымі вяселлямі ў гэтым годзе” (запісана ў Жыткавіцкім раёне). Сярод павер’яў, звязаных з велікоднымі яйкамі, вылучаюцца наступныя: “калі ў хаце ў гэты год памёр чалавек, дык яйкі зусім не красілі або красілі ў сіні колер” (запісана ў в. Кольна ад Шляга Валянціны Іванаўны); “На першы дзень біліся ў біткі, калі хто не прабівае яйкі, у таго куры не будуць несціся і хварэць будуць у хаце” (запісана ў в. Рудня ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.).

У вёсках Рудня, Запясочча, Сямурадцы, Пагост, Кольна, Перароў і інш. падрыхтоўка да святкавання Вялікадня ўключала пэўныя віды работ, выкананне якіх было абавязковым. Напрыклад, “прыбіралі ў хаце, перамывалі бялізну” (запісана ў в. Кольна), “мылі ўсё ў хатах, сціралі ўсё, бялілі” (запісана ў в. Рудня ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.). Адзначым, што ў сістэме велікоднай абраднасці значнае месца займаюць прыкметы і павер’і. Паводле народных уяўленняў, калі “чалавек устане ў чацверг да ўсхода сонца і памыецца чыстай вадой, то будзе цэлы год чысты і здаровы”. Калі раптам у гэты год памёр хто-небудзь з членаў сям’і, то “яйкі зусім не красілі або красілі ў сіні колер”. “Калі пасха выходзіла румяная, прыгожая”, то, лічылі, “і жыццё сям’і будзе такім” (запісана ў в. Кольна ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1932 г.н.).

Па сутнасці, велікодны абрад валачобніцтва не характэрны для фальклору Гомельшчыны, аднак у в. Сямурадцы, як адзначылі інфарматары, “валачобнікі ў нас по селу ходзілі”. Як падкрэсліла Ганна Пятроўна Лой, 1955 г.н., у мясцовай традыцыі быў распаўсюджаны звычай “насіць валачобнае”: “У нас, напрымер, дзеці хадзілі к хросным. От ужэ маці ў вузелочак положыць і яец, і паску, і кусочак сыра, і кусочак масла. Ну, як булі конфеты, то і конфет трошкі положыць. Да ўжэ збіраліся дзеці, там пяць ці шэсць, бралі гетого вузелочка і ішлі к хроснай маці і к хроснаму бацьку. Ды ўжо хросныя саджалі дзяцей за стол да частавалі. І обратно ложылі ў вузелок больш, чым было положэно”. Гэты ж звычай ў Тураве меў іншую спецыфіку: “Ужэ хросныя ходзяць к сваім хрышчоным у госці”. У в. Хваенск таксама быў вядомы звычай “валачайнічаць”, удзельнікамі якога была моладзь. Як адзначыла Марыя Данілаўна Скрыгалоўская, 1918 г.н., “абавязкова павінна кожная дзяўчына і хлопец зайсці да сваіх хросных маці з бацькам, а таксама да сваёй бабы. Яны насілі валачобны (пасхі, яйкі, стравы іншыя) хросным”.

Памінанне памерлых у першы дзень Вялікадня (у Тураве ж памінаюць нябожчыкаў на пяты дзень Вялікадня), гульня ў біткі, выкананне ў карагодзе песні “Ой, суседочкі, мое голубачкі” (“спевалі бабусю”) – мясцовыя рытуалы

велікоднай абраднасці ў в. Пагост. Што датычыць апошняга звычаю, то, паводле ўспамінаў Валянціны Пятроўны Маркевіч, 1939 г.н., "у пост і на Велікдзень спевалі "бабусю". На селе рабілі круг з 15 чоловек, у серэдзіне "бабуся" – жонка. Чатыры жонкі ходзяць к бабусі ў круг, а тыя не пускаюць. Яны спеваюць, што "бабусі" гарэлкі дадуць і боршчу, кашы, пампушак, а тыя спеваюць: "Мы бабусі не дамо... Мы самі поемо...".

Праз сем тыдняў пасля Вялікадня жыхары Жыткаўшчыны святкавалі Тройцу (Сёмуху), з якой, напрыклад, у в. Буразь быў звязаны абрад ваджэння куста (лічыцца, што гэтая абрадавая з'ява больш характэрна для фальклору заходняга Палесся). Паводле сведчанняў жыхароў, "з кляновых вянкоў робілімо куст. Водну дзеўку нараджаемо кляновымі галінкамі, на голову кляновы вянок надзяваемо і ўсю обвязваемо галінкамі. Калі нараджалі куст, то пелі песню:

А на Тройцу рана,
А на Тройцу рана
Дзеўкі радзяць куста,
Куста радзілі,
Тройцу прасілі …" (запісана ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н.).

З дзяўчынай, якую ўпрыгожвалі як куст, заходзілі спачатку на падвор'і гаспадароў, а затым ішлі вадзіць карагоды ў поле. Выкананне карагода і адпаведных песень, у якіх былі праілюстраваны асноўныя моманты абраду ваджэння куста, мелі на мэце паспрыяць ураджайнасці нівы, пладавітасці свойскай жывёлы, пажадаць здароўя і сямейнага дабрабыту гаспадарам. У в. Дуброва таксама выбіралі прыгожую дзяўчыну на ролю куста, "абвязвалі яе бярозавымі і кляновымі галінкамі і вадзілі па дварах" (запісана ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Як і ў іншых раёнах Гомельскай вобласці, на тэрыторыі Жыткаўшчыны быў распаўсюджаны звычай упрыгожваць зелянінай падвор'і: "На Тройцу ўсягда ўкрашалі хату і іконы клёнам і абавязкова ернікам. Насупраць кожнага акна ставілі ссечаныя бярозкі, а насупраць дзвярэй – дзве бярозкі па баках" (запісана ў в. Кольна ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.). Што да траецкіх абрадаў, то даўней выконвалі і абрад завівання вянкоў, на якіх варажылі пра свой лёс ("Таксама завівалі вянкі. Кожны вянок прызначаны быў кожнаму чалавеку: маці, бацьку, сястры, брату. Праз тыдзень, калі вянкі не засыхалі, то гэтаму чалавеку, чый быў вянок, абяцалася вялікае шчасце, а калі былі засохлымі – век яго будзе кароткі" (запісана ў в. Рудня ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.)), і абрад кумлення ("На Тройцу проходзіў абрад кумлення, але зараз яго няма. Дзве подружкі проходзяць праз завітые з бярозак ворота. Потым яны цалаваліса да куміліса. Да ўжэ котора з іх выходзіла перша замуж да нараджала дзіця, то ўжэ брала другую собе за куму") (запісана ў в. Сямурадцы ад Лой Ганны Пятроўны, 1955 г.н.)).

Сціплыя звесткі былі запісаны ў палявых экспедыцыях па русальнай абраднасці. Напрыклад, у в. Рудня выбіралі на ролю русалкі дзяўчыну, якая

“сама згаджалася”, упрыгожвалі яе зялёнымі галінкамі і кветкамі ў лесе (запісана ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.). Сярод мясцовых рытуальных дзеянняў вылучаюцца наступныя: шэсце з русалкай з лесу ў вёску, выкананне песень (звычаю абходу хат не было), ваджэнне карагода на вясковай вуліцы, выбар русалкай пары, праводзіны русалкі з яе абраннікам да жыта, раскладанне вогнішча, зняцце з галавы русалкі вянка і закідванне яго ў агонь, уцёкі русалкі ў жыта, затым у лес (запісана ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.).

Адметнасцю летняга каляндарна-абрадавага фальклору Жыткавіцкага раёна з’яўляецца Купалле. Напрыклад, пад назвай “купальны Іван” святкуецца яно ў в. Кольна. Хоць і нельга сказаць, што гэты від летняй абрадавай паэзіі захаваўся ў мясцовай традыцыі ў пэўнай сістэме рытуалаў, але ўсё ж асобныя з іх бытуюць. Гэта збор лекавых траў і кветак і іх засушванне, распальванне вогнішча (абавязкова прымацоўвалі кола (як салярны сімвал свята) на жэрдцы, якую ставілі пасярод агню), скокі цераз вогнішча (“шчыталася, што так чалавек ачышчаецца ад злога духа”), спальванне непатрэбных рэчаў (“жанчыны кідалі пабітыя гаршкі, другі посуд, а мужчыны – непатрэбныя зломаныя прылады працы”). Паводле этнаграфічных звестак, запісаных пра Купалле ў в. Рычоў, можна таксама вылучыць асноўныя рытуалы, звязаныя з яго святкаваннем: распальванне вогнішча (“Запальвалі вялікі агонь”), спальванне пудзіла (“рабілі жанчыну са шматок і пасля прывязвалі яе к жэрдцы, … а далей ужо тую жонку са шматок палілі, як бы ведзьму, якая ходзіць на Купалу по дворах”), пераапрананне ў маскі ведзьмы, чорта, русалкі, вадзяніка (“Людзі пераапраналіса ў Івана і Купалінку, ведзьму, чорта, русалок і вадзяных”), ваджэнне карагодаў вакол кастра (“Кругом агня вадзілі карагод і спявалі песні”), варажба моладзі на вянках (“Плятуць на Купало вянкі, кідаюць на воду і хлопцы іх ловяць, а дзеўкі глядзяць, хто чый вянок зловіць, того будзе і пара”, пошукі кветкі-папараці (“Ох, яшчэ ж ховалі як бы папороць-кветку, а пары закоханые яе шукалі”, скокі праз вогнішча (“Бліжэй к ранку прыгалі праз огонь по парах”), збор лекавых раслін і іх асвячэнне ў царкве (“На Купало ішлі по зелья, рвалі от усякіх хвороб. У цэркві свяцілі зелье”), купанне ў рацэ (“На досвітку купаліса ў рацэ, каб здоровым буць, шчэ козалі, шо на Івана Купального трэба ўмыцца росою, бо чалавек набірае моцы і маладзее”, калектыўнаеназіранне за ўзыходам сонца (“А заўяршалі мы свято сустрэчаю сонца”) (запісана ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.).

Качанне жанчын па расе – адзін з адметных момантаў святкавання Купалля ў в. Буразь: “На досвітку раздзенецца жонка і качалася ў расе без сорочкі, як маці родзіла” (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.). Ваджэнне карагодаў вакол купальскага вогнішча, паводле тлумачэнняў жыхароў в. Сямурадцы, мела на мэце засцярогу ад нячыстай сілы, вызваленне ад усяго “нечыстого, шо за год назбіралосо” (запісана ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н., і інш. жыхароў).

Летні цыкл земляробчага календара Жыткаўшчыны завяршалі жніўныя абрады і песні. Звычайна жалі жыта талакой: “У кого зямлі богато, то ўжэ ён

нанімаў сабе толоку” (запісана ў в. Чэрнічы ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). Традыцыйна ў жніўнай абраднасці вылучаліся зажынкі, уласна жніво і дажынкі. У в. Чэрнічы для выканання рытуалаў зажынання жыта выбіралі жанчыну, “самую-самую такую добрую жонку, шо вельмі добра жыве, шо ў іх дзеці ўсе здоровыя, шо ніхто ў сям’е не ўмёр і сама яна не разводная, і ўсе ў яе добра вельмі ў сям’е клеіцца” (запісана ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.). Першы нажаты сноп прыносілі дахаты і захоўвалі на покуці да той пары, пакуль не закончыцца жніво. Падобнымі народнымі правіламі кіраваліся, калі выконвалі і дажынкавы абрад пад назвай “барада”: “Калі былі дажынкі, то выбіралі самую рабацяшчую жанчыну. Яна зжынала паследні сноп” (запісана ў в. Кольна ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.). Варта адзначыць, што жніўныя песні шырока бытуюць на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна. Як слушна падкрэсліў К.П. Кабашнікаў, “у жніўных песнях, як і ў калядных і веснавых, тэма хлеба, жыта, жытняга поля застаецца цэнтральнай. У гэтых творах увасабляецца прырода, паэтызуецца жніво, паэтызуецца таксама праца жней і самі жнеі: яны прыгожыя, працавітя, маладыя, у іх сярпочкі залатыя. Але ў той жа час песні апавядаюць аб тым, што праца жней – цяжкая праца:

Ой, наш пан баран-баран,
Да не пускае дамоў зарань,
А наша ж пані авечая
Да дзержыць з ранку да вечара” (г. Тураў) [4, с.706].

Адметнай з’явай восеньскага цыкла земляробчага календара Гомельшчыны з’яўляецца абрад “Жаніцьба коміна”, запісы звестак пра які зроблены ў вёсках Жыткавіцкага і Лельчыцкага раёнаў. Гэты абрад “прымяркоўваўся да дзвюх каляндарных датаў: увесну – да Фаміного тыдня (паводле А.Я. Багдановіча), увосень – да дня Сымона / Сямёна Стоўпніка (Стаўбуна) 14 верасня (1 верасня ст.ст.)” [10, с. 167]. Як адзначыў аўтар-укладальнік навукова-папулярнага выдання “Беларускі народны каляндар” (1993) Алесь Лозка (звесткі аўтара пра гэты абрад змешчаны ў кн. “Земляробчы каляндар” (Мн., 1990): “З усяго дзясятка вядомых нам запісаў абраду лепшай і паўнейшай нам уяўляецца публікацыя П. В. Шэйна “Жаніцьба коміна”, матэрыялы даслаў у 1883 г. настаўнік Пінскага рэальнага вучылішча В.Л. Грудніцкі” [11, с.268 – 269]. Сучасныя запісы звестак пра абрад “Жаніцьба коміна” зроблены ў вёсках Пагост, Любавічы, Чэрнічы, Людзяневічы Жыткавіцкага раёна, а таксама ў вёсках Дзяржынск, Тонеж Лельчыцкага раёна. Гэты архаічны абрад вядомы і пад іншымі назвамі: “Жаніцьба пасвета”, “Жаніцьба лучніка”. Паводле ўспамінаў жыхаркі в. Пагост Кацярыны Аляксееўны Панчэні, 1941 г.н., калісьці яе бацька звяртаўся да коміна са словамі: “Згінь, нячысты дух! Каб Бог спас худобу, каб захаваў дзяток маленькіх і не забыў нас, старэнькіх!” Паводле ўспамінаў жыхароў в. Любавічы, гэты абрад праводзілі ў іх мясцовасці, калі “бацька заканчваў сеўбу” (запісана ад Матарас Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.).

Этнаграфічныя звесткі пра абрад “Жаніцьба коміна” дазваляюць узнавіць яго асноўныя структурныя кампаненты: падрыхтоўка і ўпрыгожванне коміна (“У хаце рабілі комін. Яго сплятали з дубцоў, абмазвалі глінай, абцягвалі мяшком, а потым у столі рабілі дзірку”) (запісана ў в. Любавічы ад Матарас Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.)); запальванне свечкі на пасвеце (“вялікая квадратная рашотка”), які падвешвалі; святочная вячэра; просьба-зварот гаспадара, які “прасіў нябесныя сілы, душы продкаў, каб яны дапамаглі захаваць узімку жывёлу, азімыя, сабраны ўраджай” (запісана ў в. Людзяневічы ад Кот Вольгі Віктараўны, 1926 г.н.); выкананне песні, адрасаванай “коміну-жаніху”. У в. Пагост “жанілі комін” падчас вячорак (“попрадок”), удзельнічалі ў выкананні абраду не толькі дарослыя, але і дзеці, якія таксама абсыпалі комін зярнятамі, што павінна было паўплываць на добры ўраджай зерневых культур: “Ето шоб ек абсыпаюць коміна зернетамі, гарбузікамі, то дзеці праворнейшыя і больш хапаюць зернет, а по зернетах глядзелі, які ў кого будзе ўражай жыта ці пшаніцы” (запісана ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.). Аграрна-магічнае значэнне надавалі рытуалам і песням гэтага абраду ў в. Рычоў, дзе “коміна радзяць дзеразой, благаслаўляюць яго, … просяць у Бога, каб жыта радзіла і пшаніца на ўсяку пашніцу” (запісана ад Кавалевіч Кацярыны Васільеўны, 1930 г.н.).

Праведзены аналіз прапанаваных асобных узораў мясцовых апісанняў каляндарных абрадаў і звычаяў дазваляе ўбачыць, як бытуе агульнаэтнічная традыцыя на рэгіянальна-лакальным узроўні, якімі асаблівасцямі адрозніваюцца мясцовыя абрадавыя з’явы.

***Спіс выкарыстаных крыніц***


1. Гурскі, А. І. Святкаванне Каляд на Беларусі / А. І. Гурскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 95 с.

2. Кавалёва Р. М. Гістарычныя карані “ваджэння казы” на Каляды // Свет славянскага фальклору. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 27-44.

3. Покровская, А. В. Земледельческая обрядность // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Ист. корни и развитие обычаев: [Сб. ст.] / АН СССР, Ин-т этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. – М.: Наука, 1983. – С. 67-90.

4. Кабашнікаў, К. П. Народная творчасць Жыткавіцкага раёна // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Жыткавіцкага раёна. Рэд.-укл. В.Р. Феранц. – Мінск: Ураджай, 1994. – С. 704-710.

5. Юдин, А. В. Русская народная духовная культура / А. В. Юдин. – М.: Высшая школа, 1999. – 331 с.

6. Агапкина, Т. А. Этнографические связи календарных песен. Встреча весны в обрядах и фольклоре восточных славян/ Т. А. Агапкина. – М.: Индрик, 2000. – 336 с.

7. Аникин, В. П. Теория фольклора: Курс лекций / Моск. гос. ун-т им. М.В. Ломоносова. Филол. фак-т. – М.: [Филол. фак-т. МГУ им. М.В. Ломоносова], 1996. – 406 с.

8. Агапкина, Т. А. Дерево плодовое // Славянские древности. – М.: Международные отношения , 1999.
9. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004.
10. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.
11.Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіф., сістэм. матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; Уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса; Рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990 – 405 с..

## ЗІМОВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

**Піліпаўка**

На Піліпаўку ў нас ваўкі ходзяць. На гулянкі баяліся хадзіць, таму і збіраліся ў якой-небудзь хаце. Святла не было, была керасінавая лампа, да і то не ў кожнага. Быў пасвет, а вакруг гэтага пасвета садзіліся жанчыны, дзеўкі маладыя шылі, вышывалі, пралі. Спявалі песні народныя, хто якія знаў, такія і спявалі.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

Піліпаўку моцна не святкавалі. Але ж пост людзі саблюдалі. У час Піліпаўкі варылі саладуху: жытнюю муку залівалі кіпятком, давалі трохі постаяць. За гэта ўрэмя яна трошкі падкісала, набывала салодзенькі ўкус. Потым яе варылі і ей піталіся. Другім посным блюдам была абязацельна каліна. У летні час за ёй хадзілі на абалонне, збіралі, сушылі, а потым ужо варылі і елі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Збіраліс на вечоркі. Былі самые доўгіе ночы, то ўжэ цэлы вечор прадуць усе дні, а ў пятніцу не пралі. У пятніцу маталі ручайкі з верэцён, у моткі маталі, а дзеці малые лён мялі, мучкі мукалі. До света ўсегда ўставалі, особенно маці ўстане зараней шчэ да тожэ прадзе. Стараліса, шоб напрасці, шоб кросна ж вуткаць. Кросна ж ткалі ў Велікі пост, ну, после Розтва, трэба было напрасці столькі, шоб на основу хваціло, бо тады ж ніток не было, шоб купіць, усё робілі своімі рукамі.

У пятніцу не ткалі, тому што не можно було прасці. Грэх, шчыталі. Дайжэ така ікона була, шо верацёна позатыканые етые шо прасці, нельзя прасці. Ніхто не праў. У суботу работалі, прыбіралі, бо тагды ж не було сціральных машын, трэба ўсё рукамі посціраць, помуць усё, бо подлога ж не крашэна.

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Русай Ядзвігі Уладзіміраўны,***
***ад Кулеш Кацярыны Іванаўны, 1938 г.н.***

Піліпаўка начынаецца 28 наябра. Піліпаўка цягнецца не адзін дзень, а до 7 января. Ніхто з людзей не назначаў у етае врэмя свадзеб, бо шчытаецца, што на Піліпаўскі пост ваўкі гуляюць свадзьбы. Еслі сыдуцца маладыя, то і будуць жыць, як ваўкі, сварыцца будуць. Піліпаўскія вечары самыя доўгія, бо людзі хаваліся ў хаты, як толькі пачынало цямнець, і ўночы ніколі не выходзілі на ўліцу: баяліса ваўкоў. Воўкі ў этые вечары хадзілі цэлымі стаямі, і не дай Бог папасца ім на вочы. Часто заходзілі ў двары, маглі сабаку загрызці, скаціну екую-небудзь.

Дак, вот раньшэ піліпаўскімі вечарамі жэншчыны ткалі, пралі, адзежу шылі. А хто маладзейшыя, то збіраліса на вечоркі ў екой-небудзь адной хаці. Там і аставаліса начаваць. У народзі дажэ іе прымаўка: "Піліп дзяцей адзявае". Ткалі з льна.

Маладыя пазбіраюцца і начынаюць: хто пяе, хто гадае. А гадалі так. Каб узнаць, ці будзе новая сем'я, ці не, гадалі на палачках высушанага лёну. Трэба ўзяць дзве палачкі, падпаліць і кінуць іх угору. Еслі ены збліжаюцца между сабою – значыць, павяжуць рукі маладых свадзебным рушніком, еслі не – седзець у дзеўках ішчэ год.

Шчэ гадаюць пра тое, якой з дзяўчын маладых будзе лепш замужам. Запальваюць 2-3 лучыны і глядзяць: у каго лучына будзе гарэць ярка, тая і будзе жыць добрэ.

А каб узнаць, з кім свадзьбу згуляеце, у дзень светого Ануфрыя, чэрэз адну ноч, сыпалі пад падушку ячмень і гаварылі: "Светы Ануфрыю, я ячмень сею, дай жа ты мне знаць, з кім я буду жыць". А шчэ любілі загадваць загадкі. Ну, напрымер, зубасты, а не кусаецца (граблі). Маленькі, гарбаценькі, усё поле абскакаў (серп). Кругленькі, маленькі, а за хвост не падняць (клубок).

Я ўсім гаварыла, штоб песні пелі разные. Напрымер, "Ох, і сеяла Ульяніца лянок".

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Яўгеніі Мітрафанаўны, 1956 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Почынаецца Піліпоўка 28 ноября і цягнецца до самых Каляд. 4 дзекабра (Піліпаўскі пост) Введзенье празднік. Кажуць, Введзенье сваі наведзе Варвары, Савы, Міколы. На Варвары ходзілі пастухі, шо пасцвілі короў, по хатах, ім давалі варэнікі. А на Савы, увечары, куцця Мікольная, вячэра посная. На Міколу ідуць у цэркаў, а прыйдуць, то, у кого е хлопцы ўзрослыя, сабіраюцца по хатам у компаніі. Ім родныя даюць піраг, сала кусок, бутылку. Наймаюць мужыка, который можэ спяваць. Хлопец, которы дружыць з дзеўкаю, заказвае ей песню. Погулялі на Міколу, потым собіраюцца к Рожэству, купляюць воск на свечкі дзеўкі.

Яшчэ ў Пілiпаўку дзеўкi збiраюцца по хатах да прадуць. Кажуць, на Пiлiпаўку воўкi вуюць да по сёлах ходзяць. Шчэ кажуць, шо Пiлiп дзяцей адзявае. А шо ў Пiлiпаўку спрадзеш, тое ў Вялiкi пост сатчэш. Пiлiпаўскiя ночкi прадуць сорочкi. Калi ў Пiлiпоўку навiсь на дзерэвi, то будзе хлеб. От. А як сядзелi ўвечары i пралi, то спявалi песнi:

Праду, праду ды кудзелiцу,
А галоўка балiць.
Як кiну я да кудзелiцу
Усё й пад кровраць.
А сама пойду, молодзюсенька,
У корчомку гуляць.
Як зап'юся, загуляюся
На чатыры днi,
А на пятый жа дзянёчак
У двор прывялi.
Дзевярочык-лебядочак
У варотах стаiць.
– А, нявестухна, ты лябёдухна,
Прысцеражыся.
Прывезена тры вазы лазы–
I ўсё для цябе.
Дзевярочык-лебядочак,
Будзь ты за мяне,
А пашыю я да кашулюхну–
А ўсё для цябе.
Як пачуў жа ды мой мiленькi,
У варотах стаяў:
– А ў етых тры вазы лазы –
У печы папалю.
А я ету кашулюхну
I сам знашу.

***Запiсана ў в. Запясочча***
***ад Чыкiды В.С., 1939 г.н.,***
***студэнтам Кувiкам А.***

Пiлiпаўка перад Калядамi, не елi скаромнае. Песнi ўсякiя спявалi:

Я, калi малiну ламала,
Пацiхоньку вячэру варыла.
Вот вячэра мая закiпае,
А мой мiлы парог пераступае.
– Давай, мiлы, мы сядзем на пароге,
Раскажы, што ты чуў у дароге.
– Чуў я, мiла, такую навiну,

Што ты маеш малую дзяціну.
– Начавалі цыгане,
Аставілі мне дзіця на лаве.
Давай, мілы, коней запрагаці
Ды паедзем цыган даганяці.
– Зачэм, міла, коней нам таміці,
Будзем праўду з табой гаварыці.
– Начаваў казачок у меня тры ночы
Да аставіл мне карые очы.

***Запісанаў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

На Піліпаўку табунамі воўкі ходзяць і жэняцца.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

**Каляды**

Рыхтуюцца да Калядаў у нас вось як: прыбіраюцца ў хаце і абавязкова вараць куццю з макам або мёдам. Калі куцця зварылася, то гаршчок з кашай ставяць у вугал на сена. На куццю запрашалі мароз: “Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Калі прыйдзеш вясною, то будзем жалезнымі пугамі біць!”

Сцялілі пад скацерць салому. Калі выцягвалі поўны колас, то год будзе багаты, калі не поўны колас выцягвалі – год бедны будзе.

У час шчадравання пераапраналіся ў цыгана, дзеда. Каза была і механош. Насілі ў нас каня замест звязды. Прыходзілі пад акно і пелі гаспадару песню, прасіліся ў хату: “Добры вечар, гаспадару! Ці зашчадраваць? Ці так каляду даць?”

Гаспадар запрашаў у хату. Ходзілі шчодрыкі ў хату і спявалі песні.

Механош насіў мяшок. У нас на калядаванне давалі яму хлеб, сала, грошы, хто што мог. Потым зноў спявалі песню і прытанцоўвалі: “Механошаму – пірог харошы, рэшата аўса, наверх каўбаса!”

Пасля гэтага гаспадар налівае шчодрыкам па чарцы, дзякуе ім. І шчодрыкі таксама дзякуюць і з песняю выходзяць з хаты.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

Каляды празнуюць з 6 па 22 января. У етые дні не трэ було нічога рабіць, толькі што ладзіцца па хазяйству. Іе тры Каляды ці тры куцці. Першая куцця була 6 января, яна называецца яшчэ “багатаю”. Увечары трэба ўсёй сям’і сесці каля стала. На ету куццю можна есці ўсё, кроме мяса і каўбасаў.

Глаўнай была куцця, яе варылі з ячных круп, можна мёдам падсаладзіць. Трэ було згатаваць 12 страў і кажную трэ папробуваць. Каб у хаце було шчасце, хазяйка засцілала стол жытам, бо Ісус Хрыстос нарадзіўся ў яслях, і засцілала белай скацеркай. Хазяін доўжан сесці на покуць, а каля яго жонка і дзеці. Ну, ужо маліліся за сябе, за тое, каб було ўсё дагледжана, каб жылі багата, потым елі. Усё з’едаць не трэба, трэба пакідаць дзядам, бо іх душы прыходзілі на святу вячэру. Можна було гадаць. Хазяйка выцягвала з-пад скацерці сцяблiну сена: калі яна була доўгая, то будзе высокі лён. Хазяін выходзіў на вуліцу і глядзеў на неба, калі многа зорак, значыць, будзе многа грыбоў і прыплод у хазяйстві. Калі була мяцеліца, будуць раіцца пчолы. У еты дзень хадзілі калядоўшчыкі. Адны хадзілі з звяздою – Божая Звязда, якая запалена ў небі, калі радзіўсь Ісус Хрыстос. Яны хадзілі ў кажду хату і пелі песні. Пасля таго, як прапеюць, нада даць ім “каляду”.

Шчэ хадзілі калядоўшчыкі з казою і разнай жыўнасцю, але глаўнай була каза, бо яна бароніць ад бяды і прыносіць багаты ўраджай. У казу і другіх звярэй перадзяваліся людзі. Яны пелі, скакалі, жалалі шчасця, багацтва, дабра.

Праз нядзелю пасля першай куцці сям’я зноў садзілась за стол. То ўжэ была другая куцця. Яе называлі яшчэ і стары Новы год. Празнавалі 14 января. Хазяйка варыла куццю ў тым гаршку, што і первы раз. У еты раз яе запраўлялі малаком ці маслам. У еты вечар елі ўсё, што було і што хацелі. Трэ було абязацельна папробуваць куцці. Дзяўчаты гадалі, дзеці калядавалі па хатах, пелі песні, шчадравалі.

Увечары, праз дзве нядзелі, недзі 18 января спраўлялі трэцюю галодную куццю. Яе варылі ў тым жа гаршку, што і тыя дзве. Яе елі нішчымнай, і ўсе стравы елі таксама нішчымнымі, бо калі не з’ясі жырнага, дык увесь год не будзе балець жывот. У еты вечар маладыя гулялі, спявалі песні. Хазяйка пасля паследняй куцці прыбірала сена, што ляжала дзве недзелі на стале і давала худобе, бо яна засцерагала яе ад хвароб.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Да Каляд рыхтаваліся зараней: білі свінку, прыбіраліся ў хаце. У дзень Каляд варылі куццю – самае глаўнае блюда. Калі зварвалася куцця, то яе ставілі на покуць. Сюды ж клалі і варашок сена. Пакуль не звечарэе, куццю ніхто не трогаў. Калі паяўляліся на небе зоры, уся сям’я сабіралас разам. Потым ужо гаспадыня на стол сабірала. Перад гэтым на стол лажылі сена, а паверх – палатняную скацерць. Тады ўжо ставілі пасярод стала куццю, а за ёй – астатнія блюды. Куцця дзялілася гаспадаром. Першая куцця называлася беднай і варылася на вадзе. Другая куцця – багатая. Тады ўжо варылі яе на масле, елі мясо, сало. Трэцяя куцця – галоўная. Куццю варылі з ячменя, пшаніцы – у каго што была. Калядныя дні працягваліся да 19 января. У вечар Каляд пераапраналіся і хадзілі па хатах. З сабой вадзілі казу і насілі звязду або ёлку са свечкамі. Калі хадзілі з казою, то спявалі песні пра жыта:

Дзе каза нагой – там жыта капой,
Дзе каза рогам – там жыта стогам,
Дзе каза туп-топ – там жыта 7 коп.

Калі шчадроўшчыкі падыходзілі да хаты, то звярталіся да гаспадароў з такімі словамі: “Добры вечар, пан гаспадар! Ці так падарыш, ці нам паспяваць?” На Каляды гулялі тры дні. І яшчэ: калі варылі куццю, то звалі: “Мароз, Мароз, хадзі куццю есці”. Пры гэтым зачэрпвалі ложкай куццю і стукалі ёй па сцяклу вакна. А перад тым, як есці саму куццю, яе верх збіралі і аддавалі курам, каб вяліся. Сена, што было на покуці і на стале, аддавалі жывёле: каб здаровай была і вялася.

Асобенна моцна ждалі Каляд маладыя ды незамужнія дзеўкі, бо гадалі адна адной на любоў, шчасце, і гэта было праўдай. Гадалі так. Абдымалі штыкеціны ў агароджы: калі парны лік, будзе дзеўка ў пары. Капалі свечкай на ваду і глядзелі, што атрымаецца. Ці яшчэ: дзеўкі апоўначы шлі на расходнія дарогі, нагіналіся і бралі ротам траву, што вытырквалася з-пад снегу. Потым, з травой у роце шлі дамоў і ні з кім ні гаварылі. Калі прыходзілі дамоў, траву клалі пад галаву і лягалі спаць. Хто прысніцца – той і суджаны. Або, перад тым, як легці спаць, ставілі пад кравацьь кружачку з вадой, а наверх клалі палачкі – рабілі “мосцік”. Гэтую кружачку ставілі ў тым месцы, дзе была галава. Калі дзеўцы снілася, што хлопец вядзе яе праз гэты “мосцік”, то ён – суджаны. Пры гэтым, як легці спаць, дзяўчына прыгаворвала: “Дай, Божа, прысніцца, з кім у пары буду”.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

У последні дзень посту старые і дзеці до заходу сонца нічого не елі. Вечэром варылі куццю з ячных круп. На стол клалі солому і сено, шоб быў добры ўрожай, шоб хватало еды ўсім: і собе, і жывелі, шоб добрэ зерновые вырослі. У гэты вечор ходзілі калядоваць, ходзілі і старые, і малые. Перэдзенуцца, нарадзяць козу і ходзяць по хатах, а хто і под вокном сплваў.

Заходзяць у хату і пытаюць:

Добры вечор, пане господару!
Ці можна вам песні проспяваць,
Вашу хату повеселіць?

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Бобрык Тацяны Максімаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

Да Каляд гатовіліся зараней. На Каляды галоўнай стравай была куцця. Першая куцця была постна, а на Крашчэнне – мясная. Перад тым, як ставіць

куццю на стол, на стол лажылі сена і накрывалі палатняным абрусам. На першы, другі і трэці дзень не спявалі, а толькі на Шчадрэц, 14 января. Да Каляд людзі посцяць, едзяць толькі рыбу. После Новага года ўжо елі бліны, сыр, масло – у мясаед. У вечар Каляд, калі варылі куццю, на стале заўсёды было 12 страў, у том чысле і напіткі. На Шчадрэц маладзёж збіралася і хадзіла калядаваць. Да калядавання яны падрыхтоўваліся зараней.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Перад старым Новым годам трынаццатага студзеня ў 12-00 трэба ўзяць 3 каты і вынесці на расходныя дарогі і пусціць іх. Праз тры дні збудзецца пажаданне.

Перад Новым годам мялі хату, смецце кідалі ў лапаць і шлі на дарогу. І каго першага сустрэнеш, то так будзе сужаны звацца.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Каляды атмячаліся ў нас 7 студзеня. Іх усе чакалі і стараліся сустрэць добра. Пяклі бліны, рабілі халадзец, хто мог, рабіў каўбасу. Абязацельна куццю варылі. Каша на ўсе тры Куцці варылася ў адным і тым жа чыгуну, і нельга было спрабаваць да таго, як селі за стол. Пад скацерць лажылі сена, а пад сена трэба было палажыць яшчэ грошы. Гэта для таго, каб грошы вяліся ўвесь год, каб не пазычаць, каб усё ў сям’і было добра.

Вечарам хадзілі калядаваць. Надзявалі цярноўкі (хусткі з цвяткамі). Часта калядоўшчыкі вадзілі з сабой “казу”, рабілі гэта хлопцы. Паробяць рогі, хвост, выварочвалі кажух і хадзілі па хатам, спявалі песні. Зорку з сабой не насілі. Калі хадзілі калядаваць, то раздавалі насенне жыта. Давалі па 2-4 у руку. Або сыпалі зерне ў хату. Гэта для таго, каб жыць добра было.

Дзяўчыны на Каляды гадалі. На Каляды забаранялася рабіць якую-небудзь работу. Страліся не біць талерак, бо будуць біцца ўвесь год.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Беруніч В.***

На палку прымацоўвалі пяціграннную звязду, якая пэўным чынам круціцца. Звязда падсвечвалася прымацаванай да палкі свечкой. Хадзілі з ей гуртом пад вокна хат і спявалі песні:

Звязда чудно воссіяла.
І тром царам пуць паказала,
Над Верцепом стала!

Дзяўкі хадзілі асобна – без звязды, а хлопцы асобна – са звяздой. Пры падыходзе да хаты звярталіся да гаспадароў: “Можна спяваць?” Гаспадар запрашаў у хату. 7 студзеня песні спяваюць на Раздво.

Господ Троіцу возлюбіў,
А Варвару восхваліў.
Клічэ Господ з нябёс:

–Скрыйсо, Ворваро, скрыйсо!
Бо едзе оцец і з войны,
Оцец цебе погубіць,
Мечом голову отрубіць.

Бежыць Ворваро, бежіць,
Перед ёю гора стоіць.
–Гора, расступіса,
Ты, Ворваро, скрыйса.
Гора не расступіласа.
Варвара не скрыласа.

Бежыць Варваро, бежыць,
Постушкі оўцы посуць.
–Вы постушкі, молойцы,
Не кажыце моему айцу.
Бо вон мяне погубіць,
Мечом голову отрубіць.

Которы сказаў,
Той каменем стаў,
А которы змаўчаў,
Той светым стаў.

Бежыць Варваро, бежыць,
Перед ёю гора стоіць.
Гора не расступіласа.
Варвара не скрыласа.
Толькі Варвара за гару,
Айцец яе за галаву.

За волосы ўзяўшы,
К каню прывязаўшы,
І по пуці цягаўшы.
Кліча Варвара Госпада і з нябёс.
–Церпі, Варваро, от днесь,
Церпі муку, як і я,
Будзеш нявеста мая.

Калядоўшчыкі заканчывалі  пеніе прымаўкамі: “Дай, Божа, каб год даждалі, да і зноў спявалі!”  Калядоўшчыкаў частавалі каўбасамі, салам, цукеркамі, рэдка–грошамі.

7 студзеня было “Ваджэнне казы”. Маску казы рабілі з бумагі. Прымацоўвалі на твары ніткай ці матузкай.

Галоўная маска, яна абазначала багацце, дастатак і ўраджайнасць. Для казы выбіралі падвіжнага, здатнага на жарты хлопца. Каза была цэнтрам свята. Яна кідалась на хлопцаў, на гаспадароў, бодала рогамі дзяцей, зазірала под стол, у подпечак.

Каза: “Як я захочу, мур перескачу і капыцечка не ўмачу”. Дзеўкі спявалі:

Рана, рана куры попелі.
Пораней курей Наташка ўстала
І коску часала.
Зачасаўшы коску,
Пойшла ў цэркаў.
Зустрэлі яе тры панічыкі,
Пытаюць яе: “Чыя, ты, дачка?
Ці ты, папова, ці ты, дзьякова?”
“Я ні попова, ні дзьякова,
Я Юрына дочка!”

Калі пелі, устаўлялі прозвішча гаспадара і яго дочкі.

Калядоўшчыкі заканчывалі пеніе прымаўкамі: “Будзь здарова, красна пані”, “Дай, Божа, каб год даждалі да і зноў спявалі!”

На Каляды абвязвалі “сад” (пладовыя дрэвы), каб зародзілі на другі год.

Калі на Раздво пойдзе снег і завісне на галле дрэў, будзе год ураджайны і грыбны.

Перад Новым годам, 13 студзеня, на Шчадрэц першы раз запрягаюць маладых каней, каб аб’ездзіць. Гаварылі: “Шчадруюць каней”.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

У нас пачыналіся Каляды, ужэ строіліся к сёмаму января. Сёмае января – гэта вялікі празнік, спяваць ідом, калядаваць. Кермаш у нас па закону на Ражаство, только яго пачыналі 9 января. А перваго па закону божаму рабілі Каляды. Вечарам сядзьмога часла сабіраліса, ідзём пад вокнамі шчадраваць. Ну, як абычно каждый чалавек у нашым сяле страміўса, каб не міналі іх хаты. Калі хату іх мінуць (двор), значыць, гэта прыкмета плохая была. Дажэ выбігалі і крычалі: “Не мінайце маёй хаты!” Ходзяць і старыя, і малыя: “Добры вечар, святы вечар. Ці запець песню?”

Гаворацъ, на шчадрэца, эта чатырнаццатага январа, можна кінуць сто коп і прыказваць. На Ражаство перадзіваліса хто ў цыганку, хто як, у сваім народным наражаліса, у вялікія чарноўкі, хто раскрашваўса трохі (бураком шараваліся).

А козу ў нас вадзілі только ўжо трынаццатага пруці чатырнаццатае. Вадзілі козу, бусла, мядзведзя і сароку. Як вялікі снег, сарока ж не можэ скакаць на двух нагах, то хлопцы насілі яе і гармошку, і барабан. Каму пападзе доля няшчасна насіць цэлы вечар сароку, той і дзень цэлы носіць. Калядоўшчык водзіць за павадок казу і гаворыць: "Козанька, прайдзі па хаце, паглядзі, у печ загляні, мо ты скорам учуеш". Каза ходзіць, а павадыр камандуе: "Покланейса хозяіну!" Хозяін прыспявае песню: "Го-го, каза, го-го, шара, дзе ты сала дзела?" А каза ў то врэмя падае. Павадыр гаворыць: "Устань, козачка, не ляніса, хазяіну пакланіса, ты зачула скорам, хай табу будзе сорам". І тады ўжо козачка замекае і падымаецца. Хазяін прыносіць пачастункі. Даюць так, што другі раз бяруць торбу вяліку, з палатна сшыту, і ў яе ўжо не лезе. Надаюць і бутылак, і сала, і каўбасы. Заходзілі ў кожную хату, бо, кажуць, грэх мінаць. Забаранялася ў такія хаты хадзіць, дзе памёр хто з родственнікаў і жалоба была. І ў той двор не хадзілі спяваць.

На Ражаство спявалі:

Ой, рано, рано куры попелі,
Святы вечар, да й добры вечар.
Галечка ўстала,
Святы вечар, да й добры вечар.
Галечка ўстала, косу часала,
Святы вечар, да й добры вечар.
Косу часала, у цэркаўку ішла,
Святы вечар, дай добры вечар.

Гэту бальшанство дзеці спявалі. А взрослыя спявалі совсем другую, пра Хрыста. Днём, восьмага часла, всегда вадзілі віфілейскую звязду. Звязду рабілі з кардона, выразалі на восем рагоў. З адной стараны наклейвалі Божу Мацер, што младзенца дзержыць, а з второе стараны – сам Господзь. На Каляды звязду не носяць. Каляды – гэта седзьмога часла, віфілейская зорка – восьмага часла, а дзевятага пачынаецца кермаш.

Трынаццатага вечарам заходзіць шчадрэц, гэта ўжо вечарам вараць куццю. На куццю павінна быць дванаццаць страў на стале здобных. На покуці становіцца слупочак збажыны (жыта або пшаніца). Куцця была посная. З 13-14 нада, штоб уся свая сям'я павячэрала, ніхто нікуды не атлучаўся. А як атлучаецца, то гэта плахая прыкмета. Уся свая сям'я ў зборы, і вот хазяін заклікае: "Мароз, мароз, ідзі куццю есці. Як не прыйдзеш на куццю, да прыйдзеш на раллю, ды я цябе пугаю паб'ю". Так прыказвалі тры разы, каб урадзіў харошы ўраджай. Потым ждуць, што прыйдзе каза ў хату. На Каляды маладыя дзяўчаты варажылі. Варажылі на дровы, аладкі пеклі, пад голаву ленты лажылі (касняікі). І гулянкі такія харошыя былі.

Адорвалі гаспадары добра: хто за стол садзіць, то ў торбу гарэлку кладуць і сала, і грошы, і ўсё, што Бог заслаў. Усе грошы заробленыя неслі ў цэркву, ставілі свечкі і спявалі песні. Кермаш вёўся дзве нядзелі. Пачынаўся з седзьмога января і канчаецца дзевятнаццатага, пакуль Крышчэнне пройдзе.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

Каляды – самы любімы празнік для нас, для маладзёжы. У гэты дзень лажылі на стол сено і закрывалі гэты стол скацерцю. Туды, дзе сено, лажылі грошы. А грошы лажылі для таго, каб яны цэлы год не канчаліса, штоб яны ўсё врэмя былі гэтыя грошы. А сено лажылі для таго, каб куры несліса толькі дома, штоб не хадзілі на чужыя поклады, а несліса толькі дома куры.

Калядуюць у нас увечары. Сабіраюцца ўсе дзеўкі да разам у адной хаці. А калядавалі з казою, а казою обязацельно-обязацельно нараджалі хлопца ці мужчыну, бо не трэба было дзеўцы нараджвацца. Робілі звязду. Бралі козу, звязду і такім гуртом збіраліса і ішлі калядаваць. Ішлі под каждое акно або заходзілі ў хату і спявалі:

– Дай, Божа, год дождаці да й зноў Каляды спраўляці. Пані гаспадару, ці можна вам песню заспяваці?

Ну, тады гаспадары отвечалі:

– Можна, калядуйце, гуляйце, каўбасу зарабляйце.

Ну, тады пачыналі калядаваць, спяваць розныя калядныя песні. А песню спявалі і гаспадару, і гаспадыне, і спявалі дзецям. А як быў хлопец у хаце, то і хлопцу спявалі. Як дзеўка была на выданні (скоро замуж нужно было ісці), і дзеўцы спявалі песню. Калядавалі до самого позна, звечара пачыналі. Калядавалі доўга, не мінаючы ні аднае хаты, бо як, не дай Бог, мінеш чыю-небудзь хату, то на другі дзень так ужо абганяць, так абідзецца, што ўродзе бы мінулі. Это ж, калі з казою ўваходзяць у хату, то коза ўродзе бы ў хату прыносіць ураджай вялікі, бо не зра ў каждой песні спяваецца: “Дзе коза ходзіць, там Бог жыто родзіць, а гдзе не бывае, то там улягае”. І вот обязацельно, як заходзяць под акно ці ў хату, то постукаюць у шыбачку і кажуць:

– Добры вечар, пані-госпадані, ці можна песні заспяваць?

Хозяін хаты гаварыў ім:

– Спявайце, спявайце ды на каляду зарабляйце.

А калі ў сяле бывалі памерлыя, то ўжо ў гэту хату не заходзілі, абміналі, таму што цэлы год там ляжаў пахаронны звычай.

Як ішлі калядаваць з трынаццатага на чатырнаццатага, это быў шчадрэц. І ўжо на шчадрэц обязацельно варылі “багатую” куццю. А чаго яна была багатая? А таму што масла туды кідалі, ужо м'ясо падкідалі, яна была ўжо не посная, яна была ўжо жырная, ужо можна было есці такую куццю. А калісь жыта сеялі, пшэніцу сеялі, самі сеялі, у каждого была свая аторка. Вот на гэтай аторцы як сожнуць пшэніцу, то ўжэ яе засыпаюць у таўкач ды яе стаўкуць, обоб’юць гэтэ зерно пасушэнэ, і ўжо обязацельно з гэтаго варылі

сваю кашу-куццю. Пеклі бліны, бо трэба было дзеўкам гадаць на бліны. Вот, напрымер, брала дзеўка бліна і ішла да чые-небудзь хаты і станавілас пад акно ды й слухала, як прымерна хазяйка кажа на сваё дзіця: “Ідзі там ці дроў прынесі, ці вады”. То это яна знала, што яна пойдзе обязацельно замуж. Но як хазяйка этае хаты пакрычыць на свае дзіця, то яна знала, што ў гэтым годзе яна замуж не пойдзе. Яшчэ дзеўкі разам збіраліса ды выбігалі на вуліцу, ды дзе стаяла такая клетка дроў, то так охапкаю цэлаю бралі ў рукі, прыносілі гэтыя дровы ў хату да ўжэ счыталі: як парнае чэсло гэтых дроў, то пойдзе замуж, а як не парнае, то ў гэтым году не пойдзе замуж. А далей дзеўкі косы запляталі, а ў косах былі коснікі, ды лажылі іх у начоўкі, ды палалі.

Да ўжо спалаюць: ды чый коснік першы ўпадзе на падлогу, то ў гэтым году яна ўжэ і замуж пойдзе, а чый астаецца ў начоўках, дык у гэтым годзе замуж не пойдзе, яшчэ трэба ждаць свайго часу. Ну, і на куццю гадала дзеўка. Як зварыцца куцця, да яна хоча пагадаць, за каго замуж выйдзе, то яна цэлы вечар ні з кім не гаворыць. Бярэ яна штаны палатняныя бацькавыя ці братовыя. У штаны лажыла ложку кашы-куцці, лажыла пад падушку і лажылаcorrespondingса спаць. І чытала малітву “Отчэ наш”, і прасіла ў Бога, каб прысніўса той, за каго яна пойдзе замуж. Яшчэ збіраліса дзеўкі ды кажды па чобату хромаваму аддаваў, ды перакідалі іх чэрез хату. Ды беглі кругом хаты, ды глядзелі: у які бок нос чобата паглядае, значыць, у той бок пойдзеш замуж.

Пасля Каляд збіраліса ўжэ з торбамі. У каждой ж хаце даюць гасцінцы: хто коўбасы, хто яйцы, хто сало. Усё гэта злажвалі ў торбу. А былі такія гаспадары, што хозяін за стол пасадзіць ды й чарку налье. Дык хлопцы выпівалі, а мы, дзеўкі, не. То нам дадуць пляшку ў торбу, дык мы з поўненькімі торбамі пойдам ды наймём музыканта, заплацім яму. Ды ноч у хаце да самага ранку танцуем, гуляем на Каляды.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

Ужэ ў последнія дні перэд Рожэством не пралі, прыбіралі ў хатах. А тогды ж не було крупы, шоб купіць на куццю, трэба ж ечменю браць свою, опарвалі его і ў ступкі тоўклі, это ўжэ з этэго ечменю варылі куццю. А ў нас з пшэніцы, але з ечменю смачней трохі. У светые дні перэд Рожэством (от Савы, Варвары, Мікола (17, 18, 19 снежня па новаму стылю)) збіраліс, вучылі песні спеваць. На Міколу Коляду запівалі. А особенно мацерэ вучылі дзецей рождзественскіе песні спеваць.

Куцця – такі торжэственны вечор быў, своею семьёю куццю вечэралі. Варыла маці борщч з грыбамі. Куцця – это была глаўная. От з этой тоўчаной пшэніцы варылі куццю з сахаром ці з мёдом. На стол ложылі сено, засцілалі льняную скацерць. Пекла маці пампушкі, мочалі ў мак або ў каноплі. І наркоманоў не було.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны***

***студэнткай Пенчык Л.***

Калядныя святы заўсёды вельмі чаканыя і радасныя. Яны былі звязаны з пераапрананнем у шчодры вечар, з гаданнямі на святкі, з багатым сталом.

Рыхтаваліся мы ўсёй сям'ёй. Рабілі ў хаце парадак, каб чыста было. Перасцілалі на іконах вышыванкі. Абязацельна, каб вышыванка была з краснымі ніткамі, свечкамі і веткамі ёлкі.

Маці мая гатавала ежу. Абавязкова трэба было прыгатовіць двенаццаць блюд, бо ў Хрыста было двенаццаць апосталаў.

Маці варыла "багатую" куццю. Гэта каша з мёдам, арэхамі і сахарам. Куцця была галоўным блюдам у гэты вечар. Пасля захода сонца нельга было нічога рабіць, бо свята ўжо пачынаецца. Уся сям'я сабірала на стол і прыгожа прыбяралася. На вугал стала ставілі свечку, клалі пад скацерць сена, каб багата жылося і ў дастатке ўвесь год.Маглі пасыпаць трохі зерня і ячменя, проса, аўса і інш., каб скаціну было чым карміць і ўраджай лепшым быў. На гэта ўсё ставілі "багатую" куццю з ложкаю. Свечку ставілі абязацельна ў якое-небудзь зерне і запальвалі. Калі свечка гарэла добра, то шчыталі, што і жызнь у гэты год будзе спакойная. Калі "красны" вугал быў гатоў, то накрывалі на стол усе астатнія двенаццаць блюд. Чаму – не знаю, але ў нашай сям'е заўсёды елі ложкамі на Каляды, можэт, ад бабулі перайшло, ніхто не ведаў, але так было заведзено.

Сядалі есці. Маці чытала "Отчэ наш", патом дзякавала за пражыты год, за ўраджай, за скаціну, за здароўе дзяцей і парадак у хаце Бога, і мы елі. Яшчэ бралі ложку, набіралі ў яе куцці і падыходзілі да вакна. Стукалі ложкай у вакно і гаварылі: "Мароз, мароз, хадзі да нас куццю есці!"

Так гаварылі тры разы, а потым кожны з'ядаў сам па ложцы куцці.

Пасля вячэры мы сабіраліся з дзеўкамі на гаданні. Гадалі мы на жаніхоў, на судзьбу ў гэтым годзе, хто замуж першая пойдзе, хто дзіця народзіць, якая жызнь замужам будзе. Кідалі сабаку аладкі, якую аладку сабака з'есць першую, тая дзеўка раней за ўсіх замуж пойдзе.

Кідалі праз парог каліткі сапог з левай нагі цераз правае плячо і гаварылі: "Кідаю сапажок з севера на васток цераз левае плячо. Глядзі носам туды, адкуль жаніх мой прыйдзе". Куды носам сапог паказваў, адтуль, лічылі, і жаніх павінен быў прыйці.

Хадзілі абдымаць заборы. Хто больш усіх ухваціць рукамі: калі парнае чысло, то ў парэ будзіш, а калі не, то адна ўвесь год.

Яшчэ лічылі, што, колькі табе гадоў, столькі адсчытываеш колышэк забора, і каторы паследні колышак, такі твой жаніх будзе. Высокі ці нізкі, тоўсты ці худы колышак пападаўся. Да, так і было, дзед у мяне тоўсты і нізкі быў, як той колышак забора.

Яшчэ перапісвалі ўсіх жаніхоў на бумажкі і клалі пад падушку. Якую бумажку з імем дастанеш утрам, так і імя жаніха будзе. Бралі ложку куцці і ішлі на вуліцу. У першага чалавека, які ішоў, пыталі імя і давалі куццю з'есці. Як ішла жанчына – так будуць зваць свякроў, як мужчына – свёкар, а як хлопец малады – так імя жаніха будзе.

На зеркале ў бані мы ніколі не гадалі, бо вельмі страшна было. Казалі, што дзеўка адна гадала, вылезла з зеркала рука і дала ёй па шчаке, у той пляма чорная на ўсю жызнь асталася. Пуганая яна хадзіла.

Яшчэ дзяўчаты бралі ложку куцці і ішлі пад чыё-небудзь акно і слухалі, аб чым там хазяева гаварылі. І што там гаварылі, то іх чакала ў будучым. Дзяўчаты падыходзілі да калодца, пускалі туды вядро пусценькае, а потым пачыналі адтуль выкручваць вядро з вадой. Каждая дзеўка дзяржалася за цэп рукамі. Па очэрэдзі. І чыя рука паследняя будзе, та і замуж скора пойдзе.

Самая інцерэсная была гадалка на кольцах. Бралі кольца і персні сваі і прасілі каго з жанчын. Складалі іх у сіта і сыпалі туды зерне. Па чарзе бралі жменю зерня і глядзелі, якое кальцо пападзецца. Калі меднае, то будзе жыць дзеўка бедна і пападзе ў бедную сям'ю. Калі сярэбранае, то будзе замужам за хлопцам з харошай, але небагатай сям'і. Калі кальцо з камнем – выйдзе за багатага хлопца. Залатое – будзе жыць з багатым у багатай сям'е. Калі пападзе свайго кальца, ілі то, якое хоча, то ўсе жэланія ў яе збудуцца. А калі жменю зерня дастане, то не выйдзе замуж у етым годзе і будзе жыць роўна ўвесь год.

Пасля таго, як мы пагадаем, мы ішлі калядаваць. Сабіраліся ўсе: і хлопцы, і дзеўкі, і малыя дзеці. Было весела! Мы пераадзяваліся, маляваліся. Хто ў Бабу Ягу з платком на галаве, хто кажух навыварат надзяваў, хто ўсы сабе падмалёўваў, хто канапушкі. Бралі мех або два мяхі, не хадзілі, як цяпер, кожны з мяхом, а адзін або два на ўсіх быў. І пойдзем. Песні спявалі розныя, знала добра я прыпеў адной песні:

Добры вечар, шчодры вечар,
Добрым людзям на здароўе,
Добрым людзям на дастатак,
Добрым людзям на ўвесь год!

Маці расказвала, як яны пераадзявалі хлопца ў казу. Рабілі яму рогі, і ён хадзіў па ўсіх хатах, шуціў, прыгаў, танцаваў і пеў песні. Шустрэй за ўсіх быў гэты хлопец. Гаварыла, што рабілі так на добры ўраджай і прыплод жывёлы ў хаце, гаспадарцы. Гаварыла, што каза сваімі рагамі чорта жудаснага пужае добра. Але мы ніколі такога не рабілі. Яшчэ расказвала мая маці, што калі нарадзіўся Хрыстос, то на небе загарэлася звязда яркая, таму ў гэты шчодры вечар рабілі звязду, пасярэдзіне ікона была і свечка. Сама яна павінна была быць яркая, у восем канцоў, і цаплялі яе на длінную палку. Насілі па хатах і ўслаўлялі Бога і Хрыста, сына ягонага.

– Святыя вечары,
Дзе ў Бога былі?
Святы вечар, добры вечар,
Добрым людзям на ўвесь год! *
Дзе ў Бога былі?
– Царкву рабілі.
Царкву рабілі

З трамі вокнамі,
З трамі вокнамі,
З двамі дзвярамі.
У перва вакенца
Месяц засіяў.
У друго вакенца
Сонейка ўзышло.
У трэцяе вакенца
Голуб уляцеў.
Голуб уляцеў,
Слёзачку ўраніў.
З тые слёзачкі
Плылі рэчачкі.
Што ў той рэчачцы
Сам Гасподзь купаўся.
Сам Гасподзь купаўся,
У расы адзяваўся.
У расы адзяваўся
З Ісусам Хрыстом.
З Ісусам Хрыстом
З святым Ражаством.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага куплета.

Было вельмі весела. Нам за прымаўкі і песні давалі канфеты, баранкі, яблакі, арэхі, булкі, пірагі, бліны, сала, каўбасу, грошы і іншае. У каго што было. Нас дзякавалі гаспадары, а некаторыя гаварылі: “Чым багаты, таму і рады”, “У нас усё добра і вам таго жадаем”. Потым мы гулялі ў розныя гульні. Кідаліся снежкамі. Каталіся на санках, вадзілі карагоды, дзялілі або рабілі багаты стол з таго, што ў мяшках. І позна вечарам ішлі да дому.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Купрыян Еўдакіі Валер’еўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Зялёнай В.***

Каляды – это вельмо старажытны празнік. От людзі раньшэ говорылі про Каляды так: “Калядкі справляюць для таго, коб було ў дастатку ўсего. Празнік Каляд, коб буў у хаці лад”. Хату людзі брызгалі свечоною водою, коб хто не прыробіў чаго, ці злые вочы не зурочылі. На Каляды людзі гатовілі смачную еду, собіраліса сем’ямі, моліліса Богу, коб Бог помог ва ўсіх начынаннях.

Да Каляд людзі гатовіліса зарань. Прыбіралі ў хаці, мылі начыста вокна, секлі дрова, загатаўлівалі лучыну. Мая маці раньшэ ўсегда гаварыла, коб мы зашывалі адзежу, еслі ена порваная, сціралі ее, бо Каляды отмечалі 2 недзелі, і 2 недзелі не трэба було нічого робіць. Особенно 7, 8 і 9 января. Бо этые дні – это начало Коляд, а конец 21 января. Днём можно було што сільно

срочнэе зробіць, а вечэром–барані Бог (ківае пальцам). Ішчэ до 7 чысла надо було самім обезацельно помыцца, коб не іці ў празнік са старымі грэхамі. А ішчэ іе прымета. Еслі аддаўжыў у каго-нібудзь ці грошэй, ці што-нібудзь, то надо до Коляд обезацельно вернуць. Вялікі грэх іці ў Каляды з даўгамі, кажуць, што ўвесь год будзеш попрашайнічаць.

7 января начыналіса Каляды. У ноч з 7 на 8 дзеўчаты гадалі на хлопцаў, на сваю будушчыю судзьбу. Гадалі па-разнаму. Обнімалі забор. Дзеўчына, екая хоцела погадаць, разбегаласа і з разбегу абдымала штокеціны. Еслі абхопіла парнае колічэство, значыць, будзе ў пары, еслі не парнэе, то не. Шчэ гадалі на тэ, ці будзе жэніх багаты ці бедны. Выцягвалі з кучы дроў аднэ палено і гледзелі: еслі полено суковатэ – богаты будзе, еслі гладке – бедны. Гадалі шчэ на тэ, у які бок замуж выйдзеш. Выходзілі на вуліцу і прыслухаліса: у еком боку забрэшуць собакі, у той бок і замуж выйдзеш.

Другі дзень (8 января) называлі "Бабін дзень". У эты дзень пеклі аладзі, варылі кашу і хадзілі ў госці да бабы, екая бабіла дзецей пры хрысцінах. Такая баба магла буць адна на цэлую вуліцу.

9 января Сцепан. У эты дзень раньшэ казалі: "На Сцепана слуга вышэй за пана". А 13 января буў шчодры вечэр. У эты дзень, правільней вечэр, ходзілі калядаваць. Хадзілі і дзеці, і велікіе. Перэодзеюцца ў разную адзежу: у баб, дзеда, абезацельно козу. А коб зробіць козу, выворачвалі кажуха. Бралі сумку для еды і сумку, поўную жыта. Бралі і звезду з собою. От заходзяць каледоўшчыкі ў хату з песнямі, музыкой (хто ўмее на гармоніку іграць, той падыгрывае), з танцамі. Зразу попросяць разрышэння зайсці ў хату. Просілі по-разному.

Зайдуць у хату і начынаюць паказваць, будто бы коза ўмерла, а коб козу вылечыць, надо даць ей ці каўбасы, ці сала. А калі коза ўжэ подымецца, то вместі з ею пеюць песні разные, танцуюць і жэлаюць шчасця, дабра хазяіну і хазяйцы, дзеткам. І засыпаюць хату жытам. Жыто нельга зметаць на ноч, толькі ўтром. Еслі хозяева это зробяць, то ў іх будзе плахі ўраджай.От выходзяць калядоўшчыкі з хаты і дзякуюць хазяінам.

У гэты дзень гатовілі багатую куццю. На багатую куццю гатовілі богато еды смачной, разной. З куццёй було звязано много прымет пра пагоду: еслі ўвечары небо яснае, то будзе велікі ўраджай на грыбы. Еслі ідзе снег і мецеліца, то пчаляры зберуць много мёду.

У тую ноч гадалі тожэ. Кідалі сапага чэрэз варота: у екі бок ён упадзе носом, у той бок і замуж выйдзеш.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

За Роздвом–13 января,–шчодры вечар. У гэты вечар бралі кочергу, бохан хлеба, які пеклі к Ражджэству, і ездзілі на кочерзе. Обвязваюць сад соломой або сенам і казалі: «Едзе Радзівон на сівом коне, везе белы цвет і красные вішне». Обвяжуць сад, ідуць у хату вячэраць. Таксамо вараць куццю, і вячэра ўжо не посная. Готуюць усе скоромнее, а дзеўкі ў еты вечар

гадаюць. Палаюць коснікі, носяць дрова ў хату і лічаць, ці да пары. Шчэ обдымаюць плот, таксамо гледзяць, ці до пары. А як у кого дзеўкі е, то воны пякуць ладкі і йдуць под окно, а маці глядзіць і скажэ ў хаці: «Сядзь», то дзеўка шчэ год сядзіць. Песне спявалі на шчодрэц, які на Коляды. Это казалі «шчодры вечар».

Ой, на моры да на чорненьком, шчодры вечор.
Да купаласа ластованька, шчодры вечор.
Да купаласа, да ўмываласа і к святому дзяньку
Прыбіралася, шчодры вечор.
І к святому дзяньку шчэ й Васілейку.
А к другому Крашчэнейку, шчодры вечор.
Откуль выйшла красна панна, шчодры вечор.
Она тому дзіву подзівіласа.
Прыйшла домоў–похваліласа, шчодры вечор.
Я шчодрую, ладку чую, шчодры вечор.
Добрым людзям на здороўе.

Прыготаўліваліса к Ражджэству: бялілі хаты мелам, усё кругом прыбіралі, у хлеву подметалі, каб буў порадок. Перэд Роздвом варылі куццю. Хто варыць з пшаніцы, хто з ячменю, у кого шо було. Клалі на стол. Жменьку сена рассцілалі под скацерць і садзіліса вечэраць. Готовалі богато страў, но тожэ посная вячэра. Гэтая вячэра перэд Ражджэством називаласа сочэльнік. У цэркоў ішлі рано на Роздво. Прыходзілі з цэрквы, обедалі. Затым прыходзяпь спевакі, то под вокна ідуць спяваць. Прыходзяць, поздраўляюць з празнiком: «Поздраўляемо і з празніком Ражджэством Хрыстовым. Можна спяваць?» – путаюць. З хаты кажуць, што можна, а колі ў кого хто умер, да год не пройшоў, то нельга, не можна. Ходзілі коледаваць узрослыя. И оны рабілі з бумагі звязду, у серэдзіне запальвалі свечку, бралі сані і ходзілі. На санях возілі тэ, што ім давалі: пірогі, сала, семкі, цукеркі, грошы. Спевалі, хто екія песні:

Рожэство Хрістово, ангел прілецел.
Он лецел по небу, людзям песні пел.
Все людзі, лікуйце, в сей дзень торжэствуйце.
Есць Хрыстово Рождзество.
Пастушкі в пешчеру первымі прішлі,
В яслях на соломе Господа нашлі,
На колені палі, Хрісту дары далі,
Новому рождзённому.
Все мы согрешылі, Ісусе, пред тобой.
Все мы людзі грешны, ты одзін святой.
Просці прогрешенья, дай нам одновленья.
Есць Хрыстово Рождзество.

А шчэ пяюць:

Колед, колед, коледніца,
Добра з мёдом поленіца.
А без мёду не така,
Вынесь, цётко, пятака.

Спявалі яшчэ іншыя песні. Спявалі ўсе тры дні празніка. На Ражджэство носяць коляду. Хросные несуць своім хрэснікам грошы, конфеты. Іх частуюць, садзяць за стол і садзяцца ўсе, хто ў хаце знаходзіцца.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,***
***студэнтам Кувікам А.***

Коляды у нас само-само старынны празнік, які прыйшоў з даўніх-даўніх часоў, які вельмі мы любім. Калядуюць у нас у сяле на Рождзество і на Стары Новы год. От, у вечар перад Рождзеством на стол кладуць сено, яке ляжыць да самога шчадраўца. Разам з сенам кладуці і грошы, якія называюць колядою. А робіцца гэта для таго, шоб ніколі не пераводзіліся грошы і булі круглы год. Коляды пачынаюцца ўвечары. Колядуюць з казою, з звяздою. Звязда на Коледу обязацельно трэбо шоб була. Патаму шо гэта азначае, шо пад звяздою радзіўся Ісус Хрыстос. Ну, і сабіраліся такая невялікая група, ішлі от хаты да хаты калядаваць. І перш чым от зайці да хаты, падходзілі под акно і пыталіся: «Добры вечар, пані-гаспадыні, ці можна песню заспяваці?» Або шчэ пыталі так: «Наце колосок на сто копок. Добры вечар, пані-гаспадыні, ці можна песню заспяваць?» Ну, і ўжо гаспадар, канешне, уходзіў, і вон ім адказваў, заўсёды отвечаў: «Спявайце ды на Коляду зарабляйце». Ну, як ужо ў чыёй-небудзь хаце на працяжэнні года булі похороны, покойнік буў, то ўжэ не йшлі колядаваць. А хоць падходзілі, то хозяін атвечаў: «У нашай хаце нельзя колядаваць».

Ну, як от заходзілі под окно колядоваць, то, дзе булі хозяева, хозяевам отдзельно песню спявалі. А як была ў хаце дзеўка ў гэтых хозяеваў, то дзеўкі песню спявалі, а як буў хлопец, то для хлопца спявалі. От як для дзеўкі спявалі такую песню:

Ой, рано, рано куры попелі,
Святы вечор, добры вечор.
А шчэ зараней Галечка ўстала,
Святы вечор, ды добры вечор.
Галечка ўстала, косу чэсала,
Святы вечор, ды добры вечор.
Косу чэсала, у цэркоўку ішла,
Святы вечор, ды добры вечор.

Мо хлопцу яшчэ такую от песню спявалі:

За горою комяною,
Шчодры вечор, Васілею.
Там ластоўка купалася,
Шчодры вечор, Васілею.
Купалася, умывалася,
Шчодры вечор, Васілею.
На Колядкі собралася,
Шчодры вечор, Васілею.

Ну, як ужо поспявалі, ды адказвалі гаспадарам. Ну, от яны спявалі і навек вадзілі казу. Каза ў хаце танцавала, каза ўсякія такія прыказкі проказвала. А казу рабілі хорошую, такую рабілі гожую. Да ўсе з гэтай казы адзявалі кажух. Но казу жонцы не трэба було вадзіць. Грэх буў. Козу обязацельна вадзіў мужчына. І навек вадзіў у нас мужчына казу. І каза обычна скакала, танцавала, далей падала. І так шуцілі, гаварылі, шо і наша каза, мабыць, хоча сала. Ну, і тады хозяін прыносіў гарэлку, даваў казе панюхаць вродзе бы пад нос, і ўжэ тады каза ўставала. І кусок сала давалі казе. Ну, особенно вельмі любілі дзеці Коляду. Ужэ пазалазяць на печ ды пазіраюць, як ужо колядуюць да бацька выносіць тыя пачастункі. Радаваліся дзеці навек гэтай Колядзе. Ну, і ўжэ як поколядуюць у хаце, то ужэ навек гаспадары адказвалі: «Дай, Божа, год прожыці ды і яшчэ раз прыйсці поспяваці. Дай, Бог, здароўя, усяго». Гаспадар обязацельно-обязацельно даваў ужэ калядоўшчыкам пачастункі, даваў коўбасу, грошы, хлеб, мясо. Ну, і обязацельно чарку налівалі. І от там ужо буў вродзе бы обучай, ужо сердзіліся, обіжаліся, як у гэту хату не зайдзе Коляда, да з козою, то вельмі сердзіліся людзі. Оні счыталі, шо не будзе ўраджаю, шо ўжэ не будзе ў гэтай хаце здароўя. Обязацельно хацелі, шоб прыйшла Коляда.

Ну, на Шчадрэц варылі багатую куццю. У ей клалі багато мяса і обязацельно-обязацельно пяклі бліны. А дзеўкі ў гэты вечор вельмі-вельмі гадалі. Гадалі на бліны, гадалі на башмакі. Бралі бліна да выходзілі на вуліцу, кідалі бліна. Слухалі, дзе сабака забрэша, значыць, у той бок і замуж пайсці. Або скідала з свае нагі валенка ды кідала чараз вароты. Да глядзела: куды насочак валенка, значыць, і туды замуж пайсці. Ну, так от було в основным на Коляды. Ну, потом ужэ, калі ўсе наколядуюцца за вечор усе, ды ўжэ ўсе разам ішлі ў клуб (ці яко клуба, дзе ні було), то там якую хату знімалі, дзе была баба старая з дзедам, да нанімалі гарманіста, аддавалі гэта ўсё-ўсё, шо накалядавалі, гарманісту. Ужэ танцавалі ўсю ноч, до самага ранку танцавалі і лапці пастоптвалі, танцуючы. Танцавалі-танцавалі да самага ранку з песнямі, з гулянкамі і з падскокамі. Праходзілі вельмі добра Коляды.

***Запісана ў в. Чэрнічы***
***ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,***
***студэнткай Хільман І.***

У Пагосці коляднікі ходзілі з звяздою под вокна. Звоночак у іх званіў, як подыйдуць под вокны. Коляднікі ходзілі кажны вечор до Старого Нового года. Ходзілі і спевалі:

Дзева сына народзіла
І ў яслях схороніла.

Коляднікам пеклі пірогі. А на Шчэдрэц у Пагосці клалі на стол сено. Перэд вечэрою обязацельно клалі тонкі слоек под скацерць. Калі ўсе повечэраюць, то сено прымаюць, а рано коровам его даюць. Мужчыны особно ходзілі колядоваць. Таму яны пелі песні іначные:

Добры вечор, пане-господар!
Наце сноп на сто коп.
Ці можна заспяваць песню?

І потым под вокнамі спявалі. Обязацельно ходзілі з колоскамі. Да колоскі былі не до пары. Трэба, шоб було тры, пяць, ну, шоб не адзін. Калі не було своіх колоскоў, то бувало кралі з чужое сцірты. І як побачыць хозяін, то ён не вельмі крычыць. Хозяева за гэтыя колоскі давалі хлеб ці грошы. Ходзілі з буськом і козою. Шоб родзіліса яблукі, ішлі к яблуні і казалі вось што: «Дзерэво, здрыгніса – Ісус Хрыстос народзіўса». І куццю варылі.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Маркевіч Валянціны Пятроўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Бабовіч М.***

Да Каляд рыхтаваліся зараней. Прыбіралі ўсю гаспадарку ў парадак: мылі хату, двор прыбіралі, абязацельна білі кабанчыка. На Каляды варылі куццю. Усіх іх было тры. Первая куцця была на Ражство і была бедная, но ўрачыстая. Калі варылі первую куццю, нельзя было пробаваць яе. Калі куцця зварвалася, яе ставілі на покуць, на якой ужо быў варашок сена. Скарынку з куцці з верху кашы збіралі і аддавалі курам, каб вяліся добра. Перад тым, як на стол ставіць куццю з вячэраю, пад палатняную скацерць лажылі сена, а пад тое сена лажылі грошы, каб у хаце цэлы год грошы вяліся. Не садзіліся за стол, пака першая зорачка на небе не паявіцца. Уся вячэра на первую куццю была посная. Первым за стол садзіўся і начынаў есці гаспадар. Гаспадар зачэрпваў ложкай куццю, падыходзіў да акна і казаў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці». Таксама на первую куццю, гэта значыць з 6 на 7, спявалі такую песню:

Дзіўная навіна –
Родзіць Дзева сына.
Парадзіла ў Вафліеме
Марыя сына едзіна.
Не ў царскай палаце,
Не ў багатай хаце,

А ў пустыні, а ў ясліне.
Да трэба ўсім знаці,
Яко Дзева чыста.
Марыя Прачыста
І раджае, і пытае,
Яго ёсць нявеста.
На руках дзяржала
І яму спявала.
– Спі ты доўга,
Расці скора,
Сыне мой едзіны.

Другая куцця была багатая. На стол ставілі ежу з мяса, з малака. Другую куццю варылі з 13 на 14 (Стары Новы год). Хадзілі ў гэты вечар шчадраваць. Хадзілі з ёлкаю, а на той ёлкі свечкі былі. Стануць пад вокнамі ды спяваюць:

Добры вечар, пан гаспадар,
Ці так падарыш, ці паспяваць.

Вадзілі з сабой казу. У ролі казы быў мужчына, які быў адзеты ў вывернуты кажух. Тады ўжо спявалі такую песню:

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Дзе каза топ-топ,
Там жыта сем коп.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

Калі хадзілі шчадраваць, то хадзілі ўсім гуртам, з гармонікам. Шчадраваць хадзіла ў асноўным адна моладзь. Калі шчадравалі, то гулялі аж тры дні.

Трэцяя куцця была галоднай. Варылі яе на Хрышчэнне. Ва врэмя Каляд дзеўкі вельмі любілі гадаць. Дзяўчыны пяклі аладкі. Кожная дзяўчына лажыла на ганак па ладцы, і пускалі сабаку. Чыю ладку сабака з’есць першы. тая першая выйдзе замуж. Вечарам выходзілі на двор і абнімалі штыкеціны ў плоце тры разы і шчыталі. Калі парнае чысло штыкецін, то ў этым годзе дзяўчына будзе ў пары, а калі не парнае, то будзе адна. Дзяўчына, перад тым як лажыцца спаць, брала кружку, налівала туды воду, а наверх лажыла палачку і гаварыла: «Дай, Божа, прысніцца, з кім у пары буду».

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.,***

*студэнткай Пяшэвіч Я.*

Роздво Хрыстовое – годовы празнік (Коляды). Прыбіралі ў хатах, пеклі ўсякое на Роздво. Варылі куццю ў гаршочыку із перлоўкі. Увечары до схода сонца бярэм сена, ложымо на покуці, бярэма горшчыка руковіцамі і ставімо на сено. Ложымо кусочок хлеба на горшчык. Сядаем вячэраць, усё, што наготовілі, ставімо на стол потым куццю, запіваем чаем і ямо.

Колядоваць у нас ходзілі з 6 на 7 январа. Стукалі ў вакно, пыталі разрашэнне. Заходзілі ў хату і калядовалі:

Ой, шчодзер, шчодзер,
Наш кіндзер злодзей.
Святы вечор!
Наш кіндзер злодзей.
Украў кобылку,
Схаваў у одрынку.
Святы вечор!
Схаваў у одрынку.
Схаваў у одрынку,
Облупіў шкурку.
Святы вечор,
Облупіў шкурынку.
Шкурынку облупіў,
Сапогі пошыў.
Святы вечор!
Сапогі пошыў.
Сапогі пошыў,
За вечор зносіў.
Святы вечор!
За вечор зносіў.

Колядоўшчыкам довалі, шо было: сала, коўбасу, шчэ бутылку. Яны дзяковалі за подарункі, шоб на тэй год мы зноў прыйшлі і вы нас прымалі.

Падчас гэтага свята гралі мы ў таку гульню, як калядная карагод-гульня «Олей». Гэта карагод-гульня праводзілася ў час Коляд (на працягу ўсяго тыдня). У гэтай гульні галоўным быў хлапец, які стаяў у срэдзіне кругу, і гэты хлапец і быў Олеем. Дзевочкі робілі корогод і спявалі:

Цяпло, цяпло, Олею
Пад дубовай карою
Сядзець сабе самому.

Олей отвячаў:

Курна, курна, дзевачкі, пад дубовай карою

Сядзець сабе самому.

Дзевочкі ему говорылі:

Дык бяры сабе, Олею,
Красну панну Волечку.

Олей браў сабе з карагоду дзеўчыну ў круг і адказваў:

Дзякуй, дзякуй, дзевачкі,
За красну Волечку.

Опяць дзевачкі пачынаюць вадзіць карагод, спяваць песню Олею, той зноў бярэ ў ахвяру сабе дзеўчыну. Гульня заканчваецца, колі ў карогодзе не застаецца ні адной дзеўчыны.

Зрання, 7 января, ходзілі посяваць:

Сею, сею, посеваю,
З Новым годом поздраўляю.
Жыто, пшаніцу,
Усяку пашніцу.
Родзі, Божа,
На той год на паляніцу.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Е тры куцці. Куцця перад Ражством называласа галодная. Другая на шчадрэц – багатая. Шоб богато було страў, грошы ложылі на стол, шчодровалі под акном. Перад Хрышчэннем куцця называласа халодная.

Куццю гатуюць утром, а вечором едзяць і завуць мароза!

– Мароз, мароз, ходзі куццю есці.

Варaць з пшаніцы. Пшаніцу таўклі ў ступе, абтоўквалі яе і получалас куцця. Яе рыхтавалі ў гліняном гаршку з мёдом.

Як на голодную куццю на небе богато зор, то будзе богато грыбоў, як небо цёмное – то чарніц. Перэд бедною куццёю вечор называецца водопосцье, дзень не едзяць, ідуць у цэркву, поп'юць свечанае воды і толькі тады едзяць куццю.

На куццю богатую клалі грошы на стол, продукты, сено. Сено ўцягалі вечором, калі сеніна даўгая, то будзе лён велікі. А шчэ на багатую куццю гадалі.

Дзеўкі збіраюцца ў одной хаце і гадаюць. Ложаць сало: чые первое возьме кот, то тая первая выйдзе замуж. Кідалі бліны собацы: у якую сторону

собака загаўкае, туды і замуж пойдзеш. Бралі дрова ў ахапку і лічылі: калі да пары, то будзе год у пары. Ой, шчэ ходзілі шчодроваць, вельмі весело було, не то шо зараз.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

З 6 на 7 студзеня – посная куцця. У вугалок, пад ікону, ставяць у гаршчочку куццю на сено і кладуць булачку хлеба. Гэтым як бы аддаюць дань Ісусу Храсту.

З 13 на 14 студзеня – багатая куцця. Вараць куццю, гатовяць розныя мясныя стравы. Снімаюць скацерць, ложаць сноп, ну, чуць менш, жыта, паверх накрываюць скацерцю і малоцяць кулакамі: еслі находзяць зерне, то будзе багаты ўраджай. Потым усе накладваюць у міскі куццю і наліваюць малаком. Гаспадар ідзе к акну, адкрывае занавеску і 3 разы заве: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці, а летам не ідзі, бо будзем пугамі секці!" Усе садзяцца і вячэраюць. На ўтро корачку куцці збіраюць і нясуць курам, каб куры добра несліся. Вечарамі нічога не робяць аж да 20 студзеня, да Хрышчэння. Вечары называліся святымі.

*Запісана ў г. Жыткавічы*
*ад Смоляр Клаўдзіі Міхайлаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Бярозаўка Мазырскага р-на),*
*студэнткай Бойка Н.*

Куццю варылі перэд Міколаю – гэто первая куцця. Варылі хто з чого. Хто–з пшаніны, а хто–з ячменю. Вячэралі. Вячэра была посная. Колі садзіліса за стол, то звалі мороза: «Мороз, Мороз, ходзі куццю есці. Да не поморозь нашых цяляток, ягняток».

Першая куцця была перэд Рожэством, тожэ вячэра посная. Называецца вячэра-сочэльнік. Як вечарам на саду навісня, то будзе добры ўроджай. Шчэ на стол ставілі богато місак з едою. Таму гэта куцця называецца «вяліка куцця». Скоромного на столе нічого не було. Энно можна було полівацъ алеем. Вячэру пачыналі з малітвы, далей запальвалі на куці свечку і ждалі, як ўзыйдзе перша зорка.

Другая куцця була на шчодрэц, перэд Новым годам. Гэтая куцця была скоромная. Подаваласа з маслом. Шчэ на стол клалі мясо, коўбасы, сало. Зато куцця зовецца шчодрою. Дзеўкі гадалі ў той вечор. Бралі куццю, загортвалі ў мужчынскія штаны, клалі под падушку і ждалі, як сужаны прысніцца. За куццёю цягалі сеніну з-под скацерці і глядзелі, екі лён будзе. А шчэ шукалі ці зерне будзе похожэ на жыто, то будзе богаты ўрожай.

Трэцяя куцця, яе называлі «голодна куцця», була перад Крэшчэннем. Тогды було і першэ водосвяцце і не елі нічого, покуль не нап'юцца. А ўжэ ўвечары ставілі на стол куццю і мало посное еды, а скоромною зусім не елі. Варылі куццю, коб буў добры ўроджай, шановалі хлебные зёрны.

*Запісана ў в. Запясочча*

*ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,*
*студэнтам Кувікам А.*

Першая куцця праходзіць у канун Ражаства. З утра моюць палы, прыбіраюць у хаце, пасля вараць кісель, кампот, пякуць аладзі на посным масле, боршч вараць з грыбамі. Куццю з пярловых круп, з алеем, посную. На кут ложаць сена і булачку хлеба круглую, садзяцца ўсе за стол, дастаюць куццю перад тым, як вячэраць, і ставяць на кут, дзе сена ляжыць. Куццю, калі гатовіш, нельга пробаваць, яе ставяць, і стаіць яна так да вечара. Сям'я сабралася, садзяцца за стол, і хазяін гаворыць: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці».

У гэтае врэмя адкрываюць куццю і глядзяць на скавародку, якой яна была накрыта: калі на скавародцы многа расы і на небе ў гэты дзень многа звёзд – шмат грыбоў будзе ў лесе.

Сено на куццю ляжыць, пакуль Каляды скончацца, а потым збіраюць і аддаюць каню, кароўцы. Зверху куццю збіраюць і даюць назаўтра ўтрам курам, каб лепей несліся. На бедную куццю быў такі звычай: самы малы з прысутных дзяцей павінен быў залезці пад стол і тры разы пракукарэкаць, бо так куры добра несціся будуць і цыпленя не звядзецца.

Другая куцця спраўлялася 13 января, перад Старым Новым годам. Гатавалі тую ж самую ежу, але страва павінна быць багатая. Куцця варылася ўжо не на посным масле, а на жырным. Боршчварыўся з мясам, калбаса была мясная, дамашняя, пірагі пеклі з мясам, дзелалі стол багатым. Хадзілі калядоўшчыкі перад Новым годам, хадзілі калядаваць, апраналіся па-рознаму, але каб было вельмі смешна людзям, хадзілі весела, з прыгаворамі: «З Новым годам паздравляем, у дом шчасця жалаем».

Таксама гадалі, кідалі цераз сарай бацінкі: у якую сторану ўпадзе носікам – з тае стараны жаніх будзе. Таксама маглі гадаць і на галодную куццю. Напрыклад, на босую ногу адзявалі любы абутак, падыйшлі да варот, перакінулі цераз вароты абутак: і куды галош пaглядае, адтуль і жаніх. Рабілі яшчэ і так: падыходзяць да забора і хапаюць на ўсю сілу, сколькі могуць, жэрдкі. Калі парнае колькасць жэрдак – будзеш у пары, калі не – наадварот. Таксама на Ражаство бралі зеркала, спічкі, свечку, захадзілі ў пограб, запальвалі свечку і глядзелі ў зеркала свой лёс. Таксама трэба было ноччу выйсці на двор і прыслухацца, адкуль брэша сабака: калі лаяла далёка, то прыедуць сваты здалёка.

Кусочак куцці завярнуць у трапачку, узяць кружку з вадой і палажыць на ёй дзве лучынкі, а на лучынку – куццю. Ноччу павінен прысніцца жаніх. А яшчэ было такое паданне: узяць ліст якой-небудзь паперы, скамячыць яго і трэба ўсё гэта рабіць у цемры, каля пячы. Затым падпаліць гэту бумажку і глядзець на белую сценку пячы, і цень ад гэтай палахаючай бумажкі пакажа твой будучы лёс.

Калі калядоўшчыкі калядавалі, то спявалі такія песні:

Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую,

Дайце каўбасу, пашчадрую другую.

Спявалі і так:
Ходзіць Ілля на Васіля,
Носіць пугу плецяную, драцяную.
Куды пугай махне, там жыта расце,
Куды касой махне, там пшаніца расце.
Святы вечар! (3 разы)

Назаўтра моладзь хадзіла засяваць. Набярэ ў карман зерня, прыходзіць у хату і сеяць па хаце. І гавораць: «Сею, вею, пасяваю, з Новым годам паздраўляю. Бог сеяў, і я сею жыта, пшаніцу, вялікую пашніцу».

Заходзілі калядоўшчыкі ў хату, пераапранутыя ў казу: кажух вывернуты, а ў ім палкі, як рогі, здзеланы – то, значыць, каза. І гаварылі: «Святы вечар, пусціце нас». Адказвалі ім: «Праходзьце, праходзьце, госці дарагія».

Калі дзеўка была незамужняя, то прыходзілі калядоўшчыкі ў хату і спявалі:

На прыпечку сядзіць Волечка,
Прыходзіць з торбачкай Колечка,
Матка кажа: «Бяры Волечку ды за ручку белую,
Ды вядзі ў пасцель белую».

Гэта значыць, што дзеўку хто-небудзь возьме ў гэтым годзе.

Галодная куцця празнавалася 18 января. Гатавалі кашу з посным маслам, пустую, рыбу варылі няжырную, кампот, кісель, пеклі аладдзі з макам. Мясныя блюды былі не дазволены. На галодную куццю, як і на тыя дзве куцці, таксама гадалі. Нельга было на галодную куццю сеяць зернавых, так як вераб'і выклявалі б зерне.

На трэцюю куццю запрашаецца мароз або дзяды за святочны стол. У гэты дзень таксама ўшаноўваліся продкі. Гатавалі ўжын, садзіліся есці і звалі дзядоў: «Дзяды, дзяды, хадзіце вячэраць! Пабылі, паелі, што шчэ, дзяды, трэба?» Дзяды адказваюць: «Нічога не трэба!» Гаварылі: «Тады ляціце на неба».

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Львоўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Вечар варожб, або Васілёва куцця. У вечар 31 снежня збіралася ўся блізкая радня на сумесны банкет. Прыходзілі тут аддзеленыя сыны са сваімі дружынамі да бацькоў, сыходзіліся браты, асобна жыўшыя, да старэйшага брата, калі бацькоў не было. І ўсе ў адной хаце праводзілі стары і сустракалі Новы год. Калі між імі бывалі якіясь сваркі ці нязгоды, то ў гэты час заціхалі. Калі катораму брату або сястры блага жылося, то ім усе памагалі радай,

нават давалі падмогу, як яна была патрэбна. Словам, гэты вечар быў вечарам сямейнай еднасці.

На Васілеву куццю першай абрадавай стравай быў аўсяны кісель, густая куцця з макам. Усё адбывалася таксама, як на куццю перад Калядамі.

Пасля вячэры гаспадар уставаў найпершы з-за стала і выходзіў у сені. Вярнуўшыся назад, абвяшчаў сабраўшымся прыход даражэнькага госціка. Пачуўшы такую навіну, усе падымаліся на ногі, каб прывітаць новапрыбыўшага. Стоячы, паглядалі на дзверы. Але госць доўга не ўваходзіў у святліцу. Тады гаспадар пытаўся ў стоячых: “Чаго ж вы, госцікі, стаіце?” А ўсе гуртам адказвалі: “Стаімо, каб пачэсна павітаць прыйшоўшага госця”. Гаспадар адказваў: “Ну, дык вітайце, бо ён ужо прыйшоў, а гэтым госцем ёсць Новы год”. Пачуўшы такія словы гаспадара, усе грамадой з вясёлымі падскокамі пелі:

Ідзі, ідзі, Новы год,
Скажы нам наўпярод,
Што каму ты нясёш,
Ці ідзеш ты да нас,
Каб даць усім шчасны час,
Ты новенькі наш!
Ці нясеш ты каму
Смерць, як году таму,
Ты міленькі наш.

Пасля песень наступалі розныя варожбы, а дзеля гэтага і сам вечар зваўся вечарам варожб.

***Запісана ў в. Загорбашша***
***ад Кахновіч Фёклы Мацвееўны***
***студэнткай Шырай Н.***

Первое то куццю готовілі посную, голодную куццю, а потом гаданне було. Як спаць ложацца, на воду гадалі: хто прысніцца ноччу, то это твой суджаны.Трэба позваць мороз: «Мороз, мороз, ходзі куццю есці». Сказаць тры раз у вокно, необязацельно на вуліцы. Это штоб на весне не було морозу. Хто клаў , а хто не клаў под скацерць солому. Трэба класці сено, потому што Ісус Хрыстос народзіўса ў яслях на сені, потому і куццю ставілі сюда к покуці. Хто на столе ставіў, а хто на лаву ставіў. На столе пуд скацерць клалі сено і ставілі чагунчыка з куццёй. Варылі квас посны, бульён посны, куццю варылі, посные аладзі пеклі, яблыкі ў іх крышылі, гуркоў клалі на стол, у кого іе, помідоры клалі на стол.

Колядоваць ходзілі ўзрослые, дзеці тож ходзілі, но рэдко. Ну, у осноўном ходзілі старыкі ў пейсят годоў. Робілі коня, сільно кросіво одзевалі коня, да звонцэ повезаюць, да збрую зроб‘яць. Просяцца, падыходзяць: «Загадай ці калядаваць, ці так даць». Ходзілі з звяздой, а як конь, то з звяздой отдзельно ходзілі. З конём коза ходзіла, а звязда отдзельно.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

К Калядам рыхтаваласа ўся сям'я: гаспадар, гаспадыня і дзеці ўдзельнічалі ў гэтым мерапрыемстві. Не елі до вечара ніхто ў сям'е. Прыбіралі ў хаці, засцілалі стол белым абрусам, варылі куцью, таўклі зерно. З этого зерна варылі куцью, медом запраўлялі, ізюмом. Зварыласа куцья, даждаліса первое зоркі, гаспадар адзяваў белую кашулю, гаспадыня адзяваласа тожэ ўсё ў чыстае прыбранне, садзіліса за стол. Перш чым начаць куцью, помоліліса Богу і ўкушалі первую страву – это куцья. Куцья эта была постная. Яе после ўкушэння астаўлялі на наступны раз. На наступны раз куцья на трынаццаць, ужэ на Шчадрэц, ужэ будзе куцья багатая. У гэтую куцью зажарвалі шкваркі, каўбасу і дабаўлялі ў гэтую куцью. Таксама садзіліса после первое зоркі за стол. Ужэ на столе было дванаццаць страў розных, ужэ не посных. Трэцяя куцья бедная. Яна была перад Крашчэннем на Водопосцье. Тожэ не елі ўвесь дзень до вечора Прыходзілі з цэркві, гэтую куцью даставалі, помоліліса Богу. Хазяін первы пачынаў гэтую куцью і благослаўляў. Дзень наступны – Крашчэнне. Перад крашчэннем прыходзілі з цэркві после вечернее і рысавалі крэсцікі на дзверах у хату, у хлеў. Оберог од усякіх злых духоў.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Сена лажылі на стол для таго, што быў такі звычай: калі нарадзіўса Ісус Хрыстос наш ў яслях на сені, не было ні адзення, нічого, погэтому сустракалі Ісуса Хрыста і лажылі сена на стол. Вызначалі, які будзе ўраджай лёну. Выцягвалі па адной сеніне. Еслі доўгае сена, значыць, будзе доўгі валакністы лён.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Перад самым Рождзеством у ноч галодная куцця. Вараць вячэру з 12 блюд. Ложаць на стол пад абрус сена. На першы дзень Рождзества Хрыстова сабіраюцца дзяўчаты і хлопцы хадзіць па вёсцы, спяваць рождзественскія песні. Робяць звязду вялікую, у сярэдзіне якой запальваецца свечка, і ідуць пад вокны хат, а хто захоча, той заве ў хату. Падыходзяць пад акно і просяць дазволу спяваць: "Добры вечар, пане гаспадару, дазволь песню заспяваць, ваш дом павіншаваць!". Гаспадар дазваляе пець. Госпада славіць і выносіць дары: каўбасу, сала, а хто і чарку паднясе. Дары называюцца калядой. Каляду збіраюць у торбу, а потым збіраюцца ў адну із хат, дзе і гуляюць. Калі гаспадар вынясе добрую каляду, то яго вельмі ўхваляюць, жадаюць здароўя, шчасця. Калядоўшчыкі гаварылі: "Калі, пане, не вынясеш каўбасу, то я тваю

хату разнясу!”. А сена, якое лажылі на галодную куццю, аддаюць худобе, як канчаецца каляда.

*Запісана ў в.Буразь*
*ад Дарошка Ніны Андрэеўны,1950 г.н.,*
*студэнткай Пятрычыц А.*

АБРАД «ШЧОДРЫ ВЕЧАР»

Гурт жанчын пераадзяецца ў цыганскія, нацыянальныя касцюмы. Радзяць аднаго ў касцюм казы і ідуць па хатах шчадраваць. Заходзяць пад акно і просяць дазволу спяваць: “Гэй, пане гаспадар! Дазволь казу вадзіць! З Новым годам павіншаваць, а нам добрыя дары даць!”. Патом пасля разрашэння заходзяць у хату, каза ідзе папераду і спяваюць песню ў першую чаргу гаспадыні:

Ой, на моры, да на сіненькам,
Ой, там ластаўка да купалася,
Да купалася, умывалася.
Ой, то ж была да не ластаўка,
Ой, то ж была да прочыстая.
Да купалася, умывалася,
К светлому дзяньку прыбіралася,
К светлому дзяньку да Васіленьку.

Пасля спяваюць жартоўную песню:

Ого-го каза, ого-го шэра,
Павярочайся, не саромяйся
То на той бачок, то сей бачок,
То на рожанькі, на капыцікі
На залатыя, на дарагія.
Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць,
Дзе каза нагой, там жыта капой,
Дзе каза рогам, там жыта стогам.
Упала каза, ляжыць не жыва,
Маці казала, каб далі сала,
А бацька казаў: рэшата аўса,
Рэшата аўса, наверх каўбаса,
Наверх каўбаса, каб каза ўстала.
Ой, ты, козанька, да не ляніся,
Па ўсёй хатаньцы да разганіся.
Дзе каза рогам, там грошай многа,
Дзе каза бяжыць, там жыта блішчыць.

Пасля кажуць: “Дай, божа, каб за год даждалі! А мы ж былі ў лозе да паймалі казу на одной нозе, пока другую прышылі да к вам прывелі, то трэба, каб вы добрыя дары далі!”

Заканчваецца тым, што гаспадары даюць дары і дзякуюць за каледаванне. Гурт ішоў з хаты ў хату. Доўга гулялі, пасля гадалі і дзялілі шчадрэц.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## ВАРАЖБА КАЛЯДНАЯ

На шчодры вечор перад Новым годом дзяўчаты збіраліся і варажылі, хто первы замуж пойдзе, хто як будзе жыць. Беглі на вуліцу, абнімалі забор: хто сколько дошок абніме. Калі пару, значыць, будзе ў пары.

Кідалі грэбенцы свое і хустку на ногі і калыхалі. Чый грэбенец первы выпадзе, той і первы замуж пойдзе.

На ноч под подушку лажылі мужчынскіе брукі, штаны. І казалі: "Сужаны, ражаны, прыдзі ко мне!"

Пяклі ладкі і неслі на вуліцу, кідалі. Дзе сабака гаўкне, у ту сторону замуж пойдзеш.

Кідалі валёнкі чэраз варота: куда ён носам упадзе, адтуль хлопец у дзяўчыны будзе.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

***

Пойдамо к тому,
Хто ў гэтом дому.
А ў гэтом дому
Господар жыве.
Пане-господар, уставай з посцелі,
Шчодры вечор.
Накрывай столы, дэ й дубовы,
Шчодры вечор.
Налівай чаркі, дэ й золотые,
Шчодры вечор.
Устрачай госцей, усе молодые,
Шчодры вечор.
От госці ідуць, дэ й козу ведуць,
Шчодры вечор.
Дзе коза топ-топ,
Там жыто сем коп,
Дзе коза рогом,
Тым жыто стогом,
Дзе коза хвостом,
Там жыто кустом.

***Запісана ў в. Хільчыцы***

*ад Казак Надзеі Архіпаўны, 1932 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

***

Шчодры вечар,
Каляда, каляда!
Добры вечар,
Каляда, каляда!
Пане-господару,
Ці спіш, ці ляжыш,
Ці нас не чуеш?
Адчыні акно,
Паглядзі ў гумно,
Што ў тваім гумне
Сам Бог ходзіць,
Скірты лічыць
І цябе клічыць,
Табе дар дасць,
З токам жыта,
Жанухне тваёй
Шубу да долу.
Сыночкам тваім
Да па вяночку,
Да па вяночку
Да па руцьвяненькім.
Пане гаспадару,
Просім не трымаць.
Кароткі світкі,
Сцюдзёна стаяць.
Наш дар невялікі:
Рэшата аўса
Рэшата аўса,
Наверх каўбаса.

***

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая,
Паварачвайся,
Не забывайся,
То на сей бачок,
То на той бачок,
То на рожачкі,
То на капыцікі,
То на залатыя,
На дарагія.
Дзе каза ходзіць –

Там жыта родзіць.
Дзе каза хвастом –
Там жыта кустом,
Дзе каза нагою –
Там жыта капною.
Дзе каза рогам –
Там жыта стогам.
Тут каза ўпала,
Здохла, прапала!
Гаспадар іде,
Каляду нясе,
А гаспадыня йдзе,
Кілбасу нясе,
А на рожачкі –
Два пірожачкі,
А на хвасточак –
Сала кусочак.
Ой, ты, казіца,
Ды й не ляніся,
Па ўсяму двару,
Ды й расхадзіся!
Прыступіся блізка,
Пакланіся нізка,
Гаспадару так –
Так як пану,
Гаспадыні так –
Так як Масленіцы!

***

Тыдзень, тыдзень да Каляд,
Пан наш да чэлядзі не рад.
Пайшла чэлядзь скачучы,
Пан за ёю плачучы:
“Каб ты намі замысляў!
Твая пані ліхая
На ўсю чэлядзь гукая,
Той хамут і дуга,
А я табе не слуга!”

***

Прыскакала Каляда на белым кані.
Яе конічак – ясны месячык,
Яе дужачка – ясна зорачка,
Яе пужачка – ясна звёздачка.
Яе вазочак з тоўстага лядку,

Яе кажушок з белага сняжку.

***

Прыйшла каляда звечара,
Прынесла дудак рэшата,
Паставіла на стоўпе,
Сама села на куце
Ды ў чырвоным кабаце.
Грайце, дудачкі, голасна!
А як там дзевачка плакала,
За нямілага ідучы,
Нялюбаму пасцель сцелючы:
"Пасцелька ж мая беленька,
Да будзець ад слёз макрэнька,
Нялюбы сам ноч спаць будзе,
А я ж, як бяроза белая,
А ён, як калода гнілая".

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

Ой, жарка-жарка каліна ў лузе,
Святы вечар, каліна ў лузе.
Ой, красна-красна дзеўка ў маліні,
Святы вечар, як пчолка гула.
Святы вечар, як пчолка гула.
Увайшла ў сені – сені зазвінелі,
Святы вечар, сені зазвінелі.
Увайшла ў хату – як зорка ўзышла,
Святы вечар, як зорка ўзышла.
Села а з сталом – панічы абселі,
Святы вечар, панічы абселі.

***

Ой, ці дома, дома сам пан-гаспадар?
Святы вечар, добрым людзям!
Калі ён дома – хай выйдзе на двор,
Хай выйдзе на двор да й зірне ў шчыры бор.
А што ў тым бары ды шуміць, ды гудзе?
Там пчолка-матка ідзе, два раёчкі вядзе:
Першы раёчак – нясе мядочак,
А другі раёчак – нясе вяночак.
Сыту сыціці і сынкоў жаніці,
Свечы шукаці, дочкі аддаваці.

***

Добры вечар таму,
Хто ў гэтым даму!
Нам не хочацца чакаць –
загадайце калядаваць.

***

Шчодрык, шчодрык,
Добры вечар!
Адкажы мне, чалавеча:
“Ці ісці, ці сесці,
Ці каўбаску з’есці?”

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Балоцька Марыі Іванаўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

– Ого-го, каза, ого-го сера,
Дзе рогі дзела?
– На соль праела.
Соль дарагая, шэрсць золатая,
Мерачка аўса, наверх каўбаса,
На печы авёс – вялікі парос.
На палу жыта нагамі збіта.
А ў тым жыце перапяліца
Вывела дзеці – люба глядзеці.
Тут каза ўпала, здохла, прапала.
Устань, козанька. павесяліся!
Гаспадар ідзе, каляду нясе,
І калядзіцу, і паляніцу,
І кусок сала, штоб наша козанька пачаставала.

***

Добры вечар, гаспадару!
Вынесь жа нам каўбас пару.
Ой, пахадзі каля печкі,
Пашукай нам перапечкі.
Пашукай жа нам каўбаскі,
Вынесь сала, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся,
Каб нажалі сто коп жыта,
Каб сям’я была ўся сыта,
Каб скацінка вадзілася,
Каб пшаніца радзілася.

***

Прыйшлі Калядкі ўвечары,
Прынеслі каўбасы і іншыя рэчывы.
Селі ўсе за стол на куце,
Дзеўкі разгуляліся,
Хлопцы расплясаліся.

***

Вы, калядачкі, вы ідзіце к нам,
А калбасачкі вынасіце нам,
А калядачкі – у двары, у двары.
А калбаскі – у вядры і вядры.
Вы калядачкі, вы вярніцеся,
На нас дзевачак агляніцеся.
А мы, дзевачкі, гуляць будзем,
Вас, калядачкі, успамінаць будзем,
Часта ў ваконца выглядаць будзем.

***

Добры вечар,
Каляда, каляда!
Добры вечар,
Каляда, каляда!
Паночак даражэнькі,
Ці ты спіш, ці ляжыш?
Адчыні акенцы,
Паглядзі ў гуменцы,
Хто ж нам што робіць.
Сам Бог там ходзіць.
Дабро тваё ліча
І цябе кліча.
Табе гасцінцы даець:
Поўна мяшок жыта,
Жонцы тваёй –
Шубу да долу,
Сыночкам тваім –
Па коніку, па вараненькаму,
Дачушкам тваім –
Па вяночку, па руцявенькім.

***

Калядзін, калядзін,
Караценькі кажушок.
Дайце мне піражок,
А наверх каўбасу,
А то хату разнясу.

*Запісана ў в. Людзяневічы*
*ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,*
*студэнткай Гуцэрман С.*

***

Го-го-го, каза,
Го-го-го, серая!
Ну-тка, козачка,
Расхадзіласа
По ўсему двару
Гаспадарскаму.
Дзе каза ходзіць –
Там жыта родзіць.
Дзе не бывае –
Там вылягае.

***

Рождзество Хрыстове, ангел прылецел,
Он лецел по небу, людзям песню пел:
"Все людзі лікуйце, той дзень торжэствуйце,
Есць Хрыстове Рождзество."
Я лечу от Бога, радосць вам прынёс.
Што в пешчере цёмнай радзілся Хрыстос.
Все вы поспешайце, младзенца вітайце
Новорождзенного.
Пастушкі в пешчеру преждзе всех прышлі.
В яслях на соломе Господа нашлі.
На колені палі, Хрысту дары далі
Новорождзенному.
Ірод злоречівый о Хрысце ўзнал,
Выбіць всех младзенцаў воінов послал.
Всех дзецей ізбілі, мечі прітупілі,
А Хрыстос в Егіпце был.
Все лета грашылі, Спас перед табой,
Все мы людзі грэшны, ты адзін святой.
Прасці согрешэнье, дай нам обновленье,
Есць Хрыстове Рождзество.

*Запісана ў в. Верасніца*
*ад Мажака Вольгі Іванаўны, 1948 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малешаў Жыткавіцкага р-на),*
*студэнткай Кошман А.*

***

Малады хлопчык хваліўся канём,
Святы вечар, хваліўся канём.
Хваліўся канём перад каралём!
Святы вечар, перад каралём!

Ні ў каго няма такога каня!
Святы вечар, такога каня!
Конь вароненькі, сам малодзенькі!
Святы вечар, сам малодзенькі!
Залата грыўка стаенку ззяе,
Святы вечар, стаенку ззяе!
Срэбраны капыт камень рубае.
Святы вечар, камень рубае!
Шаўковы хвасцец след замятае,
Святы вечар, след замятае.

***

Ого-го, каза,
Ого-го, сера!
Ой, расхадзіся, развесяліся
Па ўсяму двару
Гаспадарскаму!
Дзе каза рагамі –
Там жыта стагамі,
Дзе каза нагой –
Там жыта капой.
Шчэдрыку, шчэдрыку,
Казіны ражок.
Дай, бабка, піражок,
Рэшата аўса
І наверх каўбаса!

***

Шчадрую, шчадрую,
У клеці сала чую!
Дайце каўбасу –
Бацьку панясу.
Бацька будзе есці
І барадою трэсці,
Вусамі ківаць,
Дзетак успамінаць.

***

Шчадрую, шчадрую,
Хто ў гэтым дому?
Запасі шчэпку,
Ды пайдзі ў клетку,
Ды вазьмі аўса,
Наверх каўбаса.
Шчэ кусок сала –

Штоб свіння ўстала.

***

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Хто дасць сала,
Штоб твая свіння не ўстала?
Хто дасць аўса,
Штоб здохла аўца.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

***

Звязда ясна засіяла,
Звязда ясна засіяла,
Тром царам пуць паказала.
Прыносілі Хрысту дары ему прынесушчых,
На каленцах упадзюшчых.
Возвесціце в лазарэце,
Возвесціце в лазарэце,
Як Ісус Хрыстос нарадзіўся,
Як Ісус Хрыстос нарадзіўся.
Бо цар Ірад засмутніўся.
Слугі свое посылае,
Слугі свое посылае,
Ісуса ўбіць шукае.
Ой, цар Ірад, цар пракляты,
Ой, цар Ірад, цар пракляты,
Малых дзетак убівае.
Відзіт Бога,
Відзіт ворча,
Відзіт Бога,
Відзіт ворча,
За што ў міры пагібае.

***

– Го-го каза, го-го шэра,
Дзе рогі дзела?
– На соль праела.
Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць,
Дзе каза хвастом, там жыта кустом,
Дзе каза нагою, там жыта капою,
Дзе каза рогам, там жыта стогам.

На гары каза з казляняткамі,
Пад гарой заяц з зайчаняткамі.
Выскачыў заяц, начаў казу лаяць:
– Ох ты, козіца, старая жніца,
Узяла б ты сярпок, пашла б ты ў лясок,
Сваім дзетачкам травішкі зжала,
Дзетачак падгадавала.
– Ох, я баюся, ох, я сцерагуся,
Старога дзеда руса-вусага,
Он мяне ўб'е, шкурачку здзярэ.
Шкурачку на гарэлачку,
А мяса на тарэлачку.

***Запісана ў в. Заброддзе***
***ад Эсмантовіч Антаніны Цімафееўны, 1912 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

***

Пане-господар, ці спіш, ці ляжыш,
Шчодры вечор!
Уставай з посцелі, засцілай сталы,
Шчодры вечор!
Ці дома, дома сам пан-господар?
Шчодры вечор!
А нам сказано, шо й дома няма,
Шчодры вечор!
У гуменцы сядзіць, пшэнічку вее,
Шчодры вечор!
Ходзем до яго, розвеселімо,
Шчодры вечор!
Розвеселімо да й попросімо,
Шчодры вечор!
Ці не дасць он нам ды й по веялцы,
Шчодры вечор!
Ці дома, дома ды яго жона,
Шчодры вечор!
А нам сказано, шо й дома няма,
Шчодры вечор!
У святліцы сядзіць, пірожкі пячэ,
Шчодры вечор!
Ходзем до яе, розвеселімо,
Шчодры вечор!
Розвеселімо ды й попросімо,
Шчодры вечор!
Ці не дасць она да й по пірожку,
Шчодры вечор!

Хай дасць Бог, штоб за год дождалі.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.,*
*Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,*
*студэнткай Рыдзецкай Г.*

***

Шчадрую, шчадрую, коўбасу чую,
А за эту коўбасу я вам шчасце прынесу.
Калядзін, калядзін,
Я ў бацькі адзін
По колена кажушок,
Дайце, цетко, пірожок.
Шчодрую, шчодрую,
Коўбасу чую, дайце другую,
Ешчэ пошчадрую.

Потом коза падае, падае і ляжыць.

Як пойшла каза па ўсім сяле,
Да знайшла каза гаспадынечку,
Гаспадыню добрую.
Гаспадынечка-маліначка!
Нашай казе не шмат трэба,
І кусок сала, каб каза ўстала.
Давай на рожанькі
По два піроженькі.
На хвасточак прывяжы
Каўбасы шматочак,
Бо дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе каза рогам, там жыта стогам,
Дзе каза нагой там жыта капой,
Дзе каза хвастом, там жыта кустом.

Потым калядоўшчыкі развітваюцца з гаспадарамі і ідуць да другой хаты.

***

Прыехала Каляда ў вазочку,
Прыехала Каляда ў вазочку
Ды на сівенькім канёчку.
Прыехала Каляда ў вазочку ўвечары,
Прывезла дудак рэшато.
Паставіла дудкі на стаўні

І сама села на куце.
Зайграйце, дудкі, тоненька,
Скачыце дзеўкі хорашанька.
А вы, хлопчыкі, назірайце,
Сабе дзевак выбірайце.
Ой, рана, рана куры запелі,
Каляда, куры запелі.
Ой, яшчэ раней Ганначка ўстала,
Каляда, Ганначка ўстала.
Ганначка ўстала, коску ўчасала.
Каляда, коску ўчасала.
Коску ўчасаўшы, павы пагнала.
Каляда, павы пагнала.
Павы жанучы, пер’е збірала.
Каляда, пер’е збірала.
Пер’е збірала, ў хвартушок клала.
Каляда, ў хвартушок клала.
З хвартушка брала, веночак віла.
Каляда, вяночак віла.
Вяночак звіла, на Дунай пусціла.
Каляда, на Дунай пусціла.
– Хто вяночак пойме, той мяне возьме.
Каляда, той мяне возьме!
Ой, адазваўся малады Васілька,
Каляда, малады Васілька.
Я вянок паймаю, я цябе вазьму.
Каляда, я цябе вазьму!
Як ступіў нагою – на поле вадою,
Каляда, на поле вадою;
Як ступіў другою – на дно галавою,
Каляда, на дно галавою.

***

Добры вечар вам, ці рады вы нам.
Мы-то рады, ды хто вы такія?
Мы люд не просты, з далёкага краю.
Людцы мы ўсе сталыя з-пад самага раю.
Ідом ад пана Года, што носіць бараду
Шыроку, як лапату, сіву і лахмату.
Мы к лету ідзем, казу вядзем.
Ці шырока хата, каб нам танцаваці?
Ці добра гаспадыня, каб нас частаваці?
А ці дома, а ці дома сам пан-гаспадар.
А колі ты дома, то й отзовіса.
Засцілай стол шчэ й цесовый,

Налівай кубкі шчэ й золотые,
Бо прыдуць госці пірогоў есці.
Шо й одзін госцюк яснэ сонейко,
Другі госцюк – ясны месячык,
Трэці госцюк – дробны дожджычок.
Сонейко кажэ:–Як я ўзойду раным-рано,
Возрадуецца ўвесь мір хрышчоны,
Увесь мір хрышчоны, дзеткі маленькі
До цэркву ідуці, свечкі несуці.
Месячык кажэ: "Як я ўзойду,
Возрадуецца шчука ў моры,
Купец у дорозе,
Дожджык кажэ: "Ох, як я ўзойду,
Да возрадуецца жыто, пшэніца,
А ўсяка пашніца.
Святы вечор.

***

По ўсему свету стала навіна:
Дзева Марыя сына родзіла,
У яслях положыла,
Сном потрусіла
Господнего сына.

Дзева Марыя ў Бога просіла,
Шобы я сына свойго сповіла.
Ты, небесны цару, прышлі ты мне
Дару, сему дому, господару.

Сышлі ангелы з неба до землі,
Прынеслі дары дзеві Марыі,
Тры свечы восковы, шчэ рызы
Шоўкавы, Ісусовы Хрыстовы.

Воссіяла звезда, с неба до землі
Сышлі ангелы к Дзеві Марыі.
Поюць божы песні Господней
Невесці, радосці прыносяць.

***

Добры вечор, пане-гаспадару,
Ой, Каляда.
Хорошы маеш ты сыночкі,
Ой, Каляда.
Ой, што ж яны ў цябе робяць?

Ой, Каляда.
У святліцы золота важаць,
Ой, Каляда.
Тыя трыццаць пану-гаспадару аддалі.
А тыя чатыры нам, калядоўшчыкам.
Ідзем талакою, ўсіх віншуем з Калядою.
Сеем, веем, рассяваем,
З Калядою ўсіх паздраўляем.
Гаспадынечка-перапёлачка,
У цябе сырнікаў поўная полачка,
А ты нас частаваць будзеш?

***

Добры вечор, шчодры вечор
Твайму дому на ўвесь вечар.
Павітай жа і нас,
Прынесі нам каўбас,
Походзі возле перапечкі.
Гаспадынька, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся,
Каб пажала сто коп жыта,
Каб семейка була сыта.
Не кур, не вей, мяцеліца,
Гэй, Каляда,
Не завевай сцежак, дарожак,
Гэй, Каляда.
Ой, я ж пайду к матульцы ў госці.
Да матулькі ішла – вяночак віла,
Ад матулькі ішла – развіваючы,
Ой, па красачцы раскідаючы.
Да ўкінула ў ліпавы кусток,
А ў кусціку шэранькі ваўчок,
Гэй, Каляда.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Бобрык Таццяны Максімаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Добры вечар, гаспадару,
Добры вечар, гаспадару,
Вынясь жа нам каўбас пару.
Ой, паходзі каля печкі,
Пашукай нам перапечкі.
Вынесь сала, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся,

Каб нажалі сто коп жыта,
Каб сям'я была ўся сыта,
Каб скацінка вадзілася,
Каб пшаніца радзілася!
Шчадрую, шчадрую каўбасу чую,
Святы вечор, добрым людзям.
Дайце каўбасы, дамоў панясу.
Дайце другую, яшчэ пашчадрую.
Дарыце, не бярыце,
Кароткія світкі, памерзлі лыткі.

***

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе ж рожкі дзела?
На соль пераела,
Лезь, каза, на печ,
Пакажы чапец.
Лезь, каза, на кут,
Пакажы хамут.
Лезь, каза, на пол,
Пакажы хахол.
На печы авёс
Вялікі парос.
На палу жыта
Нагамі збіта,
А ў тым жыце перапёлачка
Вывела дзеці, міла глядзеці.
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Ганны Андрэеўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Слухайце, рабята, што ў хмары гудзе,
У хмары гудзе, сам Гаспод ідзе,
Сам Гаспод ідзе, трох гасцей вядзе.
Первыя госці – ясна сонейка,
Другія госці – дробны дожджычак.
Ухваляецца ясна сонейка:
– Ой, як я ўзыду ў нядзелю рана,
Да зрадуецца ўвесь мір хрышчоны,
Весь мір хрышчоны і нараджоны.
Ухваляецца дробны дожджычак:

– Ой, як я ўзыду на леці тры раз,
То пойдзе расці яра пшаніца,
Усяка пашніца.

*Запісана ў в. Дзякавічы*
*ад Рагалевіч Надзеі Іванаўны, 1915 г.н.,*
*студэнткай Чэркас Н.*

***

Ой, шчадзер, шчадзер,
Наш кіндзер-зладзей,
Украў кабылку, схаваў у адрынку,
Схаваў у адрынку, аблупіў шкурку,
Шкурку аблупіў, боцікі пошыў,
Боцікі пошыў, за вечор зносіў.

*Запісана ў в. Дзякавічы*
*ад Жураўлевіч Ганны Сяргееўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Чэркас Н.*

***

Ой, рано, рано куры попелі,
А яшчэ зараней дзевонька ўстала,
Дзевонька ўстала, коску часала,
Да цэркаўкі ішла.
Да цэркаўкі ішла,
Тры свячэ нясла.
Сустрэлі яе тры панічыкі,
Тры малойчыкі,
Пыталі яе, чыя ты дачка,
Ці ты папова, ці ты дзьякова?
– Я ні папова, я ні дзьякова,
Слічна панночка, бацькава дочка.

***

Ісус нарадзіўся, Бог воплоціўся,
Ангелы спявалі,
Чудо, чудо повевалі.

***

Усяго тыдзень да Каляд,
Ой, пан  чэлядзі не рад,
Скажу, пане, табе так,
Аддай, пане, мне каляду,
Я ад цябе ў свет пайду.

***

Ездзіў хлопча за рэчаньку,
Ой, Каляда,
Знайшоў хлопча падаляночок,
Падаляночкі – тры паненочкі,
Адна паненка ў злаце,
Друга – у срэбры,
А трэцця – у ядвабе.
Вам, дзевочкі, песня,
Каб вялікія раслі да замуж пайшлі.

***

Поіла коніка ў вядрэ,
Убачыла дзядульку на дне,
Кінула коніка поіць,
Пабегла дзядульку лавіць,
Не ўцякай, дзядулечко,
Не ўцякай, зязюлечко,
А ці ж я не пралейка?
А ці ж я не ткалейка?
Устану ранюсенько,
Напраду танюсенько,
Пастаўлю красенцы ў кутку,
Я табе штонікі адатку,
Тонкія, таненькія,
Белыя, бяленькія.
Ушыю гузік залаты,
Каб быў дзядулька молоды.

***

Маю ў Бога надзею,
Прыдзі, мой дзядзечко, у нядзелю,
Не ў гэту, дык у тую,
А тобе абед згатую.
Перац у ступе таўчэцца,
Кабан у пячэ пячэцца.
Перац на прыправачку,
А кабан у стравачку.

***

Пойду я праз тын глядзець,
Як мой дзядулька арэць,
Сошачка яловая,
Упражка шаўковая,
Конік воронюсенькі,
Дзядзько молодзюсенькі.

Сошачка зламалася,
А ўпражка порвалася.
Пайду на вулку глядзець,
Як мая бабулька прадзець
Тоненько, тонюсенько,
З пальчыкам раўнюсенько,
А прадзець, прадзець, мігціць,
Пад лаўку праснічку – і спіць.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

***

На новае лета
Радзі, Божа, жыта,
Жыта, пшаніцу,
Гарох, сачавіцу,
У клуні ўмалотна,
У дзежцы ўзыходна.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Касцюк Веры Пятроўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

***

Ой, рано-рано куры попелі,
Святы вечор!
Куры попелі, пеўні поселі,
Святы вечор!
А яшчэ раней Валечка ўстала,
Святы вечор!
Валечка ўстала, коску чэсала,
Святы вечор!
Коску чэсала, у цэркоўку ішла,
Святы вечор!
Сустрэлі яе два панічы,
Святы вечор!
Адзін путае: "Ці ты папова?"
Святы вечор!
Другі путае: "Ці ты дзякова?"
Святы вечор!
Я не папова, я не дзякова,
Святы вечор!
А я Валечка, Іванава дачка,
Святы вечор!

***

Дзе каза ходзіць –
Там жыто родзіць.
Дзе каза хвастом –
Там жыто кустом,
Дзе каза рогам –
Там жыто стогам.

***

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Святы вечар!

Дайце каўбасу –
Я да дому занясу.
Святы вечор!

Дайце мне грошай –
Падзякую большай.
Святы вечор!

Дайце крывянку –
Панясу Іванку.
Святы вечор!

***

Ой, пан-гаспадар,
Ці спіш, ці ляжыш,
Уставай з пасцелі – 2 р.,
Засцілай сталы – 2 р.
Сей дубовые,
Налівай кубкі,
Сей залатые,
Бо прыдзе к табе
Шчэ й тры госцейкі – 2 р.,
Тры малодчыкі.
Первы гасценёк –
Ясны месячык.
Другі гасценёк –
Ясна сонейко.
Трэці гасценёк –
Дробны дожджык.
Як я ўзыйду
Рано ўночы – 2 р.
Шчэ й у поўначы,

Вазрадуецца весь
Звер у лесі,
Купец у дарозі
На сівом кане.
Я як узайду
Утрам раненько –
Вазрадуецца весь
Мір хрышчоны,
Бабкі старыя,
Дзеткі малыя.
Як я ўзыйду
Тры раз у маю –
Возрадуецца жыто-пшаніца,
Жыто-пшаніца,
Усяка пашніца.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Васільеўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Шруб Г.***

***

Эх, Коляда,
Сярод двора крутая гора,
Сяты вечор!
А ў той горніцы Божая Маці,
Сяты вечор!
– Ой, Божа Маці,
Дзе Хрыста дзела?
Сяты вечор!
Занесла Хрыста ў цёмные леса,
Сяты вечор!
Лес ізрубілі, Хрыста не знайшлі,
Сяты вечор!
Прыйшлі до Божай Маці і пытаюцца:
– Дзе Хрыста дзела?
Сяты вечор!
Она отвечае:
– Рэкі ізбродзілі, Хрыста не знайшлі,
Сяты вечор!
Прыйшла дзеўка зноў до Божай Маці
– Дзе Хрыста дзела?
Она отвечае:
– На небесах.
Сяты вечор!
Тые небеса растворыліся,
А тое дзеўко засмуцілося,

Святы вечор!

***

Ой, рано, рано куры попелі,
Святы вечор!
Яшчэ раней дзеванька ўстала,
Коску чэсала, у цэркоўку шла,
Святы вечор!
Тры свечы несла.
А ў той цэркоўцы молодые попы
Ды пытаюцца:
– Ці ты дзякова, ці ты попова?
Чыя ты дачка?
– Я дачка Міхаілова,
Святы вечор!

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Мароз Анастасіі Архіпаўны, 1910 г.н.,***
***студэнткай Кошман Т.***

***

У Туровачку, у городочку,
У Туровачку, у городочку,
Святы вечор!
Да й не ўродзіла шоўкава траўка,
Святы вечор!
А по той траўке сцежкі-дарожкі,
Святы вечор!
Хто ж тыя сцежкі да й потоптаў,
Святы вечор!
Да й потоптала молода Любка,
Святы вечор!
Молода Любка ў цэркву йдучы,
Святы вечор!
Сустрэлі яе тры панічыка,
Святы вечор!
Пытаюць яе: "Чыя ты дочка?
Святы вечор!
Ці ты попова, ці ты дзьякова?"
Святы вечор!
"Я не попова, я не дзьякова,
Святы вечор!
Я молода Любка, Ягорава дочка".
Дай, Божэ, штоб дождалі,
Да й на той год заспявалі.

***Запісана ў г. Тураў***

*ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,*
*Шуткінай Марыі Ягораўны, 1958 г.н.,*
*студэнткай Івановай Т.*

***

Бегла Калядка пяшком,
Гэй, Каляда!
Несла пірагі мяшком, мяшком,
Гэй, Каляда!
Да й збегла да Івана,
Ад Івана да Сцяпана, Каляда!
Да Дзяніса,
Гэй, Каляда!
Ад Івана выйшла п'яна,
Ад Дзяніса выйшла лыса, Каляда!
А ў Івана куццю таўкуць, Каляда!
А ў Дзяніса пірагі пякуць, Каляда!
У адной хаце срэбра блішчыць,
У другой хаце сала шкварчыць,
Гэй, Каляда!

***

Ты запей мне песню,
Слаўнаму пану, слаўнаму пану,
Святы вечор!
Ды няма ні ў кога каня такога,
Ды няма ні ў кога двара такога,
Святы вечор!
А мы твайго двору не мінаемо,
Усю тваю сямейку велічаемо,
Святы вечор!
Святкуй на здароўе.

***

Ой, ці спіш, ці не спіш, пане Васіле,
Радуйся, зямля!
А колі не спіш, одзевай шубку,
Радуйся, зямля!
Одзевай шубку, выйдзі на ўлку,
Радуйся, зямля!
Да й послухаем, шо ў небе гудзе,
Радуйся, зямля!
А ў небе гудзе: сам Госпад ідзе,
Радуйся, зямля!
Сам Госпад ідзе з ученікамі,

Радуйся, зямля!
З добрымі людзьмі тут жа і з намі,
Радуйся, зямля!
Потым здоровы, красны панічык,
Радуйся, зямля!
Красны панічык, хлопчык Сярожка,
Радуйся, зямля!
О, радуйся, зямля!

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

***

Ражаство Хрыстовэ,
Ангел прыляцеў.
Он лецеў по небу,
Песні людзям пел.

Все людзі, лікуйце,
Весь дзень торжэствуйце,
Есць Хрыстовэ Ражаство.*

Я лечу от Бога,
Радосць вам прынёс,
Што в пешчере цёмной,
Родзілся Хрыстос.

Скорее поспешайце,
Младзенца вітайце,
Нового, рождзённого.*

Пастушкі в пешчеру
Преждзе всех прішлі,
В яслях на соломе
Господа нашлі.

На колені палі,
Хрыста праслаўлялі
Нового, рождзённого.*

Ірод злоречівый
Об Ісусе знал
І побіць младзенца
Воінов послал.

Сердзечко ізбілі,
Мечі прітупілі,
А Хрыстос усё жывой.*

Все мы согрешылі,
Божэ, пред тобой.
Все мы людзі грешны,
Ты одзін святой.

Просці согрешенье,
Дай нам обновленье,
Есць Хрістовэ Ражаство.*
* слупок паўтараецца два разы.

*Запісана ў г. Тураў*
*ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,*
*Шуткінай Марыі Ягораўны, 1958 г.н.,*
*студэнткай Івановай Т.*

**Варажба**

Сабраліся ўсе разам, у адну хату, дзеўкі выходзяць на вуліцу. Тут кожная з іх пытае імя першага сустрэчнага ёй чалавека (мужчыну). Лічыцца, што такім імем будзе называцца яе суджаны.

Выходзяць у цемнаце у дрывотню, бяруць палена з кучы пален і патом пры свеце глядзяць. Калі палена гладкае, то муж будзе добры, а калі пападзецца сукаватае, асабліва з трэшчынамі – то ён будзе дурны і сварлівы.

Выводзяць з канюшні каней праз аглоблю. Калі каторая зацэпіць аглоблю нагамі, то муж будзе сварлівы, калі ж пераскоча праз яе, то муж будзе ціхі і смірны.

Бяруць курыцу і прыводзяць у тое месца, дзе заранее прыгатавана ў трох месцах вада, хлеб, кольца (залатыя, сярэбраныя і медныя). Калі чыя курыца будзе піць ваду, то муж будзе п’яніца; калі будзе есці хлеб, то муж будзе бедны; калі возьме залатое кальцо – муж будзе багаты, калі сярэбранае кальцо – муж будзе ні багаты, ні бедны, калі ж сдвіня з места меднае – муж будзе нішчы.

Пералічваюць на лесніцах балясы, прыгаворваючы: “Удавец, маладзец”. І даходзячы да апошняй, слядзяць, на якім слове астанавіліся, такі і будзе муж.

Выходзяць да забора і гаворaць: “Загаўкай, загаўкай, сабака”. У якой старане пачуе дзеўка лай, у той старане будзе жыць замужам.

Кідаюць боты праз вароты на вуліцу, потым самі выходзяць і глядзяць: у якую старану ён павернуты наском, там і быць замужам. Дрэнная прыкмета для дзяўчыны, калі яе бот ляжыць павернуты да сваіх варот. Гэта значыць, што ў гэтым годзе не будзе ў яе вяселля.

Вывешываюць за вакно ключы, шчотку. Хто з прахожых іх пашавеля, то пытаюцца ў яго: “Як завуць?” Лічыцца, што гэтым імем будзеназывацца сужаны.

Бяруць вечарам, у пацёмках, з кудзелі пражу, начосваюць на грэбень і спускаюць за вакно. Перад сном глядзяць. якія валасы на грэбне, такія будуць і ў сужанага.

Бяруць скарлупкі грэцкіх арэхаў, рэжуць васкавыя свечкі на маленькія кускі. Устаўляюць у скарлупкі, пускаюць плаваць ў чашку, напоўненую вадой. Затым паджыгаюць свечкі сваёй скарлупкі. Тут заўважаюць: якая патоне, тая памрэ незамужняй; у якой хутчэй сгараць свечкі, тая хутчэй за ўсіх пойдзе замуж, а ў якой будзе гарэць дольшэ ўсіх, той не бываць замужам.

Дзелаюць з воска лебядзей па колькасці дзевак. Лябёдку малююць румянамі, а лебядзь застаецца белым. Тыя, хто гадае, выбіраюць для сябе лебедзя з лябёдкай, апускаюць у чашку з вадой і накрываюць платком. Перад тым, як легці спаць, глядзяць, як плаваюць лебядзь з лябёдкай. Калі плаваюць разам, то замужняя жызнь будзе сагласная; калі разышліся, то будзе вражда.

Наліваюць звечара ў румку вады, апускаюць кальцо і выстаўляюць на мароз. Перад сном трэба паглядзець, колькі бугаркоў, столькі народзіцца сынкоў, а колькі ямак – столькі дачок.

Кладуць пад падушку грабёнку і прыгаворваюць: “Сужаны, ражаны, прычашы мне галаву”. Той, хто прысніцца ноччу, і будзе расчэсваць валасы, той і будзе сужаным.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Беруць цэлы ліст бумагі ці газеты, яго мнуць рукамі, штоб ён стаў безформеннаю масаю, но штоб ён не стаў шарам, штоб застаўся непанятны контур. Як бумага гатова, яе трэба пакласці на дно перевёрнутай міскі, і падпальваюць яе спічкамі. Спаленую бумагу не шэвеляць і не разрушаюць формы пепла, падносяць к сцене, астарожна поворачваюць край тарэлкі, пока на сцене не будзе якая-небудзь цень, па очертанію якой судзяць а будушчэм.

По падлоге рассыпаюць перелічаные зёрны, а потом роўно ў 12 часоў ночы беруць з нашэста петуха (чорнага) і пускаюць яго ў хату, дзе сообразно з поведзеніем пціцы расцэньваецца будушчае. Еслі зёрна ўсе паклеваў, то ў гэтым годзе будзе ўдача і той, хто карміў, выйдзе замуж. Предположым, петух склеваў 3 зерна, значыцца, 3-я дзеўка пойдзе замуж. Калі петух зусім не клюе, это значыць неўдача ў гэтым гаду.

***Запісана ў в. Відошын***
***ад Агіевіч В.Р., 1926 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч М.***

Сабраўшыся, дзяўчаты складваюць свае пацеркі ў таз, і на выбар адна з іх апалае: чые пацеркі выпадуць хутчэй, тая дзяўчына раней другіх выйдзе замуж.

Кладуць свае пярсцёнкі ў кубак з вадой і накрываюць яго ручніком. Замужняя жанчына наўгад вымае гэтыя пярсцёнкі з кубка. У якім парадку будуць выняты пярсцёнкі, у такім парадку ўладальніцы іх выйдуць замуж.

***Запісана ў в. Калінаўка***
***ад Цырыбка Лукер'і Міхайлаўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

Маці ставіла пад ложак дачкі стакан з вадою, а на яго клала дзве лучыны, а раніцай пытала ў дачкі, які сон яна бачыла ноччу. Калі дзяўчыне снілася, што яна пераходзіла рэчку па масточку і ёй дапамагаў перайсці яе хлопец, то гэта азначала, што ў гэтым годзе яна выйдзе замуж, а хлопец, які дапамог ёй перайсці масток, будзе жаніхом.

Дзяўчына скідала валёнак, а потым кідала яго цераз забор. Куды паказваў насок валёнка, туды дзяўчына і пойдзе замуж, з таго боку трэба чакаць сватоў.

Перад тым, як класціся спаць, дзяўчына заплятала касу і прыгаворвала: "Суджаны, раджаны, прыдзі ка мне нараджаны, прыдзі, касу распляці". Хто ў сне распляце ёй касу, і будзе яе жаніхом.

Дзяўчаты пеклі бліны і з імі беглі пад вокны суседзяў і слухалі, аб чым ідзе гаворка. Калі яны чулі словы тыпу "ідзі", то гэта азначала, што ў гэтым годзе дзяўчына выйдзе замуж. Калі чула словы тыпу "сядзі", то будзе яшчэ год хадзіць у дзеўках.

Перад тым, як класціся спаць, дзяўчына пісала на паперках імёны хлопцаў і клала іх пад падушку. А раніцай выцягвала адну з паперак і чытала імя сваёга суджанага.

Перад тым, як класціся спаць, дзяўчына з'ядала лыжку куцці, на стуле побач з ложкам ставіла люстэрка, а каля яго клала хлеб і ставіла з вадою стакан. Калі дзяўчыне ноччу снілася, што ў люстэрку адлюстроўваецца хлеб, то гэта азначала хуткае замужжа, калі стакан з вадою – хадзіць ёй гэты год у дзеўках.

Дзяўчына выходзіла на дарогу і чакала, покуль на ей не пабачыць каго-небудзь. Калі першым на дарогу выходзіў стары мужчына, то ў гэтым годзе дзяўчына выйдзе замуж за старога, калі ж выходзіў малады мужчына – у гэтым годзе выйдзе замуж за маладога, калі старая жанчына – яшчэ доўга хадзіць у дзеўках, калі маладая жанчына – у гэтым годзе не выйдзеш замуж.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Субат Марыі Еўдакімаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

Раскладваюць у рад на чым-небудзь блінцы па ліку варажбітак, і кожная дзяўчына намячае адзін з блінцоў для сябе, пасля пускаюць сабаку і

глядзяць, у якім парадку ён прымецца за блінцы. Гэты парадак і служыць указаннем на час выхаду дзяўчыны замуж.

Гуртам ходзяць падслухоўваць пад вокнамі і па размове вызначаюць свой лёс.

***Запісана ў в. Беразіна***
***ад Касцюк Соф'і Сямёнаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

Насыпаць трэба пад падушку ячмень і сказаць: "Святы Андрэй, каму ячмень збіраць, прыводзь таго начаваць". Прысніцца ў гэту ноч жаніх.

"З панядзелка на аўторак, прысніся жаніхоў сорак. Усе ў шапках, а мой без шапкі". Сказаць гэтыя словы і легчы спаць.

У ноч з 13 на 14 студзеня сяброўкі збіраюць свой абутак і перастаўляюць адзін за адным папарадку к парогу. Чый абутак першы пераступіць парог, тая сяброўка першая пойдзе замуж.

У начоўкі кладуць расчоскі, потым іх палаюць (трусяць). Чыя расчоска першая выпадзе, тая першая замуж пойдзе.

Пякуць бліны. Першага бліна бяруць і ідуць на вуліцу, там пачынаюць яго есці. Стаяць, пакуль не забрэша дзе-небудзь сабака. У якім баку забрэша сабака, значыць, у той бок дзеўка пойдзе замуж.

Бягуць у двор і бяруць у шурцы абярэмак дроў, прыносяць у хату і кідаюць пад прыпечак. Калі парная колькасць дроў, значыць, у гэтым годзе пойдзе дзеўка замуж.

Пад падушку пакласці хлеб і ножніцы. Перад сном ціха сказаць: "Суджаны, ражаны, прыдзі ка мне вячэраць".

У поўнач з шуркі дроў выцягнуць палена. Калі роўнае, гладкае палена – бедны жаніх, няроўнае – багаты.

Кідаюць праз ашорстак чаравік. Накіраванасць наска і ўкажа бок замужжа дзяўчыны.

Кормяць пеўня. Калі певень старанна клюе зярняты, то муж будзе добры работнік. Калі ж певень часта падыходзіць да пастаўленай перад ім міскі з вадой, то муж будзе п'яніца.

Пытаюць, злёгку стукаючы па плячы, у прахожых імя. Якое імя ў прахожага, такое імя будзе і ў жаніха.

Носяць дровы ў хату, захопліваюць іх у рукі без ліку, а пасля падлічваюць, ці цотная, ці няцотная колькасць пален прынесена. Цот прадракае жаніха-хлопца, а лішка – удаўца.

Абхопліваюць наўгад рукамі некалькі частаколін. Калі цот – жыць у пары, лішка – сумаваць адной.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Ханені Фядоры Маркаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

Ліюць растоплены воск у халодную ваду і па фігуры, якая ўтварылася з іх, мяркуюць пра жаніха.

У гэтай варажбе вялікую ролю адыгрывае фантазія, яна багата заключэннямі: падабенства злітна з якім-небудзь прадметам са штодзённага жыцця. Так, шабля прадказвае жаніха-салдата, кола – грошы і, значыць, багатага жаніха.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Друк Елізаветы Клімаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

Перад сном кладуць пад падушку рэшткі ежы і запрашаюць прыйсці жаніха на вячэру. Мужчына, які прысніцца, і будзе жаніхом.

Пад койку ставяць на ноч пасудзіну з вадой з мосцікам праз яе. Хто правядзе ў сне праз гэты мосцік, таму і быць яе жаніхом.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Татур Алены Васільеўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

У пустым месцы клічуць жаніха. Пасля трохразовага заклікання абавязкова павінен з’явіцца чорт у вобразе жаніха. Тады трэба адрэзаць у яго кусок адзення і схаваць у сябе. З таго часу жаніх адчуе такую моцную цягу да дзяўчыны, якая заваражыла, што паўсюдна будзе шукаць яе.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Якімцавай Варвары Паўлаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

У час вячэры частку кожнай стравы (і цвёрдага, і сухога, і рэдкага) непрыкметна апускаюць у рукаў, а пасля ідуць у пустое месца і раздзяваюцца там. Апоўначы да іх з’яўляецца суджаны.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Аляксандравай Ганны Антонаўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

Клалі на пол ладкі і пускалі сабаку, чыю ладку тая першую ўхопіць – тая дзеўчына першая і пойдзе замуж. І яшчэ. Дзяўчыны бралі проса і беглі пад чыё-небудзь акно. Там, пад акном, яго высыпалі і прыслухоўваліся да таго, аб чым гаварылася ў хаце. Калі чулі словы “ідзі”, “чаго сідзіш”, “ступай” і г.д., то лічылася, што дзяўчына ў гэтым годзе замуж пойдзе, што да яе сваты прыйдуць. А калі пачуе словы “сядзі”, “пачынай”, то ў гэтым годзе замуж яна не пойдзе. Яшчэ бралі ў сваім двары дровы ў ахапку. Калі іх лік будзе чотны – выйдзе замуж, калі не – то дзеўка ў гэтым годзе замуж яшчэ не выйдзе.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Беруніч В.***

Пячэ маці бліны перад Новым годам, варыць куццю салодку. Хапаем па аднаму блінцу і бегом на вуліцу, слухаем, у яком боцы сабакі гаўкаюць, і там пойдам замуж.

Усе грэбушкі кідаем: чый першы выпаў, той пойдзе замуж скоро (па парадку лічаць).

На Новы год куцці ўхопім. Як відно, прылятаюць вороб'і і глядзім ці парныя вороб'е. Як парныя, то дзеўкі пойдуць замуж.

Вечарам усе бягом і ўбіраем кольем, бярэмо на ўсё рукі. Палічылі: як да пары – то пойдзе замуж, як не – то не.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

У ноч з 12 на 13 снежня насыпаць пад падушку ячмень і сказаць: «Святы Андрэй, каму ячмень збіраць, прыводзь таго начаваць». Прысніцца ў гэту ноч жаніх.

Пад падушку пакласці хлеб і ножніцы. Перад сном ціха сказаць: «Суджаны, ражаны, прыдзі ка мне вячэраць».

У поўнач з шуркі дроў выцягнуць палена. Калі роўнае, гладкае палена – бедны жаніх, няроўнае – багаты.

У ноч з 18 на 19 студзеня паставіць пад ложкам у галавах стакан вады з расчоскай зверху. Той, каму гадаюць, не павінен аб гэтым знаць. Ноччу прысніцца дзяўчыне жаніх, які ёй будзе валасы расчэсваць.

Вараць куццю і вяршок кладуць пад голаву. Жаніх прысніцца нявесце.

Кладуць сена на стол і накрываюць абрусам. Дзеўкі з-пад абруса цягнуць па сянінцы. Чыя даўжэйшая, у таго лён будзе лепшым і будзе болей падарункаў.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Людзяневічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

Гадалі з 6 на 7 і з 13 на 14 января. Варылі куццю, кашу елі, бегалі па ўліцэ, слушалі, дзе сабакі лаялі, туда дзеўка замуж пайдзёт. Заборы абнімалі, ці парна, ці нет. Бегалі пад окны, слушалі, што ў хаце гавораць. Дзе крычалі ілі громка гаварылі, то свекроў будзет варкатлівая. Было і гаданіе на зеркала. Зажыгалі свечы, ставілі перад зеркалам, садзілісь перад зеркалам і глядзелі, хто будзе ідці. Бывае і ўзнаеш, то будзе твая пара. А то кідалі камні ў калодзец. Як камень булькае, то свякроў будзе варкатлівая.

На куццю сматрэлі на неба. Еслі звёзднае – многа грыбоў і ягад будзе.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

Калядная карагодная гульня «Олей»

Гэтая карагод-гульня праводзілася ў час Каляд (на працягу ўсяго тыдня). У гэтай гульне галоўную ролю выконваў хлопец, які знаходзіўся ў сярэдзіне круга (карагода), ён і быў Олеем. Дзяўчаты ўтваралі карагод і спявалі:

– Цяпло, цяпло Олею.
Пад дубоваю карою садзі сабе самому.

Олей адказваў:

– Курна, курна, дзевачкі,
З пад дубовай карою сядзець сабе самому.

Дзяўчаты адказвалі:

– Дык бяры сябе, Олею,
Красну пану Олечку.

Олей забіраў сябе з карагода дзяўчыну ў круг і адказваў:

– Дзякуй, дзякуй, дзевачкі, за красну Олечку.

Зноў пачынаюць дзяўчаты вадзіць карагод, спяваюць песню Олею, той, у сваю чаргу, забірае зноў у ахвяру сабе дзяўчыну. Гульня заканчваецца тады, калі ў карагодзе не застанецца ніводнай дзяўчыны.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Кудзелька Мікалая Антонавіча, 1927 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Крэшчэнне святкуецца 19 января. Перэд Крэшчэннем вараць куццю. 18-га ідуць у цэркоў – гэто перве водосвяцце. Свецяць воду, прыходзяць з цэркві, садзяцца вячэраюць, бо ўвесь дзень не ядзяць. Куцця зовецца голодна. А ўжэ на Крэшчэнне ідуць у цэркоў свяціць воду. Воду свецяць у возеры, робяць крэст з лёду, обліваюць квасом бураковым. Вон знізу водою залівауса, шоб прымерз, а ў полонку мочалі галінкі з хвоі. Затым, як свяцілі воду, запальвалі свечкі. Як посвецяць воду, то ідуць домоў, запальваюць свечку да потроху косы прысмальваюць з чотырох бокоў, коб голова не болела і кажуць: «Ойца Сына і Святого Духа». Воду пьюць, то наліваюць у стакан. З той посудзіны не пьюць, шо налілі ў ее, кажуць, будзе порціцца. Кропяць водою хату, одрыну. А хлопцы, напіўшыса святое воды, ужэ ідуць у сваты. Шчэ прымалі сено з стола і давалі жывёліне, шоб з’ела.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,***
***студэнтам Кувікам А.***

На Крэшчэнне крэста з лёду вурубаюць. Обольюць его бурачным соком і нараджаюць лентамі з бумагі ўсякага цвету. Поп обязацельно свеціў воду ў полонцы. Людзі яе набіралі. Колісь козалі, шо од Роздва до Крэшчэння ніхто ў сваты не йдзе. Ды на Крэшчэнне ўжо постануць дзеўкі на берэзі, шоб хлопцы з лёду бачылі. Хлопцы на берэзі вугледзяць дзеўку да коўценуць тое воды, да ўжэ ідуць у сваты. І казалі заўсегда: «Іван Крэсціцель – усім святам проводзіцель».

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Маркевіч Валянціны Пятроўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Бабовіч М.***

**Стрэчанне**

Так говорaць, што зіма з летом встрэчаецца. А это не так, это, наверно, як ты ў цэркву ідзеш, то з Богом встрэчаешса. Еслі на Стрэчанне петух вады нап‘ецца, то на Благовешчанне пчолы вуляцяць. Значыць, будзе ранняя весна і цёплая.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Коліся моя маці казала, шо “Стрэчанье - гэто веснове свято. У еты дзень ноч і дзень становіліса одінаковымі, роўнымі. З гэтого дня почыналі ўжэ гукаць весну. Дзеўкі збіраліса разом і спевалі першыя весновые песні. От етого дня богато, шо значыло ў жызні чоловека, бо почыналіса некоторые подготоўкі до сеўбы, да і за погодою нагледалі ў еты дзень. Ек на Стрэчанье будзе сонцэ, то лето будзе цёплым і сухім. А самэ глаўнэ, шо ў еты дзень ходзілі освечаць у цэркві свечку громнічную. З вечора бацько стараўса ее ссукаць, да веліку, шоб на ўсе лето хваціло ее. Сукаць трэба ее з свойго обезацельно воску, но не позычаць, а ек нема, то вуменяць на пшеніцу, просо, ечмень, ну на шо-небудзь, шоб сеяць можна було, бо вуменяны трэба, шоб пряняла земелька. От ек велікі гром, то ў еты дзень подпальваюць етую свечку і освечаюць кождэе окно у хаці, освечаюць хлеў, дзе худоба. От ек вугоняюць першы раз корову на пашу, то обезацельно беруць ету свечку і обкурваюць корову, шоб вона не боялася “дурного вока”, шоб давала богато молока, домоў шоб ішла і нідзе не блудзіла. Шчэ ету свечку запальвалі пры родах, ек баба-повітуха прымала роды ў породзіхі. На Стрэчанье збіраласа ўся родня ў хаці, частоваліса, а дзеці гулялі ў гульні, дзеўкі почыналі співаць весновуе песні.

***Запісана ў в. Бечы, в. Азяраны***
***ад Аліфіравец Праскоў'і Мікалаеўны, 1911 г.н.,***
***Якубоўскай Евы Іванаўны, 1932 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

Да Грамніц людзі рыхтуюць васковыя свечкі, якія асвячаюць ў самое свята ў храме за абедняй, а таму яны і называюцца грамнічнымі.

Пасля прыходу з царквы гаспадар дома на крыж падпальваў таю свечкай валасы на галаве ва ўсіх членаў сваёй сям'і, таму што грамнічныя свечкі грамяць сілу д'ябальскую ў асобе ведзьмаў і чарадзеяў і ахоўваюць ад хвароб галовы.

Грамнічныя свечкі запальваюць і ў час навальніцы і смерці людзей, у руках з якой чалавек выпускае апошні дух.

З Грамніц земляроб ужо думае аб вясне, аб будучых палявых работах.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Ханені Аляксандры Васільеўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

**Масленіца**

Самай галоўнай ежай на Масленіцу былі бліны. Кожная гаспадыня рыхтавалася да масленічнага тыдня і выпякала бліны, таму што яны ў сабе малі вялікую сілу агню, вады і зямлі. Дзяўчаты вечарам варажылі на бліны, кідаючы іх, а потым слухаючы, у якім баку забрэша сабака: туды і пайсці замуж. Масленым тыдням называўся таму, што ў доме гаспадыні гатавалі ежу ў асноўным на малаку і печава гатавалі толькі на масле. На Масленіцу моладзь наладжвала "качэлі" (гуталкі) і гушкаліся, каталіся з горак, гулялі ў сняжкі. Дзяўчаты часта жартавалі над хлопцамі, зрабіўшы ім нешта няёмкае: прывязвалі на адзенне ззаду палку, падпіралі ў хаце дзверы. Самым забаўным і абавязковым было катанне з горак, дзе збіралася гуртамі моладзь. Дзяўчаты збіраліся сваім гуртом, ішлі да сваёй горкі, якую з вечара палівалі вадою дзеля таго, каб яна была скользкай. Перш чым катацца з яе, акроплівалі маслам, кідалі ўніз з горкі блін, а потым першае права з'ехаць з горкі давалася дзяўчыне, якая была ўжо засватаная. Гэта сведчыла аб тым, што калі засватаная дзяўчына спусціцца першай, то за ёй усе астатнія абавязкова ў гэтым годзе выйдуць замуж.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

На Масленіцу варылі яйца, рабілі сыр кліночкам, масла. Водзім з дзеўкамі карагод. Пойдом, дзе самы вышэйшы стог сена, залезаем, стопчам, бяромся за рукі і пяём:

Гу, вясна, гу, красна,
Да што ты нам прынесла,
Да ці сыра кусок,
Да ці масла брусок,         3 р.
Ці па яечку,
Ці па піражэчку.

Злезлі з стога, бяромся за рукі:
Гу, вясна, гу, красна,
Усе мацеры
Ткуць кросна.
А мая маці не ткала
Ды за комінам спала, 3 р.
Да пад лёд мучачкі пхала.
Ды плывеце, мучачкі, толокном,
Да прыплывіце к маёй маці полотном.

Таксама спявалі:
Свінья рые, корань чуе,
Вол бушуе, вясну чуе,
Воран крачэ, сыра хоча,
Дзеўка плача, замуж хоча.
Не рый, свінья, шчэ нарыешся,
Не бушуй, валіна, набушуешся,
Не крач, воран, шчэ накрачэшся,
Не плач, дзеўка, выйдзеш замуж,
Шчэ наплачэшся.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Масленіца – ето ў народзе одзначаецца як абрад, старінны обрад на прадвесні. Ну, это ўжэ вясновы абрад. Гаварылі ў народзе тады такую прымаўку: «Масленка белая вуточка. Гаварыла: “Вясна будзе, ды не хутко». Ну, после Масленіцы, яшчэ часто буваюць і мяцелі, і завеі. Масленіцу святкавалі ў нас уродзе бы казалі ў гонар Перуна, які буў Богам. Людзі вельмі верылі яму і таму святкавалі гэтую Масленіцу. Патаму шо яны верылі, шо ён як бы прэдасцярагаў, ахоўваў жывёлу. І ён буў памочнікам пастухоў. Сама Масленіца царквою ніколі не одзначалася, одзначалася яна толькі ў народзе. Патаму, шо ето народнае свята. І пачыналася сама Масленіца з «дзедаўскага тыдня». Масленіца перш-наперш одзначалася блінамі і варывом з малаком. Першы блін лажылі обязацельно для «дзядоў», ето для душ памершых. Пяклі розныя бліны з грэчкі, з бульбы, аўсяныя, з сырамі, з каноплямі. Масленіцу сустракалі ўсе жонкі з сыром, раней прыгатаваным, з сухім. Ну, его бралі, оттопвалі сыр, да яго аджымалі, перамешвалі з соллю, а далей яго засушвалі ў пячы і ўжо спецыяльна гатовілі для таго, шоб сустракаць Масленіцу з гэтым сыром. З пріходам Масленіцы заканчвалася халасцяцкая жызнь. Трэба було на Масленіцу обязацельно выбраць сабе нявесту, то ўжэ як дзе ў сяле буў стары халасты хлопец, то дзеўкі стараліся падперці дзверы яму калодаю, шоб ён на Масленіцу з хаты не вылез, шоб не прыйшоў у сваты. Бо, як прыйдзе ў сваты ў дзень Масленіцы , то хочаш – не хочаш, а замуж за яго ідзі, бо так було ў старыну. Як хочаш, а як прыйшоў стары хлопец, да

прыйшоў к табе ў сваты на Масленіцу, ужо і бацькі не пярэчылі, а раз прыйшоў, будзь добра, ідзі за яго замуж. То ўжэ стары халасцяк, дзе жыў, у якой хаце, то ўжо дзеўкі сабіраліся ўсей кучай, ды пойдуць туды пад дзверы, ды падапруць добраю калодаю, шоб ён не вылез з хаты цэлы дзень.

Ну, Масленіцу святкавалі цэлую нядзелю і называлася «масленічная нядзеля», «масленічны тыдзень».

У нас усе-ўсе людзі ў сяле на Масленіцу выносілі свае сяннікі. А шо таке сяннік? Ето таке було пошыто з палатна. У ето полотно набівалі солому, ці сено і лажылі на ложак і на пол, дзе спалі на гэтым, спалі цэлы гол. Янэ ж патрэплецца, памнецца тэе сено. Да і за год жа чалавек бувае, шо чалавек хварэе, ды і ляжыць на гэтым сянніку, то ўжэ на Масленіцу ўсе людзі выносілі на вуліцу, да рабілі пудзіло, да спальвалі ўсе гэтыя набітыя саломаю сяннікі. Гэта лічылася, шо аны ачышчалі сваю хату, свой хлеў ад зла, от нечысці, от хваробы. І збіралася навек маладзёж, усе кучаю сабіраліся, шлі на рэку. На рацэ ўрубвалі дзірку, як кажуць, палонку. Туды забівалі шост, к гэтаму шосту прывязвалі санкі, і хлопцы гэтыя санкі раскручвалі, а дзеўкі садзіліся на гэтыя санкі і гэтак цэлы дзень каталіся на тых санках.

А перад Масленіцаю, як за дзень да Масленіцы, хлопцы і дзеўкі збіраліся, дзе высоке места, да аблівалі вадою яго, тое места, шоб ужо ў раніцу була коўзалка, да ўжо коўзаліся на той коўзалцы. А дзеўкі стараліся, пака хлопцы не ўстануць, стараліся забегчы на тую коўзалку і пусціць першага бліна па той коўзалцы, маслам памазанага, шоб ето скарэй замуж выйсці. Бо вельмі ж на Масленіцу трэба було ісці ў сваты, як любіліся. Хлопец дзеўку любіў, то ўжэ ў дзень Масленіцы обязацельно прыходзіў у сваты. От так спраўлялася Масленіца .

*Запісана ў в. Чэрнічы*
*ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,*
*студэнткай Хільман І.*

Масленіцу ў нас вельмі інцерэсно спраўлялі. От у дзень Масленіцы обязацельно, обязацельно готовілі бліны. А ўвечары збіраласа молодзёж перэд Масленіцаю. І от ідзе высоке место (узгорак), облівалі яго водою, шоб за ноч покрылосо такім льдом, шоб потом добрэ було коўзацца. І от на другі ранак збіраласа ўся молодзёж на тую горку. І перш чым спусціцца першым з тое горкі, кідалі блін, а блін обязацельно змазвалі маслом. І от як блін поехаў з гэтае горкі, то саджалі ў сані тую пару, котора ўжэ засватана. І ўжэ та пара спускаласа з горкі. А дзеўкі вобшчэ таке выраблялі! Коліся ж шо казалі. Калі хлопец холосцяк, ды шчэ не жанаты, дзяўкі яго не любяць, бо ён стары, а жаніцца ж яму трэба було. А ў дзень Масленіцы буў такі обычай, шо як прыйдзе хлопец у хату к дзеўцы, она не імее права яму адказаць, таму шо пойдзе проклящце на ўсю сем'ю. І дзеўка хоцела, ці не хоцела, а бацькі застаўлялі іці замуж. То шо дзеўкі робілі? Ужэ ж оны зналі по селу, дзе жывуць старыя хлопцы, то яны з самага ранку колодою подпіралі дзверы, шо эты хлопец з хаты не вылез, бо як вылезе з хаты, то ён жа прыйдзе ў сваты, а дзеўкі сабе катаюцца на санках. А далей шчэ збіраліса на рэку, да на рацэ

пробівалі такую дзірку, а ў тую дзірку ставілі шоста, к тому шосту прычэпвалі санкі, сажалі на санкі столькі людзей, і хлопцы роскатвалі етого шоста, і етыя санкі коталіса, коталіса. А бывае, як оторвуцца, то по ўсёй рацэ ляцяць тыя санкі. На Масленіцу обязацельно стараліса спаліць сеннікі, бо ў іх аставаласа і хвороба, і не добрэ, шо було за зіму. На Масленіцу песень у нас почці не спявалі, в основном, гадалі. Ото напекуць бліноў, да з самага ранку, шчэ як не світае, дзеўка бярэ ў мацеры бліна да пойдзе, да кіне этага бліна дзе-нібудзь, на якіх росходніх дорогах. Да ўжэ стоіць да карауліць, чый сабака ўхопіць того бліна.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Лой Ганны Пятроўны, 1955 г.н.,***
***студэнткамі Бабовіч М., Быкавай Ю.***

Масленіца ў народзе адзначаецца як абрад, які святкаваўся ў нас на прадвесні. Гаварылася ў народзе така прымаўка: «Масленка – бела вутка. Говарыла вясна: «Буду, ды не хутка». Царквою Масленіца не адзначалася, а толькі ў народзе. Пачыналась Масленіца з «дзедаўскага тыдня». Масленіца адзначалася перш-наперш ежай: блінамі і варыво з молоком. Первы блін обязацельно клалі для дзядоў. У последні дзень Масленкі (а вона спраўлялася тыдзень) палілі пудзіла альбо старыя соломяныя сеннікі, набітыя соломай, на якіх спалі цэлу зіму. Лічылі, шо так адбывалося ачышчэнне, агонь спальваў зло, хваробу. Пасля спальвання попел раскідвалі по полі, кеб воно було больш уродлівым. Катаючыся з горак на санках, спальваючы пудзіла, так праводзілі зіму.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Свята Масленіца звычайна праходзіць каля клуба. Ідзе бойкі гандаль блінамі з павідлам, гарачым чаем і рыбнай юшкай. Пляцоўка ўпрыгожана ручнікамі, тканымі дзяругамі. Усю вёску аб’язджаюць на конях з вясной (дзяўчынай, апранутай у вясну), а тым часам зазывалы запрашаюць людзей:

Ах, бліны, бліны, бліны!
Усе паспрабаваць далжны.
Яны з пылу, яны з жару,
Пакаштуйце пару.

Блінчыкі, блінчыкі,
Блінчыкі-аладушкі.
Частуйцеся, частуйцеся,
Частуйцеся, рабятушкі.

Ой, народ, ты не стой у варот,
Спяшайцесь, спяшайцесь,

Вам дастаўляць радасці
Рычоўскай чайнай сладасці.

Не мяркуй і не гадай.
Бліны чаем запівай.
Яны вельмі харошы,
Ешце, людзі, ад душы.

Прыдзі, вясна, з песняю,
Прыдзі, вясна, з радасцю.
Гу, вясна, гу, красна!
К пляцоўцы гулянне прыбліжаецца.

Тройца коней, на якіх едзе вясна, са сваёй світай спяшаецца. Вяснянкі вакол вясны водзяць карагод, то самкнуўшыся ў вялікае кальцо, то выцягнуўшыся ў ізвіваючыся ручаёк. Плывуць яны пад пяшчотнымі рытмамі і спяваюць.

Усе людзі разам сустракаюць вясну з песнямі:

Ой, вясна, вясна,
Ды як жа ты красна.
Мы для цябе спяваем,
Цябе, мілая, сустракаем.
Спявайце ж, бабкі.
Кожны ля сваёй хаткі.
Жаўрук на небе лятае,
Вясне песенку спявае.
Дзеткі нашы гурбою
Весяляцца вясною.
Будзем кветкі збіраць,
У вяночкі ўплятаць.

Вясну сустракаюць караваем, які потым дзеляць на часткі і раздаюць людзям. Пасля частавання людзей караваем на пляцоўцы праводзяцца розныя гульні, танцы, спяваюць масленыя песні:

Вол бушуе – вясну чуе,
Воран крача – сыру хоча,
Баран блее – у поле хоча,
Курачка сакоча – у поле хоча.

Напрыканцы свята ўсе паляць зіму і выконваюць песню.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Бурак Галіны Мікалаеўны, 1947 г.н.,***

***студэнткай Матарас Н.***

На Масленіцу пеклі бліны, аладдзі, варылі всё. Выпівалі, пелі народныя песні, вадзілі хараводы. Гасцей прыглашалі, хадзілі з хаты ў хату, банкатавалі. З Масленіцы ажыдалі Пасху.

І туда гара, і сюда гара.
Между цемі крутымі гарамі
Всхадзіла луна.
А то не луна, дзевка малада:
Брові чорны, лічэнько беленько,
По воду ішла.
– Дзяўчына мая, напаі мне каня
Вот і с той жа новае крыніцы,
Поўнага вядра.
– Як буду твая, напаю каня
З той жа новае крыніцы,
Поўнага вядра.
– Дзяўчына мая, садзісь на каня,
А мы сядзем-сядзем да паедзем
Да майго двара.
А ў маём дварэ нічога няма,
Толька вырас адзін куст каліны
І та не расцвіла.

Вельмі прыгожыя і цікавыя гульні былі на Масленіцу. Выбіралі высокі ўзгорак, прымацоўвалі там шост і прывязвалі на ім сані. А потым каталіся на іх, жартавалі і рагаталі. Таксама спускаліся на санях з гары. Мужчыны біліся, ездзілі на конях. Абавязкова ў гэты дзень трэба было з’есці як мага болей бліноў, асабліва з маслам, бо гэта быў абавязковы атрыбут. Акрамя масла бліны рабілі з рознай ежай. Лічылася, чым больш з’ем бліноў, тым больш у хаце ў цябе ўсяго будзе.

***Запісана ў в. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнтам Краўцовай Р.***

Раней пеклі бліны да госцяваліса. Ды й усё.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

А сёння ў нас Масленка, Масленка,
Ой, лялю, рана Масленка, Масленка!
А з-пад куста ластаўка, ластаўка,

Ой, лялю, рана ластаўка, ластаўка.
Сядзіць яна высока-высока,
Ой, лялю, рана высока-высока.
Бачыць яна далёка-далёка,
Ой, лялю, рана далёка-далёка.
Што ў вёсцы дзеецца, дзеецца,
Ой, лялю, рана дзеецца, дзеецца.
Дзевяць хлопцаў жэняцца, жэняцца,
Ой, лялю, рана жэняцца, жэняцца.
Дзевяць дзевак вянчаюць, вянчаюць,
Ой, лялю, рана вянчаюць, вянчаюць.

***

А на гарэ, на гарэ ды й на камяніцы,
Масленіца, Масленіца.
Як убачыў дзяцюк дзеўку,
Скінуў рукавіцы,
Масленіца, Масленіца.
А на гарэ, на гарэ, ды й на камушочку,
Масленіца, Масленіца.
Як убачыў дзяцюк дзеўку,
Скінуў і сарочку,
Масленіца, Масленіца.

***

(Каля вогнішча)
Гары, гары гарка,
Прыедзе кухарка.
Кухарка – на карове,
Кухар – на кабыле,
Дзеці – на цялятах,
Слугі – на шчанятах.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Балоцька Марыі Іванаўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

А ў нас Масленіца ж, Масленіца,
Да прыляцела ластавіца ж, ластавіца.
Села ў пана на таку, на таку,
А пан кажа: “Засяку, засяку!”
–Не сячы мяне, паночак, не сячы,
Буду табе служыці, служыці.
Тваіх дзетак карміці, карміці.

***

А я думала, Масленкі сем нядзель,
Я думала, Масленкі сем нядзель.
Астаецца Масленкі адзін дзень,
Астаецца Масленкі адзін дзень.
Масляная, шчаслівая,
Расцягніся да Вялі-і-кадня!

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

***

Маладзіца, маладзіца маладая!
Выйдзі к нам на вуліцу,
А вынесь нам сыр,
А народзіш сына.
А вынесь ты мачку,
А народзіш дачку.
– Як я маю выходзіць,
Свёкар скажа: пазаўгольніца,
А свякруха скажа: пахмурніца,
А дзевер скажа: палятуха,
Заява скажа: шчабятуха.
– Маладая маладзіца,
Умей гэтак адказаці:
Пазаўгольніца, заўгольніца –
Свіння чорна.
Пахмурніца – цёмна хмара,
Палятуха – ластавіца,
А шчабятуха – сарока!

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Ханені Аляксандры Васільеўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

## ВЕСНАВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

### Гуканне вясны

Вельмі хорошы буў обрад у нас у Семурадцах гукаць весну, ето значыць – замукаць зіму. За ніделю до Масленіцы, на дзень святое Еўдокіі, почыналі гукаць весну, бо от яе завісеў будушчы ўрожай. Шоб весна була доброю, догодлівою, то ее клікалі, спраўлялі обрад. До етого обраду готовіласа кожная жонка, пекла пірожкі, як бы птушачкі, варыла яйца, готовіла зараней сыр, ставіла его под гнёт, шоб вон буў цверды і можна було порэзаць его на кусочкі. Масло колоцілі зараней. Усе етэ складалі ў вузелочкі кожному дзіцяці поособку, шоб не сварыліса. Сколько було ў сем'е дзецей, столько маці готовіла вузелкоў. Гукалі весну дзеці і молодзёж, ето хлопцы і дзеўкі. З самого ранку бралі вузелкі, залазілі на вушкі, горышчэ, крышу і гукалі весну песнямі-веснянкамі. Молодзеж обучно збіраласа на вусокіх местах, горках, ці на вусоком берагу рэкі. Хлопцы роспальвалі огонь, а дзеўкі пачыналі вадзіць карагоды з песнямі-веснянкамі. Гулялі ў гульні, гуталіса на гуталках. Була такая гульня "Тычка", на якую прычэпвалі жменьку соломы. От одна з дзевок чэпляла голінкаю за солому, ек бы прадзе кудзелю, а сама гледзела, якой бы дзеўцы, ці хлопцу сцёбнуць голінкою по ногах. Кому она сцёбнула, той садзіўса ў круг карагода. І так гулялі да тых пор, покуль не астанецца одзін чалавек, которому давалі право поцоловаць дзеўку (ці хлопца). На гуталках гуталіса, хто вушэй гутнецца, коло огню пеклі еечню, частоваліса тым, шо положыла маці ў вузелкі. Спевалі весновые песні:

Ой,весна, моя весняночка,
Ты прыдзі да нас красняночка.
Узыдзі рано красно сонейка,
Заглені рано ў ваконейка.
Збудзі рано красну дзевіцу,
Красну дзевіцу і малодзіцу.
Акуні ў сваю іх водзіцу.
Ой, весна, моя весняночка,
Ты прыдзі да нас красняночка.

***

Весна-красна, а зіма хароша,
Весна-красна, у-гу, весна.
Кідай сані, а сядай на воза,
Весна-красна, у-гу, весна.
Весна-красна, што ты нам прынесла?
Весна-красна, у-гу, весна.
Я прынесла хлопцам па кіёчку,
Весна-красна, у-гу, весна.
Хлопцам па кіёчку, дзеўкам па вяночку,
Весна-красна, у-гу, весна.

А старэнькім бабкам усім па вузелочку,
Весна-красна, у-гу, весна.
Весна-красна, а зіма хароша,
Весна-красна, у-гу, весна.

А ў Буразях гукалі весну до Масленіцы, тому шо начынаўса велікі пост. Весну гукаюць молодые дзеўкі, хлопцы і дзеці. Мацерэ пекуць обычно жавороночкоў, булочкі, пернікі, вараць яйца, прыготоўляюць сыр, масло кусочкамі. Бралі етэ ўсе і завязвалі ў вузелкі. Залазілі гукаць весну на вушкі. На сено просцілалі скацерць, роскладвалі кожны свой вузелок і гукалі весну песнею:

Гу-у, весна, гу-у красна,
Ой, шо ты нам прынесла?
Ці по еечэчку, ці по пірожэчэчку,
Ці масла брусок, ці сыра кусок?
Гу-у, весна, гу-у красна,

Спевалі і такую песню:

Вол бушуе,весну чуе-2р.,
Воран крача, сыра хоча.
Воран крача, сыра хоча-2р.
Дзеўка плача, замуж хоча.
Не крач воран – накрачэшся-2р.,
Не плач дзеўка – нажывешся.
Вол бушуе, весну чуе-2р.,
Воран крача, сыра хоча.

***Запісана ў в. Сямурадцы, в. Буразь***
***ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.,***
***Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.***
***дырэктарам РЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

Гэтае свята прыпадае ад Масленіцы або ад Стрэчання да Благавешчання (7 красавіка) і прадаўжалася да таго часу, покуль не ўзаруць поле, аж да Вербніцы (перадвелікодная нядзеля).

Дзяўчаты выходзяць на гумно, залазяць на страху і пяюць вяснянкі. Калі ідуць на вуліцу, з тымі ж песнямі водзяць ля бані, збіраюць кастрыцу ад льну, разводзяць агонь. Каля агню спяваюць вяснянкі. Потым ідуць на гарышча і гукаюць вясну, спяваюць вяснянкі:

А ў нас дзевачкі – дарагі тавар!
Руднецкія хлопчыкі, перайдзіце к нам!

На Звеставанне клікалі і буслоў, зазывалі птушак хутчэй прынесці вясну:

Ой, вясна вясёлая,
Нарасла трава зялёная.

Ой, птушачкі, прыляціце,
Весну з сабой прынясіце.

Як і на Купалле, на гуканне вясны пры кастры спявалі гукальныя вяснянкі і вадзілі карагоды, скакалі праз агонь. Агонь абазначаў канец зімы і пачатак вясны, ачышчэнне зямлі. За вёскаю запальвалі кола, якое сімвалізуе сонца. Уверх падкідвалі выпечаныя з цеста птушкі, яно павінна было выклікаць першых вестуноў вясны – жаваранак:

Жаваронкі, прыляціце,
Весну нам прынясіце,
Бо зіма надаела –
Усё ў хаце пераела.

У канцы свята ўсе выходзілі, станавіліся вакол вогнішча і спальвалі “зіму” (макет). Пасля гэтага ўсе радаваліся, што прыйшла вясна, спявалі песні з запрашэннем да вясны заняць сваё месца.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Перад самым “гуканнем” усе, у асноўным жанчыны з дзяўчатамі, шлі на якую-небудзь горачку. На гэтай горачцы раскладвалі і палілі вогнішча. Тут усе разам гукалі вясну:

Гей, гей, вясна, што ты нам прынясла:
Старым бабкам – па піражочку,
Старым дзядкам па кіёчку,
А малым дзеткам – па яечку.

Або яшчэ спявалі:

Вол бушуе – вясну чуе,
Дзеўка плача – замуж хоча,
Не бушуй, воле, бо яшчэ наарэшса,
Не плач, дзеўка, бо шчэ нажывешса.

У гэты дзень каталіся на арэлях, спявалі песні, выпеквалі птушачак маленькіх і давалі іх дзеткам ці крашылі і падкідвалі ўгору: зазывалі, каб хутчэй птушачкі прыляцелі і з сабой цяпло, вясну прыняслі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***

***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

Вясну гукалі перад Стрэчаннем, калі зіма сустракалася з летам. Зранні маці зварыць яіц. Мы бягімо ў адрыну, тупаем па сену і крычым:

Гу, вясна, гу, красна!
Што ты нам прынясла?

Вогнішча рабілі, але неяк не заўсёды. Як калі. Выходзілі на высокія мясціны, там распальвалі агонь. Ну, ужо моладзь вакол гэтага вогнішча разладжвала вяселле: вадзілі карагоды, спявалі песні, гулялі ў розныя гульні.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Беруніч В.***

Гуканне вясны пачыналася ў марце. Садзіліся на дрова і спявалі: “Да й ужо, вясна, да й ужо, красна! Са стрэх вада капле. І ўжо табе, удовін сынку, мандрованька пахне”.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

Праходзіць за тыдзень да Масленіцы. Гукаюць вясну звычайна маладыя хлопцы, дзеўкі, дзеці.

На гэты дзень пякуць разныя булачкі, пернікі, вараць яйкі, бяруць сыр, масла і спяваюць:

Гуй, вясна, гуй, красна!
Ой, што ты нам прынесла?
Да ці па еечку, ці па перажэчку,
Ці масла кусочак, ці сыра брусочак?

Збіраліся моладзь гуртам, ішлі на адкрытае месца, дзе рассцілалі скацерць, спявалі ды жартавалі, раскладвалі ежу, а потым частаваліся. Гульняў абавязковых не было, але некаторыя, асабліва дзеці, прывязвалі птушак да тоненькіх палачак і бегалі з імі па вёсцы. А некалькіх печаных птушак крышылі курам, каб тыя лепей несліся. Адну птушачку пакідалі ў печы.

***Запісана ў в. Саражоўцы***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Звычайна гуканне вясны было на Благавешчанне. Гуканне адбывалася так: дзяўчаты сабіраліся на самым высокім месцы ў вёсцы. Гэтыя месцы

высцілалі сенам і, сеўшы там у круг, спявалі да ночы вясеннія песні. Некаторыя спявалі песні па чарзе: у адным месцы пачнуць, а ў другім – прадоўжаць пачатую песню. Спявалі розныя песні:

Вясна-красна, адкуль прыйшла?
Адкуль прыйшла, што прынясла?
– Прынесла цёплое лецейко,
Малым дзеткам па яечку,
Старым бабкам па кіёчку,
Красным дзеўкам па вяночку,
Маладзіцам – па сярпочку.

***

– Кудзелька, шаўкова бародка,
Чаму не жэнішся?
– Рад бы я жаніцца,
Дзевачкі-сестрыцы, –
Па мне дзеўкі нету.
Адна па мне гожа,
Яна і гожа, і прыгожа.
На вулку не ходзіць,
Паночкаў не водзіць,
Вяночка не носіць.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.***
***Новак В.С.***

Ты, пчолачка ярая,
Ты вылець з-за мора,
Ой, лялю, лялю,
Ты вылець з-за мора.
Ты вынесь ключыкі,
Ключыкі залаты,
Ой, лялю, лялю,
Ключыкі залаты.
Ты замкні зімачку,
Зімачку сцюдзёну,
Ой, лялю, лялю,
Зімачку сцюдзёну!
Адамкні лецейка,
Лецейка цёплае,
Ой, лялю, лялю,
Лецейка цёплае!

***

Жавароначкі, прыляціце,
На крылах вясну прынясіце.
Сваці-сваці, сонейка,
Каб нам было цёпленька,
Пад хаткаю сідзячы,
Лусту хлеба дзержачы,
Песенькі спяваючы.

***

Вясна, вясна на калочку,
Не напрала на сарочку. Гу-у-у.
Вясна, вясна на прыпечку,
Не напрала на світачку. Гу-у-у.
Вясна, вясна, да й на печы,
Не напрала да й на плечы. Гу-у-у.

***

Вол бушуе – вясну чуе.
Воран крача – сыру хоча.
Воран крача – сыру хоча,
Дзеўка плача – замуж хоча.
Не крач, воран, – нажарэсся.
Не плач, дзеўка – нажывесся.

***

Да ярылася пчолачка,
Пчолачка, пчолачка,
У вяршэлку сосанкі,
Сосанкі, сосанкі.
Там лятала ластаўка,
Ластаўка, ластаўка.
С-пад белага каменя,
Каменя, каменя.
С-пад сіняга возера,
Возера, возера.
Папытайця, дзевачкі, у ластавачкі,
У ластавачкі, у ластавачкі.
Да што робіцца,
Дзеяцца, дзеяцца?
Семсот малайцоў жэніцца,
Жэніцца, жэніцца.
Семсот дзевачак замуж йдзе,
Замуж ідзе, замуж ідзе.

***

Шуміць-гудзе, вясна ідзе,
Шчасце і радасць людзям нясе.
У небе песня зазвінела,
Лясы, палі абудзіла,
Пралесачкі зацвіцелі,
І птушачкі прыляцелі.
Вол бушуе – весну чуе,
Дзеўка плача – замуж хоча.
Досыць, волік, бушаваці,
Яшчэ ў полі наарэшся.
Досыць, дзевачка, плакаці,
Пойдзеш замуж – нажывешся.

***

Благаславі, Божа,
Зіму замыкаці,
Зіму замыкаці,
Вясну выклікаці.
Дай жа, пан Божа,
На хлеб, жыта род,
На статак плод,
На людзей здароўе.

***

Блаславі, Божа,
Прачыстая маці,
Вясну загукаці,
Зіму замыкаці.
Лета ў карэце,
Зіма ў вазочку,
Па белым сняжочку.

***

Ці пазволіце, старыя людзі,
Нам вясну–красну выгукаці.
Сцюдзёную зіму замыкаці.
Сцюдзёную зіму ў каморачку,
А цёплае лета на вулачку.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
К нам у таночак,

Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.

***

Жаваронaчкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Наш хлебушак пераела.
Жаваронaчкі, прыляціце,
Зямлю-матушку абудзіце,
І дожджыкам напаіце,
Каб травачкі парасцілі,
Каб волікаў накармілі.
Жаваронaчкі, прыляціце…

***

Благаславі, Божа мілы,
Зіму замыкаці,
Зіму замыкаці,
Вясну адклікаці.
Зімою ў вазочку,
Вясною ў чаўночку,
У цёплым леце ў карэце.
Вясна, вясна, вясна красна!
Што нам прынесла?
З каробак жыта вытрасла,
З лукошак – гарошак,
З драбеек – канапелек.

***

Ідзі, зіма, да Кракава.
Зноў ты прыдзеш аднакава.
Ідзі, зіма, да Кіева,
Ты нам лета пакінула.
Ідзі, зіма, да крыніцы
Ды забірай рукавіцы.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

***

Гу, вясна, гу, красна,
Да шо ты нам прынесла?
Гу, вясна, гу, красна,

Масла кусок, сыра брусок.
Гу, вясна, гу, красна,
У мацеры кросенцы ткуць.
Гу, вясна, гу, красна,
Да пад лёд тычэ.
Гу, вясна, гу, красна,
Вы плавыце, мучэчкі, волокном,
Прыплывіце, мучэчкі, полотном.
Гу, вясна, гу, красна!

*Запісана ў в. Верасніца*
*ад Мажака Вольгі Іванаўны, 1948 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Малешаў Жыткавіцкага р-на),*
*студэнткай Кошман А.*

***

Гу, вясна, гу, красна,
Што ты нам прынесла?
Ці по пірожэчку, да ці по яечку,
Ці по масла брусок,
Ці по сыра кусок?

Гу, вясна, гу, красна,
Што моя-то мамонька
Ткёць кросна.
А моя ты мамонька
Да і не ткала,
Да і не прала.

Гу, вясна, гу, красна,
Да готово волокенца,
Да под лёд послала.
Гу, вясна, гу, красна,
Плуве, плуве волокенцэ,
Да прыплуве полоценцэ.
Гу, вясна, гу, красна,

***

Вяду, вяду карагод,
Сам Бог напярод.
Гдзе карагод ходзіць,
Там Бог жыто родзіць,
А дзе не бувае, то там улягае.
Зародзі, Божэ, жыто
Да на другое лето.
Што на жыто, на пшаніцу,

На ўсяку пашніцу.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.,***
***Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Рыдзецкай Г.***

***

Ой, вясна, вясна, што ты прынесла,
Што ты й прынесла?
А я прынесла цёпла лецечка,
Ды й цёпла лецечка.
Старым бабачкам пасядзеці,
Ды й пасядзеці.
А маладзічкам кросенцы ткаці,
Ды й кросенцы ткаці.
А дзевачкам цэўкі сукаці.
Ды й цэўкі сукаці.

***

Да ўжэ весна, да ўжэ красна.
Закідай сані да беры колёса.
Людскіе мацерэ ткуць кросна,
А моя маці старая под лёд мучэчкі хавала,
Плывіце, мучэчкі, толокном,
Прыплывіце, мучэчкі, полотном.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Ганны Андрэеўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Вясна красна, шчо нам вынесла?
Нам вынесла саху, барану,
Старым бабкам пасядзеннечка,
Маладзіцам красенца ткаці,
А дзяўчаткам да й пагуляці.

***Запісана ў в. Загорбашша***
***ад Пупенка Варвары Мікітаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

***

Ой, вясна, красна,
Што ты нам прынясла?
А прынясла я вам сонейко ярке
Ды мурог зялёны,
Баханочку хлеба ды ступу солі,

Славім вясну, славім красну.

***

Жаўранак, ранняя пташачка,
Чаго рана ты з выраю прыляцеў?
А там на рацэ крыгі,
А там у лесе марозы.
Я крыламі крыгі паб'ю,
А я маразы паразганяю.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

***

Молода дзевочка рано ўстала,
Ой, віно ж маё зеляно!
У зялёном саду цвяточкі рвала,
Цвяточкі рвала, вяночкі віла.
Адзін вяночак з руты-мяты,
Другі – з чырвонай ружы,
Трэці вяночок – з усяго зелля.
Да з руты-мяты заручыціся,
З чырвонай ружы павянчаціся,
З усяго зелля – на вяселле,
Ой, віно ж маё зеляно!

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

***

Гу, вясна, гу, красна,
Людскіе мацера ткуць кросна,
А мая маці не пачынала,
Пад лёд мучэчкі совала:
Плывеце, мучэчкі, толокном,
Прыплывіце, мучэчкі, полотном.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

***

– Вясна, вясна, вясняначка,
Дзе дочка твая Мар'яначка?
– У садочку шые сарочку
Свайму сыну Васільёчку.

На доліне шые пярыны
Сваёй донечцы Кацярыне.

*Запісана ў г. Тураў*
*ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,*
*студэнткай Івановай Т.*

Благаславі, маці, вясну заклікаці,
Вясну заклікаці, зіму замыкаці.
Зіму люту ў камору,
Вясну красну на вуліцу,
На ціхае лета, на буйнае жыто.

***

Благаславі, Божа,*
Прачыстая Маці,
Вясну загукаці,
Зіму замыкаці.
Лета ў карэце,
Зіма ў вазочку
Па белым сняжочку.
* першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

***

Вясна, вясна, на калочку*
Не напрала на сарочку. Гу-у-у!

Вясна, вясна на прыпечку
Не напрала на світачку. Гу-у-у!
Вясна, вясна да й на печы
Не напрала да й на плечы. Гу-у-у!
* першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

*Запісана ў г. Тураў*
*ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,*
*студэнткай Івановай Т.*

***

Плуве човен, вады повен,
Да ўжэ вясна, да ўжэ красна.
Із стрэх вада капле, із стрэх вада капле.
А ўдовіному сыну вандрованька пахне.
Вандруй, удовін сын, от лукі до лукі,
Полюбіла міленького да на свое мукі.
Плуве човен воды повен,
Ды каб не проліўса
Няма мого міленького

Да коб не ўтоміўса.

*Запісы прадстаўлены дырэктарам*
*СДК в. Буразь Дарошка Ганнай Іванаўнай*

Вол бушуе –
Весну чуе.
Баран блеіць –
У поле хочыць.
Курка сакочыць –
Несціся хочыць.
Дзеўка плачыць –
Замуж хочыць.
Стары крэхчыць –
Спачыць хочыць.

*Запісана ў в. Людзяневічы*
*ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,*
*студэнткай Кужалёвай І.*

**Саракі**

Гэтае свята было 9 сакавіка. На Саракі сарока пачынае віць гняздо і прыносіць для яго 40 пруткоў. Калі на Саракі быў мароз, то казалі, што яшчэ будзе 40 марозаў. У гэты дзень дзяўчаты павінны былі пераламаць 40 дошчачак альбо перарваць 40 вяровачак. Гэта было для надыходу цяпла, каб абудзіць ад зімы ўсю прыроду.

У гэтае свята гаспадыні выпякалі з цеста дзецям 40 жаўранкаў. Лічылася, што ў гэты дзень прылятала 40 жаўранкаў.

Гаварылі, што на Саракі прыляцелі з-за мора птахі.

На Саракі не суйся блізка да вады, гэта значыць, надышла пара разводдзя. Калі на Саракі вол нап'ецца ад расталых ледзяшоў, то будзе добрая вясна. Калі ад Грамніц да Саракоў не ішлі дажджы і псавалася дарога, тады летам будзе засуха.

*Запісана ў в. Рудня*
*ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.,*
*студэнткай Клімашэўскай Т.*

**Благавешчанне (Дабравешчанне)**

Бяруць з сабою граблі, становяцца ў кружок (адна ў сярэдзіне і паказвае, што арэ, сее, барануе, поле, жне) і ўсе астатнія за ёю спяваюць:

Ару я, ару я,
Што і на полі чарнушачка,
А ў полі пятрушачка.
Сею я, сею я,
Што і на полі чарнушачка,
А ў доме пятрушачка.

Барную я, барную я,
Што і на полі чарнушачка,
А ў доме пятрушачка.
Палю я, палю я,
Што і на полі чарнушачка,
А ў доме пятрушачка.
Жну я, жну я, што і на полі чарнушачка,
А ў доме пятрушачка.

Да сёмага красавіка зямлю нельга варушыць, таму што ў зямлі сядзяць вужы, а восьмага красавіка на Благавешчанне ўсе вужы выходзяць з зямлі, і ўжо можна рабіць на зямлі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Свята гэтае адзначалася 25 сакавіка па стараму стылю, а па новаму 7 красавіка. На гэтае свята забаранялася ўсё рабіць: «На Благавешчанне дзеўка касу не пляце, птушка гнязда не ўе». Да гэтага свята нельга было нічога ні сеяць, ні араць. Лічылася, што да гэтага часу зямля спіць і чапаць яе не можна. Гэтае свята лічылася днём надыходу вясны, лічылася, што гэта пачатак гаспадарчага года.

Праваслаўная царква адзначала зачацце Маці Божай Ісуса Хрыста. Ведаю прыкметы:

Да Благавешчання зіму не лай і сані трымай. Як за тыдзень да Благавешчання прыляціць бусел, то ў свірне на засек трэба дошку накладваць – поўна будзе, добры ўраджай, а як пасля Благавешчання – то трэба знімаць дошкі, бо не засыплеш поўных засекаў. Як на Благавешчанне дождж – збярэш багата хлеба, калі суха – летам будзе засуха. Яшчэ, якое надвор’е на Благавешчанне, то такое ж павінна паўтарыцца і на Вялікдзень.

***Запісана ў в. Рудня***

Хадзілі ў цэркву моліцца. Із неба пастухам Бог паказаў, дзе народзіцца Ісус Хрыстос. Забула кому ці Гаўрілу... Пастухі ішлі, перад імі ішла зорачка. І яны із етою зорачкаю ішлі, і ета зорачка завяла іх у пячору, ідзе овечкі стоялі і там от нарадзіла Марыя Ісуса. Празднуецца, што благую весць Бог прынёс, што Ісус Хрыстос нарадзіўса. На Благовешчанне толькі этэ. У церкві яселькі робяць і ляльку кладуць. Паказваюць, як Ісус Хрыстос нарадзіўса.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Калі пачыналі сяўбу пасля Благавешчання, то спачатку на полі засадзяць сякеру ў зямлю, так як колеш дровы, і тады садзіш. Вынімаюць, калі закончыцца сяўба. Гэта ўсё для таго, каб нішто не ело, не тачыло і

таксамо проціў шкодных насякомых і захворванняў.

Спяваюць:

Харашуха да пажалася,
А няўдалая засталася.
Харашусі – пірог з мёдам,
А няўдалай – жаніх Хвёдар.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

**Вялікдзень**

Свецяць вярбу і прашчэння просяць. Одзін у одного прошчэння просяць. Это надо. Хай у цебе Бог ведае які ўраг, а се роўно ты попросі і за яго помоліса. Это ўжэ як бу табе Бог дае аблягчэнне, прошчэнне за ўсякіе грэхі. Здороўя трэба пожэлаць. «Не я б‘ю, а вербочка б‘е, здороўе дае», надо тры раза скозаць і вербою по целу побіць.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Гэтую суботу адмячаюць у палавіне вялікага перадвялікоднага паста, перад вербнай нядзеляй. У гэтую суботу рыбакі сабіралі талаку, жонкі пралі лён ці канаплянае валакно на рыбацкія снасці, жакі, сеткі, а мужыкі вязалі жакі, ці чынілі снасці. Лазар лічыўся пакравіцелем рыбакоў. Калі ў гэтую суботу ўсё гэта рабіласа, то гаварылі, што рыба вельмі лавіласа. І была такая прыказка: “Калі рыбак ставіў зборную снасць улетку, то Лазар заганяў рыбу ў сетку, а калі ўвосень, то лавіласа ўсёго рыбін восем”, “Піліп  рыбу на зіму хавае, а Лазар летам у снасці заганяе. “Яшчэ робілі з дубцоў каробкі на лоўлю ўюноў. Каробкамі ловілі ўюноў зімой. На ноч ставілі ў палонкі каробкі і накрывалі сенам, а ўтром ішлі хаджаці і правяраці. Перад работай рыбакі маліліса “Прасілі Лазара,шоб пасыпаў у снасці рыбу.”

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

З даўніх часоў на свята людзі свяцілі вярбу. Пасля царквы людзі прыходзілі дадому і білі кожнага вярбою, прыгаворвалі:

Вярба б’е, не я б’ю.
Вялікдзень – за тыдзень.
Краснэ яечко
Ужэ не далечко.
Будзь бягуча (ы), як вада,
Будзь багата (ы), як зямля,
Будзь здарова (ы), як асенні лёд

На ўвесь год.

***Запісана у в. Рычоў***
***ад Кавалевіч Кацярыны Васільеўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Етэ невелічкее святцэ спраўляецца перэд Паскаю на Хрэсной нідзелі. У серэду замешваюць прэснэе цесто. З цеста робляць крэшчыкі маленькіе, птушэчкі і пекуць у печэ. Одзін крэшчык і тры птушэчкі остаўляюць на засеўкі, колі едуць у поле засяваць. Другі крэшчык хаваюць до Юр’я, шоб вугнаць першы раз корову на пашу, дають корові з’есці. А перэд засевом моляцца Богу і просяць ў Бога, шоб зарадзіла добрэ збожына. Крэшчык кладуць у зямлю і боронуюць поле. Спечаные “птушкі” той шо орэ, з’ядае. Еўшы говорыць: “Зарадзі, Божа, пашню на ўсякага долю”, а крышкі аддаюць птушкам. Крэшчык для таго, шоб град не побіў збожыну.

Дома спечаные “птушкі”  роздаюць толькі дзяўкам, шоб з дому хучэй “вуляталі” (ішлі замуж). Крэшчыкі – хлопцам, шоб булі добрымі, дбальнымі хозяінамі ў хаці.

После посеву обезацельно вараць зацерку і п’юць па чарцы гарэлкі. Кажуць старые, шоб дождж поліваў, шоб урожай буў добры.

***Запісана ў в.Буразь, в. Сямурадцы***
***ад Дарошка Ганны Сцяпанаўны, 1936 г.н.***
***Гром Анастасіі Парфенаўны, 1926 г.н.***
***Лой Ніны Фамінічны, 1936 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

На Чысты чацвер хозяйкі прыбіралі ўсю хату, усё старое выкідалі з хаты. У Чысты чацвер наводзілі во дворэ парадак, шоб была чысціня вездзе цэлы год. На полі, у агародзі стараліся прыбраць, шоб у агародзі пустозелля не было, шоб мало трэбо було полоць, прыбіраць яго.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Лой Ганны Пятроўны,***
***студэнткамі Бабовіч М., Быкавай Ю.***

Вярба б’е, не я б’ю,
За тыдзень – Вялікдзень,
Вярбовым дубцом
Ды самым канцом.
Уставай рана быдла гнаць,
Не забудзься лусты ўзяць.

***Запісана ў в. Пясчанікі***
***ад Пупарэвіч Вольгі Мікалаеўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

Чысты чэцвер это перэд Паскою. Ён одзін раз у год. Это дзень очышчэння духовного. Ходзяць людзі ў цэркву ў эты дзень і прычэшчаюцца.

У церкві вечэром ідзе служэнне. Это очышчэнне душы. Дома тожэ ўсе прыбіраюцца, усё чысцяць, мыюцца. Як начынаецца пост, велікі пост, перед Веліконнем, тожэ называецца чысты понедзельнік, як толькі начынаецца пост. У понедзельнік ты должон помыцца, хату повумувать, штоб ішоў у пост чыстым, штоб усе свої грэхі змуць.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Хрэсцы – на хрэснай нядзелі, у сераду. Гэта – палова вялікага паста, перад Вялікаднем.

У сераду пякуць тры крыжы, бораны і сярпы з прэснага цеста (мука, соль і вада з содай, а калі няма соды, то з закваскай хлебнай). Адзін крыж паядаюць адразу ўся сям'я, барану дзеляць паміж дзевак, а серп хлопцам дзеляць. Па адным засушваюць, і калі едуць у поле сеяць, тады бяруць на поле. Перш, чым укінуць першую жменю ў зямлю, крыжа заграбаюць у зямлю. Гэта як дар зямлі. Пры гэтым прыгаворваюць:

– Прымі дар божы, зямліца-маці, і дай нам ураджай гожы.

Пры гэтым хрысцяцца. Барану пякуць і серп, гэта тое, чым хлеб дабываюць, а крыж, як абарона ўраджаю ад ліха, граду і ўсялякай напасці.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Шандыба В.***

Гэты абрад праходзіў у палавіне вялікага паста перад вялікаднем. У сераду ўчынялі прэснае цеста з пшанічнай ці жытняй мукі. Цеста було на содзе з сахарам. Выпякалі крыжы, сярпы, бароны і жаўранкаў. Крыж одзін паядаў хозяін, бо ён чалавек у хаце, які набывае багацце ў хату. Серп – жонка, бо яна ўсіх корміла. Жаваранкаў аддавалі дзеўкам, каб быстрэй вылятали з хаты замуж, а бароны – хлопцам, бо яны работнікі і гаспадары. По одной выпечцы неслі ў поле, калі выязджалі засеваць зожыну. Крыж загрэбвалі ў зямлю, каб засцярог пасевы ад граду, серп загрэбвалі, каб була добрая збажына, а барону, каб була рыхлая глеба і добра радзіў хлеб.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

На Вялікдзень не трэба работаць. А Вялікдзень ета первый дзень Пасхі. Накануне ў нас красяць яйкі. Раньшэ не было цыбульніка як зарэз, а красілі яйца красками: красные, розовые булі. Гулялі ў біткі, як і зараз, так і раньшэ гулялі. Пасху выпякалі тожэ накануне, гатовілі еду, штоб на Вялікдзень нічого не рабіць. Накануне не лажыліся спаць і цэлую ноч не спалі. Маладыя так кастры палілі, гулялі ўсю ноч. А некаторыя людзі верующчыя так моляцца.

На могілкі ходзяць у нас на другі дзень Пасхі. Насілі на могілкі к

памёршаму яйкі, ежу якую-небудзь – паміналі памёршага.

Валачобнікамі ў нас булі дзецi. Ім давалі яечкі. А гаварылі от так:

А бедной сіроце не хваціло хлеба лусты і капусты.
А бедна сірота да й пойшла, подскакваючы,
Богу дзякуючы.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

Вялікдзень – очэнь бальшой праваслаўны празднік. Да яго гатовіліся зараней, пасціліся. Да Вялікадня прыбіралі двары, хату. На Вялікдзень пяклі пасху. Пры выпечцы прыгаворвалі і прымячалі: калі пасха падыдзе роўненька, то і на працягу года ўсё будзе ісці добра і роўна. Калі ж пасха падыходзіла на адзін бок, то ў гэтым гаду ў сям'і будзе не ўсё роўна ды добра. На Вялікдзень фарбавалі яйкі. Фарбавалі іх у чырвоны колер пры дапамозе цыбульніку або ў жоўценькі – варылі з дзеразой. З яйкамі гулялі ў біткі і ў латках качалі. На Вялікдзень жанчыны ў царкву хадзілі і свяцілі яйкі з пасхаю. Пасля гэтае свячонае яечка елі першым на Вялікдзень – каб быць здаровым. На Вялікдзень не здароўкаліся, а хрыстосаваліся. Хадзілі тады і на могілкі, клалі ўсё, што маглі: мяса, яйкі, пасху. Хадзілі на Вялікдзень і валачобнікі, у асноўным моладзь. Яны абыходзілі ўсё хаты па тры разы, спявалі, віншавалі гаспадароў і вялі з імі размову.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

Перад Веліконнем на Вербнай нядзелі ідуць у цэркоў і свецяць вярбу, потым эту вербу кладуць у гумне і за ікону на покуце. У ноч перад Веліканнем, хто гож, ідуць на ўсюночну свеціць паску і яйца. Яйца на Веліканне красяць у цыбульніцы, а колі хто з родні помер, то яйца не красяць. З ранку першым дзелом трэба з'есці свечанэ крашанэ яйцэ і паску, а потым ужэ ўсэ остальнэ. Выбіраюць і каштуюць яйца, а потым б'юцца на біткі. Хто паб'е, то забірае бітэ ейцэ. Людзі одзін одному кажуць замест "Зрастуйце" "Хрыстос воскрэс", а отвечаць трэба "Во ісціну воскрэс", і тры разы трэба поцоловацца. На Веліконне хрышчэнікі ходзяць до хросных з волочоным. Только ходзяць на другі дзень Веліконня. На чэцьверты дзень людзі ідуць на могліцы і несуць крашэныя яйца і другіе прысмакі сваім родным.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Ганны Андрэеўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

На Вялікдзень абязацельнымі стравамі былі пасха і яйкі пафарбаваныя. Усе жанчыны на Вялікдзень ішлі ў царкву на “ўсюночну” і свяцілі яйкі, пасху, канфеткі маглі. Красілі ранеё яйкі толькі ў красны цвет, а цяпер ужо могуць на іх розныя цвятныя фігуры вырабляць. Валачобнікаў на Вялікдзень не было і зараз няма. Калі ж нехта нядаўна ў сям'і паміраў, то яйкі не фарбуюць, а проста вараць у чыстай вадзе. Да вайны на кладбішчэ ў Вялікдзень не хадзілі і нічога не насілі, а зараз ужэ ў первы дзень Пасхі на могліцы ідуць масава. З сабою людзі нясуць і кладуць на магілкі пірагі, яйца.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Спачатку ў перадвелікодны тыдзень усе жыхары вёскі хадзілі ў царкву, потым пачынаўся пост. Па магчымасці ўсе пасціліся. У суботу пачыналі печ паску, гатовіць стравы. Абавязкова хадзілі свяціць ежу.

У нядзелю ўсе ішлі на могілкі да памёршых, бралі з сабой ежу, асабліва яйкі. Яйкі звычайна разламвалі, але некаторыя проста чысцілі іх і клалі на магілку.

Увечары распальвалі вогнішчы, збіралі на двары ўсе старыя рэчы, стружкі, трапкі, прыносілі да гэтых вогнішч і спальвалі. Вогнішчы палілі амаль усю ноч. Пелі песні, прыгалі праз вогнішчы. Абавязкова на Вялікдзень усе апраналіся ў новае адзенне. Таму для дзяцей гэта было двайное свята. Усю зробленую ежу на Паску павінны былі есці да Радаўніцы. На Радаўніцу таксама калі ішлі на могілкі, неслі яйкі і паску.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Яновіч Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

Елі пасху і біліся яйкамі. Яйца, звычайна, красілі у чырвоны колер (лушпайкі з цыбулі). Але, калі ў сям'е нядаўна нехта паміраў, у цёмна сіні ці ў чорны красілі.

Яйкамі біліся ўсе тры дні. Варылі звычайна па кашалю яек і з імі ішлі на вуліцу біцца.

На могілкі хадзілі не на Вялікдзень, а на 4-ы дзень пасля Пасхі. Гэта быў Мёртвы Вялікдзень.

Пасля Пасхі святкавалі “Градаву сераду”, каб град не пабіў збожжа. У геты дзень забараняліпрацаваць.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

У нас к гэтаму дню гатовіліса зараней. Кожны абавязкова пёк пасху, красіў яйкі, запякалі парасят. Стараліса, каб на стале была каўбаса, сыр, малако. На первы дзень білі біткі і старыя, і малыя. Казалі, хто бітак не пробівае, то не будзе яец і не будзе здароўя ў хаце. На другі дзень з

валачобнай хадзілі дзеці к хросным бацькам і бабам. Бралі чатыры яйкі, кусок пасхі, звязвалі і ішлі к бабе, хросным бацькам. А яны мянялі сваю пасху, лажылі ўсё сваё, дабаўлялі яец, цукерак.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

Вялікдзень – увоскрэсенне распятого на крэсту сына Божого – Ісуса Хрыста. Гэто свято із свят усёго года. До етого свята готовяцца ўсе вельмі добрэ, самое глаўное, ето обрадовая еда: яйца крашаные, "паска" (хлеб), мясо обварваём, коўбасу робім пальцом піхану, карука з горы здымаём, сыр сушым к гетому святу, масло колоцімо, пеком коржыкі, пампушкі, рыбу жарым ці варым, кісель обезацельно шоб буў. І от, із самого ранку збіраецца ўся сем'я і ідуць на могліца, шоб помінуць своіх умершых, усю родню. Збіраецца на могліцах усе село, кажды год так у нас. Дзеці здалёк прыеждають і ўсе ідомо на могліца. Там наведваёмо кожную могілку, ложым кусочкі яйца свечаного, по кусочку маленькому "Паскі", канфеты кладомо, печэнье, ну тэ, шо маем. Обезацельно окропляёмо свечаною водою кожную могілку. После могліц ідомо домоў, муёмо рукі, уціраёмо рушніком і садзімоса снедаць. Маці значала запаліць свечку, прочытае молітву, "Отчэ наш" і снедаём, почынаючы з усёго свечаного, а после і ўсе остальнэе, шо есцека на столе, спраўляём "Паску". Ек поснедаюць усе, то ідомо на село, бо там мужчыны навек гуляюць у "біткі", качаюць яйца по жалобку, шукаюць под шапкою, перэкачваюць у колошах, а жонкі спеваюць песне ўсякіе. А ўжэ ўвечэры музыканты іграюць, да ноч танцуёмо, гуляёмо. На другі дзень Паскі ходзяць волочобные, дзеці ідуцю з волочоўным, несуць волочоўного хросным бацькам, бабі-пуповязніцы. Дзеці спеваюць песні хросным і бабі:

Валачобные, людзі добрые,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет.
Волочыліса, промочыліса,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет.
Зайшлі к хросной, (хросному), (бабцы) просушыліса,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет.
А дала хросна (бабка,даў хросны) усім по еечку,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет.
Усім по еечку, да по красненьком,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет,
Хрыстос Увоскрэс на ўвесь свет.

Хросная, (бабка-пуповязніца, хросны), куды дзеці зайдуць, садзілі дзецей за стол і частовалі. Потом даюць госцінцы дзецям у два разы большые, чым оны прынеслі. Увечэры спевалі ўзрослые дзеўкі і хлопцы, танцовалі аж до ранку. Тры дне спраўлялі "Паску" і нічого не робілі.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н.,***
***Гром Любові Рыгораўны, 1927 г.н.,***

***Клімовіч Ніны Мікалаеўны, 1940 г.н.,***
***Аліфіравец Варвары Ільінічны, 1929 г.н.,***
***Маркевіч Варвары Сяргееўны, 1940 г.н.,***
***дырэктарам ЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

Вялікдзень святкуецца праз 7 нядзель пасля мясаеда (апрэль-май). Перад Вялікаднём звычайна прыбіралі ў хаце, рыхтавалі розныя стравы. Красілі яйкі, свяцілі паску, пеклі мяса, рыхтавалі хрэн і іншае. У ноч перад святам вялася адправа ў цэркві. Раніцай у цэркві выносілася плашчаніца. З ёй абыходзілі тройчы вакол цэркві. Пасля святой вадой свяціў бацюшка яду.

Елі рана і толькі свечанае. У першы дзень забаранялася рабіць работу. Цікавай гульнёй у гэты дзень была гульня “У мацакі”. Бралі крашанае яйка і білі адно яйка другім. Глядзелі, чыё пераможа. У гэты дзень вечарам ці на ноч людзі, асабліва маладыя хлопцы і дзяўчыны, ішлі гуляць, спяваюць песні “Сеюць лён”, “Кропа”, “Бабуся”, “Перапёлка”.

На другі дзень Вялікадня хадзілі валачобнікі – дзеці-хрэснікі. Яны ішлі да сваіх хросных бацькоў, маці, бабуль. Хрэснікі звычайна неслі паскі, 4 яйцы крашаныя (каб да пары). Прыйшоўшы ў хату, яны тройчы гаварылі: “Хрыстос уваскрэс! Ва ісціну васкрэс!”

Валачобнікаў хросныя садзілі за стол. Частавалі, спявалі. У гэты дзень хрэснік са сваёй хроснай павінен быў пагуляць “У мацакі”. Далей хросныя і хрышчэнік абменьваліся падаркамі. Хросная маці давала паску, яек крашаных давала больш, цукеркі, пячэнне. Хросная маці павінна была даць свайму хрышчэніку адно яйка ў руку (ахоўнае значэнне).

Існавалі прыкметы, звязаныя са святам. Пры выпечцы паскі глядзелі, каб не лопнула скарынка – няшчасце ў сям’і. Косці ад мясных страў закопвалі на полі – гэта абараняла поле ад ветру, дажджу. У першы чацвер пасля Вялікадня хадзілі на могілкі да памёршых.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны., 1932 г.н.,***
***Новак В.С.***

Пасха – гэта вельмі бальшой празнік был. Старацельна ўбіралі ў хаце ўжо ў чацверг, прыблізна за тры дні да Пасхі. Гэты чацверг называўся “Чыстым”. У гэты дзень мы ўсёй сям’ёй прыбіраліся ў хаце, у двары, потым абавязкова маці казала, што трэба было памыцца ў чыстай бані.

У суботу мы вешалі на чыстыя вокны новыя занавескі, мянялі рушнікі на іконах. Абавязкова рушнік быў з краснымі цвятамі, прыгожы, беленькі, выкачаны.

Маці замешвала цеста на пірагі, тапіла з вечара печку, гатовіла мяса і каўбасы, варыла сала з мясам, фарбавала ў яечнай шалухе курыныя яйкі. Ад лукавай шалухі яны былі красненькія, прыгожыя вельмі. І зразу чулася атмасфера празніка ў хаце.

Вечарам маці выпякала ў печцы кулічы з торагам – тварожная пасха з ізюмам, гарэхамі, мёдам. Яны былі роўненькія, прыгожыя, бліскучыя ад яйца

(памазаныя яйцом, запечаныя). Былі розныя: з крыжыкам і без яго, з касічкаю па бакам, як пірог, і іншыя.

Калі трэба было ісці ў царкву “на ўсеночную”, маці збірала ў карзіну соль, яйкі, пасху, сала з мясам, каўбасу і іншыя стравы. Абавязкова зажыгала свечку ў карзіне. Ставіла гэту свечку ў соль.

Прыходзіла з царквы каля чатырох часоў утра пасля службы з асвяцонай пасхай і ўсім тым, што было ў карзінке. Свечку абавязкова старалася данесці дадому запаленую, каб гарэла. Казала, што гэта святло Хрыста ў хату ідзе.

Усе мы чакалі маці з царквы, не лажыліся спаць, пакуль яна не прыйдзе з царквы. У нас у хаце гарэў свет, гарэлі свечкі каля абразоў, бацька расказваў нам паданні з Бібліі, чытаў “Отчэ наш”.

Калі прыходзіла маці, яна накрывала на стол і мы ёй дапамагалі ў гэтым. Потым мы садзіліся за стол усёй сям’ёй і, памаліўшыся, елі ўсе смачныя стравы. Але з самага пачатку трэба было з’есці тое яйка з соллю пасвяцонае і пасху, таксама пасвяцонаю.

Пасля выпівалі па чарцы віна і пачыналі смакаваць розныя блюды.

Утрам да нас прыходзілі госці. А мы, калі прачнемся, казалі адзін аднаму: “Хрыстос Васкрэс!” І атвячалі: “Ва ісціну васкрэс!”

Прыносілі нам госці яйкі чырвоныя, пасхі розныя, цукеркі і іншыя прысмакі. Па дварах хадзілі дзеці і песні валачобныя пелі. Ім давалі яйкі, пірагі, каўбасу. Яны пелі песні розныя пра сям’ю, пра гаспадара і яго жонку, пра дзяцей іхніх. Гэтых дзяцей называлі валачобнікамі. Казалі дзяды, што валачобнікі – гэта людзі ад Бога.

У гэтыя дні самая любімая ігра ва ўсіх сем’ях была ігра ў біткі. Бралі два яйца, выбіралі крэпкае яйцо. Стукалі ім па зубах, калі стук глухі, тады яйцо лічылі крэпкім. Адзін другому білі яйцо аб яйцо, і чыё яйцо разаб’ецца, той аддаваў сваё яйцо пераможцу, таму, у каго яйцо ўцалела.

Увесь дзень было весела, шумна, усе шуцілі, пелі песні.

Мы з дзеўкамі гадалі на будучае: пераскочыць – у таго будуць сваты ў хаце, а хто не пераскоча, то будзе чакаць яшчэ год. Яшчэ дапамагалі бедным людзям. Давалі ім ежу, а другі раз грошы. Самому добра і весела, і хай яму будзе весела і добра.

Ведаю прыкметы і павер’і, звязаныя з Вялікаднём:

Святое Вялічка – з красным яічкам.
Вялікі дзень – вялікая работа.
З Вялікадня птушкі пачынаюць пець.
На Вялікдзень першы раз зязюля кукуе.
Кукушка кукуе ад Вялікадня да Пятра, а пасля Пятра – ні дня.
Як на Чысты чацвер добрая пагода, то і на Ушэсце.
Дзень падоўжыў – нітка пакарацела.

З гэтымі днямі ў народзе было звязана вельмі многа павер’яў і прадказанняў. Раніцай выходзілі на вуліцу, калі ўзыходзіла сонца, і глядзелі

на яго. Казалі, што сонца, мабыць, "іграе" на ўсходзе, пераліваецца рознымі промнямі. Калі сонца грала, то казалі, што гэта к дабру, цёпламу лету, з шчаслівымі вяселлямі ў гэтым годзе.

Расчэсваючы галаву, бацькі гаварылі: "Колькі на галаве валасоў, дай, Божа, столькі ўнукаў!"

Лічылі, калі з'есці дванаццаць розных кулічэй за тры дні Пасхі, то збудзіцца задуманае жаданне.

***Запісана ў Жыткавіцкім раёне***

Ну, да Вялікадня гатовіліся заранъ. За недзелю да празніка прыбіралі ў дварэ, падметалі на вуліцы, бялілі сады і абязацельно ішлі на могілца прыбіраць, красіць, падгрэбліваць. У хаці прыбіралі чысто і мылі ўсё. Ішчэ самі мыліса тожэ. Людзі стараюцца порабіць усю работу до чацверга, а ў чацверг – мыцца, бо ето ж "чысты" чацвер, перед Велікднём. Шчытаецца, што чалавек ачышчае себе от усякіх злых духоў, змывае грэхі.

А от ужэ ў пятніцу ўсё гатовілі. Красілі яйца, пеклі пасху ці просто якіе булачкі, хто як гуляе. А остальную еду готовілі, што хто хоцеў.

Паску пекуць із доброй мукі, самой лепшой. Кладуць у круглую пасудзіну ці ў міску, ці ў скавараду і ставяць у печ. Кажуць, што як стаіць паска ў печы, то не трэба весело дзверамі стукаць, бо не поднімецца. А екія прыкметы існавалі, як печэш паску, то я не ведаю. Яйца-то красілі ў красны цвет або ў цыбульнік… такі карычневы палучаецца цвет. А цяпер красяць у сіні, жоўты – у любы. У суботу раненько ішлі ў цэркву свеціць яйца, паску, соль, воду, масла і яшчэ што-небудзь. Але ў нас нема цэрквы ў селе, то мы ждом, пакуль прыедзе бацюшка з Красного Бору. А ўсе, як посвецяць еду, то стараюцца кажды быстрэй дамоў пайсці. Кажуць, хто первы прыбегіць з паскою дамоў, у таго будзе лучшы ўраджай і той хазяін первы закончыць палевыя работы. Збіраецца ўся сям'я і садзяцца есці. Але сперша запальваюць свечку, моляцца Богу. Патом прыступаюць да еды. Сразу пробуюць усё свячонэ: яйцо, мясо, булку. Яйцо соляць свечонай солью.

От, кажуць, еслі ўтрам сонца іграе і его сільно відно, то будзе хорошае лето і ўсё будзе радзіць у гародзі і на полі. Косці з мяса не выкідаюць, іх нада закапаць на полі, каб зберагці поле ад граду. Адну костачку нада даць сабачцы, штоб не стаў бешаным.

Красіць яйца ў красны цвет пашло яшчэ здаўна. Красны цвет – ета цвет жызні, пабеды жызні над смерцю. Ён напамінае кроў Хрыста, якая была праліта радзі спасення людзей. А некаторыя хазяйкі, як выганяць кароў на поле, то ўсегда беруць яйцо, каб кароўка была такой жа круглай, гладкай, як і яйцо. З яйцамі гулялі ў біткі. Для гульні выбіралі самыя добрыя яйца. А шчэ яйца качалі з горкі. Чыё яйцо первым скоціцца, той і пабядзіў. А вечэром усе збіраюцца: і маладыя, і старыя і ідуць паліць агонь. Маладзёж гуляе до самого ўтра, пеюць песні, едзяць, танцуюць, гуляюць. Гульні разные: перапрыгаюць чэрэз агонь, казакі-разбойнікі. І песні розныя пеюць: саўрэменные, народные.

У нас валачобнікі не хадзілі, это на Каляды ходзяць. У недзельку, як

здароваюцца, то гавораць: “Хрыстос Васкрэс!”, а отвячают: “Ва ісціну васкрэс” (тры разы).

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Яўгеніі Мітрафанаўны, 1956 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Дожыдаем Пасху, Пасха Хрыстова. Прыбіраемо ўсё ў хатах. Пячэм булкі, пірогі, яйка красімо. Яйка ў нас усякого коліберу. Перад тым, як красіць яйка, ставімо воду, вода кіпіць, засыпаем краску, кладзем яйка. Акрамя булок, пірогоў, готовімо яшчэ розныя прысмакі. Звечара еду ў царкву на ўсюночную. Там свечу ўсяго потрошкі: і яйкі, і хлеб, і соль, і шчэ ўсякое. Потым прыеду. До мене прыходзяць дзеці на Пасху, каб одведаць. Збіраемося, сядаем за стол, шо наготовілі, усе ставімо на стол, яйкі ложацца. За столом гулялі ў біткі. Поснедалі, посядзелі, поговорылі і пошлі на могілкі. Родных отведвалі, ложылі ім пасху.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Да Вялікадня рыхтаваліся вельмі старанна. Прыбіраліся ў хаце, перамывалі бялізну. Таксама лічылася, што да Чыстага чацвярга трэба было ўжо ўсё парабіць. Існавала прыкмета: калі чалавек устане ў чацверг да ўсхода сонца і памыецца чыстай вадой, то будзе цэлы год чысты і здаровы. У пятніцу і суботу ішлі прыгатаўленні к велікоднаму сталу, красілі яйкі ў чырвоны колер. Абавязкова красілі ў цыбульніку. Калі ў хаце ў гэты год памёр чалавек, дык яйкі зусім не красілі або красілі ў сіні колер. Таксама выпякалі пасху. Пасха пяклася з мукі, яек, малака, цукру, дрожжаў і таксама ў пасху дабаўлялі ізюм, арэхі. На самым пірагу рабілі красты і выпякалі ў печы. Калі пасха выходзіла румяная, прыгожая, то ў сям’і ўсюды будзе дастатак. А калі пасха будзе няўдалай, то і жыццё сям’і будзе такім. Гулялі з яйкамі ў біткі. Мужчыны бралі з дома яйка і ішлі на сяло качаць іх. Так яны сабіралі іх каля дзясятка. На пасху хадзілі на могілкі. Кожны чалавек лажыў на магілу яйка пафарбаванае, таксама цукеркі, пячэнне. Але лічыцца, што на Пасху нельга ходзіць на могілкі, бо гэта пасха лічыцца Пасхай жывых. А хадзіць на могілкі патрэбна на Радуніцу. Таксама на сяле хадзілі валачобнікі. спявалі песні. Гэта была ў асноўным моладзь. Яна абходзіла хаты па 3 разы і вяла размову з гаспадарамі. Шкарлупу ад свечанага велікоднага яйка раструшчвалі і выкідалі на ўспаханае поле, каб быў добры ўраджай. Таксама, калі сям’я садзілася за святочны стол, то спачатку елі свячоную ежу, а потым і другое. Свечанае нельга было выкідваць, а з’ядаць ўсё.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Пяшэвіч Я.***

Хадзілі на кладбішчэ. Еслі Пасха цёплая, выхадзілі на ўліцу і старыя, і

малыя, вадзілі карагоды.

Карагод вялікі, уліца мала,
Ой, люлі-люлі, уліца мала,
У карагодзе былі,
Мы парачку відзелі,
Ой, люлі-люлі, мы парачку відзелі.
А ты, парачка, патанцуй,
Каго хочэш, пацалуй.
Ой, люлі-люлі, каго хочэш, пацалуй.

Празднавалі 3 дня, нічэго не дзелалі. Яйца красілі лукам, настаівалі шэлуху. Красілі ў суботу, Краснай называлі. У біткі гулялі. А ў Красную суботу бельё мылі, в хатах вычашчалі, бялілі. Хадзілі на всіношную. Насілі святіць пасху, яічкі, сала. Накладалі ўсё ў каробкі пляцёныя ці кашолкі і неслі.

Цеста на пасху развадзілі на дражжах, мясілі как хлеб, пеклі в печах.

Лажылі яйца в сарай, на чэрдак, у хаце – эта ад гразы добре, туды граза не б'е.

Глядзелі на Чысты чацвер. Еслі он чысты, то пасха чыстая, еслі даждлівы, то і пасха даждлівая.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

Гэта быў самы шаноўны празнік. Рыхтаваліся да яго вельмі доўга, посціліся. Перад гэтым празнікам ва ўсіх быў святочны настрой, кожны стараўся як лепей падрыхтавацца да яго, загатаўлівалі для гэтага дня вялікую колькасць яек і розных фарбаў. Пеклі пасху рознай формы, з рознымі ўпрыгожваннямі. Тая сям'я, якая багацейшая, для гэтага дня расціла парася, кілаграм на пятнаццаць, і запякалі яго цаляком. Але ўсе, нават самыя бедныя, стараліся, каб на гэты дзень усяго было на стале.

На першы дзень біліся ў біткі, калі хто не прабівае яйкі, у таго куры не будуць несціся і хварэць будуць у хаце. А чым больш праб'еш, то ў цябе будзе тады ўсяго.

На другі дзень хадзілі дзеці па хросным, па бацькам. Бралі чатыры яйцы і кусочак пасхі, а хросная заменьвала яйкі і дабаўляла свае, і давала дзеткам гасцінцы.

Таксама на першы дзень усе людзі хадзілі ў царкву, там яны свяцілі вялікодныя яйцы і пасхі.

З царквы трэба было прыбегці раней за ўсіх.

Усе рэшткі, якія заставаліся пасля Вялікадня, захоўвалі і выкарыстоўвалі ў гаспадарцы: рэшткі пасхі аддавалі дамашняй жывёліне і курам, а шкарлупінне ад яек выкідвалі на агарод.

Спецыяльных песень на Вялікдзень не было, пелі звычайныя песні, якія

хочаш, без падгалоска.

***Запісана ў в. Рудня***
***ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Клімашэўскай Т.***

Вялікдзень – вельмі вялікае свята, ці яшчэ яго называюць Пасха. У гэты дзень устаў з мёртвых Ісус Хрыстос. Да гэтага свята прыгатаўліваліся зараней, за два тыдні. Мылі ўсё ў хатах, сцíралі ўсё, бялілі. На гэтае свята вельмі смачна гатовілі ежу. Днём замешвалі і пяклі ў печы булкі з крэсцікамі пасярэдзіне. Варылі халадзец, пяклі мяса. Ноччу ўжо ішлі ў царкву святіць пасху, яечкі. Калі прыходзілі зранку дадому, то першымі запальвалі свечку, маліліся Богу, а потым пачыналі есці, і то, спачатку свечанае, а потым ужо ўсё тое, хто што хацеў.

На Пасху, калі сустракаліся людзі ці радня, то казалі: «Хрыстос васкрэс», а другія адказвалі: «Ваісціну васкрэс» і так 3 разы, і цалаваліся.

Яечкі красілі ў красны цвет. Варылі з цыбулі атвар і там іх красілі. Забаранялася красіць яечкі, калі нехта з радні памёр. Іх астаўлялі беленькімі.

Звычайна, на Пасху гулялі ў біткі, г.зн. біліся яечкамі.

Потым ужо хадзілі на могілкі. Таксама бралі свячоную ежу: булкі, яечкі, мяса і клалі на магілкі таму, хто памёр.

***Запісана ў в. Рудня***
***ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Клімашэўскай Т.***

Вялікдзень пачынаецца 23 апрэля. Хрыстос увоскрэс у чацвер перэд Паскою. Яго называюць Чысты чацвер. Як вечэраюць, то вечэра зовецца “тайною”. Хрыста на муку прэдавалі, трэба шоб на стале була рыба. Некоторыя ў чацвер повечэраюць і ўжэ до Паскі не едзяць нічога. У пятніцу, як прыходзяць з цэркві со страсця, робяць крэсты на столі, на дзьвярах свечкаю со страсця. Потом замешваюць паску, як подыходзіць, ставяць у печ. Зверху накрэст кладуць узор. Пякуць паску з тмінам, з ізюмам, з корыцаю, бувае зверху мажуць мёдам. Шчэ звечора красяць у цыбульніку яйца, шоб посвеціць да гуляць у біткі.

Уночы ідуць на ўсёночную ў цэркоў. Там свецяць паску і яйца. Дале, як прыходзяць з цэрквы, то садзяцца за стол і ядзяць усе свечоно: мясо, яйца, паску. К столу прыходзяць хросныя, прыносяць дзецям волочобнае: яйца, цукеркі, зернята, грошы. Іх частуюць. Пообедаўшы, гуляюць у біткі ў хаці, а затым ідуць на вуліцу, шоб вубіць чые яйцо, то будзе мацак.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,***
***студэнтам Кувікам А.***

Ой, як ждалі Паску ўсе. А вельмі, вельмі ждалі дзеці. Потому шо ўжо ў гэты дзень к Пасцы маці обязацельно шыла дзіцяці нове плацце ці нову сорочку. І мы ўжо ждалі етого празніка, ні знаю шо. Самае главное було –

красілі яйца. Ужэ ж дзеці ждалі етых крашэных яец. Ну, і красілі яйца ў красную краску, ва ўсякую красілі краску. І от як прымерно ў хаце быў покойнік, да на працяжэнні года, то не трэба було красіць у красну краску. Красілі толькі ў сіню ці зялёну, бо гэто вялікі грэх буў – красіць ў красну краску. От ужэ ждалі етых яец ды гэтую паску. Ды маці ўсякіх прысмакаў нагатовіць, да мяса, да здыме піндрука, да етого піндрука мясо достае, да яго варыць, да готовіць усякія прысмакі. А дзеці вельмі ждалі, шоб несці волочобного. У нас, напрымер, дзеці ходзілі к хросным. От ужэ маці ў вузелочак положыць і яец, і паску, і кусочок сыра, і кусочок масла. Ну, як булі конфеты, то і конфет трошкі положыць. Да ўжэ збіраліся дзеці, там пяць ці шэсць (колькі ў сям'е було), бралі гетога вузелочка і ішлі к хроснай маці і к хроснаму бацьку. Ды ўжо хросныя саджалі дзяцей за стол ды частавалі. І обратно ложылі ў вузелок больш, чым було положэно. А калі хросныя былі богатыя, то яшчэ клалі і грошы. А вот у Турове ўжэ не так. Ужэ хросныя ходзяць к сваім хрышчоным у госці.

Волочобнікі ў нас по селу ходзілі. Вельмі інцерэсна було, калі качалі яйца. Собярэцца багата мужчын, положаць яйцо ў калошню і коцяць, коцяць, а перакачвалі ж то жанкі. І коцяць, шоб перакоціць у другую колошню. У біткі гулялі. І от калі на Паску поснедаюць, то хозяйка ніколі не выкідала шкарлупкі з-пад свечанага яйца. Она навек этэ собірала, злажвала ў вузелок і от гэтыя косці, шо варaць коху (холоднэ, як цяпер кажуць), тожэ гэтыя косці забірала, складвала ў вузелок. І от ужэ як ехаў хозяін орaць першы раз поле (заворванне, як кажуць у нас), дак гэта шкарлупінне з гэтымі косцямі закопвалі на ўскрайку поля, шоб урожай буў добры, шоб поле было зашчышчоннэ от бур, от ветру велікого, шоб колоссе було добрае.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Лой Ганны Пятроўны, 1955 г.н.,***
***студэнткамі Бабовіч М., Быкавай Ю.***

У Велікодны пост поп не даваў спеваць тры недзелі. А дзеўкі ўсё роўна спевалі. У велікодную ноч, у дванаццаць, кругом цэркву ходзілі. У час ночы Хрыста клікалі. Потым поп начне казаць тры разы: «Хрыстос уваскрэс!» То потым усе за ім крычаць: «Хрыстос уваскрэс!». І дзень, цэлы дзень здароўкаюцца і цалуюцца з суседзямі, з своімі. Пад ранак, чуць звіднее, поп яду свеціць.

На Паску пускалі на звонніцу дзецей звоніць. На Паску, колісь, жонкі толькі на могілцы ходзілі. Яны яду свечану клалі. Мужчыны коло цэркву ў біткі гулялі. Обычно Велікдзень буў у нядзелю. А сярэд нядзелі жонкі не шылі, не пралі, не ткалі. У Турові на пяты дзень Велікодня помінають нябожчыкаў. У Погосці помінaлі на перву дзень Велікодня.

У пост і на Велікдзень спевалі "бабусю". На селе рабілі круг з 15 человек, у сярэдзіне "бабуся" – жонка. Чотыры жонкі ходзяць к "бабусі" ў круг, а тыя не пускають. Яны спевають, што "бабусі" гарэлкі дадуць і боршчу, кашы, пампушак, а тыя спевають: "Мы бабусі не дамо... Мы самі поемо...". На Паску спевалі таку песню:

А ў городзі под вербою
Стояць коні над водою.
Ой, венц, наш венц,
Зелёненькі барвенц.
– Ой, трава-трава шоўкова,
Цябе коні потоптали,
Цябе гусі пошчыпалі.
– Да й потопталі мяне тые дзевонькі,
Шо ў панчошках шоўковенькіх,
У чэрэвічках козловенькіх.

А на Вялікдзень спявалі і таку песню:

– Ой, суседочкі, мое голубачкі,
Ці не бачылі мое бабусі на торгах?
– Ой, хоць бачылі, хоць не бачылі,
Не скажомо.
– А му гарэлкі набяром,
Сваю бабусю позовом.
– А му гарэлку поп'ёмо,
Вашой бабусі не дамо.
– А му боршчычку наварымо.
Сваю бабусю посадзімо.
– А му боршчычко поемо,
Вашой бабусі не дамо.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Маркевіч Валянціны Пятроўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Бабовіч М.***

Моладзь пачынае збягацца да вясковай хаты на свята Вялікдзень. У хлопцаў у руках абавязкова павінны быць галінкі вярбы. Таксама трымаюць у руках кошыкі, у якія перад гэтым кладуць чырвоныя яйкі, пірагі (так званыя пасхі), а таксама розныя стравы.

Хутка ствараюць карагод і спяваюць прывітальную песню гаспадарам хаты:

– Ой, вясна ды вясна, ды вёсенка,
Што ж ты нам прынесла, прынеселка?
– Маладым малодкам – па бердзечкі, па бердзечкі,
А дзевачкам на крынічку па пранічку,
А малым дзеткам па яечку, па яечку,
А старым дзедкам па кіёчку, па кіёчку,
А маладым мужчынам па плужку.
А хлопчыкам па пужцы, па пужаццы.

Маладым-малодкам кросенцы ткаць,
А дзеўкам палотны бяліць,
Старым дзедкам на мураўцы сядзець,
Маладым мужчынам поле араць,
А хлопчыкам на пастку гнаць.

Калі з хаты выходзіла старая бабулька і пачынала запрашаць моладзь у хату, то дзяўчаты хапалі свае кошыкі і разбягаліся па домах, менавіта таму, што старая бабулька сімвалізавала старасць, лічылі, што калі запрашае стары чалавек, то дзяўчаты застануцца ў старых дзеўках.

Перад тым, як уцякці дадому, выбачаюцца і гавораць: «Дзякуй, бабулька, дзякуй дараженькая. Да цябе мы зайдзем абавязкова, але зараз мы спяшаемся на спатканне да сваіх бацькоў. Мы з "усяночнай" звечару стравы свяцілі ў царкве, так свята сустракалі, кастры на лузе палілі. А ў раніцу "гульню сонца» глядзелі". Моладзь абавязкова збіралася на беразе ракі або возера і глядзелі, чакалі, калі пачне ўставаць сонца. Яны абавязкова спяваюць песні.

Сонейка зазяла,
Над краем узышло,
З нябесаў нам паслала
Святочнае цяпло.
Пачатак існает ранічкі –
Чароўнае праменне,
Святочная заранaчка –
Прыроды абуджэнне.

Хлопцы, стоячы ў двары, размаўляюць з бабуляй, а потым прыходзяць унукі бабулі. Яны абавязкова хрыстосаюцца: «Хрыстос уваскрэс!» «Ва ісціну уваскрэс!» Дзеці абавязкова пытаюцца ў бабулі, ці не спазніліся яны да яе са святам. А яна адказвае: «Не, якраз. Зараз мы памыемся. У нас, на Палессі, бытуе такі звычай. На Вялікдзень, абавязкова перад тым, як заходзіць у хату і садзіцца за стол, абавязкова трэба памыць мусу (твар) і рукі свячонай вадзіцай, і будзем снедаць». Таксама бабуля апавядае такое павер'е: як толькі прачынаешся – адразу трэба мыць твар адварам, якім фарбавалі яечкі на Вялідзень. Лічылася, што так чалавек ачышчаецца ад усякіх нягод.

Бабуля на ручніку выносіць пірог, а ў гаршочку чырвоныя яйкі (у нашай вёсцы часцей за ўсё фарбавалі яйкі ў чырвоны колер, у іншыя колеры не так часта), і розныя святочныя стравы.

Яна папярэджвае, каб моладзь не спяшалася снедаць, бо спачатку трэба пагуляць "у біткі" (пачынаюць біць бакамі яйкі сяброў, у каго яйка застанецца цэлым, то і выйграе). Калі дзеці спрабуюць розныя стравы, бабуля, дакранаючыя да дзецей галінкай, прыгаварвае:

Вярба б'е,

Не я б'ю.
Сёння Вялікдзень,
Будзьце здаровы,
Як тая вярба.
Будзьце вясёлы,
Як такая вясна.
Слухайце бацька,
Слухайце мацер,
Не забывайце ўсім памагаці:
Старэнькім, маленькім
Ці хворым, можа,
А вам усім няхай
Бог дапаможа.
Пачастую я вярбою гасцей,
Каб хадзілі да сваіх сяброў часцей,
Каб здаровы былі,
Многа добрых спраў
На зямліцы рабілі,
Мову родную, беларускую любілі.

Пасля святочнага снедання моладзь адпраўляецца валачобнічаць, добраслаўляць дом гаспадара, усіх у доме, а таксама жывёлу:

Дзякуй людзям гаспадарлівым,
Што ў працы дбайныя,
Шмат чаго маюць,
Валачобнікаў шчыра вітаюць,
А, бывай здароў, жыві 100 гадоў,
Хадзі каля рэчак і май 100 яечак,
Хадзі каля лодак, май 100 цялятак,
Хадзі каля нівак, май 100 свінак.
Здрасце таму, хто ў гэтым даму:
Гаспадынечцы і гаспадару.
Ці не супраць гаспадар,
Каб да вас завітаць,
Віншаванні свае перадаць?
Добра пажадайце,
Бяды, гора не знайсці.
Дай, Божа, пане-гаспадыня,
Жыці, быці, дзетак пажаніці,
Унукаў дачакаць
Ды нас у госці пазваць.
Каб паненачка добра расла,
На тое лета замуж пайшла,
Каб пані не ганьбіла,

На вяселе запрасіла,
А мы будзем малайцамі,
Будзем дараваць чырвонцамі.

Потым моладзь ідзе валойнічаць далей, і абавязкова павінна кожная дзяўчына і хлопец зайсці да сваіх хросных маці з бацькам, а таксама да сваёй бабы. Яны насілі валачобны («пасхі», яйкі, стравы іншыя) хросным. У нашай мясцовасці паляць вялікі касцёр недзе ля ракі, таму што ў нас няма ніякіх узвышшаў. На гэтым кастры прысутнічае толькі моладзь, старых и малых часцей няма. Паляць калёсы ад машын, трактароў і гуляюць, чакаючы ўсходу сонца.

***Запісана ў в. Хваенск***
***ад Скрыгалоўскай Марыі Данілаўны, 1918 г.н.,***
***студэнткамі Меляшчэняй К., Юхіменка Т.***

От Веліконня ідзе сплошная седзьміца до пятніцы. Веліконне это недзеля, понедзельнік, оўторнік, срэда і чэцвер, толькі ў пятніцу роб‘яць. Называецца сплошная седзьміца. Тры дні Веліконня – это недзеля, понедзелок, оўторок, а Велікдзень – это першый дзень Веліконня. Тры дня Веліконня, а срэда – Градобой, а чэцвер – Наўскі Велікдзень.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

На Вялікдзень, каб пірагі падходзілі, кідалі дрова з яблыні, бо яны зыркіе.

***Запісана ў в. Буразі***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Да Вялікадня гатовіліса вельмі прыстальна і старана. Гэта рабілі ўсягда ў чацверг. Яго называлі чыстым. Большую ўвагу надавалі надворку. Палілі мусар, падмяталі, зграбалі смецце. У хаце мылі палы, здымалі павуцінне, вытрасалі палавікі. Яйкі красілі ў красны цвет. У чыгун сабіралі шкарлупу цыбулі, залівалі вадой, клалі яйкі і варылі. На Вялікдзень у царкве правіласа ўсю ноч. Утром ужо гаварылі: “Хрыстос Воскрэс!” Адказвалі: “Воісцены Воскрэс!” Гэта паўтаралі тры разы. Таксама прыходзілі хросная і хросны да дзяцей. Прыносілі паску свечаную, яйкі, грошы і канфеты. Яйкамі біліса. Выбіралі, у каго мацак. Паска праздналася тры дня.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор’еўны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Абрад “Валачобнікі”

Як рано паснедаюць, мужчыны ідуць на цэнтр вёскі і б’юць яйца, а

маладыя маладзіцы ў етэ време водзяць корогод і спяваюць:

Волочобные людзі добрые,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Валачыліса, намачыліса,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Ды й пойшлі да бабкі, посушыліса,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Ды й дала бабка ўсім по яечку,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Одной сіроціне яечка не хопало,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Дала ему бабка курачку-рабку,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Сірата не бірэ і з двара не ідзе,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Дала ему бабка дзеўку-прыгажуню,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
Сірата яе ўзяў і з двара пайшоў,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.
І падскакваючы і падзякваючы,
Хрыстос Воскрэс, сын Божы.

На Пасху размаўлялі з бацюшкой, на могілкі ідуць у чацвер. Так увесь дзень спяваем, танцуем, а мужыкі гуляюць у біткі, жонкі не гулялі, ето було вельмі рэдко.

***Запісана ў в. Вараніно***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Ой, у полі два дубкі

Ой, у полі два дубкі,
Ой, у полі два дубкі,
Ой, у полі два дубкі, два дубкі,
Там стаялі галубкі.

Вецер дуба хістае,
Вецер дуба хістае,
Вецер дуба хістае, хістае,
Хлопец дзеўку пытае:

Ой, дзеўчына, чыя ты,
Ой, дзеўчына, чыя ты,
Ой, дзеўчына, чыя ты, чыя ты,
Ці не выйдзеш гуляці?

Не пытайся, чыя я,
Не пытайся, чыя я,
Не пытайся, чыя я, чыя я,
Выйдзеш ты, то выйду я.

А я ў бацькі адзін сын,
А я ў бацькі адзін сын,
А я ў бацькі адзін сын, адзін сын,
Пагуляў бы хоць з кім.

А я дочка мамчына,
А я дочка мамчына,
А я дочка мамчына, мамчына,
Цалавацца навучэнна.

*Запісана ў в. Бярэжцы*
*ад Вянгура Марыны Васільеўны, 1902 г.н.,*
*студэнткай Мудабіравай Г.*

**Радаўніца**

Радаўніца звычайна адбывалася ў аўторак, на дзявяты дзень после Вялікадня. У другой палавіне гэтага дня забаранялася працаваць, лічылася грахом. Жанчына зранку прыгатоўлівала розную смачную ежу. Адзеўшыся ў святочнае, склаўшы ў што-нібудзь ежу, уся сям'я ішла на могілкі. Дома аставаліся толькі вельмі старыя і дзеці.

За некалькі дзён да Радаўніцы родныя прыходзілі на могілкі і прыбіралі магілкі сваіх блізкіх.

На магілцы рассцілалі рушнік, а на яго выложвалі велікодную ежу, прыгатаваную зрання. На магілках плакалі, качалі велікодныя красныя яйца па насыпу. Насып палівалі гарэлкай і мёдам. Затым, сеўшы на магіле, ядзяць. Але перш чым прыступіць да яды, запрашалі памершых пачаставацца. Колькасць страў была няпарная (5, 7, 9 і г.д.). З яды было: мёд, твораг, бліны, яйца, пячонае мяса, пірог, гарэлка.

На магілках астаўлялі патрошку кожнай ежы. Усё, што заставалася з ежы, раздавалі бедным.

*Запісана ў в. Поўчын*
*ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.,*
*студэнткай Аксёнчык Ж.*

На радуніцу паміналі ўсіх памёршых на могілках. На паску свяцілі яйкі і паску (хлеб), астаўлялі свечанае, каб было што занесці на могілкі. Рана сабіраліса родныя, бралі свечаныя яйкі і паску, цукеркі, пячэнне, абавязкова пшано і ішлі на могілкі. На могілках малиліса богу, запальвалі свечку, абходзілі магілку 3 разы, разложвалі прынесенае на магілцы і гаварылі: "Памяні, Божа, душы рабоў тваіх, а вы, птушачкі, увесь прынос з'ядайце і

нашых блізкіх памінайце. На могілках забараняласа піць спіртное, а зараз увесь род сабіраўса возле магілы з чаркай памінаць памёрлага. Садзіліса вакол магілы, слалі пакрывала і памінали. У якой вёсцы ёсць царква, то бацюшка ішоў на могілкі і правіў памінальную службу. Калі памінали без бацюшкі, то першую чарку вылівалі пад крыж ці памятнік і прыгаворвалі: "Памяні, Божа, бацьку майго (ці матку, ці дзядзьку)", і так у каго хто. І ўспамінаюць усё яго жыццё. Пасля памінак цалавалі крыж і ішлі дадому.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор'еўны,1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

**Юр'е**

Пра Юр'я е така прыказка: два Юр'і – два дурні, адзін – халодны, другі – галодны. Первым Юр'я лічыцца 9 дзекабра, а другім – 6 мая. Першага Юр'я добра не знаюць і не робяць нічога. А ўжо 6 мая некаторыя людзі гаворацць і шэпчуць на худобу сваю. У гэты дзень хазяйка сваю жыўнасць далжна накарміць, напаіць добра і смачна і абвесці вакол свайго сарая (калі гэта карова) з той мэтай, каб дзяржалася свайго двара.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Святочна апранутыя дзяўчаты збіраліся ў адной хаце, пяклі пірог з пшанічнай мукі, рабілі з галіны і чырвонай тканіны сцяг і ўтыкалі яго ў пірог. Наперадзе станавіўся хлопец з пірагом і сцягам, за ім – гурт дзяўчат, якія спявалі, а ўжо за імі – гурт хлопцаў. Яны абыходзілі ўсю вёску, заходзілі ў двары, дзе спявалі і вадзілі карагод:

Ідзе, ідзе карагод, карагод,
Усе дзевачкі напярод, напярод.
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.
Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.
У нашага карагода
Быў сын ваявода.

Адбываліся і гульні пастухоў. Пастух павінен быў абысці тры разы увесь статак, падысці да кожнага хлопчыка-падпаска, а затым усе разам з'ядалі яешню. Вечарам гналі жывёлу назад у вёску, дзе пачыналіся спевы і ваджэнне карагодаў.

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Шапавалавай Надзеі Юр'еўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Глазатавай Л.***

На Юр'я выпякаўся вялікі каравай. Выпякалі яго дзяўчаты. Хлопцы рабілі вялікі крэст. На крэст з аднаго боку весілі чырвоны фартух, а з другога – белы. Калі ішлі на поле, то неслі гэты крэст папераду моладзі чырвоным фартухам наперад. Крэст неслі хлопцы. Прыходзілі на поле, вадзілі карагод, спявалі песню. А калі ішлі назад з поля ў сяло, то крэст неслі белым фартухам наперад.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

Пякуць каравай, ложаць у века і ўкрашаюць цветамі. Мужык бярэ паднімае яго ўверх і танцуе. Гарманіст іграе і все женшчыны также спяваюць. Мужык браў граблі і два фартукі (зялёны і красны). Ходзяць по полю, по жыту і там также танцуюць і спяваюць:

Дзе карагод ходзіць,
Там жыто родзіць,
А дзе не бывает,
Там жыто влягае.
Ой, то ж карагод,
Сам Бог наперёд,
А хлопцы за намі
Маргаюць вачамі.

А потым ідуць да хаты і пяюць. І яйкі ім выносяць, а потым яйца прадаюць, что-нібудзь купляюць і робяць вечар (гулянку).

***Запісана у в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Ніны Генадзьеўны, 1915 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

Есцьцяка два Юр'і. Адзін восенню, а другі вясною. Той, які восенню, называецца халодны, а які на вясне – галодны. Казалі, што "да Юр'я патрэбна, каб сена было і ў дурня".

У гэты дзень усе ўставалі рана, з усходам сонца. Калі пазваляла надвор'е, то на Юр'я выганялі першы раз жывёлу на поле. Каля падваротніцы клалі замок. Трэба было, каб карова цераз яго пераступіла. Рабілі гэта для таго, каб ведзьмы малако не забіралі.

Яшчэ зранку, з кожнай хаты збіраліся больш старэйшыя жанкі і абыходзілі з песнямі ўсе хаты ў вёсцы. Гаспадары хат, у якія яны заходзілі, частавалі іх і прыгаворвалі: "На добрае лета". Затым гэтыя жанкі ішлі разам на поле, дзе было жыта, і вадзілі там карагоды.

Таксама на Юр'я ўсе стараліся абмачыцца расою, каб быць здаровымі ўвесь наступны год. Лічылася, што калі расы не будзе, то не будзе ў гэтым годзе і ўраджаю.

***Запісана ў в. Боркі***

*ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.,*
*студэнткай Беруніч В.*

У гэты дзень выганяюць кароў і ходзяць на поле асвяшчаць жыта, пшаніцу.

Калі хадзілі па полю і вадзілі карагод, спевалі:

Ото ж, корогод,
Ото ж, ясны!
Усе дзеванькі напярод,
А хлопчыкі ззаду.
Ото ж, корогод.

Радзі, Божа, жыта
Да на новае лета.
Дзе корогод ходзіць,
Там жыта родзіць!
А дзе не бывае,
Там улягае!

*Запісана ў в. Запясочча*
*ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,*
*студэнтам Русым Ю.*

Да юраўскага абраду рыхтаваліся амаль усе. Выпякаць абрадавы каравай хлеба выбіралі жанчыну, якая вельмі добра жыла (у дастатку, у пары і каб былі жывы ўсе яе дзеці). Каравай жэншчына выпякала з самай раніцы. Калі яго ўчыняла, дык абавязкова на хмельных дрожджах – дзеля того, каб ураджай рос і віўся ў каласкі так, як хмель. Садзіла каравай на хмялёвых лісточках. Калі каравай быў гатовы, збіраліся ўсе жанчыны, каб яго ўпрыгожыць кветкамі. Адзін з мужчын выразаў тры галінкі з дрэва слівы, і каб яны былі абавязкова з двумя галінкамі. Гэтыя галінкі ўтыкалі ў каравай хлеба, упрыгожвалі кветкамі і стужкамі з паперы. Потым яго ставілі на веко дзежкі, усыпаным хмялёвымі лісточкамі. Таксама бралі граблі і рыхтавалі два фартухі (чырвоны і зялёны). Карагод абавязкова нёс мужчына, граблі з фартухам таксама. Калі ішлі на поле, на граблі вешалі зялёны фартух, з поля – чырвоны. Зялёны фартух – на добры ўраджай, чырвоны – добраму гаспадару, прыбытку ў хляве, моцнага здароўя ўсёй сям’е. На поле ішлі моўчкі, размаўлялі паміж сабою. Калі заходзілі да поля, то чакалі, пакуль поп абойдзе поле з малітваю і царкоўнай песняй. Потом жанчыны пачыналі вадзіць юраўскі карагод, прасіць дапамогі ў Бога, каб той даў добры ўраджай і каб дазволіў вадзіць карагод. Пачыналі карагод з песні: “Да подай, маці, ключа”. Калі накіроўваліся ў вёску, то на граблях змянялі фартух, зялёны на чырвоны. У вёску ішлі з песнямі і прытанцоўкамі. У вёсцы не міналі ні аднаго двара. Кожнаму гаспадару вадзілі карагод, жадаючы яму дабрабыту, здароўя, добрага ўраджаю, усяго самага найлепшага. У знак падзякі,

гаспадары давалі пачастункі (яйкі, хлеб, сала, гарэлку, усякія прысмакі). Калі быў закончаны абыход усіх двароў, збіраліся ў чыёй-небудзь хаце. Лічылі ўсё тое, што давалі ім гаспадары. Потым плацілі музыканту і на ўсю ноч наладжвалі гулянне.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

На Юр'яў дзень пякуць карагод. Калі спякуць карагод, дык тады яго нараджаюць (упрыгожваюць). З розных паперак выразаюць кветкі, лентачкі і засаджваюць на хлеб. Затым бяруць два хвартухі. Гэтыя хвартухі прывязваюць да грабель. Потым гэтымі хвартухамі махаюць у вокны. Калі ў каго хто памёр, то махаюць белым хвартухам, у іншым выпадку – чырвоным. А карагода, што спяклі і ўжо нарадзілі, бяруць два хлопцы. Адзін носіць карагод, а другі – тыя граблі з хвартухамі. Пасля ўсяго гэтага пачынаюць вадзіць карагод, узяўшыся за рукі, а тыя хлопцы ідуць у цэнтр круга. Ім даюць яйкі, грошы, хто што мае. Затым пачынаюць пець песні:

Эй, у корогода сын-воевода.
Там, дзе корогод ходзіць,
Там Бог да жыто родзіць.
А йдзе ж да не бувае,
Там жыто да ўлегае.
Зародзі, Божэ, жыто
Да новое лето,
На жыто, на пшаніцу,
На ўсякую пашніцу.
Да, Юрай маці клічэ:
Да, подай, маці, ключа,
Штоб небо й отворыці
Да росіцу спусціці.

***

Юр'я, Юр'я, Божа мой,
Подай ключы землю адмыкаці,
Бычка напасаці.
На Юр'еву росу
Бычка напасу:
– Бычок, трацячок,
Ці повен твой бочок?
– Яшчэ пакуль не повен,
З левым не ровен.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Мароз Анастасіі Архіпаўны, 1910 г.н.,***
***студэнткай Кошман Т.***

На Юрэй ідзём на поле. Пяком каравай, наражаем яго ўсякімі цвятамі. Дзве доўгія жордкі чапляем, фартухі: адзін – зялёны, адзін – красны. Зайшлі на поле, выбралі самы густы загон жыта і бяромся ў кружок, пасярэдзіне каравай:

Зарадзі, Божа, жыто,
Да на новае лето.
А на жыто, на пшаніцу,
Да на ўсякую пашніцу.
Да подай, маці, ключы.
Да до Бога оттворыці,
Да росіцу спусціці.

***

Вяду, вяду карагод,
Усе дзевачкі напярод,
А хлопчыкі за намі,
Моргаючы брывамі.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Юр’е святкаваўся 6 мая. На свята по сялу вадзілі карагод. Бяруць граблі, вешаюць на іх два фартухі. У гэты дзень пякуць каравай. Адзін мужчына нясе граблі, другі – каравай.

Гэтыя два мужчыны станавіліся ў сярэдзіне, астатнія кругом, замыкаючы круг. Тыя, што ў крузе, па гадзіннікавай стрэлцы, тыя, што звонку – супраць. Гэты карагод звычайна вадзілі ў жыце:

Вяду карагод,
Сам Бог напярод.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,
А дзе не бывае,
Там улягае.
Зарадзі, Божа, жыта
На новае лета.

Калі спявалі карагод, давалі людзі яйкі, грошы. За грошы наймалі гарманіста, а яйкі закопвалі ля хлява, каб вялася год жывёла. На Юр’е выганялі карову, каб выйшла на раку.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,***
***Новак В.С.***

Юр’е – это празнік, на екі хазяева начыналі планіраваць сваю работу па хазяйству. Обычно ў эты дзень, 6 мая, людзі рабілі агляд сваёй зямлі, планіравалі, што дзе будуць садзіць. У еты дзень выганялі кароў на пашу. Первы дзень прыпасвалі ўсе вмесце, а на другі дзень гнаў той, каму чарга була. Стараліса выганяць так кароў, каб у понедзельнік не прышлосо кому-нібудзь гнаць одному, бо плохі дзень.

На Юр’я обрэзалі хвосты каровам. А некаторыя хазяйкі, як выганялі з двара кароўку, то клалі на землю ветачку свечонай вербы і стараліса паганяць кароўку свечонай ветачкай. Это, коб не зурочылі і не прырабілі чаго.

Пастухі ўсе пазбіраюцца: і жанчыны, і мужчыны, і малые, наберуць еды, гарэлкі і замочвалі первы дзень прыпасвання кароў. Пелі песні разные застольные, беседные, хто екіе знаў.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Субат Яўгеніі Пятроўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Перш за ўсё нехта пячэ каравай, а пасля ўсе разам яго наражаем і праслаўляем:

Каравай, каравай,
Мы цябе праслаўляем
Шчасцем і долей.
Дай, Божа, нам усім разам Юр’е згуляці,
А зараз пойдзем іграючы і спяваючы,
Слаўнага гаспадара праслаўляючы.

Усе разам ідуць з песняй у сяло к двару гаспадара. Гаспадара хаты запрашаюць з сабой на поле вадзіць карагод. Ён нясе граблі, на граблях – красны фартух, хлопец нясе звязду. Дзве жанчыны дзержаць ручнік угору, іграе музыка, і ўсе ідуць пад ручнік. На полі знімаюць красны фартух, а на граблі надзяваюць зялёны і ўслаўляюць зямлю, пасля ўшанавання зямлі ўвесь карагод ідзе да гаспадароў:

Добры дзень, пане гаспадару!
Са святам вас.
Ці можна ў вашым двары карагод вадзіць?
Няхай твая ніўка добра родзіць:
Жыта, пшаніца, усякая пашніца.

Гаспадары кожнага двара даюць нам юр’еўскія пачастункі. Так мы абходзім усё сяло. Пасля абыходу сяла ўсе ўдзельнікі карагоду збіраюцца ў клубе і гуляюць з песнямі і танцамі:

Да вынесь, вынесь, пане-гаспадару,

Карабель яіц непалічоных.
Мы ж тыя яйкі самі пералічым
Да й пана павялічым.
Будзь здароў, як крынічная вада,
Будзь вясёлым, як харошая вясна.

Ой, выйдзем на поле,
Ой, выйдзем на поле,
Паклічам Бога.
Адгукніся, зямліца,
Выпусці расіцу.
На Юр'е ўстань рана,
Паедзь на поле,
Адшукай зямліцу,
Выпускай расіцу.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Марціноўскай Ларысы Міхайлаўны, 1964 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

На Юр'я хадзілі па жыце і спявалі песні, каб ураджай быў добры. Таксама пяклі пірог, які называўся карагодам, і бралі ікону. З гэтым яны абыходзілі поле і спявалі:

Вяду, вяду карагод.
Сам Бог напярод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы бравамі.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,
А й дзе не бывае.
Там лягае.

Калі выганялі на поле карову, то лажылі ойстрым да яе. Калі карова пераступала, значыць, у яе ўсё ойстра прападала. Калі ў гаспадарцы было 2 каровы, то каб яны разам хадзілі, рабілі следующчае: вечарам, перад тым, як падаіць іх, гаспадыня брала два хвасты і церла адзін аб аднаго. Таксама ў гэты дзень білі ўсю жывёлу свечанай вярбой, каб была здарова і вялася.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Пяшэвіч Я.***

Юр'я – гэта такі дзень, які поўнасцю прысвячаўся жывёле, гаспадарцы. Так, напрыклад, хадзілі па жыці і песні спявалі, каб ураджай быў. Выганялі карову на пастбішча. Калі з хлява выпускалі, то клалі сякеру ойстрым к карове, каб усё ойстрэ прапало. Калі ў хазяйстве было 2 каровы, то на Юр'я

гаспадыня прытульвала гэтыя хвасты адзін да другога і трошкі церла адзін аб аднаго. Пасля гэтага кароўкі ўсягда разам хадзілі. На Юр'я шчэ гаспадынька біла ўсю жывёлу дубчыкамі, што сахранялі пасля вербнай нядзелі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

Юр'е атмячалі **6** мая. Выганялі скаціну ў поле.

Выганяю скаціну
На Юр'еву расіну,
Штоб травінку з'ядала,
Вадзічку співала
І хазяйке малачко прыбаўляла.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскагар-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

Гэтае свята Юр'е пачыналася 6 мая – свята вясны, першы дзень, калі выганялі жывёлу ў поле. Людзі яшчэ казалі, што на гэтае свята пачынае ўжэ кукаваць зязюля.

Юрай, як лічылі людзі, быў апекуном жывёлы.

Гаспадары ў гэты дзень выганялі жывёлу зарань вельмі, на юраўскую расу. Тады будзе вельмі многа малака. Людзі вельмі верылі ў сілу юраўскай расы. Калі скаціна паесць гэтай травы, тады будзе яна здаровая. Расу шчыталі палезнай і для людзей. Ёй абмывалі хворыя часткі цела, вочы, змешвалі яе з святою вадою, якую свяцілі на Вадохрышча, і прыскалі ёю жывёлу.

На Юр'я вадзілі карагод. Пяклі каравай, прыбіралі яго ў кветкі. На граблі вешалі два фартухі – адзін зялёны для поля, для багатага ўраджаю, для прыбытку ў гумне і на стадзе, чырвоны – для добрага гаспадара. Калі ішлі ў поле вадзіць карагод – зялёны фартух уперадзе, а з поля – чырвоны.

На Юр'я выконвалі песні светлыя, празрыстыя. Асаблівую ролю ў іх адыгрываюць ключы. Звычайна яны патрэбны Юрыю альбо яго маці, каб адамкнуць зямлю і выпусціць расу.

У песні з Жыткавіцкага раёна ад Юрыя патрабуюць, каб ён аддаў ключы сваей маці:

Ой, Юрай, падай маці ключы...
Ой, Юрай, падай маці ключы.
Да падай маці ключы
На новае лецейка,
На зялёнае жыта,
На жыта, на пшаніцу,

На ўсякую пашніцу.
Ой, што ж карагод.
Сам Бог – на парог.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,
А дзе не бывае –
Там улягае.
Трэба паглядзеці,
Дзе ж нашыя дзеці.
Трэба пачакаці,
Па яечку даці.

***Запісана ў в. Рудня***
***ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Клімашэўскай Т.***

У нас на Тураўшчыне, амаль ва ўсіх вёсках існуе такі абрад-звычай: “першы выган коровы на пашу”, пасля зімоўкі. Кожная гаспадыня зараней рыхтавалася для выгану коровы на пашу.

На “Хрэсцы” – рэлігіёзнае свята, пяклі спецыяльны “хрэшчык” для выгану коровы на пашу, яго асвяшчалі ў царкве. Гэта рытуальнае печыва ў выглядзе крыжыка, упрыгожанае сухімі ягадамі чарнікі.

Кожная гаспадыня хоча, каб яе карміліца не хварэла, давала шмат малака, нясла яго ўсё дахаты, прыходзіла толькі да свайго двара, каб не лёг на яе короўку дурны дух, каб аберагчы ад дурнога вока. Перш чым выгнаць корову з хлява, гаспадыня працягвала перад дзвярыма ланцуг, а на парозе клала замок ці якую-небудзь жалезку.

Корову спачатку акрапляла асвячонай вадой, давала ёй з’есці “хрэшчык”, абціралa тканым ручніком, гаворачы словы замовы: “Госпаду Богу памалюся, Прачыстая Божай Маці пакланюся. Прачыстая Божая Маці з прыстолу ўстала, мою короўку Рабку ў чэрэду ўганяла. Ідзі, короўка, у чэрэду, а сам Господ по перэду. Зперэду прыпу нясе, ззаду подганяе, злого духа не подпускае. Ідзі, короўка, у чэрэду, травіцу поедай, водзіцу попівай, а после чэрэды да домоў ідзі”. Або такую замову: “Праз тыдзень Вялікдзень, красна яечка ўжэ недалечка, ідзі, короўка, у чэрэду, ні по заду, ні по перэду, а ідзі по серэдзіне, травіцу поедай, водзіцу попівай, свой двор не мінай”.

Абавязкова корову выганялі з асвячонай вярбою, якую свяцілі ў царкве на “Вербніцу” са словамі: “Не я б’ю, верба б’е. Ідзі, короўка, у чэрэду, сам Господ по перэду. Хвосцікам отмахніса, рожкамі отколіса, з Госпадам Богам і молочком у здравіі домоў вороціса. Не я б’ю, верба б’е, ідзі, короўка, у чэрэду, сам Господ по перэду, там ты наедайса, і домоў вяртайса”.

Некаторыя гаспадыні, па павер’ю, клалі перад дзвярыма сякеру, скабу, касу, серп – каб адагнаць злых духаў, зберагчы ад дурнога вока і г.д.

***Запісана ў в. Старажоўцы***
***ад Леўкавец Ганны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***Аліфіравец Вольгі Паўлаўны, 1940 г.н.,***

*Рыдзецкай Ніны Максімаўны, 1936 г.н.,*
*дырэктарам ЦФ Лой Г.П.*

Юрэй адзначаецца 6 мая. На Юрэя пеклі корогоды, нараджаліся і ішлі з імі на поле. Ходзілі по збожыне да спявалі:

Ото ж корогод, ото ж воевод.
Зародзі, Божэ, жыто, да на новае лето.
Дзе корогод ходзіць, там жыто родзіць,
А дзе не бувае, там полягае.

Гавораць "На Юрэя трэба, коб сено було і ў дурня. А на Міколу подавай і вілкі хавай".

*Запісана ў в. Запясочча*
*ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,*
*студэнтам Кувікам А.*

Кожная жанчына, да якой павінны былі прыйсці госці, абавязкова гатавала ежу і пякла каравай хлеба. Яго называюць карагод. Заходзіла к ёй нейкая дзяўчына, віталася, віншавала са святам і пыталася аб справах, здароўі гаспадыні. Таксама пыталася аб тым, ці падрыхтавалася жанчына выйсці вадзіць карагод.

– Ну, а як жа, дзетка мая, падрыхтавалася. Вось бачыш і карагод ёсць з чым вадзіць, цудоўны атрымаўся каравай! Ты лепш не стой, а ідзі да дзяўчат і жанчын, клікай іх каравай нараджаць.

У нашай мясцовасці каравай павінен быць упрыгожаны кветачкамі з бумагі або жывымі галінкамі, кветачкамі. Не дазвалялася, каб каравай быў "голы".

Тут у хату гуртком заходзіць моладзь, жанчыны, мужчыны, з гармонню, усе абавязкова апраноўваліся ў чыстае святочнае адзенне і к вечару стараліся вызваліцца ад нейкіх сваіх дробных забот. А гаспадыня, у сваю чаргу, запрашае іх у хату. Госці пачынаюць радзіць каравай і абавязкова спяваюць песню:

Каравай, каравай,
Мы цябе праслаўляем
І шчасцем, долей.
Дай, Божа, нам усе маці
І разам усім Юр'е згуляці.

Тут якая-небудзь жанчына просіць гаспадыню, каб тая прынесла ў хату граблі, бо ўжо час вешаць на іх фартухі. У нас бытуе павер'е, што калі павесіць на граблі зялёны фартух і пакінуць так яго, то ў той будзе вельмі добры ўраджай, будзе добры прыбытак у гумне і на стале. Калі красны – нейкае дабро для гаспадара.

Калі на поле шлі вадзіць карагод, тады бралі зялёны і неслі яго наперадзе, а калі ўжо вярталіся з поля, дык давалі гаспадару красны. Потым выбіраўся малады, сільны, прыгожы хлопец, які пачынаў першы вадзіць карагод. Гэты хлопец бярэ каравай, выносіць яго з хаты, дзяўчына – граблі, і ўсе астатнія выходзяць з хаты. Жанчына-гаспадыня хрысціцца і гаворыць: "Благаславі нас, Божа, на век вечны, на ўсё жыццё". Нейкая жанчына спявае песню-заклікалку, каб усе астатнія чулі і таксама збіраліся ў поле на карагод. Усе гавораць такія словы: "Давайце заспяваем песню, каб усе гаспадары чулі і разам з намі пайшлі ў поле Юр'я праслаўляць, карагод гуляць. Дазволь карагод вадзіць, поле ўслаўляць і Юр'я праслаўляць. Ваша жыта ўрадзіцца, прыйдзем разам падзяліцца. Гуляйце, спявайце, дзе ж карагод ходзіць, там Бог жыта родзіць, а дзе ж не бывае, там улягае".

Хлопец ідзе першы на поле, а за ім дзяўчына з граблямі, жанчыны спяваюць юраўскі карагод. Потым яны становяцца так, каб хлопец і дзяўчына былі ў цэнтры. Хлопец падымае каравай вышэй галавы і апускае на працягу ўсёй песні. Разам з тым хлопец прыгаварвае:

Хай засвеціць сонца ясна,
Каб жылося людзям шчасна,
А зараз пойдзем іграючы ды спяваючы,
Глаўнага гаспадара ўслаўляючы.

Потым з песнямі ідуць у сяло па двару гаспадара. Калі падыходзяць, то здароваюцца, віншуюць са святам і пытаюцца, ці можна тут вадзіць карагод. А хлопец гаворыць такія словы:

Няхай твая ніўка добра родзіць жыта,
Пшаніцу і ўсякаму пашніцу.

Тут спяваюць песні, расказываюць прыказкі, прымаўкі, а, развітваючыся, разам гавораць:

Дай Бог, каб на вашам полі быў вялікі ўраджай,
Каб зерня насыпалі
Поўныя мяхі.
Вось вам проса,
Каб у вас вялося,
Каб у вас ніўка ўрадзіла
На добры каравай.

***Запісана ў в. Хваенск***
***ад Скрыгалоўскай Марыі Данілаўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Меляшчэняй К.***

Абрад Юр'я святкуецца ў сяле і да цяперашняга часу. Гэта традыцыя тут ніколі не памірае. У сяле перад гуканнем Юр'я збіраліся жанкі ў адной

хаці, учынялі коровая. Яго пяклі, рабілі цвяты з двухцвятной бумагі. Даставалі коровая з печы, ставілі на веко дзежкі, обсыпалі под веком дзежкі зерном, а далей накрывалі такою дзежачніцаю вышытаю. А потом ішлі па вішні або слівы, зразалі галінкі, на якіх шоб було тры палочкі, да ставілі іх ды нараджвалі іх цвятамі, лентамі. Гэта выконвалася прэждзе чэм выходзіць з хаты. Браў хлопец, обязацельно трэба, шоб каравая вёў хлопец, і бралі граблі. На граблі вешалі краснага фартуха і зялёнага фартуха. Як ішлі ў поле, то няслі з зялёным фартухам. І спераду ішоў у начале карагод, за карагодам няслі граблі з зялёным фартухом, а потом устраіваліся ўсе, хто вадзіў карагод, і ішлі на поле. Но поле іх навек ажыдаў бацюшка-поп. Поп чытае сваю малітву, спявае сваю бажэственную песню, заклікае Юр’я і Госпада Бога, шоб дожджычок прайшоў, шоб пшаніца не повяла, шоб яна добра расла. А потом пасля папа булі на поле жанкі. І карагода ставілі ў сярэдзіну, з граблямі водзяць вакол іх карагод па полю з песнямі. Спеваюць:

Да ўрані маці ключа,
Да падай маці ключа.
Зародзі, Божэ, жыто
Да на новае лето,
Да на пшаніцу,
Да на ўсякую пашніцу.
Дзе карагод ходзіць,
Там Бог жыта родзіць.
Дзе карагод уецца,
Там жыто даецца.
А нашога карагода
Сам сын-ваявода.
А нашое карамыслі
Сам сын новай мыслі.
Дзе карагод ходзіць,
Там Бог жыта родзіць,
А дзе не бывае, там улягае.

Патом паходзяць па полю і ўжэ сабіраюцца ісці ў сяло з поля. І ўжэ як у сяло ідуць, карагод ідзе спераду, а граблі ўжо пераварочваюць і ўжо красным фартухом. Это ўжо, шоб у сяле ўсё было красна. І начынаюць ад першай хаты і по ўсём сялу, кожнага двара не мінаючы, ходзяць па кожнаму двару. І от як ужэ прыходзяць к хазяіну, то кажуць: “Юр’я прыйшло, свята прынясло, адчыні дварыцу, выпусці расіцу. Ці можна, гаспадар, карагод павадзіць, Юр’я поспяваць і гаспадара паслоўляць?” І ўжэ гаспадар отвечает: “Можна, можна. Мы вас ждалі!” І тады ўжо начынаюць вадзіць карагод і песню спяваць. А песня була адна. Гэту песню спявалі ў кожным двары. Калі паводзяць карагод, то кожны хазяін дзякаваў, ужэ выносіў пачастункі. Ну, механоша ўсё гэта сабіраў і ўжо, як абходзілі ўсё-усё сяло, то збіраліся ўсе ў цэнтры сяла, то тожа нанімалі музыкаў, аддавалі часць таго, шо назбіралі.

Нанімалі гарманіста, спявалі, усякія прыказкі гаварылі, танцавалі вельмі добра.

*Запісана ў в. Чэрнічы*
*ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,*
*студэнткай Хільман І.*

Існаваў обрад Юр'я. Гэты обрад навек у чысле праводзіцца 6 мая. О, ето вельмі інцерэсны обрад. Обычно на гэты обрад збіраліса і жонкі, і дзеткі ўсе разом. І от ужэ вібіралі такую жонку, шоб она була ў пары, шоб у яе ў сям'е було добро. І ей даручалі пякці коровай, такі коровай, бохан хлеба. Ето она звечара, шчытайце, цесто замесіла і раненько, до восходу сонца, яна ўстае, месіць етэ цесто, робіць еты коровай, саджае яго ў печ. І от ужэ як ён спячэцца, яна яго выймае з печы, прыходзяць усе остальныя жонкі, хто збіраўса водзіць гэты корогод (коровай юраўскі). Вот і дзяўкі прыходзілі. І ўжэ перш чым начынаць гэты корогод, выразалі обязацельно з вішні або з слівы тры голіначкі, і шоб на етых трох голіначках булі паросточкі. І от ужэ обворачвалі етыя палочкі, рабілі з бумагі цветы, лентачкі вешалі, народжалі гэтого коровая, шо ён становіцца хорошы-хорошы. Усе разом народжаюць етого коровая, стаўляюць на дзежку. Веко от таке дзежкі круглое, засыпаюць туды зерно, у тэ веко, і ўжо наверх на зерно стаўлеюць коровай геты. Коровай обезацельно трэбо шоб нёс хлопец. Бралі молодого хлопца, шоб нёс коровай, і бралі граблі. На граблі вешалі зялёного хвартуха і красного. Ну, от уже хлопец браў гэты коровай. Выходзілі з хаты, спявалі песні. Хлопец несе спереду коровай, а дзеўка несе граблі. І от ужэ по ўсём селу скрозь по вуліцы ідуць гетыя жонкі, дзеўкі і хто шо спявае, якія-небудзь і частушкі, і ўсё спяваюць і спяваюць. І уже, як ідуць на поле, то дзеўка нясе граблі передом з зялёным хвартухом, потому шэ поле зялёнае, і шоб буў добры ўраджай. І ўжо прыдуць яны на поле туды, і ўжо на гэтым полі ждзе іх поп. Жонкі на поле не ступяць до тых пор, пока бацюшка не обойдзе поле, не прочытае свою святую молітву. Калі бацюшка прочытае молітву, то тады на поле ідуць жонкі. Спереду ідзе гэты корогод, які хлопец нясе, потом ідзе дзеўка з граблямі, і ідуць жонкі. І от яны становяцца ў такі круг, хлопец у сярэдзіне корогода і дзеўка ў сярэдзіне корогода. І от ўжэ по гэтому полю ходзяць і спяваюць корогодную песню, шоб гэтэ поле було ўрожайнэе, шоб було ўсе добрэ. І от такая песня була:

Да подай, маці, ключэ,
Да подай, маці, ключэ,
Да й не мушу ё творыці
Да росою спусціці.
Зародзі, Божэ, жыто
Да на новае лето,
Да на жыто, на пшэніцу,
Да на ўсяку пашніцу.
Велі, велі корогод, корогод,

Да за імі да сам Бог наперод.
А ў корогода – сын-воевода,
А ў карамыслі – добрыя мыслі.
Велі дзеўкі корогод, сам Бог наперод.
А хлопчыкі за намі, моргаючы бровамі.
Да подай, маці, ключэ
Да подай, маці, ключэ.
Да й не мушу ё творыці
Да росою спусціці.

Вот спяваюць етую песню, а хлопец подымае коровай то ўверх, то ўніз. І от як поводзяць корогод на полі, ужэ дзеўка становіцца з граблямі наперад, поворачвае граблі красным хвартухом к селу. І ўжэ напраўляюцца, ідуць на село. Ідуць у село, і пачынаючы от першое хаты, от першого двора, і по ўсём, по ўсём селу ў кажды двор заходзяць і водзяць у каждым дворэ корогод, і спяваюць. І от ужэ, як подходзяць до двора, то хто-небудзь і з жонок путае: "Пан-гаспадар, ці можна ў тваём дварэ корогода поводзіць? Ці можно табе ўрожаю пожадаць? Ці можна табе шчасця пожэлаць?" Ну, і ўжэ господыня, конечно, выходзіла, да ўжэ, ну, просіла, шоб проходзілі, шоб спявалі. Казала: "Проходзьце, жоночкі, спявайце, Юр'е прослаўляйце, жывую росу выпускайце на буйное лето, да на колосістое жыто". Ну, ды заходзілі ў огороды, у дворы, ды водзілі корогоды, но ўжэ красны хвартух спереду. А красны хвартух спереду для того, шоб буў господар красны, богаты, здоровы. І так кажды, кажды двор абходзілі. І от у Погосці до цеперашняга дня гэты обрад спраўляецца кажды год, і яго такая акціўная форма, шо яны не могуць. Яны кажды год водзяць корогод. І вы знаеце шо, от як не прыйдуць у чый-небудзь двор, не дай Бог, то людзі ўже обіжаюцца. Ну, есцественно, гаспадар стараецца даць шо-нібудзь тым, хто водзіць корогод. І ужэ як поводзяць корогод, да уже назбіраюць етых яец, да ўсё. Это ўжэ цяпер гармоністаў богато, а коліся ж гармоністаў не було ж, то ўжэ етыя яйца ўсе поскладваюць, да яка коўбаса ці шо, да заплоцяць гармоністу гэтому яйцамі да коўбасою. Да наймуць гармоніста, да цэлу ноч танцуюць, спяваюць, гуляюць. Ды ўсё сяло гудзе.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Лой Ганны Пятроўны,***
***студэнткамі Бабовіч М., Быкавай Ю.***

Выган каровы на пашу. Б'юць свечанаю вярбінаю, ложаць под дзверы яйцо і замка: замка, коб знала свою адрыну, яйцо, коб була поўная. Зналі розныя заговоры:
Юрый і Егорый,
Посі мою скоцінку,
Зранку до ночы,
З ночы до поўночы,
Под ясным месяцом,

Под яснымі зорамі,
Пасі, напасай да ў хлявец прыгоняй.

*Запісана ў в. Буразі*
*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

Валачыўся Ярыла
Па ўсяму сьвету.
Тамо жыта радзіў,
Людзям дзеці пладзіў.
А дзе ж ён нагою –
Там жыта капою.
А дзе ж ён ні зірне –
Там колас зацьвіце.

***

Юр'я, Юр'я,
Божа мой.
Падай ключы –
Зямлю адмыкаць,
Быка напасаць.

***

Святы Юр'я,
Божы пасол,
Да Бога пайшоў,
Узяў ключы залатыя.
Адамкнуў зямлю сырэсенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую.

***

А ты, Юр'я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола,
Юр'я кажа: "Абыду".
Мікола кажа: "Пагляджу!"
Юр'я кажа: "У пучочкі".
Мікола кажа: "У каласочкі".
– Дзе ты, Юр'я, урасілася?
– Дзе ты, Мікола, умачыўся?
– Горы, межы ходзячы,
– Жыта, пшаніцу родзячы.

***

Юр'я, Юр'я,
Божа мой.

Ты на полі ходзіш,
Да Бога ты просіш:
– Падай ключы
Зямлю адмыкаць,
Каней напаіць.
На Юр'е ў расу
Коней напасу.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

Юрый, уставай рана,
Адмыкай зямлю,
Выпускай расу
На цёплае лета,
На буйное жыта,
На ядраністае,
На каласістае,
Людзям на здароўе.

***

Вярба б'е, не я б'ю,
За тыдзень – Вялікдзень,
Вярбовым дубцом
Ды самым канцом.
Уставай рана быдла гнаць,
Не забудзься лусты ўзяць.

***Запісана ў в. Пясчанікі***
***ад Шчур Параскі Цімафееўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

***

Юр'я, рана ўставай,
Зямлю адмыкай,
Расу выпускай,
На цёплэ лецечко,
На буйнэ жыто,
А мы пойдом, дзевочкі,
У зялёныя лугі
Вяночкі завіваць,
На годы добрыя,
На жыто густэ,
На ячмень каласісты,
На лён доўгі.

***

Вяду, вяду карагод,
Усе дзевочкі наперод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы бровамі.
А дзе карагод ходзіць,
Там Бог жыта ўродзіць,
А дзе не бывае, там улягае,
Зародзі, Божэ, жыто на новое лето,
А на жыто, на пшэніцу,
На ўсякую пашніцу.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

***

Вяду, вяду корогод,
Усе дзевочкі наперод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы брывамі.
Дзе корогод ходзіць,
Там Бог жыто родзіць,
А дзе не бувае, там жыто ўлягае.
Зарадзі, Божэ, жыто,
Да на новае лето.
Ой, жыто, пшаніцо,
Да і ўсяку пашніцу,
Да й подай, маці, ключы,
Да й подай, маці, ключы,
Дай нам небо творыці,
Да росіцу пусціці,
Вот, вот корогод,
Вот, вот воевод,
А ў корогода сын воевода.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

У эты дзень людзі не роботалі, людзі праздновалі эты дзень. Это сегонні людзі гуркі садзяць. Іе прыказка: “Кладзі на Юр‘я, дак будзе і ў дурня”. А я послухала да пошла поклала на Юр‘я, дак стаканчык так і адпаў, дно. От як последніе гуркі ўцягала і ў руццэ стаканчык лопнуў, а ад чаго? Прыкмета ж нейкая іе. І я от того сказала, што нікогда не буду на Юр‘я робіць. Хіба што знаць не буду. Я п’ятого чысла, прымерно, кладу, перэд Юр‘ем.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Кароў аддавалі пасці пастуху. Пастух набіраў сабе подпасычоў. Бралі свечану вербінку і тры разы ўдаралі ею па карове, шоб до коровы не прыставала нечыстая сіла ці ведзьма. Хазяйка брала яйцо і прыказвала, шоб на пашы наедаласа, да була поўная, ек ейцо. Ложылі под дзверы, дзе ходзіць корова, замок, шоб ведзьма не ўлезла ў хлеў по молоко. Ек корова не покрываецца доўго, то над дзверамі становіцца дзеўка, толькі шоб була чэсная, росставіўшы ногі, шоб корова под ею пройшла і покрыласа. З запаленою свечаной свечкой обходзілі корову, шоб ей навек светло домоў ходзіць. Говорылі заговор: "Светы Юрэй і Егорый, пасі мою корову зранку до вечора, дзень под сонцэм, ноч под месяцэм, под яснымі зорамі, пасі, напасай, до хозяйкі ў хлевец прыгоняй". Пастухі называлі сябе зверамі, ваўком, зайцам, сляпым замуком, колодою. Гето шоб воўк не поймаў. шоб его рот замок закрыў, шоб ослеп і не бачыў скоціну.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Сыс Еўфрасінні Іванаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Юр'я адзначаецца ў весну, калі зацвітаюць сады і лугі. Ён прыпадае на шосты дзень мая. Юрэй у народзе называюць засцерагальнікам пасеваў і скаціны. У гэты дзень жонкі пякуць караваі-карагоды для дзяцей і адзін большы для абрада. Раніцой сабіраецца гурт дзявок і глінкамі вярбы і цвітучай садавіны ўкрашаюць каравай. Утыкаюць дзвянаццаць галінак па ліку месяцаў, потым кладуць на века з-пад дзяжы, у якой расчынялі каравай. Да каравая бралі крыж, збіты з палачак і прывязваюць два фартухі краснага і зялёнага цвету. Красны азначае сонца і цяпло, а зялёны – палеткі, багацце і радосць. Водна дзеўка брала хлеб, а другая крыж, і гурт ішоў да крыжа-абярэга, які стаіць на скрыжаванні дарог пасярод сяла. Прасілі ў Бога благаслаўлення вадзіць карагод. З хлебам і крыжам абыходзяць усё сяло, бо хлеб – сімвал жыцця, а крыж аберагае ад любых няшчасцяў. Гурт напраўляўся ў крайняе падвор'е сяла і за сонцам абходзілі ўсе падворкі. Людзі кажуць, што калі Юрэй ходзіць па падворках, то ніякі гром не ўдарыць у хату. Гаспадыня дарыла маленькія карагоды і абавязкова яйкі, шоб былі поўныя харомы дабра, якое поўнае яйка. Абышоўшы ўсе падворкі, гурт ішоў у поле. Нясучы, крыж дзяржалі красным фартухом уперад, шоб сонца саграваладзела ўсіх. У полі пелі песні. Людзі гаварылі, што калі Юрэй у полі, то град не паб'е збажыну. Качаліса дзяўчаты па пасеву, шоб пшаніца была, як калода. Пакачаўшыса, рассцілалі пакрывала на краю поля і дзялілі карагод. Галінкі з карагода затыкалі на загон у пасеў, шоб збажына стаяла, як свечка, не палегла. Паеўшы, усе астаткі сабіралі і зграбалі ў пасеў, шоб зямля добра радзіла. Ідучы назад у вёску, ужо неслі крыж зялёным фартухом уперад, неслі багацце і радасць людзям. На Юр'я былі такія прыкметы: калі на Юр'я

дождж, то будзе ўрадлівы год. Жонкі стараліса да сонца на Юр'ю сеяць агуркі на градках – вельмі родзяць добра.

*Запісана ў в. Буразь*
*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Пятрычыц А.*

**Ушэсце**

На Ушэсце ў нас прынята было хадзіць да радні, якая жыла ў іншых вёсках, якія булі недалёка ад нашай. На Ушэсце да нас у Канатоп прыходзілі, а на Юр'е хадзілі ў Грыдні.

Калі ўсе родныя збіраліся за сталом, то налівалі гарэлку ў чарку, і ўсе пілі з адной чаркі, а калі хто піў, то прыпяваў:

Я гарэлачку п'ю,
Я яе люблю.
А хто будзе яе піць,
Як я памру?

А калі багата сядзела за сталом, то покуль апошні вып'е сваю чарку (чарка ішла ад аднаго да другога, як сядзелі за сталом, а садзіліся па старшынству), то ўжэ не было чым і закусваць. Потым за сталом спявалі песні, выходзілі на вуліцу, садзіліся, размаўлялі, глядзелі, як дзеўкі па вуліцы карагоды вадзілі. І каго не сустрэнеш, усе вітаюцца.

*Запісана ў в. Сяменча*
*ад Кавальчук Варвары Паўлаўны, 1920 г.н.*

40 дней от Пасхі. У эты дзень Ісус Хрыстос на небеса ідзе. На небі должон прогрымець гром. Ісус должон показаць, што ён ужэ пойшоў з землі на небо. Ён должон подаць знак.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Кудзелька Ю.*

Дрэма

Ой, дрэма, просім цябе, маладое,
Не драмаць, не драмаць!
Устань, дрэма, бацька едзе.
Ой, дрэма маладое,
Просім цябе, просім цябе,
Не драмаць, не драмаць!
Бацька едзе, сукно вязе.
Ой, дрэма, просім цябе, маладое,
Просім цябе, маладое,
Не драмаць, не драмаць!
Устань, дрэма, матка едзе.
Ой, дрэма, просім цябе, маладое,

Просім цябе, маладое!
Матка едзе, платок вязе.
Ой, дрэма, просім цябе, маладое,
Просім цябе, маладое,
Не драмаць, не драмаць!
Устань, дрэма, мілы едзе.
Ой, дрэма, просім цябе, маладое,
Не драмаць, не драмаць!
Мілы едзе, гасцінец вязе.
Ой, дрэма, просім цябе, маладое,
Просім цябе, маладое,
Не драмаць, гасцінец узяць!

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Яруш Надзеі Архіпаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Новік В.***

Устань, дрэмо, бацька едзе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Бацька едзе, сукно вязе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Устань, дрэмо, маці едзе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Маці едзе, гусельку вязе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Устань, дрэмо, братко едзе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Братко едзе: – Чого ты вязеш?
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Устань, дрэмо, сястра едзе.
Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.
Сястра едзе, маністо вязе.

Ой, дрэмо!
Прошу цебе, молодую,
Не дрэмлі, не дрэмлі.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.*

**Тройца (Сёмуха)**

Дзень Тройцы называюць яшчэ Сёмухай. Святкаванне пачыналася з таго, што дзяўчаты і жанчыны выходзілі на луг з галінкамі ў руках, танцавалі каля пастаўленай у полі статуі вясны ці Сёміка і пелі песні ў гонар кахання, якія прыносілі ім асалоду. Дзяўчаты выбіралі прыгожую дзяўчыну, абвязвалі яе бярозавымі і кляновымі галінкамі ("куст") і вадзілі па дварах, спяваючы песні. Затым збіраліся ля вады і пачыналі варажыць аб сваім лёсе, пускалі вянкі, прамывалі вочы, кідалі розныя дары.

У гэты дзень дзяўчаты адпраўляліся ў лес "вянкі завіваць". Бралі з сабою страву і пяклі яечню, затым варажылі. Выбіралі дзве бярозы, звязвалі іх вярхушкі ў выглядзе вянка, праходзілі пад імі. Пасля гэтага ламалі са сваіх бярозак галінкі і плялі вянок. Кідалі свой вянок у ваду і варажылі: калі паплыве – добрая прыкмета, а патоне – дрэнная. Потым праз нядзелю прыходзілі развіваць вянкі з бяроз.

*Запісана ў в. Дуброва*
*ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,*
*студэнткай Клочка А.*

На Тройцу ўсягда ўкрашалі хату і іконы клёнам і абавязкова ернікам. Насупраць кожнага акна ставілі ссечаныя бярозкі, а насупраць дзвярэй – дзве бярозкі па баках. І ўжо калі ішлі ў хату, то абязацельна гэтыя бярозкі (ля дзвярэй) абыходзілі. Калі ўсё ўкрашалі зелянінаю, то прыкмячалі: як за тры дня завяне, то лета будзе сухое. Калі Тройца праходзіла, бярозкі, клён, ернік знімалі і палілі ў печы, а не выкідвалі. Лічылі, што ўся гэтая зеляніна ад Бога дана.

*Запісана ў в. Кольна*
*ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),*
*студэнткай Клочка А.*

У нас Тройцу ўсягда называлі Сёмухай. На Сёмуху ўкрашают хату клёнам. А перад Сёмухай ідуць у лес, ссякаюць бярозку з клёнам і ставят перад дзвярымо. У дні Сёмухі прыкмячалі: калі клён высахне і жоўты робіцца, то лета сухое будзе.

*Запісана ў в. Кольна*
*ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,*
*студэнткай Клочка А.*

Тройца святкуецца на 7 тыдзень пасля Пасхі. Чыста прыбіралі ў хаці і

на двары. Перад дваром слалі пляшнік (зялены аер). Затыкалі за вокна і варота галінкі вязу.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

Дожыдаем Тройцу, готовімося к Тройцы. Пячэм пірогі, готовімо прысмакі. Прыбіраемо ў хатах, ідэм і ломаемо веткі з ліпы, клёна, татаршчыну рвемо і ўкрашалі ў хаце.

Зранку на Тройцу еду ў царкву, там свячу клён, бярозу, татаршчыну. Потым прыезжаю з царквы, прыходзяць до мэне родные. Мы накрываемо стол, ставімо ўсё, шо прыготавалі і сядаем за стол чарковаці.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

11 іюня нядзеля Тройцы Айца, Сына, Святого Духа. Святкуюць Тройцу тры дні. Нясуць на Тройцу ў цэркаў святіць цветы, рознае зелье. А як прыходзяць, то ідуць рваць плешнік. Прыносяць домоў і раскідаюць у хаці, у дворэ, у хлеве, коло хаты. А з корэньчыкоў робяць свісцелікі, шоб свістаць, як воробейко, усю Тройцу. А ўжэ 19 іюня почынаецца Петроў пост.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Чыкіды В.С., 1939 г.н.,***
***студэнтам Кувікам А.***

Сёмуха (Тройца) – нядзеля, якою завяршаецца сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Сярод каталіцкага насельніцтва часта яе называлі “зялёныя святкі” альбо “зелянец”. З суботы на нядзелю хату і двор прыбіралі зелянінай. Вешалі кляновыя лісцікі, кідалі на дол у хаце плюшну (аер), кветкамі прыбіралі абразы, сталы. Таксама завівалі вянкі. Кожны вянок прызначаны быў кожнаму чалавеку: маці, бацьку, сястры, брату. Праз тыдзень, калі вянкі не засыхалі, то гэтаму чалавеку, чый быў вянок, абяцалася вялікае шчасце, а калі былі засохлымі – век яго будзе кароткі. Вянкі завівалі дзяўчаты маладыя. Яны ішлі к лесу, пелі песні, плялі вянкі на жаніхоў і на сваю долю.

Ой, ты, Тройца, Тройца,
Ой, ты, Тройца, Тройца,
Прэсвятая Багародзіца.
Эх, полем жыта, ды няхай яно зародзіцца!
Што зародзіцца, то для майго бацюхна,
Што не зародзіцца, то для майго свёкарка.
Саладок мядок, то для маёй матанькі,
А горка гарэлка, то для маёй свекоркі.

***Запісана ў в. Рудня***

*ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.,*
*студэнткай Клімашэўскай Т.*

У нас Тройцу навек спраўлялі на 50-ы дзень ад Паскі. Навек перад Тройцаю готовіліса, от кажды, кажды двор готовіўса. Прыбіралі дворы, чысцілі да ссеквалі бярозкі, у вокна затыкалі кленовыя лісточкі, галінкі, а ўвесь пол плешняком (цяпер кажуць аір) усцеляць вяленым. Ну, ужэ на другі дзень собіраліса дзевачкі, усе такія молодыя, от прымерно дзве подружкі і там дзве подружкі. І ўже собіраліса і ішлі ў лес, шоб завіць бярозкі. От зайдуць у лес, да йдзе одна коло одное бярозкі (радышком растуць), оны іх нагібаюць, этыя бярозкі, завіваюць, закручваюць. Ну, і от рабілі такія як бы ворота. І через гэтыя ворота проходзілі обычно і спявалі:

Пойдом, дзевачкі, у луг гуляць,
Зелёных веночкоў завіваць.
Заўём вянкі на ўсе святкі
На ўсе святкі, на ўсе празнічкі.

Ну, от спявалі такія песні, куміліса. Ну, от счытайце, як две подружкі дружаць, да катора іх раньшэ замуж пойдзе, то ўжэ яны завівалі вяночкі да й куміліса. Дзяўчаты астаўлялі ў лесе вяночкі. А далей ужэ чераз нядзелю прыходзілі ў лес да ўжэ глядзелі: як чый вяночак засохне, то ето ўжэ нелоўкая прыкмета. Ето ўжэ знай, шо ў роду хто-небудзь помрэ. А як вяночак не засохне – роду жыць доўга і ў роду ніхто не помрэ. Дзяўкі яшчэ плялі вяночкі з цвяткоў. Да кідалі етыя вяночкі ў воду да ўжэ й глядзелі: як вянок не ўтопне, то значыць, усё будзе добра, а як, не дай Бог, утопіцца вянок, то тожэ нядобрэ. І спявалі песні:

Ходзіце, дзевачкі, у луг гуляць,
Зелёных веночкаў завіваць.
А мы веночкі розвілі.
Мало гарэлачку да попілі.
А мы ж веночкі да ўтопілі.
Мы гарэлачку да не пілі.

На Тройцу проходзіў абрад кумлення, але зараз яго няма. Дзве подружкі проходзяць праз завітые з бярозак ворота. Потым яны цалаваліса да куміліса. Да ўжэ котора з іх выходзіла перша замуж да нараджала дзіця, то ўжэ брала другую собе за куму. Да куміліса зараней. Да і песні спявалі:

Ну-ка, кумка, покумімса,
Ну-ка, кумка, поголубімса.
Ты кума мне, а я кума тобе.
З кумой покуміліса,
Душа з душой злюбіліса.

Ну, яшчэ на Тройцу спявалі вельмі добру песню. Гэта вельмі хороша песня.

Господняя Тройца веселіць молойца,
Прысвятая Тройца.
На зялёнэ свято жывеце богато,
Прысвятая Тройца.
Да стаўце дубочкі, шоб шчаслівы дочкі,
Прысвятая Тройца.
Да стаўце бярозкі, шоб не лілі слёзкі,
Прысвятая Тройца.
Да сцеліце лепеху Господу на ўцеху,
Прысвятая Тройца.
Кідайце веночкі да на ўсе годочкі,
Прысвятая Тройца.

На Троіцу ўшаноўвалі продкаў, помершых. У гэты дзень навек спраўлялі, як кажуць, "троецкія дзяды". Маці стараласа зварыць і кашу, і боршч. У нас на Тройцу стараліса дзевачкі ў вокна затыкаць кляновыя лісточкі, бо яны на іх потым гадалі. Як скоро засохне кляновы лісточак, то значыць, яна скоро замуж і не пойдзе, а як останецца доўга зялёным, то тожэ добра. А ўжо старыя жонкі, як мая баба, глядзелі: шо як лісток высохне, то знай, шо як покосіш сено, яно высохне, а як толькі чуць-чуць прывяне, то сено вяць будзе доўга.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Лой Ганны Пятроўны, 1955 г.н.,***
***студэнткамі Бабовіч М., Быкавай Ю.***

Празнік Ісуса Хрыста, Бога і Святога Духа. Это ж Тройца Божа Маці, Прэсвятая Багародзіца. Это ўсе тры, усе ў одном. У окны затыквалі клён як оберэг, штоб оберэгчы селішчэ. Ідом у цэркву, свецім клён, то трэба, як прынясеш з цэрквы, то трэба пакласці яго за ікону. Эты клён раны лечыць. Трэба размяць его і ў ранку покласці.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Пойдзем, дзевачкі,
Ва луга-лужочкі,
Завіваць вяночкі.
Мы заўём вяночкі
На гады добрыя,
На жыта густое,
На ячмень каласісты,

На авёс расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Балоцька Марыі Іванаўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

На траецка свята
Буцце ўсе багаты,
Прэсвятая Тройца.

Стаўце ўсе дубочкі,
Каб шчаслівы дочкі,
Прэсвятая Тройца.

Кідайце лепеху
Для свайго ўспеху,
Прэсвятая Тройца.

Кідайце лепеху
Госпаду на ўцеху,
Прэсвятая Тройца.

***Запісана ў в. Бярэжцы***
***ад Вянчура Марыны Васільеўны, 1902 г.н.,***
***студэнткай Мудабіравай Г.***

***

Ой, поможы, Божа, нам на елку выйці,
Нам на елку выйці, песенку запеці.
Ой, казала маці ў тое село аддаці,
А я не схоцела, покуль разглядзела,
А як разглядзела, то я б і полецела,
То я б залецела за высоку гору
Да пад ясну зору.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Жураўлевіч Ганны Сяргееўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Пані дворовая церам будавала,
Будавала церам без вакон, без дзвярэй.
Ой, коб не вляцела дзіўная пташэчка,
Да коб не ўнесла дзявочае краскі,
Бо дзявочая краска, што ўдзень, то й і ўночку,
Што ўдзень, то й і ўночку ў нядзельку ў вяночку.

*Запісана ў в. Дзякавічы*
*ад Жураўлевіч Ганны Сяргееўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Чэркас Н.*

Пані дваровая,
Пані дваровая
Церем будавала,
Будавала церем
Без вокон, без дзверей.
Ой, коб не вляцела
Дзіўная пташачка,
Да коб не ўнесла
Дзявочае краскі.
Бо дзявочая краска,
Што ўдзень, то й ночку,
Што ў нядзельку ў вяночку.

*Запісана у в. Дзякавічы*
*ад Рагалевіч К.А., 1929 г.н.,*
*студэнткай Крапіўка А.*

Перанос свячы праходзіць на Тройцу. Вялікую ікону, на якой ізабражон Бог, Ісус Хрыстос, кожны год пераносяць з адной хаты ў другую. На гэта свята прыглашаецца святы айцец. Ён моліцца і свеціць гэтую ікону. Потым, калі дзержаць ікону, прапускаюць дзяцей над ёй, гэта значыць, дзіця становіцца асвяшчоннае і цэлы год не будзе балець. Затым сцелюць на землю палавікі і робяць дарожку з адной хаты ў другую. І пераносяць свячу (святую ікону). Сям’я, у якой знаходзіцца ікона цэлы год, павінна саблюдаць усе хрысціянскія святы. У гэтым доме не даўжно быць ругані. Хазяйства павінна жыць дружна і мірна. Таму зараз не кожны хоча браць да сябе ікону, бо багата сварацца, а раней ікону пераносілі з хаты ў хату па чарзе.

*Запісана ў в. Валаўск*
*ад Кабановіч Марыі Іванаўны,*
*студэнткай Туравец М.*

Сёмуха адзначаецца на пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня. Да Тройцы гатовяцца старанна, прыбіраюцца ў хаце, у двары, а ў суботу ўвечары ставяць клечанне, затыкаюць галінкі клёна ў окны, дзверы, закідваюць двор ляпешнікам. З кляновых вянкоў рабілімо куст. Водну дзеўку нараджаемо кляновымі галінкамі, на голову кляновы вянок надзяваемо і ўсю абвязваемо галінкамі. Калі нараджалі куст, то пелі песню:

А на Тройцу рана,
А на Тройцу рана
Дзеўкі радзяць куста.
Куста радзілі, Тройцу прасілі:
Тройца, Тройца, дай нам молойца!

Тройца, Тройца, дай нам молойца!
Маладого клёна заламалі,
Пакуль свайго куста ўвабралі.
Тройца, Тройца, дай нам молойца!
Тройца, Тройца, дай нам молойца!
Дзеўкі молодыя, павядома куста,
Дзе трова зялёна, пшанічанька густа.
Тройца, Тройца, дай нам молойца!
Тройца, Тройца, дай нам молойца!

Нарадзіўшага куста водзяць па хатах з песняю:
Кляновая лісціна,
Кляновая лісціна,
Куды цябе вецер вее?
Ці ў луг, ці ў даліну,
Ці ў луг, ці ў даліну?
Ці назад на кляніну?
Данясе мяне ветрык,
Данясе мяне ветрык
Да паны Галіны ў дворык.

Падыходзячы да хаты, пыталіся разрашэння, паздраўлялі са святам, жадалі здроўя, каб жыта вадзіласа і худоба, грошы, пелі гаспадару песню:
Добры дзень, слаўны
Пане гаспадар!
Выйдзі сустракаць пачотных гасцей,
Пачотных гасцей, Светую тройцу.
Тройца к табе ідзе, здароўе нясе,
А куста вядуць, вяселле нясуць.
Выйдзі, паночку, дай меда баночку,
Дай меда бочку, шчэй по блінчыку,
Да яшчэ, пане, по золотому.
Свечы ставіць, тройцу славіць,
Каб да ста гадоў табе дажыць.

Патом ішлі вадзіць карагод да бярозы, у луг, ды на вянках гадалі. Ішлі да бярозы, таму што яна раней за ўсіх расцвітае, гэта самае паважанае дрэва. Нашы продкі лічылі, што бяроза валодае асобай сілай. Хто пастаіць пад ёю, той увесь год будзе адчуваць сябе здаровым і бадзёрым. Пры ваджэнні карагоду спявалі песню:
Дзеўкі молодыя, поведомо куста,
Дзе трова зялёна, пшэнічонька густа,
Поведомо куста ў луга зялёны,
Заплетомо косы ў ленты шаўковы.
Поведомо куста ў поле под дубочкі

Да сабе поўемо кленовы веночкі.
Будомо гуляці, тройцу праслаўляці,
На сваім вяночку будом мы годаці.
Ты плыві, плыві, вяночак,
К міламу ў садочак.

Тры дні тройцы, таму што першы – гэта Бога нашага, другі – Сына Божага, трэці – Духа Святога.

Яшчэ былі на тройцу прыкметы: калі на тройцу няма дажджу, то будзе добра сохці сена летам. Калі клечанне за тры дні тройцы высохне, то будзе добра сохці сена.

На тройцу гатавалі яечню і пяклі каравай. Каравай дзяліўса паміж удзельнікамі свята.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Дарошка Ніны Андрэеўны, 1950 г. н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## ЛЕТНІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

**Купалле**

Свято ў нас называецца Іван Купальны. Да яго мы рыхтаваліса зарань: возілі калёса, рабілі жанчыну са шматок і пасля прывязвалі яе к жэрдцы. А ўвечоры, шо збіраліса ўсе на горэ і святкавалі. Запальвалі вялікі агонь. Людзі пераапраналіса ў Івана і Купалінку, ведзьму, чорта, русалок і вадзяных. Кругом агня вадзілі карагод і спявалі песні. Моладзь каталаса на лодках. Плятуць на Купало вянкі, кідаюць на воду і хлопцы іх ловяць, а дзеўкі глядзяць, хто чый вянок зловіць, того будзе і пара. Ох, яшчэ ж ховалі як бы папороць-кветку, а пары закоханые яе шукалі. От було ўжо забавы. Бо шукаюць тую ж кветку вельмі старанно, бо хто ж найдзе, то козалі, шо яны пожэняцца. Но колісь козалі, трэба йсці ў лес папороць шукаць, шо яна цвіце. Хто нойдзе, той будзе вельмі шчаслівы. Бліжэй к ранку прыгалі праз огонь по парах. Спяваюць песні про Івана, а далей ужо тую жонку со шматок палілі, як бы ведзьму, якая ходзіць на Купалу по дворах. На Купало ішлі по зелья, рвалі от усякіх хвороб. Ходзілі по чарніцы, думалі, шо это лякарство, бо яны святые ў гэты дзень. У цэркві свяцілі зелье. На досвітку купаліса ў рацэ, каб здоровым буць, шчэ козалі, шо на Івана Купального трэба ўмыцца росою, бо чалавек набірае моцы і маладзее. А заўяршалі мы свято сустрэчаю сонца. Станом, бувало, на мосту і чакаем яго ўсходу, то такая ўжэ красота, шо не перадаць словамі, трэба самому побачыць. От тоды мы гулялі, то гулялі, а шо цепер.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

Ноччу на Івана Купального сабіралі травы, іх счыталі лекарственнымі, калі сабіралі іменна ў этую ноч. Травамі етымі абпальвалі бальных, бароліса з нечыстай сілай, кідалі ў запаленую грубу ў час гразы, шоб атвесці хату от удара молніі. Ешчэ іх, травы, бралі для прываротаў і отваротаў. Калі ж рвалі траву, то казалі: “Зямля-маці, благославі мене травы браці, і трава мне маці!”

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Кошман А.*

На Івана Купала быў у жанок звычай. У досвітку раздзенецца жонка і качалася ў расе без сорочкі, як маці родзіла. У глечык збірала росу, каб корова богато молока довала.

*Запісана ў в. Буразь*
*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

У мое свекрові була перэпона корова. Она ее ходзіла доіці сама, ее свекроў не хоцела доіць. На Купальского Івана ўдосвета она пошла ў одрыну.

Толькі одкрыла дверы, ож там на прогуменку седзіць жаба, ек шапка. Побачыўшы яе з ведром, закіркала і стала поўзці до мяне. Моя свекроў спужаласа, і одступіла назад до сцены, а там стаялі вілкі. Она ўхопіла вілкі і сунула ў жабу, а попала з перепуду ў лапу. Жаба шчэ раз кіркнула і знікла. Нявестка подоіла корову і понесла молоко ў хату. Аж там ее свекроў перевязвае руку. Она зло погледзела на невестку, але нічого не сказала. Тогды невестка поняла, шо ее свекроў ведзьма.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Сыс Еўфрасінні Іванаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Аднойчы да сонца іду я даглядаць каней. На выгане аселіцы па траве бачу, качаецца голая жанчына, як маці нарадзіла. Я спярша спужаўся, думаў, што нейкая пужалка, а там збоку, каля дарогі, стаяла кузня. Я схаваўса за кузню і дай, думаю, разгляджу пужалку. Тут жонка ўстала, узела ў рукі глечык і давай збіраць росу ў глечык. Стараецца, дзе большая трава, шоб больш собраць. Чую, нешчо муркае. Я прыслухаўса, а она кажэ: “Роса ў гладышку, а молоко ў імечко”. Я стою і гледжу. Ну, думаю, недожданье твое, усё роўно погледжу, хто такая. Стою нішком за кузнею. Вот она назбірала колькі ёй трэба, покачаласа по траве і ідзе. Бачу, а гэто цётка Ёўга. Я хоцеў отозвацца, да думаю, што она спужаецца. Она ж думае, шо ніхто не бачыў. От того разу ее ўсе почолі бояцца, звалі ведзьмаркою. Оттого перед Купальным Іваном людзі стараюцца обсыпаць свое хоромы сечаным сухім маком, шоб ведзьма не ўлезла ў хоромы і не отобрала молоко.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Сыс Еўфрасінні Іванаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Прыказвалі старыя людзі: не лезце ў воду, бо русалка насцала ў воду. Она вас поцягне на дно. Пужалі дзяцей русалкаю. Казалі, шо ў яе каменна цыцка, да ўб’е. Шчэ пужалі, шо сядзіць ў жыці, таму нельга ходзіць ў поле, бо поймае. Дзеці бояліса русалку і не ходзілі.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Одной жонцы было недобрэ зрабілосо, помешаласа. Она зайшла на поле, распрануласа наголо, распусціла косы і стала бродзіць по жыту. А там по краю поля одноособнік пас корову. Вон погледзеў на жыто і аслупенеў. А гето было перед Купальным Іваном. Она тоже его побачыла і стала по жыту ісці до его. Ён кінуў корову і побег домоў у село. Бежыць і крычыць: “Русалка ў жыце!”. Некоторые смелейшые побеглі побачыць. Забеглі к полю і бачаць, шо голая жонка з распушчанымі косамі ў жыце. Усе подумалі, шо праўда. А той чоловек з пуду облёг, год похворэў і помёр. Усе бояліса туда

ісці, да своякі тое жонкі сталі шукаць, покуль не найшлі коля поля. Так была раскрыта русалка.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Сыс Еўфрасінні Іванаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

На Купалле распальвалі касцер возле ракі. На гэтым кастры ўсе непатрэбныя рэчы спальваюць. Потым усе скачуць праз вогнішча, бо агонь ачышчае ад усяго плахога, што мы ў сабе накапілі за год. Потым, пасля пераскокаў, павінны ўсе змыць вадой усю нечысць, якая сабраласа ў нас за год. Людзі гавораць: "На Купальскага Івана ў ваду не залезай". Была легенда, што ў вадзе пасля Купальскага Івана сядзіць русалка з каменнаю цыцкай і можа пацягннуць за сабой, утопіць. Шукаюць кветку шчасця, на вянках дзяўчыны гадаюць. Калі дзеўкі пускаюць вянок у воду, і ён паплыве, а не прыб'ецца да берага, яна будзе ў пары. Калі хлопец з дзеўкаю прыгаюць праз агонь, трымаючыса за рукі, і не адарвуць іх, то яны не разойдуцца, а калі адарвуць, то разам не будуць. Калі вадзілі карагод, спявалі такую песню:

Ой, рано, рано сонцэ граецца,
Сонцэ граецца да і з зарою.
Ой, на Івана, да на Купалу
Сонцэ граецца, дзеўка маецца,
Мілого дружка дожыдаецца.
Ой, на Івана, да й на Купала
Міл дружок ідзе, вяночка несе,
У белы ручэнькі мілой подае,
Ой, на Івана, да й на Купала.
Ходзем, мілая, корогод водзіць,
Корогод водзіць, веселье ладзіць,
Ой, на Івана, да й на Купала.
Ой, на Івана сонцэ граецца,
Сонцэ граецца да і з зарою,
Ой, рано, рано, да на Івана.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

***

Кладзіце агні вялікія,
Паліце ведзьму лятучую,
Каб яна па полі не лятала,
Каб яна загонаў не ламала,
Каб яна па хлявам не хадзіла,
Каб яна кароў не даіла.

***

Сядзела Купалка на палаце,
Яе галоўка ў злаце.
Ручкі ўніз апусціла,
У Бога пагодкі прасіла:
– Аддай жа, Божа, пагодку
На гэтую ночку-вясёлку.
Будуць музыкі граці,
Будуць дзевачкі спяваці,
Будуць зеллейка збіраці,
У старога дзеда пытаці:
– Ой, дзед-дзеду, а што за зелле?
Ці не дзявоцкае насенне?

***

Выпеклі ведзьмы вочы,
Каб уначы не хадзіла,
Каб расы не збірала,
Каб у печы не сушыла,
Каб у жэрлах не малола,
Каб кашы не варыла,
Каб дзяцей не карміла,
Каб вядзьмят не пладзіла.

***

На Святога Івана
Дзеўкі зелле капалі,
Яны яго не зналі.
У татулькі пыталі:
– Татулечка, ды што гэта за зелле?
– Гэта, дзеткі, купалле – дзявоцкае ўмыванне,
А дзецюкам – каханне.

***

Ой, на Янавай расе
Ясенька каня пасе.
Ён пасець пасаючы,
Весела спяваючы.
Ешце, конікі, траўку,
Зялёную мураўку.
З крыніцы ваду піце,
Простай дарожкай ідзіце.
А мы пайдзём да бору,
Да набяром чабору.
Наш чабор зялёненькі,
Янчачка малодзенькі.

***

Гарэла купалле, гарэла
На купаллі дзяўчына сядзела.
Прыйшоў па яе бацька:
– Хадзем, мой дзіцятка, дадому,
Наехала сватоў цэлы двор.
– Няхай едуць, – гэта не мае,
А як будуць ехаць мае.
Дык будзе дарожка звінеці,
Дык будзе музыка граці,
Дык будзе сваха сяваці.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

Ішла Купалка сялом,
Закрыўшы вочкі чубром,
Сталі людзі дзівіцца,
Стала Купалка сварыцца.

***

На Купалу, на Купалу
Рана сонца йграла,
А Купалінка наша
Дзе была, што рабіла?

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

***

Купала на Івана!
Дзе Іван ходзіць,
Купала на Івана,
Там жыта ўродзіць.
Дзе Івана жонка –
Там родзіць пшонка.
Дзе Іванавы дзеці –
Люба паглядзеці.

***

Зайдзе сонцэ за оконцэ,
За вішнёвенькой садок.
Зайшло сонцэ за оконцэ,

За вішнёвенькой садок.
Ноч купальская настала, 2 р.
На лугу цвятоў не стала,
Дзеўкі кветкі ўсе парвалі, 2 р.
У вяночкі павязалі.
У вяночкі павязалі 2 р.
Ды на рэчку пакідалі.
Вы плувіце, вы, веночкі, 2 р.
У далёкія краёчкі.
Ой, плувіце вы, плувіце, 2 р.
Адтуль шчасце прынясіце.

***

Ой, у Тураве ды на мураве,
А ў Кіеве да на рыночку,
Ой, рана на Івана. 2 р.
Ходзіць Ванька да поўз рэчку.
Чуго, Ваня, туто ходзіш,
Ці ты людзей пераводзіш?
Ой, рана на Івана. 2 р.
У рэкі моёй, у рэкі моёй пераводы,
Льюцца з мене дробныя слёзы.
Ой, рана на Івана.
Була ў мене, була ў мене
Жонка Мар'яночка,
Нужкі мула да на камені.
Ой, рана на Івана.
На камені, на камені ножкі мула
Ду на рэчку потанула.
Ой, рана на Івана.
Ду на рэчку потанула,
Трое дзетак покінула.
Ой, рана на Івана.
Шчо ёдное, шчо ёдное з поветочку
Сушыць мою головочку.
Ой, рана на Івана.
Як другое, як другое на прыпечку
Сідзіць, грае ў скрыпочку.
Як трэцяе, як трэцяе на лавуньцы
Сядзіць, плачыць па мамуньцы.
Ой, рана на Івана. 2 р.

***

Ой, там рана на Івана,
Ой, рана на Івана. 3 р.

Дзе ж ты, дзеўко, ночовала,
Ой, рана на Івана. 3 р.
Дзеўка ў лесе ночовала,
Ой, рана на Івана. 3 р.
Кветку-папороць шукала,
Ой, рана на Івана. 3 р.
Свае шчасце ўгадала,
Ой, рана на Івана. 3 р.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.,***
***Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Рыдзецкай Г.***

***

Ой, рана на Івана / 2 р.
Проці Івана ночка мала.
Ой, рана на Івана / 2 р.
Дзе, Купала, начавала?
Ой, рана на Івана / 2 р.
Начавала ў чыстым полі
Ой, рана на Івана / 2 р.
У чыстым полі сярод жыта,
Ой, рана на Івана / 2 р.
Чым, Купала, вячэрала?
Ой, рана на Івана / 2 р.
Варэнічкі вячэрала
Ой, рана на Івана./ 2 р.
Чым, Купала, запівала?
Ой, рана на Івана./ 2 р.
Гарэлачкай запівала
Ой, рана на Івана / 2 р.

***

Купала,
Такі-сякі
Па бацьку ўдаўся,
Каля тыну, каля плоту
У крапіву схаваўся.
А як вылез з крапівы,
Узяўся за бокі,
Паглядзіце хлопцы, дзеўкі,
Які я высокі.
Чыкі, чыкі, чыкалачкі,
Едзе баба на саначках,
Пытаецца ў Васіля,

Ці далека да сяла?
Ах, ты, баба слепавока,
Бачыш: сяло недалёка.
Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зялененькім.
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.
Многа песень спета
Пра цёплае лета.
Толькі Ганначка не спявае,
У буйных травах кветкі збірае,
Кветкі збірае,
У вяночак уплятае.
Пакацісь, вяночак, у дварочак,
Дзе жыве мой мілы дружочак.
Хай ён знае, знае,
Хто яго чакае,
Хто яго чакае.
Хай вячэрняй роснай парою
У луг зялёны пойдзе са мною.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Ганны Андрэеўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Да ўзыдзі, ясна сонейка,
Асвяці нам Купалейка,
Хлопчыкам на ігрышча,
Дзевочкам на гулянне.
Дзевочкі нагуляліся,
Хлопчыкі наскакаліся,
З Купалейкам папрашчаліся.

***

Гарэла Купалле, гарэла,
На Купаллі дзевочка сядзела.
Прыйшоў за ёй бацька яе:
– Хадзем, моё дзіцятко, дадому,
Наехало сватоў цэлы двор.
– Няхай едуць, гэта не мое,
А як будуць ехаці мое –
Да будзе дарожка звінеці,
Да будзе музыка іграці,
Да будзе свахночка спяваці.

***

Купалка Яна на вулку звала,
Ой, выйдзі, выйдзі, пане Іване,
На вулку дзіво паглядзець,
Дзіва паглядзець, подзівіціся,
Едзе малойчык жаніціся.
Чатыры коні наперадзе ідуць,
А на пятым дзевочку вядуць,
А на шостым ён едзе,
А на сёмым – дружыночка,
А на восьмым – радзіночка.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

Пойдзем, сястрыцы, пад ясну зарніцу,
Пойдзем, сястрыцы, пад ясну зарніцу,
Ноч малая ды купальная,
Ноч малая ды купальная.

Набяром, сястрыцы, жоўтага пясочку,
Іграй, сонца, із зарою,
Іграй, сонца, із зарою.

Пасыплем, сястрыцы, каткі пад акенцам,
Ноч малая ды купальная,
Ноч малая ды купальная.

Пасеем, сястрыцы, белага гарошку,
Іграй, сонца, із зарою,
Іграй, сонца, із зарою.

***

Ой, рана на Йвана
Кругом, кругом сонца ходзя,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
Недзе сонцу станавіцеся,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
Станавілась сонца ў Мозыры,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
А ў Мозыры дзеўкі гладкі,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
Дзеўкі гладкі, глядзіць Кацька,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
Станавілася сонца ў Тураве,

Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
А ў Тураве дзеўкі худы,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!
Дзеўкі худы, глядзіць Люба,
Ой, рана, рана на Йвана. Гу-у-у!

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,***
***Шуткінай Марыі Ягораўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

***

Пятрова ночка маленька,
Не выспалася паненка.
Яна ўсю ночку на спала,
Шаўковы шнуры шукала,
Да таты ў госці ад'яжджала.
– Ступайце, коні, шырока,
Бо мой татачка далёка.
Ступайце, коні, вузенька,
Мая мамачка блізенька.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

Пятрова ночачка ранюсенька.
Яначка ночкі не спала,
Шоўкам світкі вышывала,
Ішла на вулку – прадавала,
А свайму Івану – даравала.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

***

Ой, рано-рано солнцэ граецца,
Солнцэ граецца, дзеўка маецца.
Мілого дружка дожыдаецца.
Міленькі ідзе, вяночка нясе,
Вяночка нясе, у ручкі подае.
Ходзем, мілая, корогод водзіць,
Корогод водзіць, вяселле ладзіць.
Ой, рано-рано на Купало.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***

***студэнткай Матарас Н.***

**Ой, дзе была, Купалочко?**

Ой, дзе была, Купалочко?
Лён полола, лён полола, Іваночко, Іваночко.

Дзе гуляла, дзе гуляла, Купалочко, Купалочко?
Ой, у жыці, ой, у жыці, Іваночко, Іваночко.

Ой, з кім спала, ой, з кім спала, Купалочко, Купалочко?
Ох, і з чортам, ох, і з чортам, Іваночко, Іваночко.

Ой, дзе бываў, ой, дзе бываў, Іваночко, Іваночко?
У чыстым полі, у чыстым полі, Купалочко, Купалочко.

Ой, з кім гуляў, ой, з кім гуляў, Іваночко, Іваночко?
Ох, з русалкай, ох, з русалкай, Купалочко, Купалочко.

***Запісана ў в. Азяраны,***
***ад Кавальчука Анатоля Аляксеевіча, 1978 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

До етого гульбішча молодзёж готовіласа загодзя. Хлопцы ехалі ў лес і збіралі там голье для костра. Рэзаць і колоць не трэба було, а толькі збіраць, которэе ўпало з дзерэва. Дзеўкі ішлі по селу і прыглашалі ўсіх на Купалье. А после ішлі на луг ці за рэку рваць зелень, цветы, дзерэзу, шоб наплесці венкоў. Место вубіралі коло рэкі, коло Багрыноўчыное хаты, коло Паўла Козачышыного, шоб вусоке место було. Почыналі гуляць з вечора і гулялі до ўзыхода сонца. Купалье гулялі только молодзёж, а остальные моглі толькі гледзець і водзіць карагод кругом огня, шоб очысціцца от нечыстого, шо за год назбіралосо. Дзеўкі плелі венкі і спевалі купальскіе песні, хлопцы роскладалі голье кругом колка, на еком надзетэ старэе колесо от воза, і запальвалі огонь. Кожна плела по неколько венкоў, шоб чэрэз огонь скакаць, на голову одзець, і на рэку пускаць. Ек огонь горыць,то дзеўкі з хлопцамі попарно скакалі чэрэз огонь, гулялі ў гульні, заплеталі рушнікі, гуталіса на гуталках. Дзеўкі вубіралі самую хорошую, певучую дзеўку і нараджвалі ее ў Ясю-Купальніцу, которая як бы була самая глаўная на Купалы, і она спевала свою песню.Збіраліса на сам празнік увечэры. Усе село прыходзіло погледзець і поучаствоваць у ём. Молодые дзеўкі і хлопцы запальвалі огонь, водзілі кругом его карагод усе хто хоцеў, і спевалі вельмі багато песень разных про Купалье, Ясю-Купальніцу. После хлопцы з дзеўкамі скакалі парамі чэрэз его, шоб очысціцца огнем от недоброго. А чэрэз огонь скакалі толькі тые хлопцы і дзеўкі, екіе гулялі одзін з другім, не було такого шоб скакалі просто так. А далей дзеўкі гадалі на венках, пускалі по рэцэ венкі з запаленымі свечкамі і гледзелі: чый плуве, а чый утопіцца і чыя свечка скорэй потухне, а чыя доўго горыць. Ек чый утопіўса, ці свечка хутко

потухне, то ето вельмі недобрэ, тая дзеўка ўжэ попоплачэ. Стараліса погадаць на Купальского Івана. Ек сонцэ заходзіць і садзіцца нізко, то ішлі на росходніе дорогі, дзе стояў крэст, садзіліса перэд ім на колені і моліліса. После молітвы вурывалі зубамі тры лісткі подорожыны, затыкалі іх ў грэбешок, а потом у косы.Так ішлі домоў не оглядаючыса, ні з кім не трэба было гаварыць, ложыліса спаць і прысынаўса той, за кого пойдзе замуж.

Гадалі шчэ на воду: перэд сном ставілі місочку з водою і клалі наверх дзве полочкі з веніка бэрэзового, ні з кім не говорачы ложыліса спаць, прысніцца шо ведзе чэрез кладочку суджаны.

У Купальскую ноч бацькі отпраўлялі хлопцоў, чыя попадзе очэрэдзь, пасціць коней. Бо ў етую ноч могла русалка заманіць коня ў воду і загубіць его ў кручы рэкі, альбо отдаць воўкам на з’едзенье.

***

Ішла русалка краем ракі,
Закрыўшы вочкі ў дзявочы вянкі.
Як сталі людзі дзівіціся,
Стала русалка сварыціся.
А, што за людзі, за дзіўныя,
Ды на русалку завідныя.
Сёння ж Купала, Купальейка,
наражалася,
Усім весялосць ды гуляньейка.
Кідайце дзеўкі ў воду вянкі,
сабіралася,
Няхай плывуць уздоўж ракі.
Ішла русалка краем ракі,
Закрыўшы вочкі ў дзявочы вянкі.

***

Ой, рана, на Купала,
Ой, рана, на Івана.
Там русалка купалася,
Ой, рана, ой рана.
Купалася, умывалася,
Ой, рана, на Івана.
У вянок з цвяточкаў
Ой, рана, ой рана.
К свайму мілому
Ой, рана на Івана,
Ой, рана на Івана.

***

Сёння Купала, а заўтра Ян
Сёння Купала, а заўтра Ян,
Ды будзе хлопчыкі ліха вам.
Ды якое ж ліха ліхое,
Пагоніце коней у поле.
Сёння ж Купала, а заўтра Ян,
Ды будзе хлопчыкі ліха вам.
Бо каторы конік-рабушка,
Будзе вам хлопцы падушка.
Сёння ж Купала, а заўтра Ян,
Ды будзе хлопчыкі ліха вам.
А каторы скача, б’е звонка,
Будзе вам хлопчыкі жонка.
Сёння Купала, а заўтра Ян,
Ды будзе хлопчыкі ліха вам.

***

Ці было лето, ці не бывало,
Ці было лето, ці не бывало,
Маці гуляці не пускала.
Маці гуляці не пускала,
Да ў комороньку замукала.
А ў комороньцы окенечко,
Мне на вуліцу відненечко.
Ой, пусці, маці, погуляці,
Бо ўжэ мне хлопцоў не відаці.
Бо ўжэ мне хлопцоў не відаці,
Пойшлі до коней ночоваці.

*******

Ой, там у лузе, под вербою
Ой, там у лузе, под вербою
Стоялі коні над водою.
Ой, трэба сесці, поехаці,
Слаўное село отведаці.
Слаўное село Семурадцы,
Ой, там вуліцы шырокіе.
Ой, там вуліцы шырокіе,
Ой, там дзевочкі высокіе.
У іх головочкі, як маковочкі,
Воны шчэбечуць, як ластовочкі.

У еты ж дзень гледзелі екая погода будзе: ноч зорная – будзе багато грыбоў. Велікая роса – уродзяць гуркі. У еты дзень обезацельно трэба було пройці хоць одзін прокос, шоб наготовіць без дождж у сена на зіму корові.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Клімовіч Марыі Сяргееўны, 1936 г.н. ,***
***Лой Ніны Фамінічны, 1936 г.н. ,***
***Гром Любові Рыгораўны, 1928 г.н. ,***
***Лой Аляксандры Пятроўны, 1926 г.н. ,***
***Івановай Ніны Яфімаўны, 1938 г.н. ,***
***Маркевіч Варвары Сяргееўны, 1940 г.н. ,***
***Альфіравец Варвары Ільінічны, 1929 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

**Пятро**

Это празнік у чэсць опостала Пятра. Ніхто нічого ў гэты дзень не робіць. Пятроў пост две недзелі, еслі ты посціш велікі пост, то трэба посціць і Петроў пост. Потому што як бу Бог его возвысіў. Ходзяць у цэркоў.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Калі ўжо жыта жалі, то спявалі ўсякія песні. Услед за жнейкаю ішла дзеўка малада і спявала:

У калхозе добра жыць:
Еслі дзела – дзелай чэсна,
Нада труд свой палюбіць.

Каб не балела спіна, была такая прыкмета: як загрыміць першы гром, трэба хутчэй бегці і прысланіцца спіной да дуба.

Падчас дажынак рабілі вечар: спявалі, танцавалі, радаваліся, што працу гэту закончылі. Рабілі "бараду" – звязаныя каласы, якія пакідалі на полі. "Бараду" звязвалі чырвонай стужкаю і астаўлялі так стаяць на полі, покуль самэ не ўпадзе.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

**Жніво**

Спраўляюць у нас на Тураўшчыне і абрад жніво. У кого зямлі богато, то ўжэ ён нанімаў сабе толоку. Увечары хозяін ходзіў по сялу, ці хозяйка, да ўжэ кого яны шчыталі, хто такі вельмі добра жне пшаніцу, да ўжэ звалі на следуюшчы дзень, шоб прыходзілі пшаніцу жаць у іхне поле. Прыходзілі ўсе жанкі разам. Збіраліся ў хозяіна ў двары. Спачатку, пака ісці на поле, то хозяін сажаў за стол жанок, покорміць іх усіх, от пачастуе, і ўжэ ідуць яны ў поле. Ідуць з сярпамі жаць яго жыта. Ідуць обязацельно з песняю, спяваюць песню па ўсім сялу, ды з песняю заходзяць на поле. Выбіраюць самую-самую

такую добрую жонку, шо вельмі добра жыве, шо ў іх дзеці ўсе здоровыя, шо ніхто ў сям'е не ўмёр і сама яна не разводная, і ўсе ў яе добра вельмі ў сям'е клеіцца. От яе выбіралі, шоб яна зажынала первы зажыначны сноп. Перш чым зажаць першы дажыначны сноп, она рабіла бороду. Брала тако жмень дзве пшаніцы ці жыта, яке поле жалі, да яго скручвала. Завязвала краснаю лентою і ето называлася борода. А кругом етое бороды, ужо пасля, як канчаюць жаць, усе етыя зажнуць поле, то кругом бороды абпольвалі ўсё-усё зеллейка, абпольвалі, абчышчалі, шоб ужо на следуюшчы год було поле чыстое, без пустозелля. Ну, і перш чым начаць жаць жыто, тая самая глаўная, катору яе выбралі, загадвала жанкам: "Шоб жаночкі ўсе зажнеце, зробеце пярэвесла, етымі пярэвеслamі перавяжыце сабе спіну, шоб до конца етого жатвы вашы спіны не болелі". І ото ана начынала: "Госпадзі Божэ, дай нам помоч, дай нам следуюшчого году дождаць, етую пшанічку дажаць". І от яны начыналі жаць. Жалі етую пшаніцу, робілі первы зажыначны сноп. Нажыналі поўнасцю-поўнасцю, каждая жонка зажынала і потрошку лажыла ў еты зажыначны сноп. І от як ужэ ўвечары ішлі дадому, неслі етого зажыначного снопа хозяіну. Хозяін етого снопа ставіў на покуце, і на покуце ён стаяў до тых пор, пака не кончыцца жатва па ўсім-усім сялу. Ужо як заканчывалася жатва па ўсім сялу, то ўжэ еты дажыначны сноп рабілі, зваў хазяін етых самых жанок, каторыя жалі, к собе дадому. Рассцілалі дзяругу і на етую дзяругу аббівалі еты дажыначны сноп. Аббівалі спецыяльнымі малаткамі, бойкамі. Аббівалі, абцярэбвалі еты зажыначны сноп. Салому хазяін нёс у сарай. І ў сараі ету салому змешваў з другою саломаю, ето шоб для жывёлы, шоб жывёла була здоровая, крэпкая. А з зярном етым, которэ обмолоцяць з дажыначнага снопа, спраўлялі "Богоча".

***Запісана ў в. Чэрнічы***<br>***ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,***<br>***студэнткай Хільман І.***

Збіралі баб як зажыналі жыто, штоб не жэншчына шла зажынаць, а баба, чыста, без рубашкі. Яна шчыталаса як малада дзеўка. Так ходзілі збіралі баб, штоб яны зажалі жыто, штоб благополучно ўвобралі, штоб ніхто не обрэзаўса. Ішлі з песнямі. Уге як дожыналі снопу заносілі ў колхоз і праздновалі, так і на зажынках. На дожынках кому довалі подаркі. Колхоз доваў подаркі.

***Запісана ў в. Пухавічы***<br>***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***<br>***студэнткай Кудзелька Ю.***

Штоб быў харошы ўраджай, з сабою ў поле бралі свячу і абыходзілі поле. Бралі з сабою шкарлупкі са свячонага велікоднага яйка і кідалі на поле, штоб быў добры ўраджай. Первым зернем кідалі ячмень, авёс, ярыцу. Штоб мышы і птушкі не елі хлеба ў полі, ставілі пудзіла на полі.

Выбіралі жанчыну. Усе шлі ў цэнтр поля. Жанчына, якую выбралі, зжынала сноп. Яго ўпрыгажалі цветамі і ставілі яго на покуць.

Калі былі дажынкі, то выбіралі самую рабацяшчую жанчыну. Яна зжынала паследні сноп. Некалькі каласоў астаўлялі недажатымі. Яго называлі барадою.

***

Хорошуха да пожалася,
А няўдала да осталася.
Хорошуха, пожынай, пожынай,
Неўдалуха, погуляй, погуляй.
Хорошусе да пірог з мёдом,
Неўдалусе да жаніх Хведар.
Хорошухі да дзіця крычыць,
Неўдалухі да жаніх бяжыць.
Ужо сонейко закоцілося.
Нам дамоўкі захоцелося.
А наш пане ды баране,
Не пускае нас заране.
Наша пані да давечая,
Не пускае нас да вечара.

*******

Ой, дай, Божа, пагоданькі,
Ой, дайце мне пов’язчыка
На нашую работаньку,
Прыкрасного молойчыка.
Коб мы дзела і зрабілі,
Ён са мною снопаў звяжэ.
Коб нас людзі похвапілі.
Ён до мэне слоўцо скажэ.
А я ў полі жыта жала.
Снопок звяжэ, помацуе.
У снопочкі повязала.
Словцэ скажа, поцолуе.

*******

Покоціўся вянок з поля,
Прыкоціўся да покоя.
У нас цяпера дожыночкі.
Дай, дзярэктар, гарэлачкі.
Коцілася бочачка з поля.
Прыкопілося до покоя.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Пяшэвіч Я.***

Жыта, калоссе свяцілі. Калі сеялі, зачын свяцоным жытам дзелалі. Штоб не елі пціцы жыта, нада взяць первую жменю, закрыць глаза і сказаць: «Как я не бачу свайго жыта, так штоб вароны, вараб'і не бачылі яго». Спявалі песні:

Я не мылася, не часалася,
Пашла ў поле жыта жаць.
Я нажала снапок
Ды пакінула сярпок,
Сама павалілася.

***

Мая мамачка, мая родная,
Зачем ты меня радзіла,
Зачем ты долю горкую,
Несчастлівую мне ўдзяліла.

Астаўлялі бараду, звязвалі её, ну, так у снапок, убіралі яе цвятамі палевымі. Плялі вянкі з васількоў, з жыта. Свяцілі каласы. Большэ свяцілі ў цэркві. Бывала, прывадзілі бацюшку, он дзелал абход, малітву чытал, вадой свяцонай абрызгівал. Зерне свяцілі. Калі жыта абмалоцяць, эта зерне і свяцілі. Патом хазяін, кагда на зіму сеял, зернем свяцоным зачын дзелал. Свяцонае калоссе скаціне давалі, у хату пад іконай клалі. Калдуны, нехарошыя людзі дзелалі завоі. Уплятaлі косы, паклю. Дзелалі эцім врэд. Хто расплетваў іх, не панімаўшы, балелі, бо завоі дзелалі людзі недобрыя. Бывала, чалавек балее, балее, не можа абараніцца і да смярцельнага. Шукалі чалавека, каторый знал малітвы, он расплетал і сжыгал завой.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

Для доброго хозяіна самым важным було жніво, бо ек кажуць: "Одзін дзень год корміць". Перэд тым, ек іці ў поле, начысто ў хаці прыбіралі: з самого ранку ўмуваліса, засцілалі вубеленою тканою скацерсцью стол.

Хозяйка з дочкамі, невесткамі, зовіцамі, брацiхамі звалі чужых жонок, одзеваліса чысто і хорошэ і ішлі зажынаць жыто. Бралі з собою хлеб, соль, сыр. У еты дзень доўго не жалі, само глаўно нажаць "зажыночны сноп" для Багача. Почынала жаць самая старэйшая з хаты, кланялася полю і говорыла: "Добры дзень, ніўка! Я к тобе прышла!". Закопвала "галёпу" на краю поля з словамі: "Бацян, бацян, на тобе "галёпу, а мне жыта копу". Потом, зжаўшы першую жменьку жыта, она говорыла : " Зажынайце жоночкі, не перэходзячы одзін одного, шоб дождаць года другого. Зажынаймо і ў сноп складаймо".

Першы сноп ставілі на ржышчы і подкладвалі под его хлеб, соль, сыр з словамі: “Стаўлю сноп на сто коп, на тысечу мерок”. Частоваліса квасом і спевалі песню:

Голубочок, снопочок,
Нажалі моложайкі
Да іх белые ручэнькі.
Месяц, месячыку
Свеці нам на дорожэньку,
Шоб мы не заблудзілі,
Снопочка не загубілі.

Шчэ трохі пожнуць, і так шоб одна за другую не заходзіла. Не трэба на перэд серпа заходзіць. І на другі дзень становіліса жаць так ек на першы. Бралі еты зажыночны сноп і ішлі дохаты. Ек заходзілі ў хату, то з поклоном оддавалі сноп хозяіну і той ставіў его на покуцье , а под его ложыў несколько копеёк.

Жонкі спевалі:
Цепера ў нас зажыночкі-2 раза.
Бо мы жыто зажыналі,
У снопочкі повязалі.
Свойму хозяінку
Сноп даровалі.
Наш господарочок молодзенькі,
Его конік вороненькі,
Он на поле под’ежджае,
Своіх жнеёк огледае.
Жнеце, жнеце не стоіце,
Зжаўшы, ў снопы повежыце.
А нажаўшы, одпочніце (оддохнеце).

На другі дзень усе ішлі жаць поле. Першою почынала “почынальніца” і ўсе становіліса так, ек у першы дзень “зажынок”, бо чэрэз серп перэходзіць грэх.

Жаўшы, жонкі спевалі:
Добра ніўка була,
Сто коп жыта ўродзіла.
І шчэ хваліцца,
Шо на копу колосье валіцца.

Во ўрэмя обеда, хозяін прывозіў обед, корміў і поіў квасом, коліноўніком, кіселём. Жонкі хутко, пообедаўшы, ішлі зноў жаць і, конечно, як важко не було – спевалі:

Ой, я жала житейко пры дорозе,
Повесіла люлечку на берозе.
А ек жала жыцейко пры доліне,
Повесіла люлечку на коліне.
Ой, я жну полосочку, жну другую,
Крычыць мое дзецетко, я не чую.
Поспі, не плач дзецетко, моя доню,
Дай дожаці нашэ жыто – свою долю.

Ек дожыналі, то спевалі:
Ой, у полі да дожон, дожон,
Пусці пане да домоў, домоў.
А ў полі да дожыночкі,
Былі ў полі да й родзіночкі.
Ганна Івану сына родзіла,
Да такого ж да богатыра.
Мы на ніўцы да стоміліса,
Нізко ніўцы мы клоніліса.
Мы дожыночны снопок несом,
У пуні зернечко мы ўсе звезом.
Ой, у полі да дожон, дожон,
Пусці пане да домоў, домоў.

І такую песню спевалі:

За нашою доліною-2р
Там Таццяна жыто жала-2р,
У правой руцэ серп дзержала.
У правой руцэ серп дзержала-2р,
А левою подбірала.
Ой, там Васіль сено косіць-2р,
Таня  голос перэносіць.
Кідай косу ў травоньку-2р,
Беры свою дзецінОньку.
Беры свою дзецiноньку-2р
Дай пойдомо до домоньку.

І так жалі кажды дзень, покуль не пожнуць усе жыто ці пшэніцу, а ек кончалі жаць,то обезацельно остаўлялі бороду на концэ поля, под екую закопвалі шкорлупіньe з еец, косточкі з еды, сыпалі чуць свечаное солі. А ек дожыналі, то тожэ нажыналі "дожыночного" снопа і неслі з песнямі домоў хазяіну. У концэ  "дожынок"  хазяін частоваў жонок дома. Снопа етого "дожыночного" вон тожэ ставіў на покуць под образы і два снопы: "зажыночны" і "дожыночны". Ждалі празніка  "Багача". А на "Багача" іх

обмолачвалі, ці мялі, сыпалі зерно ў сявеньку і спраўлялі “Багача”, перэносячы з хаты ў хату.

***Запісана ў в. Сямурадцы***
***ад Гром Анастасіі Парфенаўны, 1926 г.н.***
***Шчакатовіч Марыі Іванаўны, 1934 г.н.***
***Лой Аляксандры Пятроўны, 1926 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Г.П.***

От ужэ збіраліся жонкі, обоб’юць усё ета зярно, усыпалі яго зярно ў сявеньку. Хозяін у ета время шукаў свечку вялікую. Ету свечку ставілі ў сярэдзіне сявенькі, затыкалі, запальвалі ету сявеньку, і хазяін браў ету сявеньку ў рукі, а жонкі кругом етой сявенькі вадзілі корогода і спявалі песню:

Госпадзі Божа, дзякуй за збожжа,
Дзякуй за ўраджай, за смачны каравай.
Госпадзі Божа, усім жыццё гожа,
Есці і піці, дзетак расціці.
Госпадзі Божа, дай жа нам тожа,
Цябе мы просім на наступну восень.

От яны водзяць кругом хозяіна, кругом богача карагод. І ўжэ як закончаць спяваць, хозяін нясе і богоча ставіць под іконаю. Поставіць богоча под іконаю, етых усіх, хто вадзіў корагод, хто аббіваў зярно, садзіць за стол і вельмі добра частуе. Почаструе іх, потом сам хозяін бярэ богача і ідуць па ўсім сялу от хаты до хаты. І ў каждой хаце водзяць етого карагода, спяваюць ету песню. Еты богач до самого ранку носяць. Под ранок доўжэн обязацельно вярнуцца ў тую хату, з якой хаты ён пайшоў. І ўжэ тады под ранак тушаць свечку, яшчэ раз хозяін садзіць людзей за стол, частуе. Спяваюць яны песні, танцуюць і расходзяцца ўжо по домам. І ўжэ з етого богоча ето зярно высыпае ў семянно зярно, шоб посеяць трошкі, дае карове, трошкі свінням, курам, шоб куры добра нясліся.

***Запісана ў в. Чэрнічы***
***ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,***
***студэнткай Хільман І.***

***

Ой, у садочку цвіла лілея.
Дажала жытка старшая жнея,
Сбор жытка, сбор.
Каб мы здаровы жытка спажывалі,
Зарок шчаслівы зноў дачакалі.
Сбор жытка, сбор.
Засцілай, маці, сталы і лавы,
Бо да цябе ідзе госць небывалы.

***

Жалі, жалі па сонейку,
Будзем жаць па месяцу.
Па сонейку – самаму пану,
Па месяцу – капітану.

***

Ніўка, ніўка,
Аддай маю сілку
На другую ніўку.
А я ж табе жала,
У сілку спацерала.
Нашы жнейкі маладыя,
Іх сярпы залатыя.

***

Згубіла зара ключы
Каля позніх жней ідучы,
Месячык за ёй ішоў,
Ён тыя ключы знайшоў.
–Месячык, мой братка,
Аддай мае ключыкі.
Жнеячкі дамоў ідуць,
Нечым нівачку замкнуць.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

***

Ой, у полі ды дажыначкі,
Ой, у полі ды дажыначкі,
Ды пастаў, паначку, нам гарэлачкі.

Гарэлачкі ды салодзенькай,
Гарэлачкі ды салодзенькай,
А паначку наш малодзенькі.

А я жала ды не дажала,
А я жала ды не дажала,
Ды й капы я жыта не нажала.

Ой, дзеванькі, ды дайце сяду,
Ой, дзеванькі, ды дайце сяду,
Ды астаўце мой загон ззаду.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.***

***

Дажалі мы жыта да аблогу,
Падзякуем пану Богу.
Плён прыносім, плён.
Выйдзі, пане, на ганачак,
Прымі жыта вяночак.
Дай, Божа, у здароўі пажывалі,
А за год жаць дачакалі.
Не жалуй мяне, сівога дрыганта,
А пашлі па музыканта.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Таргонскага Казіміра Францавіча***
***студэнткай Шырай Н.***

***

Маці, маці,
Пара жыта жаці!
Каласок нахіліўся –
Пачынайце!
Расло жыта, расло ў полі,
Прыйшлі жнейкі жыта жаці
Усе разам, усе разам.
Прыйшлі жнейкі жыта жаці,
Узялі з сабой сярпочкі,
Сталі жыта подразаць
Усе разам, усе разам.
Сталі жыта падразаць,
У снапочкі павязалі,
Трэба ў бабкі пастаўляць
Усе разам, усе разам.
Трэба ў бабкі пастаўляць.
Сонца свеціць добра ў полі,
Будзем песенькі спяваць
Усе разам, усе разам
Будзем песенькі спяваць,
Хутка працу мы канчаем,
Пойдзем усе адпачываць
Усе разам, усе разам
Пойдзем усе адпачываць.

***

Дажынкі, дажынкі,

Мы канчалі жаці.
Дазволь, пане-гаспадару,
Сноп табе аддаці.
Каціўся вяночак па полю
Прасіўся жнічак дадому
Дадому, жнічкі, дадому.
Ужо пагуляліся па полі.

***

А ты, вясна, ты красна,
Што ж ты нам прынесла?
А прынесла, прынесла
Цепла лета, ціхае,
Цепла лета, ціхае.
І цёплую вадзіцу,
І цёплую вадзіцу,
З зямліцы травіцу.
Старым бабкам па кійку,
А пастушкам па яйку.
Дай, божа, на жытачка род,
На статачак плод,
Людзям на здороўе.

***

Вол бушуе – вясну чуе.
Баран бляе – у поле хоча.
Курачка сакоча – несціся хоча.
Дзеўка плача – замуж хоча.
Стары крэхча – пажыць хоча.

***

Благаславіце, старыя людзі,
А й вясну-красну позваць загукаць жа.
Лютую зіму ж замыкаць,
Замыкаць жа.
Да вясну-красну на вулачку,
На вулачку ж.
Лутаю зіму ў каморачку,
У каморачку.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Ганны Андрэеўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Ой, выйдзем мы на горку

Да паклічам Бога.
Адамкнуць зямліцу,
Выпусціць расіцу.
Будзем зіму замыкаць,
Цеплае лета адмыкаць,
Штоб нам, дзеўкам, цепла гуляць.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Бобрык Таццяны Максімаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

***

Кажуць людзі на мене, што я Васіліха,
Нажалася ў полі жыта, іду дадому ціха.
Нажалася жыта новымі сярпамі,
А мой мілы дома п'е с сваімі кумамі.
Покінь, покінь, мой міленькі, гарэлачку піці,
Хадзі, хадзі снопікі вазіці.
Я пшанічаньку не жаў, возіці не буду,
Выйдзі вон, задрыпана, а то біці буду.
Яка ж я задрыпана? Хазяйка харошая,
Сем дней хату не мела, смецце не выносіла.
Як паехаў мой Васіль, паехаў за граніцу,
Купіў сваёй Васіліхе зелену спадніцу.
Кажуць людзі на мене – зелена спадніца,
Сюды-туды павернуся – гарна молодзіца.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Сама пайду дарогаю,
Галасок пушчу дубровою,
Хай мой голас галосіць,
Хай мая мамка чуе,
Калі вячэру гатуе,
А вячэру смачную,
А пярыну мяккую,
На вячэру – ложку,
На пасцель – падушку.

***

Ужо вечар вечарэе,
Мая мамка вячэрае,
Кліча і мяне вячэраці.
Ой, вячэрай, мамка,

Бо я ўжо вячэрала,
Ела хлеб ды слёзкамі праганяла,
Ды ў соль мачала,
Ды долю праклінала.

***

У нас сёння вайна была,
А ўсё поле зваявалі,
А ўсё поле зваявалі,
І ў копачкі паскладалі.
Што горачка, то копачка,
Што нізочак, то вазочак.

***

Дзевонька з поля ішла,
За поясам сярпок нясла,
За поясам сярпок нясла,
За плечыма калысаньку,
А на руках – дзіцятко,
Калыска – цугі, цугі,
Дзіцятко – кугі, кугі.

***

Выйшла маці жыто жаці,
Стала сярпы перакладаці.
Няма сярпа золотого,
Жняца молодого.
Выйшла свякроў жыто жаці,
Стала сярпы раскладаці.
Прыбыў сярпок залаценькі,
Жнец маладзенькі.

***

Ой, дайце мне загон-разгон,
Молодого повязнечка,
Ён са мною снапы звяжа,
Ён са мною спаці ляжа.
Снапы звяжа, памацуе,
Спаці ляжэ – пацалуе.

***

Ой, у полі бярэзінка,
Боліць моя сярэдзінка,
Ды некаму спагадаці,
Сярэдзінку потаптаці.
А дай жа, Божа, кугакола,

Каб пад снапком заплакала,
А я б пайшла, скалыхнула,
Сярэдзінка б аддахнула.

***

На лугу касцы косяць,
Косяць, косяць ды мыляюцца,
На мяне ўзіраюцца,
Што я тонка, высока,
Што я бела, румяна,
Што я хорашэ ўбрана,
На лугі я послана.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

***

Дубова мяцелачка ўсё поле памяла
І ўсё жыта пажала.
Судзі, Божа, панам у здароўі спажываты,
А нам жа ж зарок дачакаты.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Лагун Валянціны Іванаўны,***
***студэнткай Шырай Н.***

**Спас**

Іе яблычны і медовы Спас. На яго ходзяць на кладбішчы. І несуть свячоныя яблыкі. Яблык свячоных нельзя було есці тым, у кого дзеті помiралі. Есці яблык нельзя було ім до Спаса. А после Спаса ўжэ еш. А чаго нельзя, я б об'ясніла, да я не знаю. Чым отлічаецца яблычны Спас от медоврго Спаса я не знаю. Но на яблычны Спас яблыкі свецяць, а на мядовы – мёд. На медовы Спас на кладбішчы не ходзяць. Ходзяць у цэркву свецяць яблыкі і моляцца.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

## ВОСЕНЬСКІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

**Багач**

Гаварылі: “Прыйшоў Багач, кідай рагач, бяры славеньку, сей памаленьку!”

Багач святкуецца ў канцы сельскагаспадарчых работ і на пачатку сяўбы азімых.

Святочна прыбіраюць хату, развешваюць посцілкі, ручнікі, абрусы на сталах, посуд, на покуце – ікона, пад ёй каласкі жыта, гронкі рабіны.

Гаспадар і гаспадыня чакаюць гасцей. У хату ўваходзяць гурт людзей і наперадзе нясуць Багача-сяваньку з зернем, пасярэдзіне стаіць запаленая свечка.

– Прымайце, гаспадары, госця дарагога, Багача!

– Дзякуем табе, наш моцны Божа,
Што нам дапамог сабраць збожжа.

Гаспадары з паклонам бяруць Багача і праносяць яго па ўсёй хаце. Пасля гаспадар ставіць Багача пад ікону, а гаспадыня чытае малітву. Пасля гаспадары частуюць гасцей:

Ад краю да краю ўсім дабра жадаю!
Каб вам жылося, каб у вашым жыце
Калоссе вілося!
Каб жылі да красаваліся,
Каб Бог даў табе здароўя
У ручкі, у ножкі і жывату трошкі.

***Запісана ў в. Чырвоны Бор***
***ад Макарэвіч А.А., 1928 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

Звычайна на “Багача” патрэбна пазваць усіх, хто працаваў на працягу жніва на полі, ды і тых, хто дажынаў апошні сноп “багаты”.

Сноп, звычайна апошні, прыносяць у хату гаспадароў, у якіх жніво жалі. Жанчыны расцілаюць абрус і прыказваюць:

Сцяліся, абрусік, роўненька,
Каб наша пшанічанька
Лягла тоўсценька,
Каб мы яе памялі
І “Багача” спраўлялі.

Сноп кропяць асвячонай вадою:

Галубок-снапок,
Нажалі малажайкі,
Да іх белыя ручанькі.

Усе мнуць сноп і прыказваюць яму:

Месяц-месячыку!
Асвяці ж нам дарожаньку,
Шоб мы не зблудзілі,
Снапочка не згубілі.

Бо нам снапочак красны,
Як месячык ясны,
Яшчэ высшы ад плота,
Даражэйшы за злота.

Яшчэ вышэй ад гары,
Ясней ад гары,
У снопе гарысты,
У сяўку “багаты”.

Жанчыны пачынаюць аббіваць сноп і спяваюць песню. Аббіўшы сноп, жанчыны бяруць абрус за чатыры канцы, каб зерне сыпалася ў цэнтры абруса. Жанчына, збіраючы зерне ў сяваньку, гаворыць:

Снапочак рагаты,
Які ж ты багаты.
Насыпаў пшанічаньку,
Ды поўную сяваньку.

Жанчыны шукаюць свечку, ставяць яе ў сяваньку, бяруць “Багача” і ў цэнтры круга з Багачом ходзіць жанчына, астатнія ўтвараюць круг і спяваюць песню:

Госпадзі Божа,
Дзякуй за збожжа,
Дзякуй за рагача
І за “Багача”.
Госпадзі Божа,
Усім жыта гожа,
Есці і піці,
Дзетак расціці.
Госпадзі Божа,
Дай жа нам тожа.
Цябе мы просім,
На наступну восень.

Пасля жанчына звяртаецца да гаспадароў:

Прыміце, гаспадарочкі,
Госця дарагога,
Кідайце рагача,
Прымайце “Багача”.

Гаспадар прымае багача, ставіць яго пад ікону, запальве свячу. Гаспадыня чытае малітву:

Дзякуй вам за працу вашу,
За пашану і павагу да нас.
Дзякуй вам, што нашай хаты не мінавалі.
Мае любыя жнеечкі!
Вы ўсе збожжа пажалі,
“Багача” даждалі.
Накрыла я сталы дубовыя,
Паставіла прысмакі мядовыя,
Сядайце, гуляйце.

Жнеі спяваюць песню гаспадарам:

Дзякуй табе, гаспадынечка,
Мы “Багача” даждом,
Але ж у гэтай хаце.
Яшчэ не танцавалі.

Усе прысутныя танцуюць, а гаспадар у гэты момант бярэ “Багача” і выходзіць у круг танца, прытанцоўваючы. Жанчыны ўслаўляюць гаспадара:

Слаўся, гаспадарочку, слаўся!
Што нас, жнеек, не стыджаўся.
Як мы не стыджалі,
Тваю ніўку дажалі
І “багача” даждалі.

Гаспадар ставіць “Багача” на покуць, а гаспадыня частуе пачастункамі жанчын:

Пашлі, Божа, многа збожжа,
Нарадзі хлеба ў полі,
Шоб было ўсім гожа
І не пуста ў пуні.

Жнеі розвітваюцца з гаспадарамі:

Гаспадынька і гаспадарочку!
Час ужо збірацца
Ды да другога гаспадара падацца.

Нам няма як чакаці,
Трэба “Багача” перанесці
Ад хаты да хаты.

Перанясем ад хаты да хаты,
Каб у наступным годзе
Быў ураджай багаты.

Гаспадыня хаты, у якой былі жнеі, звяртаецца да “Багача”:

А ты, Багач, не лякайся,
Ды да раніцы назад вяртайся.

Жанчыны бяруць “Багача” і з песняй выходзяць з хаты, накіроўваючыся ў другую хату.

“Багача” насілі ад хаты да хаты, а да раніцы яго вярталі назад гаспадарам. Гаспадар зерне таксама падсыпаў у насенне, якім засеваў поле. Падсыпалі таксама ў цеста, з якога выпякалі хрэсцы, для першага выгану кароў на пашу. Чуць падсыпаў у зерне, калі карміў курэй, каб тыя нясліся доўга і абавязкова дома.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Лой Ганны Пятроўны, 1955 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Раней было так: ек закончыцца жніво, то хозяін, екі нанімаў жонок жаць, зваў усіх на Багача. Его жонка з самого ранку готовілася: пекла, варыла боршч, кашу, еечню у печ ставіла. І от, ек прыдуць усе жонкі, которые жалі толокою у его, то росцілалі на подлозі скацерсць і говорылі:

Сцеліса скацерко роўненько,
Шоб наша пшэнічэнька легла роўненько.
Коб мы ее помялі і “Багача” спраўлялі.

После гетых слоў ложылі снопа на скацерць, обкроплялі свечоной водою говорылі:

Голубочок-снопочок,
Нажалі моложайкі,
Да іх белые ручэнькі.

І почыналі оббіваць, ці мяць снопа, прыказваючы ему:

Месяц, месячыку!
Освеці нам дорожэньку.
Шоб мы не заблудзілі,
Снопочка не згубілі.

Бо наш снопочок красны,
Ек месячык ясны.
Яшчэ высшы от плота,
Дорожэйшы злота.
Ешчэй вышэй от горы,
Ясней от зоры.
У снопе горысты,
Сеўку "Багаты".

Оббівалі і спевалі песні. А пасля ету пшэніцу сыпалі ў севеньку і казалі:

Снопочок рогаты,
Екі ж ты богаты.
Насыпаў пшэнічэньку,
Да поўну севеньку.

Ек жонкі оббівалі снопа, то одна з іх сукала свечку з освечаного ў цэркві воску, котору ўтыкалі посерэдзіні севенькі, бо свечка ек бы освечала етэ зерно. После свечку запальвалі, возвушалі трыжды " Багача", водзілі кругом его корогод і спевалі песні.

После песні про "Багача" жонкі подносілі его хозяіну, а той забіраў. Дзяковаў жонкам і ставіў его под ікону на покуць. Хозяйка звала ўсіх жонок за стол і частовала. Тут жэ спевалі і танцовалі, веселілі хозяйску хату. А после бралі "Багача" і разом з хозяіном обходзілі ўсе село, не мінаючы ні одное хаты, і ворочалі "Багача" у ту хату, откуль вон вуйшоў. Хозяева после подсыпалі зерно з "Богача" у семена, шоб буў уражай і на другі год добры. Чуць сыпалі свіньям, корові, гусям, курам, шоб худоба плодзіла і була здоровою. Трошкі сыпалі і ў хлеб, ек замешвалі, шоб дзеці і ўся сем'я була здоровая. А на другі год ужэ водзілі "Багача" з другое хаты.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папок Надзеі Іванаўны, 1924 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Ганнай Пятроўнай***

**Здвіжанне**

У норы змеі залазяць. У лес нельзя ходзіць. Хто праграшыцца, то ў землю іх не пускаюць.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

**Пакроў**

Пакроў – гэта празнік закрывання зямлі на зіму, канец палевым работам, а маладым – канец гуляньям. На Пакрову начыналіса вечоркі. Як казала мая маці-пакойніца: "Святы Пакроў у гумно звоніць, зерно лічыць, маладых дзевак на пасаг клічыць". А еслі да Пакроў да дзеўкі не прыходзілі сваты, то казалі: "Прыйшла Пакрова – зарэўла дзеўка як карова".

Раньшэ пра Пакровы казалі так: “Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду – лядком, пчалу – мядком. Святы Пакроў накрыў рыбу лускай, дзерэўя – карой, птаху – пяром, дзеўку–чапцом”. А шчэ кажуць, што зіма накрывае лета. После Пакроў ніхто не хадзіў у гароды, ждалі вясны.

З Пакровай звязана многа прыкмет. Напрымер, еслі на Пакровы не ідзе снег і земля не накрытая, то і на Каляды не будзе снегу. Екая пагода ў дзень Пакроў, такая будзе і ўсю зіму. Еслі на Пакроў нема снега, то его не будзе ешчэ дзве недзелі.

От у етую пару хлопцы прыглядвалі сабе дзеўчат, а дзеўчаты гадалі на хлопцаў перад Пакровай. По-разному гадалі: от наберуць у фартух лістоў, а потом выгрэбалі з его. Куды вецер понесе, туды і замуж іці. Шчэ пеклі салёные ладдзі, і перэд сном елі іх. Хацелі, каб прысніўся і напаіў вадой той, хто замуж возьме.

Шчэ ў гэты дзень сабіраліса дзе-нібудзь у адной хаці і гулялі ў ігры разные, пелі.

Напрымер, “Мост”. Той, хто гуляе, становяцца ў пары: хлопцы з дзеўкамі. Пары выстрайваюцца адна за адной. Хто-нібудзь становіцца ўперэдзі і падае каманды (раз, два, тры), паследняя пара бегіць. Хлопец – у адзін канец, дзеўка – у другі, і бягуць да вядучага. Калі ведушчы хлопец, то ён стараецца славіць дзеўку, а калі водзіць дзеўка, то ена ловіць хлопца. Той, хто астаецца без пары, становіцца на место ведушчого. Новая пара становіцца на место гуляюшчых. Так ігра і цягнецца.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Субат Яўгеніі Пятроўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Покрова – ето ўжо свято асенняе. Покрова – ета покрывало Божае Мацеры. І от говорылі ў нас спакон вякоў, шо на Покрову зіма закрывае лето, а Бог пячатае землю, закрывае ўсю землю на зіму, шоб ана аддыхала, спала после летнего етого перыяда цяжкага і до самое вясны ніхто не мог найсці ніякіх скарбов. «Святая Покрова землю накрывала жоўценькім лістом, молодым сняжком, воду – лёдам, дзерево – корою, птушачку – пяром, а дзеўку – чапцом». І от як ужэ до Покровы не прыйдуць да дзеўцы ў сваты, то ўжэ ўсё, ужэ дзеўка жджэ да самой Масленіцы. Ужэ толькі на Масленіцу ў сваты прыходзілі. Да і не зра казалі прыказкі такія, шо ўжэ прыйшла Покрова, то зараўла дзеўка, як корова. Бо ўжэ не прыйшлі ў сваты, да ўжэ ана плача. Ды на Покрову ўжо ставілася ўся худоба ў хлеў. І на ето свята гаварылі, шо прыйшла Покрова, не дала молока корова. Ужэ і молока ў коровы меншэ на зіму і пройшла корова, зараўла корова, не наесца травіцы корова. І от по Покровы глядзелі, якая будзе погода. Колі до Покровы снег не покрые зямлю, то і на Коляды не будзе снегу, і як до Покровы да свята ўсіх святых кроты землю точаць, то зіма будзе снежная і морозная. Ею ўсе глядзелі на Покрову такія прыкметы.

І дзеўкі на Покрову, да Покровы вельмі ждалі сватоў, патаму шо толькі да Покровы хадзілі ў сваты к дзеўкам. Як до Покровы дзеўку высватуюць, то ўжэ і ана ад радасці спявала от такую песню:

Ці я, ці я не дзеўка?
Ці я не паненка?
Рукі як вяроўкі
Чакалі Пакроўкі.
А Пакроўка прыйшла,
Усё ў дастатку прынясла:
І гарбузік залатой,
І мне венчык маладой.
Радуйцеся, дзеўкі,
Пакроўка прыйшла,
Пакроўка прыйшла,
Усім вяночкі прынясла.

А ў нас на Тураўшчыне на Пакрову наладжваўся вельмі вялікі кірмаш. Кажная жонка готовілася як на вяселле.

Трэба було наготовіць усякое-усякое яды, усякіх прысмакоў. Патаму шо з усіх етых суседніх дзяравень прыязджалі родзічы на Пакрову отведваць своіх родственнікоў. І можа там у родзічаў зародзіла добра кортопля, а тута ў нас нарадзіла зярно, то ўжэ аны прывозяць картоплі, ды мянялі на зярно. Да на самое цэнтры сяла наладжваўся кірмаш, торговалі, продовалі, вельмі богато було гармоністаў. Навек було многа гармоністоў. Хто хацеў свае шота прадаць, нанімаў гарманісга, сажаў яго на воз, дзе ляжало там зярно, ці картопля, ці буракі, ні маркоўка. І ўжо гарманіст іграў. Іграе гармоніст, значыць, прыдзе і больш покупацелей да етого воза. Ну і ўжэ торговалі, прадавалі. Да ўжэ за дзень наторгуюцца, а етыя, хто родственнікі прыязджаюць у каждую хату, садзяцца за стол, частуюцца, п’юць, гуляюць, а далей збіраліся ўсе-ўсе на цэнтры сяла і ўжо там гулялі і спявалі. Етыя гармоністы ўсе ігралі. Да ўжэ і песні і танцы до самого ранку.

***Запісана ў в. Чэрнічы***
***ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.,***
***студэнткай Хільман І.***

Пакроў – пакрывала Божай Маці. Говорылі, шо зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю. После етога дня і да вясны ніхто не можа знайсці скарбаў. Святы Пакроў пакрываў зямлю жовтым лісцем, молодым сняжком, ваду – лёдам, дрэво – корой, птушку – пяром, дзеўку – чапцом. Святы Юрай і Пакроў звязаны паміж собой: Юрай – выганам жывёлы после зімы, Пакроў пачатак зімавання жывёлы в хляве. Да свята Пакроў захавалася много прыкметаў і парадаў, звязаных з Покровамі:

Прышла Покрова – не дала молока корова.

Прышла Покрова – закрыкала ў хлеве корова.

Прышла Покрова – не поесць травы корова.

Пакров лічылі надзёным паказчыкам надвор’я на цэлы год:

Колы да Покрова дня снег не покрые землю, то і на Коляды не будзе снегу.

Колы ад Покрова до свята ўсіх Святых (1 лістапада) краты землю точаць, то зіма будэ снежная і морозная.

Етоксама сачылы за напрамкам ветру на Покрову – з екого боку вон дзьмуў у еты дзень, з такого ж боку вон будэ дзьмуць всю зыму.

На Покрову хлопцы па вёсках выглядалі сабе нявест, а дзяўчаты напярэдадні Пакрова варажылі на замужжа: бралы ў фартух апалае лісцэ і потым вытрыхалы яго – куды вецер панясе, туды і замуж ісці.

Пякді солёные бліны, перад сном з’ядалі і з жаданнем кладучыся спаць думалы, кеб сасніўся і напаіў вадою тый, хто накаваны лёсам.

І марамі пра замужжа дзяўчаты прасілі святы Пакров накрыць іх голавы вянком (чапцом). Існавалі етоксама прыказкі да дзяўчат: “Ад Пакрова вжо дзеўка гатова”.

Прышла Пакрованька ранцам, накрыла голованьку чапцом. Ек накрыла ты, Пакрованька, зямлю сняжком, дак покрыла мэне молоду вянком.

На Покрову сняжок зямлю накрывае, а мэне молоду замуж выправляе.

Колы ж вяселле міновала хату, то говорыла прыкмета: «Прышла Покрова – заровла дзеўка ек корова». «Праходзіць Покрова – раве дзеўка ек бы корова». «Прошла Покрова і ў раначку зараўла дзеўка на ганачку».

Самым главным у свяце Пакровы було то, шо кожна гаспадыня рыхтавалася, ек на вяселле. Варылі розныя прысмакі, пяклі смачныя печывы, многа ежы гатавалася з мясу. У еты дзень да кожнага двара з’яджаліся і зыходзіліся родзічы з навакольных вёсак. Кожны прывозіў з сабой пачастунак для дзяцей і етаксама сабраны ўраджай, кеб зрабіць абмен ці прадаць на кірмашы. Гаспадары хаты накрывалі багатыя сталы, частавалі сваіх родзічаў, дзе адбывалася застольнае свята, спявалі, танцавалі.

Многа на кірмашы було музыкаў, гармонікі гучалі ў розных куточках вёскі, гучалі пералівы родных песен. Вёска ў еты дэнь звінела ад песен і танцаў. На трэцім тыдні пасля Пакрова (у субботу) напярэдадні Змітровага дня адзначаецца агульны памінальны абрад, вядомы ек восеньскія (змітроўскія) Дзяды.

***Запісана ў в. Града***
***ад Клімовіч Марыі Харытонаўны,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Уводзілі Божу Маці ў цэркву да пакрывалі яе чым-то. Покрова – ўвядзенне Божой Маці ў цэркву і пакрыванне яе рызаю, мабуць так. Іе прыметы на эты празнік. Яка Покрова, таке і лето буде, які дзень перад Покровою, така буде вясна, які дзень после Покровы, така буде осень. Еслі вецер з югу, то зіма буде цёплая, а калі з севера, то зіма холодная.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Кудзелька Ю.*

**Жаніцьба коміна**

Гэты абрад праводзіўся восенню, калі заканчвалі сеўбу. У хаце рабілі комін. Яго сплятаалі з дубцоў, абмазвалі глінай, абцягвалі мяшком, а потым у столі рабілі дзірку. Залазілі на гару і рабілі лежака. Дзеўкі пойдуць на двор і нарвуць хмелю, а маці чапляе яго кругом коміна.

Бацька сёк лучыну, якую падпальвалі пад комінам. Гэта называлі посветам. Маці ж давала кожнаму дзіцяці зернета. А потым сыпала на комін, і дзеці іх збіралі.

Галоўнай стравай на стале быў боршч, каша, маці секла пеўня. І ўсе члены сям'і садзіліся вячэраць. Бацька заканчваў сеўбу, і таму праводзілі гэты абрад.

*Запісана ў в. Любавічы*
*ад Матарас Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.,*
*студэнткай Нікановіч Н.*

Комін меў выгляд шырокай трубы, сплеценай з лазы і абмазанай глінай. Пад ёй падвешвалі пасвет – вялікую квадратную рашотку, на якой доўгімі зімовымі вечарамі гарэлі лучыны, асвятлялі хату.

У кожнай сям'і гэта было важнае свята, да якога рыхтаваліся ўсе. Гаспадыня накрывала багаты стол, абвязвала комін доўгімі прыгожымі ручнікамі, моладзь упрыгожвала яго кветкамі. Святочны стол ставілі тут жа, побач з комінам. Як толькі цямнела, сям'я садзілася за стол і распачынала святочную вячэру. З доўгай прамовай да дамачадцаў звяртаўся гаспадар. Ён прасіў нябесныя сілы, душы продкаў, каб яны дапамаглі захаваць узімку жывёлу, азімыя, сабраны ўраджай. Заканчваў ён сваё слова прыгожым пажаданнем: "Каб нашаму роду не было пераводу".

У канцы вячэры коміну-жаніху спявалі:

Ой, прыйшлі ж ночанькі даўгенькі,
Пасвяці нам, коміну бяленькі,
Мы ж цябе кветкамі ўбіралі,
Барвяночкам, рутай аперазалі.
Праца наша – дзеўка чарненька,
Палюбі коміна радзенька.
Мы ж цябе будзем жаніці,
Жаніці, квас, піва, мёд піці.
Свяці ж, коміночку, ясненька,
Пабуджай чэляду раненька,
Шыць, прасці, ткаці маладым,
А падарачкі збіраці старым.

*Запісана ў в. Людзяневічы*

*ад Кот Вольгі Віктараўны, 1926 г.н.,*
*студэнткай Шырай Н.*

Абрад "жаніцьба коміна" (пасвета) у нас абычна праводзіўса ў первы дзень восені, на дзень святога Сымона, ек канчаласа ўся работа на полі і пераходзілі з работы ў хату. У другі раз праводзілі абрад ужэ на Фоміным тыдні (ето нядзеля пасля Паскі), ек работа ўжэ пераносіласа ў полі. От у нас восенню і запальвалі лучыну на спецыяльному посвету. Робілі посвет з чаго-небудзь жалезнаго, а було і так, шо робілі з лозы, облепвалі кругом гліною, сушылі его, мазалі мелом, шоб буў белы, і подвешвалі до столі. У столі робілі дзірку на вылет, кудою ўходзіў дым.

Сам абрад спраўлялі для таго, шоб ушаноўваць хатні дух, огонь багач, дух продкоў нашых. Яго трэба було ўлагодзіць, дагодзіць яму і попросіць яго, шоб выросла пшэніца, шоб можна було спекці каровай да сына жаніць, дочку замуж аддаць дый і людзей на вяселле пазваць. Ну, і богато шчэ для чаго.

Жаніцьба – ето ўшанаванне, оказванне коміну гонару. А жэняцца по етому абраду хатняя праца – нявестка і комін – жаніх, шо прыносіць святло і богатство.

Для таго, шоб ожоніць коміна, жонкі збіраліса з кудзелямі для попрадок. Дзеўкі спявалі песні, казкі баялі, старэйшы з жонак асцерагалі дзеда-лучніка, то вуголлю падкіне, то святую лучынку покладзе. Сама лучынка на пасвеці пачынала вячоркі ў сяле, якія працягваліса тогды ож до самой весны.

До абрада "жаніцьба коміна" есціка спецыяльная песня, якую спеваюць коло коміна, як водзяць кругом ек бы корогод. У абрадзе ўчастовалі не толькі ўзрослыя людзі, але і дзеці. Ето шоб ек абсыпаюць коміна зернетамі, гарбузікамі, то дзеці праворнейшыя і больш хапаюць зернет, а по зернетах глядзелі, які ў кого будзе ўраджай жыта ці пшаніцы.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Жэняць коміна у нас для таго, шоб радзіўса лён, просяць у Бога здароўя. Лён – гэта жыццё. Жанілі коміна ў нас як только першы раз трэба было паліць посвет. У нас сабіраліса жонкі, бралі кожны па жменьцы лёну сабе і палілі посвет, запалілі і тады жонкі становіліса ў круг, махалі сваім ільном, паказвалі, каторая сама больша жменька лёну, а гэты посвет абсыпала маці. Зернейкі хапалі жонкі і дзеці, патом глядзелі, хто больш нахапае гэтых зернеек, той, кажуць, больш будзе ў суткі прасці. А колісь жа пралі: з утра начнуць і да вечара, а ўвечары, як прадуць, дык ложаць пад бок дрова, каб раней устаць ды больш напрасці. Ну, вось гэтыя жонкі нахапалі зернеек, катора больш, катора менш. Патом прасілі ў Бога здароўя, як сыплецца зернейка, так каб і сыпаліся семечкі з галовак ільна (іх раней елі). Патом збіралі гэта ў жменькі і глядзелі, чыя даўжэйшая і чыя большая і рабілі

заткало, і запіхалі коміна, гэта ад нячыстае сілы і шоб холад не шоў, бо з коміна прамая дзірка да холаду. Затым запіхалі заткалом. Жаніцьба коміна прысвечана іменна льну, для ўражая і абработкі.

***Запісана ў в. Пагост***

Абрад “жаніцьбу коміна” праводзяць перад Галавасекам, калі людзі паробяць засеўку ў полі. Коміна радзяць дзеразой, благаслаўляюць яго. Звычайна на свята прыходзяць суседзі, і ўсе разам жэняць коміна: просяць у Бога, каб жыта радзіла і пшаніца на ўсяку пашніцу. Гаспадар налівае чарку, падыходзіць да коміна і налівае тры разы на комін, а адзін раз к печы і гаворыць словы:

Дай, Божа, каб нашаму роду не было пераводу.
Каб Бог радзіў жыта, спас худобку і дзетак маленькіх,
Не абіжаў і нас, страэнькіх.
Каб у кожнай хаце коміна жанілі, а ў полі жыта, пшаніцу расцілі.

Гаспадар пасыпае коміна зярнятамі і прыгаворвае:

Дай Бог коміна ажаніць,
А на той год дачку замуж аддаць,
Да каб парасло жыта і пшаніца на каравай.

Пасля гаспадар хаты падыходзіць да стала, стукае па бутэльцы і гаворыць:

А каб гэтыя рэкі цяклі ў нас навек,
А ў гэтай хаце заўсёды ўсё вялося,
Добра елася і пілося.

Гаспадар падпальвае пасвет і ўсе, хто ў хаце, радзяць коміна каласкамі пшаніцы:

Ой, прыйшлі ночанькі доўгія,
Пасвяці наш камінку беляньκі,
Мы ж цябе кветкамі ўбралі,
Бервеночкам, рутай апаразалі.

Ну, а потым мы робім абыход вакруг каміна з песняй:

У нашага суседа,
У нашага суседа
Вяліка семейка.
Ой, люлі, люлі, вяліка семейка.

Вяліка семейка
Села вячэраці.
Ой, люлі, люлі, села вячэраці.

Шо і наш бацька,
Заўтра ва полечка едзе.
Ой, люлі, люлі, ва полечка едзе.

Ва полечка едзе
Жыта засеваці.
Ой, люлі, люлі, жыта засеваці.

А цяпер мы будзем
Коміна жаніці.
Ой, люлі, люлі, коміна жаніці.

Коміна жаніці, да й Бога прасіці.
Ой, люлі, люлі, да й Бога прасіці.

Урадзі ж ты, Божа, жыта
На новае лета.
Ой, люлі, люлі, на новае лета.

Жыта і пшаніцу на ўсяку пашніцу.
Ой, люлі, люлі, на ўсяку пашніцу.

Суседкі прыгаворваюць вакол коміна:

Праца наша – дзеўка чарненька,
Палюбіці коміна радзенька.
Мы ж цябе будзем жаніці,
Гарэлачку, мёд, піва піці.
Свяці ж, камінанька, ясненька.
Пабуджай жа Людачку раненька.
Жыці, прасці, ткаці маладым,
А падарачкі збірайце старым.

Зарадзі, Божа, на ўсякага долю,
Жыта, пшаніцу, ячмень як мятліцу.

Усе разам спяваюць песню:

Ой, за маім садом
Пшанічанька расце,
Радам жа авёс.

Радам жа авёс,
Не па праўдзе мілы,
Не па праўдзе любы
Са мною жывёш.

Як настане вечар, вечарок
Да другой, да другой ідзёш.

А мне, маладзенькай,
Па росту маленькай,
Жалю, жалю надаём.

Жалю надаём.
Пасаджу я вішню ў новых варотах,
Буду, буду паліваць.

Буду паліваць.
Ой, не раз садзіла,
Не раз палівала,
Не прымаецца.

Не прымаецца.
Любоў наша верна,
Верна, вернюсенька,
Розлу-розлучаецца.

Яшчэ жанчыны співаюць і такую песню:

Ой, парасці, кроне,
Ой, парасці, кроне,
По вушэй агарода,
По вушэй частакола.

Ой, не хадзі, стары,
Ой, не хадзі, стары,
Да мяне маладой,
Да мяне маладой.

Бо я цябе, стары,
Бо я цябе, стары,
З малых год не злюбіла,
З малых год не злюбіла.

Бо я твою хату,

Бо я твою хату,
Бур'яном закідвала,
Бур'яном закідвала.

Ой, прыхадзі, малады,
Ой, прыхадзі, малады,
Да мяне харошай,
Да мяне харошай.

Бо я цябе, малады,
Бо я цябе, малады,
З малых лет палюбіла,
З малых лет палюбіла.

Бо я твою хату,
Бо я твою хату,
Розамі ўкрашвала,
Розамі ўкрашвала.
Ой, парасці, кропе,
Ой, парасці, кропе,
Павышэй гарода,
Павышэй гарода.

Адна з суседак спявае песню:

Ой, засею я загон, да разгон,
Дайце мне сеўнічка не старога,
Дайце мне сеўнічка маладога,
Бо стары скажа: "Сей, пасевай",
А малады скажа: "Ты са мною погуляй",
Бо ў старога ў барадзе вошы,
А ў маладога ў кармане грошы.

Усе разам спяваем і гэту песню:

Ой, музыкі мае,
Заіграйце вы мне.
Вось тады я пагуляю
На сваёй старане.

Вось тады я пагуляю,
Як рыбанька па Дунаю,
Як рыбанька пагуляла,
Про мілого подумала.

Яшчэ рэчка не зышла,
Кажуць, што не тае.
Шчэ й свякрухі не бачыла,
Кажуць, што ліхая.

Ой, маці мая, любіць мяне Кузьма,
Як я з хаты, ён закляты,
Чапурушка мая.

А каб шчабятала
Ліхая гадзіна.
Чэраз тваё шчабятанне
Мяне маці біла.

Ой, казалі варагі,
Гаварылі людзі,
Што ў мяне маладой
Жаніха не будзе.

І жаніх у мяне е,
І кажух у мяне е.
Няхай маім варажэнькам
На пагібель ідзе.

Ой, казалі варагі,
Што мы тут не былі,
А мы тут. А мы там,
Да назло варагам.

Суседка звярталася да коміна з такімі словамі:

Каміночку, ты нам спагадай,
Кручу, ветры, буры праганяй.
Ды і сажу нясі варагам,
Свет, ахоту і радасць нясі нам.
Гаспадыня наша, паглядай,
Гарэлачку і мёд налівай.

Усе госці садзяцца за сталы і ў гэты момант адна з суседак загадвае загадку:

Тысяча брацікаў звязаны,
Адным поясам падпаразаны (сноп).

Ляцяць гускі, дубовыя паскі,

Ляцяць і гавораць: то-то я, то-то я.

Усе разам спяваюць песню:

Зайшоў, зайшоў месяц
За цёмную хмару.
Шукала матуля
Сваёй дочцы пару.

Шукала, шукала багатого сына,
А дочку кахае бедна сіраціна.

Дазволь, дазволь, маці,
З бедным пакахацца.
Не дазволю, доню,
Табе з бедным знацца.

Зайшоў, зайшоў месяц
За чорную хмару,
Не знайшла матуля
Сваёй дачцэ пару.

Пасля застолья танцуюць, загадваюць загадкі:

Канец ляжа, накід вяне.
На тым месцы горад стане (копы).

Ног шмат, а дамоў на спіне ідзе (барана).

Круціцца, верціцца, а ноччу павесіцца (цэп).

Добра мы жэнім коміна, здаецца, што нам Бог дапаможа, нашаму ўраджаю:

Да й арэ мілы край дарогі,
У яго волы крутарогі.
Гэй, шо, тр.., крутарогі.
Павесіў торбу на бярозе.
Гэй, шо тр.., на бярозе.
Да й шлі дзеўкі за грыбамі,
Гэй, шо тр.., за грыбамі.
Да ўзялі ў яго торбу ўкралі.
Гэй, шо тр.., торбу ўкралі.
Да не нішчымную, з пірагамі.
Гэй, шо тр.., з пірагамі.

*Запісана у в. Рычоў*
*ад Кавалевіч Кацярыны Васільеўны, 1930 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

Гэты абрад прыходзіць восенню. Па заканчэнні палявых работ начынаюць первы вечар запрадаць, паліць пасвет і пры лучыне прасці. Гэта ўсё рабілі ў абычнай сельскай хаце. У куце на сцяне вісела ікона з вышытым рушніком, у другім куце стаяў ложак, засланы посцілкай і падушкай. Пад абразамі – засланы стол з боханам хлеба. Побач са сталом стаяў услончык, каля сцен – лавы, каб было дзе сядзець. Пасярод хаты, бліжэй да сцяны, вісеў комін. Комін, абмазаны глінай і намалёванымі клеткамі, быў зроблены з мешкавіны. На коміне вісеў пасвет, пад пасветам вядро з вадой, куды падае жар ад згарэлай лучыны. Возле пасвета на ўслончыку сядзеў гаспадар і рубаў лучыну. Баба муча моўчкі пела песню:

Праду смукачу, спатонькі хочу.
Ой, схілю я галованьку, да й на сваю кудзеленьку,
Трошкі подрэмлю, трошкі подрэмлю.
Свёкор мой ідзе, як овод гудзе:
– Сонлівая, дрэмлівая, на работу ленівая
Невехна ў мяне, невехна ў мяне.
Батюхно ідзе, як голуб ідзе:
– Доня моя дорогая выйшла замуж молодая,
Не выспалася, не выспалася.

Прыходзілі жанчыны і спрашвалі разрашэнне ўвайсці жаніць комін, як гэта рабіласа кажды год. Усе жанчыны станавіліса колам кругам коміна. Гаспадарка ў сярэдзіне, каля пасвета з вадой свечанай у банцы. Кожная жонка ў руках дзяржала жменю лёну і, падымаючы угору, хваліласа, у каго большы. Адганялі нячыстую сілу ад коміна, каб не наводзіў порчы, абліваючы яго тры разы свечанай вадой і плюючы праз левае плячо, гаварылі: "Згінь, проподзі, ад нас адыдзі!". Потым жанчыне трэбы было пакласці лучыну на пасвет і прасіць у Бога ў добры час пачаць комін жаніць, пасвет паліць, запрадкі рабіць. Нявестай для коміна была праца. Прасілі здароўя ўсім на ўвесь вечар і на год, каб лянок папраць, красёнцы поткаць, сарочкі пашыць і панасіць. Патом абсыпалі комін зернем. Як пляцецца гарбузінне, каб так цягнуліся нітачкі на верацёна. На якую велічыню растуць гарбузы, каб такія былі клубкі, бо кажуць, гарбузы пораслі, як дзежы, то каб і клубкі такія вялікія былі, каб такі лянок высокі рос, як саношнік. Потым правяралі, якая спраўнейшая гаспадыня, паднімаўшы гэтыя зернеты, хто больш назбіраў. Потым рабілі заткало, гэта быў дар коміну. Выбіралі жанчыну, для гэтага, браўшыса за вілочкі рука паўз руку, якая з жанок паследняя браласа, тая і рабіла. Жонка сабірала ва ўсіх лён і круціла прыгаворваючы: "Як круціцца лянок у заткало, каб так віліса снапочкі на полі жыта і пшаніца, ячменю і лёну, каб было хлеба ўволю на кожнага долю".

У канцы абрада лажылі заткало на пасвет і прасілі Бога адвесці злое вока, каб ніхто не зурочыў, каб рукі не балелі, і пелі песню:

Дай, Божа, дай, Божа, дай, Божа,
Ужо мы дзело зрабілі,
Свайго коміна жэнілі,
Свайго коміна жэнілі,
Да й у Бога просілі:
– Зародзі, Божэ, ляночку,
Шоб напралі на едочку,
Каб на кожнаго долю
Да было ўсяго ў волю.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор'еўны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Калі первы раз паляць пасвет, то трэба абсыпаць комін семачкамі. Жонкі становяцца вакруг пасвета. Первая жонка гаварыла: "Благаславі, Божа, комін жаніць, первы раз пасвет паліць, каб усягда цяпло і святло було. Але і не карай нас, Божа, агнём. Дай нам, Божа, здароўейка, каб мы за зіму напралі лянок, наткалі красёнца. Зарадзі, Божа, лянку шаўкавістага, кудравістага і на сямейка багатага". Брала гарбузяныя семечкі і абсыпала комін. На якую высату ляцяць семечкі, каб на такую вышыню ляночак парос, як сыплюцца гэтыя семечкі, каб так сыпаліса ручайкі з нашых ручак. Патом выбіраюць жонку, каб заткала зрабіла. Усе рука паўз руку бяруцца на вілочнік, якая жонка пaverседняя возьмецца зверху, то тая і робіць заткала. Усе з жанок даюць жменю лёну на заткало. Тая, што робіць, збірае яго, круціць заткала і прыказвае: "Як верціцца лянок у заткало, каб так віліса снапочкі на полі жыта і пшаніца, ячменю і лёну, каб было хлеба ўволю на кожнага долю". Ложыць заткало на пасвет: "А зараз дай, Божа, у добры час пачаць прасці і адвярні, Божа, ад нас злое вока, каб нас ніхто не зурочыў, каб нашы ручкі не балелі". Хрысціцца і гаворыць: "Госпадзі-Божа, памажы і здароўем навязі!"

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

**Дзяды**

Людзі ўспаміналі пра сваіх продкаў, якім яны абавязаны жыццём. Цяпер яны адплачваюць доўг удзячнасці душам сваіх продкаў. У гонар іх памяці і спраўляюць свята Дзяды, памінанне продкаў.

Людзі верылі, што ў гэты дзень душы продкаў спускаюцца на зямлю, штоб паглядзець, як іх успамінаюць. Памінанне не дапускае ніякіх забаў.

К Дзядам гатовіліся зараней. Рыхтаваліся цэлы дзень. Гатовяць ежу, наводзяць чыстату і парадак у хаце і каля хаты. Праціралі абразы, завешвалі іх чыстым палаценцам, упрыгожвалі галінкамі хвоі.

На памінальную вячэру падавалася няпарная колькасць прысмакаў. Усё гэта была абрадавая ежа, кулінарные вырабы і напіткі: квас, медуху, сыту, студзенец, куццю і інш.

На гэта свята ўсе члены сям'і далжны быць у гэты дзень у роднай хаце. Святкаваць пачыналі ўвечары. Адзяваліся як на свята, стол засцілалі белым палатном. Гаспадар, а калі яго не было, то хто-нібудзь з старэйшых запальваў свечку і ставілі яе каля абразоў і чытаў малітву.

На стол, у атдзельную пасудзіну, ставілі ежу, а ў стакан налівалі гарэлку, бо верылі, што ў гэты час у хаце прысутнічае дух продкаў. Гэта быў для іх пачастунак. Есці пачыналі з куцці. Затым хто-нібудзь з старэйшых падымаў чарку, памінаў продкаў. За сталом ці то маўчалі, ці то ўспаміналі памёршых толькі добрым словам. За сталом сядзелі доўга. Стол на ноч не прыбіралі.

На другі дзень гаспадар і гаспадыня снедалі тым, што адкладвалі "дзядам". А ўсе астатнія члены сям'і снедаюць недаедзенай ежай.

***Запісана ў в. Поўчын***
***ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Это дзень памінання усопшых. Вечором усёй сям'ёй збіраюцца за стол і разом вечэраюць. Гатуюць посную еду. Обезательно должна буць сыта і каша. Усю еду надо похрысціць і адкласці ў отдзельную посудзіну. Эту еду потом отдаць курам. Колі садзяцца за стол, то зовуць усопшых. На другі дзень снедаць тожэ ўсе садзяцца разом і зноў одкладваюць еду, на другі дзень еда непосная. Нельзя, штоб у хаці быў кот.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Дзяды памінали перад Міхайлам. На Дзяды варылі вячэру посную з алеем, грыбамі, ці з рыбай боршч, кашу, кісель ці кампот. Пеклі пампушкі і мачалі ў размяты мак, каноплі ці чарніцы. Запальвалі свечку і маліліса богу. У шклянку злівалі па тры ложкі еж, якія былі на стале, і адстаўлялі далей для дзядоў. Пры памінках не палагаласа громка гаварыць і пець. Працаваць таксама нельга было. Да Дзядоў рыхтаваліся як да свята. Мылі пол і прыбіраліса ў хатах. Памінали дзядоў у пятніцу. У суботу варылі снеданне ўжо больш не поснае. Ежа была з мяса і былі бліны. Пасля ежы стол не прыбіралі, каб, калі прыдуць душы, стол не быў пусты. Успаміналі ўсіх родных і блізкіх. Гаварыць стараліся толькі харошае, хоць чалавек і не вельмі добры.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор'еўны,1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

# СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

## *Новак В.С. Традыцыі сямейнай абраднасці Жыткавіцкага раёна*

Сямейныя абрады, звычаі і песні суправаджалі чалавека на працягу самых важных этапаў у яго жыцці. Калі нараджалася немаўля, выконвалі ўсе неабходныя рытуалы радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, спадзеючыся, што такім чынам можна засцерагчы яго ад звышнатуральнага ўздзеяння розных шкодных сіл і забяспечыць яму ў будучым шчаслівае і багатае жыццё. Шлюбныя абрады, звычаі і песні былі скіраваны на засцярогу маладых і захаванне дабрабыту іх сям'і. У пахавальнай абраднасці і галашэннях знайшлі адлюстраванне народныя ўяўленні, звязаныя з культам продкаў, з верай у існаванне чалавека пасля смерці.

Засяродзім увагу на асобных структурных кампанентах радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу. Жыхары і сёння прытрымліваюцца прыкмет і павер'яў, звязаных з нараджэннем дзіцяці. Напрыклад, цяжарнай жанчыне забаранялася дакранацца да свайго твару, калі тая станавілася сведкай пажару (… еслі ўбачыш – гарыць агонь, яна замеціла, не нада хватацца за часткі цела …, палучаецца (у дзіцяці) пятно, такое краснае, наліўное крывёй пятно") (запісана ў в. Бялёў ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г.н.). Жанчына-парадзіха асцерагалася выконваць пэўныя віды работы ў святочныя дні: "Ну, еслі она беременная, у празнікі, якія празнікі ці малыя, ці большыя, ей не нада ні рэзаць, ні шыць, ні в'язаць" (запісана ў в. Азяраны ад Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.). Высокім у народзе быў аўтарытэт кумоў, якія павінны былі абавязкова прысутнічаць падчас абраду хрышчэння дзіцяці. Нельга было адмаўляцца, калі запрашалі на ролю кума і кумы: "Отказваць у гетом не трэба ніколі, бо своіх дзецей можэ не будзь, колі хросны(а) молодые" (запісана ў в. Малешаў ад Шаўчук К.С., 1931 г.н.).

З вялікай пашанай адносіліся да выбару бабкі-павітухі, бо яна "була ўжэ з самого рожэння, вона і забоцілас об малом, пока родна маці окрыяе трохі" (запісана ў в. Малешаў ад Шаўчук К.С., 1931 г.н.). Менавіта бабка-павітуха рыхтавала да хрэсьбіннага застолля абрадавую страву – кашу, гаршчок з якой разбівалі і раздавалі гасцям. Звычайна гэту пачэсную ролю выконваў той, хто пакладзе больш грошай на кашу: "Хто больш паложыць на кашу з кумоў, той і біў гаршок" (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.). Як і ў іншых раёнах Гомельскай вобласці, цырымонія раздачы бабінай кашы ў вёсках Жыткавіцкага раёна суправаджалася па-мясцоваму адметнымі дзеяннямі з чарапкамі ад разбітага гаршка, якім надавалася магічнае значэнне, з якімі звязвалі ўплыў на нараджэнне ў будучым дзіцяці: "Разбітыя кавалачкі горшчыка кідалі на падол маладым маладзіцам, каб у тых таксама скора былі радзіны" (запісана ў в. Дзякавічы ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г.н.); "Рэжуць кашу на кусочкі і кідаюць па людзях, а потым па кусочку даюць кожнаму, запіваюць, закусваюць і вылазяць з-за стала" (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.); "Кашу рэзалі на кусочкі і елі, а чэрэпкі з горшка кідалі молодым

молодзіцам на пелёнку, шоб рожалі дзяцей” (запісана ў в. Града ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.); “Як толькі кум разбіваў гаршчок з кашаю, бабка кідала чарапкі ад разбітага гаршчка і прыгаворвала: “Як хутка і бесперашкодна ляцяць гэтыя гаршчкі ад кута да парога, няхай будзе ў майго ўнука такой у жыцці дарога” (запісана ў в. Кольна ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.); “Білі горшчык і чэрэпкі клалі куме на галову. Калі яна была незамужняя, то ў той год пойдзе замуж” (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.); “А чэрэпкі этыя остаюцца, ну, бяруць этыя чэрэпкі, хто незамужні, кладуць на голову, або эты горшчок, што остаецца рыльцо, радом хто сядзіць молоды, то на голову поклодут, шоб быстро замуж ішоў, шоб богаты быў” (запісана ў в. Азяраны ад Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.). У некаторых вёсках хрэсьбіны завяршаліся адвозам бабкі-павітухі да магазіна: “А бабу самае, ужэ пабілі кашу, бабу садзілі ў якую каляску, а то ў балею і цягнулі яе до магазіна, эт самае, к магазіну, каб баба што-нібудзь там купіла” (запісана ў в. Бялёў ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г.н.). Строгае выкананне рытуалаў, звязаных з нараджэннем і хрышчэннем дзіцяці, лічылі, з’яўляецца важнай умовай пажадання шчасця і долі дзіцяці.

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя падчас праведзеных на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна экспедыцый, дазваляюць сцвярджаць, што вясельныя абрады, звычаі і песні ў параўнанні з іншымі жанрамі захоўваюць выключную ўстойлівасць бытавання. Зыходзячы з этнаграфічных апісанняў вясельных абрадаў і звычаяў, атрыманых у палявых экспедыцыях, можна рэканструяваць умоўную структуру вясельнага абраду. Адзначым, што асноўныя структурныя кампаненты вясельнай абраднасці – гэта сватанне, запоіны (змовіны, заручыны), “меранне сарачок”, каравайны абрад, пасад жаніха і нявесты, дзяльба каравая, паслявясельная частка (“Пірагі”, “Госці” і інш.).

Звернемся да фактычных матэрыялаў па давясельнаму перыяду вясельнай абраднасці, пачаткам якога з’ўлялася сватанне. Напрыклад, у в. Пухавічы, паводле сведчанняў жыхароў, у сваты выпраўлялася дзесяць – дванаццаць чалавек: “Прыходзіла ўся радня: бацько, маці, хросныя (бацько, маці), дзядзько, цётка, брат” (запісана ад Аліфяровіч Кацярыны Іванаўны, 1923 г.н.). Паміж сватамі адбываўся іншасказальны дыялог, з якога вынікала мэта прыходу бацькоў жаніха: “Прыходзяць у сваты к дзяўчыне і пытаюць:

– Ці можна зайсці ў хату?

А затым пытаюць таксама:

– Ці ў вас прадаецца цяліца?

Яны адказваюць:

– У нас не цяліца, а красная дзявіца. Мы яе не прадаём, а замуж аддаём” (запісана ў в. Хільчыцы ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.).

Звычайна падчас сватання адбываліся такія рытуалы, як адорванне сватоў падарункамі і падпярэзванне іх ручнікамі. Паводле ўспамінаў Мальвіны Рыгораўны Лоўгач, 1926 г.н., з в. Перароў, калі прыходзілі сваты, то не адразу выводзілі “сапраўдную” нявесту: “А дзеўка ў другой хаці, ховалі

ее. Ек прыежджаў молоды по дзеўку, то ее ховалі. Одзевалі дружку ў плацце белэ да показвалі ек невесту. Вукуп бралі да толькі потом показвалі молодую".

Заслугоўваюць увагі зафіксаваныя на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна звычаі, згодна з якімі, калі дзяўчына не давала згоды на шлюб, то клала "яму (жаніху) ў воз вараны гарбуз" (запісана ў в. Востранка ад Бандюк Ганны Аляксееўны, 1921 г.н.), "Калі дзеўка не хацела ісці за гэтага хлопца замуж, то яна лажыла яму ў воз вараны гарбуз" (запісана ў в. Людзяневічы ад Макарэвіч Марыі Аляксееўны, 1925 г.н.) або бацькі дзяўчыны гаварылі, што "яна яшчэ маладая" (запісана ў в. Сямурадцы ад Лой Ганны Пятроўны, 1952 г.н.), "Еслі давалі згоду, то садзіліса павячэраць, а не – то не. Тады падружкі дзеўкі надзявалі на хлопца гарохавы венок" (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.); "Ек не договораюцца, то сваты пірога і пляшку не несуць. Дзеўка назаўтра ці позаўтра относіць" (запісана ў в. Крэмнае Жыткавіцкага раёна ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.); калі дзяўчына "передумала, то вязе маладому хлеб, соль, гарэлку і рушнік, што прывозіў жаніх" (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.).

Калі дзяўчына пагаджалася выйсці замуж, то "збянтэжана калупала сухі мох паміж бярвеннямі ў сцяне" (запісана ў в. Любавічы ад Матарас С.П., 1912 г.н.); [1, с. 220]; маладая "прымала і пірог, і горэлку" (запісана ў в.Сяменча ад Кавальчук Варвары Паўлаўны, 1920 г.н.); запрашалі гасцей за стол: "А калі хлопец нравіўся дзяўчыне, а дзяўчына – хлопцу, то садзіліся за стол, елі, пілі" (запісана ў в. Востранка ад Бандзюк Ганны Аляксееўны, 1921 г.н. [1, с. 258]; "Бацька ставіць сваю пляшку і запрашае за стол" (запісана ў в. Буразь ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.); дзяўчына "дазваляе піць за яе і сама чуць выпівае" (запісана ў в. Вароніна ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.).

Запоіны як перадвясельны абрадавы этап адбываўся пасля сватання. Асноўныя рытуалы гэтага абрадавага моманту – пакрыванне галавы маладой хусткай з боку маці маладога і перавязванне ручнікамі родзічаў маладога: "На запоіны маці маладога нясе нявестцы ў падарунак хустку і накрывае маладую. Маладая перавязвае рушнікамі ўсіх родзічаў маладога, якія прыйшлі на запоіны" (запісана ў в. Буразь ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.). На запоінах у в. Вароніна, паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, замацоўвалася згода на шлюб, дзяўчына лічылася "засватанай, запітай" (запісана ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.). "П'юць у асноўным за здароўе маладых. Нявесце прэдлагаюць таксама выпіць. Тая адпівае чуць і ставіць стакан на стол. Сват ложыць туды некалькі манет. Дзяўчына гэту гарэлку з манетамі выливае на край хусткі, кланяецца свату, а яму ўзамен дае падарак. Падаркі даюцца і бацькам хлопца. Сваты ў час выпіўкі дагаворваліся аб дні заручын" (запісана ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.). У вясельнай абраднасці в. Сямурадцы вясельныя абрадавыя этапы запоіны і заручыны не вылучаліся асобна, былі арганічна паяднанымі. Прыходзілі на запоіны (заручыны) родзічы жаніха ў колькасці

20 чалавек. Паводле мясцовых вераванняў, калі нявеста першай убачыць жаніха, то будзе галоўнай у сям'і: "Нявеста хаваласа і выходзіла потым, каб першай убачыць свайго суджанага, каб потым быць гаспадыняй хаты і заўсёды верхаводзіць" (запісана ад Лой Ганны Пятроўны, 1952 г.н.). Калі завяршаліся запоіны (заручыны) у в. Буразь, то выконвалі песню:

На заручынах былі
Да гарэлачку пілі,
Гарэлачку салодзенькую
За Галечку молодзенькую (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.).

Адметным этапам у структуры вяселля на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна з'яўляецца такі абрад, як "меранне сарачок" ("меранне сарочак"), які адбываўся пасля запоін. Яго сутнасць заключалася ў тым, што напярэдадні вяселля маладая павінна была падрыхтаваць для маладога і яго бацькоў пэўныя падарункі: пашыць для маладога сарочку і вышыць сарочку для яго маці. Як правіла, у гэтым абрадзе сама маладая не ўдзельнічала. З гэтай мэтай "у дамоўлены дзень дзявочая радня (маці, хросная, братава жонка, сястра) адпраўляюцца "мераць сарочкі" да маладога. Іх сустракаюць бацькі маладога і вядуць у хату. Спачатку гасцей саджаюць за стол і частуць смачнымі стравамі, якія падрыхтавалі для іх. Пасля выпіўкі дзявочая радня прымаецца за свае справы. Яны пачынаюць здымаць мерку з сарачок маладога, якія трэба будзе пашыць маладой да вяселля са свайго палатна. Маці маладога таксама давала і сваю сарочку, каб будучая нявестка вышыла ў сарочцы каўнер, рукавы і падол. Уважліва аглядалі хату маладога, каб ведаць, колькі трэба ручнікоў, фіранак, шырм і інш. падрыхтаваць" [1, с. 222]. У в. Буразь падчас абраду "меранне сарочак" адбываўся адметны жартаўлівы звычай, які, паводле мясцовых вераванняў, меў пэўны магічны сэнс: "Пасля пачастункаў цешча з хроснай маці хапаюць маладога, ложаць у ночвы з падушкай і качаюць. Робяць гэта дзеля таго, каб малады заўсёды быў лагодны да маладой і цешчы, каб быў паслухмяны. Калі качаюць, могуць прыгаворваць, спяваць, жадаць лепшае долі" (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.). Паводле сведчанняў гэтага інфарманта, "перад вяселлем маладая павінна пашыць (разам з дружкай) маладому тры пары споднягa бялля, а свякрусе вышыць сарочку-перкалёўку" (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.). У в. Пагост гэты перадвясельны абрад быў вядомы пад назвай "прымярэнне сарочак": "Мералі маладога, абмяралі дзверы, окны, мералі, сколько рушнікоў трэба павесіць у хаце" (запісана ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.).

Завяршаюць давясельны перыяд заручыны, на якія запрашаюцца не толькі родзічы, але і іншыя вяскоўцы. Падчас заручын у в. Вароніна адбываліся рытуалы абменьвання пярсцёнкамі паміж маладымі і абменьвання падарункамі паміж бацькамі маладых: "На заручыны прыглашалі больш людзей, чым на запоіны. Усе яны былі сведкамі згоды з двух бакоў. Маладыя

абменьваліся кольцамі. … Бацькі хлопца і дзяўчыны абменьваліся падаркамі” (запісана ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.).

У сістэме вясельнай абраднасці Жыткавіцкага раёна, як і іншых раёнаў Гомельшчыны, важнае месца адводзілася каравайнаму абраду. Адзначым, што адметнасцю беларускай вясельнай абраднасці на тэрыторыі Гомельшчыны з’яўляецца менавіта каравайны абрад. “Сімволіка каравая – гэта перш за ўсё сімволіка хлеба, з якім было звязана ўсё жыццё селяніна. Таму і ў працы, і ў абрадах і звычаях, у песнях і іншых вуснапаэтычных творах хлеб (жыта) – важнейшы атрыбут і вобраз, боства, здольнае забяспечыць шчасце і дабрабыт чалавека” [2, с. 131]. У в. Ляхавічы Жыткавіцкага раёна “у суботу пякуць у хлопца каравай. Увечары ў дзеўкі пякуць каравай” (запісана ад Кур’яновіч Ніны Іванаўны, 1927 г.н.). Згодна з народнымі вераваннямі, у гэтай мясцовасці для падрыхтоўкі каравая забаранялася запрашаць жанчын-удоў (“Завуць жанку, каб не ўдава”), а таксама мясіць цеста (“Цеста разміналі”), “каб мужык не біў” (запісана ад Кур’яновіч Ніны Іванаўны, 1927 г.н.). Калі ўпрыгожвалі каравай, то ў в. Ляхавічы абавязкова з цеста рабілі “месяц”, каб забяспечыць доўгае сумеснае сямейнае жыццё: “На версе каравая пасадзілі месяц, касічку спляталі. Месяц – каб жылі ўмесце” (запісана ад Кур’яновіч Ніны Іванаўны, 1927 г.н.).

У мясцовай традыцыі в. Крэмнае было прынята, каб маладая асабіста запрашала на каравай. У гэтай цырымоніі ўдзельнічалі і яе дружкі, якія павінны былі адкрываць і закрываць дзверы перад маладой, калі яна заходзіла ў тую ці іншую хату: “Дзве дружкі з ёю шлі, старша – сперэду, а друга – ззаду. Шоб не молода дзверы отчыняла і зачыняла, а дружкі. Воны стояць коло порога, а молода борухаецца: “Прыдзіце на коровая” (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.). Калі ўжо прагучала з вуснаў маладой запрашэнне на каравай, то яе абавязкова хрысцілі і жадалі: “Шчасця, долю і век доўгі”, а іншы раз “котора кожухом накрые” (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.). Звычайна жанчыны, якіх запрасілі на каравай, прыносілі з сабою і муку, і яйкі, і масла: “Кажнэ нясе місу мукі, на муку дзве ейцэ ці кусок сала покладзе” (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.). Невыпадковым, як сведчаць тэксты каравайных песень, было прыгадванне ў іх змесце сімвалічнай лічбы “тры”:

Ніхто не ўгадае,
Шо ў нашом да каровай:
З трох нівок пшаніца,
З трох бочок мучыца,
З трох рэчок водзіца
І дзве кваскі масла,
А трэця доля шчасна (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.).

Сярод іншых рытуалаў мясцовай каравайнай абраднасці, якія адбываліся непасрэдна перад тым, як каравай паставіць у печ, варта назваць

наступныя: “хрышчэнне” сцен хаты (“Да хросна маці бярэ лопату, сцены ею хрысціць: на поўнач, у порозі другу (на поўдзень), дале з вокнамі трэйцю (на ўсход), дале чацвёртую (дзе печ)), насыпанне на хлебную лапату жыта і хмелю (“Шоб жытка ў молодых добра була, хмель – шоб дзеці вяліса”) (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.), “біццё” лапатай па галовах маладой і маладога, што павінна было паспрыяць дзетанараджэнню (“Да ўжэ молоду по голове лопатою тоею б’е, тры раз біла. І молодого білі. Б’е й прыказвае: “Дай, Бог, шчасця. А ека прыказвала: “Ето на сына, ето на дочку”. Да колькі разоў ударыць, то ето шоб столькі дзяцей у яе було” (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.). Відавочнай з’яўляецца магічная сутнасць гэтых рытуальных дзеянняў.

Вядома, што кожны этап падрыхтоўкі каравая суправаджаўся адпаведнымі песнямі, напрыклад, падчас выпечкі каравая ў в. Крэмнае выконвалі песню, у якой галоўны абрадавы хлеб персаніфікуецца:

Наша печ крокочэ,
Коровая хочэ,
А прыпечок коловаецца,
Коровая спадзеваецца.
А коровай ножкі гібле
Да до печонькі дзыбле (запісана ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.).

У змесце каравайных песень найбольш глыбока адлюстраваліся традыцыі народнай “смехавай культуры”. Жартамі, смехам, здзекамі, кпінамі і весялосцю імкнуліся засцерагчы сам працэс падрыхтоўкі каравая ад уздзеяння звышнатуральных сіл. Каравайныя песні можна ўспрымаць і як своеасаблівае папярэджанне не здзяйсняць тых дзеянняў, якія супярэчаць народнай маралі, шкодзяць лёсу маладых, а таксама як пажаданне ім быць дбайнымі гаспадарамі. Паводле сведчанняў жыхароў в. Навуць, у іх мясцовасці, “калі рабілі і пеклі каравай, то дзеўкі не сціхалі, увесь час спявалі” (запісана ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.). Як адзначылі жыхары в. Рычоў, звычайна ганаровае права рашчыняць каравай атрымлівала хросная маці маладой, шчаслівая ў сямейным жыцці: “Калі без пары, нельга, бо будзе нядоўгі і нешчаслівы шлюб” (запісана ад Рыдзецкай Г.Н., 1928 г.н., Рыдзецкай Г.Р., 1932 г.н.). Гэтых жа народных веранняў прытрымліваліся і ў в. Пухавічы: “Каравай можна було пекці толькі жэншчыне, екая добрэ жыве з мужам. Не дай, Бог, не дапускалі ўдаву пекці. Маладая дзеўчына не магла пекці каравая” (запісана ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.). У в. Людзяневічы, паводле ўспамінаў інфармантаў, рашчынялі каравай і ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты: “Прыходзіла хросная маці маладой і прыносіла з сабой дзяжу. Раніцай маладая ішла за сяброўкамі… Сколькі было жанчын, столькі звалі і мужчын. Хросную маці называлі старэйшай каравайніцай, пелі песню:

Ішлі і беглі каравайначкі
Цераз гару высокую.
Няслі муку пшанічную
І яйца курэй маладых.
Памыйце рукі беленька.
Замясіце каравай харашэнька” (запісана ад Макарэвіч Марыі Аляксееўны, 1925 г.н.).

Па сутнасці, як пацвердзілі жыхары в. Малешаў, вяселле пачынаецца з выпечкі каравая і яго ўпрыгожвання. Пасля выканання асноўных рытуалаў, звязаных з падрыхтоўкай каравая, у гэтай вёсцы было прынята публічна абвясціць аб тым, што “вяселле пачалося”: “У гэты час бацькі маладога пасылаюць дваіх гасцей да маладой з мукой і яйцамі з абвяшчэннем, што вяселле пачалося. Ад маладой таксама ідуць двое з абвяшчэннем вяселля. Іх там частуюць” (запісана ад Кошман Валянціны Міхайлаўны). Пасля таго як ужо рашчынілі каравай, свахі-каравайніцы мылі рукі, а гэту ваду вылівалі звычайна пад вішню і спявалі:

Ой, вісу, наш вісу,
Да налеймо воды ў місу,
Да памыймо ручанькі,
Да залеймо да на вішаньку.
Няхай вішанькі развіваюцца,
А маладыя насладжаюцца (запісана ў в. Хільчыцы ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.).

У в. Перароў, калі ўжо хросная маці рашчыніла цеста на каравай, то таксама выконвалі наступныя песенныя радкі:

Му свое дзело зробілі,
Коровая у печ усодзілі,
А тую воду пойдом ручкі муць
Да на вішэньку ліць (запісана ад Лоўгач Мальвіны Рыгораўны, 1926 г.н.).

Паводле сведчанняў жыхароў в. Кольна, у іх мясцовасці “ваду ж, у якой мылі рукі пасля замешвання каравая, неслі ўсе разам і вылівалі на вішню. Калі вылівалі, то гаварылі: “Наша маладая, як вішанька ў садочку” (запісана ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.).

Як адзначылі жыхары г.п. Тураў, трэба было, калі рыхтавалі печ да выпечкі каравая, тры разы падкладваць у яе дровы: “А ў печэ трэба на коровай тры раз закідваць дрова. Не по богато, але ж трэба, шоб було тры раз. Згорацъ, а дале зноў раз закінуць, згорацъ, зноў раз закінуць” (запісана ад Дамашкевіч Праскоўі Цярэнцьеўны, 1921 г.н.).

Дзяльба каравая як кульмінацыйны момант вясельнай абраднасці суправаджаўся шматлікімі вясельнымі пажаданнямі, у якіх знайшлі адлюстраванне жыццёвыя назіранні, высокія маральна-этычныя прынцыпы і філасофскія погляды нашых продкаў: “Перапіваю воўка, каб была жонка лоўка”, “Перапіваю кошэль длінны, коб до году былі родзіны”, “Перапіваю вам грошы, коб былі дзеці хорошы”, “Перапіваю вам зялёную рошчу, коб зяць пацалаваў цёшчу”, “Перапіваю вам куру-квактуху, коб молода поцэловала свякруху” (запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н., Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.).

Вялікае значэнне надавалі мясцовыя жыхары абраду вянчання. У в. Пухавічы “перад вянчаннем маці маладое благаслаўляе пару, каб засцерагчы ад злых духаў. Маладые кланяюцца ў ногі бацькам, дзякуюць ім” (запісана ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.). У в. Запясочча абрад вянчання адбываецца ў нядзелю: “Стояць молодыя ў цэркві перэд вянцом, і подходзіць старшы маршалок к молодой, расплетае косу. Затым ідуць молоды з молодою к іконі Спасіцеля, патом к іконі Божай мацеры, становуляцца на калені і тры разы поклоняюцца, цэлуюць іконы. Затым бацюшко закончыць службу, сцелюць рушнік коло прастола, кладуць грошы, абвязваюць бацюшку рушніком. Становяцца молодые ногамі на грошы, мічалка (гэта дзеўка з рукі маладога, якая на вянцы дзержыць свечкі – запісана ад Сакавай Ганны Іванаўны, 1927 г.н.) дае молодым свечкі, бярэ пярсцёнкі маладых, кладзе на місочку. Затым подае венец молодого маршалку, той бярэ платком, дружка бярэ платком і дзержаць над головамі. Помоліўшыса, тры разы абводзіць вокруг прастола, прытым молодые беруцца за рукі, а бацюшко платком звязвае” (запісана ад Русай М.І., 1939 г.н.). Пасля вянчання адбываліся пэўныя магічныя дзеянні з ручніком, якія сімвалізавалі надзеі сяброўак нявесты на хуткае замужжа: “Кончылоса венчанне, молода цягне рушнік до дзвярэй, каб дзеўкі ішлі замуж, не заседжваліся доўга” (запісана ў в. Запясочча ад Русай М.І., 1939 г.н.). Звычайна маладыя, пасля таго як павянчаліся, ехалі са сваёй раднёй кожны да сябе дадому, садзіліся разам з гасцямі за сталы, пры гэтым спявалі:

От венца, венца, Божого слоўца,
От Божого храма ў нядзельку рана
Пайшла дзевонька із венчанья,
Под каліною стала,
Ручанькі ломіць, слёзанькі роніць,
У Бога долечкі просіць яе.
Прыйшоў до яе бацюхно:
Чого, дочочко, плачаш?
Што самі маем, то і табе даём,
Долечкі не ўгадаеш (запісана ў в. Запясочча ад Русай М.І.).

У в. Рычоў абрад вянчання адбываўся на другі дзень пасля вясельнага застолля: “На галаву маладым надзяваліся венцы. Чыталіся малітвы.

Маладым звязваліся ручніком рукі, тройчы абводзіліся маладыя па кругу ў цэркві:

А мы ў цэркві бывалі,
Трое зелье відалі:
Однэе – рута,
Другое – мята,
А трэцяе – квеці,
Павянчаліся дзеці” (запісана ад Рыдзецкай Г.Н.,1928 г.н., Рыдзецкай Г.Р., 1932 г.н.).

У структуры вясельнай абраднасці Жыткавіцкага раёна вылучаўся і такі абрадавы этап, як зборная субота. Паводле ўспамінаў жыхароў в. Рычоў, у гэты дзень спачатку збіралі кветкі для вянка. Таксама ў гэты дзень плялі касу нявесце. Выконваліся ў зборную суботу песні:

Пасадзіла дзевачак усіх у рад,
Сама села вышэй усіх,
Скланіла галоўку ніжэй усіх” (запісана ад Рыдзецкай Г.Н., 1928 г.н., Рыдзецкай Г.Р., 1932 г.н.).

Заўважым, што кожны этап віцця вянка для маладой суправаджаўся адпаведнымі песнямі.

Важным абрадавым момантам вяселля з’яўляецца пасад, “адзін з самых старадаўніх вясельных абрадаў, саджэнне жаніха і нявесты на дзяжу, пакрытую вывернутым кажухом (пазней падушкай або ручніком). Абрад захаваў рэшткі язычніцкай рэлігіі старажытных славян: пакланенне культу хатняга ачага, духам продкаў, богу пладавітасці і земляробства” [3, с. 390].

Падчас вясельнага застолля ў в. Рычоў адбываўся сумесны пасад маладога і маладой: “Маладога і маладую садзілі за першы стол, перад гэтым палажыўшы падушку, пры гэтым спявалі:

Ой, ляцелі гусонькі
Цераз сад
Да гукнулі Надзеньку
На пасад.
Ой, чаго вам, гусонькі, ой, ето,
Ёсць у мяне мамонька
Для того.
Яна ж мяне хорошэнько
На посад посадзіць” (запісана ад Рыдзецкай Г.Н.,1928 г.н., Рыдзецкай Г.Р., 1932 г.н.).

Звязванне маладых ручніком – важны рытуал сумеснага пасада маладых. З гэтымі магічнымі дзеяннямі была звязана цікавая прыкмета аб

тым, хто будзе галоўным у сям'і: "Маладыя супраціўляліся, бо хто падчыніцца, той будзе падчыняцца ўсю жызнь" (запісана ў в. Рычоў ад Рыдзецкай Г.Н., Рыдзецкай Г.Р., 1932 г.н.).

Заслугоўвае ўвагі звычай сустрэчы дружыны маладога, напрыклад, у в. Навуць "калі дружына маладога пад'язжала да хаты маладой, то дзеўкі-сяброўкі беглі закрываць вароты, не пускалі іх. І толькі калі дружына перакідвала ў двор нявесты каравай, вароты адкрываліся, бо лічылі: увайшоў хлеб на двор, значыць, і яны (сваты) заступілі сюды" (запісана ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.). У в. Буразь прыезд дружыны жаніха да хаты нявесты, які быў вядомы пад назвай "поезд едзе да маладой", суправаджаўся песняй:

З-пад белага да бярэзнічку,
Сівы конік да выбягае,
Да не сам жэ ён бяжыць,
На ім Коленька сядзіць.
Он коніка да паганяе
І з конікам да размаўляе" (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.).

У в. Вароніна "калі пад'язджаюць да дому нявесты, вароты зачынены. Эту прэграду ім устройваюць хлопцы са стараны нявесты. Пачынаецца торг. Звычайна адкупліваюцца гарэлкай. Увайшоўшы ў двор, іх жджэ яшчэ адна прэграда, но ўжэ на гэты раз устрайваюць дзяўчыны, падругі маладой. З імі нялёгка справіцца. Ім даюць і грошы, і канфеты, і пірагі. Але дзяўчыны на гэтым не спыняліся. Яны прыдумлялі розныя заданні, якія павінен быў рабіць жэніх. Пасля ўсіх этых іспытанняў жэніх са сваімі суправаджальнымі маглі ўвайсці ў хату. Тут іх сустракалі бацькі нявесты з хлебам і соллю. Галоўнага свата і хлопцаў са стараны маладога, якія не былі жанатыя, маці нявесты перавязвала палаценцамі. Дзяўчыны чаплялі на адзежу, на грудзі хлопцам кветкі, якія самі зрабілі ў дзявочы вечар. Жаніху таксама прыкраплялі кветкі на адзенне і на шапку" (запісана ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.).

Паслявясельная частка ў вёсках Жыткавіцкага раёна вядома пад назвамі: "У прыданыя" (в. Ляхавічы), "Пярэзвы" (вв. Дуброва, Кольна), "Пірагі" (вв. Рычоў, Пагост, Запясочча, Старажоўцы), "Прыданыя", "Дзед на вяселлі" (в. Дзякавічы). Удзельнікі паслявясельнай цырымоніі ў розных вёсках Жыткавіцкага раёна ўзнаўлялі асобныя вясельныя абрадавыя этапы і звязаныя з імі рытуалы ў карнавальнай камічна-жартоўнай, іранічна-грубаватай форме з магічнай мэтай засцерагчы маладых ад уздзеяння звышнатуральных сіл, забяспечыць у будучым іх дзетанараджэнне. Адметны характар мела паслявясельная частка ў в. Дзякавічы. На "прыданых" рабілі спецыяльную ляльку, якую называлі "дзедам": "Мужчынскія штаны і сарочку набівалі саломай. У патрэбным месце прычаплялі два чырвоныя буракі і маркоўку, рабілі таксама ляльку. Сустракаючы прыданых, паказвалі тым ляльку і казалі: "Паглядзіце ж, сваточкі, што за дзіва! Ваша дачка мала

таго, што глухая, дык паглядзіце, якое ж дзіця за ноч нам нарадзіла!" Паказвае лялькy, якую зрабілі з самай раніцы. На варотах вешалі чучала дзеда. Прыданыя павінны сарваць гэтага дзеда і адвезці на печ гаспадыні вяселля. Сваты са стараны маладога не даюць магчымасці сарваць, і паміж прыданымі і раднёй маладога адбываецца спаборніцтва за дзеда. Падстаўныя жаніх і нявеста выконваюць сваю ролю, яны, размаляваныя, прывітаюць прыданых, абдымаючы і вымазваючы сватоў тым, чым намаляваныя самі. Потым, калі раздзеляць каравай, то бралі веко з дзежкі і астаткі каравая клалі на веко. Выносяць на вуліцу і частуюць дзяцей, якія стаяць на вуліцы" (запісана ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г.н., Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г.н.).

Прыведзеныя матэрыялы па вясельнай абраднасці аднаго з найбагацейшых па захаванні народнай спадчыны раёнаў Гомельскай вобласці з'яўляюцца яскравым пацвярджэннем высокага ўзроўню захаванасці ў народным жыцці і побыце прыкмет і павер'яў, звязаных з імі міфалагічных уяўленняў, якімі прасякнуты рытуалы розных абрадавых этапаў вясельнага абрадавага комплексу. Вясельная абраднасць і паэзія раёна вылучаецца непаўторным багаццем мясцовай спецыфікі, якая закранае структуру абраду, семантыку абрадавых дзеянняў і прадметнай атрыбутыкі, а таксама вярбальнае суправаджэнне. Несумненна, выяўленыя рэгіянальна-лакальныя асаблівасці вясельнай абраднасці ўзбагацяць агульнаэтнічную вясельную традыцыю.

Сціплыя звесткі запісаны ў палявых экспедыцыях пра пахавальную абраднасць і галашэнні. Што да прыкмет і павер'яў, то варта адзначыць, што і сёння многія з іх надзвычай актуальныя ў сучасным жыцці палешукоў. Напрыклад, невыпадкова запрашалі святара, калі паміраў чалавек, "для апошняй іспаведзі". Людзі лічылі, што ў гэтым выпадку душа без болю адыходзіць у вечнасць, калі "паміраючаму даць у рукі свечку, што гэта свечка асвятляе шлях на той свет" (запісана ў в. Поўчын ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.). Імкнуліся паслядоўна выканаць усе неабходныя абрадавыя моманты, звязаныя з пахаваннем чалавека, годна ўшанаваць памерлага. Своеасаблівым сімвалічным знакам смерці чалавека з'яўляліся галашэнні: "Бліжэйшыя з радні жанчыны пачыналі першыя галашэнні. Штоб пра смерць даведаліся аднавяскоўцы, выходзілі галасіць на вуліцу" (запісана ў в. Поўчын ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.). У в. Града своеасаблівым знакам, які сімвалізаваў смерць чалавека, з'яўляліся вывешаныя на вокнах ("ад вуліцы") ручнікі: "Колы ў нашым селе паміраў чоловек, то ў етой хаце вешаліся ручнікі на вокна ад вуліцы ці чорныя харугвы, якія ставіліся да сцяны з боку вуліцы" (запісана ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.). Як правіла, абмываць цела нябожчыка запрашалі чужых людзей: "Мыў усягда памёрлага чужы чалавек, у асноўным старыя жанчынкі" (запісана ў в. Кольна ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.). Забаранялася ў гэты час выконваць галашэнні. Паводле сведчанняў інфарманта, "на трэці, дзевяты і саракавы дзень пасля пахавання наведвалі магілку і плакалі, галасілі, але не так ужо сільна"

(запісана ў в. Кольна ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.). Тэксты галашэнняў, адрасаваных родным, адрозніваюцца імправізацыяй і высокай эмацыянальнай пачуццёвасцю, яскрава перадаюць унутраны стан людзей, якія страцілі блізкіх.

Такім чынам, прадстаўленыя ў кнізе фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы па сямейнай абраднасці адлюстроўваюць філасофію жыцця чалавека, пачынаючы ад яго нараджэння і завяршаючы адыходам у вечнасць.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

2. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 422 с.

3. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

**Радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні**

Во і родзілос малэ. После яго рожэння не трэба нічого-нічого даваць з хаты тры дня, ето для того, коб у хаці царыў покой, гетэ закрывало падход до сем’і і хазяйства тым, хто можэ навесці нячысту сілу і ўкрасці долю маленькага. Гетэ ж робілос, колі і хозяйство прыносіло прыплод.

Новорожанэ дзіцятко, колі ўносілі першы раз у хату, то клалі коло печы, там, дзе ложылі дрова, для того, шоб нечыста сіла побачыла з коміна, шо гето дрова і потом не прыставала до дзіцяці, так дзіця будзе спокойнэ і ешчэ дзіця, колі вырасце, будзе хозяйскім чоловеком. Потом дзіця клалі ў колыбель і вешалі над ім дзерэвянные цацкі з віду пташок ці жывёл, коб зашчыціць ад заговороў. Дзерэвянные пташкі вешалі на нітачцы на покуці, шоб зашчыціць. Лялькі, зробленыя з онуч, ставілі на вокна, оны булі заступнікамі од ночніц – злых духоў, екія мучаць малэ по ночам.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Шаўчук К. С., 1931 г.н.,***
***студэнткай Шаўчук Т.***

За дзень да хрысцін (а яны праводзіліся абавязкова ў нядзелю) бацька дзіцяці нёс у хату хросным бацькам і бабцы-павітусе хлеб-соль, завёрнутыя ў ручнік ці кавалак палатна, і запрашў на хрысціны. На другі дзень з самай раніцы прыходзілі хросныя бацькі і бабка-павітуха. Яны ішлі не з пустымі рукамі: хросная маці брала з сабой “мятліка” (такі падарунак, які потым зносіць дзіця), бацька хросны браў грошы, а бабка несла адзенне, у якое будзе апранацца дзіця ў царкве. Спачатку бабка мыла дзіця вадою з макам, апранала яго адзеннем, прыказваючы: “Як я цябе адзявала, так штоб вяселле даждала. Дай Бог табе гэтае адзенне знасіці і нам усім любым быці. Каб ты, мой унучак, рос да прыбываў, да каралём стаў. А зараз я цябе хрышчу,

перахрышчаю і да хроснай маці пасылаю” (у гэты момант аддае дзіця хроснай маці). Колісь да царквы ішлі пешку альбо ехалі на конях. У царкве праходзіў абрад хрышчэння дзіцяці. Хросная маці на працягу ўсяго абрада трымала дзіця на сваіх руках. Той мятлік, што брала хросная з сабою, патрэбен толькі ў царкве. Калі дзіця хрысцілі і аблівалі свячонай вадою, мятлікам выціралі і аддавалі маці дзіцяці, каб тая абавязкова адзявала яго на дзіця. За хрышчэнне дзіцяці плаціў грошы хросны бацька і купляў крэшчык. Калі вярталіся з царквы, то ў хаце гаспадароў чакалі астатнія госці. За стол і на покуць садзілі бабку-павітуху, а за ёй кумаўя. Выпівалі першую чарку за бацькоў дзіцяці і дзіця. За сталом гаварылі, жартавалі, прыказвалі. Самым галоўным у гэтым застоллі была бабіна каша. Перад тым, як разбіць горшчык з бабінай кашай, яго патрэбна было выкупіць. Выбіралі сярод прысутных самага гаварлівага і жартаўлівага чалавека, які быў шчоччыкам (лічыў, на якую суму пакладзе на горшчык з кашай кум, кума, баба). Клалі на горшчык не ўсё сразу, а паступова, а лічыльнік лічыў. Заўжды рабілі на канцы так, каб каша была кумава. І ён разбіваў гаршок з бабінай кашай. Лічыльнік назначаў суму за бабіну кашу і абавязкова плацілі бабі за яе кашу. Разбітыя кавалачкі горшчыка кідалі на падол маладым маладзіцам, каб у тых таксама скора былі радзіны. На хрысцінах спявалі, танцавалі, жартавалі. Разыходзіліся госці аж за поўнач.

З хрысцінамі, як і з усякімі абрадамі, якія ідуць з чалавекам, звязаны розныя забабоны. Напрыклад, маці забаранялася ўваходзіць у царкву ў момант хрышчэння. Лічылася, што пасля хрышчэння дзіця становіцца спакайней, лепш спіць. І як пройдуць хрысціны, такі будзе лёс у дзіцяці.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўны, 1936 г.н.,***
***Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Спачатку бралі бабу суджану, кумоў любленых. Да хрэсьбін баба носіць прынос (варыць абедкі) унучцы (дзіцяцінай маці), носіць тры дні. А на трэці дзень яна робіць зліўкі: бярэ тры каласкі, ваду і кідае туды капейку, потым падыходзіць к унучцы і мажа каласкамі рукі зверху. А ўнука рукамі праводзіць па вачах і грудзях, каб малако прыбывала. Гэту ваду баба вылівае ў покуці на пол. Дзеці ўцягаюць сабе капейку.

Прывязуць дзіця к кресту (штоб не памерло), хрысцяць, прывозяць яго дамоў і робяць хрэсьбіны.

Бабу з дзедам садзяць на покуці, каля іх садзяць кумоў. Выпіваюць, закусваюць. Потым ставяць боршч і кашу, якую абвешваюцьь цукеркамі. Калі варылі кашу, дык навараць яец і ў кашу кідаюць, і моцна салодзяць.

Даюць падаркі бабе, дзеду, кумам і б’юць гаршок аб край стала, гаворачы: “Раз, два, тры”. А на трэці раз разбівалі. Хто больш паложыць на кашу з кумоў, той і біў гаршок. Астатнія ніякіх падаркаў не лажылі. Кумы плацілі бабе за горшык. Вярхушку кашы давалі ўнучцы, каб малако

прыбывала. Рэжуць кашу на кусочкі і кідаюць па людзях, а потым па кусочку даюць кожнаму, запіваюць, закусваюць і вылазяць з-за стала.

Калі хрэсьбіны праводзіліся зімою, дык бабу садзілі на санкі, калі летам – на возік. Мужыкі вазілі яе, пакуль яна не ўпадзе. Потым усе расходзіліся.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

Малэ трохі подростае і робіліс хрысціны. Бацькі малого вубіралі хросных, а баба була ўжэ з самого рожэння, вона і забоцілас об малом, пока родна маці окрыяе трохі. Бацько ішоў з хлебам-соллю ў хату і до кума, і до кумы. Просіў іх охрысціць его дзіця. Отказваць у гетом не трэба ніколі, бо своіх дзецей можэ не будзь, колі хросные молодые. Потом ідзе до бабы і ешчэ раз просіць бабу об помошчы. Баба прыходзіць перэд хрысцінамі (перэд тым, ек ехаць у цэркву), купае малэ, а колі ўваходзіць у хату, то сразу ж ідзе до колыбелі, ложыць туды грошы і прыгаворвае: “А дай, Божа, етаму дзіцяці ўсякую долю ўзяці: і хлебовую, і солевую, трэцюю – здоровенькую”. Говорыць, шо малэ нехорошы і плюе тры раза ўбок. Тут она доўжна его пакупаць і одзець нову одзежу. Баба гатовіць воду малому і говорыць, шоб он чуў, шо ў водзе: “Во, мой дорогі, каб ты буў хорошы і чысты я добаўлю чыстоцелу, а коб спаў добрэ – горбацу”. Тут она доўжна вуняць немоўля з колыбелі і купаць прыгаварвая: “Бог у воду, (імя) у воду”. У канцы купання: “Бог з воды, (імя) з воды”. Выціраючы і одзеючы малэ, вона говорыць: “Да сон, дрэмучкі ў вочэнькі, а здоровьечко ў плечыкі. Да Прачыста Божа Маці будзе вашэ дзіцятко годоваці”. Потом прыходзяць кумоўя, і баба отдае дзіцятко куму, прыгаворвая: “Наце вам дзіця нарожанэ, а прынясіце хрышчонэ”. Кумаўя ехалі ў цэркву, а дома готовіліса до прыходу госцей. Кумоўя верналіс з хрышчоным дзіцям, і ўжэ ўсе празнуюць. Спеваюць песні “Ой, кумка мая”, “Ой вы, госці мае”, “Рыкнула коровонька”. Ужэ пры концэ баба выносіць кашу. Каша – гето самэ глаўнэ на хрысцінах. Баба ставіць на стол кашу і говорыць: “Годзі, Божэ, хлеб, кладзі, Божэ, статок целяток на валу, дзеток на полу”. Тут доўжны ўсе госці отдаць подаркі, і кум з кумою начынают торговацца. У рэзультаці кум ўсегда выкупае, але ж хоць і кума дасць больш, то ўжэ по закону кум б’е кашу. Кашу дзеляць, і ўсе расходзяцца. Маці і бацько малого даюць подаркі куму, куме і бабі. У подарку ўсегда доўжна буць буханка печаного хлеба.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Шаўчук К.С., 1931 г.н.,***
***студэнткай Шаўчук Т.***

Жанчына, якая павінна народзіць, звалась парадзелья. На хресьбіны звалі блізкіх, бабку, якая перевязывала пуповіну, кума і куму. Парадзелья і яе муж звалі гасцей за стол.

Наварожденнаму дзіцяці жадалі здароў'я, каб доўга жыў і г.д. У концы застолья падавалі кашу. Кашу варыла бабка-павітуха з пшана ў гліняным гаршку. Кашу перакупалі. Наіболей давал грошай кум (кресны бацька дзіцяці). Хто болей дал, той і кашу дзяліў. Гаршок з кашай разбівалі аб стол. Раздаваў усім удзельнікам перакупу па куску кашы. Грошы аддаваліся парадзелы.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

Кум разам з кумой, аддаючы дзіця бацьку пасля вяртання з царквы:

– Наце ваша раджонае, а наша хрышчонае. Судзіў Бог бачыць пад крастом, судзі, Божа, бачыць пад вянцом.

Як бабка ставіць гаршчок кашы на стол:

– Ну, гаспада, госці дарагія. Прасілі вас на хлеб, на соль, вось прашу і на бабіну кашу, прашу пакласці па чырвонцу.

Бабка, атрымаўшы падарунак ад парадзіхі:

– Дзякуй, унучка і ўнучак, за падаркі і піражок. Каб мой унучак, а ваш сынок вялікі рос і вяселлем трос.

Няхай Гаспод гадуе да долю гатуе. Дай, Божа, прыждаць ды вяселле гуляць.

Дай жа, Божа, на жыццё, на быццё, на добрае здароўе, на доўгі век.

Каб свой розум і навука далі сыну сілу ў рукі.

Кумаўство – не вялікае сватаўство.
Як не кум, то да кумы не падладжвайся.
Кума звяла з вума.
Кума ад кума без гума.
То не кума, што з кумам не піла.
Што радзіцца, усё згадзіцца.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Акуліч Валянціны Міхайлаўны, 1917 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Як ражалоса дзіця, звалі бабу. Выбіралі такую, каб тры дні насіла есці на абед, снеданне, вячэру. На трэці дзень баба пякла яечню, пампушкі, боршч, кашу варыла і кісель. Бабу гэту частавалі добра, каб дзіця было здаровым. На трэці дзень былі зліўкі, на іх звалі 3 пары кумоў. Але хросных на зліўкі не звалі. Былі толькі бацькі і баба. За сталом на зліўках спявалі песні.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

За дзень до хрысцін (а оны спраўляюцца толькі ў недзелю) бацькі дзіцяці несуць у хату хросным бацькам і бабцы хлеб-соль, заматаныя ў рушнік ці кусок полотна, і кажуць, у колькі поедуць коньмі ў цэркаў хрысціць дзіця. З самого ранку прыходзіла бабка-павітуха і купала дзіцятко, одзевала его ў цэркву. Прыходзілі хросные бацько і маці. Бацько хросны браў з собою грошы, а маці хросная брала подарок для дзіцяці і «мятлік». Бабка, одзеваўшы дзіця, прыказвала: «Як я цебе одзевала, шоб так веселья дождала», «Дай Бог тобе гэтэе одзенье зносіці і нам усім любым буці», «Шоб ты, мой унучок, рос, подростаў да королём стаў». Хросна маці забірала дзіця і ехалі ў цэркаў хрысціць. После цэрквы прыязджалі дамоў і там ужэ ждалі ўсе прыглашонные на хрысціны. За стол на покуці садзілі бабку і хросных, прыказваючы і смеючыся. После частовання вуносілі бабіну кашу, на которую клалі кум з кумою по очэрэдзі подаркі і «шчотчык» (самы шутлівы на хрысцінах) счытаў, хто ж з іх троіх больш положыў на кашу. Клалі на горшок не ўсе зразу, а по очэрэдзі, і «шчотчык» доўжэн буў у жартоўнай формі пошчытаць так, шоб каша стала кумава. Тогды кум бярэ горшок з кашаю і розбівае об край стола. Кашу рэзалі на кусочкі і елі, а чэрэпкі з горшка кідалі молодым молодзіцам на пелёнку, шоб рожалі дзяцей. Доўга гулялі, спявалі, танцовалі і росходзіліса по домам аж за поўнач.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Перад тым, як ехаць у храм, дзіця купалі, апраналі ў новае, выключна белага колеру, адзенне, перавязвалі чырвоным поясам, а затым бацька тройчы па сонцы абносіў дзіця вакол стала, каб яно любіла бацькоў і родную хату. Затым дзіця передавалі хросным бацькам са словамі: «Бярыце нехрышчонае, а прывязіце пасвячонае». Пакуль кумы былі ў храме, бацькі, бабуля-пупарэзніца і іншыя члены сям'і накрывалі сталы для святочнага застолля. У гэты час збіраліся госці – род дзіцяці. Кожны з іх прыносіў падарункі: дзіцячае адзенне, цацкі. Прысуд кумоў чакалі з хваляваннем, бо па традыцыі імя дзіцяці павінен даць святар. І таму, перш чым кум уваходзіць у хату, называе бацькам імя іх дзіцяці. Калі кумы вяртаюцца з царквы, уваходзяць у хату і прыгаворваюць: «Наце ваша народжанае, а наша хрышчонае». Маці бярэ дзіця і ложыць у калыску. Першую чарку падымалі за новага члена роду і мо імя і гавораць: «Дай Бог, каб наш Іванка шчаслівы рос». Многа жартаў выказвалася таксама на другім застоллі ў адрас бацькоў, кумоў, бабулі. Потым падавалі кашу. Яна называлася бабінай кашай. Бабіна каша – гэта рытуальная страва, якая варылася як ахвяравальная ежа багам. Варыла такую кашу бабуля-пупарэзніца. Яе варылі з прасяных круп, дабаўлялі цукар, масла, малако. Каша павінна быць жоўтая, як сонейка. Перад тым, як падаць кашу, закручываюць на чатыры ўглы і ставяць на сярэдзіну стала. Потым ішоў торг, хто больш падорыць грошай за кашу, той і б'е яе. Абычай такі: кум гаворыць: «А сколькі стоіць бабіна каша?» Бабуля адказвае: «Мая каша з канапелькамі». Як толькі кум разбіваў гаршчок з

кашаю, бабка кідала чарапкі ад разбітага гаршка і прыгаворвала: «Як хутка і бесперашкодна ляцяць гэтыя гаршчкі ад кута да парога, няхай будзе ў майго ўнука такой у жыцці дарога». Баба рэзала сваю кашу на кавалачкі і раздавала ўсім прысутным, і яны выказвалі шматлікія зычэнні ў адрас нававароджанага: «Дай Бог, каб наша дзіця было крэпка, як вада, багата, як зямля, і красна, як вясна!» На хрэсьбінах бацькі давалі падарункі бабе і кумам. Ні адных хрэсьбін не абыходзілася без песен і танцаў. На развітанне пелі песню:

Запрагайце, запрагайце
Да дванаццаць валоў.
Адвязіце, адвязіце
Дый бабулю дамоў.
Запрагайце, запрагайце
Да дванаццаць сабак.
Адвязіце, адвязіце
Вы кумоў у кабак.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Пяшэвіч Я.***

Калі ражала жэншчына, то звалі бабку-повітуху і роды прынімалі дома. Дома остоваліса толькі рожэніца, повітуха і бабы, якія помогалі. Повітуха сама отрэзала пуповіну і завязвала яе. На другі дзень баба (павітуха) прыходзіла муць дзіцятко, ужэ наварыць горшчык компоту да прынясе ўнуццы. Обмуваць обезацельно трэба було, потому што это шчытаецца як бу ты его вубросіла на двор, но Бог его пудыме і ён его сам обмуе. А сомой обмуваць нельзя. А еслі ты не обмула его, то это шчытай, як ты яго вубросіла на поле. Калі жэншчына рожала, то трэба було, штоб людзей менш знало, штоб рожалоса легчэ.

Хрысціць везлі хросные бацко і маці, а родные бацько і маці оставаліса дома. Робілі отведкі і хрэсьбіны. Отведкі – это колі прыходзілі отведаць рожэніцу. А хрэсьбіны – это ўжэ покрысцілі дзіця і ўжэ кашу б’юць, і хто выкупе кашу, той і хросны бацько. Білі горшчык і чэрэпкі клалі куме на галову. Калі яна была незамужняя, то яна ў той год пойдзе замуж.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Як вязуць дзіця ў цэркву, то як мальчык, ложаць сякеру, каб быў плотнік, дзевачцы – кніжку, каб была вучоная. Баба-пупорэзная даўжна помыць дзіця, то лажаць деньгі под голоўку, гэта пасля хрэшчэння. Бяруць аднаго кума і адну куму, оны толькі одныя для ўсіх дзецей. Едуць у цэркву, пасля цэрквы сядающь за стол. Калі застолье, спяваюць песню первоначально:

Сосна на бок похілілаca,
Дэй кума з кумом посварыласа,
Зашо ж оны посворыліса,
Ці за яблуко свячонае,
Ці за дзіцетко за хрышчонае,
Ці за яблуко свячонае,
Ці за дзіцетко за хрышчонае.

Як застолье ў самым разгары, то кум з кумою сорэўнуюцца. Усе прысуствуюшчые слухаюць у дзецкой колысцы. Кум, кума, хто далікатней? Яны ў калыскі і хто лепей правядзе забаву або ігры, хто лепей паразлякае дзіця. Каго прысуствуючшые познаюць победзіцелем, таго носяць на руках, катаюць на санках узімку, а прайграўшага, каб не бачыў, мажуць сажаю. Б'юць кашу, а потым ігры, танцы бесконечно.

***Запісана ў в. Вараніно***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

– Ой, ты, кум, куманёк,
Чыні сваю волю.
– Ой, хадзем, паскачэм,
Гайдучка з табою.

Кацярына, кума мая,
А ў гародзе свіння твая.
Няхай рые, хоць начуе,
Бо салодкі корань чуе.

Кацілася, валілася
Калодачка з печы,
Ой, пабіла калодачка
Бабулечцы плечы.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Акуліч Валянціны Міхайлаўны, 1917 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Ды нашая Ганначка ў палозе ляжала,
Ды захацелася ёй вішнёвага соку.
– Ды пазавіце Ванечку з току,
Хай ён прынясе мне вішнёвага соку.
– Ек на сына, то буду старацца,
А на дачушку – няхай выбачае.
– У нашом у садзе ўсе роўныя кветкі,
Сынкі, дачушкі – ўсе роўныя дзеткі.

***

А хто ў нас ды па ночцы ходзіць,
А хто ж у нас ды бабульку просіць:
– Бабулечка мая, галубачка мая,
Прыдзі ж ты ко мне, ды к моёй жане.
У моей жаны жыватоқ баліць,
Жыватоқ баліць, усю сярэдзіну ломіць.
– Унучак ты мой, галубочак мой,
Не журыся ж ты, каго Божа дасць.
Як сын – то пісаці будзе,
Як дачка – то вышываці будзе.
Як сын – малявана калыбелька,
Як дачка – лубяная каробачка.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Карась Валянціны Ігнатаўны, 1919 г.н.,***
***Кулеш Настассі Ігнатаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Стоіць хата на помосці,
Едзе сястра к брату ў госці.
Ховай, жонко, хлеб со стола,
Едзе ў госці сястра моя,
А сестрыца гэтэ ўчула,
Назад коня повернула.
Не журыса, мой броточку,
Я не еду обедаці,
А я еду отведаці.

***

Пупорэзная бобусенька
На покуцьі зажурыласа.
Яе каша не ўвопрэла,
А помпушкі сучка з'ела,
А кум седзіць усміхаецца,
Яе кашы дожыдаецца.

***Запісана ў в. Буразі***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Ну, када зацяжарыла жэншчына, эт самае, тады і яна сразу сябе пачуствавала, што яна носіць пад сабой, пад серцэм дзіця. Многа што ёй не дазвалялася рабіць. Эт самае, галоўнае, што яна не магла ніколі ўдарыць кошку. Кошку нагой яна нікагда не магла ўдарыць, патаму што эта сільна быў вялікі грэх. Яшчэ было эта такое самае, што еслі ўбачыш – гарыць агонь, яна замеціла, не нада хватацца за часткі цела, эт самае, ілі за ліцо бывае, ілі за

што-небудзь хватацца, еслі ана схвацілася, іспуду палучаецца, там, эт самае, палучаецца пятно, такое краснае, наліўное крывёй пятно. Но яно ў некаторых праходзіць, у некаторых застаецца пажызненна.

Баба-павітуха ўсегда купала першы раз дзіця, калі жанчыну прывозілі, эт самае, із бальніцы, але раней ражалі, эт самае, дома, значыць, першую, што звалі, эта бабу-павітуху, каторая, эт самае, яна бывала мо прымала і роды, еслі самае што бывае трудные, яна астаецца і за бабу-павітуху, і яна купае дзіця, і тады ўжо самае её ўсё.

Калі дзіця нарадзілася сённі, значыць, яе прывезлі із бальніцы і раньше дома ражалісь, значыць, тады ўвечары прыходзілі ў вотведкі, называлісь такіе. Баба тады гатавала, эт самае, боршч, гатовіла кашу, сарокі, яешню пякла і так і родзічы ўсе збіраліся. Сарокі –эта такіе бліны (аладушкі), каторые мачалі ў смятану, а інагда мачалі, эт самае, ў алей і з сахару. Колісь у алей, эт самае, сахар падсыпалі, разбівалі і мяшалі гэтыя аладушкі. Раньше не было як цяпер жа ж, гатавалі самі. Эта ўсё самае было: квас, эт самае, варыла, кашу варыла і кампот. Эта абавязкова рабіла баба-павітуха. Яна прыходзіла ў госці. Ну і родзічы, каторыя ішлі, яны ўсягда неслі з сабой, такія бралі хусткі звязвалі: тарэлка на тарэлку. Хто кісель варыў, хто, эт сама, халадзец варыў, там бліны пеклі, эт самае, ну ўсё што маглі дома, рыбу жарылі, катлеты, хто што мог зрабіць і так звязвалі: тарэлку паставілі ў хустачку, тарэлкай накрылі, апяць –тарэлку паставілі, тарэлкай накрылі, і так во штукі тры звязалі, такімі во авоськамі ішлі ўсягда. Эта ўсягда так было.

Ну, а хросных выбіралі хто як: хто радню выбіраў, хто можа ідзе да таго, хто яму дапамог у трудную мінуту, палучалась так, эт самае. Эта цяпер выбіраюць багатых хросных, а тады ж не, тады проста, самае, і саседку ілі сяброўку з дзетства. Еслі дзеці памерлі, то ўжэ ту самую хросную маці не бралі, бралі ўжэ другую. Вот у нас так самае, а на Тураўшчыне, так там бяруць дзве маці хросныя. І стараліся ў нас браць адну хросную маці, шоб была, бываюць і такія.

Баба самае пякла ўсягда кашу, як былі самае радзіны. А еслі ў вотведы ідуць людзі самі, хто там радня, там кума, там сястра, ані ішлі ў вотведкі самі, ніхто іх не зваў на вотведкі, а ўжэ на радзіны, эт самае, пахрэсцілі, эт самае, дзіця, вот тады самае зноў тады збіраюцца радзіны, вот тады самае ўжэ яны прыглашаюць людзей. І баба, тады тожэ. Баба варыць самае кашу і бярэ яшчэ варыць боршч, ну тож усё варыць, ставіць усё ў каробку і нясе да ўнучкі, шчытай самае, на радзіны. Эту кашу, эт самае, біў той, хто больш паложыць грошай на кашу: “Ну, цяпер будам біць!” Там пілі, спявалі, усё на свеце, елі: “Ну, а цяпер будам біць бабіну кашу!” Бабіна каша ўсягда была ў горшчыку, у гліняным горшчыку, штобы её можна было разбіць. Ну, эт самае, тады яны ішлі па кругу, вот першы там горшчык, абвязаны канфетамі, так можна было павесіць лентачку, так канфет навешае, абавяжа горлышка, самае, штобы красівы быў горшчык. І вот пайшла па кругу така каша. Хто больш, вот ідзе: “Вася – пяць рублей бабіна каша, бабіна каша сем рублей!” Хто больш і ідудь, ідуць, ідуць, эт самае, і, шчытай, хто больш палажыў грошай, той б’е бабіну кашу. Ну, цяпер стараецца бабіну кашу пабіць кум, а

тады было, хто больш грошай. Вот кашу самае разбілі, эт самае, хто больш грошай, ён бярэ кашу аб край самае стала і ўсё, рассыпаюцца этыя шчэпкі, каторыя ляцяць, і кажды стараецца: “Вот табе шчэпка, каб ты радзіў!” Там кладут, каб дзіця радзілася. Няма ў вас дзяцей – вазьмі і пакладзі пад падушку, і дзеці ў вас будут тожа. І раздавалі эту кашу самае ўсім на тарэлачкі, і ўсе елі эту кашу. Кашы падманнай не было.

Абрадавых песень не было, спявалі песні – адзін зацянуў, гарманіст зайграў, а недзе так спявалі. Выходзяць на вуліцу, паспяваюць, патанцуюць і зноў у хату.

А бабу самае, ужэ пабілі кашу, бабу садзілі ў якую каляску, а то ў балею і ўжэ цягнулі яе до магазіна, эт самае, к магазіну, каб баба што-нібудзь там купіла. Яе вязуць па вуліцы, самае, спяваюць, мужыкі цягнуць, а бабы ззаді, і бабы бягуць за імі, цягнуць эту бабу до магазіна ў каляске то легчэ, на санках, але ўжо як у балеі цягнуць! Але цягнуць, заязджаюць у магазін, танцуюць перад бабай, купляе там ўжэ выпіўку.

Лажыліса не толькі грошы, лажыліса, эт самае, раней мацер’ял на пелёнкі, тожэ палзуны лажылі там, хто касцюмчыка цяпер там, хто што. І жадалі, штобы і здаровы быў, і ў армію пашоў, і зашчышчаў, ну ўсё, еслі то хлопчык, эт самае, быў”.

*Запісана ў в. Бялёў*
*ад Макарэвіч Кацярыны Мікалаеўны, 1954 г.н.,*
*дырэктара СДК,*
*студэнткай Рэшанок А.*

“Ну, еслі она беременная, у празнікі, якія празнікі ці малыя, ці большыя, ей не нада ні рэзаць, ні шыць, ні в’язаць – нічэго этого делаць, і дажэ поднімаць не нада, ёй не давалі ўжэ, абычна што тогда мяшкі. Она должна сохраніць рэбёнка, не давалі делаць нічога.

Ну, рожала она дома, тогда ж не было акушэраў. Я сама раділа ўсе троя дома. Бабу зовуць, бабу-повітуху. Вот такія бабы і ўжэ старыя, оні ўжэ эту пуповіну ту зав’яжуць, уберуць усе. Эта ўжэ бабка шчыталас новорождённого, ето яе ўнукі.

Бабку выбіраюць по нраві кажды. От не так, што от узяў ды, а хто нравіца, ті родственіца яка. Прыбягаюць ужо ж, молодая як думае рожаць, дак прыходзяць: “Ходзіце к нам на роды”. Ужэ бабка бярэ пялёнкі две, ці што там, і прыходзіць. А ўжэ на трэйцій дзень бабка готовіць, эта сама котора ўбрала ўсё, кашу варыць, пампухі пячэ, яйца, што мае, варэнне ў кошэль, тоды ж, карзіны цяпер, тоды кошэлі большыя булі. І кладзе ўсё эта ў кошэль, і ідзе ў вотведкі. Прянясе ўжэ яна, ужэ ўгошчае ўсех. І бабку садзят за стол, угошчаюць. Вот так. Жэншчыны толька ў вотведкі ходзілі.

Первый раз купае дзіця бабка ета, которая пуповіну зав’язвола, обязацельно кладуць кольцо золотое ці золото ў воду обязацельно і купаюць маленьке. Для того, шоб золото шоб было, шоб ў малого было, усягда было достаток і золото. Да кладуць і цяпер.

Ну, а кумоў собяруць, ужэ мужык і жонка сядзяць ужэ раяцца: кого нам узяць за кума? Кого за куму? Я, напрымер, свою подругу бяру, он бярэ мужык з мужыком, хто яму нравіца.

Ну, і ўжо проходзіць врэмя, бувае месяц, некоторые две недзелі, а то бывае і два месяцы, ужэ строяцца, крэпне малыш, сама жэншчынка окрэпне і бяруць кумоў, нясуць пірогі одному і другому, жэншчыне і мужчыне, і кажуць от: ”За куму к нам, мы хочам”. Усё, яна прыходзіць, мятліка, кажуць нясе. Это на пелёнкі што-небудзь обязацельно, шоб ці распашонку якую, шоб етому маленькому дзіцятку обязацельно, шоб яго ілі пелянaлі ў етыя пялёнкі, ілі распашонку надзелі. На крэсту поп крэсціць эты, кладуць на маленького. Ну, і от пакрысцілі, прыехалі ўжэ, выпілі, пообедалі, ужэ назначаюць, калі хрэсьбіны будуць.

Ужэ хрэсьбіны роб'яць мо чэрэз месяц ці там. Ужэ ззываюць родню, кума ета і кума ўжэ говораць ім. І кума готовіцца, усе подаркі бярэ. Баба собе, і от хрэсьбіны ідуць. Е така тамада, выбіраюць, шо ходзіць с тарэлкою, і кладуць грошы ўсе, і он шчытае: хто больш положыць, того каша, той будзе біць кашу. Ну, так от стараюцца. Баба кладзе, наклала ўсяго, кажуць: “Бабіна каша”, – перавышае, кум кладзе грошы, пошчыталі –ужэ “кумава каша”, бо кум больш положыў, кума кладзе – пошчыталі ўсяго, што яна там кладзе. Яна кладзе і покрывала можэ, і мужыку рубашку, і этому дзіцятку і обуві, і одзежу, і курткі – усё, што есць. Шчытаюць усе, тамада шчытае, што стоіць і сколькі ўсяго это будзе, і от ужэ “куміна каша”, – говорыць. Кум зноў кладзе грошы, ужэ кум поклаў грошы – “кумава каша”. Тут баба ўмае з-за пазухі шчэ чаго-то, кладзе – ужэ “бабіна каша”, а куму ж стыдно, шо не поб'е кашу, да баба, кум зноў кладзе, і так могуць цэлы час класці ўсе і шчытаць, хто сколькі больш положыць. Ну, і обычно кум б'е кашу, того кума выцадзяць, о! Ну,ужэ кум побіў кашу, ужэ на столы кашу ўсім на тарэлочкі поклалі, надо ж покоштоваць: ці яка яна, ці смачная ці. Ужэ о выпілі на кашу і расходзяцца ўжэ. А чэрэпкі этыя остаюцца, ну, бяруць этыя чэрэпкі, хто незамужні, кладуць на голову, або эты горшчок, што остоецца рыльцо, радом хто сядзіць молоды, то на голову поклодут, шоб быстро замуж ішоў, шоб богаты быў.

У нас бабу не возілі, усе за столом робіцца.

Ну, жадалі, шоб здоровы рос, шоб рос і прыбываў, шоб багаты буў, шчаслівы, шоб рос на радосць родітелям. Прыказвалі ўсе хорошае”.

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Рэшанок А.***

## ЗЛІЎКІ

Коліся, калі не было бальніцы і радзільных домоў на вёсцы, то да парадзіхі гукалі бабку-павітуху. Бабку выбірала маці маладых. Выбірала багатую і знатную на вёсцы жонку, бо бабка парадзісе насіла тры дні обеды. Малады бацька браў хлеб і бёг па бабку, калі раждаласа дзіця. Бабцы трэба было завязаць пупок дзіцяці. Калі бабка прыносіла прынос з обедом, то бабцы давалі чарку гарэлкі так як усім. На трэці дзень рабілі зліўкі, і бабка

больш не будзе насіць прынос. Кумы выбіраліса ў гэты дзень. Каго выбраць, гаварыла маць. Глядзелі, каб больш заможных, ці так паважаных людзей. На другі дзень малады бацька вечарам разносіў па хатах, у якіх жылі кумы, хлеб. Клаў на стол і гаварыў: “Я хачу ўзяць вашага сына за кума, ці дачку за куму”. Калі былі згодны, то хапалі хлеб і хутка кусалі, каб хутка гаварыла малое дзіця. А калі былі не згодны, то хлеб аддавалі назад. На зліўках дзіця не хрысцілі, а дамаўляліся, калі будуць. Звалі на зліўкі толькі блізкіх. Гэта бацька з маці, браты, сёстры, кумы. Кума несла мятлік куме, а дзіцяці пад галаву клалі грошы, капейкі, бо на малое не разрашаласа глядзець голым вокам. Малое закрывалі полагам, ад людскога вока, бо е такія вочы, ад якіх малое не спіць, а крычыць. Бабка-павітуха несла паследні обед да парадзіхі, боршч з грыбамі, кашу з яечняй, пампушкі і кісель. Падаркаў на зліўкі не давалі, і не дарылі. Пеласа песня “Спорыкнула корованька” на вуліцы.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор’еўны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

Калі хрысцілі дзіця, то выбіралі кума і куму. Кумам выбіраў бацько дзіцяці свайго добра знаёмага друга, а куму – жонка, сваю сяброўку. Гэта маглі быць і родныя браты і сёстры. На хрысціны баба пячэ кашу-пшонку ў печы, у гліняным гаршку. Украшае яе канфетамі. На хрысцінах каша выкупаецца кумам ці кумою. Хто больш дасць падаркаў і грошай, гэта часцей кум. Гаршчок з кашай разбіваецца аб вугал стала і даецца ўсім прысутствуюшчым за сталом на спрабаванне. А кускі разбітага гаршка трэба раскідаць на ўсіх незамужніх дзявок, каб быстрэй замуж выйшлі. Яны гэтыя кускі гаршка забіраюць дадому і храняць у сябе.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ганны Ільінічны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## Вяселле

Хлопец, які рашыў жаніцца на дзяўчыне, прыходзіў з самага начала ў сваты. Прыходзіла ўся радня: бацько, маці, брат, сястра, дзядзька, хросныя (маці і бацько).

–Добры вечар, ці туды мы зайшлі?

–А к каму вам трэба? Што будзеце купляць?

–Гэту дзеўку.

–Просім за стол, госцейкі!

За сталом была ўсякая еда, а гарэлку прыносілі сваты. Молодая дае кожному подарок. Бацькоў молодого падпаразаюць ручнікамі. Назначаюць дзень вяселля. Калі будуць гуляць. Потым цэлы вечар гуляюць, песні пяюць.

У суботу перад вяселлем пеклі каравай. Каравай пеклі некалькі замужніх жанчын. Самая глаўная – маці хросная. Пелі песні, скакалі, каб

каравай добры ўдаўся. Пасля таго, як каравай ужо гатовы, яго прыгожа ўбіраюць і нясуць стаўляць вячэру.

У нядзельку рана пачыналася вяселле (вячэра). Калі прыязджаў малады са сваёю дружынай, брат маладое падводзіў маладу да маладога.

Усе частуюцца і збіраюцца ехаць на вянчанне. Перад вянчаннем маці маладое благаслаўляе пару (каб засцерагчы ад злых духаў). Маладые кланяюцца ў ногі бацькам, дзякуюць ім. Маці абходзіла вясельны картэж тры разы, абсыпаючы ўсіх зернем. Пасля вянчання бацькі сустракаюць маладых хлебам-соллю. Гэтым зычылі яны маладым шчасця, добрай долі, багацця.

Малады должэн быў перанесці маладу цераз парог, бо парог – мяжа паміж смерцю і жыццём. І пасля гэтага цэлы дзень гуляюць вяселле ў хаце маладой.

Пад вечар дзеляць каравай. Каравай дзеліць дружок (з радні маладога) са словамі: “Благаславі, бацько і маці, караваю подаці! (3 разы)”. А бацькі далжны адказаць: “Хай Бог благославіць!”.

Маладым дараць грошы, падаркі, жадаюць усяго доброго.

Пасля таго, як падзеляць каравай, забіраюць маладую і яе пасцель (падушкі, пакрывала, одзеяло) і вязуць на вазу ў хату маладога.

Прыехалі госці, зайшлі ў хату маладога, садзяцца і частуюцца. Маладой здымаюць вянок, завязваюць хустку. Робіць гэта свякруха, прыгаварывая: “Была дзявіцаю, цяпер стала маладзіцаю”. Госці гуляюць цэлы вечар. У гэты час дзеліцца каравай для гасцей маладога. Пасля таго, як падзялілі каравай, госці расходзяцца.

Пасля вяселля

Калі праходзіць тыдзень пасля вяселля, радня маладое едзе да маладога пабачыць, як жывецца іх дзяўчыне.

Там ізноў пачынаецца гулянка.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.,***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

У суботу прыходзяць сваты, каб пагаварыць. Прыходзілі ўтрох або чатыры чалавекі: бацька хросны, бацька жаніха, брат ці сястрын мужык.

На заўтрашні дзень прыходзілі з гарэлкаю. Дзеўка збірае ўсю радню. Падвязваюць сватоў ручнікамі. Дагаворваюцца, калі свадзьба. Музыка грае да вечару. Спявалі такія песні, хто якую пачне.

У суботу пякуць у хлопца каравай. Увечары ў дзеўкі пякуць каравай. Завуць жанку, каб не ўдава. Калі каравайніца ідзе, то бярэ місачку і 2-3 яечкі. Цеста разміналі, а не мясілі (каб мужык не біў).

У печ дровы падкідваюць, ждуць гарманіста. Становяць стала, дзежку. Наверсе каравая пасадзілі месяц, касічку сплялі. Месяц – каб жылі ўмесце. Спяваюць песні:

Караваю, мой раю!

Я ля цябе хораша іграю.
Каравай мой жытны,
Спяклі цябе па-мужыцку.
Караваю мой грэцкі,
Спяклі цябе па-шляхецкі.

Цераз мора да глыбокае,
Цераз мора шырокае
Шлі каравайнічкі,
Няслі муку пшанічную,
Бралі воду крынічную.

Ганіна маці да па сеначках ходзіць,
Да суседачак просіць.
Да суседачкі мілыя,
Да прыходзьце ка мне,
Да к маему дзіцяці,
Каравай саджаці.

Сколькі каравайніц, столько і піражкоў маленькіх у печ накідваюць.

Спяклі каравай, садзяцца за стол. Вячэраюць. Потым усе пайшлі ў клуб гуляць. Танцуюць, гуляюць.

Рана ў нядзельку хлопец і дзеўка прыглашаюць сваю радню, кожны асобна. Хлопец з дзеўкай дагаворваюцца, колькі дружак прыглашаць, каб кожнаму хапіла.

Дружкі ўкрашаюць нявесту, плятуць вянок нявесце. Дзеўкі ёлачку радзяць. На галаву надзявалі вянок, марлю, брыжыкі розныя рабілі такія.

Хлопцава радня сабралася ў хлопца. Маці саджае мужыкоў, дружкоў паўз маладога. За маладым саджае маці хросную. Запрашаюць “пастуха”, надзяюць торбу, кладуць туды 2-3 пірагі. Ён вядзе свадзьбу.

Прыйшлі к дзеўцы. Выносяць і становяць стол у варотах. Сустракаюць маладога з яго раднёю. Выпілі, патаргаваліса, пусцілі ў двор. Упусцілі ў двор, яны становяцца так, як маці саджала за сталамі.

Брат маладое бярэ яе за руку. Дружкі нявесты ідуць устрачаць дружкоў маладога. Кожная дружка чапляе цвяткі.

Прыйшлі дружкі і паселі на лаве, і малада з імі.

Малады стаіць на дварэ, дружкі прыходзяць у хату і купляюць места для маладога. Калі сцягнуць тухлі ў нявесты – заходзьце так, бясплатна.

Малады не должэн сесці на покутнай лаве (на покутнай лаве ложаць пакойніка). Пяюць песні, дзеўкі ругаюць хлапцоў:

Ой, у большага дружка
Да паршывая ручка.
І з кармана не вымае,
Сваіх дружак не вітае.

Свахі ругаюць дзявок:

Ой, у большае дружкі
Цыцкі, як падушкі.
Аднае парася ўбіла,
А другою асмаліла.

Паабедалі, спяваюць песні:

Клянова да лісцінaчка,
Да чаго ж ты таненькая.
Ты ж і дзерава высокага,
І коранямі каранiстага.

Маладая Ганначка,
Да чаго ж ты да маленькая.
Ты ж і роду вялікага,
Да бацюхны да багатага.
Чырвона каліна весь луг
Украсіла калінамі, да малінамі,
Чырвонымі журавінамі.

Каціласся сонейка з горкі,
Прасілася дзеванька
З цэрквы дамоўкі:
“Вязі мяне, дзе ўзяў,
Бо на мне вяночак завяў,
А на мне вяночак завяне,
А на мяне, матачка, ён гляне.”

Паігралі, патанцавалі. “Пастух” запрашае абменьвацца пірагамі. Ён дае два, а яму – чатыры.

Саджаюць хлопцаву радню. Брат маладой бярэ за руку маладую і даводзіць да маладога. Брат прашчаецца з ёю. Яна прашчаецца з усімі дружкамі. Садзіцца радам з маладым. Спяваюць песні, жанкі плачуць:

Ой, сонейка заходзіць
Брат сястрыцу заводзіць,
А сястрыца ўпіраецца
І к брацейку пакланяецца.
–Чым я, братко, надакучыла
Ці расою, ці касою,
Ці сваёю красатою?
Ой, сястрыца мая мілая,

Ты ж мне не надакучыла,
А надакучылі добрыя людзі,
У суботу прыязджаючы,
У нядзелю ад’язджаючы.

Ідуць, нясуць каравай. Гавораць: “Благаславі, оцец, маці, каравай падымаці!”

Маці атвечае:“Бог благаславіць (3 разы).”

Каравайніцы спраўляюць гарэлку, бо не падымаецца каравай. Потым гавораць: “Благаславі, маці, каравай рэзаць.”

Маці гаворыць: “Бог благаславіць (3 разы).”

Рэжуць каравай на малыя кусочкі, кідаюць уверх: “На дзяшовы хлеб.”

Маладая сядзіць з боку маладога. Маладой даюць платка, каб лажыць тое, што дарацаь. У свата талерка, абвязаная платком. Сыплюць жыта.

Першых вызываюць бацькоў маладых, потым хроснага бацьку і ўсю радню.

Падзялілі каравай. Маці маладой знімае вянок у нявесты і павязвае ёй сваю хустку.

Звязваюць у кухар пасцель. Выбіраюць пяць пасцельніц.

Выводзяць на вуліцу маладога з маладзэ. Яны дзержацца за рукі. Маці маладой становіць правую ногу на калясо воза. Маладыя становяцца спачатку на калясо, потым у воз.

Камяная печачка
Вечар гарыць ды не вугорыць
І камяня не распаліць.
Маладая Ганначка вечар сядзіць,
Не заплача,
Сваёй маткі не разжаліць:
“Ой, разжалю сваю матачку
У нядзелю вечарынкаю,
Із застойлейка ідучы,
Дабранач даючы.”
Ой, дабранач, ды ўсім нанач,
А дабры тыдзень на ўвесь тыдзень.
Ой, па табе матка плача,
Што ложачкі да не мутыя,
Стояць яны да пад лаўкаю,
Заросшыя мураўкаю.
Стояць яны пад прыпечкам,
Заросшыя ракітнікам.
Стояць яны на паліцы,
Няма ж маёй памутніцы.

Едуць. Прыязджаюць да хлопца. Дружкі купляюць у “кубельніка” пасцель. Маладыя ідуць да дзвярэй. Іх сустракае маці маладога ў кажусе, вывернутым шэрсцю ўверх:

Не пужайся, Ганначка,
Што чужая маці
Вывернула кажуха,
Ды стала пужаці.

Стаіць стол. На стале хлеб, у стакане мёд і ложачка. Маці паманьвае маладых, потым дае. Усе ідуць за стол. Радня маладых ідзе ў прыданыя. Жанкі гавораць: “Эй, хадзем у прыданыя!” Іх прыглашаюць за сталы.

Адчыняй, матка, лецён,
Бо на тыя жоўтыя лаўкі
Ды пасядуць прыданкі.
Ды паселі ўсе прыданкі,
Што пагнуліся лаўкі.
Ой, не так увагнуцца,
Як гарэлкі нап’юцца.

Так ужо п’юць, гуляюць у хаце жаніха.

У панядзелак радню маладэе прыглашаюць у пярэзаў. Маладую не запрашаюць. Нявесту не пускаюць усю нядзелю.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Кур’яновіч Ніны Іванаўны, 1927 г.н.,***
***(раней пражывала ў в. Ляхавічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Бойка Н.***

Жэняцца тады, калі між сабой дагаворацца маладыя. Яны знакомяцца, гуляюць, вырашаюць между сабой, а патом гаворáць бацькам. Патом малады з бацькам выбіраюць дзень і едуць да маладой і яе бацькоў. Яны бяруць з сабой хлеб, соль, гарэлку, рушнік. Прыходзяць у хату і таргуюцца. На заручынах дагаварваюцца пра дзень вяселля. Маладая выносіць маладому рушнік з хлебам і сольsuccessfully. Пасля праз нядзелю маладая з бацькамі едзе да маладога. Калі маладая передумала, то вязе маладому хлеб, соль, гарэлку і рушнік, што прыводзіў жаніх.

Вяселле начынаецца ў суботу. Пякуць каравай, пячэ яго хросная маці. Яна, перад тым, як ставіць яго ў печ кажа: – “Блаславі, ацец і маці”. – “Бог блаславіць!”

І так тры разы. Потым малады з караваем едзе да маладой. Па дарозі да маладой яму загароджваюць дарогу. Калі малады прыязджае да нявесты, адбываецца выкуп. Патом маці вядзе маладых за стол. Маладых садзяць на вугал. Справа каля маладога садзіцца нявеста, а за ёй дружкі і сваякі, а злева ад маладога – яго дружкі і сваякі. Бацькі наліваюць гарэлку, бласлаўляюць

маладых, усе крычаць "горка". Нявеста кідае цукеркі. Госці ядзяць, спяваюць песні. Пасля доўгага гуляння сват нясе каравай і перад тым, як паставіць на стол, пытае ў бацькоў тры разы: "Блаславі, ацец і маці і добрыя людзі, каравай дзяліць!" Бацькі адказваюць тры разы: "Бог блаславіць!"

Потым дзеляць каравай. Маладым дораць грошы, жадаюць шчасця, долі, любві. Калі каравай астаецца, яго завязваюць у хустку і аддаюць музыканту. Патом пачынаюць з сватоў, спяваюць песні, скачуць. Маладая ў гэты час рыхтуецца ў дарогу, збірае прыданае. Маці маладой садзіцца на прыданае і трэбуе з маладога выкуп. Малады бярэ маладую за руку і старшая свацця вядзе іх тры разы возле кутняга стала. Госці становяцца парамі, сколькі ў хаце дзвярэй і дзержаць над сабой хлеб, пакуль не пройдуць маладыя. Маладая бярэ хлеб у ручнік, каб патом пакласці ў маладога. Хросная маці вядзе маладых да машыны, а родная маці бярэ вядро вады і абходзіць машыну тры разы і лье ваду пад машыну. Па дарозе маладых спыняюць. Калі пад'яжджаюць да маладога, маладая сыпле ў бакі канфеты. Маці выносіць хлеб з мёдам і віном. Патом маці вядзе маладых у хату. Калі ідуць цераз парог, маладая сыпле жыта па хаце і кладзе хлеб. Усе садзяцца за стол і працягваюць гуляць вяселле: п'юць, ядзяць, спяваюць, бласлаўляюць маладых і дзеляць каравай, як і ў маладой. Як падзялілі каравай, маці маладога здымае ў нявесткі вянок і завязвае ёй сваю хустку, а маладая завязвае сваю хустку свякрусе. Госці спяваюць песні і вяселле цягнецца два дні. Праз нядзелю госці збіраюцца зноў – на пярэзвы, каб праведаць маладых. Тут зноў весяляцца, садзяцца за стол, спяваюць і танцуюць.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Сваты

Колісь маці дочцэ посля дваццаці годоў казала: "Ты мне ўжэ не семя'нін". У пост не гулялі вяселляў, на масленай нядзелі – не і ў пятровіцу – не. Само на Троіцу – чотыры святых дні. Уполету, на Петра, навек рабілі вяселле, на жніва. От Роздва до Крэшчэння – не. Которые хочуць жэніцца, то ек Крышчэнне да з цэркву пойдуць ці коньмі поедуць на Ёрдань, дзе воду свецяць. Дзеўкі поўхорошваные стануць на беразі, бераг вусокі. А хлопцы на лёду, коло крэста вугледаюць. Да вугледзяць, да ўжэ ідуць у сваты. Ек святое воды коўценуць, послі крэшчэнне.

У нядзелю ходзілі. Йдзе вон, маці й бацько, і хросных шчэ беруць. Бацько пірога несе ў вереньцы, а то і ў торбі. Обматаны рушніком пірог. І пляшку гарэлкі ці квасу несе. У хату заходзяць да: "Дзень добры. Прышлі к вам куповаць цялушку". А хатніе отказваюць: "Е цялушка маленька. Таку, мо, не й захочэце". А тыя: "Чого? Дзеўка е ў вас? Ек на дзелечко охочая да оддасце, то годоваціме". А хатніе: "Е дзеўка ў нас, глядзіце. Ек нравіцца (ек хороша вам), то седаймо да поговорэмо". Такое шо-небудзь кажуць, сядаюць за стол, да ўжэ договораюцца.

Путалі ж і дзеўкі, ці пойдзе. От ек договораюцца, то тые кажуць: “Цяпер ужэ наша дзеўка”. Да вуп’юць з тое пляшкі кажнэ по чарцы, да пірогом тым закусяць. Да пойдуць сваты з хлопцэм. Шо останецца, на поліцу ставяць. З некім другім разом шчэ вуп’юць да закусяць. Ек не договораюцца, то сваты пірога і пляшку не несуць. Дзеўка назаўтра ці позаўтра относіць. Ці ека друга дзеўка.

Пры нашых дзедох не ходзілі молодые ў сваты. Ек у другом селе дзеўка, то вона не знае, за кого йдзе, а той не ведае, кого бярэ. Прывядуць молодого на запоіны, не знае, котора молода. Его не путалі і дзеўкі не путалі.

Заручыны

А ўжэ ў ту суботу ўвечар у ее запоіны. Запівалі дзеўку. Людзей не багато було, роднейшые которые. Да хросные, да старшы маршалок, старша дружка. Сталоў тры-чатыры ўсіх. Зноў і з пірогом, і з гарэлкою йдуць. Занесуць яе больш, у пляшках, ці ў барылі, ето ж запоіны. І кусок сала неслі. Его гарэлка перва, ее потом.

Молоды коло молодое садзіўса. Песён багато спявалі, только не вясельные. Молода дарыла наметкамі, полотном. Сама ткала к вяселлю. Полотно, полотно, полотно колісь давалі! Колісь краму етого не було. Вон буў, але ж не було грошай яго купіць.

Ек расходзіліса, то спевалі:

На заручынках булі
Да гарэлачку пілі.
Гарэлачка солодзенька,
А дзевочка молодзенька.

Дружкі прыдуць на запоіны, помераюць молодого да ой – цэлы тыдзень шыюць! Трэ ж нашыць п’яцеро сорочок да п’яцеро штаноў, сподне. Да дзежаўку, да шчэ, мо, і перкалёву ж сорочку. Молода сама нашывала на пазухі, коўнерыкі, чохлы.

Венка молодой робілі. Скруцяць дроціну. З бумагі ўсякого цвету шышкі зробяць да на яе чэпляюць. Ленты чырвоные, вішнёвые, голубовые. Навешаюць. Бувало, дроціну з шышкамі куповалі готову. Да багато дзевок пользуюцца. А ленты свое вешалі. Дружкі вешалі.

Колісь дзяк з Пасекі жонку браў да ў капліцы погоцкой венчаўса. То на ёй венок з цветочкамі, як на церну. І лісцейко зелёнэ і белэ, больш ніякого.

Молодого маці з госцінцэм ходзіла к молодой серэд тыжня. Ето ўжэ у чацвер ці ў п’ятніцу, проці вяселля. Пірога рушніком обмотае. Шчэ там якого м’яса зварыць, рыбу ці шо ўжэ там. Холоднэ, пампушок спечэ. І молодой несе, на плаце мо. А та ўжэ свойго подарка дасць – намітку ці полотна отрэжэ.

У п’ятніцу строяцца кажнэ к своёй беседзі. Варацць, пякуць. П’ятніца-почынальніца, казалі.

## У суботу-каравайніцу

А субота – ето ўжэ каравайніца. Коровай пякуць. На Тройцу то первого дня пеклі, у нядзелю, а так – у суботу ўвечар, перэд нядзелею. От поснедаюць, сонцэ трохі вушэй, да старша коровайніца прыдзе. Росчыніць у дзежцы да домоў пойдзе. Жытнім расчынялі. Упорану – не, прокісне ж до вечора. Ек не ўдова, то хросна маці за старшу коровайніцу.

Под вечор молода по хатах, трэ ж на коровая і на вяселле позваць. Ек ідзе на Тройцу, людзей на селе, то ўсіх борухатаецца. Дзве дружкі з ёю шлі, старша – зперэду, а друга – ззаду. Шоб не молода дзверы отчыняла й зачыняла, а дружкі. Воны стояць коло порога, а молода подыйдзе, дай борухаецца: "Прыдзеце на коровая". А та ўжэ хрысціць ладонею: "Шчасце, долю і век доўгі". Котора кожухом накрые. Наборухаецца. На вяселле звала, то не борухаталаса, і не хрысцілі яе. Сусед на коровая звала з кажное хаты, своіх і так екіх жонок. Дзевок – не. І от молодого звалі дружкі, вона не йшла ў его хату. К ёму на коровая мо сястра е, мо хто там, дзеўкі звалі. Вон не ходзіў.

От подояць короў, устрояцца, да ўжэ на коровая йдуць. Сонейко на нізу, як у полету. І ўдову шлі, ек звала, только воны коровая не пеклі. От его к ёй прыдуць там брацiха, сястра да ўжэ к ёму от ее йдуць, прытаманые которые. Кажнэ нясе місу мукі, на муку дзве ейцэ ці кусок сала покладзе.

Старша коровайніца месіць пшанічным. Сыроводкі ў цесто, яец, шчэ там. Да возьме двома рукамі з дзежкі, да на стол, да й качае. Одзін раз брала. Коровая робіць. Да й спяваюць коровайніцы:

Ніхто не ўгадае,
Шо ў нашом да короваі:
З трох нівок пшаніца,
З трох бочок мучыца,
З трох рэчок водзіца
І дзве кваскі масла,
А трэця доля шчасна.

І коровайніцы цесто з дзежкі бяруць, помало. Да дна дзежку вускрэбуць. Шышкі роб'яць. Вуплетаюць, качаюць. Накачаюць ек кулачок, кругленькіе. І баранкі робілі. Цестом пооблепваюць хусткі одна другой, смяюцца. Дома обчіралі хусткі, на коровае не. Да спеваюць:

Нашы коровайніцы п'яны
Да ўсё цесто покралі,
По кішэням да поховалі.

Ека свечку на коровая сучэ. Хросны бацько свецёлцы свечку сучэ, веліку. Шоб не ўдовец буў. Бацько хросны ці брат, шоб мужчына, у сад ідзе да з яблуні розкі вурэзвае тры, кажна з трома ралцамі. А хто, бувало, дну з

трома ралцамі, а дзве розкі з двома. Прынесе, да ўжэ коровайніцы на іх цесто матаюць, матаюць скрозь до конца, і знізу цестом.

І печ топілі. Тры раз закідалі дрова. Перву раз – бярэмок, шоб зыр быў. Згорацць етые – дзве-тры полені ўкінуць. Зноў агонь у печэ… Старша коровайніца ўжо коровая зробіць. Круглы, вялікі. Стаканом кружкі на ём поробіць, ладонею крэст. От прочахне печ, да ў ее розкі садзяць. Прыпекуць, выймуць. Да така ўжэ песня коровайна:

Прачыстая Маці,
Прыдзі к нашай хаці
Веселле зачынаці,
Коровая у печ сажаці.

Да хросна маці бярэ лопату, сцены ею хрысціць, дэжжу (на поўнач), у порозі другу (на поўдзень), дале з вокнамі трэйцю (на ўсход), дале чацвёртую (дзе печ). Которые то хрысцілі перэдпечне окно і дзверы, больш не. На лопату жыто сыплюць, шоб жытка ў молодых добра була, хмель – шоб дзеці вялісa. Коровая хросна маці з стола на лопату. Да до печэ. Коровайніцы да ей йдуць, спеваюць:

Наша печ крокочэ,
Коровая хочэ,
А прыпечок коловаецца,
Коровая спадзеваецца.
А коровай ножкі гібле
Да до печонькі дзыбле.

Ек спяваюць, то заспеваюць:

Благослові, оцец і маці,
Благославі, уся родзіна ў хаці
Коровая ў печ саджаці.

Да ўсадзіць хросна у печ, на чэрэн, очэлье заслонкою закрые. Да ўжэ молоду по голове лопатою тоею б’е, тры разы біла. І молодого білі. Б’е й прыказвае: “Дай, Бог, шчасця”. А ека прыказвала: “Ето на сына, ето на дочку”. Да колько разоў ударыць, то ето шоб столькі дзяцей у яе було. Да ўжэ будуць стола муць. Спяваюць:

Мішу, наш Мішу,
Да нальёмо воды ў місу,
Да будом ручкі муці,
Да на вішэнькі ліці,
Шоб вішэнькі розвіваліса,
Шоб молодые красоваліса.

Змуюць тэ цесто й муку, вуцеруць стола. У сад пойдуць да лінуць там ету воду под яблыню ці там под грушу. Да ўжэ йдуць з сада, спяваюць:

Мы на сад воду носілі,
Соловейка просілі:
– Леці, соловей, з намі,
Ужэ коровая згібалі.

У хату зайдуць, заспеваюць:

Му на сад воду носілі,
То ж му дзело зробілі.
От то ву это знайце,
Нам гарэлочкі дайце.

То ўжэ за столы саджаюць коровайных, столоў тры ці чатыры іх назбіралосо. Квас п’юць, трохі гарэлкі хто коўцене. Мало тое горэлкі колісь було. Едзяць, гомоняць. Посля песню коровайну заспеваюць коровайніцы:

Наша печ поклёвана,
У серэдзіні помулёвана,
На золотых стоўпах стоіць,
У сярэдзіне коровай сядзіць.

Два часы седзіць коровай у печы, да вуймаць трэ. То ўжэ спяваюць:

Ох, у печэ коровай гічэ,
Коровайнічок клічэ:
– Дзе ж нашы коровайночкі,
Дзе ж нашы недбайночкі?
Ці на меду да запіліса,
Што про мене да забуліса?

З-за сталоў выходзяць, до печы йдуць. Маці хросна коровая з печэ вуйме. Да кладзе на веко з дзежкі, шо цесто росчыняла. То ўжэ така песня:

Жаловаўса коровай свечы:
– Ой, буў жэ я ў печы,
Засмаліў плечы.
Ой, коб жэ сыр да масло,
То б усе етэ згасло.

Да мажуць короўячым маслом, шоб блішчэў. Старша коровайніца берэ веко з короваем да по хаці ўкружкі нясе – у одзін бок, у другі бок.

Коровайніцы за короваем ідуць. Да за веко одноею рукою дзержацца. Спяваюць:

Коровай кубком, кубком,
Под зелёненькім дубком
Да ў чысценьком полі,
Да на вороненьком коні.

Ставяць коровая на столе коло вугла, дзе вобраз.

Шышэчкі ў печ послі коровая саджалі, баранкі. Воны хутко пекліса. Шышкі і ўпарану пеклі, ячныя, з картопляў, абу-екія тые шышкі, шо іх есці не можна. То на коровае ў рэшэто іх, вусып’юць за порог у сенях, да дзеці хапаюць.

Да ўжэ радзяць коровая, сад роб’яць. Розкі нарадзяць лентамі, бумагою крашэнаю. Шышэчкі з бумагі крашэнае воўязваюць, до розок ніткамі прывязваюць. Да растрыкаюць тры розкі по боках у коровай. Лентою красною обоўяжуць іх разом. Которые, то дну розку ў цэнтры, то ета з тройма ролцамі, а дзве по боках, то етые з двойма. І лентою одноею обоўязвалі. А як жэ! Баранкі на красну горпінку, да кругом коровая обоўяжуць. І спяваюць:

Короваю, наш раю,
Коло цябе хорошэ граю
Да з дудкамі і з скрыпкамі,
Да з молодымі молодкамі.

Молода не радзіла. Коло пола стояла ці сядзела там. Зелле, чэплялі яке е, зімою і барвенак, бувало. І ўсё-ўсяке. І веткі, спявалі ж:

Му свойго коровая радзілі,
У луг по каліну сходзілі.
Половіну луга сходзілі (обломілі),
Покуль свого коровая нарадзілі.

Такое було, шо ёлочку ўвоткнуць, з елкі обломяць. Свечку станоўлялі ў цэнтры. І яе радзілі. От нарадзяць да спяваюць:

– Короваеньку нараджоны,
Да хто ж цябе нарадзіў?
– Нарадзіла мяне маці (*Раманава …*)
Ручкамі да беленькімі,
З пёрснямі золоценькімі.

Найстрояць, шо й глядзі. Ек нарадзяць да хто падходзіць к короваю, спяваюць:

Не йдзіце, молодзіцы,
Коровая радзіці.
Му ж радзілі самі
Да яснымі свечамі.

Да ўжэ другі раз за столы садзяцца. Вупіваюць. Колісь не вельмі коровайніц напойвалі. Квас больш пілі. Закусваюць там екімі пампушкамі. Песні спяваюць. Старшой коровайніцы от таку:

Старша коровайніца,
Да не садзіса на покуці,
Да сядзь собе на порозе,
Да на бітой дорозі,
Шоб хлопчыкі не надпілі,
Да коровая не ўхопілі.

Так коровайніцы спяваюць:

Хваліласа коровайніца,
Шо веліка да работніца.
Шо ў мене сем сорочок –
Одна на мне,
Дзве ў пранне,
А чотыры ў кудзелі.

Трэцёй екой:

Наша коровайніца п'яна
Да на порозі ўпала.
Да чого вона п'яна,
Чого вона ўпала,
Да ногі задзірала?
По чарочцы по поўненькой
До дна вупівала.

І таку спявалі:

За колодою за дубовою
Да там баранову рогі,
Так наша коровайніца
Да задзірае ногі.
Да чого вона
Да ногі задзірае?
Шо по чарочцы по поўнай

До дна вупівае.

Смяюцца, рогочуць. Танцоваць у другу хату шлі, ек ета мала. Смук граў ці гармонь, барабан біў. До часоў чотырох гулялі. Ек уполету, то днело, ек домоў шлі. Міскі бралі, шышкі ім у міскі клалі, шо на коровае пеклі. Без гармоні йдуць і без смука. Спяваюць:

Мы ж булі на короваі,
Там нас чостовалі
Куркамі печонымі,
Гускамі смажонымі.

І ету:

Коровайніцы грозно
Расходзіліса позно.
Як сонейко ўзойдзе,
Кажна свой дом найдзе.

Прыдуць дахаты ды кароў дояць.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Чарнушэвіч Марты Гаўрылаўны, 1915 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

Вяселле гулялі ў “мясаеды”, але не ў пост. У сваты да дзеўкі хадзілі позна вечарам, каб знаць, ці згодны бацькі хлопца і сват. Калі згоду дадуць, то ідуць ужо днём, і людзей з імі тады больш.

Перад самым вяселлем пяклі каравай круглай формы. І пякла яго маці хрышчона, а дзеўкі той парою песні спявалі:

Наша печка рагоча,
Караваю яна хоча.
А прыпячак калываецца,
Караваю спадзяваецца.

Калі рабілі і пеклі каравай, то дзеўкі не сціхалі, увесь час спявалі. Спечаны каравай украшалі крэмамі, рабілі цвяты, птушачак. Затым яго неслі ў кладоўку, а перад тым, як яго дзяліць на вяселлі, з кладоўкі каравай выносіў старшы маршалак.

На вяселлі многа разных песен пелі. Калі малады ці маладая былі сіратою, то спявалі:

Зялёна дубровушка,
Чаго ў цябе да пянькоў многа,
А зялёнага ды ніводнага?

Маладзенькі-маладзенькая,
Чаго ў цябе таткоў многа,
Роднага ды ніводнага?
Е каму – ды напіцеся,
Няма каму – пажурыціся.
Е каму піць і есці,
Няма каму парадачку весці.

Маладая на сваю маці казала:

Сядзьмо, мамка, павячэраем,
Па вячэры падзялімуся:
Табе, мамка, хатка-дамоўка,
А мне, мамка, куфар, кароўка.

Калі "дружына" маладога пад'язжала да хаты маладой, то дзеўкі-сяброўкі беглі закрываць вароты, не пускалі іх. І толькі калі "дружына" перакідвала ў двор нявесты каравай, вароты адкрываліся, бо лічылі: увайшоў хлеб на двор, значыць і яны (сваты) заступілі сюды. Перад тым як маладыя ехалі ў царкву ці ў сельсавет, іх па тры разы абыходзілі вакол і асыпалі жытам, каб жылі добра і багата.

Найбольш жалосных песняў было напрыканцы вяселля, калі нада было ўжо ўезжаць маладой ад сваёй мамкі да хаты маладога. Тады ўжо і маладая спявала:

Ты, мамко, аддала мяне ў вяліку сям'ю.
Та вяліка сям'я дый пасядзе вячэраць,
А мяне маладу пасылаюць па ваду.
Як па воду ішла, горкі слёзы ліла,
А вадзіцу нясла і ўмывалася,
Правым белым рукаўцэм уціралася.
Падайду я пад акно, што та сям'я гаварыць.
А та сям'я гаварыць,
Маці сына вучыць піць:
– Ох, ты, сынку-сынок,
Чаго водку не п'еш,
Чаго водку не п'еш,
Чаго жонку не б'еш?
– За што ж мне яе біць,
Яна ўмее ўсё рабіць:
Намеле, натаўчэ і наварыць, напячэ,
Без вячэры спаць ідзе.

Недзе ў сярэдзіне вяселля дзялілі каравай. Каравай заўсёды дзяліў сват. А ў канцы вяселля маладыя дзеўкі, хлопцы пераапраналіся ў "маладых" і

тожэ трэбавалі дзяліць каравай і грошы з падарункамі сабе. Потым ужо, пасмяяўшысь з гэтых “маладых”, былі танцы, спевы, скокі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

Вяселле звычайна гулялі ў Мясаед, пасля Крашчэння. Першы дзень вяселля пачынаўся звычайна ў нядзелю, а другі дзень – у панядзелак. Вяселле звычайна рабілі на Тройцу.

Сватанне

У сваты звычайна хадзілі ў нядзелю ці ў святы. Напярэдадні сватоў звычайна пілі свечаную ваду. Перад ад’ездам у сваты сватоў благаслаўлялі, жадалі поспехаў. Сваты ў маладой звычайна адразу ў хату не заходзілі, а выдавалі сябе за купцоў і гаварылі: “Наш купец – ваш тавар”. Раней маладыя адзін другога не ведалі, ім саветавалі бацькі, на кім ажаніцца.

Запоіны (заручыны)

На запоіны вялі хлопца да маладой. Збіралі ежу на 2 сталы. Радныя запрашаліся з 2 старон. Жаніх нясе сваю гарэлку, але гэтую гарэлку на запоіны не пілі. Маладая рыхтуе закумку. Дзяўчына павінна была даваць падаркі родным жаніха: палатно, намёткі. На запоінах адбываўся дагавор аб вяселлі. Пелі:

На заручынах былі,
Мёд-гарэлку пілі.
Гарэлачка саладзенька,
(Імя дзяўчыны) маладзенька.

***

Ой, у нашага свата
Ой, да хароша хата.
Печ яго пабялёная,
Чэсць яго ўхвалёна.

Свякруха накрывала маладую хусткаю. Звязвалі маладых ручнікам.

Зборная субота

У зборную суботу збіралі кветкі для вянка, плялі яго. Таксама ў гэты дзень плялі касу нявесце. Вялікі вянок прышпільвалі маладой да макушкі, калі яна сядзела на пасадзе. На кожным этапе віцця вянка прасілі благаславення ў маці. Выконваліся ў зборную суботу шматлікія песні рознай тэматыкі:

Пасадзіла дзевачак усіх у рад,
Сама села вышэй усіх,

Скланіла галоўку ніжэй усіх.

Уласна вяселле (каравай)

Пачынаецца з замешвання цеста на каравай. Пяклі каравай у суботу. Звычайна рашчыняла цеста хросная маці, і абавязкова, каб у яе быў мужык. Калі без пары, нельга, бо будзе нядоўгі і нешчаслівы шлюб. Хросны бацька ў каравай рассоўваў свечкі. Для каравая ваду лілі за адзін раз, за адзін раз кідалі муку, каб жылі ў пары. Затым рашчынялі каравай. Раніцай хросная маці замешвала. Пры гэтым выконваліся песні:

Ніхто не ўгадае,
Што ў наш каравай
З трох рэчак вадзіца,
З трох рэзак пшаніца
І адна кваска (лыжка) масла,
Шоб доленька шчасна.

Калі пеклі каравай, рабілі зайца і месяц з цеста. Іх саджалі на каравай. Зайца павінен выкрасці жаніх. Калі каравай саджалі ў печ, гаварылі:

Ацец, маці, уся радзіна,
Разрашы каравай саджаць!

Затым па вуглам хаты лапатай гэтай рабілі крэсты і чыталі малітву. Каравай выпякалі круглы. Пры гэтым у дзежку клалі сыр і масла. Павінна было быць па аднаму караваю з кожнай стараны (жаніха і нявесты). Калі саджалі каравай у печ, спявалі:

Печ наша калуваецца,
Каравая дажыдаецца,
Каравай гіча,
Каравай кліча.

Пасля таго, як пасадзяць каравай у печ, мылі рукі і прыпявалі:

Каравай наш вышоў,
Да налемо да вады ў міску,
Да будзем рукі мыці,
Да на вішаньку ліці,
Шоб вішанькі развіваліся,
Маладыя красаваліся.

Затым, калі каравай спячэцца, яго радзілі:

Як мы свого каравая радзілі,

То ў луг па каліну хадзілі,
Половіна луга зламалі,
Пакулько каравая обралі.

На каравай звычайна збіралася свая радня. Неслі на каравай міску мукі і наверх клалі два яйкі.

Да Недзеньчына мамонька,
Да по ёлочках ходзіць, 2 р.
Да суседачак просіць:
– Да суседачкі мае, 2 р.
Да ходзеце вы ко мне,
К моему дзіцяці.
Ко мне, ко дзіцяці
Коровая згібаці.
Коровая згіблемо, 2 р.
Да вяселле зробімо.

Першы дзень

Уласна вяселле начынаецца ў нядзелю першым днём вяселля. Цэнтральным абрадам гэтага этапа з'яўляецца пасад. У нядзелю раніцай жаніх ехаў да маладой. Звычайна ехалі на конях. Каней радзілі, цаплялі кветкі, пакрывалі папонкамі, перавязвалі лентамі. Абавязкова была гармошка. Малады вёз каравай. На парозе хаты маладой яго не пускалі. Ставілі стол і малады павінен даць выкуп за нявесту, а дзеўку тым часам хавалі. Пасля выкупа заходзіў малады ў хату:

Ой, прыехала 700 баяр
На мой двор:
– Познай, молода Надзенька,
Каторы твой.
– Ой, што ў сіненьком,
Той не мой.
Ой, што ў серабрэ і ў золаце,
То той мой.

Жаніх прыносіў маладой падаркі: цукеркі, гарэлку. Маладая шла адзявацца. Жаніх садзіўся за стол. У маладое было 2-3 дружкі, якія рыхтавалі ёй адзенне вясельнае і дапамагалі ёй прыбірацца. Калі маршалкі апраналі маладую, маршалы са стараны жаніха насміхаліся над імі:

Адна дружка – ды цыцата,
Друга дружка – да пузата,
Цыцкаю парася забіла,
На прыпечку асмаліла,
Халоднага наварыла.

А нашы дружкі шылі
Да нічога не нашылі:
Адны штанішчы
Да і тыя без крэслішча.

Калі нараджалі маладую, наперад нараджалі дружку. Ішоў торг паміж сватамі. Пасля вялі другую, яна кульгала (адзявалі якую-небудзь старую бабу). Таксама ішоў торг. І толькі за трэцім разам вялі маладую. Пасля садзіліся за стол.

Пасад

Маладога і маладую садзілі за першы стол, перад гэтым палажыўшы падушку.

Ой, ляцелі гусонькі
Цераз сад,
Да гукнулі Надзеньку
На пасад.
Ой, чаго вам, гусонькі, ой, лето,
Есць у мяне мамонька
Для того.
Яна мяне хорошэньку нарадзіць,
Яна ж мяне хорошэнько
На посад посадзіць.

Пасля маладых звязвалі ручніком. Маладыя супраціўляліся, бо хто расчыніцца, той будзе падчыняцца ўсю жызнь.

Пасля таго, як пагулялі ў дзеўкі, адбываўся перапой маладога. Перапой адбываўся толькі з боку родных жаніха.

Перапіваю крэста
З севера да юга,
Штоб любілі друг друга.

Перапіваю дзве казы
У доўгай лазе.
Паймайце, да ў карысць майце.

Перапіваю воўка,
Каб была жатка лоўка.

Перапіваю палена,
Каб зяць пацалаваў цёшчу ў калена.

Пасля малады вядзе маладую да сябе. У маладога садзілі толькі гасцей з боку маладой. Ставяць дзежку ў дзвярах. Яго маці накрываецца кажухом, дае маладым мёд.

Знайце, знайце,
Да не своя маці,
Да напляла кажуха,
Да хоча спужаць.

Калі маладая пераступае да наступае на дзежку – яна чэсная, калі абойдзе – грэшная. У такі момант ставілі тую дзежку, што замешвалі хлеб. Пасля быў перапой з боку маладой. Калі перапіваў бацька, спявалі:

Перапіў бацька кароўку
На маю бедну галоўку.
Да кароўкі трэба рана ўстаці,
А я люблю доўга спаці.

Спявалі і іншае:

Перапіваю квактуху,
Каб нявеста пацалавала свякруху.

Перапіваю грошы,
Каб дзеці былі харошы.

Перапіваю палена,
Каб жаніх пацалаваў
Нявесту ў калена.

Першую шлюбную ноч маладыя павінны былі правесці не ў хаце, а ў клеці. Яны спалі на сене. На раніцу сваты правяралі сарочку, пілі і гулялі далей.

Я пад ёлкаю спала
Да не дзеўкаю ўстала.
Няма чого дзівоваці,
Така была яе маці.

Другі дзень

На другі дзень пасля застолля ехалі ў цэркву вянчацца. На галаву маладым надзяваліся венцы. Чыталіся малітвы. Маладым звязваліся ручніком рукі, тройчы абводзіліся маладыя па кругу ў цэркві.

А мы ў цэркві бывалі,

Трое зелье відалі.
Однэе – рута,
Другое – мята,
А трэцяе – квеці,
Павянчаліся дзеці.

Пірагі

На другую нядзелю пасля вяселля робяць "пірагі". Маладая едзе да маці. Рыхтаваўся стол. Там елі, пілі, спявалі песні (невясельныя). Затым маладая зноў ехала да маладога.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Г.Н., 1928 г.н.,***
***Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.***

У пятніцу ў хлопца каровай пеклі, а ў дзеўкі ў суботу пеклі каровай. Ішлі ў клуб, гулялі. У нядзелю вяселле начыналосо, а ў понедзелок кончалосо, потому што ў суботу нельзя нікогда дзеліць каровай, потому і пошла такая от жызнь, як началі ў суботу каровай дзеліць. Сённі пожэніліса, а завтра развеліса. Ездзілі на кладбішча і звалі на веселле родню. Гулялі сначала ў недзелю ў невесты, а потом пуд вечор ехалі к хлопцу. І ужэ там, у хлопца, дзелілі каровай. Сначала ў дзеўкі дзелілі каровай, а потом у хлопца, штоб у одзін дзень подзеліць. І дзелілі ў недзелю, а не ў суботу, і ў понедзелок нельзя. А ў понедзелок от дзеўкі ехалі к хлопцу ў госці, бо дзеўцы не трэба ворочацца домоў.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

У гэты дзень дагаворваліса, як рабіць вяселле, каму дарыць падаркі, дзе будуць жыць маладыя. Гаспадары накрывалі стол рознымі прысмакамі, ставілі лавы, і маці з дачкой гатовілі ручнікі, якімі будуць перавязваць сватоў. Сваты прыходзілі ў хату з вялізнай сумкай, а жаніх з вузлікам ў руках. У сумцы жаніх прыносіў сваю гарэлку. Калі заходзілі ў хату, сваха цалавала сваху і нявестку, сват здароваўса за руку. Малады падыходзіў да маладой і даваў ёй вузлік з гасцінцамі і цалаваў. Сваха аддае свасе сумку і казала: "Гэта на запоіны!". Маладых за сталом садзілі на покуце, маліліса богу і благаслаўлялі маладых на брак. За сталом спявалі такую песню:

Спорыкнула кірованька ў гаю,
Засталі дзевоньку ў чужым краю.
Садзісь, садзісь, дзевонька, блізенько,
Нагні, нагні головоньку нізенько,
Бо свекровонька табе да не мамонька,
Да будзе цябе будзіць раненько.

Перад тым як пачыналі перавязваць сватоў, сваха накрывала хусткай нявестку. Потым абсуждалі пра вялелле. Падарункі нявеста дарыла толькі

бацькам, кумам, брату ці сястрэ, бабулям з дзядулямі маладога. Напрыканцы танцавалі, спявалі частушкі:

На заручынах былі,
Да гарэлачку пілі,
Гарэлачку салодзенькую,
За дзеваньку малодзенькую.

Прыехалі ко мне сваты,
Думалі богатая,
А ў мяне ўсяе худобы –
Две капы лахматыя;

Прыхалі ко мне ў сваты
Прасілі цялушку,
А мой бацька прывалок
З сажалкі лягушку.

Прыехалі ка мне ў сваты
На сівой кабыле,
Усе прыданнае забралі,
А мяне забылі.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ганны Ільінічны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

МЕРАННЕ САРОЧАК

Перад вяселлем ідуць да маладога мераць сарочкі. Маладому маладая з дружкай заранее шые тры пары споднягa бялья, а свякрусе – вышывае. Тут сабіраюцца хросная маці і бацька, маці маладой, сястра і цётка і ідуць да свахі ў госці, абмяраюць сваху і паюць: “Наша сваха абнасіласа, што й па пупа абгаліласа, а ты свашэчку нарадзіла, да й у запечок посадзіла”. Абмяраюць вокна і дверы, бо на вокны трэба навесіць занавескі. Тут меральшчык гаворыць: “Мы на вокна навесім выразкі з газеты, бо нас сваха не частуе”. Пачуўшы гэтыя словы, яна тут жа запрашае. За сталом дагаварaюцца, колькі падаркаў трэба аддаць маладой хлапечаму роду. Падаркі дарыліса хатняй сям’і, хросным, бацьку і маці, дзядзькам і цёткам маладога. Потым абмяралі маладога. Пасля абмеру стараліса палажыць яго на падушку, каб там паждаць яго, нада шоб ён убачыў, якія ў нашай маладой падушкі мяккія. Мераўшы сваху і свата, жартавалі, гаварылі, што сваха як бочка, што не стане цэлага сувоя палатна, а свата стараліса шчыльна вымяраць. А сваты гаварылі, што не шкадуй палатна на матню, а то як начнецца, так і парвецца, што вы такія лянівыя, што не хопіць палатна, то мы паможам, алеж палатна хапала на ўсё. За сталом абавязкова пелі песні, але ж не вясельныя. Вясельныя да вяселля нельга было пець. Потым разыходзіліса.

***Запісана ў в.Буразь***

***ад Дарошка Ганны Ільінічны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## ЗАПОІНЫ

На запоіны да дзяўчыны ідуць блізкія маладому родзічы: бацькі, сёстры з чалавекамі ці браты з жонкамі, хросныя бацькі, і маці, і хлопец, якога бярэ малады за маршалка. Малады таксама бярэ дружку, і заве сваіх родзічаў. На запоіны маці маладога нясе нявесцы ў падарак хустку і накрывае маладую. Маладая перавязвае родзічаў маладога ручнікамі. Родзічы, якіх перавязалі, павінны нявесцы даць грошай, хто колькі, без розных прыказак, толькі дзякуюць. Тут ужо пяюць песні, но не вясельныя, бо да вяселля не спяваюць вясельных песен, згавараюцца, калі і як рабіць вяселле, можа ў каго чаго няма, то памагаюць адзін аднаму, каб усё было добра. Калі маладыя выходзяць із-за стала, то пяюць:

На заручынах былі
Ды гарэлачку пілі.
Гарэлачку салодзенькую,
За Галечку малодзенькую.

Усе развітваюцца і ідуць дадому. Сват сватоў праводзіць да вешніцы і згаворваюцца, калі вяселле. І перад вяселлем ідуць мераць сарочкі.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ганны Ільінічны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## КАРАВАЙ

Каравай расчынялі ў суботу ўтром. Вечарам у пятніцу звалі хросную маці, а калі яна ўдава, ці разводная, то расчыняла браціха, ці другая кума, бо кумоў, як у сям'і тры дзіцяці, то столькі і кумоў. Хросна ўсё роўна была пры гэтым. Раніцай каравай мясілі і саджалі ў печ, у посуд, у якім пёкса каравай, сыпалі жменю жыта і лажылі капейкі. Пасадзіўшы ў печ, мылі рукі ў місцы, а воду неслі і аблівалі вішню ці яблыню. Пры гэтым пелі:

Ой, вісу, мой вісу,
Ой, вісу, мой вісу,
Да нальемо воды ў місу,
Да будом рукі мыць,
Да будом рукі мыць,
Да на вішаньку ліць,
Каб вішэнькі развіваліса,
Маладыя красаваліса.

Пакуль ждалі, калі будзе гатовы каравай, зазіраючы ў печ. пелі:

А ў печы коровай гіча,
А ў печы коровай гіча,
Коровайнічок кліча,
А прыпечок коловаецца,

Коровайніц дожыдаецца.

Калі вынялі каравай з печы, яго красяць кветкамі і пяюць:
Да ніхто і не ўгадае,
Да ніхто і не ўгадае,
Ой, да што ў нашым караваі.
А ў нашым ды караваі,
А ў нашым ды караваі
З трох рэчак вадзіца,
Ды з трох рэчак вадзіца.
І дзве долечкі масла,
І дзве долечкі шчасця.
Караваю ды нараджоны,
Караваю ды нараджоны.
Ой, хто цябе нараджае?
Нараджае мяне Ганночка,
Нараджае мяне Ганночка
Ручкамі да беленькімі,
Перснямі золоценькімі.

Калі ўжо каравай нараджаны, яго ставяць на покуце, садзяць усю радню і ядзяць. Калі ў маладой, то радня сядзіць за сталом да тых пор, пакуль не прыедзе жаніх па нявесту са сваёй раднёй. Тут пачынаюць пець песню маладой і маладому.
Да Галеньчына мамонька,
Да Галеньчына мамонька,
Да по селоньцы ходзіць,
Да суседочок просіць.
Да суседонькі мое,
Да суседонькі мое,
Да прыдзіце вы ко мне,
Да к моему дзіцяці,
Да к моему дзіцяці
Каравая згібаці.
Коровая згібнемо,
Коровая згібнемо
Да вялелле зробеме,

Пасля гэтага малады з раднёй едуць да маладой. Маршалак бярэ каравай і выносіць з хаты. Едуць коньмі. Калі была машына, то машынай, калі блізка, то пешком. Калі радня прыехала да маладой, то іх сразу не ўстрачаюць, трэба каб яны самі знайшлі хату. У хату не пускалі. У сенях на парозе сядзела раджаная мужчынам жанчына і падбівала чаботы. Яна была шаўцом і казала: “Людцы добрыя, чаботы адбілі, што такая чарга да мяне?” Усе пачыналі шуткаваць, ёй даваць выкуп. Тут выкупаюць маршалкі

маладую, бо дружкі маладой паставілі стол і не пускаюць маладога да маладой у хату. Ішлі таргі. Калі заходзілі на пасад у хату пасля таргоў, то каравай маладога ставілі на стол, а маладой прымалі на печ. За стол малады садзіўса сам. Пасля трох чарак звалі маладую на пасад. Маладую адразу не падводзілі да маладога, а падводзілі дружку ў вянку, а другога падводзілі хлопца, таксама нараджанага маладой. На трэці раз падводзілі маладую. Жаніх усіх адпраўляў назад, гаворачы: “Не мая!”, налівау чарку гарэлкі, яны выпівалі і адыходзілі. Калі падыходзіла маладая, ён садзіў яе на пасад. Дружка маладой стараласа сесці да маладога і заняць месца маладой. Жаніху патрэбна яго выкупіць, што ён і рабіў. Пасля маладых саджаюць на кажух.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Дарошка Ганны Ільінічны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

**Вясельныя песні**

На заручынах мы булі,
На заручынах мы булі,
Гарэлачку пілі.
Гарэлачку солодзеньку,
Гарэлачку солодзеньку
За Танечку молодзеньку.

***

– Ой, белая да бярозонько, 2 р.
Ой, чого ты не зелена?
– Як жэ мне зелёное буці, 2 р.
Шчо ды мя купцы едуць,
Едуць, шчо ды мя купцы едуць.
– Молодая Танечко, 2 р.
Ой, чого ты не весела?
– Ой, як жэ мне весёлое буты, 2 р.
Шчо ды ў мене сваты ў хаце.
У хаце, шчо ды ў мене сваты ў хаце.
Хочуць мене молоду взяці.
Да не даюць косы, косы плесці,
Да не даюць косы, косы плесці,
Да мне даюць бальшую грусць.

Каравай

Да Таненчына мамонька,
Да Таненчына мамонька
Ходзіць, да соседочок просіць:
– Да соседочкі мое,

Да соседочкі мое,
Да ходзеце ко мне,
Моему дзіцяці.
Ко мне, моему дзіцяці
Коровай да веселле робіць.

Як рашчыняюць каравай

Да не хто жэ не ўгадае,
Што ў нашым караваі:
З трох рэчок вадзіца,
З трох рэзок пшаніца.
…………………….
Штобы далей качалось.

Як пасадзілі каравай ў печ, памылі рукі і выліваюць воду

Ой, вечо, наш вечо,
Да наліла вады ў місу,
Да будземо рукі муці,
Да на вішэнькі ліці,
Штоб вішэнькі развіваліся,
Молодыя красоваліся.

Вымаюць коровай з печы

Ой, у печы коровай яечэк,
Ой, у печы коровай яечэк
Коровайнічэк кліча.
– Дзе жэ мое породзіночкі,
Ці ў лесе заблудзіліся,
Мене ў печы да забуліся.

Як упрыгожваюць каравай

Як мы свого коровая
Радзі лета по луга
По калену хадзілі,
Половіну луга зламалі,
Покуль з малаком убралі.

Хлопец едзе за маладой

Вой, ей там на дворэ, на дворэ,
Там рано, там засвечано.
Там ўражаецца, собіраецца
Іваночко ў дорогу.
Уражаецца да путаецца:
– Кого мне за сватоў браці?
– Ой, ей, мой сынонько-лебедзенонько,

Бяры свою сердзеноньку,
Бяры браценько ды за сваточка.
Браценько замашэ головочку.
Во я сястрыцы да й за свашэчкі,
Штоб болей спяваць.

### Вясельны поезд

Да Галенчына мамонька 2 р.
Ек дарогі да прылегай,
Ці стогне дорога 2 р.
Да ці шуміць дуброва.
Ці слышан чачот нагайкі, 2 р.
Ці гукаюць марша,
Ці музыченькі граюць, 2 р.
Ці самі спяваюць.
І дорожэнька стогне, 2 р.
І дубровонька шуміць,
І слышан чачот нагайкі, 2 р.
І гукаюць марша,
І музычанькі граюць, 2 р.
І самі спяваюць.

### На пасад

Да ляцелі гусонькі на леса,
Да гукалі Танечку на пасад.
Ночовалі гусонькі по друго.
Ёсць у мене мамонько,
Она ў мене хорошэнейко.
Нарадзіць она ў мене молодзенько
Да посадзе.

### Каменная печачка

Да каменная печэнько, 2 р.
Вечор горыш, да не ўгорыш,
Вечор горыш, да не ўгорыш, 2 р.
Камней да не рассыпеш.
Молодая Танечко, 2 р.
Вечор сідзі да не заплач,
Да не заплачэць, 2 р.
Да мамонько да не розжаць.
Роднае мамонько,
Як я пойду по застолье?
Косы мое да по шчаках,
Слёзы мое дробненькія,

Лета мое молодзенькія.

### Побірайся, Танечко

Побірайся, Танечко, 2 р.
Побірайся, моё дзіця.
Ой, як жэ мне побірацiся, 2 р.
Не могу бувать у хаце.
У хаце, не могу бувать у хаце.
Да некому парадак даць.
Только тые, што напецеся, 2 р.
А некому пожурыцiся.
Только тыя, што піці да есці, 2 р.
А некому парадак весці.

### Коровайніцы едкі

Коровайніцы едкі
Да целого да вола з'елі.
До столу да качаючы,
Да ў солі да мочаючы.
На столе да не крышачкі,
Под столом да не косточкі.

### Калі сядзяць у доме маладога (молодой)

А ў нашага свата
Да хорошая хата.
Печ у яго побелёна,
Яна ў яго ўмалёвана.
А ў нашага свата
Да дубовая хата.
А сенечкі да березавы,
А сваточкі да цвярозы.

### У доме маладога ці маладой

А ў нашага пана свата
Кудравая галава.
Ён кудрамі потрасе,
Нам гарэлкі прынясе.
А ў нашага пане свахі
Кудравая галава.
Ёна кудрамі потрасе,
Нам закускі прынясе.
Свеце на рогожа, подушок няма.
Ой, штоб наша беседонька
Уся была весяленька ў
Пана свата за сталом 2 р.

### Сваточкі-паночкі

Да сваточкі-паночкі,
Да сваточкі-паночкі,
Пора ехаць дадому.
Бо ў нас дома да по дзіцяці,
Да некому дапомогаць.
Да ні мамкі, ні нянькі 2 р.
Да нікого ў хаце няма.

### Маладая едзе да дому жаніха

Ужэ Танечка на дорожэньцы,
Кланяйся ты на порожэньцы.
Она ўстала да говорыла: 2 р.
– Ек мой бацько, да багаты будзе,
Будзе, як мой бацько да багаты будзе,
Бо хто ему да родіці будзе.
– Не журыся, Танечко, 2 р.
Ек зародзіць Бог жыто.
Жыто, ек зародзіць Бог жыто
То на новое лето,
То я жанцоў да понаймаю, 2 р.
Свое добро позбіраю.
Жонцы мое молодзенькія 2 р.
Як цветанькі золоценькія.
Жонцы мое потоміліся, 2 р.
А серпікі поломаліся.

### Выйдзі, мамонько, поглядзі

Выйдзі, выйдзі, мамонько, поглядзі,
Бо шчо цебе прывелі.
Да цялёнечку,
Ці позор, ці хорошу,
Не відно молоду
Да авечачку.
Не позор, а хорошу
Не відно молоду.

### Як Таненчына мамонька по дворы ходзіць

Да Таненчына мамонька 2 р.
По дворы да похажае. 2 р.
Да похожае по дворы,
Да в огород да зазірае.
Ой, Божэ, мое Божэ, 2 р.
Бо й рана ў мяне рожу.

Рожу, ой, рана ў мяне рожу.
Цебе нору.
Да Іванкова мамонька 2 р.
По дворы да похажае,
Да похажае по дворы,
В огород да зазірае.
Ой, Божэ, мое Божэ,
Посаджоная не веру.

***

Ой, прыехал додому
Да парень со своею жэною.
Моя жона каліна-маліна,
Высокая, як рабіначка,
Чырвоная, як каліночка.

Калі маці развітаецца з дачкой

Ой, ты свацейко,
Да мая ты пташэчка,
Ой, штобы не було моему
Дзіцяці век горовацi,
Штобы не стояло цёмное
Ночэнькі жэ под окном,
Штобы не ўцірало дробных
Слёзочок рукавом.
Ой, штоб не було,
Ой, штоб не було,
Вы соседонькі, вы мамонькі.

Запрашаюць нявесту ехаць дадому

Едзьмо, Танечко, з намі, 2 р.
У нас тобе добра будзе. 2 р.
Нашы сені да вецер мяце, 2 р.
А сонейко пірогі печэ,
А ты только да сідзеці, мяшаці, 2 р.
На то дзіво да глядзеці.

Вясельныя пажаданні:

Дарую табе шчасце і долю, і век доўгі, і дарую стакан суніц, каб не хадзіў да чужых маладзіц.

Перапіваю воўка, каб была жонка лоўка.

Перапіваю кошель длінны, каб до году былі родзіны.

Перапіваю 2 козе ў доўгай лозе, поймайце і корысць майце.

Перапіваю вам грошы, каб былі дзеці хорошы.

Перапіваю вам стакан медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі.
Перапіваю вам зялёную рошчу, каб зяць пацалаваў цёшчу.
Перапіваю вам куру-квактуху, каб молода поцэловала свякруху.
Перапіваю вам канапель, каб да году быў сын, як пень.
Перапіваю вам жывотворяшчэго креста, з севера до юга, штоб любілі друг друга.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.,***
***Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Рыдзецкай Г.***

***

*Прыезд по молодую:*

Прыбілася да рыба к чату,
Прыбілася да рыба к чату.
Да пусцеце сватоў ў хату
Да ручэнькі погрэці,
Молодую погледзеці.

*Адказ свахам:*

Му ж вас не загубімо,
Кого любім, того возьмомо.
Вуп'емо, подскочымо, возьмомо, кого схочомо.
Мы ж думалі, шо сваты возом,
А оны пешком ішлі, молодого ў мешку неслі.
І колошы торчалі, і собакі ворчалі,
Зачэпілі за плоцішчэ, порвалі да колошышчэ.

*Сватам:*

Прыехалі тры сваты,
Тры сваты да ўсе калекі:
У одного лыса голова,
У другого руда борода,
У трэйцего крывая нога.
На лысой голове боб молоціць,
А крывою ногою жар загрэбаць,
А рудою бородою хату заметаць.

*До венца:*

До венца, до венца, да до божого слоўца,
Да до божого храму ў нідзелечку рано.

*От венца:*

От венца, от венца, да от божого слоўца,
Да от божого храму ў нідзелечку рано.

*Сустрэча мацер'ю молодых от венца:*

Ой, на горэ цэркоўка Светы Спас.
Выйдзі, выйдзі, мамонько, проці нас,
Выйдзі, выйдзі, мамонько, з свечамі,
Бо ўжэ твое дзетонькі звенчаны.
Выйдзі, выйдзі, мамонько, у жупані,
Бо ўжэ твое дзетонькі ў пары.

***Запісы прадстаўлены дырэктарам***
***СДК в. Буразь Дарошка Ганнай Іванаўнай***

## Сваты

У сваты да дзяўчыны ішла маці, бацька і малады. У каго не было бацькі, то ішоў брат. Маці хлопца пякла вялікі пшанічны пірог і бралі пляшку гарэлкі. Зайшоўшы ў хату да дзяўчыны, віталіся.

У сваты ішлі вечарам, каб меней людзей бачыла, а то людскія вочы бываюць ліхія.

Бацька, зайшоўшы ў хату, пытаўся: “Ці прадаеце вы цялушку? Нам людзі казалі, што ў вас ёсць на продаж. Мы будзем купляць”. Бацька дзяўчыны адказвае, што ёсць, купляйце, калі згаворымся ў цане: “Мая цялушка не цельная, не дойная, я за яе хачу вялікі выкуп”. Бацька хлопца: “Ну, колькі загадаеце, столькі дадзім”. Маладыя ў гэты момант паглядаюць адзін на аднаго. Бацька хлопца ставіць на стол пляшку гарэлкі, хлеб, кажа: “Вось мая цана”. Тады бацька пытае ў дзяўчыны ці згодна. Калі скажа дзяўчына, што згодна, то бацька ставіць сваю пляшку і запрашае за стол. Маладых садзяць поруч.

Бацькі дагаваруюцца, калі рабіць запоіны (гэта пасля сватоў праз два тыдні). У сватах людзей не сабіраюць, толькі бацькі дзяўчыны і хлопца.

## Запоіны

На запоіны да дзяўчыны ідуць ужо блізкія маладому родзічы: бацькі, сёстры з чалавекамі ці браты з жонкамі, хросныя бацька і маці, і хлапец, якога бярэ малады за маршалка. Маладая таксама бярэ дружку і заве таксама сваіх блізкіх родзічаў.

На запоіны маці маладога нясе нявестцы ў падарунак хустку і накрывае маладую. Маладая перавязвае рушнікамі ўсіх родзічаў маладога, якія прыйшлі на запоіны. Родзічы, якіх перавязалі на запоінах, ложаць маладой грошы, хто колькі, але без прыказак, толькі дзякуюць. Тут ужо пяюць песні, але не вясельныя, бо да вяселля не спяваюць вясельных песень.

Да памерзлі, пачэзлі,
Да памерзлі, пачэзлі
У велікой дарозе, 2 р.
Да на лютым морозе.
Да хто ж нас пожалее, 2 р.
Да хто ж нас да разогрее.
Да поймаймо цецеру 2 р.
Свойму свату да на вячэру,
Штой цецера да на сошэчку, 2 р.
А пер’ейко на подушэчку.

Тут ужо згаворваюцца калі і як рабіць вяселле, можа ў каго чого няма, то дапамагаюць адзін другому, каб было ўсё добра. А калі пара, выходзяць з-за сталоў, то пяюць:

На заручынах былі,
Да гарэлачку пілі.
Гарэлачку салодзенькую, 2 р.
За Галечку молодзенькую.

Усе развітваюцца з сватамі. Усе ідуць дадому, а сват сватоў праводзіць да вешніцы. Згаворваюцца калі вяселле і перад вяселлем ідуць да маладога мераць сарочкі.

Каравай

Першым быў каравай. Яго расчынялі ў суботу вечарам, звалі хросную маці, а калі хросна ўдава ці разводная, то расчыняла браціха ці другая кума, бо кумаў было 3 пары. Хросна ўсё роўна прысутнічала пры гэтым.

Раніцой каравай мясілі і саджалі ў печ. У посуд на дно, у якім пёкся каравай, сыпалі жменю жыта і клалі капейкі. Пасадзіўшы ў печ, мылі рукі ў місцы, а ваду неслі і аблівалі вішню ці яблыню, пры гэтым пелі:

Ой, вісу, мой вісу, 2 р.
Да нальемо да воды ў місу,
Да будомо ручкі мыці, 2 р.
Да а вішэньку ліці,
Каб вішэнькі развеваліся, 2 р.
Маладыя красаваліся.

Каравайніцы чакаюць, пакуль не спячэцца каравай, зазіраюць у печ і пяюць:

А ў печы коровай гіча, 2 р.
Коровайнічок кліча.

А прыпечак половаецца,
Коровайніц дожыдаецца.

Каравай выцягваюць з печы і ўпрыгожваюць кветкамі і пяюць:

Да ніхто не ўгадае, 2 р.
Ой, што ў нашым да короваі.
А ў нашым да короваі
З трох рэзок пшэніца,
І дзве долечкі масла,
І дзве долечкі шчасця.
Короваю да нараджаны, 2 р.
Ой, хто цябе да нараджае?
Нараджае мене Ганночка, 2 р.
Ручкамі да беленькімі, 2 р.
Перснямі золоценькімі.

Калі каравай нарадзяць, ставяць на покуце і саджаюць усю радню і частуюцца. Калі ў маладой, то радня сядзіць за сталом да тых пор, пакуль не прыедзе жаніх па нявесту са сваёй раднёй. Тут пяюць песню маладой і маладому:

Да Галеньчына мамонька, 2 р.
Да по елоньцы ходзіць,
Да суседочок просіць:
Да суседонькі мое, 2 р.
Да прыедзеце вы ко мне,
Да к моему дзіцяці 2 р.
Коровая згібаці.
Коровая згіблемо, 2 р.
Да вяселле зроблемо.

Абрад "Поезд"

Пасля малады са сваёй раднёй едуць да маладой. Бярэ маршалак раджаны каравай і выносіць з хаты. Едуць коньмі ці машынай, а калі блізка ў сяле, то пешшу. Гэта ўжо называюць поезд едзе да маладой, тут пяюць песню:

З-под белага да бярэзнічку, 2 р.
Сівы конік да выбягае,
Да не сам жа ён бяжыць, 2 р.
На ім Коленька сядзіць.
Он коніка да паганяе, 2 р.
І з конікам да размаўляе.
Ой, коню мой, коню, 2 р.

Ухвалонько моя, ухвалі ты мяне. 2 р.
Коло цесцевого двора 2 р.
Да высокая гора,
Нельга к горэ прыступіці, 2 р.
Конічэнька да напоіці.
Вот вышла, выбегла 2 р.
Молодзенькая Галечка,
Узяла коніка за грывоньку, 2 р.
Ой, а Колечку за ручэньку,
Дала коню овса, сена, 2 р.
Сама пошла на пасад села.
Дала коню овса, бруку, 2 р.
Сама села да коло боку.

Калі хлапеча радня прыехала да маладой, то іх адразу не пускаюць ў хату. У сенях на парозе сядзіць. Раджаная мужчынам жанчына і пабірае чобаты, і кажа: "Што, людцы добрыя, чобаты адбілі, шо такая чарга да мяне?" Усе жартуюць, ёй даюць выкуп і яна трымаецца.

Тут выкупляюць маршалкі маладую, бо дружкі маладой паставілі стол і не пускаюць маладога да маладой у хату, ідуць таргі, а на дварэ пяюць песню, запрашаючы гасцей да столоў.

Зеленое жыто, зеленэ,
Зеленое жыто, зеленэ.
Зеленое жыто за сялом,
Харошые госці за столом.
Зеленое жыто, зеленэ,
Зеленое жыто і овёс,
Дорогіе госці, род увесь.
Не машы мне, мілы, рукою,
Бо не лягу спаці з тобою,
А я лягу спаці з казаком
Под зялёным явором.
Под явором вецер не вее,
Под явором сонцэ не грэе,
Под явором сонцэ не грэе,
Под явором дробны дождж ідзе,
Моя міла замуж ідзе.
Зеленое жыто, зеленэ,
Хорошые госці ў мене.
Зеленое жыто за селом,
Хорошые госці за столом.

Пасля таргоў заходзяць у хату і сваты запрашаюць садзіцца за сталы. Каравай маладога ставяць на покуць, а за стол садзіцца малады сам.

Завуць маладую на пасад

Пасля трох чарак выклікаюць маладую на пасад песняй.

Ой, ляцелі гусонькі цераз сад,
Да гукнулі Галечку на пасад.
Далецеў саловейко, сеў на суку,
Ой, скучненько мне самому,
Коб, мол, соловушка за мною,
Шчабятаў бы ўсю ночку я з ёю.

Маладую адразу не падводзілі да маладога, а падводзілі дружку ў вянку, а другога падводзілі хлопца, таксама радзілі маладой, на трэці раз падводзілі маладую. Жаніх усіх адпраўляў назад, гаворачы, што не мая. Наліваў чарку гарэлкі, яны выпівалі і адыходзілі. Калі падводзілі малодую, то малады запрашаў яе за стол на пасад. Дружка маладой старалася сесці да маладога, займае месца маладой. Тады жаніх выкупляе месца для нявесты. Пасля выкупа маладых саджаюць на кажух.

Абрад “Зразаць свечку”

Як малады прыедзе па маладу, то адразу садзяцца за стол. І малады патрабуе свечку маладой. У маладога свяцёлка (дзяўчына, якая дзержыць свечку). Ён нясе свечку, а маладое свечка дома. Тады бацька маладой бярэ хлеб і зразае верх, робіць 2 дырочкі, у якія ўсоджваюць свечкі. Свечкі ўпрыгожваюць кветкамі. Потым свечкі абгортваюць ручніком ці матэрыяй і падаюць запаленыя свечкі свяцёлцы, якая іх дзержыць усё вяселле. З гэтымі свечкамі ехалі да вянца, калі хто вянчаўся.

Гэтыя свечкі берaглі ўсё жыццё. Іх свяцілі ў царкве на Стрэчанне і запальвалі, калі грымела і бліскала, гэта каб гром не ўдарыў у хату. Пасля зразання свечак падводзілі маладую да жаніха.

Едуць да маладога

Пагуляўшы ў маладой, малады забіраў свой род і пара было ехаць дамоў, везлі да сябе маладую.

Прашчанне маладой са сваёй маці. Пяюць песню:

Да каменная песенько, 2 р.
Вечар гарыш да не выгарыш.
Молодзенькая Галечка вечор сідзіш,
Да не заплочеш.
Ой, тады я заплачу, 2 р.
Як я пойду по застольейку.
Косонькою обгорнуса, 2 р.
Слёзонькою обольюса.

Малады бярэ молодую платочком за руку, а іх вядзе маршалак, таксама платочкам вакол стала на покуцці. У маладой у руках ікона з ручніком. Абышоўшы тры разы маці і бацьку, просіць благаславення. Маці тры разы

перахрышчвае дачку і гаворыць: “Бог благаславіць і я благаслаўляю”. Цалуе тры разы. Пасля гэтага ідзе з хаты.

Тут пяюць:

Давай, мамко, повячэраймо, 2 р.
Повечерав, подзелемося.
Тобе, мамко, ніт і бердзечко, 2 р.
А мне, мамко, полоценечко.
Тобе, мамко, да ўсе харомы, 2 р.
А мне, мамко, волы да коровы.

Калі маладыя садзіліся на коні, то бацька з хлебам абыходзіў воз з маладымі 3 разы і тады маладыя ехалі да маладога. Спявалі песню:

Ой, ворагі, ворожэнькі,
Да не пераходзьце дарожэнькі.
Да няхай перейдзе Господ Бог,
Да няхай перейдзе бацько свой.
Па дарозе пяюць:
Ужо Галенька на дарожэньцы 2 р.
Кладзе серпік на парожэньцы,
А кладучы, гаварыла: 2 р.
Як мой бацько да багаты будзе,
Ой, хто ему гороваць будзе?
Не журыся, Галочко, 2 р.
Не журыся, моя дочэнько.
Як зародзіць Бог жыто 2 р.
Да на новае лето,
То мы жнее да понаймаем, 2 р.
Своё добро да позжынаем.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Земляшэк Л.***

Раней на Тураўшчыне вяселле рабілася так.

Каравай пяклі ў суботу вечарам. У нядзелю да абедня маладая хадзіла ў царкву пад вянец, а потым, прыйшоўшы да вянца, радня жаніха ішла да нявесты. Начаставаўшыся ў нявесты і правёўшы ўсе рытуалы, якія тут бытуюць, ехалі да жаніха, але бацькі за дачкою да жаніха не ехалі, а іх прыходзілі запрашаць у панядзелак ісці да сватоў к сваёй дочцы. Вось гэтая бяседа у панядзелак і называлася пярэзвы.

Стаяць сталы, накрытыя абрусамі, відаць, што тут было вяселле. Уваходзяць у хату гаспадыня з гаспадаром і раяцца паміж сабой, што патрэбна ўжо ісці зваць на пярэзвы і будзіць маладых патрэбна, а няма ні хроснай, ні завіцы (завіца – сястра гаспадара).

Прыходзіць завіца і раяцца, што патрэбна ісці зваць на пярэзвы.

Гаспадыня дае хлеб, соль, уматаныя ў ручнік і паказвае, што, як прыйдзеш у хату, то скажы: "Прыйшла я к свасе і свату, да добры дзень у вашу хату. Хлеб і соль на стол кладу, да на пярэзвы вас усім вашым слаўным родам заву. Будам вашу дочку будзіць, да парадочнасць ее хваліць". Як завіца пайшла з хаты зваць сватоў, то зайшла хросная жаніха. Хросная слала пасцель маладым у першую іх брачную ноч у клеці (клець – гэта памяшканне, дзе спалі маладыя). Хросная павінна была іх і будзіць і знаць, ці зберагла маладая сваю дзявочасць.

Гаспадыня (маці жаніха) кажа: "Ідзі, кумочко, до клеці, дзе спяць нашы дзеці, одной тобе знаць, якую пасцель ты слала, то цяпер тобе і довераем, шоб ты ее праверала".

Праз некаторы час выходзяць з клеце маладажоны, а за імі ішлі хросная з бутылкай водкі ў руках. Навязаны красны каснік на бутылцы.

Красны каснік на бутылцы – гэта сімвал таго, што зберагла маладая сваю дзявочасць. А калі маладая не зберагла сваёй дзявочасці, то склалі б хамут на шыю свасі (маці нявесты).

У панядзелак пасля вяселля, на пярэзвах нявестка клала на галаву хустку, складзеную ў серпаночак. Завіхалася разам са свякрухай каля сталоў, таму што з мінуты на мінуту павінны былі прыйсці госці. А свякруха вельмі задаволеная нявесткай, што прыйшла за яе сына, захаваўшы дзявочасць, прыказвае: "Памагай, нявестачка, на стол накрываць, да тваю мамку з татом з красным каснікам сустракаць. Да хвала будзе ўсему вашаму роду, што доглядзелі сваю дочку змолоду". У дзеры ўваходзяць завіца са сватамі. На стале стаіць пляшка з красным каснікам. Усе вельмі задаволены. Зяць падыходзіць да цёшчы. Нізка ёй кланяецца і дае ёй падарунак. Накідае на плечы вялікую красную хустку, як сімвал парадачнасці яе дачкі. Запрашаюць сватоў садзіцца за стол такой песняй:

Ой, зяць цёшчы просіць, (2 разы)
У руках шапку носіць,
Ой, цёшчанька моя, (2 разы)
Ой, матухно добра,
Учыні добру волю (2 разы)
Да пабудзь ты са мною.

За сталом частуюцца. Хваляць смачную яду, слаўную гаспадыню і потым спяваюць песню:

Да познай свою дочку,
Да познай свою дочку. (2 разы)
Учора була ў веночку,
Учора була ў веночку, (2 разы)
А цяпер у серпаночку.

Сваты дзякуюць адзін аднаго і за дзяцей слаўных, і за пачастунак добры і здароўя адзін аднаму жадаюць, а потым і зноў спяваюць песню:

Свахна свахне паклонісь, (2 раза)
Шоб на Ольку не сварылась,
Бо Олечка молодзенька, (2 раза)
Да на сон она радзенька.
Не будзеце яе, як певень пяе, (2 раза)
Бо што рано будзе,
А будзеце, як пастух коні жэне, (2 раза)
То што ж добре будзе.

Наспяваўшыся і натанцаваўшыся, сваты ідуць дамоў і пляшку з красным каснікам абавязкова за сабою бяруць. І ўмудраюцца яе несці так, каб усім было відно, які ім пачот за іхнюю дачку. Ці кладуць у карман, ці ў руках нясуць, таму што па вуліцы людзі будуць абавязкова выглядаць, ці будуць ісці сваты з пляшкай, на якой красны каснік, ці з хамутом. І пасля гэтага ў кожнага свае перасуды. І добра дзяўчына і прыгожая, да яшчэ і захавала сваю маладосць. Пярэзвы – гэта завяршэнне ўсіх вясельных рытуалаў.

Ну, а калі б дзяўчына не захавала сваёй маладосці, то песні спявалі б наступныя:

Зяць цёшчу вядзе,
Да на дарозе кладзе,
Да лежы цёшча тута,
А я пайду да прута,
Да буду цябе біці,
Што не ўмела дочку гледзеці,
Ганьба маёй цёшчы, ганьба, 2 р.
Не ўгледзела свою дочку з рання,
Аганьбіла ўвесь наш род, 2 р.
Што страшно ісці во двор.
Уцерай, цёшча, слёзы, уцерай, 2 р.
Да смела на людзей не паглядай.

Вось што спяваюць, калі жаніх з нявестаю сядзяць на пасадзі:

Сядзьмо, мамко, повечэраймо, 2 р.
Повечэраймо, подзелемось.
Тобе, мамко, ўся худобенька, 2 р.
А мне скрыня і коровенька.
Тобе, мамко, ніты, бердзечко 2 р.
А мне ўсе полоценечко.
Тобе, мамко, хатка з вугламі, 2 р.

А мне з хаткі побугацісь.
Побірайся, Олечко, 2 р.
І з хаты да іголкою.
І з хаты да іголкою, 2 р.
І з двора да мецёлкою.
До вороцечок бежкі, 2 р.
За вороцечкі бежкі.
Па вуліцы окуніцою, 2 р.
А ў Іванка молодзіцою.

Калі нявестку прыводзяць у двор жаніха, спяваюць:

Выйдзі, сваце, паглядзі,
Шо мы тобе прывезлі,
Ці овечку, ці козу,
Ці невестку молоду,
Ні овечку, ні козу,
А невестку молоду.

Спяваюць, калі нявеста ідзе да вянца:

До венца, до венца,
До божого слоўца, 3 р.
До божого храма,
У нядзельку рана
Як прыйдзе ад венца:
Прышла Олечка ад венца,
Пад каліною стала,
Слёзонькі роніць,
Ручэнькі ломіць.
У Бога долечкі просіць,
Прышла до ее мамонька ее,
Чого, дочэнька, плачэш?
Шо сама маю,
То і тобе даю,
А долечку не ўгадаю.

Спяваюць, калі малады пад’ятжджае да двара нявесты:

Каля цесцёва двора 2 р.
Там крутая гора,
Нельга к горэ прыступіцца 2 р.
Конічэнька да напоіці,
Откуль вышла малада Олечка, 2 р.
Узяла коня да за повода.

Узяла коня да за повода, 2 р.
А Іванка да за ручаньку.
Дала коням оўса і сена, 2 р.
Сама пошла на пасад села.
Дала коням пшэніцы, 2 р.
Сама пошла да віно піце.

Спяваюць на запоінах:

Ой, на моры, да й на камені, 2 р.
Там седзелі два ангелы.
Оны, седзя, да й говорылі: 2 р.
Да лецемо на заручыны,
Да лецемо на заручыны, 2 р.
Да і к Ольцы на разлучыны,
Бо там Ольку да заручваюць, 2 р.
Да і з матухнай разлучваюць.
Да і з матухнай разлучваюць, 2 р.
Да і к свекрові да прылучваюць,
Бо там Ольку да заручваюць 2 р.
Да і з бацюхном разлучваюць.
Да і з бацюхном разлучваюць, 2 р.
Да і к свёкру да прылучваюць.

Каравайнік

Да месілі коровая, месілі,
Да ў Дунай по водзіцу ходзілі.
А той Дунай отказаў,
Да ідзіце по водзіцу ў крыніцу.
Да ідзіце по водзіцу ў крыніцу,
Да несіце коровая ў светліцу.
Наша печэнька рогочэ,
Да коровая хочэ.
А прыпечок колываецца,
Коровая дожыдаецца.
За колодою, за дубовою,
Там баранні рогі,
Там старшая каравайніца
Задзірала ногі.
Да чого ж вона, да чого ж вона,
Да ногі задзірала,
Да по чарочцы, до по поўненькай
До дна допівала.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны,***

*студэнткай Пенчык Л.*

Сватанне

Перш чым ажаніцца, хлопец знаходзіў сабе нявесту. І тут ужэ начынаецца сватанне. У сваты хадзілі толькі жанатыя мужыкі. Жаніх абязацельна доўжан быць. Галоўнай асобай у сватанні быў старшы сват. На гэты пост выбіралі такога мужчыну, штоб ён быў вясёлы, гаворкі, каб пры выпадку не лез у карман за словам, як кажуць.

Дагаварыўшы аб задуманым у доме жаніха, сваты адпраўляліся ў дом, дзе жыла дзяўчына.

У сваты едуць абычна ўвечары і прытом у суботу. Увайдзя ў дом, сваты і хлопец вітаюцца з бацькамі дзяўчыны. Калі ў хату прыходзілі сваты, дзяўчына сходзіла з хаты. Бацькі хоць і хацелі аддаць дочку замуж, але ж не паказвалі гэта сватам. Сват даставаў з-за пазухі хлеб і бутылку гарэлкі і ставіў іх на стале. После гэтага маці дзяўчыны ставіла на стол закуску і сваю бутылку гарэлкі. Начыналася выпіўка. Гаварылі сразу на паўсядзёныя тэмы.

А ўжо потым сват начынаў угаворваць бацькоў дзяўчыны, штоб яны далі саглассе на шлюб. Тагды бацькі звалі сваю дачку, штоб паследняе слова сказала яна. Калі яна саглашаецца, дазваляе піць за яе і сама чуць выпівае. Калі сваты ўжо збіраюцца ісці дамоў, дзяўчына дае свайму хлопцу ў падарак бутылку, поўную жыта. Яна завёртвае яго ў кусок палатна і завязвае поясам сваёй работы.

Запоіны

После таго, як бацькі і іх дачка саглашаліся на шлюб, начыналіся запоіны, на якіх украплялася гэта згода. На другі дзень, пад вечар, зноў у хату дзяўчыны прыходзілі хлопец, сват, бацькі хлопца. Бацькі дзяўчыны звалі сваю радню і суседзей, а дзяўчына звала сваіх самых блізкіх падруг. Тут ужэ прысутнічаў і музыкант. Бацькі дзяўчыны гатуюць угашчэння на стол і гарэлку. П'юць у асноўным за здароўе маладых. Нявесце прэдлагаюць таксама выпіць. Тая адпівае чуць і ставіць стакан на стол. Сват ложыць туды некалькі манет. Дзяўчына гэту гарэлку з манетамі вылівае на край хусткі, кланяецца свату, а яму ўзамен дае падарак. Падаркі даюцца і бацькам хлопца. Сваты ў час выпіўкі дагаворваліся аб дні заручын. А патом ехалі дадому.

После запоін дзяўчына шчыталася засватанай, запітай.

Заручыны

Іх задача – заручыцца згодай радні жаніха і радні нявесты на шлюб. Тут ужэ канкрэтна замацоўваюць згоду, дагаворваюцца пра ўсе падробнасці вяселля.

На заручыны прыглашалі больш людзей, чым на запоіны. Усе яны былі сведкамі згоды з двух бакоў. Маладыя абменьваліся кольцамі. После заручын ні аб якіх адмаўленнях на шчот шлюбу не магло і быць. Заручыны спраўлялі ў суботу. Бацькі хлопца і дзяўчыны абменьваліся падаркамі. За сталом спявалі, жартавалі, а пасля вячэры танцавалі. Закончвалася ўсё познім вечарам.

## Зборная субота ці дзявочы вечар

Перад вяселлем у суботу вечарам у маладой сабіраліся яе падружкі на дзявочы вечар. Гэта было пражчанне нявесты з сваім дзявоцтвам, з падружкамі. З імі после замужжа яна ўжэ не мала праў хадзіць на гулянкі.

Хлопцаў у хату не пускалі, дажэ жэніха. Дзяўчаты вілі вянкі, а галоўнае – вянок для маладой. Вянкі сімвалізавалі дзявочую чыстату, маладосць. Рабілі кветкі для дружак. Уючы вянкі, дзяўчаты спявалі песні, але не пад музыку. У эты вечар не танцавалі. Падружкі як бы пражчаліся з нявестаю, праводзілі з ёю паследні іх сумесны вечар, спяваючы жаласлівыя песні.

Калі вянок для маладой быў гатовы, ана падыходзіла да сваіх падружак і дзякавала іх з паклонам.

## Каравай

Каждый мамент падгатоўкі і выпечкі каравая (замешванне цеста, сажанне каравая ў печ, вyманне з печы) саправаджалася адпаведнымі рытуаламі і песнямі.

Напярэдадні вяселля вечарам і ў доме жаніха, і ў доме нявесты ў прысутствіі многіх сваякоў і знакомых праводзілася выпечка каравая. Для пячэння каравая  запрашаюць  3 жанчыны, адна з іх хросная маці. Начынае кажды этап падгатоўкі каравая, прасілі з бацькоў благаславення. Жанчыны начыналі рыхтаваць цеста для каравая. Адна сее праз сіта муку, другая сыпле муку ў дзяжу, а трэцяя, звычайна хросная маці, размешвае муку ў дзяжы.

Месяць цеста паціху, не спяша. Замешваючы цеста, рукі мачылі ў гарэлцы, каб цеста не ліпла к пальцам. Замясіўшы цеста, яго ставілі на прыпечак, штоб яно быстрэй падыйшло. Як цеста падыйдзе, ляпілі каравай і саджалі яго ў печ.

Пасля этага каравайніцы мылі рукі. Воду, у якой мылі рукі, вылівалі пад яблыню ці грушу на вуліцы. Гападары ставілі гарэлку і закуску і ўсе, хто прыстунічаў, частаваліся. Сажая каравай у печ, спявалі, штоб ён высокі рос, пры этым хлопалі ў ладошы і падскоквалі. На караваі рабілі разные ўкрашэнні. Калі каравай ужэ гатовы, каравайніцы падходзілі к печы і спявалі, пры гэтым вынімалі каравай з печы. Выймаюць каравай таксама сваеасабліва і стукаюць 3 разы лапатай у паталок. Каравай ставяць на стол і замачваюць яго. Патом хросная маці нясе яго ў сені, за  ёю ідуць і другія жанчыны, якія пяклі каравай. Пры гэтым спяваюць і танцуюць.

Калі каравай удаваўса, то лічылі, што гэта на шчасце. Было многа радасці, калі каравай намнога вырастаў. Каравай – гэта хлеб. А хлеб – гэта сімвал шчасця, дабрабыту, сімвал жызні. Прысутнасць каравая на вяселлі азначала пажаланне шчасця і дабрабыту маладой сям’і.

## Пасад

Пасад – гэта благаславенне жэніха і нявесты на шлюб, пажэланні ім шчаслівага жыцця.

Падругі адзяюць на галаву маладой вянок. Бацька ў гэты час укочвае дзяжу з сеней, тую самую, у якой мясілі цеста на каравай.  Маці кладзе на

дзяжу кажух, каб іхняя дачка багатая была. Хросная маці бярэ нявесту за руку, абводзіць яе вакруг дзяжы 3 разы і садзіць на дзяжу. На калені дзяўчыне бацька ложыць хлеб і соль. Бацькі, хросныя бацькі, і ўсе, хто сабраўся, абходзяць маладую 3 разы. На пасадзе брат нявесты расплятаў ёй касу і расчэсваў іх. После этого падружкі падвальвалі волосы з чатырох бакоў, дружка дзержала свечку, а падружка чэраз калечка працягвала невялікую колькасць валос і падносілі іх к агню. Пры ўсіх гэтых дзействіях спявалі песні.

На дзяжу сажалі толькі тых маладых, якія былі яшчэ дзяўчынамі. Перад вяселлем дзеўкі прызнаваліся ва ўсём. У адваротным выпадку пасад мог бы наклікаць на будучую сям’ю бяду.

У доме маладога адбываецца пачці што тое ж самае. Малады кланяецца ўсім, хто прыстунічае на этым абрадзе. Патом яго сажалі на дзяжу і падстрыгалі. Бацькі благаслаўлялі яго. Но ў хлопца эта царымонія канчалася быстрэй, чым у дзяўчыны.

Прыезд жаніха па нявесту

Ехаў малады ад маладой на конях, якіх зараней упрыгожвалі лентачкамі, званочкамі, галінкамі з дрэў. Калі ўсё было гатова к ат’езду, бацькі жэніха з стаканам гарэлкі ў руцэ і маці з жытам абходзілі 3 раза вакруг вазоў, пасля чаго маці абсыпала вазы і ўсіх, хто прыстунічаў жытам. Жанчыны спявалі. Бацька вылівае гарэлку ўверх над вазамі.

Едучы да маладой, маладога могуць астанаўліваць. Для этага рабілі загарожу. Ставілі стол ці стул пасярод вуліцы, на яго лажылі хлеб і соль. Перад кожнай загарожай трэба было астанавіцца. Тым, хто спыняў вяселле, давалі выкуп – гарэлку, канфеты, а калі і грошы. Вяселле астанаўліваць можна некалькі раз. Раньшэ людзі верылі, чым больш перашкод на шляху ў вяселля, тым лучшэ будуць жыць маладыя. А калі ніхто іх не астанаўліваў, то это плохо, дажэ й вельмі.

Па дарозе спяваюць песні. Калі пад’язджаюць да дому нявесты, вароты зачынены. Эту прэграду ім устройваюць хлопцы са стараны нявесты. Пачынаецца торг. Звычайна адкупліваюцца гарэлкай. Увайшоўшы ў двор, іх жджэ яшчэ адна прэграда, но ўжэ на гэты раз устрайваюць дзяўчыны, падругі маладой. З імі нялёгка справіцца. Ім даюць і грошы, і канфеты, і пірагі. Але дзяўчыны на гэтым не спыняліся. Яны прыдумлялі розныя заданні, якія павінен быў рабіць жэніх. Пасля ўсіх этых іспытанняў жэніх са сваімі суправаджальнымі маглі ўвасці ў хату. Тут іх сустракалі бацькі нявесты з хлебам і соллю. Галоўнага свата і хлопцаў са стараны маладога, якія не былі жынатыя, маці нявесты перавязвала палаценцамі. Дзяўчыны чаплялі на адзежу, на грудзі хлопцам кветкі, якія самі зрабілі ў дзявочы вечар. Жаніху таксама прыкраплялі кветкі на адзенне і на шапку.

Бацькі запрашаюць усіх к сталу. За сталом доўга не засіжваюцца. Маладыя нічога не п’юць і не ядзяць, бо ім нельга, так як іх у цэркві поп будзе прычашчаць. Жанчыны спяваюць песні. Затым выходзяць на вуліцу і ўсаджваюцца ў вазы. Маладыя сядзяць, едучы ў царкву, поразь. У першым

возе едзе жаніх, а ў другім нявеста. Калі ўсе пасядуць у вазы, маці маладой бярэ з хустачкі жыта з грашамі і абсыпае ім усе вазы, абыходзячы 3 разы вакол іх. Бацька маладой аблівае вазы гарэлкаю. Затым бацькі перакрэшчваюць усе вазы і перад імі дарогу. Стараюцца, штоб добра заехаць да вянца і з вянца прыехаць. А калі распражэцца конь па дарозе, то не будзе шчасця маладым, разойдуцца.

У час вянчання таксама глядзяць, штоб у час не патухла свечка ў маладога ці ў маладой, то той раньшэ ўмрэ. І, наогул, глядзяць, як гараць свечкі.

После вянчання ўсе віншуюць маладых і едуць да хаты к маладой. Цяпер ужэ едуць усе па парам: малады з маладою, сват з свацццяю...

Калі прыяжжаюць к дому, то ніхто не злазіць з вазоў. Ждалі запрашэння са стараны бацькоў. Толькі тады ішлі ў хату.

На парозе маладых устрэчалі бацькі нявесты. У руках дзве чаркі гарэлкі, два кускі сахару, дзве лусты хлеба. Маладыя бралі ў рукі чаркі, прыгублялі іх, тое, што засталося ў чарцы, вылівалі за спіну, а чаркі папярод сябе разбівалі і тапталі нагамі, на шчасце. Закусвалі хлебам з сахарам. Затым ішлі ў хату. Усе, хто прысутнічаў тут, паздраўлялі іх з законным шлюбам. Пры гэтым спяваюць. Маладыя кланяюцца ў ногі па 3 раза.

### Застолье

Бацькі запрашалі ўсіх гасцей за стол. Маладых сажалі на покуце пад абразамі. Каля маладой сядзела дружка, а каля маладога яго дружок. Усе пілі і елі, толькі маладыя часта не елі і не пілі. Іх кармілі после вясельнага застолля. Спявалі песні, гучалі вясёлыя тосты, жарты, пажаданні маладой сям'і. Госці за сталом крычалі "горка", пасля чаго жаніх і нявеста цалаваліся.

### Дзяльба каравая

Каравай прыносяць у хату, у гэты момант іграе музыка. У хаце маладой каравай дзяліўся паміж яе раднёй, а ў маладога – паміж яго. У гэты момант адбываўся перапой: сват разрэзваў каравай на кускі і запрашаў гасцей на каравай. Гэта перапой. Першымі падходзілі бацькі, лажылі перад маладымі падарунак (грошы, жывёлу, ці яшчэ што-нібудзь), бралі стаканы з гарэлкаю і выпівалі, затым бралі па куску каравая і адыходзілі ў старану. Сват зноў прыглашаў к караваю гасцей (хросных, сясцёр, братоў, дзядзек, цётак, бабуль, дзядуль). Яны таксама выпівалі гарэлку і дарылі, перапівалі маладым падарункі. Закусвалі караваем. Пры перапоі маладых надзялялі рознымі пажаданнямі. Усім, хто падносіў падаркі, маладыя дзякавалі паклонам. За стол садзіліся 2 разы. Паміж застолля маладыя танцавалі пад гармошку і спявалі песні і частушкі разгаварвалі.

### Ад'езд да дому маладога

За этым наступае самы хвалюючы мамент – дачка пакідае бацькаўскую хату, штоб стварыць сваю сям'ю. Тут не абыходзіцца без слёз. Бацькі дзяўчыны збіраюць яе прыданае, і яна вязе яго з сабою. Але малады доўжан

быў выкупіць і саму нявесту, і пасцель, і даць выкуп падружкам маладой, якія не хацелі з ёю раставацца. На воз, на каторым маладыя паедуць дадому, клалі падушкі. Перад тым як ехаць, перад первым возам запальвалі вязку саломы. Коні далжны былі пераскочыць чэраз агонь. Эту рабілася для таго, штоб сваркі і калатня асталіса пазадзі. Калі коні паехалі, то бацькі тры разы перакрэшчывалі вазы ў дарозе. Па дарозе іх зноў пераймалі і прасілі гарэлкі.

Сустрэча маладых

Ля двара жэніха маладых устрачалі з вялікай урачыстасцю. Было многа музыкі, песень, паздраўленняў. На парогу хаты іх устрэчалі бацькі маладога. Маладыя нізка кланяліся ім. Маці карміла адразу маладых, а патом і ўсіх другіх мёдам. Гэта было пажаланне маладым шчаслівага, салодкага жыцця і ўсім астатнім. А маладая аддавала мацеры маладога пірог, загорнуты ў палаценца. Маці брала іх за рукі і праводзіла ў хату. Спявалі песні.

Другі дзень вяселле ў хаце маладога

Усё праходзіла таксама, як і ў доме маладой. Садзіліся за сталы і ўгашчаліся. Было адно тое, чаго не было ў доме маладой. Маці маладога знімала з галавы нявесты вянок і адзявала ёй на галаву хутску. З дзяўчыны яе пераводзілі ў жанчыну. Калі дзялілі каравай, перапівалі, то маладая дарыла ў замен падаркі радні маладога За сталамі яшчэ трохі сядзелі і пачыналі разыходзіцца па дамам. Маладзёж спявала і танцавала пад гармошку. Маладых праводзілі ў комнату, дзе ім была паслана пасцель.

Утром маладых будзілі, а после этаго адбываўся агляд пасцелі. Калі маладая да вяселля была яшчэ дзяўчынай, то на другі дзень вяселле праходзіла яшчэ больш весела і закончвалася шчасліва для ўсіх.

На другі дзень у хату бацькоў маладога прыязжалі бацькі з раднёю маладой. Вяселле працягвалася. Многа спявалі і танцавалі. Бацькі маладой прасілі ў бацькоў маладога, штоб яны не абіжалі іх дачку.

Пры канцы вяселля правяралі ўменне нявесты як гаспадыні, як работніцы. Ад гэтага залежала, як складуцца атнашэння между маладой і свякрухай.

Чэраз нядзелю маладыя і бацькі маладога прыходзяць у госці да бацькоў маладой. А яшчэ праз нядзелю бацькі маладой прыходзяць у госці да маладых і да бацькоў маладога. Тут яны зноў п'юць, ядзяць, спяваюць і танцуюць.

На гэтым і сканчваецца ўвесь цыкл вясельнай абраднасці.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Абрад “Дзед на вяселлі”

На першы дзень вяселля робяць двух падстаўных. Жанчыну малога росту апранаюць у адзенне жаніха, а мужчыну высокага ў адзенне нявесты. У той момант, калі маладыя падыходзілі да хаты жаніха, іх сустракалі

падстаўныя жаніх і нявеста. Яны з маладымі жартавалі, маладому падстаўлялі яго падстаўную нявесту, а нявесце падстаўнога жаніха.

На другі дзень вяселля ў хаце жаніха рыхтаваліся да прыходу прыданы – радні маладое. Мужчынскія штаны і сарочку набівалі саломай. У патрэбным месце прычаплялі два чырвоныя буракі і маркоўку, рабілі таксама ляльку. Сустракаючы прыданых, паказвалі тым ляльку і казалі: “Паглядзіце ж, сваточкі, што за дзіва! Ваша дачка мала таго, што глухая, дык паглядзіце, якое ж дзіця за ноч нам нарадзіла!” Паказвае  ляльку, якую зрабілі з самай раніцы.

На варотах вешалі чучала дзеда. Прыданыя павінны сарваць гэтага дзеда і адвезці на печ гаспадыні вяселля.

Сваты са стараны маладога не даюць магчымасці сарваць і паміж прыданымі і раднёй маладога адбываецца спаборніцтва за дзеда. Падстаўныя жаніх і нявеста выконваюць сваю ролю, яны размаляваныя прывітаюць прыданых, абдымаючы і вымазваючы сватоў тым, чым намаляваныя самі. Потым, калі раздзеляць каравай, то бралі века з дзежкі і астаткі каравая клалі на века. Выносяць на вуліцу і частуюць дзяцей, якія стаяць на вуліцы.

Дзяўчаты-дружкі павінны асцярагаць века, каб яго не перакінулі цераз хату. Калі перакінуць, то не пойдуць дзеўкі замуж, а калі зберагуць, то выйдуць у гэтым годзе.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Вольгі Сяргееўна, 1936 г.н.,***
***Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1934 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

Галоўну коровайніцу білі лопатай по плячах пасля того, як усадзілі коровай у печ. Галоўнай коровайніцай была хрышчона маці. Коровай мясіць не дозволялі ўдаве ці разводной жанчыне. Галоўнай коровайніцай могла быць толькі жанчына, якая жыве ў пары.

Як прыедуць на свадзьбу да маладой, садзяцца за стол, ждуць пачастункаў і спяваюць:

А ў нашага пана свата…

А ў нашага пана свата
Кучэрава галава.
Ён кудрамі потрасе,
Нам гарэлкі прынясе.
Яму носіці цяжэло,
А нам піці охвотно.
А ў нашага пана свата
Кучэрава голова.
Ён кудрамі потрасе,
Нам закускі прынясе.
Яму носіці маркотна,
А нам піці охвотно.

Спявалі маладым:

Із-под новое клеці,
Із-под новое клеці,
Адкуль выйшла молода Волечка,
А за ею молоды Васілько,
На сукенку наступаючы,
На сукенку наступаючы,
У Волечкі ды пытаючы:
– Ты, Волечко, молодзенькая,
Ты, Волечко, молодзенькая,
Ці поедзеш ты з намі?
Ці поедзеш ты з намі,
І з намі да боярамі?
– Кабы моіх бацькоў да і воля,
Кабы моіх бацькоў да і воля,
Поехаці я з вамі готова,
Готова да радзесенька.

Спявалі маладой:

Сера вутка плыла
Із-под нового млына,
Сера вутка плыла,
А за ею серы селезень,
На клечко напрываючы,
У вуточкі пытаючы:
– Ты, вутоўка, ды серэнькая,
Ты, вутоўка, ды серэнькая,
Ці полеціш ты з намі селезнямі?
– Каб моіх вуценяток воля,
Каб моіх вуценяток воля,
То я бы з вамі, вутовосенька,
Паляцела бы радзёсенька.

Співаць тады, калі саджаюць на пасад. Усе госці вылазяць з-за стала. На одном стале ставяць вячэру маладому з маладою. І мічалка з свечкамі застаецца з імі. Мічалка – гэта дзеўка з рукі маладога, якая на вянцы дзяржыць свечкі.

Поглянь, мамко

Поглянь, мамко, ды на мой посад,
Поглянь, мамко, ды на мой посад.
Усе дзявочкі ды й у косах сядзяць,

А на мою імгла ўпала,
А на мою імгла ўпала,
Русу косу ды расчасала.
Расчасал русу косаньку,
Расчасала русу косаньку
Ды й праліла горку слёзаньку.

Як вязуць маладу к маладому:

Да на бок і на бок дорогі,
Да і не переходзіце дорогі.
Да няхай перейдзе Господ Бог,
Да няхай перейдзе бацька свой
І з усёю родзіною,
І з долей шчаслівою.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Сакавай Ганны Іванаўны, 1927 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Поўчын Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

Заручыны

На заручынах спяваюць:

Ой, чэкель, чэкель,
Пакрой дарогі. 2 р.
У нашага Васенькі
Крывыя ногі.
Подай кульбачку падпіраціся,
Штоб да Валечкі дабіраціся. 2 р.
Як пабегла Валечка два двары,
Ды мінаючы на трэці, ды ступаючы.
Ой, стану я, ды паслухаю, 2 р.
Што й ж людзі і гаворяць.
А цяпер і не кажыце, 2 р.
Сэрца маё да не сушыце,
Сэрцу жалю да не задавайце. 2 р.
Да от мамкі да не отлучайце.

Як прыйдёць на свадзьбу, то спяваюць. Як пасядуць за стол і ждуць гарэлкі:

А ў нашага пана-свата
Кучерава голова.
Он кудрямі потрасе,
Нам гарэлкі прынясе.

Ему насіці маркотна,
А нам піці ахвотна.
А ў нашага пана-свата
Кучерава голова.
Он кудрямі потрасе,
Нам закускі прынясе.
Ему насіці маркотна,
А нам есці ахвотна.

Спявалі маладым:

Із-пад новага млына
Сера вутайко плыла,
А за ёю серы селезень,
На клечко падплываючы, 2 р.
К вутаўкі пытаючы:
Ты, вутаўка, да серэнькая, 2 р.
Ці полеціш ты з намі, селезнякамі?
А яна кажа:
Каб моіх вуцянятак воля,
То я з вамі вуто-весенька
Паляцеці ды радзесенька.

Адкуль выйшла малада Валечка,
А за ёю малады Васілька, 2 р.
На сукенку паступаючы, 2 р.
У Валечкі да путаючы:
Ты, Валечко, молодзенькая, 2 р.
Ці пойдзеш з намі? 2 р.
І з намі да боярамі?
Кады маіх бацькоў і воля, 2 р.
Поехаці да радзесенька.

Усе госці вылазяць з-за стала. На адном столе ставяць вячэру маладому з маладой і мічалка з свечкамі застаецца з імі. Мічалка – гэта дзеўка з рукі маладого. Яна на вянцы дзержыць свечкі. Адпраўляюць з хаты дый спяваюць:

Поглянь, мамко, ды на мой пасад, 2 р.
Усе дзявочкі ды й у косах сядзяць.
.................................................... 2 р.
Русу косу да рашчасала,
Рашчасала русу косаньку,
Да й праліла горку слёзаньку.

Як вязуць молоду к молодому:

Да на бок і на бок дарогі,
Да і не пераходзьце дарогі,
Да няхай перайдзе Гаспод Бог,
Да няхай перайдзе бацько твой,
І з усею да радзінаю,
І з долькаю да шчасліваю.

Каравай

Пачынаецца ў суботу з караваю. Як пакуль ды спяваюць:

Ды месілі каравая, месілі,
Ды на Дунаі по водзіцу хадзілі,
Ой, той Дунаю адказаў,
Ой, ідзіце по водзіцу у крыніцу.

Ужо месяць і спяваюць:

Ой, ніхто ж і таго не ўгадае,
Што ў нашым караваі:
З трох рэчок водзіца,
З трох нівок пшаніца,
І тры долечкі масла,
І тры долечкі шчасця.

Глаўну каравайніцу білі лопатай по плячах, пасля таго як ўсадзілі ў печ каравай (хрышчона маці). Каравай мясіць не разрашалася ўдаве, разводнай. Можна толькі той жынчыне, што жыве ў пары.

Запоіны

Перад запоінамі, у той дзень, калі іх рабілі, з хаты не можна нікому нічога даваць.

Як едзе молоды з свадзьбаю, штоб ніхто голы на сустрэчу не выйшаў.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Шантар Марыі Пятроўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Вяселле як було? Моё вяселле було ўжо по новым порадкам. А от колі я прыйшла замуж, то моя свякруха расказвала про своё вяселле.

“Я стою каля вешніцы, а ідзе по вуліцы хлопец. Я поглядзела на яго: ён быў нізкі ростам, худзенькі, світка з плеч з’ехала, чубаты. У зборку хлопец незавідны. Я подумала, кому гэта доля попадзе. Каб хто сказаў, шо тобе, я б з ім спрачацца стала.

## Сваты

От, праз некаторы час прыходзяць да маіх бацькоў сваты. Сватаюць мяне за іх сына (а ў іх было восем сыноў). Імя жаніха не ўпаміналася. Я думала, мяне засваталі за Пракопа (малодшага сына), з якім я пасла з дзяцінства коней ды кароў, а мне падсунулі Рыгора. Калі я на яго глянула, то гэто буў мой хлопец, то ішоў по вуліцы".

Вяселле почыналоса з сватання дзеўчыны. Хлопец з бацькамі выбіраюць дзень і едуць до дзеўчыны і яе бацькоў у сваты.

Ідуць у мясоедныя дні. У пост і посныя дні не ідуць. Звычайна ідуць у суботу ці ў нідзелю. Бяруць з собою хлеб, соль і горелку. Заматваюць у рушнік. Шчэ з собою бяруць старшого свата, то бувае ці хросны бацько, ці дзядзько. Выходзячы з хаты, глядзяць на абразы ды хрысцяцца: "Дай, Божа, час добры, пору добру".

Калі молода жыве далеко, то едуць, а колі блізко, то ідуць пешшу. Як заходзяць у хату, адразу не кажуць, чого зайшлі, а гаворацъ, што прыехалі купляць цялушку. Бацькі маладой адказваюць: "Наша цялушка бодліва, крыклівa". Але сваты згоджаюцца. Тоды ставяць на стол гарэлку, кладуць хлеб, соль, пяюць, гуляюць. Подпіўшы спяваюць:

На заручынах былі,
Мёд, гарэлочку пілі,
Дваіх дзеток заручалі.
Одно дзіця да рожонае,
А другое да сужонае.
На заручынах бывалі,
Да гарэлочку ўлівалі.
Гарэлочка солодзенька,
А дзеўчынонька молодзенька.

## Запоіны

А дале булі запоіны (ці хто заве заручыны).

На запоінах договорваліса колі робіць вяселле. Пілі, гулялі. Затым нявеста подносіць молодому рушнік з хлебом і соллю. Сярэд нядзелі посылаюць от молодой у хату жаніха двуіх жанчын, каб яны памералі скацерць на стол, рушнік на ікону, уціральнік, ды колькі падарункаў дарыць. У молодого іх частавалі.

## Вяселле. Каравай

Вяселле пачынаецца ў суботу з коровая. Собіраліся жонкі і тая, шо жыве з мужыком, і не ўдова пячэ коровай. Зваласа вона старша коровайніца. Вона расчыняла коровай, а іншыя коровайніцы пелі:

Тройца по цэркві ходзіла, спаса за руку водзіла.
Прэчыста маці, прыйдзі к нашай хаці
Коровай расчыняці, вяселле почынаці.

Ніхто не ўгадае, што ў нашым да короваі:
З трох нівок пшеніца, з трох речок водзіца,
Дзьве дзежкі масла, і дзьве долечкі шчасця.

Потом месяць коровай і пяюць:

Сам Бог коровай месіць, а прэчыстая свеціць.
Ангелы воду носяць, а пророкі Бога просяць.
Хрыстос подлівае, хусткою накрывае.

Сажаюць коровай у печ на лапаці і тою лопатою робяць на столі накрэст. А ўсіх, хто ў хаце, лопатою по голове кладуць. Затым муюць рукі, нясуць воду ў сад і пяюць:

Ой, вішу, наш вішу, налемо воды ў місу,
Ручкі помыймо да на вішэнькі злемо,
Каб вішэнькі развіваліся, а молодыя красоваліся.
Мы ўсё дзело зробілі, коровай у печ усадзілі,
А вы, сватове, знайце, нам гарэлочкі налівайце.

Шчэ пякуць маленькія шышачкі, шоб подзеліць коровайніцам. На коровай ішлі адны жонкі, чоловекі на коровай не ішлі. Коровай пеклі ў молодой і ў молодого. У молодой своя родня, а ў молодого своя. Вынімаюць коровай з печы дай спяваюць:

Старша коровайніца, не садзіса на покуці,
А садзіса на порозі да на бітой дорозі,
Каб хлопчыкі не поднялі, коровая не ўхопілі.
Коровайніц саджаюць за стол і частуюць, пьюць, ядзяць, пяюць.
Коровайночкі п’яны да ўсё цесто покралі,
Да ў кішэнечкі схавалі.
А кішэнечкі оторваліса, а мы сорому набраліса.
Старша корованіца да на порозі ўпала,
І ногі задрала.
Смеяліса хлопцы, шо ў чорной сорочцы.
Чорна да плотняна, пробачайце, я п’яна.
А за коровая куса ўсю ноч тоўкуса.
Дайце мне хоця шышачку, коровая крышачку.

У суботу ішлі зывальнікі. Пара: мужык і жонка. От молодого звалі родню молодога, а от молодой – родню молодой. Потым пара молодой ідуць к молодому, а молодого к молодой і кажуць: “На хлеб, на соль, просім на вяселле”.

Увечары у суботу к молодой ідуць молоды з маршалкамі і мічалка со свечкамі. Гэта дзеўчына, котора нясе свечкі, якія сучуць молодым. А сучуць іх у молодого. Молода загортвае іх у мацерыю і лентою обвязвае. Шчэ ідзе з

молодым старшый сват. Молоды нясе, у хусточку белу завязваюць перніка, семкі, цукеркі і молодой хустку. Молода дае молодому рубашку. І воны адзяюць на вяселлі хустку і рубашку. І саджаюцца за стол, частуюцца, пьюць, гуляюць. Гармоніста молоды прыводзіць і хлопцы пяюць, жартуюць.

Старшая дружка да цыцатая,
А другая череватая,
Трэця на днях ходзіць,
А чацвёрта дзіця родзіць.

Нядзеля. Вянчанне

Пагулялі ў суботу. А ў нядзелю ідуць ці едуць к вянцу. Молоды са своёю роднёю, з маршалкамі, мічалкою. Молода з своёю роднёю, з дружкамі. Стояць у цэркві перэд вянцом і подходзіць старшы маршалок к молодой, расплетае косу. Затым ідуць молоды з молодою к іконі спасіцеля, патом к іконі Божай Мацеры, станоўляцца на калені і тры разы поклоняюцца, цэлуюць іконы. Затым бацюшко закончыць службу, сцелюць рушнік коло прастола, кладуць грошы, абвязваюць бацюшка рушніком. Становяцца молодые ногамі на грошы, мічалка дае молодым свечкі, бярэ пярсцёнкі маладых, кладзе на місочку. Затым подае венец молодого маршалку, той бярэ платком, дружка бярэ платком і дзержаць над головамі. Помоліўшыса, тры разы абводзіць вокруг прастола, прытым молодые беруцца за рукі, а бацюшко платком звязвае. Бацюшко вядзе, а пеўча с кліраса пяюць:

Положыў есі на головы ім венцы
От каменя чесных, от каменя чесных.
Жывота просіўшаго ў цябе і даў есі ім.

Ставіць зноў на рушнік. Кончылоса венчанне, молода цягне рушнік до дзьвярэй, каб дзеўкі ішлі замуж, не заседжваліся доўга. Молоды ідзе з раднёю своёю домоў к собе, а молода к собе. Сядзяцца за стол, снедаюць і спяваюць:

От венца, венца Божого слоўца,
От Божого храма ў нядзельку рана
Пайшла дзевонька із венчанья,
Под каліною стала,
Ручанькі ломіць, слёзанькі роніць,
У Бога долечкі просіць яе.
Прыйшоў до яе бацюхно:
Чого, дочачко, плачаш?
Што самі маем, то і табе даём,
Долечкі не ўгадаеш.

Потым прыходзіць молоды з роднёю, пірогі нясуць. Молода сядзіць за столом на кожусі і дружкі коло яе. Молоды пералазіць цераз стол к молодой. Потым сядаюць маршалкі і мічалка коло молодого і ўся родня. Подходзяць к столу жанчыны і пяюць:

Зародзі, Божэ, жыто да на новае лето.
Наша Олечка мала, каб у яе да жыто жала.

Потым усі пяюць песні:

Мы думалі, шо сваты едуць,
Аж яны да пяшком ідуць,
Маладога ў мяшку нясуць.
І ногі торчалі, і собакі ворчалі,
Ой, чыкель, чыкель по край дорогі,
У нашого молодого крывые ногі.
Дайце кульбочкі подпіраціся,
До молодой добіраціся.
А ты, молода, заганяй гусі,
Поцолуй молодого ў чорные вусы.
Шо вам за дзело, я поцолую
У яго бородку, шчэ й золотую.
Ежце палюшкі, покшыны няма,
Спіце на рагожах, падушак няма.
Каб наша беседонька
Да ўсё была веселенька
У пана-свата за сталом.
Дзе ж наш пан-сват дзеўся?
Ці ў ключ’е ўверцеўся?
Ці на полі да барануе?
Чаму сватоў да не частуе?
Ой, у нашага пана-свата
Кучарава галава.
Ён кудрамі патрасе,
Нам гарэлкі прынясе.
Ему носіць маркотно,
А нам піці весело.
А ў нашай пані-свахі кучарава голова.
Яна кудрамі патрасе,
Нам закуску поднясе.
Ой, выпіла, выхіліла,
Сама сябе пахваліла,
Бо богатого роду,
П’ю гарэлку як воду,
Завернуўшыся ў куток,

По тры чаркі ў радок.

І шуміць і гудзе, дробны дождзік ідзе.
Хто мяне, маладую, дадому правядзе?
Отозваўся козак на солодком меду:
Гуляй, гуляй дзеўчыночко, я до дому доведу.
Не вядзі ты мяне, не прошу я цябе.
Бо ў мяне ліха маці, будзе біці, ругаці.
Хай бы біла і ругала, як я мала была,
А цяпер я вяліка, знайшла сабе чалавека.

Пасядзелі за сталамі, попілі, поспявалі, як выйдуць з-за сталоў, ідуць спяваць. Бяруць хусточку, бяруцца рукамі. Кружкамі ходзяць і пяюць:

Ой, не пойдзе дробен дождык без цёмное хмары,
Ой, не возьме козак дзеўкі без людское славы.

І ўжэ молодого родня ідуць домоў, а молодой родня вязуць к молодому посцель і скрыню. Садзяцца жончыны і пяюць. Прывезлі к молодому, просяць выкупа. Ім нясуць гарэлку, закуску. Разгрузяць і едуць по молодых. Іх садзяць на пасад, пяюць песні жалобные, ці будзе жыто, шоб сыпала кружкі.

Становіся, родзіночка, усе ў рад,
Бо ідзе молода на пасад.
Усю родзіночку обышла,
Нідзе свойго бацюхна не знайшла,
Заплакала горэнько і пойшла.
Устань, устань, бацюхно, годзі спаць,
Пора своё дзіцятко отпраўляць.
Ці я тобе, матухно, надаела,
Што мяне аддаеш за дзеда?
Ці я тобе кошулечкі не прала?
Ці я тобе посцелечкі не слала?
Прала тобе кошулечку на моры,
Слала тобе посцелечку ў коморы,
Прала тобе кошулечку беленько,
Слала тобе посцелечку мякенько.
Молода сядзіць на посадзі, ёй спяваюць:
Сядзьмо, мамко, повячэраемо,
За вячэраю подзелімоса.
Тобе, мамко, уся худобенька,
А мне скрыня да коровонька.
Тобе, мамко, хата з вуглamі,
А мне скрыня з поставамі.

Тобе, мамко, ніт бердечко,
А мне только полоценечко.
Тобе, мамко, остоваціса,
А мне от цябе ўбіраціса.
Не журыса, молода дочачко,
Там тобе добрэ будзе,
Буйны вецер да сені мяце,
А сонейко пірогі пячэ,
А свякроўка вячэры наварыць,
Посадзіць за скамею,
Мёд, віно перад ею...
Посадзіць за століком
Со своім соколіком.
У нашого молодого чорные очы,
Вон не боіцца цёмное ночы.
Як жа мне, молодому, да ночы не бояцца?
Бог надо мною, коні надо мною,
Уся родзіонька моя ідзе со мною.

Даюць молодым по буханцы хлеба і солі. Молодой ікону, мічалка со свечкамі, старшая дружка і маршалок вядзе бацько платком. Садзяцца на воз, молода посыпае хмелем і жытом усіх, і на перавулках. Бацько з хлебам обходзіць тры разы воз, а жонкі спяваюць:

Выкоцілі, выкоцілі бочку медочку,
Высваталі, высваталі ў пана-свата дочку.
Да й повезом, да й повезом до свойго домочку,
Да й посадзім, да й посадзім на новой кроваці,
Што захочам, то й зробім з чужого дзіцяці.

Ад'язджаюць і пяюць:

На бок, на бок, ворогі,
Да не пераходзьце дорогі.
Да нехай перэйдзе Господ Бог,
А нехай перэйдзе бацько свой,
І з месяцам, і з зоркою, і з долькою.

Пад'язджаюць к молодого хаці, то спяваюць:

Гукнем нізко, бо ўжэ нашэ село блізко.
Хай пан-сват наш гарэлку гатуе,
Гарэлочку солодзеньку за дзевоньку молодзеньку.
Отчыняй, бацько, новы двор, бо едзе к тобе сын твой
І з своею верною жонкою, і з своею верною супругою.

Выходзіць бацько, бярэ платком, вядзе до хаты. Коло дзьверэй маці молодого накрываецца кожухом і дае молодым мёд. А вясельныя пяюць:

Знаці, дзевочко, знаці,
Шо ў цябе не своя маці
Накрыласа кожухом,
Хацела спужаці.

Молодые хапаюць мёд у мацеры і самі едзяць. Прывядуць у хату, покладзе молода ікону, хлеб, да вядуць у клець завіваць косы, рабіць коўба, і спяваюць:

Зародзі, Божэ, жыто да на новэ лето,
Зверху колосісто, а ў сярэдзіне ядрэністо.
Наша Олечка мала, шоб у яе да жыта жала.

Прывозяць коровай молодой і пірогі ў скацерці, кладуць на стол перніка і цукеркі. Маці молодого забірае со стола пірогі, подымае тры разы і кажа: "Благословіце, сваты". А сваты: "Бог благословіць". Сядзяць за столамі, п'юць, гуляюць. Потом молода ходзіць з жончынаю перапіваць. Бяруць слодок, шклянкі. Жанчына налівае піво, а молода подае ўсім по чарзе, хто сядзіць за столамі. Первым подаюць бацькам. Перап'е бацько корову, то ўся беседа шукае. Спявае:

Перапіў бацько кароўку
На мою бедну голоўку,
Каб рано ўстовала, да корову даіла.

Расходзяцца ў нядзелю вясельныя. У панядзелак пасылаюць жонку ад молодой будзіць молодых. Саджаюць яе за стол, частуюць, потым ідзе воно домоў. А от молодого ідуць маршалкі к родным молодой, нясуць пірога і бутылку. Сажаюць іх за стол, абвязваюць рушнікамі. Ідуць к молодому маршалкі. Ім таксамо даюць пірога, бутылку. Молоды ідзе зваць радзіну молодой. Гето пярэзвы называюцца.

Чэшчэнько, наша матухно,
Учыні добру волю,
Поедомо со мною.

Едуць к молодому. Молода кланяецца бацьку, мацеры, вешае ікону, рушнік на ікону накрывае, скацерць на стол сцеле, садзяцца за стол, п'юць, гуляюць, дзеляць коровай. Первы ковалочок даюць молодым, затым усёй беседзі.

Падаркі радне молодого дае маці молодой, подаркі носіць маршалок родне молодой.

Подзелілі подаркі, замочваюць, спяваюць:

Свахна свахне поклоніласа,
Каб на яе дзетонько не сварыласа.
Бо наша дочачка молодзенька,
На сон радзенька.
Не будзеце яе як певень пяе,
А будзеце яе як пастух жэне,
Той добры будзе.

Разыходзяцца сваты і спяваюць:

Да й булі мы ў свата,
Да була нам повага.
Да елі мы барана,
Чорного да рогатого,
У пана-свата да богатого,
Чорного, рогаценького,
У пана-свата богаценького.
Бывайце здоровы,
Бацьковы коровы,
Да ўжэ не ходзіці
Мне вас доіці.
Да ўжэ не стояці
Ранкам пад ганком.
Да не говорыці з козаком Іванам.
Кого я любіла, стоіць за плячыма,
А кого не знала, з тым на шлюб стала.

Да й жывуць, як у кого складзецца. От як тоды бувало.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай М.І.,***
***студэнтам Кувікам А.***

Вяселле ўсягда рабілі ў Мясаед. Калі сваты былі, то абавязкова пяклі пірага і з сабой бралі. У сваты, звычайна, хадзілі хрышчоны бацька і маці хлопца. Калі бацькі дзеўкі давалі згоду сватам, то потым ужо праводзілі заручыны або запоіны. На заручыны звалі бліжнюю радню. Ужо на запоінах маладая давала радне маладога падарункі. У гэты дзень дагаварваліся пра дзень свадзьбы. Перад свадзьбай маладую наражалі дружкі і спявалі ў гэты момант свадзебныя песні. Перад свадзьбай пяклі каравай. Каравай абавязкова пякла хросна маці маладой. У час замешвання цеста на каравай увесь час спявалі вясёлыя песні. Іх спявалі бліжнія цёткі маладой, якія дапамагалі

хроснай маці. Спявалі, калі замешвалі і ставілі каравай на бляху. Ваду ж, у якой мылі рукі пасля замешвання каравая, неслі ўсе разам і вылівалі на вішню. Калі вылівалі, то гаварылі: “Наша маладая, як вішанька ў садочку”.

У час пасаду маладой спяваць не нада, яна спяваць не далжна.

Калі маладыя ехалі ў царкву, то іх жытам абсыпалі, а калі ехалі назад, то іх мёдам прычашчалі, штоб жыццё сладкім было.

На вяселлі каравай дзяліў хросны бацька. У час свадзьбы пераадзяваліся, праводзілі розныя гульні.

Калі “дзялілі” прыданае, маладая гаварыла сваёй маці:

Сядзьмо, мамка, павячэраем,
Па вячэры, падзялімуся.
Табе, мамка, ніты і берца,
А мне, мамка, усё палаценцэ.

Калі маршалак звязваў падушкі маладой, каб забраць іх з сабою, то яму спявалі адпаведную песню, каб усе не забіраў:

Сколькі ў мамкі не рабі,
Мамка лішняго не дасць:
Дзве падушкі, дзве дзяружкі
І саломенны матрас.

Калі маладая была сіратою, то ёй спявалі:

Ой, там у полі, у полі,
У полі сцелецца туман,
А ў зялёным гаю
Казак з дзеўкай гуляў.
Яны гулялі, гулялі,
К ім цыганка прыйшла:
– Дай жа мне правую ручку,
Праўду скажу табе я.
– Ой, не веру, не веру цыганам,
Возьмеш абманеш мяне.
Выйдзі, цыганка, ты з гаю,
Праўду скажы аба мне.
Цыганка з гаю не выйшла,
Стала яна на краю:
– Чуеш, як плача дзяўчына,
Плача ў зялёным гаю.
Ой, ты, казача, казача,
………
Бедна яна сіраціна,
Бацькі і маці няма.

– Ой, дзяўчыну не кіну,
Ой, дзяўчыну люблю.
Крэпка яе пацалую,
Крэпка да сэрца прыжму.

Пасля таго, як пройдзе тыдзень пасля вяселля, госці маладога (яго родныя) ехалі да маладой, а яе госці – да маладога. Гэта называлася пярэзвы.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Каб дамовіцца аб шлюбе, хадзілі ў сваты к дзяўчыне. У сваты хадзілі бацькі маладога, хросныя бацькі і пазней прыходзіў малады. Дзяўчына не ведала, што к ёй прыдуць сватацца, а прыходзілі часцей позна. Сваякі маладога бралі з сабой хлеб, соль, гарэлку. Хросны бацька маладога браў торбу, палку, плоха апранаўся і прыходзіў першы ў хату. Ён пытаў:

– Я чуў, хазяечка, што ў гэтай хаце цёлка харошая для продажу ёсць.

Хазяйка адказвала яму:

– Я цёлкі не прадаю, а ёсць у мяне дачка. Я яе замуж выдаю.

Сват гаварыў:

– Я – гэты купец, што хочу купіць цёлку і дачку ў нявесткі ўзяць.

Калі дзеўка не хацела ісці за гэтага хлопца замуж, то яна лажыла яму ў воз вараны гарбуз. А калі хлопец нравіўся дзяўчыне, а дзяўчына хлопцу, то садзіліся за стол, елі, пілі.

Кругла мала балоценька.
Ды хоць яно малюсенька,
Але птушачак у ім поўна.
Адны птушачкі адлятаюць,
А другія птушачкі прылятаюць.
Маладая дзеванька
Ды хоць яна малодзенька,
Сватоў у яе поўна.
Адны сваты прыязджаюць,
А другія – ад’язджаюць.

***

Як прыехаў казачэнька з поля,
Прывязаў ён каня да явара.
Дай заплакаў каля коня стоя,
Забалела галованька мая.
Ой, дай, Божа, вечара даждаці,
Пашлю сватоў дзяўчыну сватаці,
А сам буду пад акном стаяць,
Паслухаю, што будуць казаць.

А дзяўчына па святліцы ходзіць,
Яна свае белы ручкі ломіць.
Маці, маці, парадніца ў хаце,
Скажы, маці, што сватам казаці.
Ці мне, маці, прыданне гатовіці,
Ці мне, маці, шчэй год пагуляці.

***

Салавей у саду спявае
Як на дудцы йграе.
Аддай мяне, мая маці,
Дзе хораша ў хаце.
Дзе завіцы, як сястрыцы,
Свякроўка, як маці.
Дзе дзіверы маладыя
Любяць жартаваці.
Адзін кіўне, другі маргне,
Трэці пацалуе.
А мой мілы, чарнабровы,
Да ўсё гэта чуе.
А мой мілы, чарнабровы,
Усё гэта чуе.
Да на маё бела цела
Нагайку гатуе.
Нагаечка драцяная
Высока ўзлятае,
Сарочачка палатняна
Ў цела ўлінае.
Сарочачка палатняна
Ў цела ўлінае,
Фартушына вышывана
Ад слёз не ўсыхае.
Салавей у саду спявае,
Як на дудцы йграе.
Аддай мяне, мая маці,
Дзе хораша ў хаце.
Дзе завіцы, як сястрыцы,
Свякруха, як маці.
Дзе дзіверы маладыя
Любяць жартаваці.

***

Ці знаеш ты, дзеванька,
Што ў вас людзі начуюць,
Цябе таргуюць?

Аддае цябе мамачка,
Бярэ чару залатую.
Мілей ёй чара залатая,
Чым дачка радная.

За тыдзень да вяселля прыходзілі к маладой самыя блізкія сваякі. Бацькі абменьваліся хлебам, соллю. Хросная маці нявесты перавязвала сватоў і жаніха ручнікамі. А дзяўчына дарыла ўсім сваякам маладога падаркі. Дамаўляліся, калі будзе свадзьба.

Гарэла сасна, палала,
Пад ёй дзеўка стаяла.
Пад ёй дзеўка стаяла,
Русую косу чэсала.
Ой, косы, косы, вы мае,
Доўга служылі вы ў мяне.
Ой, больш служыць не будзеце,
Бо ўжо пад вянок пойдзеце.
Гарэла сасна, палала,
Пад ёй дзеўка стаяла.

Вечарам напярэдадні вяселля рашчынялі каравай. Рашчынялі і ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты. Прыходзіла хросная маці маладой і прыносіла з сабой дзяжу. Раніцай маладая ішла за сяброўкамі, каб яны таксама рашчынялі каравай. Сколькі было жанчын – столькі звалі і мужчын. Хросную маці называлі старэйшай каравайніцай. Пелі песні:

Ішлі і беглі каравайначкі
Через гару высокую.
Няслі муку пшанічную
І яйца курэй маладых.
Памыйце рукі беленька,
Замясіце каравай харашэнька.

Калі рашчынялі каравай, то тапілі печ.

У нашым караваі
Сямі крыніц вада,
Сямі пшаніц мука,
Сямі кароў масла –
Дай, Божа, маладым шчасця.

Калі печ разгаралася, ставілі ў яе каравай. Спявалі:

Печ караваю хоча.

Караваю, мой раю,
Каля цябе хораша я іграю.
Расці, расці, каравай.

У маладога дома пяклі каравай таксама. Пелі песні:

Наша печка рагоча,
Караваю хоча.
Наша печка калываецца,
Караваю наліваецца.

Калі каравай быў гатовы, то свахі ў шутку абмазвалі ўсіх мукой.

Калі прыходзіў дзень вяселля, то да маладой прыязджалі сябры маладога. А перад гэтым маладую прачуць і выходзяць сяброўкі маладой. Сваха пытала, сколькі дадуць дружкі за маладую. Дружкі гаварылі, што многа. У гэты час адзін дружок хоча пралезці і ўкрасці ў маладой туфлі. Калі ён украдзе, то за маладую хлопцы ўжо не плацяць. А калі туфель не ўкрадуць, то сколькі сваха скажа, столькі за маладую і заплацяць. Грошы брала старэйшая дружка. Потым садзіліся за стол, пілі, елі, гулялі, пелі песні.

Жыта ў полі,
Жыта ў полі людзі засявалі,
Ну, а маці з сваім сынам
Ціха размаўлялі.
Жыта, маці, жыта, маці,
Жыта не палова,
Як мне дзеўку не любіць –
Яна чарнаброва.
Жыта, сынку, жыта, сынку,
Жыта– не пшаніца,
Як ту дзеўку не хваліць,
Яна– чараўніца.
Жыта, маці, жыта, маці,
Жыта –каласочкі,
Як ту дзеўку не любіці,
У яе чорны вочкі.
Жыта, сынку, жыта, сынку,
Жыта пара жаці,
Калі дзеўку вельмі любіш,
То хадзема ў сваты.
Жыта ў полі, жыта ў полі,
Жыта ўсе нажалі,
А ў нашым ў сяле
Вяселле згулялі.

***

Ой, нашыя сваты елі, елі
Да цэлага каня з'елі,
Па сталу качалі.
На стале – ні костачкі,
Пад сталом – ні крошачкі.

***

Сакатала курка, сакатала,
Чула вяселле – не сказала.
А мы тут курку на юшку,
Пер'е – на падушку.

Маладыя на вяселлі не елі, не пілі. І пад вечар пачыналі дзяліць каравай маладой. Першымі вызывалі бацькоў і сваякоў, потым дружак маладой. Каравай выносілі і дзялілі пад музыку. Дзялілі старшы сват і маршалак. Калі каравай уносілі, свахі пелі песні. Сваякі давалі падарункі маладым.

Сівы конь,
Сівы конь,
Залатая грыва,
Няхай наша маладая
Любіць маладога,
Пака будзе жыва.

Калі падзеляць каравай, маладую забіралі к маладому. У маладога таксама ў пярэдадні шлюбу пякуць каравай. Перад ад'ездам маладая пяе:

Выгрэбай, маці, жар, жар,
Будзе табе дочкі жаль, жаль.
Будзе жаль, да не вернецца,
Твае сэрца перавернецца.
Да із хаты да іголкаю,
Да із дому да мяцёлкаю.

Едуць к маладому і пяюць:

Адчыняй, матка, новы двор,
Едзе к табе нявестачка, сынок твой.

Дома ў бацькоў маладога сустракаюць перад сталом на дварэ. Маладых прымае маці, яна пераварачвае кажух і адзявае яго, потым яна дае з ложачкі маладым мёд і абсыпае іх жытам, каб жылі багата. Усе заходзілі ў хату і маладыя садзіліся на лаву, на якой ляжаў перавёрнуты кажух. Маладую за стол вёў брат і пеў:

Брат сястру за ручку дубіць,
А сястрыца ўпіраецца,
Слязамі заліваецца.

За сталом гулялі, елі, пілі, весяліліся, танцавалі ўсю ноч. Пад вечар, пад гармошку ўносілі каравай маладога. Калі яго дзялілі, то першымі вызывалі бацькоў маладога, а потым блізкіх сваякоў. Маладая ўсім дарыць падарункі, і за каравай сваякі кладуць на талерку грошы і гавораць маладым пажаданні. Пасля таго, як падзеляць каравай, свякруха знімае з маладой вяночак і адзявае ёй хустку. Увесь час пяюць песні і весяляцца.

Ой, у полі стаяла вежа,
Стаяла вежа муравана.
Ой, у той вежы
Дружок ляжыць.
Устань, дружок, не ляжы,
Каравай ты падзялі.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Макарэвіч Марыі Аляксееўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Ярмош Н.***

Пачынаецца вяселле з выпечкі каравая і месяца. Збіраюцца каравайніцы. Хросная маці вымешвае і сажае ў печ каравай і месяц. Усе мыюць рукі і выносяць ваду. Выліваюць на вішню з песняй:

Ой, вісу нам вісу
Да налемо да воды ў місу.
Да ручанькі памыймо,
На вішаньку залемо.
Каб вішанькі развіваліся,
Маладыя красаваліся.

Так спяваюць тры разы. Затым усе садзяцца за стол і частуюцца за тое, каб спёкся добры каравай. Каравайніцы вартуюць каравай у печы, каб яго ніхто не ўкраў. Каравай і месяц хросная вынімае з печы і прыказвае: “Быў я ў печы, асмаліў сабе плечы. Каб не сыр да масла, то ўсё б пагасла”. Каравай і месяц ставяць на века з дзежкі і абвязваюць белай хусткай. Каравайніцы радзяць каравай і спяваюць:

Да ніхто з вас не знае,
Што ў гэтым да каравае:
Сем рэчак вадзіца,
Сем рэзак пшаніца
І бачоначак масла,
Штоб было жыццё красна.

***

Як мы свайго каравая радзілі
Да ў бор па зелле хадзілі.
Нам зялёны бор адказаў:
"Я вашага каравая не знаю,
Я для вас зеллейка не маю".

Як нарадзяць каравай, раднейшыя ідуць да маладой зрэзваць свечкі. З булкі хлеба зразаюць верх і ставяць две свечкі: свечку маладога і маладой. Маці маладой знізу абвязвае свечкі ручніком. Свечкі дзяржыць старшая сваха, абавязкова дзяўчына. Маці нявесты абвязвае іх усіх ручнікамі. Усе вяртаюцца да маладога і садзяцца за сталы частавацца. У гэты час бацькі маладога пасылаюць дваіх гасцей да маладой з мукой і яйцамі з абвяшчэннем, што вяселле пачалося. Ад маладога таксама ідуць двое з абвяшчэннем вяселля. Іх там частуюць. Каравайніцы вяртаюцца ад нявесты, і за імі скора ідзе поезд маладога па маладую. Ідуць з караваем. Калі блізка – ідуць пяшком, а далёка – едуць на вазах, запрэжанымі каньмі, і спяваюць:

Адступіцеся, варажэнькі, з дарогі,
Да не пераходзьце дарогі,
Да нехай перэйдзе Госпад Бог,
Да нехай перэйдзе бацька твой.
Спяваюць тры разы.

***

Насыпайце жыта поўныя карыта,
Карміце коні ў доўгую дарогу.
Што ў вялікай дарожаньцы
Трое варот стаіць,
Што ў адные вароцейкі
Месячык засвеціць,
А ў другія вароцейкі сонейка засвеціць,
А ў трэція – малады (Іванка) ўедзе.
Месячык засвеціць – відненька будзе.
Сонейка ўзойдзе – цепленько будзе.
Іванко ўедзе – вяселлейка будзе.

Заехалі к маладой. Іх не пускаюць у хату. Дзядзька маладой адзяецца ў шаўца і бые боты. Гаворыць, што вы не туды заехалі, тут няма ніякага вяселля. Маладога радня спявае:

| | |
|---|---|
| Ой, памерзлі, пачэзлі | 2 р. |
| У вялікай дарозе. | |
| Ой, хто тута да падабрэе, | 2 р. |

Ён нас да разагрэе.
Што (Насценька) да падабрэе, 2 р.
Яна нас да разагрэе.

***

Каля цесцева двара
Там вялікая гара.
Нельга к горы прыступіці,
Канячэньку да напаіці.
Адтуль выйшла, выбегла
Маладзенькая Насценька.
Яна к коню прыступіла,
Канячэньку да напаіла.
Дала коню овса, сена,
Сама пайшла на пасад села.
Дала коню аброку,
Сама села каля яго боку.

Маршалкі таргуюцца, даюць выкуп, і іх пускаюць у хату нявесты. Малады дае маладой хустачку з падарункамі. Сажаюць за стол, п’юць, едзяць і песняй гукаюць нявесту:

– Сівы, белы зелязёнчыку,
Ці быў жа ты на Дунайчыку?
Ці бачыў жа ты сваю вутаньку?
– Ой, не то ж я яе бачыў,
Я з ёю наплаваўся.
Ой, скоро я на Дунай заплыў,
Аж яна па вірах плыве.
А на ёй пер’е сіяе,
А пад его вада іграе.
– Ой, серая вутовко,
Ці палеціш ты з намі,
І з намі, зелезнямі?
– Як будзе погода,
То я з вамі готова.
Як будзе дожджык ісці,
То я буду на вірах плаваць.
– Маладзенькі Іваночка,
Ці бачыў ты сваю Насцечку.
– Дай не то ж я яе бачыў.
Я з ёю да нагаварыўся.
Ой, скоро я на двор заехаў,
А яна ў клецць бяжыць,
А на ёй плацце шуршыць.

Я за ёю, даганяючы,
На суконьку наступаючы.
– Маладзенькая Насцечка,
Ці паедзеш ты з намі,
І з намі да баярамі?
– Як будзе пагода,
Я з вамі гатова.

***

Да прыляцеў саловейко,
Сеў на лому.
Ой, скучненько мне самому.
Каб моя голубонька со мною,
Шчабятаў бы ўсю ночку я з ёю.
Да прыехаў Іваночку,
Сеў за столом.
Ой, скучненько мне самому.
Каб мая Насточка со мною,
Гаварыў бы ўсю ночку я з ёю.

***

Ой, ляцелі гусонькі через сад,
Гукнулі Насцечку на пасад.
– Што ж вам, гусонькі, до того,
Ёсць у мяне бацюхно для того.
Ён мяне харашэнько нарадзіць,
Ён мяне на пасадзік посадзіць.

Пасля песен пачынаюць падводзіць к маладому маладую (нявесту). Паляўнічы са стрэльбай падводзіць два разы падстаўных нявест. Паляўнічы хваліць падстаўную маладую. Госці яе не прымаюць, даюць паляўнічаму чарку гарэлкі і просяць найці ім іхнюю нявесту. За трэцім разам прыводзіць нявесту. Нявеста пачынае развітвацца, кланяецца тры раза і цалуецца з маткай, бацькам і родзічамі. Бацька з іконай благаслаўляюць маладую на пасад ісці. Сажаюць за стол. К маладому садзяцца тры дружкі, а нявеста садзіцца за імі (на лаве падсланы кажух для маладога і маладой). Маршалкі скупоўваюць дружак, каб уступілі месца маладой ля маладога. Пачынаецца пераклічка песнямі:

Госці маладога спяваюць:

У вашае дружкі паршывыя ручкі:
І з кішэні да не выймае,
Нашых грошай не прымае.

Госці нявесты:

А ў нашае дружкі залатыя ручкі:
Яна шыла да вышывала,
По чырвончыку брала.

**Госці маладога:**

Адна дружка цыцатая,
А другая – чараватая,
А трэцяя на днях ходзіць,
Да вечара сына родзіць.

Госці нявесты:

А ў маршалка барада як лапата,
Шапка цяляча, шубка свіняча,
А чаботы ды авечыя.
Шапка рыкнула, шубка віскнула,
А чаботы ды бекалі.

**Госці маладога:**

А ў вашае дружкі цыцкі як падушкі.
Цыцкаю карася ўбіла,
На прыпечку асмаліла,
А на печы разбіла,
Гасцей частавала.

Дружкі бяруць выкуп (гарэлку, грошы) і ўступаюць месца маладой каля маладога. Дружкі ставяць маршалкам гасцінец: талерку з гарбузікамі і арэхамі. Усе частуюцца і выходзяць гуляць. Малады з маладой, дружкі і маршалкі застаюцца за сталом. Старшы маршалак і брат маладой мяняюцца месяцамі і месяц аб месяц стукаюць, хто каго пераможа, чый будзе верх: маладой і маладога. Старэйшы маршалак бярэ маладую за платочак, а маладая бярэ за платочак маладога і ўсе бяруцца за рукі і абходзяць вакол стала тры разы. Маладая падходзіць к іконам, становіцца на лаву, цалуе ікону маці, а сваю забірае з сабой і едзе к маладому. Забіраюць пасцель маладое і скрыню. Пасцель і скрыню таксама выкупліваюць.

На двары маладога сустракаюць маладых бацька і маці з хлебам і соллю, абсыпаюць іх тры разы жытам і хмелем, каб у іх жыццё ладна звілося. А ў сенцах маладая (калі яна яшчэ дзяўчына) ступае на дзежку, а свякруха, пераадзетая ў вывернуты кажух, прывітвае іх мёдам і віном і запрашае ўсіх у хату. Заходзячы ў хату, госці спяваюць:

А мы сюды да не ведалі,
Самі коні заехалі.
Дарогаю-жаптанкаю
За своею казанкаю.
Дарогаю-тапатухаю
За своею маладухаю.

Садзяцца за стол і спяваюць:

Тут нас не прымаюць,
Тут намі ганьбуюць,
Тут нас не частуюць.

Бацька і маці, і ўсе раднейшыя маладога падходзяць к маладым і іх прыветваюць, дараць падарункі, а маладая абдарывае іх таксама падарункамі. Усе частуюцца. Пачынаецца перапой радні маладой.

Госці спяваюць:

На дабранач, маці, не лажыся спаці,
Давай, мамка, павячэрайма,
Павячэраў, падзелімся.
Табе, мамка, ўся худобонька,
А мне – скрыня да коровонька.
Табе, мамка, конёчок,
А мне – Іванка–голубочок.

Дарыць бацька і маці маладой.
Госці спяваюць:

Перапіў бацька кароўку
Ды на маю бедну галоўку.
Трэба рана ўставаці
Ды кароўку даіці.

Госці частуюцца і пяюць:

Ой, ковалю, ковалюсенька, 2 р.
Да скуй жа мне да сокероньку,
Да зрабі мне да кроватоньку,
Да прыкуй мне зоўзуленьку.
Штоб рано ковала 2 р.
Да мяне пабужала.
Бо ў мяне не свая маці, 2 р.
Не будзе побужаці.

Да не будзе побужаці,
Па суседах судзіці.
Ой, суседонькі мое, 2 р.
Ой, што ў мене за невехнонька:
Сонліва, дрэмліва. 2 р.
Сонца не зайдзе – ляжа,
Сонца ўзойдзе – устане.
А ўстане да паснедае
І мамоньку да отведае.

***

У вінового да колодзежа
Там Настонька да воду брала
Да ў край свой паглядала:
Ці не едзе мой бацюхно,
Ці не везе мне госцінчыка
Чырвоного да Васільчыка.
Не так рада я Васільчыку,
Як я рада свайму бацюхну.

***

Да хіліцеся, лугі, із горы ў доліну,
Да нехай будзе відно
На кого мне жалко.
Ой, жалка мне да на
Бацюхна свайго.
Куда едзе – не заедзе,
Калі ідзе – не зайдзе.
І варота мінае, ко мне не заезджае.
А я малодзенька бачу,
Сільненька плачу.
Плачу, плачу да ўтруся,
Да бацюхна не вярнуся.

***

– Ой, белая ты бярозанька,
Ой, чаму ты не зялёная.
– Ой, як жа мне зялёнай быць,
Праз мяне шлях-дарога.
Каля мяне купцы ідуць,
Із мяне дубцы рэжуць,
На карэньчыках агонь кладуць,
А ветачкі падкладваюць.

***

– Ой, мамонько родная, 2 р.
Ратуй ты мяне з гора,
Із вялікага мора.
– Ой, рада б я да ратаваці, 2 р.
Не ўмею поплаваці.
А ні чоўна, ні вясла – 2 р.
Усё бура разнесла.
Чоўны мае да дубовыя,
Веселечка веселёвае.

Вечар канчаецца, госці выходзяць з-за стала і выходзяць:

Разганяйся, маці, па вялікай хаце,
То ў той куток, то ў запечак,
Галавою аб прыпечак.

***

Прапіў бацька дочку
На салодкам мядочку.
Напіўшыся – скача,
Праспаўшыся – плача.

Свякроў бярэ чапялу і ею знімае вянок з галавы нявесткі і атдае дружцы, надзяе ёй на голаву, каб яна скора пайшла замуж. Расплятае нявестцы касу, закручвае каўпак з кос і надзяе хустку. Госці спяваюць:

Маладзенькая Насцечка, 2 р.
Ужо табе да мінаецца
Дзявочае дзеваваньейка,
Руса каса зачэсаньейка.
Хоць будзеш чэсаці,
То не будзеш заплетаці,
Хоць будзеш заплетаць,
То не будзеш каснік уплетаць.

На другі дзень вяселля рэжуць каравай. Хросны бацька ўстае і кажа: “Бацька, маці, уся радзіма ў хаце, дазвольце першы, другі, трэці раз каравай разразаці”. Каравай паднімае ўгару і так паўтарае тры разы. Бацькі адказваюць: “Бог благаславіць і мы благаслаўляем. Пачынайце”. Кветкі з каравая ставяць на покуце. Века качаюць у парог, каб дзяўчаты і хлопцы жаніліся. Каравай разразаюць, падзываюць родных, даюць каравай і чарку. Родныя выпіваюць чарку, дораць маладым падарункі і віншаванні:“Дару бульбы падполье, штоб было дзяцей поўнае застолле”, “Дару вядро суніц, каб не хадзіў да другіх маладзіц”, “Дару цыбулю, штоб нявестка не давала свякрыве дулю”.

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Кошман Валянціны Міхайлаўны,*
*студэнткай Клімовіч І.*

Веселе гулялос гледзячы на посты, на высокосны год, на год Удавы. Калі етые настаюць дні, то веселля ніхто дажэй і не пачуе, і не пабачыць, бо калі хто і выходзіў замуж, жэніўса, то жылі не доўго, ето буў велікі грэх – робіць веселле ў пост, у высокосны год, а ешчэ лучэй – у год Удавы. Ніводная маці не разрашала сыну жэніцца, бо знала, шо ўмрэ, колі жэніцца ў год Удавы.

Веселе робілі, калі ўжэ засватаюць молодую. Жэніх з своімі бацькамі і роднымі людзьмі шлі до невесты ў хату. Ужэ ў хаці оны не говорылі, шо прышлі сватацца, а говорылі:

– Шлі цераз вашу хату – свет горыць, рэшылі зайці. Говорать, у вас голубка жыве, а ў нас голубок е для яе. Мо спаруём іх як-небудзь?

Так бацькі, поговорыўшы пра хозяйство, соглашаюцца. Маці жэніха отдае хлеб-соль, з екім прышлі, і ўсё остальнэ, шо прынеслі.

На сватах дагаварваюцца, у які дзень будзе свадзьба, прыгледаючы ўсе празнікі, посты.

Во і настае дзень веселля. Дзеўкі адзеваюць невесту ў белэе плацце, а фату на голову доўжна адзець толькі дружка молодой. Колі фата була ўжэ на голове ў молодой, то ўсе садзіліс і начыналі говорыць об весёлых гісторыях, якія булі, калі дружылі до замужэства. Етые гісторыі означалі, шо больш такіх гулянок не будзе і дзяўчына, екая выходзіць замуж, убывае з кругу сваіх подружок. Она доўжна ўжэ будзе думаць об хозяйстві, а гулянкі ўсе толькі ўспамінаць.

Тут молодой завязваюць красны пояс, каб не наговорылі, і даюць свечану соль. Соль доўжна освеціць на Велікдзень або ў Чысты чэцвер.

Потом пачынаюць збірацца госці, якіх невеста з дружкою прыглашала перэд веселлем. Оны заходзілі ў хату з хлебам-сольлю і не сразу говарылі об веселлі, а путаліс, як жывуць, чым занімаюцца і толькі тогда звалі на веселле.

Во і чутно, ек і жэніх з своімі роднымі і госцямі ідзе выкупляць свою хорошуху. Госці ў молодого собіраюцца трохі раней, бо шчэ перэд выходом до невесты садзяцца за столы і навучаюць жэніха, ето тожэ означало, шо молоды хлопец становіцца хозяіном і не доўжон ходзіць на гулянку, ек ето робіў перэд веселлем.

Выкуп проводзяць у дзверах, поставіўшы ў дзверах стол, дружка з другом таргуюца. Дружка доўжна ўзяць ек больш грошэй і ўсего, шо ў іх е. Прыдумваецца багато разных прычын, шоб выцягнуць грошы. Потом, колі ўжэ выкупілі молодых, госці едуць у сельсавет на рэгістрацыю і сразу ў цэркву на венчанне. От’езжаючы от хаты, маці чытае заговор на добрую жытку і дае нацельные хрэсцікі, бо ў цэркву ўсягда трэба. Колі вертаюцца з венчання, то едуць сразу до невесты, дома ждуць маці і бацько. Перэд порогом маці і бацько дзержаць пірог, молодые доўжны ўкусіць еты пірог,

так узнаюць, хто будзе больш командоваць у хаці. Затым молодых обсыпаюць цветамі з сахарам, тожэ на добрую жызню.

Усе садзяцца за столы, гуляюць, спеваюць, танцуюць. Тут і коровай до стола подносяць. Коровай печэ хросна молодого, колі хросной молодога нема, то хросна молодой. На руцэ хросной доўжно буць абручальнэ кольцо, колі вона будзе замешваць цесто.

Коровай украшаецца вылепкамі з цеста і зробленымі з бумагі цветамі. Коровай подносіцца на полотняном рушніку і отдаецца хросному молодой, вон і заведуе короваем, пока ўсіх не обойдзе і не заберэ подаркі для молодых.

Сразу ж после падзелу каравая маці жэніха падходзіць да молодых, знімала з невесты фату і завязвае ёй хустку і фартух – сімвол жаночай долі. Фату хавала і не давала нікому мераць.

Потом брала рушнік, на еком молодые стоялі ў цэркві, колі венчаліс, на столе рассоўвае тарэлкі і ложыць рушнік, на рушнік кладзе тарэлкі, вілкі, ложкі, фужэры, якімі пользаваліс молодые (усё выцірае). Снімае цветочкі жэніха і невесты, перэплетае іх поміж собой і тожэ ложыць на рушнік. Сюды ж она складвала венчальные свечкі і ту частку коровая, ека прынадлежала молодым. Потом усё, шо сопровождало молодых у час веселля, маці згортвала ў рушнік і перэвязвало красным поясам – оберэгом. Колі веселле заканчвалос, то ўсё гета хавала ў скрыню, робілос етэ для шчаслівого семейного жыцця.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Шаўчук К. С., 1931 г.н.,***
***студэнткай Шаўчук Т.***

Рабілі вяселле толькі ў мясаед і пасля Раздва. У пост вяселле не робяць.

Пачыналась вяселле ў суботу. Яно было на працяг целага тыдня.

У вечары у суботу малады нес невесте перніка (бісквіт) і хустку. А маладая адарывала маладога рубашкой і стужкой, якой перевязывалі свечкі на веселле.

Першым было сватанне (заручыны) – ішлі сватацца ў любы дзень тыдня. Дагаварываліся пра пасаг маладой. Перапой – аддаюць праданае маладым бацькі.

“Прыхадзіце сватацца ,
Я не буду пратацца.
Я невеста малада,
Падбіраю жыніха!”

У сваты хадзілі бацькі і сват.

Калі згаджаліся, то на стол ставілі бутылку гарэлкі, а праз тыдзень – ужо яе пілі, і гэта былі запоіны. Калі адмовлялі, то не пілі гарэлкі і забіралі яе.

На заручыных спяваюць:

“Дай, Божа, маладым
Шчасця і долі абаім!”
“Ой, на моры, да на камені,
Там сідзелі два ангелы.
Оні сідзелі і гаварылі:
Паляцелі на заручыны,
Олю заручваюць,
Ад бацька, ад маці адлучываюць,
Да к Сяргею прылучваюць”.

Каравай

Каравай пякуць у пятніцу шчастлівыя замужныя жанчыны, які не ўдовы, не другій раз замужам. Калі пяклі каравай:

“А ў нашай каравайніцы
Залатыя нарукавніцы.
Сядзьмо, мамко, павечераем,
А павечераўшы, падзелімо.
Табе, мамко, хата з вуглами,
А мне –скрыня з пастяламі.
Табе, мамко, уся худобонька,
А мне, мамко, одна карованька.”

Расплетанне косы – пераход деўкі да жонкі, расплятаюць касу і завівают коўба.

Калі вялі маладую да маладога, яго маці і бацька выносілі дзежку (невелічкая бочка, дзе разчынялі тесто на хлеб). Дзяўчына павінна была заскочыць на яе. Калі не заскочыць, то яна ўжо не дзеўка. А калі не дзеўка, то ў той дзежкі не будзе падыходзіць цесто.

Тупі, тупі, конікі,
Прывязалі ў двор ступу.
А не ступу, а не калодзіцу,
А не дзеўку, а малодзіцу.

Госці – ответны абряд. Ідуць да маладога, пасля маладой.

Вяселле. Маладых обсыпалі хмелем, калі малады вез маладу дадому. Калі ад’язджаюць ад двара маладой, обсыпаюць маладых пшаніцаю. Гэта рабіў бацька маладой: “Дай, Божа, маладым шчасця і долю абоім, штоб жылі і багацелі, і спераду гарбацелі!”

Калі садзілі маладого і маладую за стол, палілі свечкі, якія намечаны і перавязаны стужкой. Па таму, як горят свечкі, глядзелі, хто ў хаце будзе галоўны. Чья свечка хутчей сгарает, тот і галовны ў сям’і.

На веселле сіроце спявалі:

Становіся, радзінанько, ўсе ў ряд,
Бо іщціме Галю на пасад.
Усю радзінаньку абыйшла
І нійдзе сваю мамоньку не найшла,
І заплакала сільненько і пайшла.
Трубіце, ангелы, у трубы,
Разбудзіце мамоньку з гроба.
-–Устань, мамонька, годзе спаць!
Пора свое дзіцятко адпраўляць.
-–Доченька моя, рада б я ўстаць,
Навернулі сырое зямлі,
Да нельга мне ўзняць.

Маладая ў час пасада не спявае, а плача.

На веселле каравай дзяліў дзяцька ці кум. Першія кускі маладым. Астатнія ўсім удельнікам вяселля.

Пасля вяселля на наступным тыдзьне хадзілі ў госці да маладой. (Абряд “Пірогі”)

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

Прымярэнне сарочак

После запоін ішлі к маладому мерацъ сарочкі. Бралі хросну мацер і хроснага бацькі жонку і ехалі.

Мералі маладога, абмяралі дзверы, окны, мералі, сколько рушнікоў трэба павесіць у хаце.

І ўжэ як дружка шыла маладому штаны, то зашывала калошы, шоб яны не бачылі (маладыя). Да ў первую брачну ноч малады должан адзець маладое бяльё, каб быць у хаце хазяінам. Гэта была як і шутка. Сарочкі абавязкова шылі з палатна, каб на полі рос добра лён. Бабе маладога давалі кохту. Гэта быў жартоўны абрад.

**Пірагі**

Яго спраўлялі цераз нядзелю пасля вяселля. Первую нядзелю ішлі да маладое мацер, а цераз тыдзень ішлі ўжэ к маладому. Але самыя глаўныя пірагі былі ў маладое мацер, таму што зяць ехаў у госці і глядзеў, дачка чэсная, значыць, зяць купляе падарка харошага цешчы, а як не, то прывозіў хамута. І цэлую нядзелю дачка не павінна ісці к мацер, шоб прывыкала к сям’е маладога. І ўжо цешча збіраласа з сёстрамі, дзецьмі (калі жанатыя) і спявала:

Цешча зяця дажыдаецца,

Цешча зяця дажыдаецца,
На дарогу прыглядаецца:
Ці не едзе яе дочэнька,
Ці не едзе яе дочэнька,
Ці не прывязалі ёй фартушынку.

А фартуха, еслі нечэсна дзеўка выйшла за хлопца і ідзе к мацер, яка не павінна прыпінаць фартуха чырвонага, ідзе ці без фартуха, ці ў белым.

Еслі дзеўка без фартуха, маці чуе тады неладнае. Зяць тады адзявае цешчы хамута і ўсе тады пачынаюць спяваць:

Зяць на цешчы капусту вазіў,
Маладую на паказку вазіў.
Вон із дому, цешча мая,
Пру, стой, маладая жына.

І тады зяць хлешча нагайкаю цешчу і жонку. А калі прывозіў чэсную, то дорыць чобаты (выцяжкі), і тады спяваюць:

Чобаты, чобаты вы мае,
Нарабілі клопату да вы мне.
За гэтыя чобаты дачку ўзяў,
Я пастаўлю чобаты, хай стаяць,
Буду я на чобаты паглядаць,
Пра дачушку ўспамінаць.
Чобаты, чобаты вы мае,
Нарабілі клопату да вы мне.

Патом абменьваліся пірагамі: зяцева маці вязе свахі свае пірагі, а гэтая цешча пяке свае пірагі і абязацельно стол хлебам, шоб так была багата маладых хата здароўем і хлебам.

На пірагі звалі сугубо родзічаў. Хросныя былі обязацельно, патаму што хросныя мянялі хлеб.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Толкач М.***

Цераз нядзелю пасля свадзьбы зяць ехаў у госці да цешчы. Калі нявеста была чэсная, то зяць вёз добры падарак, а калі не, то хамут.

Цэлую нядзелю маладая не ішла да маці, бо павінна была прывыкнуць да новай сям'і.

На пірагі збіраліся цешча і яе родныя сёстры і спявалі такую песню:

Цешча зяця дажыдае, цешча зяця дажыдае,
На дарогу прыглядае, ці не едзе яе дочэнька,

Ці не едзе яе дочэнька,
Ці прыпнула фартуха, ці прыпнула фартуха.

Калі вышла замуж нячэсная, то дочка не надзявае краснага фартуха на пірагі да маці. А маці прыглядаецца і чакае, што зробіць зяць. Калі маці бачыць, што дачка без фартуха, або фартух не красны, то ўжо чакае неладнага. Зяць вешае на шыю цешчы хамут і тады пачынаюць спяваць:

Ой, зяць на цешчы капусту вазіў,
Маладую жану ў прыпражцы вазіў.
Ой, не галуба цешча мая,
Пру, стой, маладая жана.

Зяць жонку і цешчу хлешча нагайкаю, а калі чэсная нявеста была, то зяць прывозіць цешчы чобаты або выцяжкі. Усе тады спяваюць:

Чобаты, чобаты, вы мае,
Нарабілі клопату вы мне.
За гэтыя чобаты дачку ўзялі,
Я пастаўлю чобаты, хай стаяць,
Буду я на чобаты паглядаць.
Чобаты, чобаты, вы мае,
Нарабілі клопату вы мне.

Тады ўжо гуляюць, абменьваюцца пірагамі. У гэты дзень абавязкова зяць прывозіць сваі пірагі.

Існуюць некалькі павер'яў: калі багаты стол, тады добра жыць будуць. Звалі ў гэты дзень сугуба родзічэй і хросных бацькоў. Хросныя бацькі мелі асабістую ролю ў гэты дзень: яны мянялі пірагі.

### Прымярэнне сарочак

На першую брачную ноч абавязкова шылі новае бяллё для маладых. Гэта перадвясельны абрад. Маладыя пасля запоін ішлі мераць сарочкі, бралі хроснага бацьку і маці, якія абмервалі маладога. Таксама абмервалі і для свякрові сарочкі. Яшчэ абмервалі дзверы, вокны. Для маладога шылі ўсё: і бяллё, і штаны, і сарочкі.

На першую брачную ноч малады павінен адзець усё новае бяллё. Шылі сарочкі з палатна. Гэта быў перадвясельны абрад, які тычыўся толькі маладога.

***Запісана ў в. Старажоўцы***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

### Сваты

Прыходзяць у сваты к дзяўчыне і пытаюць:

– Ці можна зайсці ў хату?
А затым пытаюць таксама:
– Ці ў вас прадаецца цяліца?
Яны адказваюць:
– У нас не цяліца, а красная дзявіца. Мы яе не прадаём, а замуж аддаём.
Садзяцца за стол, калі сагласны на вяселле. Пьюць чарку і дамаўляюцца пра вяселле.

**Каравай**

Прыходзяць свахі і расчыняюць каравай. Пасля памылі рукі і вынеслі пад вішню і спяваюць:

Ой, вісу, наш вісу,
Да налеймо воды ў місу,
Да памыймо ручанькі,
Да залеймо да на вішаньку.
Няхай вішанькі развіваюцца,
А маладыя насладжаюцца.

Выймаюць каравай з печы:

Ніхто не ўгадае, што ў нашым караваі.
З трох рэчок вадзіца,
З трох рэзак пшаніца,
І грудачка масла,
Штоб долечка счасна.

Старэйшая каравайніца пяе:

Не садзіся да на покуце,
Сядзь сабе на парозе,
Да на бітай дарозе,
Шоб хлопчыкі не падышлі,
Каравая не ўхапілі.

Каравайніца хвалілася, што ў яе сарочак: “адна – на мне, дзве – у пранне, чатыры у кудзелі”.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

У нядзелю ўпарану прыедзе молоды і к молодой, маршалок, сват. Прыедуць по молоду к венцу ехаць. І ўжэ кладуць хлеб на стол. Не пірог – хлеб. Ёго ў молодое пеклі. Чырвоны такі, круглы. Старшы маршалок ці хто, шоб з ёго рукі мужчына, церэз усю боханку зрэжэ ножэм корку ету зверху, вурэжэ дзірку. Да свечкі ўставіць – ёго, ее, тоўстыя, іх на коровае мужчыны

скучылі. Дружка горыном обоўяжэ, шоб не россоўваліса. Звяжэ старша сваха от ее свечкі полотном унізу, да нарадзяць етымі бумагамі да свецёлцы даюць. На рукі ён перкаль, а на перкаль хлеб. У молодое ў косе лента. Одзежу вона сама шыла да на венец одзевала. А платок мацерын. Венок на ее голове з цветамі да лентамі, богато лентоў. Даўно колісь венка не було. Хустку заўязвалі – два рогі на шыі і два – на лоб, гузом. Да ўжэ йдуць молодые на возы садзіцца, вона на свой, а вон – на свой. Потом едуць і к венцу. Дружкі поўхорошваюць дугі кветкамі, шамшэлі коням на шыі повесяць. Да едуць у село, дзе цэркоў. А ек у своём селе цэркоў, то, бувало, і не ехалі, шлі. На венчанне ёго і ее мацерэ не едуць. І бацькі не едуць. Едуць маршалкі, дружкі, цёткі, дзядзькі которые. Хросные мо і ехалі, але ў цэркаў не шлі. Прыедуць у село, дзе цэркоў, постаўяць коні ў екого хозяіна да пешкі ў цэркаў. Молоды под руку молоду да ў цэркоў, да там розыйдуцца, вон у одзін бок, вона ў другі. А то маршалкі молодого ведуць, а дружкі молоду. Людзей чужых у цэркві поўно. Стануць. Поп свечкі паліць, дае ім у рукі. Просцілку перэд прэстолом просцілаюць, полотно за просцілку. Бувало, одну наметку просцілалі свахі ці то дружкі. Маршалкі копейкі клалі. Постануць молодые на подножку. Наметка ее, копейкі ёго. Маршалок над ім венца дзержыць, дружка над ею. Венцэ колерыстые булі, а на версі крэшчыкі позолочаные. Ек одным днём венчаліся, то на кажну пару свое венцэ. Поп знімае з палцоў кольца, ложыць на прэстол, почытае, поспевае, берэ тые кольца да ўжэ путае: “Не обешчаўся другой?” “Не”.”Не обешчалася другому?” “Не”. Мой обешчаліся, але ж так казалі. Дай ёй ёго кольцо, дае ёму её, подзержаць еку мінуту на своіх палцах іх да ўжэ назад мяняюцца. Тры разы меняліса. Пітнуць віна, даваў ёму-ёй, ёму-ёй, ёму-ёй. Одным бокам шоб пілі. Звяжуць молодым рукі платочком, поп рызаю рукі накрывае да кругом прэстола водзіць по сонцу, тры разы обуходзяць. Ззаду свецёлка хлеб з свечкамі несе. Да ўжэ к царскім вороцям молодые йдуць, вон кланяецца тры раз тым вороцям да цалуе іх, а дале вона. Свецёлка не шла к вороцям. От вуходзяць з цэркву да молода тэ полотно поцягла за ногою ў порог, до звонніцы, а катора той на двор, шоб ето дзеўкі замуж хутка шлі. А катора і к прэстолу полотно тэ ці рушнік ногою грэбене, шоб не йшлі дзеўкі хутко замуж. Смехом. Дзеці хапаюць копейкі, да перву тую, на екуй молода стояла. Староста тэе полотно собе, а просцілку свахі на воз, на ёй молодые садзіліса. Вуводзіць молоды молоду под руку з цэркву. Ек з цэркву вуходзяць, то свахі подойдуць к цэркві, спеваюць, мо то і дружкі з імі:

Да мецёна ёлонька дзеркачэм,
Да звеньчона наша дзевонька з панічэм.
Да з тым панічэм, шо ўчора буў
Да нашу дзевоньку полюбіў.
Да з правое ручэнькі персня зняў,
Да занёс матухні показаў:
– Ето тобе, матухно, подаркі
От мое Галі-каханкі.

Пешкі йдуць до воза, а воз на дворэ стояў чыём-то. Спеваюць:

Му ў цэркві бувалі,
Трое зеллёў відалі.
Однэ зелле – рута,
А другее – м’ята,
А трэйцяя – кветкі.
Звенчоные дзеткі.

На ёго воз сядуць да к ёй поехалі. На еты воз шчэ маршалок, дружка і свецёлка садзіліса, а на ее остатніе. Гуляюць ек од венца. Спевалі:

Подзякуймо Богу,
Погосцкому попу,
Шо двое дзеток звеньчаў,
Небогато за венец узяў.
Двоек молодзенькіх
За чотыры золоценькіх.

Спевалі й таке:

Од венца, од венца,
От божого слоўца,
От божого краю
Да ў недзелечку рано.

А шчэ так:

Ішло дзіця од венца,
Не промовім слоўца.
Руса коса до пояса,
Коснічок до долу.
Не говорыш зо мною.
Поясок жывоток ломіць,
Слоўца не промовіць.

І етак спевалі:

Од венца ідучы,
Загубіў Іванко онучы.
А Галочка збірала
Да Іванку оддавала.

І музыка ек од венца. Колісь не гармонь, да смук. Хорошэ граў. І баранан буў. Танцуюць. До самое хаты гуляюць. На покуці посадзяць молодых. Поедзяць, шо на венцэ булі, да ўжэ вон зобіраецца до себе – з роднею, маршалком, свецёлкою. Едзе по свой воз, за короваем. Прыедзе ці там прыйдзе, да ўжэ зыходзіцца ёго род по молоду ехаць. Спеваюць:

Ой, там, на горэ, на новом дворэ,
Там рано засвечэно.
Ой, там радзіцца, нараджаецца,
Іванко ў дорогу пабіраецца.
Вон радзіцца, нараджаецца,
У бацюхна путаецца:
– Ці мне ў парочку,
Ці одного коня вороного,
Шоб завезці мене, молодого,
Ой, до мое Галочкі на размову?

От таку шчэ:

Да не куй, хлопчынку, золотого ножа,
Да подкуй вороного коня.
Бо тобе прыехаць к цесцю ў госці
Да лугамі, борамі,
Каменнымі мостамі.
Да луг будзе шумеці,
А камень звінеці,
Да золотую збрую
Да будзе вращчэці.
Ек зачуюць людзі,
То нам слава будзе,
Ек зачуюць лепшой,
То нам будзе слаўней жэ.

Подводы под’едуць. На іх сена ці солому кінуць багато, вушэй за дравцы. На первой попонку просцелюць. Молоды з хаты выходзіць. У руцэ госцінец молодой у платочок заўязаны, канхветы, коржыкі, шчэ ека прысмака. Колісь рубашка навыпуск, доўга, поесом переўязвалі. Бувало, шо рубашка і ў штаны ўвобрана. Штаны ў чоботы ўвобраные. Чоботы хромовуе. На заворочках да з подковочкамі. Бувало, у одных чобоцях п’яць пар повеньчаецца. І ў яловуе чоботы обуваліса, дзёгцём мазалі. Ек беднота, то і ў лапцях. Новух, а як жэ. Маршалок коровая несе, нараджаного, свечкі на палочках. Тры пірогі ў корзіні ці вереньцы несуць. І гарэлку. Свецёлка хлеб з свечкамі.

Спеваюць:

Едзь, едзь, Іванко, да не вечорыса,
Под каліною не становіса,
Бо ўжэ твою Галоньку
Дружкі обселі, свахны обпелі.
По ліцу слёзінка,
По плечу хусцінка,
От слёз мокрэнька.
Нехай сядуць, опеваюць,
Як самі знаюць.
Я свою Галоньку
Між імі познаю.

Як на возы посядуць, спеваюць:

Ану-це, повірайцеся, бо ўжэ свет,
Поедом у королёўшчыну на отвед,
Да розоб'ёмо каменну сцену мечамі,
Дай возьмомо сабе дзевоньку з свечамі.

Поселі дай поехалі. Бацько й мацер не едуць. У дорозі заспеваюць:

Да не лекайса, цесцю,
Немногі зяць едзе,
Небагато баяр везе –
Восьмеро, дзеўяцеро,
Усіх дзесяцеро,
Два конічэнькі збродных,
Два браценькі родных.
А трэйця сестрыца,
Молодой езовіца.

А ек скоро ўжэ хата молодое, то і таку спеваюць:

З-под белого да берэзнічку
Сіву конік да й вубегае.
Ой, не сам жэ вон бяжыць,
На ём Іванку сядзіць.
Ой, коню мой, коню,
Похваляйса ты мною.
Перэд цесцёвум двором
Перэскоч да ворoцечка,
Да не вубі да копыцечка,
Да не вуломі драночкі,
Не зробі неславочкі.
Да дай цесцю знаці,

Шо му едом да воёваці,
Два дворэ звоюём
І комору зграбуём.
Комороньку да новенькую,
А дзевоньку молодзенькую.

А ек ужэ к хаці под’езджаюць, то спеваюць:

Бразнулі тарэлочкі на столе,
Топнулі конючэнькі на дворэ,
Ой, мой Іванко едзе ко мне,
Готуй кубелечко для мяне.

Ето, шоб готовілі скрыню ці ободню. Вечорэе ўжэ. Молода коло окна сядзіць да вуглядае молодого круз персцень. От ужэ ідуць по двору з короваём. Под дзверыма на порозі стануць. Заспеваюць:

У гордового цесця
Стоіць зяць за воротамі.
Шо на зяця да мецёл меце,
Да дробны дожджык ідзе.
Ой, крыўса я, крыўса,
Покі не намочыўса.
Коні мое понамокалі,
А собулі позвісалі,
А свашэчкі поохрыпалі.

Цесць отчыняе дзверы, да хатніе путаюць:

Дзе ж ву, свахі, волочыліса,
Шо по пояс намочыліса?
Ці на грэблі лапці плелі,
Ці на мосту ворсалі,
Шо к нам да прычасалі.

То бояры так ужэ просяцца:

Пусці, сваце, у хату,
Му ж цебе не згубімо,
Возьмомо, кого любімо.
Вуп’ёмо да по кубочку,
Возьмомо да голубочку.
Вуп’ёмо да подскочымо,
Возьмом кого хочомо.

А з хаты:

Шо ето на порог лезе,
Чорные, кудлатые,
Хлебные да богатые?

Да цесць ужэ кажэ: “Просім, сваты, у хату, просім, сваты, у хату”. На руках у ёго пірог, на тарэлцы. Да молоды і род ёго ў хату йдуць. Поперэду коровая неслі. Спеваюць:

Коло цесцёвого двору
Да вусокая гора.
Нельга к горэ прыступіці,
Конічэнька да напоіці.
Аж вуйшла, вубегла
Молодая Галонька.
Вона к горэ прыступіла,
Конічэнька да напоіла,
Узяла коня за грывоньку,
А Іванка за ручэньку
Да повела да й у светліцоньку.
Дала коню оўса і сена,
Сама коло ёго седзела.
Дала коню оўса і броку,
Да сама села коло боку.

Коло порога з маршалкамі становіцца молоды і коровай тут. Молода з дружкамі особно сядзіць на лаві ці на слоні. Её коровай на столе. На ёй кохта з рукавамі, назад зашпільваецца. Сперэду шытые брыжкі, сподніца з паскамі краснымі, усякімі. Хвартух з плацу красны, вішнёвы, зялёны, сіні, екі буў з паскамі. Сподніца колерыста, вішнёва ці голубова, ці зелёна, ці ека там. З сукна, бувало, да важка. Перкалёўка на ёй, вушэй грудзей перкалёва, з-под кохты бачно, ніжэй полотняна, подстанік полотняны. На ногах боцінкі з вусокімі каблукамі ці чэрэвікамі з халяўкамі на шнурках. Хустка веліка назад заўязана, церноўка колеру ўсякого, только не чорного, поверх вянок. Шоўкова споўзае. А даўно колісь, головушка на голове обруч з берэсніцы наметкаю об’ўязаны. У косу одзін коснік уплеталі, на обручэ коснікі доўгіе ўсякого колеру – чырвоные, вішнёвые. Іх вешалі, як молоды к хаці.

Ек заходзяць тые ў хату, от молодое бягуць да за стол садзяцца. Небогато, душ п’яць, шэсць. Да спеваюць:

Не наступай, Літва,
Бо будзе ў нас бітва,
Будом біці да воёваці,
Да свое Галонькі не оддаваці.

А боярые ім:

Вон, вон, казакі, з хаты,
Хочэ тут комусар стаці
Да з своею комусаркаю,
Да з кудравою да голоўкою.

Да ўцякаюць тые з-за столоў. Мужчына от молодое берэ её коровая, а от молодого – ёго коровая да ўжэ вушаюць. От её хросны бацько, от ёго маршалок. Уверх подымуць ёго вушэй. По хаці ідуць. На короваёх свечкі горацьь. От молодое спеваюць:

Да наша свечка ясна,
Да наша Галонька красна.

От молодого одказваюць:

Да наша свечка ясна,
Да наш Іванко красны.

От её ўжэ так:

Чый, чый коровай вушэй?
Наш, наш коровай вушэй.

А бояры:

Чый, чый коровай вушэй?
Наш, наш коровай вушэй.

Да ўжэ коровай молодое на поліцу ці на печ, а молодого на стол, дзе молодое буў проці покута. Спеваюць бояры стоя:

Да ў нашого свата
Хорошая хата,
Чырчыком обсыпана,
Каліною да обтыкана.

Да за столы садзяцца. Первуе молодые. Ек зусім колісь, то на полу іх саджалі, а то ўжэ на покуці. На кожуху сядзелі, маці просцілала. Коровай перэд імі. Свецёлка коло молодого, вона сестра ёму ці так дзеўка, шоб незамужам. Ек мала сестра, то й мала свецёлка. Свечкі на окно ставіць. Саджаюць блізкіх молодого за етые столы, а далёкіх за тые. Спевалі:

Сядзь, свахо, да й не верціса.

Есьцека место, дай садзіса,
Бо нашые кошкі ласы,
Вурвалі кубло свасі.

Його беседу садзілі, а от её только дружок. Спевалі:

Прыехалі вулёўцы,
Просыпалі на столе чырвонцы.
Да погордуй, бацюхно, погордуй,
Хоць зімоньку мене погодуй.
Да не буду, дзіця моё, гордоваць,
Прыехалі госценькі, трэба оддаць.

На столах ужэ стоіць. Вупіваюць. Усім носяць однаково есці. Людзей чужых на дворэ поўно, шыюцца, аж вокна открываюцца. Боярые посядуць, поедзяць. Спеваюць:

Да суха каша, суха,
А наша сваха глуха.
Затым вона не чуе,
Шо з сватом ночуе.

У Перэрові була на веселлі, і там спявалі:

Да хорошая ж хата,
Печ её побелёная,
Чэсць её отхвалёная.
Да хорошая свашка,
Да помазана кашка.
Комара затрошчылі,
Свахам кашу засмачылі.

І от таке:

Да паставілі юху.
Да вуцяг да комар муху.
Да поселі на крысі,
Да потопіліса ў місі.

Поспяваюць етэ, поедзяць да дружок скупоўвацімуць. Бо воны ж шылі молодому тыдзень сподне, перкалёўку. Тоўклі, шоб на стол з того поставіць. Спеваюць:

У старшого маршалка
Золотая ручка.

З кішэні да не вуймае,
Дружок не скупляе.

Дружка тарэлку дзержыць, а етые кладуць копейкі ці мо так смехом, чэрэпкі екіе, бувало. Спеваюць:

Старшы маршалок Нікон
По сметнічку нікае,
Да чэрэпочкі збірае,
Да дружэчок скупляе.

Ек зерне сыпнуць, то спеваюць:

Старшы маршалок кішэню верне,
Знайшоў ячне зерне,
Да кладзе на тарэлцы,
Да плачэ по гарэлцы,
Да не так по гарэлцы,
Ек по красной дзеўцы.

Рубля паложаць на ту тарэлку, спеваюць:

Маршалочкі молодые,
Вашы грошы золотые,
Нашы дружкі хорошы
Да не беруць вашы грошы.

А етые ўжо й не ведаюць, як скупіць. То тут песня:

Старша дружка да цыцата,
Другая чэрэвата,
А трэйця на дню ходзіць
Да ўвечары сына родзіць.

А ета ўжэ про маршалкоў:

А наш маршалок хорош,
Ек яблуко, вочы,
Ек гарбуза, нос,
Ледзьві чэрэво ў хату ўнёс.

То ўжэ таку заспеваюць дружкам:

А дружэчкі не дорожэце,
Дорого не берэце,

Бо дорого веліка,
Трэ сено купіці,
Конікі покорміці.

Песён, шо Господзі, Господзі! Да ўжэ ек дружкі согласны, то сыплюць гарбузянкі на тарэлку. А маршалкі ўжэ бутылку станоўяць, пірога кладуць. Бувало ўсё сало нарэжуць у тарэлочку да станоўляць. Да дружкі перэўязваюць маршалкоў наметкамі, кветкі почэпляюць кажна сваёму. Колісь трох маршалкоў обоўязвалі. Ек скупяць, чуць поедзяць, улазяць з-за стала, гуляюць. І час, два ці тры ночы, садзяцца за стол. Зноў вупіваюць, едзяць.

Гарэлкі колісь мало було. Бувало, жытню муку з картоплямі ў цэбер велізны стоўкуць, на печ, тыдзень стоіць, укісне, сахарыною подсолодзяць да на вяселлі п’юць. Сахарыну перэжарацць, шоб жоўты квас буў. Одным келюшочком, шо на раз коўценуць, усе столы обойдуць. Одна дружка коўценула да ўжэ танцуе ў сенях, прыпеўвае: “На горэ куры несуцца”. То за её да ў сцёпку схавалі сорам.

Перва закуска була сало сырэ. Елі боршч з мясом, яешню, коўбасу, юху, рыбу і жарану, і падзевану, коржыкі пшэнічные, пампушкі мочаные ў сыр. Ек бедные булі, то й мало тое закускі. Казалі: “Да каша, да пампушка, да ўся наша закуска”. Жытнім рошчыняць, а пшанічным замесілі. І ячным мясілі. То тыя пампушкі ўжэ з осцюкамі. Последня закуска була каша з пшона на молоцэ і компот з груш. Казалі: “Ужэ послі кашы няма пашы” і “После груш нічого не воруш”. Ек скуповалі дружок, погулялі да зноў за сталы, то спевалі:

Да ў Іванка за гумном
Да й стаяць стогі радом,
Да й усе пшэнічные.
А ў Галонькі за столом
Да й сядзяць сваты ўсе радом,
Да й усе ж воны да молодые.

Отспеваюць етэ ўсе. Да ўжэ музыкі будуць. Була гармонь, смук, барабан. Кветкамі іх народжвалі. Смуком хорошчэ мог вуйграць, чым гормонею. А шчэ ж перэпой буў. Молодому ў ее хаці перэпівалі боярые. Хлопцу мало перэпівалі. Хто рубля, хто копейкі. Квасом перепівалі, компотом ці з груш, ці з яблук. Молоды седзіць. Екі мужчына поўз столы йдзе з чаркою. Становіцца, кажэ: “Перэпівае сусед” ці хто там. А той кажэ: “Перэпіваю шчасце, долю і век доўгі”. Ці так: “Перэпіваю ту целіцу, шо скачэ з печы на поліцу”. І так: “Перэпіваю кошэль гліны, шоб не прошло году да булі ў вас родзіны”. Адна баба казала: “Перэпіваю жэробчыка і поўжэробчыка, шоб прывозіў бабі дрова”. Бувало, бацько коня хлопцу перэп’е. Адзін бацько казаў: “І себе перэпіваю, шоб глядзеў”. Даўно колісь хлопцу не перэпівалі, толькі дзеўцы. Прыданые перэп’юць да ўжэ кончаюць. Ек розыходзяцца, песню еку невеселну заспеваюць. Позно розыходзіліся.

*Запісана ў г. Тураў*
*ад Гаршкалеп Усціны Адамаўны, 1913 г.н.,*
*студэнтам Яворскім С.*

Раней на Тураўшчыне вяселле рабілася так. Каравай пяклі ў суботу вечарам. У нядзелю да абеда маладыя хадзілі ў царкву пад вянец, а потым, прыйшоўшы ад вянца, радня жаніха ішла да нявесты. Пачаставаўшыся ў нявесты і правёўшы ўсе рытуалы, якія тут бытуюць, ехалі да жаніха, але бацькі за дачкою да жаніха не ехалі, а іх прыходзілі запрашаць у панядзелак ісці да сватоў к сваёй дачцы. Вось гэтая бяседа ў панядзелак і называлася пярэзвы.

На пярэзвы ідзе завіца або хросна. Ідуць з хлебам і сольлю, уматанымі ў ручнік. Як прыходзяць у хату, то кажуць: “Прышла я к свасі і свату, да добры дзень у хату вашу. Хлеб і соль на стол кладу, да на пярэзвы вас з усім вашым слаўным родам заву. Будом вашу дочку будзіць, да парадочносць ее хваліць”.

Калі хросная слала пасцель маладым у першую іх брачную ноч у клеці, то хросная павінна была іх і будзіць, знаць, ці зберагла маладая сваю дзявочасць.

Маці жаніха суправажае яе словамі: “Ідзі, кумочко, до клеці, дзе спяць нашы дзеці, одной тобе знаць, якую пасцель ты слала, то цепер тобе і довераем, шоб ты ее проверала”. З клеці выходзяць маладажоны, а за імі хросная з бутылкой водкі ў руках. Красны каснік на бутылцы – гэта сімвал таго, што зберагла маладая сваю дзявочасць. А калі б маладая не зберагла сваёй дзявочасці, то склалі б хамут на шыю свасі.

У панядзелак пасля вяселля на пярэзвах нявестка клала на галаву хустку, складзеную ў серпаночак. Завіхалася разам са свякрухай каля сталоў, таму што з мінуты на мінуту павінны былі прысці госці. А свякруха вельмі задаволеная нявесткай, што прыйшла за яе сына, захаваўшы дзявочасць, прыказвае: “Памагай, нявесточко, на стол накрываць, да твою мамку з татом на пляжцы з красным каснікам сустракаць. Да хвала будзе ўсему вашаму роду, шо дагледзелі свою дочку змолоду”. Пляжка з красным каснікам стаіць на стале.

Калі прыходзяць госці, то зяць падыходзіць да цёшчы, нізка ёй кланяецца і дае ёй падарунак: накідае на плечы вялікую красную хустку, як сімвал парадачнасці яе дачкі. Запрашаюць сватоў садзіцца за стол такою песняй:

Ой, зяць цёшчу просіць,
Ой, зяць цёшчу просіць,
У руках шапку носіць.
Ой, цёшчанько моя,
Ой, цёшчанько моя,
Ой, матухно добра.
Учыні добру волю,
Учыні добру волю,

Да побудзь ты со мною.

За столом частуюцца, хваляць смачную яду, слаўную гаспадыню і потым спеваюць песню:

Перезвянко наша мамко,
Перезвянко наша мамко,
Да познай свою дочку,
Да познай свою дочку,
Учора була ў веночку,
Учора була ў веночку,
Учора була ў веночку,
А цепер у серпаночку.

Сваты дзякуюць адзін аднаго за дзяцей слаўных і пачастунак:

Свахна свахне поклонілась,
Свахна свахне поклонілась,
Шоб на Ольку не сварылась,
Бо Олечка молодзенька,
Бо Олечка молодзенька,
Да на сон она радзенька.
Не будзеце яе, як певень пяе,
Не будзеце яе, як певень пяе,
Бо гето ж рано будзе,
А будзеце, як пастух коні жэне,
А будзеце, як пастух коні жэне,
То гето ж добрэ будзе.

Наспяваўшыся і натанцаваўшыся, сваты ідуць дамоў, і пляжку з красным касніком абавязкова з сабою бяруць. І ўмудраюцца яе несці так, каб усім было відно, які ім почот за іхнюю дачку. І пярэзвы – гэта завяршэнне ўсіх вясельных рытуалаў.

Ну, а калі б дзяўчына не захавала сваёй маладосці, то песні спявалі б наступныя:

Зяць цёшчу вязе,
Да на дарозі кладзе,
Да лежы, цёшча, тута,
А я пайду па прута,
Да буду цябе біце,
Шо не ўмела дочку гледзеце.

Ганьба маёй цёшчы, ганьба,
Ганьба маёй цёшчы, ганьба,

Не ўгледзела свою дочку зрання,
Аганьбіла ўвесь наш род,
Аганьбіла ўвесь наш род,
Шо страшно ісці во двор.
Уцірай, цёшча, слёзы, уцірай,
Уцірай, цёшча, слёзы, уцірай,
Да смело на людзей не поглядай.

***Запісана ў в. Вараніно***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Я выходзіла замуж, дзецятко, по неволі, да не по любові. Мене сілою оддавалі. Прышлі сваты ко мне із Тонеж. Я согласілаcа йці. І мене ўдвох маці з бабою отнялі за рукі от жэніха. Не отдалі. Ой, вона куды замуж зайдзе. А я буду хворэць, а вона там будзе, а я тут, да я не знаціму. Ох, еке ж мне було сватоўство. Ну, не отдалі мене за того. А тут от сусед быў, сірота, годованік у бацька. Ужэ гэты прыйшоў у сваты. А я за гэтого не хоцела, а хоцела за другого. Так бацько й мацер: “То бедны, а ў гэтого поле, а ў того поля нема”. Колісь гэтым полем млелі. У гэтого поле, да будзе за чым жыць. А за того бедного пойдзеш, так шо ты там будзеш робіць? Не оддалі мене, оддаюць за гэтого. Ужэ свадзьба, роб’яць свадзьбу. Ужэ йдуць гэто од молодого по мене. А гэты, шо мене хоцеў, то я вуйшла на двор по воду ці шчо, вон за мене. А ў нас тут сад буў большой, тут хата стояла колісь наша. А вон за мене да ў той сад. Да поселі му ў кутку там у саду. І вон рэве, і я рэву. І нас шукаюць. Тут одна старуха подказала мацер, а маці кажэ: “Ну, а шо я зраблю? Точно пошлі да потоп’яцца”. Это ж було так. Не по любові жэнілісa, пошлі да потопілісa. Ох, да тут крык, да зык, да саматоха, пока мене не трапілі да посадзілі за стол. Да от ека була мне свадзьба.

Каравай

От ужэ ўзаўтра вяселле. От прыходзіць хросна маці. Ужэ вона этого коровая строіць. Вон у місі ў такой велікой рошчынены. Хросна маці сама рошчыняла. Ужэ подходзіць вечор. Ужэ коровайніц поззывалі. Это молода ходзіла, на коровай звала. А ў печэ трэба на коровай тры разы закідваць дрова. Не по багато, але ж трэба, шоб було тры разы. Згорaць, а дале зноў раз закінуць, згорaць, зноў раз закінуць. Ну, ужэ зовуць: “А дзе ж та маці, ужэ пора коровая саджаці”. Ужэ йдзе та маці, берэ гэту місу з этым цестам, і ўжэ вона стаўляе і кажэ: “Благословi, оцец і маці, уся родзіна ў хаці, коровая ў печ саджаці”. Вона ўжэ берэ гэтэ цесто, качае й качае. І жонкі коло ее стояць. Тожэ по трошку беруць да качаюць. Да одные зробілі месеца, а тые роб’яць такіе бараночкі маленькіе, шчоб попекці да на этого коровая понізаць. А сад ужэ саджаюць, як спечэцца. Ужэ ж посылаюць маршалок: “Ідзіце ж, нарэжце росох іс саду ў коровай”. Ну, ужэ гэта маці, як начынае качаць, ужэ вона й почынае песню:

Тройца по цэркві ходзіла,
Спаса за ручку водзіла.
Прэчыстая ж маці,
Прыдзі к нашой хаці
Веселье зачынаці,
Коровая ў печ саджаці.

Ну, а потом ужэ й зноў. Воны і месяць, і спяваюць, і спяваюць:

Дровна пшонка, дровна.
На ўсе ж вона здовна.
Куркі клююць, гускі шчыплюць
На столе коровай.

Ото гэто песне такіе спяваюць. Ну, й шчэ ж багато песень, то шчо ж вам спяваць усе? Ці хваціць дзве? Замесілі ўжэ коровая, ужэ ўсе построілі, ужэ хлопцы прынеслі эты сад. Эты сад ужэ бяруць бабы, от так о цесто роскачваюць. Некоторые і гэтые росохі пообматваюць этым цестом тоненько-тоненько. І гэтыя росошкі трэба ў печ, як шчэ не саджаюць коровая, шоб оны запекліса. От тогды ўжэ коровая ў печ саджаюць, як ужэ гэтэ ўсе поготовілі. Ужэ спяваюць:

Росці, короваю,
На столе ж вусокі
Да й у печы ж шырокі,
Бо й наш род вялікі,
Трэба ёго обдзеліць.

От ужэ маці та хросна за этого коровая і понесла ў печ. Посадзіла ўжэ ёго ў печэ. Ужэ й печэцца эты коровай. Ужэ муюць рукі, муюць этого стола. І несуць ужэ эту воду. От як у мене от садок, то под грушу, под яблуню лінуць дай назад ідуць. Да ўжэ й зноў песню спяваюць:

Мы на сад воду носілі,
Соловейка просілі:
—Леці, соловейка, з намі,
Мы коровай згібалі.
А ву на это знайце,
Да нам горэлочкі дайце.

Ужэ мы седзімо, ждом, а коровай жэ печэцца, а боімоса, шоб коровай не вусох, шоб не засушыўса. Ужэ ек вуймом коровай, то ўжэ тогды саджаюць ужэ ўсіх за стол. Да ўжэ коровай за столом, а дружкі роб’яць этые цацкі на коровай, шоб ёго ўжэ нарадзіць, шоб вон ужэ стояў, ночоваў нараджоны. Бо

ўзаўтра ж ужэ трэба готовіцца, ужэ ж узаўтра прыдуць госці. Это ў дзеўкі, а ў хлопца тожэ ж.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Дамашкевіч Праскоўі Цярэнцьеўны, 1921 г.н.,***
***студэнтам Яворскім С.***

У сваты бралі хросных, родзіцелей. Бралі пірога, гарэлкі бутылку, а остальнэе накрывала стол дзеўчына. І казалі:

– У нас е бучок, а мо ў вас е цёлка нам на продаж. А дзеўка ў другой хаці, ховалі ее.

Ек прыежджаў молоды по дзеўку, то ее ховалі. Одзевалі дружку ў плацце белэ, да показвалі ек невесту. Стола ставілі на порозі. Вукуп бралі, да толькі потом показвалі молодую.

Хросна маці доўжна рошчыняць коровай.

Му свое дзело зробілі,
Коровая у печ усодзілі,
А тую воду пойдом ручкі муць,
Да на вішэньку ліць.

Украшалі каравай шышэчкамі разнымі з цеста.

Перад началам, ек веселье начынаецца, спевалі:

Тройца по цэркві ходзіла,
Спаса за ручку водзіла,
Прэчыстая маці,
Прыдзі к нашай хаці
Веселье начынаці.

Хросны бацько дзеліў коровай. Сначала маці з бацькам вузывалі, а потом ужэ ўсіх остальных весельных. Да прыказкі ўсякіе казалі:

Дару коробку гліны,
Шоб до году булі родзіны.

***Заісана ў в. Перароў***
***ад Лоўгач Мальвіны Рыгораўны, 1926 г.н.,***
***студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.***

Свадзьбу правяць, як хто задумал. У Пілінаўку не правяць, бо грэх у пост і ў вялікі пост нельзя, а так усе дні. А от некаторые стараліса на Каляды, бо вельмо благопрыятнэе врэмя було. Ну, некаторые выконваюцца. Напрымер, сватанне, заручыны, пярэзвы, госці. Песні пелі разные, хто екіе знаў.

У сваты прыходзілі бацькі, браты хросные. Еслі давалі згоду, то садзіліса павячэраць, а не – то не. Тады падружкі дзеўкі надзявалі на хлопца гарохавы венок.

Каравай быў красівы, велікі, каб хваціло госцям, а еслі аставалосо, то выносілі на вуліцу дзецям і пры этом говорылі: “Просім на дзеловы каравай!” Каравай пеклі круглой формы ці ў форме месяца, к караваю маглі напекці шчэ булачок. Обезацельно з харошэ мукі. Каравай можно було пекці толькі жэншчыне, екая добрэ жыве з мужам. Не дай Бог не дапускалі ўдаву пекці. Маладая дзеўчына не магла пекці каравая.

Молодой нельзя було пець і танцаваць, толькі з молодым. Не трэба було паказвацца молодому. Ну, еслі ішла па любві дзеўчына замуж, то пелі пра шчаслівую долю, жадалі шчасця, а еслі не па любві, то стараліса подтрымліваць дзеўчыну, подбадзёрвалі сваімі песнямі. Ніякіе песні не пелі. А дружкі молодого, як выкупалі молодую, то казалі: “Наш купец – ваш тавар!” А дружкі молодой ставілі стол у дзвярах, не прапускалі нікого. Покуль тые не дадуць добры выкуп: грошы, канфеты. Дружкі молодой праводзілі разные гульні пры этом. Напрымер, молодому і его дружкам надо було выпіць цэлую банку трохлітровую кампоту, бо на дне банкі лежаў ключ ат комнаты молодой. Калі ўжэ молодые от’езджаюць у ЗАГС, хросны тры разы абсыпае жытом ці машыны, ці, як раньшэ, коней. А дружкі прыносілі ёлачкі маленькіе, нарадные і меняліса імі.

После того, як прыезджалі з ЗАГСа, то ехалі к молодой дамоў. Там і встрэчалі хлебам і соллю, мёдам. Молодым надо було откусіць хлеба і ў того, кого будзе большы кусок, той будзе хозяіном у хаці. А мёду надо з’есці тры разы, каб жылосо сладко. У этэе врэмя не пелі песні, а поздраўлялі.

Перэд тым, як зайсці ў хату к молодой, бацькі жаніха гаварылі: “У нашага свата з вярбы і лазы хата, і печ не белена і чым ена хвалёна?”

На застолле нанімалі жанчыну, екая ўмела пець песню “Веселле”. А еслі ена не прыходзіла, то пелі весёлые застольные песні.

Молодой і молодому адзевалі на адзежу булаўкі, нельзя було молодым ходзіць по одному, обязацельно ўзяўшыса за рукі. После того, як подзеляць каравай у молодой, а каравай адзін дзелілі ў молодой, а другі – у молодого. Зразу поседзяць, не едзяць, а потом выходзяць хросные і дзеляць его.

От устрэцілі молодых з ЗАГСа. Зразу молодых разом не садзілі. Госці молодого садзіліса есці, а прыглашоныя молодой сядзелі на вуліцы і ждалі.

Усе пасядуць госці на доўгую лаву. У хату молодую ўводзіў брат, а еслі нема брата, то бацька, ці хто з мужчын. Молодая ішла по лаві, а молоды ўжэ седзіць. Дайдзе дзеўчына до покуці, пакланіцца мацеры, а сперва бацьку тры разы і садзіцца.

От госці молодого наедзяцца і ідуць танцаваць. Да ўжэ садзіцца родня молодой.

У канцы свадзьбы, после каравая, свекруха знімае молодой венок і адзевае хустку. От ужэ цепер усе плачуць і пеюць жаласныя песні.

После етого собіраюцца і едуць до молодого на перэзвы. Обезацельно прывязвалі к машынам ці возам банкі, шклянкі, каб ніхто не перэкінуў дзеркача ці жабу дохлую.

Ужэ ў молодого дзеляць его каравай і садзяцца за стол радня маладой, а его радня седзіць на вуліцы ці ідзе дамоў поесці. После свадзьбы оставаласа ў молодого і свекруха, проверала характер невесткі: загадвала ёй прынесці ў печ дроў. Еслі ена кіне дрова сільно, значыць, плахі характер, а еслі ціхо положыць – харошы. Шчэ загадвалі невестцы пабеліць печ ці грубу, так проверали ці домовітая ена.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Яўгеніі Міхайлаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Вясельныя пажаданні

Жадаю маладым пару галубоў і вечную любоў!
Жалаю курачку-квактуху, каб паважала свякруху!
Жадаю маладым зялёнага дуба, штоб жылі люба.
Маладым жалаю скавараду шкварак, штоб не было сварак.
Дару маладому пару сініц, штоб не ходзіў до чужых молодзіц.
Дару калоду мёду, каб быў сын да году.

***Запісана ў в. Відошын***
***ад Агіевіч В.Р., 1928 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч М.***

Са шлюбам законным Вас (імёны).
І вам пажаданне сярдзечнае наша.
Жывіце ў любові, жывіце ў згодзе.
Хай сонейка-шчасце для вас не заходзіць.
Працуйце са смакам, і ежце, і піце.
А ноччу адзін аднаго вы будзіце,
Бо, кажуць, старыя ды мудрыя людзі: той сільно кахае,
Хто часценька будзіць.
Хай будзе ў вас пяцісценная хата,
Вялікая пуня, жывёла багата.
Каза, казляняты, кабанчык, кароўка,
Штоб вам пра абед не балела галоўка.
Яшчэ жадаем вам дзетак бярэма:
Івана, Пятра, Халімона, Ахрэма, Настулю,
Аўдулю, Хадору і Свету, Паліну, Галіну, Агату, Сыклету.
Жалалі б і далей, бо мы не скупыя,
Ды пальцаў, як бачыце, у нас не хапіла.
Дык будзьце здаровы, у шчасці жывіце,
І на хрэсьбіны яшчэ прыгласіце.
Паміж нас маладыя за вясельным сталом,
Павянчалася шчасце ды пад шлюбным вянком.

Горка, горка гарэлка за вясельнай гульбой.
Падсалодзяць нам чаркі малады з маладой.
Падсалодзяць тым шчасцем, што два сэрцы зліло,
Каб вясёлым, медовым век жыццё іх было!

Пажаданні ў час дзялення караваю (перапою)

Дару ніткі, штоб малады не заглядваў на чужыя лыткі.
Штоб ваш ложак скрыпаў, а да года сынок выпаў.
Штоб нявеста была багата, а з пераду гарбата.
Жэлаю столькі сынкоў, сколькі ў лесе пянькоў.
Жэлаю столькі дочак, сколькі ў лесе кочак.
Штоб у вашам дамочку, у вашам хлявочку,
У вашам садочку ўсё радзілася і пладзілася.
Дару чатыры падушкі, штоб мелі чатыры дачушкі.
Сколькі ў доме сталоў, сколькі ў сталах дошчак,
Штоб столькі вам сынкоў і дочак.
Дару картопляў падполле і дзетак застолле.
Дару вам пару галубоў, штоб была ў вас крэпкая любоў.
Дару вам дзве анучы, штоб усё жыццё былі ў кучы.
Дару вам кошку, штоб ніхто не перабягаў вам дарожку.
Дару вам грошы, штоб дзеці былі харошы.
Дару скрынку мукі, штоб ражаліся сынкі.
Дару віна бочку – на сына і на дочку.
Дару вязку цыбулі, штоб не тыцкалі адно другому дулі.
Дару грошы бумажныя, штоб маладыя былі паважныя.
Дару грошы  медныя, штоб ніколі не былі бедныя.
Дару жменю медзі, штоб дзеці былі як мядзведзі.
Дару каробку жукоў, штоб не называлі адно другога дураком.
Дару торбу грэчкі, штоб не было паміж маладымі ніколі спрэчкі.
Дару цябе дугой, штоб не хадзіў да другой.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Галец Тамары Якаўлеўны, 1913 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Пажаданні ад свата і свацці

Як у полі вясновым травінка
Расцвітала ў сям’і дзяўчынка.
Быццам жыта тугі каласочак
Гадаваўся ў сям’і сыночак.
Быццам сонейка з ранкам спаткаліся,
У сваім светлым каханні прызналіся,
І ўтварыўся вяночак святы –
Дзеці, поўныя шчасця сваты.
Вось, як гэты ў вянку каласок,
Коля вам не зяць, а сынок.

Вось, як гэтай пшаніцы асьмушка,
Лена вам не нявестка – дачушка.
Ну, а вы не чужыя больш людзі,
Усё агульным для вас ужо будзе.
Дык давайце, як гэтых зярнятак,
Пажадаем сям'і немаўлятак.
Хай сямейны вяночак чароўны
Будзе шчасцем і радасцю поўны,
Горка маладым!
Горка бацькам!

***

Добры дзень усім вам, госці дарагія!
Нездарма да вас мы завіталі ў хату,
Есць у нас з сабою весткі неблагія,
Маем скарб таксама сонечна багаты,
Каб яго вам перадаць,
Папрашу бацькоў пазваць!

Зварот да бацькоў маладога:

Паважаныя мама і тата!
Праляцела гадочкаў багата,
Як сыночка маленькага гушкалі,
А ўжо ў думках хацелі дачушку,
Дык прыміце ж прыемную вестку,
Прывезлі вам дачку, не нявестку,
Хай прыветны і добры ваш дом
Стане ёй незвычайным дварцом,
Дзе няцяжка ёй будзе назваці
Вас па шчырасці татам і маці.
Паглядзіце, ці ёсць прыгажэй
І шчаслівей у свеце дзяцей?
Першы тост – вашы ім пажаданні!

Прывезлі к вам у цяпліцу
Прыгажуню-маладзіцу.
Будзе добрай гаспадыняй,
А для вас, бацькі, дачкой,
І для мужа жонкай вернай –
Не было яшчэ такой!
Будзе маці самай лепшай
І ў рабоце самай першай,
Толькі вы яе шануйце,
Моцна ў крыўду не давайце,

Дык за шчасце ў гэтай хаце!

Аддаём мы Лену замуж
За добрага хлопца,
Хай і каханне ў іх будзе
Прыгожым і моцным,
А жыццё ў іх хай стане
Песняй цудоўнай.
На здароўе, на пачуцці
Да краёчкаў поўным.
Дзеткі хай растуць таксама
Лепшыя ў свеце!
Прапаную тост –
За шчасце, за іх даўгалецце.

На другі дзень вяселля перад дзяльбой каравая казалі:

Прыйшла пара раскрыць кішэні,
Збірайце грошыкі ў жменю!
І хоць душа ў вас гарыць,
А ўсё ж патрэбна аддарыць,
Аддайце ўсё, хто колькі зможа,
Ды памажы вам, мілы Божа!
Вясельную куляйце чарку,
Шукайце на закуску скварку,
І каб запомнілі наш край –
З сабой вазьміце каравай!

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Калтуновай Галіны Паўлаўны, 1935 г.н.***
***(прыехала з п. Карэлічы Гродзенскай вобл.),***
***студэнткай Шырай Н.***

Дзяўчаты з насмешкай
А казалі, што жаніх прыгожы.
А якога чорта ён прыгожы!
Нам казалі: “Ён як паніч.”
А шчэ й ззаду ён як паніч,
А спераду, як свінны лыч.

Жаніху і нявесце
Я на ганку стаю,
Слёзкі кацяцца,
Ніхто замуж не бярэ,
А замуж хочацца.
Я на мосціку ішла,

Каблукамі стукала.
Хоць я Ваську не любіла,
А цукеркі хрупала.
Мяне мілы абдымаў,
А я рвуся ды крычу,
Толькі ён не здагадаўся,
Што я гэтага хачу.

З суботачкі на нядзелечку, у васкрасенне
Займаліся ўсе вяселлем,
Займаліся ўсе вяселлем
А суботачка на нядзелечку –
Дзявічы вечарочак.

Ой, да шлюбу ішлі,
І хвалілі маладых,
І смяяліся дзяўчаты,
І смяяліся хлапцы.
А потым у царкве
Звязалі маладым
Рушніком белыя ручкі.
Да сказаў словы добрыя
Маладой нявесце.
Усё роўна жаль
Родную матачку пакідаць.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

За сонцам не відно…

За сонцам не відно,
За лесом не чую,
За недобрым мужом
Дома не начую.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Пусці мене, мужу,
До броду по воду,
До броду по воду,
До родного роду.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Не пушчу цебе я
До родного роду.
Бо ты там раскажэш

Про нашу незгоду.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Як будуць пытаці,
Я буду маўчаці.
Як пальюцца слёзы,
То я выйду з хаты.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Як сестра пытала,
То я промоўчала.
Як маці спытала –
Я праўду сказала.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Коло цесцевого двора…

Коло цесцевого двора
Там высокая гора.
Нельга к горы прыступіцца
Конічэнька напоіць.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

От і вышла, от і выбегла
Молодая Галечка.
Она к горэ прыступіла,
Конічэнька напоіла.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

Узяла коня за грывоньку,
А Іваночка да за ручэньку.
Дала коню аўса і сена ,
Сама пошла на пасаг села.
(апошнія 2 радкі паўтараюцца 2 разы)

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Вольгі Іванаўны, 1948 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Малешаў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Кошман А.***

*Радня маладой*
“Чаго сваткі да прыехалі?
Ці па боб, ці па гарох?
Ці па нашу дзявіцу?
Боб не малочны,
А гарох у дзяжах не ляжыць.

Наша Танечка ў косах сядзіць?”

*Радня маладога*
“Пусці, сваць, у хаце
Хаця ручкі пагрэць,
Маладой паглядзець.
Гаспадынька, як калінка,
А дзетачкі, як кветкі.
Харашэнько і зварыла.
І сватоў угасціла.”

*Калі месяць каравай*
Ой, старша коровайночка
Добрэ дзело зрабіла:
Каравай усадзіла.
Караваю, караваю,
Я ле цебе хорошэ граю.
Караваю, мой грэці,
Садзім цябе па-шляхецкі.”

*Калі рабілі каравай*
Наша старша каравайніца
Усё цеста покрала:
То ў мех, то ў кішэню
Сваім дзеткам на вячэру.
А наша печка рагоча,
Караваю хоча.

*Каравайная песня*
Наша печка камяністая,
Вечар гарыць, да не выгарыць
І каменне не распаліць.
І наша Танечка вечар сядзіць.
Вечар сядзіць, ды не плача
І мамачкі не разжаліць.
Я разжалю мамачку
У нядзельку рана,
Із застолля ідучы,
Добрай ночы даючы.
Эта табе дабранач,
Ды не вернусь я нанач.

Ой, заграбай, мамко, попел,
Бо ўжэ тваю доньку ўхопяць.
Ой, заграбай, мамко, жар –

Будзе табе донькі жаль.
Кладзі, мамко, серпік на дарозе,
Бо ўжо твая донька ў дарозе.

Брат сястрыцу не любіць,
Да й за ручаньку лубіць,
А сястрыца ўпіраецца
І слёзкамі абліваецца.
Ой, братачак, да мой родненькі,
Чым табе я надакучыла?
Ці касою русаю,
Ці сваёй красатою?
*Маладому*
Ой, у поле дымно, дымно,
Ды й нічого не відно.
Там Колечка ды й ваюецца,
Па ім татухна яго журыцца.
– Не журыся, да мой татухна!
Бо я к свету да дамоў прыеду.
І з светавою зарою
Да і з маладою жаною,
І з светавою зарніцаю,
Да і з сваёй маладзіцаю.

*Маладой*
Ой, ішлі дзяўчаткі гарою,
Да гукалі Танечку з сабою:
– Хадзі, хадзі, Танечка, з намі.
Дадзім табе вяночак з цвятамі.
– Ой, дзевачкі, дзевачкі, не мушу,
Палюбіла Колечку за душу.
Ой, хадзіла Мар’ечка па полю.
Да сеяла вінаград з прыполу.
– Расці, расці, вінаград, да вялікім кустом
І шырокім лістом,
Бо будзе ехаць Колечка са сватамі.
Да патопчэ вінаград з камнямі.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папко Надзеі Іванаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бялёў Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Макарэвіч Т.***

Как мы свайго коровая радзілі,
То ў луг па каліну хадзілі,
Палову луга зламалі,

Свайго коровая ўбралі.
Ой, короваю, наш нараджаны,
О, хто ж цябе нарадзіў?
– Нарадзіла мяне пані королева
Ручкамі беленькімі,
Перснямі золоценькімі.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Марыі Марцінаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

Дзякуй Богу, сына ажаніла…

Дзякуй Богу, сына ажаніла,
Ды й нявестку дочакала.
Ды й не буду воду носіці,
Ды й не буду хлеба мясіці,
Да й не буду хату мясці,
А буду парадочок весці.
Дай, Божа, ляльку,
То буду за няньку.

Свякроў нявестку ды й перапівала…

Свякроў нявестку ды й перапівала,
Ды й перапівала, ды й паздраўляла:
– Будзь жа ты, нявестка,
Як зіма, здорова,
Як вясна, прыгожа ды вясёла,
Як лета, шчаслiва,
Як восень, багата.

***

Учора была ночанька, а цяпер дзень,
Ужо свякроўка нявестку даўно чакае.
Шыла яна шубу да долу,
Ды й прыбудзь, нявестка, дадому.
Шыла яна шубу да зямлі,
Ды й прыбудзь, нявестка, да сям'і.
Шыла яна шубу па пяты,
Ды й прыбудзь, нявестка, дахаты.

У нядзелю рано…

У нядзелю рано,
Чуць сонейко ўзыходзіць,
Мужыкова маці
Ужо по хаце ходзіць.
Усё по хаце ходзіць,

Лучыну ломае.
Свёкар яшчэ горшы,
Вочмі маргае.
Мае залавіцы
Ходзяць, як звярыцы,
Слова не скажуць,
А ўсё кругом ходзяць.
Мая братавая
Хораша гуляе,
А я, молодзенька,
Слёзы проліваю.

***

У нядзелю рано,
Чуць сонейко ўзыходзіць,
Мужыкова маці
Ды й нявестку будзіць:
– Ці ты спіш, ці не спіш,
Бадай ты не ўстала.
Ідзі выгоні тое,
Што з дому прыгнала.
А я, молодзенька,
Рано ўсхопілася,
Слязамі без воды ўмылася.
Ой, на што ж ты мяне браў
З чорнымі вочыма:
Трэба было браці
З вялікімі грошыма!
Ой, на што ж ты браў мяне
З чорнымі брывамі?
Трэба было браці з коньмі, з коровамі.

Добры дзень, сястрыца

– Добры дзень, сястрыца,
Ці жыва, здорова?
Ці жыва, здорова,
Ці добрая доля?
– Добрая, братко, доля,
Што не зычу нікому,
Нават ворагу свайму.
Хвартушок тоненькі,
Слёзак поўненькі.
– Не плач жа, сястрыца,
Ты ж сама таго хацела.
Я ж хоцеў ды й не даці,

Ты ж стала плакаці.

### Аддала мяне маці

Аддала мяне маці
На чужую зямлю
Ды й у вялікую сям'ю.
Сям'я посела вячэраць,
А мяне адправілі по воду.
Гора высока, вода далёка,
Хутка не вярнуся.
Я крынічку знайшла,
Зачарпнула поўвядра,
Пакуль да хаты прышла,
То й слязьмі доліла.
А вялікая сям'я
Почувае мужыка:
– Чаму жонкі не б'еш,
Чаго волю даеш?
– А за што ж яе біць?
Яна ўмее ўсё рабіць,
Пісаць, чытаць,
Па садочку гуляць.

### Каліна-маліна галлё поломала

Каліна-маліна галлё поломала,
Як я была ў маці, то й гора не знала.
Як замуж я пойшла, той свякруха ліхая
Сама рано ўстала, мяне не разбудзіла.
Ды й пашла па суседзях, мяне осудзіла.
– Уставай, нявестка,
Уставай, молодая.
Ідзі, даі корову, што ад бацькі прыгнала.
– Не, не пойду доіць корову,
Што ад бацькі прыгнала,
Пойду доіць корову, што ад свёкра достала.
– Чужыя коровы гуляюць у дуброве,
А моя нявестка ўсё спіць у каморы.

### Мы цябе, дзеванька, завіваем

Мы цябе, дзеванька, завіваем,
Мы цябе, дзеванька, завіваем,
Шчасцем, долей абсыпаем.

Ой, будзь богата, як зямля,
Ой, будзь прыгожа, як кветка,

Ой, будзь здарова, як вода.

### Ішлі дымы па-за лугамі

Ішлі дымы па-за лугамі,
Ой, то не дымы, а пара коней ідзе,
Молоды Ванюшка жаночку вядзе.
– На табе, бацько, пару коней на двор,
А тобе, маці, нявестку за стол.
Ды й вучы яе, як сама знаеш,
Каб шоўкам шыла, ды й не памыліла,
А дротам ткала, ды й не ўкрала.

### А ў нядзельку рано

А ў нядзельку рано
Дзеванько говорыла:
– Ой, мамочко моя родная,
Сасніўся мне сон дзіўненькі:
Сівыя сокалы наляцелі,
За столом поселі,
Чорны шоўк распусцілі,
Золата рассыпалі.
– Моё ж дзіцятко роднае,
Молодзенькі розум маеш,
Своёго сну не разгадаеш:
Сівыя сокалы – сваты твое,
Чорны шоўк – коскі твое,
А золото – слёзкі твое.

### Краем, бором, каліна́нька зацвіла

Краем, бором, калінанька зацвіла,
Краем, бором, чырвоная зацвіла.

Ой, ехаў там пан пяючы,
Пачуў ён сіву зязюленьку куючы.

То не зязюленька сівая кувала,
Волечка прыгожыя песні спявала.

Пад акенцам седзячы,
Сваёму міленькаму сорочку шыючы:

– Ой, дай, Божа, сорочку пошыці,
Мойму міленькому здорову зносіці!

### Месяц узыходзіць

Месяц узыходзіць,
А зара зарыца.
Молода Волечка
Ды й на воз садзіцца.

– Подыйдзі, мамонько,
Да мяне блізенько,
Да мяне блізенько,
Поклонюся табе нізенько.

– Не хочу, дзіцятко,
Я в тойго поклону.
Ступай ад возу
Ды й ходзі дадому.

– Рада б я, мамонько,
З возу ступіці,
Ды й сядзіць Ванечка,
Будзе сварыці.
Рада б я, мамонько,
З возу ступіці,
Ды й баюся, што Ванечка
Будзе крычаці.

### Дымна ў полі, дымна

Дымна ў полі, дымна
Ды й нікого не відно.
Чуць завіднее –
Сівы конь выбягае,
Ванечка, Ванечка выязджае
З роднаю сястрыцаю.
– Сястрыца-парадніца,
Ды й парадзь ты мне:
Як цесця зваці, ваяваці,
Як сабе Волечку ўзяці.
– Ды й вауй, братка, вауй,
Сівых коней на двор вярні,
Сабе Волечку бяры.

### Сягоння субота – святы дзянёк

Сягоння субота – святы дзянёк,
Сягоння субота – святы дзянёк.
Звілі Вольцы з руты вянок.
Ой, вілі, вілі, ды й говорылі:
– Чым жа яна табе, маці, дочка не міла,

Ці яна работы не робіла?
Позна клалася, рано ўставала,
Собе работку сама шукала.

### Ды й ходзіла Волечка па полю

Ды й ходзіла Волечка па полю,
Звіла яна вяночак з куколю.
Ды й просіла маці, просіла,
Штоб того й вяночка зносіла.
– Ды й поносі, дочачка, поносі,
А потым падружанькам аддасі.

### Ой, ступіла Волечка на парог

Ой, ступіла Волечка на парог
Ды й зломіла з калінкі вяршок.

– Ой, жыві, жыві, калінка, без вяршка,
Ой, жыві, жыві, мамочка, без меня.

Як калінка без верха,
Так будзе мамочка без меня.

### Ой, у лузе ды каліна стояла

Ой, у лузе ды каліна стояла,
Ой, у лузе ды каліна стояла,
Молода Волечка яе ломала,
Да свайго белага лічыку каліну раўнавала:
– Каб я была такая, як тая каліна чырвоная!
– Маё дзіця, такая й будзеш,
Калі да мяне яшчэ гадок паходзіш.
А калі пойдзеш ад мяне,
То завянеш, як рыбка,
А збялееш, як ліпка.

### Не куй, зязюлька, у зялёным лесе

Не куй, зязюлька, у зялёным лесе,
Яшчэ накуешся ў зялёнай дуброве.
Не плач, Волечка, у свайго бацькі,
Яшчэ наплачашся ў свякроўкі,
Яе парогі пераступаючы
І яе наровы пераймаючы.

### Зялёны садочак, зялёны

Зялёны садочак, зялёны,
Вакол рутаю аплецены.

Ніхто ў тым садочку не бываў,
Адзін Ванюша ў карты граў,
Ён сабе Волечку намаляваў:
– Поедом, Волечка, з намі,
З молодымі сватамі.
– Як мне ехаць з вамі,
З молодымі сватамі?
Шкода мне маці кідаці,
Бо мая маці старэнькая,
Як галубка сівенькая.
Ня будзе кому ёй посцельку послаці,
А як устане – прыбраці.

### Дзе ж ты, Волечка, хадзіла

Дзе ж ты, Волечка, хадзіла,
Што голоўка твоя збялела?
– Да й ходзіла, дзеванькі, у вішнёвы сад,
Да й на мою голоўку цвет упаў,
Хоць вецер повее – не звее,
Хоць сонейко засвеціць – не звяне.

Ходзіла Волечка по лузе,
Носіла каліну ў хвартуху.
За ею дзевонькі ходзілі,
У яе каліны просілі.
Яна ім каліны не дала,
А сабе вяночак звіла.

Хадзіла Волечка ў вішнёвы сад,
Да на яе галоўку цвет упаў,
Да й на яе галоўцы зацвітаў,
Да яе Ванечка спадабаў.

Захоцела Воленька калінавага вяночка
Да й послала свою маценьку
Да й по каліну.
Покуль маценька да луга,
То каліна зацвіла.

### Чуці, чуці ў зялёнай руце

Чуці, чуці ў зялёнай руце
Плакала Волечка, вяночка ўючы.
Пачуў Ванечка, па каня ідучы.
– Чаго, Волечка, плачаш?
– А таго плачу, шо сама бачу:

У цябе, молодого, родзіны много,
У мяне, молодой, падарункаў мало.
У цябе родзіны, як у лесе ляшчыны,
У мяне падарункаў, як у лесе гаёчкаў.
– Блізкую родзіну ўсю обдары,
А дальнюю – перапросі.

### Зборная субота, зборны дзень

Зборная субота, зборны дзень.
Ды й сабрала Волечка ўсіх гасцей,
Ды й садзіла ўсіх іх у рад,
А сама села між усіх,
Ды й склоніла голоўку ніжэй усіх,
Задумала думачку больш усіх.
– Ды й не думай, Волечка, не думай,
Пераедом рэчку ды й Дунай.
– А як жа мне, молодой, не думаці,
Ды не знала свякроўкі, а трэба знаці,
Я мала, не знаю, як назваці.
Назвала б свякроўкай – не смею,
Назвала б маці – не будзе,
Толькі мойму сэрцу жаль будзе.

### Сваха свасе ды покорылася

Сваха свасе ды покорылася,
Каб на нашу Волечку не сварылася,
Бо наша Волечка вельмі молодзенька.
Не будзі яе, як певень пяе,
Будзі яе, як пастух ідзе.
Певень пяе рано з поўначы,
А пастух ідзе, рано поснедаўшы.

### Заехаў зяць на цесцеў двор

Заехаў зяць на цесцеў двор,
Побіў мосты жалезныя,
Разліў віно зялёнае.
А цёшча зяця спужалася,
За новы сені сховалася.
– Постой, цёшча, не пужайся,
За новы сені не ховайся.
Не багато нас наехало:
Семсот сватоў, акрамя братоў.
А свашачка – семілетачка
Між сватамі як кветачка.
Ой, не сядзі, Волечка, не сядзі,

Адчыні акенцо да й пагляДзі.
– Ой, не сядзі, Ванечка, не сядзі,
Адчыні акенцо
Да й бяры вішанькі з кішэні.

Там на возеры плавалі качаняты

Там на возеры плавалі качаняты,
Ужо там, Волечка, мінуцца дзяўчаты.
Там на возеры плавалі індыкі,
Ужо табе, Волечка, мінуцца музыкі.
Там на возеры плавалі качоры,
Ужо табе, Волечка, мінуцца вячоры.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Івановай Вольгі Гаўрылаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

Прыехаўшы ад вянца, дзяўчаты спявалі:

Да прыляцела шэрая зязюля з ялаўца, (2 р.)
Да прыехала маладая Ганначка з-пад вянца.
Да стала яе мамонька путацца:
“Да ці ўмела, мая дочанька, вянчацца?”
“Не путайся, моя мамонька, у мяне,
Путайся, моя мамонька, у свашэчок.
Яны коло мяне стоялі,
Яны бачылі, як нас молодых вянчалі.
Яны бачылі, як мы пярсні мянялі,
Яны бачылі, яе белы ручанькі звязалі”.

Перад ад’ездам маладога за маладой спявалі:

У нядзельку рана сонейка йграе,
Молоды Васілька коніка сядлае.
Не так сядлае, як навучае:
“Ой, ты, коню, коню мой ты, вороненькі,
Не будзь ты, коню, у людзях дурненькі.
Ой, будуць там цябе навучаці,
Будуць пад ножкі табе страляці,
Нясі, ты, ножкі вышэй дарожкі,
Нясі галоўку, як ясны сокал”.

Малады выбіраецца ехаць па маладую, яму спяваюць:

З дворыка Васілько з’язджае,
Саколіка з рукава выпускае.

Не ляці, саколік, пасярод,
А ляці, саколік, напярод.
Не ляці, саколік, дзе мёд п’юць,
А ляці, саколік, дзе нас ждут,
І нашу Ганначку аддадуць.

Малады пад музыку заязджаў на падворак маладой, дзяўчаты ў гэты час спявалі:

Выйдзі, мамонько, на ганочок, поглядзі,
Ці хорошого тобе зяця прывезлі,
Ці ёсць у яго за сваційку сястрыца?
Няма ў яго на шапцы росіцы,
Няма ў яго за сваційку сястрыцы.

Перад ад’ездам да маладога:

Усядай, Ганначка, на вазы,
Пакідай матуліны наравы.
А дзякуй, матачка,
За хлеб, соль,
Не пайду цяпер за твой стол.

Спяваюць на пірагах:

Вецер вее, павявае,
Маці ў дачушкі пра жыццё пытае.
Пытай, маці, у шэрай вуці,
Шэрая вуці на моры начуе,
На моры начуе – усё горачка чуе.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Ракавец М.М., 1927 г.н.,***
***Дарошка К.С., 1932 г.н.,***
***Рыдзецкай М.Р., 1927 г.н.,***
***студэнткай Русай Л.***

Ой, каравай, каравай садзілі,
Будом каравай вынімаць, ды маладога гукаць.
Там на моры, ды на дошчачцы,
Там жа Валька, ды палошчацца.
Палошчацца, заліваецца, слёзкамі ды ўмываецца.

Уязджаюць маладая к маладому,
Бі коня, паганяй коня,
Да, да бацькавага двара.

А на бацькавым дварэ
Стаіць маці ды ўстрачае,
Ды й маладых не забывае.

Здымае вянок маці ў нявесты і завязвае ёй хустку:

“Хадзіла Волечка па гарэ,
Патаптала ножкамі па траве”.

***Запісана ў в. Бялеў***
***ад Данілевіч Ганны Барысаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Шчур А.***

Как мы свайго коровая радзілі,
То ў луг па каліну хадзілі,
Палову луга зламалі,
Свайго коровая ўбралі.
Ой, короваю, наш нараджаны,
О, хто ж цябе нарадзіў?
– Нарадзіла мяне пані королева
Ручкамі беленькімі,
Перснямі золоценькімі.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Марыі Марцінаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Ніканoвіч Н.***

Ой, белачка па сцяне скача,
Ой, маточка па дзіцяці плача.
Ой, белочка хвосцікам матае,
Маточка пытае:
“Куды ж маё да дзіця пайшло?
Ці ў бор да па ягады,
Ці ў крыніцу па вадзіцу?”
– Каб у бор па ягады,
То б набіркі побрало,
А ў крыніцу па вадзіцу,
То вядзеркі побрало б.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Надзеі Іванаўны, 1915 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

*Спяваюць на заручыны, на запоіны*

Як пабегла Волечка…

Як пабегла Волечка
Два двары ды мінаючы,

На трэці ды ступаючы.
– Ой, я стану ды й паслухаю,
Ой, я стану ды й паслухаю,
Што ж і людзі і гавораці,
Што ж і людзі і гавораці,
Як маю свякрованьку судзяці.
А цяпер і не кажыце,
А цяпер і не кажыце,
Сэрца мое да не сушыце.
Сэрцу жалю да не задавайце,
Сэрцу жалю да не задавайце,
Да ад мамкі да не отлучайце.

Ой, чэкель, чэкель…

Ой, чэкель, чэкель, пакрой дарогі,
У нашага Васечкі крывыя ногі,
У нашага Васечкі крывыя ногі.
Падай кульбачку падпірацiся,
Штоб да Волечкі дабірацiся,
Штоб да Волечкі дабірацiся.
Ой, а Волечка горда казала:
– Я цябе, Васільку, зусім не знала,
Я цябе, Васільку, зусім не знала.

Каравайныя песні

Свадзьба пачынаецца ў суботу з караваю. Месяць каравай і спяваюць:

Да месілі каравая, месілі.
Да на Дунай по водзіцу ходзілі.
Ой, а той Дунай одкозаў:
– Ой, ідзіце по водзіцу ў крыніцу.

***

Ой, ніхто ж і того не ўгадае,
Што ў нашым короваі:
З трох рэчак водзіца,
З трох нівок пшаніца
І тры ложачкі масла,
І тры долечкі шчасця.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Сакавай Ганны Іванаўны, 1927 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Поўчын Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

*Спяваюць у сватах:*

Ой, белая берозонько,
Да чому ж ты не зялёная?
– Ой, як жа мне зялёной быць,
Што дзянёчка купцы едуць,
Да із мене дубцы рэжуць,
На коранях огонь кладуць,
Лісцейко падпальваюць.
– Ой, молодая дзевонько,
Да чому ж ты не весёлая?
Ой, як жа мне весёлой быць?
Што вечор сваты едуць,
Да не даюць бацьку спаць,
Да хочуць мене молодую ўзяць.

*У час расчынення каравая спяваюць:*

Благаславіце, людзі, блізкія суседзі
Каравай замясіць ручкамі беленькімі,
Перснямі золоценькімі, песнямі весяленькімі.

*Замешваючы цеста на каравай:*

А ніхто не ўгадае, што ў нашым караваі.
А сямі крыніц вада,
А сямі пшаніц мука,
А сямі кароў масла –
Дай, Божа, маладым шчасця!

*Калі садзяць каравай у печ:*

Ой, вічу, вічу, коровая клічу.
Наша печачка рогочэ,
Короваенька хочэ.
А прыпечок коловаецца,
Коровая сподзяваецца.

*Калі каравай павінен быць гатовы, каравайніцы падходзяць да печы і спяваюць:*

Яшчэ, каравайку, яшчэ!
Каравайчык кліча, засланкі адбівае
Да каравайніц гукае:
– Ой, дзе ж нашы каравайніцы?
Ці на мяду запіліся,

Шо про мяне забыліся.

*Вымаючы каравай з печы:*

Да бярыце меч, да рубіце печ.
Каравай з печы не лезе.
Ці ён багат, ці ён рагат?
Нельга к яму прыстаці,
Ён іграе ў пячы.
Як жа мне не іграці,
Што на мяне часта пазіраюць,
А сырам, маслам паліваюць.

*Прыбіраючы каравай, спяваюць:*

Ой, коровою, наш нараджоны,
Да хто цябе нарадзіў?
– Нарадзіла мяне пані королеўна
Ручкамі беленькімі, перснямі золоценькімі,
Да песнямі веселенькімі.
Покуль коровая свойго нарадзілі,
То поўлуга каліны зломілі.

Убірайся, коровай, то ў мяту, то ў руту,
То ў ружовыя кветкі, шоб любіла дзеткі.
Старшая коровайніца по лугу ходзіла,
Да каліну ломіла, коровая квяціла,
Увесь род звесяліла.

*Прымаючы спечаны каравай, каравайніцы звяртаюцца да гаспадара з наступнаю песняю:*

Дзе падзеўся гаспадар?
Няхай выкупіць каравай,
Няхай вязе бочку мядочку, а віна дзве,
Да выкупіць каравайку увесь сабе.

*Выконваецца, як просяць каравай:*

Да няма дзевонькі ні тут, ні там.
Пойшла дзевонька до могілонькі,
Да дому родзінонькі.
Прошу, прошу, мамонько, к собе на вяселле.
Да й ідзі жаніся, дочэнько, як сама знаеш,
Бо не можна ўстаці, камянёў подняці,

Бо я каменем прыложоная,
А вечнымі замукамі замёкнёная.
Першы замочак – зялёны дзярночок,
Другі замочок – жоўты пясочок,
Трэці замочок – цесовая дошка.
Зялёны дзерночок, ты отверніся,
Жоўты пясочок, ты отсыпніся,
Цесовая дошка подыміся,
А ты, моя мамонько, хоця одзовіся.

*Выконваецца перад пасадм маладой:*

Каменная печачка, каменная печачка,
Вечар гарыш – не выгарыш, вечар гарыш – не выгарыш,
Каменейка да й не распаліш.
Маладая дзеванька, маладая дзеванька,
З рання сядзіш, да й не заплачаш,
З рання сядзіш – не заплачаш,
Родзіноньку да й не разжаліш.
Ой, тоды разжалю, як пойду я по застолейку,
Коскамі распушчуся, слёзкамі обольюся.

*Як сірату-нявесту на пасад вядуць:*

Станавіся, родзінонько, уся ў рад,
Бо іціме Ганночка на пасад,
Бо іціме Ганночка ў радочку.
Усю родзіноньку обышла,
Нідзе свое мамонькі не знайша.
А галоўка моя ў квеце,
Няма моей мамонькі на свеце,
А головонька моя ў вяночку,
Няма моей мамонькі ў радочку.

*Як нявесту на пасад вядуць:*

Ой, ляцелі гусонькі церaз сад,
Да клікнулі Ганусеньку на посад.
– Што ж вам, гусонькі, до того?
Е ў мяне мамонька для того,
Она мне хорошэнько нарадзіць,
Да мяне на посад посадзіць.

Туман яром, туман доліною,
Зу туманом нічого не відно,

Только відно дуба зеленого,
Под тым дубом крыніца стояла,
З той крыніцы Галя воду брала,
Дэ й спусціла золотэ ведзерцэ.
Ой, хто тое ведзерцэ достане,
Той со мною на рушніку стане.
Отозваўся Васіль молодзенькі:
– Я ведзерцэ золотэ достану,
Дэ й с тобою на рушніку стану.

Аддала мяне маці ў далёку сторону,
У далёку сторону, шчэ й вялікую сям'ю.
А вяліка сям'я ўся вячэраць посела,
А мяне молоду посылаюць по воду.
Я ведзерцэ ўзяла ды по воду пойшла,
Ды по воду пойшла, крынічэнькі не знайшла.
Як крыніцу знайшла, зачэрпнула поўвядра,
Як дадому ішла, то слезамі доліла.
Поставіла ў сяней, сама стала ў дзвярэй,
Ды послухаю я, шо гаворыць сям'я.
А вяліка сям'я навучае мужыка:
– Чаму жонкі не б'еш, на што волю даеш?
– А на што яе біць, она ўмее ўсё рабіць,
І са мною гаварыць.

*Перад развітаннем маладой з бацькамі свахі спяваюць:*

Хоць я ночкі не спала,
Я свою свахночку ошукала.
Собе нявехночку дождала
Да к сцюдзёнай зіме плацце праці,
А к краснай вясне кросны ткаці,
А к ціхаму лету жыта жаць,
А к цёмнай ночы на таку малаціць.

*Чакаюць маладых у доме маладога. Спяваюць:*

Выйшла мамонько на дорожэньку,
Ды й слухае, ці шуміць дубровонькі,
Ці стогне дорожэнька,
Ці музычэнькі йграюць,
Ці свахны спяваюць.
І шуміць дубровонька,
І стогне дорожэнька,
А музычэнькі йграюць,

І свахны спяваюць.

*Пад'язджаючы да двара свякрухі:*

Выйдзі, выйдзі, мамонько, поглядзі,
Да шо тобе бояры прывезлі.
Да ці овечку, ці козу,
Да ці невехночку молоду.

*Калі прыязджаюць да маладога, жанчыны спяваюць:*

Ой, маці, маці, вывернула кожух,
Хоча спужаці.
Не пужай, маці, я ж не боюся,
За Васількову ручэньку моцненько дзяржуся.

*Выконваецца пры ад'ездзе радні маладой дадому.*

Ой, ты, свашэчка, моя пташэчко,
Прошу вас, шоб не було мойму дзіцяці
Глуму ў вас, шоб не стояла ўсю ночэньку под окном,
Да не вуцірала дробных слёзочок рукавом,
Шоб не було з лешчыноньки хаты,
Шоб не було з суседонькі мамонькі.
Лешчынонька – не цёплая хатонька,
Суседонька – не родная мамонька!

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас А.С., 1924 г.н., Каралец П.Р., 1917 г.н.,***
***Ракавец М.М., 1927 г.н., Матарас С.П., 1912 г.н.,***
***студэнткай Русай Л.***

У адным сяле есць у бацькі прыгажуня-дачка, а ў другім сяле ў бацькі хлапец-,прыгажун. Бацькі хлопца едуць да бацькі дзяўчыны і пытаюцца: “Чулі, што ў цябе ёсць цялушка. Ці прадаш нам яе?” Калі бацькі дзяўчыны згаджаюцца, то дамаўляюцца на дзень заручын.

На заручыны ўжо прыязжае і будучы жаніх. Маладая абвязвае сватоў памяткамі. На заручынах дамаўляюцца, калі будуць сарочкі мерацьь.

Перад вяселлем збіраюцца ў маладой яе сяброўкі, у маладога – сябры.

У дзень вяселля, калі ўпрыгожваюць нявесту, яна спявае песню: “Хоць буду коснік маці, то не буду заплятаці”. Замужняй жанчыне нельга заплятаць коснік у косы.

Жанчыны, якія пяклі каравай, памыўшы рукі ў вадзе, выліваюць ваду пад дрэва і пяюць:

Ой, вісу, ой, вісу,

Палі вады ў місу,
Будам рукі мыці,
На вішаньку ліці,
Вішні будуць развівацsmall,
Молодыя красоваціся.

Малады прыязжае з дружкам у хату да маладой. У хаце маладой яны абыходзяць вакол стала тры разы, дзержачыся за рукі. Маладая, выходзячы са сваёй роднай хаты, цалуе ўсю сваю радню.

Хросны бацька маладога бярэ хлеб і абыходзіць з ім вакол воза, на якім паедуць маладыя ў хату маладога, каб маладым добра жылося, і перакрэшчывае дарогу.

Калі маладыя заходзяць на двор да маладога, сваццfolly спявае:

Што гэта на парог лезе,
Што гэта на парог лезе?
Чорнэ, кашматы, хлебнэ да багатэ.

Ідзе насустрач, абсыпае маладых жытам і хмелем.

Калі маладая ідзе на пасад, яе сяброўкі пяюць:

Ляцелі гусочкі цераз сад,
Да гукнулі Галечку на пасад.

Хросны бацька маладога ці маладой выразае з хлеба круг і ставіць у яго дзве свечкі, і глядзяць, якая свечка пагасне першай, той з маладых пераживае другога.

Пасля вяселля сястра маладога дае пустое вядро маладой, каб тая ішла па ваду. Маладая бярэ сахар і кідае яго ў калодзеж, каб усім людзям быць прыемнай.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас Вольгі Іванаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Кошман С.***

Ой, дума, мая дума,
Свела казака с ума,
С великого разума.
Не по воли женился,
Не под мысли жену взял,
Бодай ее Бог принял,
Так пошел бы погулял.
Пошел бы миж девки,
Миж хорошое красотки,
Все девки, как девки,
Одна я не такая –

У ее коса, лента голубовая,
Лента голубовая, сама чернобровая,
А юбочка кортовая.

***

“Да бадай табе, коню, трое сілкі отпало,
Як ты ад мяне да дзіця павёз.
Была хата, як святліца,
А цяперака, як курніца”.

***

Ой, гегнула гусонька,
Попередочку летучы:
“Ці ўсе маі серы гусі
За мной да прыляцелі?”
Ой, отозваласа Галенька,
По передочку едучы:
“Ці ўся моя беседонька
За мною прыехала?”

***

Ой, жалко мне жалко
Да на бацюхна свайго.
Не схацеў мяне дзержаці
Да мною загадваці,
А свёкорко будзе дзержаці,
Да мною загадваці.

***

Бывайце здаровы, бацьковы парогі,
Кудою ходзілі мое белы ногі,
Кудою ходзілі – больш ходзіць не будуць,
Кого я любіла, то любіць буду.
Кого я любіла – трэба забываці,
Кого знаць не знала – трэба прывыкаці.
Прышоў нелюбы, заняў усю лаву,
Прышоў міленькі – недзе яму сесці,
Недзе яму сесці, вячэры паесці.
А за ету вячэру кладзе рублей дзвесці,
Кладзе рублей дзвесці, адзін рубль талковы,
Адзін рубль талковы, а сам чарнабровы.

***

Бывайце, братцы, уся мая друзья,
Сейчас я ўезжаю, не відзіш меня.

Выйшаў на крылечко – стаіць маць родна,
Она сільно плача, з сынкамі гаворыць:
– Ой, сыну, мой сыну, што ты нарабіў?
Отца зарезаш, матку отравіў,
Старшую сестріцу на море ўтапіў.
Старшая сестріца законна была,
Отца паважала, матку навсегда.

***

Што табе, мамонько, за дзело,
Што ты аддаёш меня за дзеда?
Ці я табе кашуленькі не прала?
Ці я табе пасцеленькі не слала?
Прала кашуленьку на моры,
Слала пасцеленьку ў каморы.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

***

Прыляцела цяцера, да не ўчора,
Ой, цяцера, тут мне добра,
Тут веселенько, тут я буду зімоваці.
Прыехала Галенька не ўчора, а цяпера,
Тут мне добра, тут веселенько,
Тут я буду вековаці.

***

Ты, чырвона каліна (2 р.),
Пахілілась да луга.
Пахілілась да луга (2 р.)
На крутыя берага.
На чужыне цяжка жыці (2 р.),
З чужым родам гаварыці.
Распушчу я сваю долю (2 р.),
Плыві, доля, за вадою.

***

Як прыехаў казачэнька з поля,
Прывязаў ён каня да явора,
Да й заплакаў каля каня стоя,
Забалела галованька моя.
Ой, дай, Божа, вечара даждаці,
Нашлю сватоў дзяўчыну сватаці,
А сам я буду пад акном стаяці,

Паслухаю, што будуць казаці.
А дзеўчына па святліцы ходзіць,
Яна свае белы ручкі ломіць.
Маці, маці, нарадзіцца ў хаце,
Скажы, маці, што сватам казаці,
Ці мне, маці, прыданне гатаваці,
Ці мне, маці, шчэ й год пагуляці?

***

Зяць цешчу вядзе,
На дарожэньцы кладзе.
Да лежы, цешча, тута,
То я выламлю прута.
Буду цешчу біці,
Шо не ўмела дочкі вучыці.

***

Гарэла сасна, палала (2 р.),
Пад ёю дзеўка стаяла.
Пад ёю дзеўка стаяла (2 р.),
Русую косу чэсала.
Ой, косы, косы вы мае (2 р.),
Доўга служылі вы ў мяне.
Ой, больш служыць не будзеце (2 р.),
Бо ўжо пад венок пойдзеце.
Гарэла сасна, палала (2 р.),
Пад ёю дзеўка стаяла.

***

Ляцелі гусонькі цераз сад,
Гукнулі Галеньку на пасад.
Гусонькі не того,
Ёсць у мяне бацюленько для того,
Ён мяне хорошэнько нарадзіць,
Ён мяне на пасадзі пасадзіць.

***

Ехаў Ясь на кані, Кася воду брала (2 р.),
Заглядзелася на Яся, яго зачаравала (2 р.).
– Касенька ты мая, напаі мне каня.
– Я каня паіць не буду, бо я жонка не твая.
– Хоць ты не жонка, але ж каханка,
Напаі мне коніка, бо яму так жарка.
Конь воду п’е, п’е, ножкаю б’е –
Уцякай, Касенька, ён цябе заб’е.

– Хай забівае, хай абкусае,
Я не буду ўцякаць, буду я цябе кахаць.
Ехаў Ясь на кані, Кася воду брала (2 р.),
Заглядзелася на Яся, яго зачаравала (2 р.).

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас Лексы Савічны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

**Прапіў бацька дочку**

На салодкім мядочку,
А, напіўшыся, скачэ,
А, праспаўшыся, плачэ.

***

Да падзякуймо Богу
Да туроўському попу,
Што нашы дзеткі звянчаў,
Не дорага за вянец узяў,
Да двое молодзенькіх,
А чатыры золоценькіх.

***

Адчыняй, маці, аконца,
Вязуць табе нявестку, як сонца,
Адчыняй, матуля, другое,
Вязуць табе дзеток абое.

***

Ой, у цэркві бывалі,
Трое зелье відалі:
Одно зелье – мята,
Друге зелье – рута,
А трэце – квеці,
Звычайныя дзеці.

***

Ніхто не ўгадае,
Што ў нашым караваі –
З трох рэзок пшаніца,
З трох рэчак вадзіца,
З трох дзежак масла,
Штоб долечка красна.

***

Ой, мы дзело зробілі,

У сад вадзічку насілі,
Да ручанькі памоймо,
Да на вішаньцы злемо,
Штоб вішанькі развіваліся,
Да маладыя красаваліся.

***

Ой, стаяла бярозонька сорак лет,
Сячыце бярозаньку пад загнет,
Кідайце бярозаньку ў жарку печ,
Штоб наш каравай ясен быў,
Штоб наш малады красен быў.
Ясен каравай мукою беленькаю,
Красен малады душою добранькаю.

***

Ой, у печы каравай гічэ,
Каравай гічэ, жанок клічэ:
“Дзе мові каравайніцы,
Дзе мові нарадніцы?”
У мяду запіліся,
Мяне ў пячэ забыліся.
Хадзеце, маладзіцы,
Каравая радзіці,
Да нарадзімо самі
Залатымі перснямі.

***

Ты, дубровонька, ты, дубровонька,
Ой, зялёная была,
По тобе ж я і ходзіла,
Заблукалася была.
Я думала, ой, дубровонька,
Што лясок твой невысокі.
Не чуе мяне матуля,
Не чуе мяне татуля,
Толькі лясок гудзіць,
Галасок мой не пускае.

***

Да бору, малайцы, да бору,
Да бярыце тапары з сабою,
Да рубіце сасонку дадолу.
Да сядзела сасонка колькі лет,
Да зрубіце сасонку на загнет,

Каб наш загнет красен быў,
Каб каравай красен быў.

***

Караваю, мой, раю,
Я цябе прыбіраю
Па краёх – сырам, маслам,
Пасярод – доляй, шчасцем.
Каравайнічкі, пачынайнічкі,
Да не стойце ў запечку,
Ды выйдзіце на хаточку,
Да пачніце вяселейка,
Вяселейка вясёлае.
Дзевачкі ў песенькі,
Музыкі – у скрыпачкі,
А мамочка ў мысельsprings.

***

Выйдзі, мая матулечка, з свячамі,
Ужэ твоё дзіцятко звянчалі
З тым госцікам, што ўчора быў,
Ён тваё дзіцятко палюбіў.
Палюбіліся да з поўначы,
Павянчаліся пры свячэ.
Палюбіліся ў каморачцы,
Павянчаліся ў цэркаўцэ.

***

Не сядзі, дзевонька, не сядзі,
Адчыні акенцэ, паглядзі,
Ці ясен месяц пры зары,
Ці харошы хлопчык пры кані.
Ой, пад ім конік, як сокал,
На ім шапачка, як агонь.
На баку шабелька мігацела,
За яго дзевонька хацела,
Вяночак да ўсё зелейка,
Пачынайся ж, вяселейка!
Вяночак – рута-мята,
Вяселіся ж, хата!
Повілі вяночак, повілі,
Па столейку пакацілі,
Па століку цясовым,
Па абрусу шаўковым.
Кацїся, вяночак, у парог,

Маёй матульцы да ног.
Падымі, матуля, паднясі.
– Не падыму, дзіцятко, не падыму,
Бо я сваіх ручак не ўзыму.

***

Па небу месячык коціцца,
Сын у татулькі просіцца:
– Пусці, татуля, на адну ноч,
Заўтра к абеду прыеду,
Прывязу скрыню і пярыну,
І маладзенькую княгіню.
А скрыню, пярыну да клеці,
Маладую княгіню – да печы.
А скрыню, пярыну – пасцель слаць,
З маладой княгіняй век векаваць.

***

Ой, выйдзем і паслухаем,
Ці не едуць сваты,
Ці не імчацца, ці не гойкаюць,
Бізунамі ці не хлопаюць?
Ой, іржуць, іржуць коні,
Відаць, багатырочку везуць.
Не так бы яны раўлі,
Каб худобочку везлі.

***

Молода Ганночка, сабірайся,
Сабірайся, не бауся,
Там цябе дажыдаюць,
Цэркоўку адчыняюць.
Адчыняйся, цэркоўка,
Вядуць дзеток-адналеток,
Аднэ дзіця роджанае, друге – суджанэ.
Яўсейку сам Бог радзіў,
А Мар’ечку яму судзіў.

***

Звілася, бярозка, звілася,
З кім наша Мар’ечка сышлася?
Сышлася з табою, Іванко, з табою,
Над зялёненькай вярбою.
Вараныя конікі пасучы,
Абараначкі ядучы.

***

Ой, зелена, зелена ў лузе трава,
Ой, молада, молада ў мужа жана.
Таго яна зелена, што дожджык ідзе,
Таго жонка молода, што доля яе.
Свёкор по сеночках похаджвае,
Сваю нявесточку, чужое дзіця,
Ужо куры канопелькі погрэблі,
А козы капустачку пагрызлі.
Ранняя пшанічка ні жата стаіць,
Ой, спі, мая міла, да белага дня,
На табе падушачку пад галаву.

***

А на небе месячык узыходзіць,
А ў дзяжэ каравай падыходзіць,
І да гары вечачка падымае,
Да сябе молодзіц прызывае:
“А ўставайце, молодзіцы, не сядзіце,
Памыйце рукі беленька,
Замясіце каравай харашэнько.

***

Гаспадар запрасіў на хлеб-соль,
Я запрашаю на каравай,
Прашу бацьку, маці,
Каб ласкавы былі і на каравай прыбылі.

***

Не кукуе-то зязюлька,
Не соловейко пяе,
Плачэ-то мая матулька,
Мяне замуж аддае,
А я не буду плакаць, бедаваць,
Слязамі мора не нальеш,
А толькі сэрца надарвеш.

***

Ехала дзяўчына да вянца,
Сыпала золота з рукава.
Хто маё золата падбярэ,
Хто мяне пад вянец падвядзе?
Падабраў золата старшы брат,
Падвёў пад вянец малодшы брат.

***

Станавіся, радзіна, у рад,
Будзе ісці дзевочка на пасад,
Па плечыках коскі распусціць,
Па лічыку слёзкі разолье,
Коскамі зямліцу падмяце,
Слёзкамі ножочкі полье.

***

Ішлі дзевочкі ў тры рады,
Манечка наперадзе.
Усе дзевочкі песні пяюць,
А Манечка плачэ.
Чаго ж ты, Манечка,
Усю ночку плачэш?
Няўжо чуеш зяця, свякруху.
Ліху, не ліху, а ўсё роўно –
Не матулечка.

***

Ой, радуйся, маці,
Сын у хату нявестку вядзе,
Маладую, на дзело схвочую.
Ідзе ў поле, не лянуецца,
Прыйдзе з поля – весялуецца.
Дзе свякруха бяжыць,
Там зямля дрыжыць,
Дзе ж нявестка ідзе,
Дык як пава плыве.

***

Ой, крывая вулочка,
Як па ёй ходзіці?
Ліхая свякроўка,
Як ёй угодзіці?
Як па крывой вулочцы сям-там перайду,
А ліхой свякровочцы ніяк не ўгаджу.

***

Прыехалі заручынкі,
Без скрыпкі, без дудачкі,
Што яны іграць будуць?
Каго яны заручаць будуць?
Няма дзевонькі дома,
Кароўку пасла ды згубіла,

Шукала ды заблудзіла.

***

Зборная суботанька настае,
Зялёна рутонька на столе,
Дзевочка дружыну збірае,
Вакол століка саджае,
Самая малодзенькая між іх,
Склоніла головоньку ніжэй усіх,
Склоніла головоньку з касою,
Поліліся слёзонькі ракою.
– Ці вы мне головоньку звяжыце,
Ці малойчыка прышліце.
Звязалі головоньку вяночком,
Прыйшоў малойчык з цвяточкам.

***

Дадому, сватове, дадому,
Бо поелі конікі салому.
Не то салому, не то мякіну,
По-за плоцікам крапіву.

***

Была, была ночанька,
Вось ужо і дзень,
Свякруха нявестку даўно жджэ.
– Да нявесточко моя, жадана,
Да жадала цябе год ці два,
На котором годку дожджала,
Штоб ты мяне маткою назвала.
– Назову свекруху маткою,
Я без розуму не буду,
Я ж собе розуму добуду.

***

Выйшла маці зяця прымаці,
Не так прымаці, як выглядаці,
Ці велікага стану, ці хораша ўбраны?
Ці бела на ём кашуля,
Каўнер бабровы, а зяць чорнабровы,
Каўнер ваўністы, а зяць наравісты,
Стаў пры парозе, як пень пры дарозе,
Да ці яму не гадзіцца нам пакланіцца?

***

Чырвона каліначка бліз саду стаяла,
Ды расою прыпала, там дзевочка расу брала,
Расою вымывалася, да шлюбу сабіралася,
У матулечкі пыталася:
– Матулечка мая, родная,
У што мне прыбірацiся?
– Дзіця мое молодое,
Прыбярыся сабе ў залатое,
Каб галовочка ззяла,
Каб свекровочка знала,
Родным дзіцятком назвала.

***

Добры вечар, добры людзі,
Мы да вас.
Ці не прылятала наша галачка да вас?
Бо з вечара сачыла,
А сягодня й дарожаньку згубіла.

***

Ой, стояла ж, буяла,
Канопелька ў гародзе,
Да не даў ёй ветрычак яшчэ пастаяць,
Ой, адбіў ёй лісточок на жоўты пясочак.
Ой, гуляла ды пагулівала
Манечка ў сваёй матулечкі,
Да не даў ёй Яначка
Яшчэ больш пагуляці, косачкай памахаці,
Да расплёў ёй косачку, разліў слёзачку.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Кадоліч Алены Антонаўны, 1908 г.н.,***
***студэнткай Кадоліч Н.***

Вуйдзі, вуйдзі, мамонько

Вуйдзі, вуйдзі, мамонько,
Погледзі, шчо мы тобе, боярэ, прывезлі:
Да ці авечку, ці козу,
Да ці невесточку молоду.

Да свекроўка невестку за столом вітае

Да свекроўка невестку за столом вітае,
За столом вітае, да долі пужае:
Да не будзь, невестко, вельмі хворліва,
Да будзь, невестко, вельмі шчаслівa.
Розносці долю да по мойму полю,

Розносці шчасце по моіх адрынах.

***

Перэпіў бацько короўку
Да на мою бедну голоўку,
Шчоб рано ўставала,
Короўку доіла і ўганяла.

Ой, ковалю, коваленьку

Ой, ковалю, коваленьку,
Скуй да скуй мне сокерэньку,
Да зробі мне да кроваточку,
Да прыкуй зезюленьку,
Шчоб рано ковала,
Шчоб мене да побуджала.
Бо й у мене не свой бацько,
Да не будзе будзіці,
Пойдзе к суседу
Да мене, молодзеньку, судзіці:
– Да, суседочкі мое,
Есць у мене да невесточка:
Сонліва, дрэмліва,
А на дзельце леніва.
Сонцэ не зойдзе – ляжэ,
Сонца ўзойдзе – устане,
Устане рано, поснедае.

***

Прывезлі да молодзіцу
У нову светліцу,
У багатую землю,
У вялікую сем’ю.
Што земелька корэністая,
А семейка ганарыстая.

***

– Чому, Олечко, не вечэраеш
У свойго бацюхна?
А ек ты пойдзеш
К чужому бацьку,
Вечэраць не будзеш.
Самі посядуць дэ й вечэраці,
Цебе пошлюць по воду.
Вёдра велікі, вода далеко,
Некому пожалеці.

– Ой, есць у мене
Молоды жэніхно,
Он мене пожалее.
Он за ведзерца, а я – за друге,
Пойдомо по водзіцу.

### З намі, Олечко, з намі

З намі, Олечко, з намі,
У нас дзельцэ не робяць,
Только хорошэнько ходзяць.
У нас котко дзельцэ робіць,
Лапкамі хатку меце,
А водзіца – да сама цечэ,
А сонейко пірогі печэ,
А дожджычок да полівае,
А месячок серп мае.

### Да лецелі гусонькі церэз сад

Да лецелі гусонькі церэз сад,
Гукнулі Олечку на пасад.
– Геню, вам, гусонькі,
Ля гэтого есць у мене бацюхно.
До того вон мене хорошэнько нарадзіў,
Он мене на пасадзі посадзіў.

***

Перэд цесцевым двором
Да высокая гора,
Нельга к горэ прыступіці,
Конічэнька напоіці.
От і вуйшла, от і вуйшла
Молодая Олечка,
Узяла коня за грывоньку,
Дэ й повела во дворэньку,
Дала коню аўса, сена,
Сама пошла на посад села.

### Да дзевоньчын бацюхно

Да дзевоньчын бацюхно
Да по ёлоньцы ходзіць,
Да суседочок просіць:
– Да суседочкі мое,
Да ходзеце вы ко мне
І к моему дзіцяці
Коровая гібаці.

Коровая заблемо,
Да веселле зроблемо.

### Ой, вісу, наш вісу

Ой, вісу, наш вісу,
Да налью воды ў місу,
Да ручэнькі помуйло,
Да на вішэнькі зльемо,
Штоб вішэнькі развіваліса,
Молодыя красоваліса.

***

Тупу, тупу коло дзежэчкі,
Зародзілі сыроежэчкі.
Ці сыроежэчкі браці,
Ці невесту вітаці.

***

Стояць садочкі да ў тры радочкі.
Шо ў одным садочку
Коніка пояць,
А ў другім садочку зязюля куець,
А ў трэцім садочку дзеванька плача,
Да бацюхна просіць:
– Ходзі, ходзі, бацюхно, ко мне на веселле.
Бо некому ўстаці, порадочок даці.
– Ідзі, ідзі, дочэчко, собе на здороўе,
Бо мне нельга ўстаці, порадочок даці.

### З-под белай берозонькі конік выбегае

З-под белой берозонькі конік выбегае.
На ём жэніх седзіць і коніка погоняе,
І з коніком размоўляе:
– Ой, конь мой, конь охваленька мой.
Охвальвай ты мене.
Перед цесцевым бором да высокая гора,
Ой, выйшла молодая дзеванька.
Она к горэ прыступіла і коня напоіла.
Узела коніка за грывоньку
І повела ў одрыноньку,
Дала коню оўса, сена,
Сама пойшла на посад села.

### Кленовая лісціонька

Кленовая лісціонька,

Куды цебе да вецер вее?
Ці ў луг, ці ў доліну,
Ці назад на клёніну?
Молодая дзевонька,
Куды цебе бацько аддае?
Ці ў татары,
Ці ў татарскую землю,
Ці ў велікую сем’ю?
Ні ў людзі, ні ў татары,
Ні ў велікую сем’ю,
А ў царскую землю.
Там земелька корэністая,
Молодая ганарыстая.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Белка Кацярыны Пятроўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман Т.***

Вось пачынаецца  вяселле і пяюць:

Ой, на страсе парасло зелле,
А ў хаце вяселле.
Ходзем зелле позрываймо,
Ды вяселле начынаймо.

У дзеўкі спяваюць:

Летняя  зяўзюленько,
Ужо ж табе дамінаецца.
Летняе куковайнейко,
Высокае полетайнейко,
Хоць будзем летаці,
То не будзем куковаці.
А хоць будзем куковаці,
То не будзем гнязда маці.
Маладыя (імя) ужо табе дамінаецца.
Дзявочае дзеваванейко,
Русо, косо да часанейко,
Хоць будзеш заплятаці,
То не будзеш косніка маці,
То не будуць дзеўкай зваці.

Калі сірата замуж ідзе, то так спяваюць:

Зялёная дуброванько,
Чаго ў цябе пянькоў многа,

Паростачкаў да нігодненького.

Калі няма бацькі, спяваюць так:

Маладая (імя), чаму ў цябе бацькоў многа,
А роднага да нігодного.
Одно тая, што піці да есці,
Да некаму парадак весці.
Одно тая, што напіціся,
А некаму пажурычыся.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Пятроўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Вясельная песня

Ой, ковалю-ковалюсеньку,
Скуй жэ мне сякерусеньку,
Да зробі кроватоньку,
Да прыкуй зязюленьку,
Шоб рано ковала,
Да мяне побужала,
Бо свякроўка – не маці,
Не хоча будзіці.
Пойде до суседаў,
Да будзе судзіці,
Ой, суседонькі мое,
Ой, шо ў мене за невестонька?
Сонліва, дромліва, на работу леніва,
Сонцэ не зойдзе – ляжэ,
Сонцэ ўзыйдзе – устане.

***

От венца ідучы,
Погубіў молоды онучы,
А молодая позбірала,
Молодому пооддовала.

***

Ой, знаці, шо свякроўка – не маці,
Надзеласа кожухом, да хоцела спужаці,
А я яе да не баюса,
І з мамонькою поміруса.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

## Пахавальная абраднасць і галашэнні

Адчуўшы набліжэнне смерці, хворы прасіў, штоб пазвалі сьяшчэнніка для апошняй іспаведзі. Людзі лічылі, што душа без болю адыдзе ў вечнасць, калі паміраючаму даць у рукі свечку, што гэта свечка асвятляе шлях на той свет.

У той момант, калі чалавек памёр, хто-нібудзь з сваякоў тушыў гэту свечку. Затым гэту свечку ставілі ў пасудзіну з зернем. Нябожчыку плотна закрывалі рот і вочы. Рабілі гэта самыя блізкія. У хаце спынялі часы, зеркала завешвалі, нябожчык не павінен "бачыць" свой адбітак. Бліжэйшыя з радні жанчыны пачыналі першыя галашэнні. Штоб пра смерць даведаліся аднавяскоўцы, выходзілі галасіць на вуліцу. Распальвалі ў печы адразу для таго, каб нагрэць ваду для мыцця нябожчыка. Тыя людзі, каторыя мылі і адзявалі нябожчыка, рабілі і патом няслі гроб на могілкі, капалі яму, не былі сваякамі з нябожчыкам.

Калі прасілі памагці, то ніхто не адказваўся, бо гэта лічылася вялікім грахом. Памёрлага мылі 3 чалавека сваяго полу. Пры мыцці ніхто з пастаронніх не прысутнічаў. Воду, у якой мылі нябожчыка, вылівалі пад вугал нежывой забудовы.

На смерць людзі адкладвалі самае лепшае, чыстае, новае адзенне. Пасля мыцця яго адзявалі. На ногі адзявалі белыя панчохі, затым надзявалі абутак. Маладых нябожчыкаў адзявалі як пад вянец. На рукі нежанатых надзявалі кольца.

Нябожчыку за пазуху лажылі дробныя грошы, штоб на том свеці ён мог расплаціцца за места на могілках і мёртвыя яго не прагналі. Рукі складвалі на грудзях.

Да таго часу, калі зробяць гроб, цела лажылі на лаву, на покуці, галавой да абразоў, а нагамі да дзвярэй ( як выхад смерці з дому). Ля галавы лажылі баханку хлеба.

После таго, як прыбяруць нябожчыка і пакладуць на лаву, пачыналі прыходзіць знаёмыя і суседзі, амаль што ўсе аднавяскоўцы. Стаўшы над нябожчыкам, маліліся. Усе успакойвалі родных, успаміналі памерлага толькі добрымі словамі.

Людзі адзявалі чорнае адзенне і чорную хустку завязвалі на галаву жанчыны. Ніхто з сям'і ў гэтыя дні не працаваў. Да тых пор, пакуль нябожчык быў у хаце, падлогу ніхто не мёў. Каля памёрлага ўвесь час хто-нібудзь быў.

Гроб збівалі з сасновых ці яловых досак. Дно выкладвалі сенам, паверх пасцілалі кавалак палатна.

Цела нябожчыка хавалі на 3-ці дзень.

Калі цела нябожчыка ў грабу выносілі з хаты, то нябожчыка і ўсіх, хто прысутнічыў, лавы, дзе стаяў гроб, усю хату абсыпалі зернем (жытам, пшаніцай, ячменем, аўсом), узятымі з пасудзіны, дзе стаяла свечка. Зерне кідалі як у хаце, так і на вуліцы. Рабіў гэта хто-нібудзь з радні. Сразу после выпраўлення нябожчыка ў хаце наводзілі парадак.

Нябожчыка на могілкі вязлі на кане, ці неслі. Правясці памерлага ў апошні шлях выходзілі ўсе жыхары вёскі. Наперадзе ішоў мужчына і нёс у руках крэст. За ім ішлі тыя, хто нёс вянкі, за імі ішоў свяшчэннік, затым неслі ці везлі дамавіну, за якою ішлі блізкія і суседзі.

Апошняе развітанне з нябожчыкам адбывалася на могілках. Родныя, блізкія, суседзі цалавалі нябожчыка, плакалі, галасілі. Пасля гэтага дамавіну закалочвалі гваздзямі і апускалі ў яму на вяроўках. Закопвалі тыя, хто капаў яму. На гатовы насып ставілі крэст каля ўзгалоўя, на магілах садзілі дрэвы і кветкі.

***Запісана ў в. Поўчын***
***ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Галасіць пачыналі, калі ўжо памёр чалавек. Яму (нябожчыку) закрывалі вочы, рукі складвалі. У хаце ўсе зеркалы завешвалі, бо лічылі, што душа памёрлага можа сябе ўбачыць там і застацца назаўсёды. Калі галасілі, то да нябожчыка ўсягда харошымі слоўкамі абрашчаліся, прасілі яго ўстаць, прачнуцца. Нябожчыка ў той дзень, калі памёр, мылі, пераапраналі. Калі мылі, то не галасілі. Мыў усягда памёрлага чужы чалавек, у асноўным старыя жанчынкі. Калі труну неслі з хаты, то тожэ чужы чалавек выносіў. Маглі па дарозе да могілак і прычытваць:

Ой, памру я, памру, пахароняць меня,
А радныя не знаюць, дзе магіла мая.
Над маёю магілаю ніхто слёз не пральёт,
Толькі ранняй вясной салавей прапаёт.
Салавей прапаёт і апяць уляціць,
А сіроцка магіла па-за рошчай стаіць.

Але ў асноўным гэту прычыталку, тады гаварылі, калі памёрлы быў сіратою ці жыў сам доўгі час, а пад старасць яго суседзі даглядвалі, ухажывалі за ім.

На трэці, дзевяты і саракавы дзень пасля пахавання наведвалі магілку і плакалі, галасілі, але не так ужо сільна. Гэтыя дні так і называліся: трэці, дзевяты, сорак дней. Праз год тожэ на могілкі хадзілі, а ў хаце стол накрывалі, рабілі памінкі. Тады ўжэ галасілі толькі на могілках. Тожэ галасілі і на Дзяды.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

Калі хто паміраў у сяле, то многія людзі ідуць у паследні раз паглядзець на таго чалавека. Еслі паміраў блізкі чалавек, то галасілі вельмі жалабна, з прычытаннем. У галашэннях етых да памёршага звярталіся толькі

добра, успаміналі толькі добрыя дзяла яго. Калі паміраў бацька ці маці, то дзеці станавіліся ў жалобны траур і заўсёды праводзілі нябожчыка мінутай маўчання.

Памёршага ўсягда мылі, апраналі і абувалі бабы чужыя. Пры адзяванні не галасілі, а толькі прасілі: “Федзька, Бог з табою. Дай ручку, дай ножку”, так як мёртвы ўсягда быстра астывае і яму нельга было сагнуць і рукі, каб адзець. Потым ужо нябожчыка ложаць у дамавіну. Туды ж ложаць усе тыя рэчы, якімі ён карыстаўся: мыла, палаценцэ, крэшчык, праходную і інш. Пасля таго, як памёрлага ўжо палажылі ў дамавіну, хазяйка павінна пакарміць баб, што мылі нябожчыка. Перад ядою яны моляцца, а потым застаюцца ў хаце і начуюць там (сядзяць усю ноч) каля памёрлага. Насупраць дамавіны, у галавы нябожчыка ставяць булку хлеба, соль і свечку запаленую, што стаіць у стакане, у якім насыпана зярно.

На другі дзень прыязджае поп. Дамавіну з хаты выносілі і яму капалі чужыя людзі. На кладбішчы дамавіну з нябожчыкам заносяць у капліцу, і там поп чытае літургію. Сваякі ў гэты час стаяць каля дамавіны і дзяржаць свечкі. Калі ўжо дамавіну апусцілі ў яму, то сваякі кідалі ў яму медныя манеты і па тры жмені пяску: каб забыць хутчэй. На другі дзень пабудку на магілу ідуць самыя блізкія родственнікі. Там яны моляцца Богу, крэсцяцца, выпіваюць. На дзевяты дзень ходзяць толькі тады, еслі харанілі без папа, і ён гроб не пячатуваў. Абязацельна хадзілі на сорак дней і праз год, рабілі дома памінкі. Калі хадзілі на Радаўніцу, то не галасілі.

Калі ж чалавек скончыў жыццё самагубствам, то яго харанілі не ў рад са ўсімі, а збоку кладбішча.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Галасіць пачыналі адразу, як паміраў чалавек. Мылі нябожчыка бабы старыя. Яны абувалі, апраналі. Нельга было галасіць, калі мыеш. Труну выносілі мужчыны. У дамавіну нябожчыку лажыла ўсе неабходныя рэчы: палаценца, мыла, крэшчык, праходную і г.д. Калі бабы памыюць нябожчыка, хазяйка павінна пакарміць іх. Калі хавалі блізкага чалавека, то было жалобнае галашэнне. Гаварылі аб нябожчыку ўсё добрае. Яму капаюць чужыя. Святар у капліцы чытае літургію. У магілу кідаюць па 3 жмені пяска. Адныя гаворасць, каб забыць хутчэй, другія, што проста абычай. На дзень пабудку прыходзяць самыя блізкія. Пасля 40 дней нябожчыка памінаюць. У дзевяць дзён памінаюць тады, як святар не хароніць. На Радаўніцу не галосяць. Галосяць на Дзяды:

Ой, памру я, памру, пахароняць мяне,
А радныя не знаюць, дзе магіла мая.
Над маёй магілаю ніхто слёз не пралье,
Толькі ранняй вясною салавей прапяе.
Салавей прапяе і апяць уляціць,

А сіроцка магіла пазарошча стаіць.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Пяшэвіч Я.***

Колы ў нашым селе паміраў чоловек, то ў етой хаце вешаліся ручнікі на вокна ад вуліцы ці чорныя харугвы, якія ставіліся да сцяны з боку вуліцы. Кажды прохожы бачыў знак бяды, якая случылася ў етой хаце. Кажды, хто прыходзіў у хату, падыходзіў да памёршага і сядаў на лаву. Обязацельно трэбо було ціхенько помолыцца. Усю ноч возле памёршага сядзелі старыя людзі. Воны говорылі пра своё жыццё і жыццё памёршага. Уранні ўсе тыя людзі, хто быў усю ноч возле памёршага, выходзілі ў двор, муліся, обмывалі ліцо памёршага і выцiралі спіцыяльным уціральнікам. Тоды запальвалі свечку, ставілі яе под абразамі і довга маліліся. У еты час родына памёршага выходыла з хаты і голосілі:

Мой жа ты гаспадарочак,
Мой жа ты сакалочак.
І ты ж, бувало, куды поедэш,
Ты ж у мэне рупішся,
Я і ў двор поспець і
Там дзела супаўняць.
Ты ж бувало, у полэ поедзеш
І ў двор рупішся.
Каб і копку прывэсці,
І ў гумно поглэдзець.
Каб жа мнэ выжняяць,
Каб і змолоціць,
І полэ поспець посіяці і запохаці.
І мой жа ты голубок!
А мой жа ты соколок!
Чаму ты мэне пакінуў?
Без тэбе мне свет загінуў.
Учора ты косіў, ораў,
І сягоння вжо бораду задраў.
А супружачак мой міленькі,
А куды ето ты прыбраўся,
А нашто ты мэне пакінуў!
А да кого я тапера прыхінуся,
Няма ў мэнэ нікого родного.

Некалі домовіну з памёршым выносілі з хаты проз вокны. Колы жывыя входылі ў дверы, то памёршага трэбо вынэсці праз вокно. Его ставілі возле порога хаты на несколько хвілін, – кеб помёршы змог последнюю хвіліну побыць возле родное хаціны. Домовіну із помёршым становілі на машыну,

екая прыбрана була хвоямі. У концэ села все спыняліся, нехто з родыны прасіў у людзей прошчэнне: «Кому вон зробіў нешта плохе, кеб не зловаліся на его». Людзі отвечалі: «Хай Бог прошчае» (і так тры разы). Машына з домовіною ехала на могілкі. На могілках домовіну стаўлялі возле ямы, снімалі крышку і прошчалісь з памёршым.

***Запісана ў в. Града***
***ад Нікіценка Яўгеніі Васільеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Еслі не було батюшка, то булі старые людзі, якія моліліса за покойніка. Пелі цэркоўные песні за ўсопшого. Обмуваць покойніка должны бабкі, у якіх не було рубашкі, старые, чыстые бабкі. Покойнік должон ноч постояць у хаце. Людзі, родные, должны остовацца дома і усю ноч сцерагчы яго. Бо ў гэту ноч прыходзілі святые і штоб нечыстые не маглі забраць душу. Трэба завешваць зеркало, штоб душа не заблудзіласа і штоб у зеркалі не застаўса образ покойніка, і штоб ён потым не пугаў остольных. Калі везлі покойніка, то пуд гроб клалі сено ці сосновуе веткі, а потом іх спалвалі ля кладбішча. Самоўбійц на кладбішчах не хавалі, бацюшко іх не отпеваў. А колі і хоронілі, то бліжэй к забору, з краю.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Калі памірае чалавек, адразу закрываюць зеркала і астаноўліваюць гадзіннік.

Завуць мыць нябожчыка старых жанчын, калі памрэ жонка, а калі мужык, то мужыкоў, таварышаў, кумаў, суседаў. Ваду, што мылі нябожчыка, выліваюць на перакрыжаванне дарог, каб людзі разняслі яго грахі, і ён чыстым прадстаў перад божым судом. Рукі выціраць даюць ручнікі мужчынам, жонкам хусткі белыя. Іх яны потым забіраюць сабе. Адзяюць нябожчыка ў адложанае адзенне пры жыцці. Ложаць сарочку жонцы з рукавамі, не камбінашку, бо ёсць легенда, што нячысцік сказаў: «то мае людзі, што голыя рукі і грудзі». Калі ў жонкі было два чалавекі, то ў труну ложаць два фартухі, калі больш, то кладуць больш. Калі памірае чалавек нявенчаны, то пад ногі ложаць кусок палатна, калі венчаны, то на ўвесь гроб на самае дно, патом аббіваюць матэрыялам. З царквы прыносяць венчык, прыхадную, і ложаць на лоб, а на грудзі ложаць прахадную малітву, каб з малітвай прадстаў чалавек перад судом божым, і ложаць на лаву галавой на покуцце. На стол ставяць палатно – гэта дарога жыцця, бохан жытняга хлеба – жыццё чалавека, запальваюць свечку. Свечку і крыж ложаць у левую руку, бо правай трэба храсціцца. Нябожчыка накрываюць матэрыяй, бо жывы ложыцца спаць, накрываецца адыялам. Да нябожчыка прыводзяць жонку, ці мужыка, якія ходзяць у цэркву, каб над ім чыталіса памінальныя каноны, пакуль не прывязуць свяшчэнніка на похараны. Калі выносяць нябожчыка з хаты, то бяруць той хлеб, што на стале ляжаў, возле нябожчыка, і перадаюць

адна з хаты над нябожчыкам. Другая ў сенях забірае яго і ложыць на печ за комін. Гэта каб жыццё не забіраў з хаты нябожчык. А ложаць на печ, бо на печы жыве дамавы. Потым гэты хлеб рэжуць на меленькія кусочкі і даюць на памінках кожнаму. На памінкі гатовяць канун. Гэта салодкая вада і белыя кусочкі хлеба. Кожны памінаючы должэн узяць па тры ложкі канону, потым браць усё, што ёсць на стале. У аддзельны сподачак на покуце ўсіх страў і чарку ставяць нябожчыку. Абавязкова былі боршч, каша і кісель.

***Запісана ў в.Буразь,***
***ад Струк Вольгі Грыгор'еўны,1949 г.н***
***студэнткай Пятрычыц А.***

За стол прыглашалі ўсіх, хто прысутнічаў на пахаванні. Памінкі пачынаюцца з куцці. Куццю павінны былі есці ўсе. Ложкаю зачэрпвалі ў місцы куццю і елі. Трэба было 3 разы зачэрпваць, пры гэтым кожны раз ложку лажылі на стол. Была і выпіўка. Перад тым як выпіць, паміналі нябожчыка. Гарэлка памагала заглушыць напатканае гора і боль страты. Пілі на памінках у меру.

Калі вячэра скончана, то астаткаў ніхто не прыбіраў да наступнага дня. На другі дзень, после пахавання, уся сям'я памёршага ішла на могілкі. Яны неслі з сабой ежу, выпіўку – усё для памінання. На могілках папраўлялі магілу, жанчыны плакалі. Памінкі пасля смерці спраўлялі на дзявяты дзень, саракавы дзень, у паўгода і ў год. На гэтыя памінкі збіраліся самыя блізкія людзі.

**Галашэнні**

Галосяць жанчыны. Яны плачуць з прычытаннем, у якім пералічвалі станоўчыя якасці нябожчыка, апісвалі гора сям'і памершага, выказваліся розныя добрыя пажаданні ў вечным жыцці, у якое перайшоў памершы, якога называюць нябожчыкам. Плач над нябожчыкам – гэта выражэнне смутку, бяссілля перад смерцю, расстанне з блізкім чалавекам назаўсёды.

У час пахарон жанчына не ўхілялася ад плачу. У адваротным случаю, яна б не абабралася сораму ад аднасяскоўцаў.

Галасілі ў час усяго пахавальнага абраду. Галасілі і ў той мамент, калі збіраліся каля прыбранага нябожчыка, калі цела перакладвалі ў гроб, калі з'яўляўся хто-нібудзь новы з радні, калі выносілі гроб з хаты, з двара, калі паследні раз прашчаліся на могілках і апускалі гроб у яму. Галасілі на другі дзень, прыйшоўшы на могілкі, на памінках. Не галасілі толькі ў той момант, як мылі нябожчыка. Не галасілі ўночы. Жанчыны плакалі вельмі доўга, да стомы, да знямогі.

Чым гучней і дольшэ плакалі, тым ў вачах людзей выказвалася большая любоў да нябожчыка. Галасілі ў асноўным жанчыны, якія былі блізкай раднёй. А як не было нікога з блізкіх, то прасілі старэйшую жанчыну, якая ўмела гэта рабіць. Галасіць умелі пачці што ўсе жанчыны.

***

Мая ж ты бабулечка!
Да ты ж нас глядзела,
Як родная маці,
Ды ты ж нас абмывала,
Ды ты ж нас абцірала,
Ды ты ж нас усяму парадку навучыла
І ад бяды нас пазбаўляла.

***

А ты ж мой дзядулечка.
А мы ж цябе ўжо не ўбачымо,
А ты ж такі добры быў.
А хто ж з намі гуляці будзе?
А чаго ж цябе ў цёмную цямніцу вязуць,
Цяжкімі дзярночкамі ножкі спаўюць?

***

Ой жа ж, мая мамачка,
Ой жа ж, мая родная,
Ой жа ж, да каго ж я прыхілюся?
Ой жа ж, да каго ж я прытулюся?
Мамачка мая,
Верная мая,
Родная мая,
Зязюленька мая.
Ой жа ж, наша матулечка,
Як цяжанька раставацца,
Як цяжанька разлучацца,
Мне з табою.
Ой жа ж. дзе ж мне маманьку шукаці?
Ой жа ж, дзе ж мне маманьку выглядаці?

***

Ах, ты ж мой татачка родненькі!
Ах, што ж ты надумаўся?
Зарань у зямельку пайшоў,
Пакінуў ты нас маленькіх,
А з кім мы ж жыць будам?
А хто ж нас навучаць будзе?
Мамулечка ж зусім слабенькая,
Яна ж не зможа нас гадаваць,
Добрага пуці ўказаць.
Устань жа ты, наш татачка, устань,
Раскажы ж ты, як нам тут аставацца,
У каго ж нам добрае слова пытаці?

І будуць жа людзі смяяцца,
Што мы сіроткамі асталіся.

***Запісана ў в. Поўчын***
***ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

А мая ж ты матушка,
А мая ж ты зязюлечка!
Чаму ж ты, чаму памёрла,
Сваю дачку асіраціла?
А каб ты відзела, знала,
Якая мяне доля спаткала!
Ах, устала ж бы ты, устала,
Ах, некаму мяне пажалеці.
Я ў хаце, як у клетцы.
Слязамі, слязамі плачу,
Шчасця-долі не бачу.

***

Ах, татулечка наш,
Ах, сізы голуб наш!
Ты ж нас гадаваў,
Ты ж нас карміў,
А цяпер пакідаеш.
Ці ты жаласці не маеш?
Кто ж цяпер у нас парадак завядзець,
Кто ж нас цяпер прадасцяражэць.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Кароткай Антаніны Максімаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

Дзіцятачка мае мілае, крошачка дарагая.
Чаму ж так хутка ішчэзла,
Як ранняя раса,
Як волас у агне?
Божа мой, Божа,
Чаму ж ты не даў мне нацешыцца
Маім жаваранячкам нябесным,
Маім салавейкам пеўчым у хаце,
Маім сонейкам ясным у небе?
Сонца накрыла чорная хмара,
Хата анямела,
На душу лёг цяжкі камень.
Божа, Божа,
За што ты мяне так люта пакараў?

***Запісана ў в. Поўчын***
***ад Шчур Ульяны Антонаўны, 1911 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Ох, мой воробейко, мой соловейко,
Да ўстань да ты, да не сердзіся ты,
Адплюсні свае вочкі, да размулі свае губачкі.
Да адзавіся хоць адным славечкам ка мне,
Да скінься варабейкам, да скінься ты салавейкам.
Да прыляці ка мне ў госці,
Да сядзеш у меня на вішаньцы,
То я жа адчыняю акенца,
Да ўляціш ка мне ў хату.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Данілевіч Ганны Барысаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Шчур А.***

# ЗАМОВЫ

***Вяргеенка С.А. “Зберажы, Божа, ніву трудавую…” (Спецыфіка рэалізацыі сельскагаспадарчых практык на Жыткаўшчыне)***

Жыткавіцкі край – унікальны куток Беларускага Палесся, які вылучаецца не толькі геаграфічна, але і мае самабытныя народныя традыцыі. Можна не ведаць прыродна-ландшафтных асаблівасцей рэгіёна, але дастаткова пазнаёміцца з фальклорнымі творамі ўвогуле і замовамі ў прыватнасці, каб пра яго склалася адэкватнае ўяўленне. Сапраўды, ці будзе селянін, які спрадвеку вызначаўся прагматызмам, складаць і трымаць у памяці замоўныя тэксты, здольныя абараніць яго ад істот, з якімі яго жыццё не звязана. Але калі мы чуем “хажу па лясам, па кустам, па мхам, па балотам, па гнілі, па чарнікам, па малінам…” (“Ад лесуна”, 1*), адразу ўяўляецца малюнак забалочанага зарослага лесу, дзе арыентавацца можна толькі па сонцу ці зорах. Ва ўяўленні нашых продкаў, “лясны хазяін” мог заблытаць, звесці чалавека, што “пакорна аддаўся” яму, тады гучыць просьба: “ад мяне, раба, адшатніся, у бярозу абярніся” (“Ад лесуна”, 1*). Але самы апрабаваны спосаб “дамовіцца” з лесавіком ведае Н.Ю. Шапавалава (2*). Яна распавядае: “Іду ў лес, бяру хлеб і соль і нясу лясному хазяіну…”. Такі пачастунак-ахвярадаўства павінен прынесці свой плён, калі яшчэ і падмацаваць яго магіяй слова і нагадаць, дзе трэба лясному гаспадару знаходзіцца “…падзі ад мяне, няшчасны, на імхі, на балота, на гнілую калоду. Там табе спаць…” (2*), то, зразумела, пажаданне здзейсніцца. Калі ж “добрае слова” не дапаможа, то можна і прыгразіць: “Не я цябе ганю, гоніць цябе Хрыстос і святая Луна, гоняць цябе агнём, пламенем, жалезным прутом” (2*). Такое ж пакаранне чакае і шматлікіх хтанічных істот: “Вы вужы, вы гадзюкі, вы кусаеце, яд не высасаеце. Папрашу я Госпада Бога, нашле на вас архангела Гаўрыіла, будзе ён вас гарапнікам біці, на агне смаліці” (3*). Геаграфія бытавання замоў ад гадзюк, вужоў, сліўняў даволі шырокая – гэта і г. Тураў, і вв. Азяраны, Кольна, Людзяневічы, Хільчыцы, Востранка, Пухавічы. І гэта толькі ў нашай калекцыі. І ў кожнай мясцовасці свае замовы, накіраваныя на “мясцовых” паўзуноў. С.І. Матарас (1*) падзялілася замовай, якая звернута да “царыцы” ўсіх змей: “…на моры сінім ляжыць сіні камень, на том сіням камні стаіць кравáць, на той кравáці – пуховыя падушкі, цюлевыя засцілкі. На тых падушках, на тых засцілках ляжыць Хама-Хаміца, усім змеям царыца” (“Ад гадзюкі, вужакі, сліўня”). Адзначым, дарэчы, што маральна-этычны кодэкс палешука не дазволіў з царыцай абысціся так, як з простымі змеямі: ёй не пагражаюць пабіць ці пакараць агнём, не ссылаюць у непрывабныя для чалавека месцы, дзе “сонца і яркі месяц не будуць вам (змеям, вужам, слепням – С.В.) свяціць і не будзе прынімаць вас Сыра Маці-Зямля” (4*). Царыцы па-царскі прапануецца альтэрнатыва – або выняць “з раба Божага сваё жала”, або “буду цябе праклінаць і ў празнікі памінаць. Не ўцалееш ты і ў лесе, не ўцалееш пад карчамі, а ў полі пад межамі, а ў будынках пад угламі, а ля банек пад мяллем” (“Ад гадзюкі, вужакі, сліўня”, 1*). У лесе, асабліва калі яшчэ тут ёсць і вадаём, можна сустрэцца і з русалкай – “шальной

дзявіцай”, і гэтая сустрэча, мяркуючы па ўсім, нічога добрага не абяцае. Каб такога не надаралася, Надзея Юр’еўна Шапавалава (2*) пазнаёміла нас з замовай “Ад русалкі”: “Вадзяніца, лесавіца, шальная дзявіца, атвяжыся, аткаціся, у маём дварэ не кажыся. Табе тут не век жыць, а нядзелю быць. Ступай у рэку глыбоку, на асіну высоку… Ідзі ў бор, у чашчу, к лясному хазяіну. Ён цябе ждаў”.

З разгледжаных замоўных модуляў сабралася мазаічнае палатно ландшафта Жыткавіцкага Палесся. Паказальна тое, што наша віртуальная карціна нічым не адрозніваецца ад таго, якім убачыў Палессе вядомы беларускі навуковец М. Улашчык у 30-ыя гады XIX стагоддзя. Ён пісаў: “Адзінае, чым было вядома Палессе на ўвесь свет, там безліч балот, туманаў, дзікасці, ведзьмаў” [1, с. 54]. Нават у наш час татальнай меліярацыі, асушэння проста бяскрайніх балот і лясоў у Жыткавіцкім раёне “56 % тэрыторыі займае лес з перавагай хваёвых і чорнаальховых драўняных парод, 14 % – рэкі, азёры і штучныя вадаёмы, балоты” [2].

З даўніх часоў наш старажытны продак на забалочаных і зарослых ляснымі масівамі землях выжываў за кошт збіральніцтва, палявання, рыбалоўства, бортніцтва. З часу аседласці адбыўся сапраўдны рэвалюцыйны пераварот ва ўсім укладзе жыцця чалавека. Ён вучыцца прыручаць жывёлу, апрацоўваць зямлю, аднак займацца земляробствам было неверагодня цяжка. Палешукам прыходзілася адваёўваць прыгодныя для гаспадарання ўчасткі зямлі ў леса. Уся жыццёвая практыка старажытнага чалавека засведчыла, што ён цалкам залежыў ад прыроды, таму імкнуўся знайсці сродкі, каб вызваліцца ад гэтай залежнасці і з карысцю скарыстаць тыя магчымасці, што дае прырода, разумеў, што “…павінен дзейнічаць сумесна з прыродай, з яе боскімі і дэманічнымі сіламі. Прырода не прыносіць свае дары чалавеку без яго дзейснага ўдзелу” [3, с. 556]. Такім дзейсным удзелам у працэсе спасціжэння прыродных таямніц было ўважлівае назіранне, супастаўленне, спробы растлумачыць прыродныя з’явы. Перш за ўсё наш продак звяртаў свой позірк да нябёсаў, бо адтуль пасылаецца жыватворнае цяпло або спапяляючая гарачыня, апладняючы зямлю дождж або разбураючыя вадзяныя патокі, а то і град, гром, маланка, віхуры і г.д. “Мир не нем и непроницаем… Космос «живет» и «говорит», он прозрачен и таинственен” [4, с 103-104]. Старажытны чалавек імкнуўся разгадаць гэтыя таямніцы, пачуць і зразумець падказкі-пажаданні-папярэджанні прыроды і скарыстаць іх у сваёй аграрна-практычнай дзейнасці. “…наш селянін увогуле добра, хаця і павярхоўна, ведае, ад якой сукупнасці прыродных (надвор’евых), фізічных і хімічных умоў залежыць велічыня яго ўраджаю. І разам з тым ён у такой жа ступені працягвае верыць, што ён абавязаны ўраджаем таксама – і перш за ўсё – добрай волі і добразычлівасці містычных сіл…”[5, с. 111]. Наш продак вынайшаў не менш містычны і даволі дзейсны спосаб уздзейнічаць на гэтыя містычныя сілы – рытуал замаўлення, дзе ў адзінае знітаваны сакральныя словы, магічныя дзеянні і прадметы-апатрапеі. “На Юр’я, колі выгоняюць короў, шоб корова добрэ ходзіла на пашы і ішла домоў, то бралі свечэну

вербу і ёй тры разы ўдарыць корову і казаць: “Ідзі, здоровенька ходзі, да домоў прыходзі”. Так трэба тожэ тры разы сказаць” (5*).

З зямлёй былі звязаны самыя запаветныя спадзяванні і мары земляроба пра дабрабыт. Традыцыйная аграрная культура сфарміравалася на вопытна-эмпірычнай аснове і з’яўляецца вынікам жыццядзейнасці сялян. Здаўна палешукі ведалі, калі высяваць збожжавыя культуры. Тады, як паведаміла Н.Ю. Шапавалава (2*), “трэба перакрысціцца” і звярнуцца да жыта: “Жыта часць, сеяць цябе час. Не сам сабою, Госпад Бог мой са мною”. З гэтага часу пачынаўся штодзённы клопат па догляду нівы: “Забота крестьян в течение дня, как зимой, так и весной состоит в том, чтобы смотреть за скотом, а летом, до наступления полевых работ, кроме того, еще посмотреть в поле посевы…” [6, с. 113]. Сапраўды, клопату было шмат: каб у добры час пайшоў дождж, або наадварот, засцерагчы ўраджай ад навальніцы, і тады С.І. Матарас (1*) звярталася да Бога: “Сцеражы, Божа, тучу гразавую, зберажы, Божа, ніву трудавую. Дай, Божа, у добры час”, або ўжо проста напрамую звярталася да навальнічнай хмары, адсылаючы яе далей ад свайго поля: “Туча, туча, ідзі бокам, апыніся над Глубокім. Там каржы пякут і табе дадут. Там цябе паджыдают”.

Пры доглядзе за ўраджаем не магло быць дробязей. Ратаваць яго трэба было не толькі ад метэаралагічных пагроз, але і ад больш празаічных, але не менш значымых небяспек, напрыклад, ад шкоднікаў-вераб’ёў, якія хмарамі зляталіся на поле і прыносілі вялікія страты. Каб засцерагчыся ад гэтай навалы, можна было з добрымі словамі непасрэдна звярнуцца да птушак, нагадаўшы пра блізкароднасныя адносіны з імі: “Вераб’е, браткі мае, не сядзіце, ляціце ў цёмныя ляса, дзе высокія горы, дзе глыбокая рака. Там вас ажыдаюць, сталы пазасціланы, кубкі паналіваны. Станеце, вераб’е есці, астаньцеся там на месце…”(6*). Замаўляльнік, ратуючы сваю ніву ад шкоднікаў, спакушае іх гасцінным прыёмам “там вас ажыдаюць”, пачастункамі. Але ж дасведчаны чалавек, які знаёмы з міфалагічнымі ўяўленнямі і народна-фальклорнай карцінай свету, разумее, што сэнс адсылання птушак ляжыць не на паверхні, а прыхаваны, бо “цёмныя ляса, … высокія горы” асацыіруюцца з хаосам, што раўназначна “таму свету”, апраметнай. У хаатычную прастору “на ляса, на балота, на чэрэта” прапануе ляцець вераб’ям і Т.М. Бобрык (5*). Яна здзяйсняе магічны рытуал у барацьбе з крылатымі шкоднікамі. Трэба “обойці проціў сонца поле тры разы і штоб ніхто не бачыў цябе, то трэба ісці раненько ці позно ўвечары”. У акцыянальным складніку абраду ўсё мае магічны сэнс: абрад здзяйсняецца патаемна, “штоб ніхто не бачыў”, у “прамежкавы” час (гэта і не дзень, і не ноч), “раненько ці позно ўвечары”. Так званы прамежкавы час ці прамежкавая прастора (мяжа, перакрыжаванне дарог і да т.п.) валодаюць негатыўнай энергетыкай і ўзмацняецца яе, як і абход “проціў сонца”, магіяй лічбаў (“тры разы”) – эфект, які пацвярджаецца ў вербальнай частцы: “сонцэ ідзе не тудою, кудою я…” – павінен канчаткова замацаваць дзеянне ўсяго рытуалу. Ужыванне магічнай тройкі – з’ява не выпадковая, бо лічба гэтая сімвалізуе гармонію, што дае неба, зямля і вада – тры жыццядайныя сілы,

таму і У. Тапароў адзначаў, што “роля лічбы тры ў замовах аказваецца не проста галоўнай сярод іншых лічбаў (4, 7, 9, 12 – С.В.), але і выключнай” [7, с. 215].

Калі разгледжаныя замовы былі накіраваны супраць рэальна існуючых шкоднікаў, то ўраджаю пагражалі і чужыя, варожыя звышнатуральныя сілы. Адна з такіх варожых сіл – ведзьма. Заломы, якія яна пакідае на палях, могуць “адабраць” ураджайнасць, пладнасць нівы, пагражаць не толькі здароўю, але і жыццю селяніна-гаспадара. Таму і спосаб уздзеяння на зламысніка-ведзьму больш радыкальны. Калі шкоднікаў-птушак хоць і адпраўляюць ў месцы, непрыгодныя для жыцця чалавека, але яны могуць там жыць (“астаньцеся там на месце”, або “ешще і піце і там (у лесе, балоце) сядзіце”), то ведзьме ў замовах пасылаецца адназначнае пажаданне смерці. Нездарма ў тэкстах упамінаецца нябожчык: “У том саборы стаіць гроб, у том грабу ляжыць мяртвец, у таго мяртвеца занямелі яго зубы і цела…”. Закрэпка рэалізуе асноўную для замовы семантыку: “Хто еты залом заламіў, занямей яго цела і кроў на векі вякоў, і амінь яму!”. Калі ў барацьбе з рэальнымі шкоднікамі замаўляльнік разлічваў на ўласныя сілы, то для знішчэння звышнатуральнай сілы ён звяртаецца да боскіх сіл: “Госпадзі Божа, благаславі, пасоб мне еты вянок вырваць”. Да таго ж яшчэ ў тэксце ўпамінаюцца і артэфакты-апатрапеі: “Іду я па Юр’евай расе, па жамчужнай траве, Юр’евай расою ўмываюся, малебнаю скацерцю ўціраюся і пайду ў цэркву-сабор” (“Ад залому”, 2*).

Дарэчы, ведзьмы шкодзілі не толькі хлебаробам, але і гаспадарам-жывёлаводам. Паводле народных уяўленняў, ведзьма магла адбіраць у каровы малако, таму, “каб не прапала малако, гаворыцца (замова – С.В.) на Юр’еў дзень, калі выганяюць кароў на пашу: “Выганяю скаціну на Юр’еву расіну. Бяру залатыя ключы і кідаю ключы ў сіне морэ. Як табе, ведзьма вядзьмоўская, з мора ваду не выпіваць, ключэй не даставаць, так і маей скаціны малака не атымаць” (7*).

З мэтай засцярогі-абароны жывёлы важнае месца адводзіцца рытуалам, звязаным з замыканнем. Так, В.І. Шляга (8*) перадала абрад замаўлення “Каб што-небудзь не чаплялася да худобіны”: “… нада ўзяць замок, замкнуць яго, ключ забраць. Там, дзе стаіць карова, адкрыць дзверы і тут жа ў падваротніцы палажыць замок (на тры дні)”. Як бачым, акцыянальна-прадметны (атрыбутыўны) кампанент замовы даволі традыцыйны – прагон жывёлы праз замкнёны замок.

Як вынікае з прыкладаў, у ахоўна-засцерагальных прыёмах “ад ведзьмы” выкарыстоўваюцца пэўныя прадметы-апатрапеі, напрыклад, грамнічная свяча, бо паўсюдна верылі (ды і цяпер вераць), што “громят они силу бесовскую… что такие свечи полезно употреблять для отогнания ведьм от коров, к которым они, дескать, в виде жаб подползают, взбираются по ногам и выменам и высасывают молоко” [6, с. 156]. А паколькі, паводле народных вераванняў, ведзьмы асабліва актывізаваліся падчас вялікіх святаў (Масленіца, Юр’е, Купалле і інш.), то гаспадары імкнуліся менавіта ў гэты час супрацьстаяць нячысцікам. Перавага аддавалася менавіта Юраўскім

святам, бо да гэтага святога “перайшлі” функцыі аховы жывёлы (і свойскай, і дзікай) і палеткаў. Першы выган худобы на пашу пасля доўгай зімы тэмпаральна і прымяркоўваўся да гэтага свята. А паколькі сіла вядзьмарская была магутная, то гаспадыня (менавіта яна бальш кантактавала з каровай-карміцелькай) пачувала сябе няўпэўнена, часта бездапаможнай і ў сваіх зваротах да боскіх сіл-памочнікаў выказвала спадзяванні на іх дапамогу. Гэта даказваюць і тэксты замоў, перададзеныя Н.В. Лякоевай (9*): “Святы Юрый і Ягорый, пасі маю кароўку дзень пад сонцам, ноч пад месяцам, пад яснымі зорамі, пад Гасподнімі словамі…” або “Егорый ты наш храбрый, спасі нашу скаціну ў полі і за полем, у лесі і за лесам, пад светлым і пад месяцам, пад красным сонейкам…”. За дапамогай гаспадыня звярталася не толькі да боскіх памочнікаў, але і да персанажаў ніжэйшай міфалогіі. Так, С.І. Матарас (1*) ведае замову, звернутую да хлеўніка: “Упрашаю хазяіна дамавога, палявога, выгоннага, межавога і самага старэйшага Дзяменція Дзяменціевіча і цябе, Аграсій Аграсіевіч. Прашу я вас, не астаўляйце нас, любіце раба Божага, маіх коней і мілуйце, і прыглядайце, як самі знаеце…” і за ягоную дапамогу па старадаўняй традыцыі прыносіць яму ахвяру: “Добры вечар, хлеўнічок-панічок. На табе хлеб-соль, дай маей карове спакой” (10*). А “Ад шалу, бешанства” скаціну выратоўвае сівы дзядок, які да таго ж знаходзіцца ў сакральным міфалагічным цэнтры: “На моры, на акіяне, на востраве Буяне сядзіць стары сівы дзядок, калінку ламае, сіні агонь прапускае і шал, і бешанства выганяе з скаціны, рыжае шарсціны…” (1*).

У доглядзе за сваёй карміцелькай не маглі быць незаўважанымі нават “дробязі”, тут усё было важна, на ўсё трэба было звярнуць увагу і знайсці прычыну, і, галоўнае, у час сказаць запаветныя словы і каб карова не білася (“Господзі Божа, благославі. Як поговору, так і будзе. Так бы моя корова с места не шэвелілась. Не дай ей, Господ, ні ножного ляганья, ні хвостового маханья, ні рогового бадання. Стой горой – доісь рэкой…” (5*)), і каб не раўла (“У понедзелак закрычала, у нядзелю замоўчала. У аўторак закрычала, у нядзелю замоўчала. У серэду закрычала, у нядзелю замоўчала…” (5*)).

Цяжка прыходзілася гаспадару зімой, а “штоб карова зімой не балела, трэба тры ахапка сена із розных трох коп са словамі: “Фрол і Лаўр, прыходзьце зімой мою корову корміць…” (5*) аддаць карове пасля заканчэння выпасу жывёлы перад надыходам стойлавага перыяду.

Увогуле Палессе – арыгінальны і багаты на народныя промыслы край. Тут, на Жыткаўшчыне, да гэтага часу захаваліся многія віды заняткаў, якія, нягледзячы ні на якія перашкоды, працягваюць сваё жыццё. Адным з такіх заняткаў з’яўляецца пчалярства, якое, мяркуючы па запісах з фальклорна-палявых практык, развіваецца ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Да пчалы спрадвеку чалавек ставіўся з любоўю і пашанай. Яна, як і мурашка, лічыцца сімвалам працавітасці, “олицетворяя порядок, мудрость, трудолюбие, скромность, усердие и красноречие” [8, с. 348]. “В качестве источника меда пчелы могут наделяться сакральным статусом: они выступают олицетворением высшей мудрости” [8, с. 348]. Тое, што пчала з ранку да цямна працуе – агульнавядома. Пчаляры паведамляюць, што ў пчалінай сям’і непахісна існуе

строгі парадак і “працоўныя” абавязкі: так, ёсць матка, яе клопат пра з’яўленне новага пакалення – новай сям’і. Вядома, што калі з’яўляецца гэтая новая сям’я, то старая пакідае вулей і выпраўляецца на новае месца жыхарства. Пакідаючы свой абжыты вулей, пчолы раяцца пэўны час на новым месцы і тут трэба не ўпусціць момант і, тое, што называецца, “прыбраць рой да рук”. Гэтай справе дапаможа замова “Для пчол”: “Як етыя пальцы да маёй далоні не прыстануць, так етыя мецішча не ўстануць. Матка зорка, будзем Госпада Бога брахаць і етае мецішча абіраць” (2*). Знаёмства з гэтым старадаўнім заняткам не толькі пашырае кругагляд чалавека, але і прыадкрывае таямніцу такіх спрадвечных заняткаў, як бортніцтва, пчалярства.

Жыткавіцкі рэгіён – гэта ўнікальная тэрыторыя самабытнага фальклору, які захаваў аўтэнтычнасць, дзякуючы ашчаднаму стаўленню да духоўнага народнага багацця шчырых неабыякавых людзей. І яны шчодра дзеляцца гэтым неацэнным скарбам. Фальклорны ландшафт гэтага рэгіёна шматвектарны і living рознабаковы. Аснова яго – найбольш старажытны пласт, які ўвабраў у сябе замовы, міфы, казкі, легенды, прыкметы, павер’і і іншыя жанры.

Спіс інфарматараў

1*. С.І. Матарас, 1932 г.н., г. Тураў.

2*. Н.Ю. Шапавалава, 1933 г.н., в. Азяраны.

3*. В.М. Бандзюк, 1929 г.н., г. Жыткавічы.

4*. В.П. Макарэвіч, 1940 г.н., в. Пухавічы.

5* Т.М. Бобрык, 1937 г.н., в. Верасніца.

6*. В.А. Рыдзецкая, 1939 г.н., Г.Р. Рыдзецкая, 1932 г.н., в. Рычоў.

7*. М.М. Халязнікава, 1923 г.н., г. Жыткавічы.

8*. В.І. Шляга, в. Кольна.

9*. Н.В. Лякоева, 1916 г.н., г. Жыткавічы.

10*. Л.Ф. Фішар, 1942 г.н., в. Людзяневічы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Улашчык, М. Выбранае // М. Улашчык. – Мінск: Беларускі кнігазбор. – 2001. – 608 с. [8] с; іл.

2. Жыткавіцкі раён / https://be.wikipedia.org/wiki/Жытквіцкі_раён

3. Кассирер, Эрнст. Избранное. Опыт о человеке / Э. Кассирер. – М.: Гардарика, 1998. – 784 с. (Лики культуры).

4. Элиаде, М. Священное и мирское / М. Элиаде / Пер. с. фр., предисл. и коммент. Н.К. Гарбовского. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 144 с.

5. Леви-Брюль, Люсьен. Первобытный менталитет / Л. Леви-Брюль / Перевод с французского Е. Кальщикова. – СПб.: «Европейский Дом», 2002. – 400 с.

6. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края: в 3-х т. / П.В. Шейн. – Санкт-Петербург :

Типография императорской академии наук, 1887. – Т. 1. – 585 с.; 1893. – Т. 2. – 715 с.

7. Топоров, В.Н. Числовой код в заговорах. По материалам сборника Л.Н. Майкова «Великорусские заклинания» / В.Н. Топоров // Заговорный текст. Генезис и структура. – М. : «Индрик», 2005. – С. 194-246.

8. Словарь символов и знаков / авт.-сост. Н.Н. Рогалевич. – Мн. : Харвест, 2004. – 512 с.

**Замовы**

Стоіць Рыгора на мора. Прочыстая Божа Маці по небу ходзіць, белы зубкі лечыць. Коб ясные зоры горэлі, коб у Наташкі зубкі не болелі.

* * *

Наперш – вяснянка, а другая – лядзянка, а трэцяя – лістопадніца, а чацвёрта – косценіца, а п'ята – квоктуха, а шоста – ночніца, а сёма – смутніца! Одкоціса, одваліса – од грудзей і от бела цела, от бедной головы! Ты дзеўкой не шляйса, на міне не зазірайса. Я ў хаці ляжу, на вуголь гляжу.

Як вуголю згорэць, так тобе ў котле кіпець. Бяжы, не озірайса, назад не вяртайса, ступай у пні, у колоды, у гнілэ болото. Там тобе жыць, со мхоў воду піць. Амінь.

* * *

Лішай-лішоўя, твоя маці жыдова, у пятніцу сало ела, а ў суботу заговела. Было ў лішая дзевяць сыноўя. З дзевяці на восем, з васьмі на сем, з сямі на шэсць, з шасці на п'яць, з пяці на чатыры, з чатырох на тры, з трох на два, з двух на адзін. Сын упаў і ў Івана лішай пропаў.

* * *

*Провесці по спіне жывёлы от рог до хвоста:*

– Ты, кароўка, нічого не знай, твоею подхвосцінкой ні оруць, ні боронуць. Ек будуць орацьі бороноваць, то тогда на цябе будуць урокі нападаць. А ты, короўка, нічого не знай, а ўсё молочко отдавай.

* * *

Я іду каменным бродом, а мой Іванко горою. Я стала і дзіўлюса ў воду, ека з мяне цень: з воды – водзяна, а з лозы – лозяна, а з мяне – моя. Ек моя нога за ногою, каб так Іванко за мною. Коб ён куды йшоў – не дойшоў, коб ён еў – не доеў, каб ён спаў – не доспаў, коб ён дзень і ноч думаў обо мне – і ў ядзе, і ў ходзе, і ў сне думаў обо мне.

* * *

Я светою водою ўмываюса, золотом уціраюса, а сонейком одзеюса, а месяцом подперэжнуса, а зоркамі засцегнуса: я нікого не боюса. Як сонцэ і месяц на ўвесь свет свеціць, так коб я была на ўвесь свет міла й люба Одамку.

*Запісана ў в. Азяраны*
*ад Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.*

* * *

Вольна і вольна
Ідзі до своіх суцэльных, родных
І блізкіх і далёкіх
Жало замовляці,
До серца опуху не пускаці. Амінь!
*Говоріць 9 раз.*

* * *

Ішлі калекі через трі рекі. Ішлі, размовлялі, кров замовлялі. Амінь!
*Повторыць 9 раз.*

**Ад лішая**

Лішай-лішавіна, твая маць жыдавіна. У суботу сало ела, у недзелю згубіла. Амінь!

*Чытаць 9 раз.*

**Ад сглазу дзіцяці**

Со двора водзіца, з младзенчыка ліхавіца. З кого ўзялоса, тому пердалосо. Хто са злобой калючой, тому слезой горучой.

Амінь!

*Бяруць стакан вады, разбіваюць туды яйцо, обводзяць 3 разы по часовой стрэлцы кружкі галавы дзіцяці і чытаюць загавор. Патом перэкрэсціць дзіця 3 разы і паставіць стакан пад яго краватку. До ўсходу сонца яйцо со стакана выліць на крыжывую дарогу. Так рабіць 3 дні падрад. Калі дзіця зглазілі, то белок пусціць стрэлы кружкі жэўтка, а дзіця будзе добрэ спаць.*

* * *

Вода ты вода, ключэва вода, як смываеш ты, вода, круглы брэга, пены, корэны, так смывай тоску-кручынушку з белого ліца, з томлёного серца раба Божага (імя). Маі слова легкі і крэпкі. Амінь!

*Чытаць нада на воду, якой умываешся утром.*

* * *

Спасава рука, спасі, сохрані. Ангела-храніцеля ў раба (імя) укрэплі. Ангел мой, зашчыці маё цело, сахрані маю душу от посешчэння врага, от вороўского посежэння, от хітрых, злобных людзей, от пламені і огню. Ангел мой, сохрані мяне, ныне, прысно і во векі векоў. Во імя Отца і Сына і Святого Духа. Амінь!

*Перэд заговором прочытаць "Отчэ наш".*

* * *

Водзіцэ, царыцэ Іорданска Божа Помошніцэ, очышчаеш рэкі, мара і ўсякіе места, очысць раба Божу (імя) от усякого паданого, помышлёного, одвіяного. Ці то з воды, ці то з росы, ці з буйного ветру , ці со злых людзей, ці з недобрых вочэй, ці коўтун, ці гразь, ці спугі, ці страхі. Ці от двох сусов, ці от усякіх быхоў унесці ў глыбокіе мора, у шырокіе сцепа, у цёмные лясы. Няхай собе гуляюць, рабу Божу (імя) не займаюць, дзе ніхто не ходзіць, дзе нічого не родзіць, дзе птахі не лятаюць, там цябе, бяда, дожыдаюць. Амінь!

*Чытаць, калі ідзеш з дому, ці некаго праважаеш.*

* * *

Шэпчу доброй душэ, шоб здорова була, нікогда не болела. І прошу Господа Бога: "Господзі Божэ, помолюса за раба твоего (імя), шоб не балеў і навек здароў буў." Амінь!

*Гаварыць тры разы.*

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Раманоўскай Ніны Іванаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Кузьміч І.***

* * *

Господу Богу помолюса, Ісусу Хрысту поклонюса, і з Божой Маточкой і з усімі Святымі, з Ангелом-храніцелем у дарогу соберуса і нікого не боюса. Слава Господу Богу.

*Чытаць тры разы.*

* * *

Тры дзевы, усе тры Мар'і. Воны шэпчуцца, воны рэпчуцца: про гада сівого, про гада чорного, про гада полового.

– Гад, гад! Забяры свой яд. Ек забярэш свой яд, то будзе тобе ўскрозь прынад, а не забярэш свой яд, то не будзе тобе нідзе прынад: ні ў лесах, ні ў глубокіх водах.

* * *

Стою я на пуці, Ісус Хрыстос і Божая Маці і я з намі, кладу золотую печаць, а вам, ворогам, молчаць!

* * *

Не я к тобе прыступаю, прыступае сам Господ Бог. Веровочка скутая жалезным путом, веровочка віта – стой, короўка, ек урыта, стой, короўка, не брыкай і молочко мне ўсё атдай.

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Кулеш Кацярыны Іванаўны, 1938 г.н.***

* * *

Ёсць у полі лён, у лесі клён, а ў вадзе лін. Як гэтым тром дзельцам у кучку не сходзіцца, так зубы раба каб век-вешны не балелі.

**Ад валасня**

Разыдзіцеся вы, валасьні, па чорнай зямлі, па цёмным лясу, па шчырым бару, па белым камяню, у чырвону сасну: там сабе будзьце, там вы прабувайце, свой вопух пушчайце, рабы Божай не чапайце.

**Ад ваўкоў**

Як тапару ў печы не ляжаці, так шэраму зверу скаціну не відаці. Здайся пнём і агнём.

** * **

Вуж-вужавень, пад мяжой не ляжы, чалавеча цела пры сабе не дзяржы. Чалавечае цела аддай чалавеку, а сваё да сябе бяры.

** * **

Дуб на моры, месяц на небі, а ў месяца два браты ўмесце не сыходзяцца. Каб ета грыжа разышлась, разьмелась па бабіне, па гарошыне, па калашніне, каб яе ветрам здула, каб у гэтай (імя) грыжы не было.

** * **

*Адразу трэба перакрысціца:*

– Госпаду Богу помолімса і Мацеры Божай прыклонімса. Хрэст Хрыстоў у рабу Божу (Надзею), хрэст Хрыстоў і на Паўлу, храстом Хрыстовым бесаў адганяюць. Адступіцеся, бесы праклятыя, да ня дзелайце ні едзіныя ўрэды. Тут жывуць ангелы і архангелы, харувімы і сарахвімы і чатыры вангалісты Матвей і Марк, Лука і Іван Баслоў, і раба Божа Надзея.

** * **

Стрэнь, Божэ, усім добрым, дай, Божэ, час добры і пору добру і ўсе врагі на сторану. Ангел мой, пайдзём са мной, ты ўперадзе, я ўзадзе.

*Перакрысціцца тры разы.*

**Ад жывата**

На моры, на акіяне Прысвятая Багародзіца стаяла, залатнічком кіравала: уверх не падымайся, у бакі не раздавайся, стань у гняздзечка, будзь, як яечка. Памагі рабе Божай (імя).

** * **

*Перакрэшчваюць нажом жывот тры разы*:

– Першым разам, добрым часам прашу я Госпада Бога і Духа Святога, стань, Бог, у помач, ангелы на радасць. Залатнік-залатнічаньку, мой мілы panічаньку, я цябе прошу нізкімі поклонамі, покорным словам, стань на стану, сабярыса ў хмелёву шышачку, разыдзіся па макавым зярнятку.

## Ад залому

*Трэба тры разы перакрысціцца, скруціць залом і наступіць на яго:*

– Госпадзі Божа, благаславі, пасобі мне еты вянок вырваць. Іду я па юр'евай расе, па жамчужнай траве, юр'евай расою ўмываюся, малебнаю скацерцю ўціраюся і пайду ў цэркву-сабор. У том саборы стаіць гроб, у том грабу ляжыць мяртвец, у таго мяртвеца занямелі яго зубы і цела. Хто еты залом заламіў, занямей яго цела і кроў на векі вяком, і амінь яму!

* * *

*У хаце запальваюць царкоўную свечку і водзяць ёю па ўсіх вуглах хаты, калі яна ўспыхівае і трашчыць, значыць, нячыстая сіла ёсць, і яна ізганяецца. Або сцены хаты акрапляюць свечанай вадой. Калі ж у чалавека сядзіць нячыстая сіла, то гавораць такую замову:*

– Памяні, Госпадзі, цара Давіда і ўсю кротасць яго і вялікую памяць яго. Судзяржаў цар Давід ваду і зямлю, і нашы грэшныя душы, судзяржаў жа нарадашную балезнь з такога-та раба Божага. Міхайла-архангел, багатыр нябесны, пабіваў ён уражу сілу з нябёс на сыру зямлю, каб так пабіў уражу сілу з такога-та чалавека. Святы Ягоры-пабеданосец і святы Міколушка-чудатворац, і Спасіцель, і Божая Мацер, так як вы прэждзе памагалі і нячыстую сілу выбівалі, і пользу давалі, так каб і з етага чалавека нячыстую сілу пабілі.

* * *

Першым разам, добрым часам Бог з помаччу. Вячэрняй зарой (ці ранняй), добрай парой. Зара, зара, не запрыступіся (імя) рачонаму, хрышчонаму. Каўтун-каўтуніца, сом і саміца, братка, сястрыца – усіх жа вас троячка. Я ж вас угавараю, я ж вас умаляю, на цякучыя рэкі ссылаю. Там вам купацца, умывацца, у (імя) не стаяць, касці не ламаць, сэрца не крушыць, гарачкі не паліць.

* * *

Ехаў Ісус Хрыстос ракою, паганяў валы мятлою. Астанавіся, кроў, уранні, як Ісус Хрыстос у Іардані.

* * *

Іду ў лес, бяру хлеб і соль і нясу лясному хазяіну, Кляпяке і Астраке, і падзі ад мяне, няшчасны, на імхі, на балота, на гнілую калоду. Там табе спаць, а майго не відаць. Не я цябе ганю, гоніць цябе Хрыстос і святая Луна, гоняць цябе агнём, пламенем, жалезным прутом.

* * *

Асінка, асінка! Вазьмі маю трасцінку, аддай маё здароўе.

* * *

Цар зямны, цар нябесны, цар вадзяны, цар агняны, цар лесавы, прашу я вас, малю я вас, уцішыце, уніміце.

**Ад патніцы**

На моры, на кіяне стаіць дуб, на том дубе сядзіць гарціца. Табе, чарціца, – патніцы, а мне – рукавіцы.

* * *

Лякі, лякі, ідзіце на сабакі, на сарокі, на вароны, на жураўі, на вераб'і, на ўсё птаства, дзе Божы дар не родзіць, курачы голас не заходзіць.

* * *

*Перакрэшчваюць тры разы нажом таго, каго шэпчуць:*

– Первым разом, лепшым часом шла Прачыстая Божа Маці рабе Божай (імя) ляку шаптаці. Адзін свет, адна вада, адныя людзі, адзін бацька, адна маці, ішлі рабе Божай (імя) спуд шаптаці. Амінь.

*Той, каго шапталі, здзвігаецца з места, дзе сядзеў, і сплёўвае цераз левае плячо тры разы.*

**Ад скулы**

Першым разам, Божым часам, Маняю звацць, скулу выгаварацць.

Цераз сіне мора кладачку кладуць, там тры ангелы ідуць. Прыступіла Божая Маці Мані скулу выгавараці. Перша – залатуха, друга – рыжуха, трэця – з любімага духа.

* * *

Звіх, звіх, не будзь ліх, не ламай белу косць, а ламай белу тросць. Жыла баба без ума, загаварывала звіх дарма: косці і суставы, каб усе на месці ў (імя) сталі.

* * *

Шоў Гасподзь па шырокай дарозі, па вялікіх лясах, па зялёных лугах, костачкі-сустаўкі сабіраў, рабу ад звіху помачы даваў.

* * *

Першым разам, Гасподнім часам. Ішоў Бог Ісус Хрыстос цераз залаты мост. Масьніца праламілася – у раба Божага (імя) урокі адваліліся.

* * *

Первым разам, Гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Свята Прачыста Маці, прыступі ўрокі шаптаці. У полі стаіць тры дзявіцы, да тры сястрыцы, а там царыца, а каля царыцы – крыніца, а там цячэ рэчка. Як у тых крыніцах, у тых рэчках вада прыбывае, так у маёй кароўкі малачко прыбывае. Як мой дух ціхенькі, лёгенькі, добранькі, дай, Госпадзі, помач. Я словам, Гасподзен дух.

* * *

Ішоў апостал Пётра, а з імі ішоў чорт. Пётра нясе паленіцу, а чорт рукавіцу. Чорт, чорт, кінь рукавіцу, вазьмі чэмер і патніцу.

**Ад хваробы вачэй**

Маладзік малады, у цябе рог залаты, табе на сіянне, а мне на здароўе, табе цёмныя ночы, а мне светлыя вочы.

* * *

Як у нас Юр'я коні пасуць, статак сцерагуць, нячыстую сілу проч адганяюць, хлеўніка і цмока вожакам поруць, прыгаварываюць: "Хіра ў лес!"

**Ад шалёнай сабакі**

Шопат, ропат, губам, зубам, жарам, ярам, яртус – вон.

**Для пчол**

*Яна гаворыцца для цэлага рою пчол:*

– Як етыя пальцы да маёй далоні не прыстануць, так етыя мецішча не ўстануць. Матка зорка, будзем Госпада Бога брахаць і етае мецішча абіраць.

* * *

На гадзюку еду і вужом паганяю, людзям мову замаўляю. На праўдзе стаю, праўду гавару. Мая хата і мая печ, замаўляю суддзям рэч.

**На ўраджай**

*Зразу трэба перакрысціцца:*

– Жыта часць, сеяць цябе час. Не сам сабою, Госпад Бог мой са мною.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Матцы пакланюся. На моры, на кіяні, на востраве Буяні стаіць хата без вакон, без дзвярэй. Хто ў той хаці? А ў той хаці тры вараны, тры арлы ружжо замаўляюць, замочуюць порах і свінец, і стpаляць ужо ружжу канец.

* * *

Пайду я на сіне мора, на сінім моры ляжыць жэсць, пад тою жэсцью ляжыць лютая змяя. Вазьму тую змяю, павярну к сабе навекі нерушыма.

* * *

Сонцам асвячуся, а месяцам абгараджуся, а залатымі ключамі замкнуся, зорамі асыплюся, нікога не баюся, а Госпад мяне ўстрэне ў вялікай дарозе.

* * *

Вадзяніца, лесавіца, шальная дзявіца, атвяжыся, аткаціся, у маём дварэ не кажыся. Табе тут не век жыць, а нядзелю быць. Ступай у рэку глыбоку, на асіну высоку. Асіна, трасісь, вадзяніца, уймісь. Я закон прынімаў, залаты крэст цалаваў, мне з табой не вадзіцца, не куміцца. Ідзі ў бор, у чашчу, к лясному хазяіну. Ён цябе ждаў, на мху пасцелюшку слаў, муравой усцілаў, у ізгалоўіца калоду клаў. З ім табе спаць, а мяне, хрышчонага, табе не відаць. Амінь.

***Запісана ў в. Азяраны***
***ад Шапавалавай Надзеі Юр'еўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Глазатавай Л.***

* * *

*Спачатку прачытаць "Отчэ наш...".*

Госпадзі Божэ, благаславі (імя) ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь! Как Гасподзь Бог неба і зямлю, воды і звёзды, і маць-сыру зямлю твёрда ўтвердзіл, крэпка ўкрапіл і как на той маці-сырой зямле нет нікакой балезні, ні кравяной раны, ні опухалі – так бы сатварыў Господь і мяня, рабу Божью (імя), твёрда ўтвердзіл і крэпка ўкрапіл жылы мае і косці мае, і белае цела маё. Так бы і ў мяне, рабы Божьей (імя) не было на белам целе, на рэцівам серцы, на касцях маіх нікакой балезні, ні крові, ні раны, ні шчыпаты, ні ламаты, ні опухалі. Едзін архангельскі ключ ва векі вякоў. Амінь!

* * *

Ішоў Гасподзь з небясоў, нёс сто замкоў, сто ключоў касцяныя вароты рабы Божай (імя) адкрываць, младзенца на Божы свет выпускаць.

*3 разы.*

* * *

Ангел мой, кресці меня, ідзі са мной: ты – впередзі, я – за табой.

Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь. (*перахрысціцца*)

Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь. (*перахрысціцца*)

Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь. (*перахрысціцца*)

* * *

У дарогу іду – за сабой Госпада Бога вяду. Крастом крэшчусь (*перахрысціцца*). Ангелы ў небесах, Божая Маці впередзі – і ніхто не падхадзі.

***Запісана ў в. Браніслаў***
***ад Швец Ніны Іванаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Ранчынскай С.***

* * *

Прачыста Божа Маці, залатнічка ўгавараці. Залатнічок, сядзь на сваё местачка, будзеш кніжачку чытаць і залатнічка ўгавараць.

* * *

Выйду я ў чыста поле. Із-пад дуба цячэ карніста рака. Там ішоў Ісус Хрыстос са святым Ільёю. Вядзяныя ключыкі закрываліся, Юрдан-рака астанавілася. Закрыйцеся, жылы крывавыя, стань, не цячы, кроў чырвоная. Ішоў пан Юзес праз Юрдан. Рака стала і кроў стала.

**Ад рака**

Выйду я ў чыста поле, гляну на захад сонца, там стаіць Нікалай-чудатворац. Ідуць дзве дзяўчыны бальныя, страдныя. Нікалай-чудатворац спрашвае:

– Куды вы ідзяцё?

– У русал.

– Не ідзіце, я буду прасіць. Ён вас агнём спаліць, громам паб’е. От рака, усёй балезні, Івана, гэта будзе пры Святым Дусе. Не я хажу, не я бражу, это ходзіць Божа Маці, Прэсвятая Багародзіца.

Амінь, амінь, амінь!

* * *

Ехаў Гаспод па дарозе, там стаяла тры розі. Адна сохла, друга вяла, трэця расцвітала.

* * *

Первым разком, лепшым часком. Жыў чалавек Андрэй да нічо не рабіў, толькі звіхі, удар гаварыў. Звіхнічку, ударнічку, я цябе прашу, молю звіхі, удар гаварыці. Костачка на костачку настаўляецца, добрым здароўе памагаецца. Господзь с памаганнем, а я с паддуваннем.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Данілевіч Ганны Барысаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Шчур А.***

* * *

Страсьці, страсьці, вуйдзі, вуліса, ад раба Божага (імя) з буйное галавы, з густых кудрэй, з ясных ачэй, з рацівога сэрца, з рук, з ног, з жыл, з белаго цела, з краснае крыві, з чыстага жывата. Не я вуліваю страсьці, перапалох, (спуг), а ўлівае Матушка Прысвятая Богородзіца з усімі ангеламі, архангеламі, храніцелямі і пакравіцелямі.

***Запісана ў в. Бярэжцы***
***ад Тачыла Галіны Міхайлаўны, 1941 г.н.,***
***студэнтам Семеняка Н.***

* * *

*Водзіць ножом по больному месту і говорыць:*

– Сілы небесные, чаша брачная, ісцэлі, Панцелеймон, своім даром раба Божого (імя). Амінь.

* * *

*Обойці проціў сонца поле тры разы і шоб ніхто не бачыў цябе, то трэба іці раненько, ці позно увечары*:

– Сонцэ, ідзе не тудою, кудою я, а вы, воробейчыкі, не леціце туда, куды не хочу я. Ляціце на ляса, на балота, на чэрэта, ешще і пейце, і там сядзіце. Ага! Ага!

* * *

*Як зайдзе сонцэ, поставіць спужаного перед горашчай грубой імі печкай і чытаць тры разы:*

– От огня – дым. Дым, пойдзі на вецер, забяры з раба (імя) спуд, страхі, развей на чатыры стораны. Як огонь погорае, дым па ветру ростае, так і спуд з рабы (імя) ісчэзне. Амінь.

**На жывёлу (еслі корова рэве)**

*До того, як петух крыкне, трэба открыць печ і сошку, і заслонку. Нагнуцца і ў печ сказаць сем раз:*

– У понедзелак закрычала, у нядзелю замоўчала, у аўторак закрычала, у нядзелю замоўчала, у серэду закрычала, у нядзелю замоўчала.

Амінь.

**Шоб корова зімой не болела**

*Трэба тры охапка сена із разных трох коп со словамі:*

– Фрол і Лаўр, прыходзьце зімой мою корову корміць. Амінь.

**Шоб корова не біласа**

*Прочытаць на воду, потом этой водой обмуць вымя:*

– Господзі Божэ, благослові. Як поговору, так і будзе. Так бы моя корова с места не шэвелілас. Не дай ей, Господ, ні ножнага ляганья, ні хвостового маханья, ні рогового бадання. Стоіць горой – доіс рэкой, озеро сметаны, рэка молока. Ключ і замок словам моім. Амінь.

**Шоб гусі не гіблі**

*Перве гусяня бярэш у рукі, трэба дзяржаць двума рукамі і гаворыць:*

– Водзіцца не переводзіцца, плодзіцца не пераплодзіцца, сколько пуху ў твое мацеры, столько багато гусей для мого выпасу. Амінь.

* * *

*Калі будзеш танцоваць с кавалером, глядзі яму ў вочы і про сябе скажы тры раза:*

– Адам і Ева согрэшылі, дзяцей народзілі, потому шо друг друга любілі. Так і ты мяне будзеш любіць. Амінь.

* * *

*На Юр'я, колі выгоняюць короў, шоб корова добрэ ходзіла на пашы і ішла домоў, то бралі свечэну вербу і ей тры разы ударыць корову і казаць:*

– Ідзі, здоровенька ходзі, да домоў прыходзі.

*Так трэба тожэ тры разы сказаць.*

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Бобрык Таццяны Максімаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

* * *

Господу Богу помолюся, Пречиста Боже Мати, поможи кровь замовлять. Бегла мурашечка через воду. Вода разлилася, кровь сунялася.

* * *

Господу Богу помолюся, Пречіста Божэ Маці, поможы кровь замовляць. Бегла мурашэчка чэрез воду. Вода разлілася, кровь сунялася.

* * *

Иду я в путь. Со мной Святой Дух Христос, Христос и Христова печаль. Никакому врагу меня не взять. Христос впереди, ангелы по бокам, а я у Божьей Матери в руках. Господи, Господи, сохрани и помилуй нас в пути. Аминь.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Марыі Марцінаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Ніканoвіч Н.***

* * *

Святая Прачыста Божа Маці, Святы Юрый, памагі (імя) балячку ўгавараці. Балючая балячка, калючая, у вочы не ўлятай, а ў вушы не залятай. Ідзі ты на сіняе мора, на сіням моры столікі пазасціланыя, там табе піценне да едзенне. Ідзі ты на чыстае поле, у чыстым полі расце чорны цвет, там табе спакойны свет.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Хрысту пакланюся, а ты, Прачыста Божа Маці, прыступі і памажы (імя) звіх, удар уговараць. Забіўся не забіўся, повіхнуўся, не повіхнуўся, не свіхнуўся. Не свіхнуўся, не забіўся, повіхнуўся, не свіхнуўся. Ішоў чалавек з тапаром не сеяці, не рубіці, не драць, не пахаць, (імя) звіх, удар уговараць. Удару, удару, ты мой господару, я табе пасылаю, куды, сама не знаю. Ножкамі растапчу, ручкамі разышчу.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай Маці пакланюся. Пане Яне, пане Адаме, прашу прыйсці да мяне. Выймі сваё жала на віднае месца, на сіняе мора, белы камень, а на камне чырвоны певень. Як з таго пеўня кроў не кане, так краві нічога не стане.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці пакланюся, памажы кроў замаўляць. Бегла мурашка цераз ваду. Вада разлілася – кроў сунялася.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці, прыступі і памажы (імя) пуд уговораці: мужчынскі, жаночы, хлапецкі, дзявочы. Шоў дзед з места, нёс пуд, а з бабай шлі – неслі два пуда. (Імя) з белага цела зняць пуд красны харошы, несці крутымі беражкамі, жоўтымі пяскамі, пад цёмныя ляса, на сладкія мёды, на жоўтыя цвяты. Там вам піценне да едзенне. Півам запіць, мёдам закусіць, (імя) спаць, прыбуваць і пуду не відаць.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці (імя) падзівок уговораці. Адзін Кірыла, другі Гаўрыла, трэцяя сястра Марта, она нічога не робіць, прыстрэк з падзіўкам гаворыць: падзівочны, ветрэны, мужчынскі, жаночы, хлапецкі, дзявочы. Прыляцелі сарокі, вароны, забралі падзівок. Падзівок, урокі забралі, панеслі на крутыя беражкі, на жоўтыя пяскі, пад цёмныя ляса, на жоўтыя цвяты. Там вам піценне да ядзенне, півам закусіць ды падзіўка не відаць.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Хрысту пакланюся, Прачыстай Божай Маці. Ляцеў птах цераз Божы дах, сеў на вароты. – Чаго ты прыляцеў? – З каровы (белай, чырвонай, рабой) урокі забраці (чырвонай) шэрсці, чырвонай каровы, жоўтай косці. Паляцеў на чароты і на балоты, на жоўтыя пяскі, на крутыя беражкі. Там вам піценне да ядзенне, а карове прыбуваць ды ўрокаў не бачыць.

**Для малака**

Госпаду Богу памалюся, Хрысту пакланюся. Святы Ілья, Святы прарок і Святы Барыс, Святы Мікалай-чудатворац, прашу вас, усіх чатырох і прасіце Госпада Іісуса Хрыста і Прасвятую Багародзіцу, і памажыце ва ўсякую мінуту і ўсякі час і секунду, адганіце злога духа ад маей каровы, бег на чатыры рага, бег прыбуваць. Дай, Божа, маей карове малака, каб было і прыбувала, але не ўбывало.

*Запісана ў в. Востранка*
*ад Бандзюк Ганны Аляксееўны, 1921 г.н.,*
*студэнткай Ярмош Н.*

* * *

Во імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь!

Первым разком, Гасподнім, Божым часком. Прачыстая Маці, прыступі, памажы балячку шэптаці.

Двенаццаць балячак, двенаццаць гарачак: Ясочка, Красочка, чорная, смярцельная, касцяная, масцяная, я цябе маўляю, говараю, на ціхія лозы адпраўляю, там жыве твой бацька, твая маці, будзе табе говараці, (імя) называці.

*Другім разком…(паўтараць 9 разоў).*

**Ад варыкозу**

Шоў айцец Аўраам з самалюбезным сваім сынам Ісакам, неслі жылу недзюжую, Хрысту на вылечванне. Стрэлісь ім 12 камух – Антыхрыстовых шчэрэй. Спытаў іх айцец Аўраам: “Вы сапсавалі жылы рабы Божай (імя)?” Камухі айцу Аўрааму прывіталісь, перад святасцю павінілісь, перад Хрыстом задрыжалі, з рабы Божай (імя) кравяны вузлы забралі. Хто ў пятніцу гэта прачытае, ад таго з жыл Хрыстос хваробу забярэ. Амінь!

**Ад віхору**

Наперад Госпаду Богу памалюся, Ісусе Хрысце пакланюся. Ісусе Хрысце з нябёсаў слязаў усемі святымі крыстамі залатымі. Прашу я цебя, малю я цебя з рабы Божай (імя) віхор выймаці.

Віхор, віхор, ідзі на цёмныя лозы, на жоўтыя пяскі. Там крыніца, у крыніцы шаўкова травіца. Табе травіцу паядаці, у крыніцы воду папіваці, рабе Божаю (імя) забываці.

* * *

Першым разком, Гасподнім Божым часком, Божая маці, прыступі, памажы.

Дамавы-дамавой, хадзі разам са мной, жыві на месце, абходзься ля раба Божага (імя) па чэсці. А калі ты чужой, ды абыдзі мяне стараной.

*Другім разком… паўтараюць 9 разоў.*

* * *

Першым разком, Гасподнім Божым часком, Божая Маці прыступі, памажы залатнік шаптаці.

Залатнічко, залатнічко, Божы чалавечко, па касцям не хадзі, касцей не ламі, крыві не сушы, есці не застужай. Стань сабе на мясцечку, на залатым крылечку, там табе баба пупа адразала, мясцечку паказала. На пупочку, на залатым жоўтым клубочку, шаўковым шнурочку, жоўтым пясочку. Амінь!

*Другім разком… паўтараецца 9 разоў.*

**Ад заікання**

Сабака ляжала, кошка прыбегла і ўсё злізала. Ты, пёс, не скулі, а ты, кошка, забяры, а ты, (імя) добра гавары. Амінь, Амінь, Амінь!

* * *

Во імя Атца і Сына і Святага Духа. Амінь! Хмель і віно, адступісь ад раба Божага (імя) у цёмные ляса, дзе людзі не ходзяць, коні не бродзяць, пціца не лятае.

Во імя Атца і Сына і Святага Духа (*паўтарыць трэба два разы*), хмель і віно, выдзі на быструю воду, на каторай вадзе не ездзяць. Ад раба Божага (імя), хмель і віно, уйдзіце на буйныя ветры, каторы вецер па дальнасці ходзіць. Во імя Атца і Сына і Святага Духа, зацапісь к ліхаму чалавеку, каторы на (імя) ліха думае, к таму зацапісь, каторы дабра не робіць, ат мяне во векі адвяжысь. Во імя Атца і Сына і Святага Духа. Амінь!

* * *

Святы Господзі, блаславі і мне, грэшніку, дапамажы.

На гарэ-востраве стаіць Божы дом, у том доме стаяць тры апосталы: Васіль, Марціян і святы Антоній. Дзержуць у руках па свячы із ярага воску і ўпрашаюць старшага царка Агена: “Унімайце вы сваіх адзінаццаць братоў і самі дванаццатыя ўнімайцеся”. На гарэ-востраве стаіць божы прастол. Састаўлены ты, прастол, ні з вады, ні з зямлі, а састаўлен прастол з пламення вогненна. Што зняў, то патрэбляй, а лішняга не чапай! Ва вякі вякоў. Амінь!

*3 разы.*

* * *

Наперад Госпаду Богу памалюся, Святой Божай Маці пакланюся. Прыступі, памажы рабу Божаму (імя) спуд шаптаці.

Лохі, полохі каціныя, казіныя, сабачыя, ветраныя, вадзяныя. З коміна дым, з рабы (імя) спуд.

*Паўтараць 9 разоў.*

* * *

Ішоў Бог, Ісус Хрыстос і неслі тры рожы: адну шаптаці, другую спальваць, а трэццю і так прападаці.

*Паўтараць тры разы.*

* * *

Штоб Гасподзь разлучыў дзве душанькі – грэшную і нягрэшную. Царскія вароты рашчыніліся, ключы залатыя разамкнуліся, дзве душанькі разлучыліся.

* * *

Наперад Госпаду Богу памалюся, Святой Божай Маці пакланюся. Божая Маці з прэстола ўставала, рабе Божай (імя) урокі шаптала.

Прыступі Господзі, памагі, Господзі, рабе Божай (імя) урокі шаптаці: мужчынскія, жаночыя, хлапочыя, дзявочыя, ветраныя, вадзяныя. Мо вы з піцення, з ядзення, я вас вызаву, выгавару з твайго перада, з тваіх касцей, з тваіх грудзей, з вушэй. Годзе хадзілі, косці тамілі, кроў смакталі, спаць не давалі, есці застужалі. Ідзіце на быстрыя цёмныя лозы, на быстрые воды, гдзе

людзі не ходзят, гдзе пеўня голас не заходзіт, там у мяне тры сястрыцы-зарніцы не ўмеюць ні прасці, ні шыці, да ўмеюць урокі шаптаці.

*Паўтараць тры разы.*

**Ад эпілепсіі**

Ідалава жонка, вот табе яда: і хлеб, і вада. А рабу Божаму (імя) добрага здаровейка.

*Паўтараць тры разы.*

**Пры выхадзе з хаты**

Выхаджу я за вароты, Маці Прачыстая наперадзе рызаю закрывае, ад усіх урагоў мяне спасае. А я раба Божая (імя) іду, сонцам асвячуся, месяцам абгаражуся. Іду раба Божая (імя), нічога не баюся.

*** * ***

На моры, на акіяне е бел-гаруч камень Алатыр, нікім не вядомы. Под тым каменем скрыта сіла магуча, і сіле няма канцу.

Выпускаю я сілу магучу на (імя) красну дзеўчыну, саджу я сілу магучу ўва ўсе суставы, паўсуставы, ва ўсе косці і паўкосці, ва ўсе жылы і паўжылы, у яе вочы ясны, у яе шчокі румяны, у яе белу грудзь, у яе сэрца, у ўтробу, у яе рукі і ногі. Будзь ты, сіла магуча, у (імя) краснай дзеўчыне несходна, жгі ты, сіла магуча, яе кроў, яе сэрца на любоў к (імя хлопца) палюбоўнаму хлопцу. Каб та дзеўчына не змогла адгаварыцца ні загаворам, ні прыгаворам, не змог ні стар, ні млад адгаварыць яе сваім слоўцам. Слоўца маё, як бел-гаруч камень Алатыр, крэпко. Хто з мора ўсю вадзіцу вып'е, таму і мой загавор не адолець.

*** * ***

Во імя Айца і Сына і Святога Духа, амінь! Першым разочкам, лепшым часочкам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Матке пакланюся аб помачы шаптаць.

Уганяю кароўку на пашу. Сонца ўзыходзіць – кароўка на пашы ходзіць, сонца заходзіць – кароўка дамоў прыходзіць. Ганю я кароўку святым (дзень нядзелі, калі ўганяюць у чараду). Ідзі, кароўка, у чародку, бо я пастушок без бародкі і я не пажэну чарады. Пятро і Паўло дапамагаў і маю кароўку ў чародку ўганяў. Спераду прыпыняў, а ззаду падганяў, па баках паварачваў. Пятро і Паўло маю кароўку дамоў прыганяў, у пасцель спаць пакладаваў, на ўвесь год, на ўсе лета хазяіну спакою даваў. Амінь!

*Другім разочкам… паўтараць 3 або каля 9 разоў.*

***Запісана ў в. Грычынавічы***
***ад Глушань Яўгеніі Аляксандраўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Рыдзецкай Ю.***

**Ад жаху**

Першым разком, Божым часком, Прачыста Божа Маці, памажыце (імя) жахі ўгавараці. Жахі, жахі, вялікія страхі, начныя і поўдныя. Па касцях не хадзіце, касцей не ламіце. Тады будзеце косці ламаць, як з таго свету будуць людзі ісці наперад пятамі.

* * *

Першым разком, Божым часком, Прачыста Божа Маці, памажыце (імя) іспуг угавараці. Выкачыю іспуг ранняю, вячэрняю зарою. Выкачыю іспуг урочны, спадзіўны, авечы, чалавечы, жаночы, мужчынскі з буйнай галавы, з русых валос, з румянага ліца, з чорных броў, з сэрца і з балюч, з калюч, з касцей, з нагцей, з лакцей, з усіх суставаў і з жыл, і з-пад жыл. Выхадзі, касцей не ламі!

* * *

Першым разком, Божым часком, Прачыста Божа Маці, памажыце (імя) рожу ўгавараці. Выгаварваю ад рожы, ад ветраное, ад вадзяное, ад касцяное. Выгаварваю рожу чырвоную, малінавую, бардовую, рабінавую, жоўтую, белую, зялёную, сінюю, касцяную, вадзяную, ветраную, спадзіўную. Выгаварваю з усіх часцей, з усіх касцей, з буйной галавы, з русых валос, з чыстага серца.

* * *

Першым разком, Божым часком, Прачыста Божа Маці, памажыце (імя) скулу ўгавараці. Выгаварую ад скулы-скуліцы, ад краснай дзявіцы. Выгаварую тут тваё негадаванне, некрасаванне. Выхадзі з буйнай галавы, з русых валос. Касцей не ламі, з буйной галавы выхадзі. Тут табе не красаванне, не гадаванне. Тваё красаванне і гадаванне на сінім моры, на чыстым полі, на сухіх лясах. На сінім моры сталы пастаўлены, скацерцямі засцелены, шэлковымі каўрамі і разнымі напіткамі ўстаўлены. Скулу-скуліцы вызывалі напіткі піць, касцей не ламаць, сэрца не таміць, не пудзіць, не сушыць.

* * *

Першым разком, Божым часком, Прачыста Божа Маці, памажыце (імя) удар выгаварацi.

Удар, удар, Божы гаспадар, па гары каціўся, у даліну спусціўся, у пярыну ўпаў і не забіўся.

***Запісана ў в. Ёвічы***
***ад Стражэвіч Варвары Андрэеўны, 1920 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Цімашэвічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Глушань А.***

* * *

*Калі прамаўляюць гэту замову, маюць на ўвазе того, хто зусім нядаўна памёр. Той, хто прамаўляе, павінен быў ведаць гэтага чалавека*:

– Месяц-маладзічэ, ты ходзіш па небу, бачыш таго, хто памёр, ці не баляць у мертвеца зубы?
– Не.
– Хай не баляць і ў мяне.

* * *

Залатніча – Божы чалавеча, стань на сваім месцы, там табе будзе і піценне, і ядзенне. Я цябе не ўмаўляю і не ўбаўляю, толькі ўмаўляю прыстрэк мужыцкі, парабоцкі, дзённы, начны, паўночны. Не хадзі, боль, не твары, спакою дай.

*Пасля прамаўлення таму, хто прамаўляў – плюнуць убок, а хвораму – здвінуцца з месца.*

* * *

*Замова прамаўляецца тройчы шэптам, гледзячы на параненае месца:*
– Ішоў Ян праз Іардан. Ян, стань! Кроў, перастань!

* * *

Я, раб Божы (імя), хаджу кругом свайво царства, мераю ступнямі аграду і Владычіцу, Маці Бога нашава, Неапалімую Купіну. Прашу, спасі рабов Божых (імёны) ат агня, врага і мяча і ат всякава супастаці. Амінь! Слова маё крепка. Падуй вецер, пацяні шупель і полымя ні на чыі харомы, ні на скаціну дваровую, а на палёвую быліну. Слова маё крепка. Амінь!

* * *

Госпаду Богу памалюся, Ісусу Храсту пакланюся, Прачыстай Святой Мацеры Божай пакаруся. Прачыстая Свята Маці Божая, прыдзі, памажы раждзёнаму-крашчонаму (імя) іспуг шаптаці:

– Лякі, лякі раз,
Лякі, лякі два,
Лякі, лякі тры,
Лякі, лякі чатыры,
Лякі, лякі пяць,
Лякі, лякі шэсць,
Лякі, лякі сем,
Лякі, лякі восем,
Лякі, лякі дзевяць.

*Пасля прамаўлення плюнуць адзін раз.*

* * *

Шлі папы праз двары, рожу ламалі, (імя) памагалі.

* * *

Вы, вужы, вы, гадзюкі, вы кусаеце, яд не высасаеце. Папрашу я Госпада Бога, нашле на вас архангела Гаўрыіла, будзе ён вас гарапнікам біці, на агне смаліці.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Бандзюк Вольгі Мікалаеўны, 1929 г.н.***

* * *

– Маладзік малады,
У цябе рог залаты,
Ты высока ходзіш,
Ты далёка бачыш.
Буў на тым свеце?
– Буў.
– Бачыў майго (называецца імя сваяка-нябожчыка)?
Як ён памёр і ў яго (зноў называецца імя нябожчыка) ўсё занямела?
Няхай і ў мяне зуб занямее
І ва век не балее. Амінь!
*Чытаць тры разы.*

* * *

*Ад ліпавага палена адламаць дзве шчэпкі і покласці пад матрац хрэст-на-хрэст. Калі чалавек устане і пойдзе, трэба сказаць замову:*

– Вось я ўкладваю па Божай міласці дзве лучыны жыватворныя. Свеце ціхій і ты, Матухна Святая Багародзіца, дапамажыце мне ў жаночай справе. Дапамажыце вярнуць мужа майго. Я сымаю жыватворныя лучыны і ўкладваю на вуголлі пенныя. Як яны гарацькарацкаанць, распаляюцца, як адным полымем займаюцца, так і мне, і чалавеку майму гарэць разам, распаляцца.

На ночы, на утренней заре і на вечере, на перекрой месяца праходзьце мае словы ва ўсе шчэлі зямныя, ва ўсе омуты глухія. Вярніце сляды майго чалавека на сваё месца, у сваю хату, Божай міласцю паложанае.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Быхан Агаф'і Міхайлаўны, 1900 г.н.,***
***студэнткай Гулюта Л.***

* * *

Я запалю свечку ў начной цемры, пакланюся ёй тройчы аддана і скажу словы замоўныя: "Ой, вы, духі вялікія, светлыя, зло-бяду ад кахання адводзячы, вы пачуйце мяне, вас молячую, не тушыце свечку, мной запаленую. Я паліла яе з чыстай душою, не чужога мужа прыманьвала, не чужога жаніха прыхаджвала. Запаліла дзеля мужа (жаніха) каханага, мне самім лёсам суджанага. І малю я вас, духі светлыя, надзяліце агонь вашай сілаю, сілай добрай, усепранікальнай, ад пагібелі каханне абараняючай. Запаліце агонь у сэрцы любага, асвятліце ў ім усе злучыны, пасвяціце да самага донейка. Чую, там ляжыць ільдзіна стылая – рэўнасць лютая злой разлучніцы. Растапіце тую льдзінку калючую, ёй слязой вярніце гаручаю. І

яшчэ вас малю, духі добрыя, распаліце агонь у крыві любага, каб у каханні ён быў пяшчотна-палкім і, як глыток вады ў спякотны дзень, пацалунак мой яму быў бы слодыччу. І ў трэці раз вас малю, духі светлыя, абараніце каханне маё чыстае, захавайце мне мужа (жаніха) любага з сэрцам верным, ні з кім не падзельным".

*Замову вымаўляць увечары ў пакоі, куды ніхто ў гэты час не зойдзе. Запаліце свецку і, гледзячы на яе полымя, гаварыце замову.*

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Воўк Веранікі Паўлаўны, 1967 г.н.,***
***студэнткай Ляўковіч І.***

## Ад суму

Вода-водзіца, історчніца, ходзіла по морям, по горам, по пескам, по белым корешкам. Пескі размываліся, у рабы Божай (імя) тоску і болезні прогоняла. Амінь, Амінь, Амінь.

* * *

*Чытаюць на ваду днём у 12 гадзін перад агнём (печкай, свячой) 3 разы, пасля кожнага раза сплёўваць церах левае плячо. Перад сном памыць гэтай вадой твар і грудзь, дзе баліць душа, піць па 3 глаткі 3 дні. Гэта паўтараць праз 3 дні:*

– Матушка, быстрая вода, абмываеш ты круты берега, бел-горюч камень, жолты пескі і корні своей быстрой золотой струёй. Обмой-ка ты з рабы Бож'ей (імя) тоску тоскучую, горе горючее, скорбі і болезні, думу непобедзімую і боль неўмолімую, злу-худобу, смой, сполошчі с рабы Бож'ей (імя), с буйной головы, с белого ліца, понесі іх, матушка, быстра река, своей быстрой золотой струёй за сінее море, за топучіе грязі, за зыбучіе болота, за осіновы лес, за осіновы тын, смой, сполошчі с рецівого сердца тоску с рабы Бож'ей (імя). Амінь, Амінь, Амінь.

* * *

*Чытаць на маладзік, пасля кожнага раза сплёўваць чэраз левае плячо:*

– Месяц, месяц, молодой, у цебя рог золотой, в море ты купался і не іспугался. – Адам і Ева – первые жыцелі на Зямле. У вас што болело? – Нет. – Ну, у меня, раба Бож'его (імя), штоб тожэ нічего не болело.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Гулюты Тацяны Рыгораўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

## Ад ікоты

Ікота, ікота, перайдзі на Федота, з Федота на Якава, з Якава на ўсякага.

* * *

Святы Юрый і Ягорый, пасі маю кароўку дзень пад сонцам, ноч пад месяцам, пад яснымі зорамі, пад Господнімі словамі. Сам Гасподзь знае, як кароўку папасае і да гаспадыні ў хлеў прыганяе.

* * *

Егорый ты наш храбрый, спасі нашу скаціну ў полі і за полем, у лесі і за лесам, пад светлым і пад месяцам, пад красным сонейкам ад ваўка драпежнага, ад мядзведзя лютага, ад звера лукавага. Амінь.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Ляккоевай Ніны Васільеўны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Венгер К.***

**Ад ворагаў**

Чэраз парог перэступаю, гадзюкою выползаю, всем врагам рот затыкаю. Я не іду, а еду чорным волам, штобы ў всех маіх врагов язык стал колом. Амінь!

*Чытаць тры разы. Сплюнуць тры разы праз левае плячо.*

* * *

*Спачатку прачытаць "Отчэ наш":*

– Шла баба камэнна з камэнною дытыною, з камэнною палыцею чэрэз камэнны мост. Баба ўпала і кроў у (імя) пэрэстала.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Савіч Аляксандры Андрэеўны, 1923 г.н.,***
***студэнтам Шаўчэнка В.***

* * *

Ехаў сам Ісус Хрыстос на белым кані чэрэз жэлезны мост. Маснічка ззыбнулась, у каня ножка звіхнулась. Стаў Ісус Хрыстос плакаць і рыдаць. Ідзе яму навстрэчу Прачыстая Маць. – Сынку мой, сынку, што ты плачэш і рыдаеш? – Как жэ мне не плакаць, не рыдаць. Ехаў чэрэз жэлезны мост, маснічка ззыбнулась, у каня ножка звіхнулась. – Сынку мой, сынку, не плач, не рыдай, кроў з кроўю сальецца, жыла з жылай сайдзецца, косць з косцю зрасцецца, рабу Божэму (імя) звіх мінецца.

* * *

*Замова на скаціну, каб не прапала малако, гаворыцца на Юр'ев дзень, калі выганяюць кароў на пашу:*

– Выганяю скаціну на Юр'еву расіну. Бяру залатыя ключы і кідаю ключы ў сіне морэ. Як цябе, ведзьма вядзьмоўская, з мора ваду не выпіваць, ключэй не даставаць, так і ў маей скаціны малако не атымаць.

* * *

*Замова на скаціну, каб не прапала малако, гаворыцца на Юр'еў дзень, калі выганяюць кароў на пашу:*

– Выганяю скаціну на Юр’еву расіну. Бяру залатыя ключы і кідаю ключы ў сіне морэ. Як цябе, ведзьма вядзьмоўская, з мора ваду не выпіваць, ключэй не даставаць, так і ў маей скаціны малако не атымаць.

* * *

Выганяю скаціну на Юр’еву расіну. Бяру залатыя ключы і кідаю ключы ў сіне морэ. Як цябе, ведзьма вядзьмоўская, з мора ваду не выпіваць, ключэй не даставаць, так і ў маёй скаціны малако не атымаць.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Краўцовай В.***

* * *

Чатыры сястрыцы, Захар ды Макар, сястра Мар’я ды Дар’я, ды сястра Вульяна самі гаварылі, што ў раба Божага (імя) шчокі не пухлі, зубы не балелі век па веку, ад ныне да веку. Тым маім славам ключ ды замок. Ключ – у воду, а замок – у гору.

*Нагаварыць тры разы на воду і выпіць яе.*

* * *

Ехаў Даніла на сваёй кабыле. Кабыла прыстала, і ў рабы Божага (імя) нага балець перастала.

* * *

Ішла Прачыстая Матка Хрыстова гарою, несла ваду дугою. Дуга, разагніся, вада, разалліся. Дуга разагнулася, вада разлілася, а ў раба Божага (імя) кроў сунялася, печанай запяклася.

* * *

Із-пад яснае зары, із-пад белае гары цякло тры ракі: рака малочная, вадзяная і крывяная. Я малочную разап’ю, вадзяную разаллю, а крывяную астанаўлю.

* * *

Прэсвятая Маць Багародзіца на залатую праліцу прала, нітку атарвала, кроў завязала.

* * *

Два браты камень сякуць, дзве сястры ў акно глядзяць, дзве свякрухі ў варотах стаяць. Ты, свёкар, вярніся, а ты, кроў, утаміся. Ты, сястра, адвярніся, а ты, кроў, уйміся. Ты, брат, змірыся, а ты, кроў, замрыся. Брат бяжыць, сястра крычыць, свёкар бурчыць. А будзь, маё слова, моцным на ўціханне крыві ў раба (імя) па гэты час, па гэтую хвіліну.

* * *

Устань, каса, на камень – кроў не кане, устань на тапор – увесь загавор.

*Тры разы чытаць над пацёкам крыві, тры разы дунуць.*

* * *

Лішаю, лішаю, я цябе рашаю. Я цябе рашаю, як свінням мяшаю.

* * *

Звіх, звіх, не будзь ліх, перастань, на вецер стань.

Звіх, звіх, не будзь ліх, каб кожны сустаў на месца стаў. Сук, усыхай, а ў рабы Божай (імя), звіх, прападай.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Людзяневічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

* * *

Я прыступаю (імя, напрыклад, Мар'янінай Лідзе) залатнік угавараю. Залатнічку, Божы памачнічку, сядзь на свае мясцечко, на залатэ крэслечко, там табе будзе піценьейко, едзеньейко, столікі накрываны, кружачкі наліваны.

*Гаварыць 9 раз.*

**Ад зносу**

Знос – не на нос, у мяне від ззаду: сакаловымі вочкамі глянуса, задком атаб'юса і ніякого зносу не баюся.

* * *

Первым разком, Гасподнім часком, Госпадзі, прыступі, памажы. Ішоў Рыгор паміж гор, встрэчае Варвара:

– Куды ідзеш, Рыгор?

– Замаўляць (імя) кроў з (месца, напрыклад, рукі).

– Замаўляй на камень раз, каб не капнула ні раз.

Другім разком, Гасподнім часком…

*Усё тое ж, толькі* "Замаўляй на камень два, каб не капнула ні два".

*Такім чынам, змяняючы толькі першае слова і два словы ў апошнім радку, гавораць 9 разоў.*

* * *

Святы Божа-гасудар, я прыступаю, звіх, ятрасць і ўдар угавараю. Ішла баба за 9 міль, несла пясок на вілках. Пясок упаў, і звіх, ятрасць і ўдар прапаў.

* * *

*Калі хлопец гуляе доўга з дзеўкай, яна далжна ўзяць яго рукою за мізінны палец і сказаць пра сябе:*

– Адам з Евай каранаваўся, сонцам, месяцам падпаразаўся, а я цябе падпаразваю вужам і гадам. Як ты вужа і гада адарвеш, тады ты мяне ад сябе адпіхнеш.

* * *

*Перад тым, як пачаць гаварыць замову, усягда гаварыцца:*

– Госпадзі Божа, памажы, Госпадзі Божа, прыступі, Святая Прачыста, святая нядзелька, святая (дзень, у які загаворваюць, напрыклад, пятніца) Хрыстовая. Я прыступаю, Нінчынай (імя маці той дзяўчыны, якой загаворваюць) Валі (імя самой дзяўчыны) крыксы (назва той хваробы, ад якой загаворваюць) угавараю.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны***
***(раней пражывала ў в. Боркі Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

* * *

Я прыступаю, Ганнінаму Мішы (імя) знос выгавараю. Знос не на нос, у мяне від ззаду. Сакаловымі вочкамі аглянуся (9 раз), задкам адаб’юся і ніякага зносу не баюся.

* * *

Тэкля Марусю радзіла, месяцам нагрsuccadзіла і зоркаю падпаразала, і на суд адпраўляла. Я выйду на Сіянскую гору, зайграю на медную гару, пабяру пякельныя замкі (9 раз), пазамукаю вякельныя рты, штоб вачыма не відалі, а зубамі Марусю не кусалі. Госпадзі Божа, прыступі, Госпадзі Божа, памажы.

**Каб што-небудзь не чаплялася да худобіны**

*Калі карова стаіць на зімоўцы, нада ўзяць замок, замкнуць яго, ключ забраць. Там, дзе стаіць карова, адкрыць дзверы і тут жа ў падваротніцы палажыць замок (на тры дні). Еслі карова ідзе, нада шаптаць:*

– Госпадзі Божа, прыступі, Госпадзі Божа, памажы, Свята Прачыста, свята нядзелька і аўторнік Хрыстовы (той дзень, у які ты выганяеш). Я прыступаю на пасьбішчы, Валіну (імя) кароўку выганяю. Я выйду на Сіянскую гару, зайграю на медную гару, пабяру пякельныя замкі, пазамукаю вякельныя рты, штоб вачыма не відалі, а зубамі Валінае каровы не кусалі. На вужу еду, гадзюку паганяю, а змяю закальзаю. *(9 раз).* Госпадзі Божа, прыступі, Госпадзі Божа, памажы. Памажы ад Госпада Бога і ад мяне Кончынай Валі карове. Амінь.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Боркі Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

* * *

*Каб у лесе не сустрэлася змяя і не ўкусіла, пахрысціць сябе тры разы і прачытаць замову:*

– Ты, змяя ракова, не кусай меня. Табе – пень ды калода, а мне – пуць ды дарога. Амінь, амінь, амінь.

**Ад радзікуліту**

*Чытаць перад дубам ці дубовай палкай па тры разы на ранішняй зорцы і на заходзе сонца:*

– Дубовы стоўб, прабач і адпусці рабу Божую (імя) ад прыткі, ад хіткі. Выйдзі, прытка, выйдзі, хітка, із касцей, із машчэй, із станавых жыл. Ва векі вякоў, амінь, амінь, амінь. Святая вада, сырая зямля, прасці і адпусці рабу Божую (імя) ад прыткі і ад хіткі. Выйдзі, прытка, выйдзі, хітка, із касцей, із машчэй, із станавых жыл у рабы Божай (імя). Ва векі вякоў, амінь, амінь, амінь!

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Юнчыц Любові Андрэеўны, 1964 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Грабаў Петрыкаўскага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

* * *

Маладзік малады, у цябе рог залаты, на моры купаўся, мне паказаўся. Табе – цёмныя ночы, мне – светлыя вочы. Табе – на высату, мне – на красату. Табе – на ўбытак, а мне – на прыбытак. Пытаўся стары ў маладога, ці баляць зубы ў мяртвога? Не баляць у смерці і ў мяне да смерці.

* * *

Першым разам, Госпаднім часам. Ішоў Бог Ісус Хрыстос цераз залаты мост. Масьніца праламілася – у раба Божага (імя) урокі адваліліся.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

* * *

Спаситель небесный, будь впереди. Ангел хранитель, будь позади. Царица небесная, будь над головой. Спасите нас целиной от злых людей и внезапной смерти. Господи, спаси и сохрани. Аминь.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас Лексы Савічны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

* * *

Я, раба Божья (имя), еду на вороном коне, месяц за плечами, солнце меж очами. Бог мне помощник со всеми ангелами и архангелами. Я, раба

Божья (имя), еду на коне до пана. Пан стоит. Кого встречает, тому глаза вынимает, врагами меня закрывает. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь.

* * *

Госпаду Богу памалюся, Мацеры Прачыстай Гасподняй пакланюся. Першым разам, Гасподнім часам. Ішло тры хмаркі: адна – дажджавая, другая – грамавая, а трэцяя – ветраная. Дажджавую дождж размывае, ветравую вецер раздувае, грамавую гром разбівае. Хто на рабу Божую (імя) злабу мае, хай таму на лоб вочы павыпірае.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

* * *

На валку еду, вужом паганяю, злым людзям губы-зубы замыкаю, а добрым адмыкаю. Няхай добрае скача наперад, злое падаецца ўзад. Няхай, хто мяне любіць, адчыніць дзверы. Няхай зачыніць той, хто мне не рад. Даруй мне, Божа, грахі маі ў гэтай справе (якая справа). Дапамагі! Амінь!

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Балоцька Марыі Іванаўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кужалёвай І.***

* * *

Госпадзі Божа, Мацер Бож’я, святыя апосталы. Стаіць у лесе дуб, як сядзе на дуб той птушка, у раба твайго Божага (імя) пачынае балець. Дапамажы, Божа, твайму рабу (імя), каб ў яго ніколі зубы не балелі, не дазваляй птушкам садзіцца на гэты дуб. Дзякую табе, Божа. Амінь!

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Маці Божай таксама памалюся. Са мною Гасподзь Бог, і я нічога не баюся: ні змей, ні вужэй, ні гадзюк, ні цябе, нячысты дух. Ісус Хрыстос са мною, сваім Святым духам адганяе ад (імя) нячыстую сілу.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Бандзюк Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Гуцэрман С.***

* * *

Маладзік-маладзіча, цябе Бог кліча. На ваўку еду, вужам паганяю, гадзюкаю пужаю, сваім ворагам, ведзьмарам сэрца замаўляю.

* * *

Я са словам, Бог з помаччу, не мой дух – Гасподні дух. Не я табе памагаю, а паможа табе сам Гасподзь Бог і Божая Маці. У Тані спуг выганяе,

у залаты сундучок складае, залатым ключыкам замыкае, на дно сіняга мора пускае.

* * *

Памолімся, паклонімся Госпаду Богу, Духу Святому, усім святачкам. Першым разочкам, добрым часочкам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Вымаўляю, выгаварываю рожу на крутыя горы ссылаю. Там табе, рожа, бываць, на крутой гарэ гуляць, а ў Каці не ламаць, белага цела не сушыць.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Пуш Марыі Сяргееўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

* * *

Стану я рана, умыюся бела, памалюся Богу верна. Выйду я ў чыстае поле, гляну на кіян-мора, там ідзе Божая Мацер, Ісус Хрыстос, Сын Божы і Дух Святэй. Яны ішлі і жаўтыя пяскі бралі, і змеіныя раны пасыпалі, і вужыныя жалы, і такому рабу-чалавеку помачы давалі (дунуць). Дух Святэй на пользу.

**Для прыручэння хатняй жывёлы**

Добры вечар, хлеўнічок-панічок! На табе хлеб-соль, дай маей карове спакой.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Фішэр Людмілы Францаўны, 1942 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

**Ад болі ў горле**

Ветла, ветла, возьмі сваю глоць. А еслі ты её не возьмеш, мы яе пракоўтнем з карнямі. Амінь, амінь, амінь.

*Чытаць тры разы.*

* * *

На моры-акеяне ляжыць камень. На тым камені сядзіць дзяўчына, шыць масцярыца. Яны трымае голку булатную, удзявае нітку шаўковую, зашывае раны кровавы раба Божага (імя). Тут тобе не буваць, па касці не хадзіць, касцей не ламіць, галавы не кружыць і раба Божага (імя) не ўмарыць.

* * *

*Перахрысціцца тры разы, прачытаць, тры разы плюнуць у бок:*

– Устань, каса, на камень – кроў не канет. Устань на тапор – увесь загавор.

* * *

*Тры раза перахрысціцца:*

– Святы сягодня чацвер, чэсны дзянёчак мне Каця ўказала, на помач давала. Як у Кацін слядочак не ўстаці, так майго сыночка (імя) звіху не бываці. Хадзіў звіх по полю, по каменню, по бярвенню, по лазе, по дарозе. Я яшчэ там не бываў, дзе калы ўбіваюць, дзе перэвіч перэвівалі, дзе звіху не бываюць. Другім разком, лучшым часком Госпадзі Божа, памажы.

*І так дзевяць раз пераказаць. Падуць, сплюнуць і перэхрысціць дзіцятка і самой перахрысціцца.*

* * *

Іду ў дарозе, у пуці, сам Гаспод Бог уперадзі, Божая Маці ззадзі, ангелы-храніцелі па бакам. Нікому свайго цела і душы не атдам. Госпадзі, памілуй, сахрані. Амінь.

* * *

*Чытаць дзевяць раз раніцай і вечарам:*

– Госпада Бога прашу і на помач прызываю. Любімага (імя) к сабе прызываю. Ранняю і вячэрняю зарою, штоб я ў яго стала вернаю жонкаю. Каб ён ні с кім не піў і не еў, а штоб ка мне с ласкаю на крыллях ляцеў. Я – словам, а Гаспод – сваім духам.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Валянціны Міхайлаўны,***
***студэнткай Клімовіч І.***

* * *

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Прыступі, памажы хрышчонай, ражонай (імя). Залатнік-залатніча, цябе маці кліча. Цябе маці радзіла, на сваё места пасадзіла, шаўковай нітачкай пупок звязала, табе месцейко ўказала і ні схода, ні маладзіком і ні подпоўня і ва векі вяков не адчыняйся. Ідзі на зялёные луга, на сінія маря. На сінем море стаялі прыстолы. Кубачкі наліваныя і столікі засціланыя. Там сядзелі тры бабкі, яны нічога не робяць, толькі гуляк, дзяцінец, пераходы, падумныя і пагаданыя гаворац. Вы, дзявіцы, расхадзіцеся, разнясіця. Як ясен месяц сышоў, на сваё места ідзі. Любіш мяне, любі і дух мой.

*Дуць. Дзевяць разоў загаварываць.*

**Ад перапалоху**

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Прыступі, памажы хрышчонай, ражонай (імя). Пераход, пераход, шумісты чалавек.

Годзі табе хадзіць, жоўтай косці маліць. В чыстом полі стаіт дуб рагаваты, пад тым дубам сядзіт дзед кавтопаты. А дзедушка-лябёдушка, давай посватаемся, побратаемся. У цябе сын, штоб он не спал, не гулял, целам не прыбывал, а мая дочка спала, гуляла, і целам прыбывала. У чыстым полі, сярод мора, стаіт дуб на сем воротов, на сем покотов. Пятро, Павел, Ілля суд судзілі ля того дуба. Сядзелі, хрышчонай, ражонай (імя) іспуг лячылі. Аднаму штаны, а другому мак, а (імя) іспуг разайдзёцца так.

* * *

Залатой птах, залатая дзюба (*3 раза*). На мосту стаіт, всё гора разгребает, на крутые горы, на нішчые лозы пасылает. Гдзе волкі не лятаюць, гдзе сабакі не брэшуць, петухі не поют, гдзе людзі не ходзят, на сінее мора пасылают. На сінем море стаіт прістол. Сам Ісус Хрыстос кнігі чытае і (імя) хрышчонай, ражанай усю боль рассылае. Любіш мяне, любі і дух мой.

* * *

Божа Мацер прыхадзіла, в руках тры розгі прынасіла: огненную, ветравую, вадзяную. Огненную – на агне спаліла, ветраную – на вецер пусціла, вадзяную – в сіне морэ пусціла, хрышчонай, ражонай (імя) усю боль удаліла.

* * *

Гдзе сонейка всходзіт, там (імя) ходзіт. Цветы расцвятают, хрышчонай, ражонай (імя) усе балезні рассылают.

*Чытаць суботнім вечарам на покуці. Загавор чытаць 9 разоў і пасля каждага раза дуць. Пры сабе імець нацельны хрэсцік і бальному і загаворшчыку. І бальны должан дзяржаць хрэсцік у руках, кагда загаварывают.*

**Вогнік**

Госпаду Богу помолюся. Прочістой Мацеры поклонюся. Огнішчэ, огнішчэ, вазьмі маё струмішча. Любіш мяне, любі і дух мой (3 разы).

*Каласкі ці спічкі узяць, ад іх угалёк, па 3 каласка і павадзіць вакруг вогніка 3 раза.*

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Шаўчук Кацярыны Сялееўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Шаўчук Т.***

* * *

Першым разком, лепшым часком. Ясень-ясеніца, коранем не караніся, лістом не шумі, галья не ламі пры этому звіху. Касцей не ламі, крыві не замірай, жыл не зацягай, шоб не ўспаміналасо ні ў маладзіку, ні пад поўнэ, ні пры месяцу перахода.

*Гаварыць 9 разоў.*

* * *

Госпаду Богу памалюса, Святой Прачыстай пакланюса. Зоркі-зарніцы, Божыя памошніцы, прыступіце, ад удара замовіць дапамажыце. Удар-удар, уйдзі з косці малой і з большой, суставаў і ад ліца. Тут удару не бываць, белой косці не ламаць, краснай крыві не сушыць, сіняй жылы не пароць, ад болі вызваліць, здароўем раба Божага (імя) надзяліць. Амінь.

*Гаварыць тры раза.*

*Запісана ў в. Пагост*
*ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,*
*студэнткай Толкач М.*

* * *

Гадзіна вадзяная і зямная, слепні і вужы, змеі і вужакі, аддайце свае жаласці і ярасці (імя), то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннямі. Сонца і яркі месяц не будуць вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра маці-зямля.

* * *

Першым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Матачцы пакланюся.

Прачыста Божа Матачка, прыступі, да мой дух палюбі, нячыстую сілу з (імя) выганяць.

Выганяю з раба Божага (імя) бясоў, д'яблаў, нячыстых духаў і сама злейшых духаў.

Выганяю з цёмнага воласу, з яркіх вачэй, з сэрца, з зубоў, з целесу, со рта, з носа, з віскоў, з мазгоў, з шыі, з плеч, з хрыбетнай касці, з робер, з сярэдзіны, з рук, з ног, з суставаў, з нутры, з утробы, з жыл, з крыві, з дыхання, з узгляду.

І ссылаю вас, бясы-д'яблы, на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на паганыя воды, дзе Садом і Гамора стрэблены.

Заклінаю я вас усемагушчым Богам з вышніх аблакоў, чатырма евангелістамі: Іванам і Маркам, Лукой і Матфеем.

Адступіцеся, злые духі, ад раба Божага (імя). Амінь!

* * *

Першым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Матачцы пакланюся.

Прачыста Божа Маці, прыступі да мой дух палюбі (імя) вулякі ўгавараці: і мужчынскія, і жаночыя, і хлапечыя, і дзявочыя, і скаціныя, і лашадзіныя, і вадзяныя, і ветраныя.

Вулякі на ніцыя лозы ссылаю, дзе сонца не грэе, дзе вецер не вее, дзе пташкі не лятаюць, дзе людзі не ступаюць. Там ім укусціцца, там ім укараніцца і ад (імя) адступіцца.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Макарэвіч Вольгі Прохараўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Цімашэня В.*

* * *

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Галі помач давала, віхра шаптала. Віхор спускался з высокага неба залатымі крэстамі, святымі апосталамі. – Госпадзе, куды ідзёш? – Галі раду даваці, віхра шаптаці. Ідзі, віхор, на сухія

лозы, на быстрыя воды, на зялёныя травы, на жоўтыя пяскі. Дзе месяц не свеціць, дзе сонца не грэе, там той пагуляць, царыцу павідаць, вадзіцу папіваць, рабу Бож'ю (імя) забываць. (*9 раз)*

* * *

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Галі ад залатніка шаптала. Залатнічку, залатнічку, Божы чалавечку, по касцях не хадзі, касцей не ламі. Сядзь на месце, на залатом крэсле, сядзь на дарозе, на залатым возе. Тут тобе піценне, тут тобе ядзенне. Пуп вязала, пупу показала, туто место показала.

* * *

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Галі помач давала, пуд шаптала. Ехаў Бог на сівым кане чэрез высокі мост. Конь спатыкнуўся, Галі пуд адвярнуўся.

*9 раз.*

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрыеўскай Галіны Яфімаўны, 1922 г.н.***

* * *

Путаў стары ў молодого, ці боляць зубы ў нежывого, як у нежывого забаліць, то няхай у (імя) толькі зашчыміць.

* * *

На морэ шчука, а ў лесе мядзведзь із одной чашы пілі і елі, штобы ў (імя) зубы не балелі.

* * *

Божая Маці на прыстоле стояла. З прыстола злязала, (імя) яды загаварала: ці ты паровы, ці ты половы, ці ты вадзяны. Вужэ, вужэ, я вас позбіраю, вашы яды пазабіраю, у бочку паскладаю. Сколькі ўкусу, столькі моцы.

### Ад віхра

Госпаду Богу помалюса, Ісусу Хрысту покланюса. Хрыстос, прашу цябе, малю цябе. З нябёсаў злязаў, усімі святымі (імя) віхра выйшаў: із рук, із ног, із галавы, із жывата. Віхор, віхор, ідзі ў цёмныя лозы, з лоз – на жоўты пясок, з пяску ідзі ў крыніцы. У крыніцы расце шаўкова трава, травіцу паядай, Божу (імя) забывай.

Госпадзі, Божая Маці, Ісус Хрыстос, ангелы-апостолы, золотымі крастамі прыступіце (імя), нячыстых адганіце.

### Замова ў дарогу

Іду я, Господзі, у пуці, сам Господзь і Божа Маці ўперадзі, а я за вамі ззадзі. Господзі, прыдзі, на мяне пячаць палажы, а вам, урагі, замаўчаць, замаўчаць, замаўчаць.

**Замова на нервы**

З касцей, з машчэй, з румяного цела іду я зялёным лугом, шчодрым бором, крутым беражком, там стаіць ізбушка, там Мацер Божья кніжку чытае і от (імя) нервы отымае, на чыстую воду кідае. Амінь.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

* * *

Золотнічэ, золотнічэ, Божы чалавечэ. Годзі табе ходзіці, косці ломіці. Стань сабе на месці, на залатом крэслі, шапочкою потпірайса, айца і мацер путайса. Ойцец сотворыў, а маці родзіла.

* * *

Первым разочком, первым часочком, лепшаю порою, наперад Господу Богу памалюса, Прачыстай Маці пакланюса. Буду я болячку шаптаці (імя). Болячка колюшча, болячка болюшча, болячка прыстрэшніца, болячка рожа. Годзі табе ходзіці, косці ломіці, по косцях не ходзі, косцей не ламі.

**Ад спуду**

Господзі, прэступі, поможы, Прачыстая Божа Маці, ляку шаптаці. Адзін цвет, адзін свет, адна зямля, адна вада і адзін хлеб, адзін бацько, адна маці, ляко, чаго табе баяцца.

*Шаптаць з нажом.*

**Ад урокаў**

Господзі, прыступі, памажы, Прачыстая Маці, (імя) ўрокі шаптаці. Первым разом, лепшым часом урокі-урочышча, парабоцкі, дзявоцкі, мужчынскі, жаноцкі. Сарокі-белабокі, ляціце на сухіе лозы, на буйстрые воды, покрапецеса і помачэцеса.

***Запісана у в. Рычоў***
***ад Кавалевіч Кацярыны Васільеўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

* * *

Господу Богу памалюся, Прычыстай Святой Бож’яй Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі, да памажы рабу Бож’яму (імя) ад гадзіны-духавіцы шаптаці. Цябе, отчы Мікола, Божы ўгоднічак, прыступіце, поможыце ад гадзіны-духавіцы шаптаці. Гадзіна-духавіца, не аддай раба Божаму (імя). Бяру бочку ў сажу, жалезным абручом абаб’ю,

сколькі ў гадзіны-духавіцы моцы, столько ў яе ўкушу. Дай, Божэ, помач ад Госпада Бога і ад мяне. *(9 раз)*

*** * ***

Красная дзявіца, на ўвесь свет чараўніца. Господу Богу помолюся, Прачыстай Бож'яй Маці поклонюся. Прачыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі рабе Бож'яй (імя) ад залатнічку шаптаці. Залатнічку, залатнічку, Божы чалавечку, сядзь на месцы, на залатым крэслі. Там тобе піценне, там тобе ядзенне. Па касцях не хадзі, касцей не ламі, пад грудніцу не падпірай, на плячыцу не налягай, на спіну не ападай. Дай, Госпадзі, помошч ад Господа Бога і ад мяне.

*** * ***

Чаго, знос, на маё дзіця нападаеш, ці ты яго не знаеш. Ці не адзін свет, ці не адзін цвет, ці не адна вада, ці не адна зямля, ці не адныя людзі, ці не адныя дзеці. Адзін свет, адзін цвет, адна вада, адна зямля, адныя людзі, адныя дзеці. Дай, Госпадзі, помашч ад Господа Бога і ад мяне.

*** * ***

Господу Богу памалюся, Прачыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Бож'я Маці, прыдзі да прыступі, да памажы рабе Бож'яй Таццяне ўрокі шаптаці. Не дзесяць, не дзевяць, не восем, не сем, не шэсць, не пяць, не чатыры, не тры, не два, не адзін. Адныя ўпалі, у Тані ўрокі прапалі. Дай, Господзі, помочі ад Господа Бога і ад мяне.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Мажака Наталлі Ільінічны, 1929 г.н.***

### Ад вераб'ёў

Вераб'е, браткі мае, не сядзіце, ляціце ў цёмныя ляса, дзе высокія горы, дзе глыбокая рака. Там вас ажыдаюць, сталы пазасціланы, кубы паналіваны. Станеце, вераб'е, есці, астаньцеся там на месце. Дай, Божэ, помашч от мяне і от Бога.

### Ад завою

Господу Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі рабе Бож'яй Валі завой шаптаці. Ехаў завой на дзесяці конях. З дзесяці на дзевяці, з дзевяці на васьмі, з васьмі на сямі, з сямі на шасці, з шасці на пяці, з пяці на чатырох, з чатырох на трох, з трох на двох, з двох на адном. Конь упаў, завой прапаў. Дай, Госпадзі, помашч ад Госпада Бога і ад мяне.

*** * ***

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі, да памажы рабе Бож'яй Каці завой шаптаці. Завой, завой, ехаў стары сабака на дзевецярых конях. З

дзевецярых на васьмярых, з васьмярых на семярых, з семярых на шасцярых, з шасцярых на пецярых, з пецярых на чацвярых, з чацвярых на траіх, з траіх на дваіх, з дваіх на адном. Дзе той адзін упаў, там завой прапаў. Дай, Госпадзі, помашч ад Госпада Бога і ад мяне.

* * *

Господу Богу памалюся, Прычыстай Божай Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі, да памажы рабе Божай Валі кроў замаўляці. Ішла Божая Маці, несла тры печаці: одну – медзяну, другу – вадзяну, трэццю – крывяну. Медзяную – вулью, вадзяную – вупью, крывьяну – замоўлю. Дай, Госпадзі, помашч ад Госпада Бога і ад мяне.

**Ад прыстрэку**

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыступі да памажы рабе Бож'яй (імя) прыстрэку шаптаці: мужыцкага, журавіцкага, жаноцкага, дзявоцкага, парабоцкага, водзяногa, ветраногa. Дай, Госпадзі, помашч ад Госпада Бога і ад мяне.

* * *

Господу Богу памалюся, Прычыстай Божай Маці пакланюся. Прычыстая Божая Маці, прыдзі да прыступі, да памажы Ганне звіх шаптаці. Шлі трыдзевяць Кацярын Ганне звіх шаптаці. На Сіянскай гары Божая Маці ляжала. Як уставала, то ікона засіяла. Колькі ў гаду празнічкаў, столькі ў Божай Маці памошнічкаў. Божая Маці просіць: "Памошнічкі, подыдзеце, поможэце Ганне звіх шаптаці". Ішлі трыдзевяць Кацярын: адна – звіх шаптала, другая – ятрасць откідала, трэцяя – от пузырэй говоріла. Дай, Госпадзі, помашч ад Госпада Бога і ад мяне.

* * *

Ехаў Гасподзь дарогаю, ехаў, пераехаў, на Сіянскую гору заехаў. Ты, месяцу Васілёчку, ты по небу ходзіш, з Госпадам говорыш. На небе ёсць тры зарніцы, тры сястрыцы, тры чараўніцы. Адная – прысуша, другая – прынуда, трэцяя – прыгавора. Прысуша, прысушы, прывара, прывары, да рабы Бож'яй Галі Васіля прышлі. Госпадзі, дай помашч ад Госпада Бога, а такжэ ад мяне.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.,*
*Рыдзецкай Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.,*
*студэнткай Рыдзецкай Г.*

* * *

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Тані ад залатніка шаптала. Залатніча, не хадзі, касцей не ламі, жоўтыя касці, сінія жылы, красныя крыві, мускул не зрушай, мускул не разлівай. Залатніча, залатніча, добры чалавеча, сядзь на

прыпечку, на том месцечку. Другім разочкам, лепшым часочкам, паскарэйшы, памачнейшы…

* * *

Господу Богу помолюся, Прычыстай Маці поклонюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Тані звіх шаптала. Звіху, не хадзі, касцей не ламі, жоўтыя касці, сінія жылы, красныя крыві, мускул не зрушай, мускул не разлівай. Другім разочкам, лепшым часочкам, паскарэйшы, памачнейшы…

*6 раз.*

* * *

Напярэд Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Бож'яй Маці пакланюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, Тані ўрокі шаптала: мужчынскія, жаночыя, хлапочыя, дзявочыя, ветраныя, вадзяныя. Другім разочкам, лепшым часочкам, паскарэйшы, памачнейшы…

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Елізаветы Рыгораўны, 1925 г.н.***

* * *

Господу Богу помолюся, Прычыстай Маці поклонюся. Прычыстая Маці з прыстола ўставала, ад вдару шаптала. Ты, вдару, не хадзі, касцей не ламі, чырвоныя крыві, жоўтыя касці, сінія жылы. Дай, Госпадзі, помошч ад Госпада Бога і ад мяне.

*2-3 раза.*

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Елізаветы Рыгораўны, 1925 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

* * *

*Зажечь паклю, взять нож и, имитируя соскребание, водить им над рожей на ноге и заговаривать три раза три дня подряд:*

– Шёл Бог через свиной лог и нёс три рожи. Одна – сохнет, другая – вянет, третья – с тела сгоняет. Рожа-рожевица, красная девица, не ходи по белым ногам, не ходи по синим жилам, не делай рак на белых ногах, не делай рак по синим жилам. Я – словом, а Бог – с помощью. Аминь!

***Запісана ў в. Сяменча***
***ад Чорнагалоў Тамары Андрэеўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

**Ад болі ў зубах**

Цар на небі, цар на землі і цар рак у моры. Як тым тром царам за сталом не бываць, так у (імя) зубам не балець. Цар ты, Ярмола, ці быў ты за морам, ці бачыў ты мёртвых? Як у мёртвых зубы не баляць, не шчымляць, штоб так у (імя) зубы не балелі, не шчымелі, ні сходам, ні маладзіком. Я са словам, Бог з помашчу.

**Ад болі ў нагах**

На галявым полі, пад галявой грушкай, стаіць залаты кубак, у тым кубку чатыры цары, пятая царыца. Вынімай сваю чэлюсць, не будзеш вынімаць, буду асінавым колам прабіваць і сілай з нагі болі знімаць, на ніцыя лозы адпраўляць.

**Ад дрэннага чалавека**

Згубленага не знаходзь і да мяне не прыходзь, і не наведвайся, і з горэм не знайся.

**Ад гадзюкі, вужакі, сліўня**

Памолімся, паклонімся Госпаду Богу і цару Давыду. У цара Давыда на моры сінім ляжыць сіній камень, на том сіням камні стаіць кравацьь, на той краваці пуховыя падушкі, цвілевыя засцілкі. На тых падушках, на тых засцілках ляжыць Хама-Хаміца, усім змеям царыца. Калі ты, Хама-Хаміца, усім змеям царыца, не вынімаеш з раба Божага сваё жала, буду цябе праклінаць і ў празнікі памінаць. Не ўцалееш ты і ў лесе, не ўцалееш пад карчамі, а ў поле пад межамі, а ў будынках пад угламі... Святы Спас, святы Петра-Павел, памілуйце нас.

**Ад глаз, ад прыдзелу, ад ветру**

Первым разам, добрым часам, Госпаду памолюся. Ранішняя зарніца, Божья памачніца, памагала людзям, памажы і нам. Станьце ў помашч выгаворваць балезню. Можа ты на вецер нашла, можа хто і падшуціў, можа хто і прырабіў. У цябе выгаворваю з буйной галавы, з румянага ліца, карых вачэй, з рыжага мясца, з жоўтых жыл, з пухлога жывата. На моры, на Лукаморы стаіць дуб зелёный, на 12 какатоў, на 12 каранёў. Тудою ішоў сам Гасподзь з залатой трасцінкай, сеў на сваё месцечка, на залатое крылечка:

– Пётр і Павел, чаго вы сядзіце, чаго вы хваробы не берэце (імя) хто паддзелаў, ці на вецер нашла, нясіце на сінія моры, на жоўтыя ляса, на глыбокія балота. Там вас ажыдаюць, сталы засцілаюць, кубкі наліваюць, там вам піць і гуляць і ў (імя) хваробы вымаўляць і вам дрэвы ламаць. Амінь!

**Ад грыжы**

У лесе дрэва сечанае, сучча сечанае. Як таму дрэву не прыставаць і лістам не шумець, лістам не зелянець, так у раба Божага (імя) грыжы не балець. Ідзі, грыжа, у лес, грызі кару і лес. Я са словамі, Бог з помашчу.

**Ад дамавога**

Добрый вечар табе, дзядзюшка, шырокая бародушка, кучаравая галовушка. Калі ты свой дамавой, жыві на гэтым месцы, абходзься ля гэтай скаціны. А калі ты чужы, прысланы, ідзі да яго пагуляй, яго скаціну паганяй, а ў маім двары не бывай.

**Ад залатніка**

Першым разам, Бож'ім часам Госпаду Богу просьбу падам, святога чэснага дзянёчка нядзелькі. Залатнік-залацінец, ты ляці, браток, стань на месцечка на залатым крылечку. Цябе матка радзіла, пупком акружыла, цябе бацька пачынаў, на гэты свет паслаў. Выкаціся гарошынкаю, рассыпся на дробненькі мак, а ты, залатнік, садзіся ў свае крэсла проста на места.

**Ад злога духу**

На сінім моры камень, на тым камні дуб, на тым дубе трыдзевяць какатоў, на тых какатах трыдзевяць гнёздаў, на тых гнёздах трыдзевяць урок: ад жэнскага, ад хлапецкага, ад мужчынскага – русы волас, рыжы волас, белы волас. Святые святочкі, прыходзьце да мяне на помашч, я – з словамі, Бог – з духамі. Як стала, так і перастала.

**Ад крывацёку**

Два браты камень сякуць, дзве сястры ў вокны глядзяць, дзве свякрухі ля варот стаяць. Ты, свёкар, вяртайся, а ты, кроў, уталяйся, ты, сястра, адвярніся, а ты, кроў, запрыся. Брат бяжыць, сястра крычыць, свёкар варчыць. Будзь, мае слова, крэпкае на ўціханне крыві ў раба (імя) па гэты час, па гэту мінуту.

**Ад лесуна**

Хажу па лясам, па кустам, па мхам, па балотам, па гнілецям, па чарнікам, па малінам. Куды ні хажу, ніколі не блужу. Сонцэ па сонцы, луна па луне, пры частых звёздах, пры вячэрніх зорах, хажу, не блужу, а табе, лясной хазяін, пакорна аддалася, ад меня, раба, адшатніся, у бярозу абярніся. Амінь!

**Ад ліхаманкі**

На гарах Афонскіх стаіць дуб макрэцкай, пад тым дубам сядзіць трынадзесяць старцаў з старцам Панфуціем. Ідуць да іх 12 дзявіц проставалосых, простапаясых. І рече старац Панфуцій, з трынадзесяць старцамі: "Хто сіе к нам ідзёт?" І рече яму 12 дзявіц: "Есць мы цара Ірада дочкі, ідзём на весь мір косці знабіць, цела мучаць". І рече старац Панфуцій сваім старцам: "Зламіце па 3 прута, тым станам іх біці па 3 зары ўтрэніх, па 3 зары вячэрніх". Взмалілісь 12 дзеў к трынадзесяць старцам з старцам Панфуціем. І не памагла іх мальба, і пачалі іх старцы біці, глаголя: "Ой вы, 12 дзявіц. Будзьце вы, трасуніцы, вадзяніцы, расслабленыя і жывіце на вадзе студзеніцы, у мір не хадзіце, косці не знабіце, цела не мучце". Побежалі 12 дзявіц к вадзе – студзяніцамі, трасуніцамі, вадзяніцамі, расслабленымі. Загаворваю я раба (імя) ад сухоты-ліхаманкі. Будзьце вы прокляты, 12 дзявіц, ад раба (імя) у цёмныя леса, на дрэвы сухія.

**Ад маланкі**

Сцеражы, Божа, тучу гразавую. Збережы, Божа, ніву трудавую. Дай, Божа, у добры час.

**Ад навальніцы, дажджу**

Туча, туча, ідзі бокам, апыніся над Глубокім. Там каржы пякут і табе дадут. Там цябе паджыдают.

**Ад нарываў на руцэ, опухалі, краснення рукі**

Вадзіца-крыніца, красная дзявіца, бегла з Вастока да мора, будзе табе слава далёка, замывала ты розы-бярозы, змый (імя) ніжэперніцу, прыдуманую, прыгаданую, прысмешную, уродную, дзявоцкую, жаноцкую. Ідзі ты на сваё месцечка, на залатое крылечка, там табе гуляць і размаўляць, і опухалі не бываць, і касцей не ламаць, сэрца не знабіць. Я са словам, Бог з помашчу, прылюбі мой дух.

**Ад п’янкі**

Ты, неба, чуеш, ты, неба, бачыш, што я хачу рабіць над целам раба (імя). Звёзды вы ясныя, сайдзіце ў чашу брачную, а ў гэтай чашы вада з загаворнага студзенца. Месяц ты красны, сайдзі ў маю клець, а ў маёй клеці ні дна, ні пакрышкі. Сонца ты прывальнае, узыйдзі на мой двор, а на маім дварэ ні людзей, ні звярэй. Звёзды, уйміце раба (імя) ад віна, сонейка, усміры раба (імя) ад віна. Слова маё крэпко.

**Ад пажару**

Упрашаю цароў: жаркага, агнявога, вадзяного, ветравога, паланянага, тура, ляснога бацьку і лясную мамку. О, Госпадзі, явісь, на дапамогу рабу Божаму станавісь. Упрошваю я Вас і ўмаляю Вас, цароў і багатыроў. Амінь!

**Ад парэзу**

На моры, на акіяні, на востраве на Буяне ляжыць бел-гаруч камень Алатыр. На тым камні сядзіць красная дзявіца, швяя-масцярыца, дзержыць іголку булатную, удзявае нітку шолкавую, рудажоўтую, зашывае раны крывавыя. Загаворваю я раба (імя) ад парэзу. Булат, проч адстань, а ты, кроў, цекці перастань.

*** * ***

Першым разам, Божым часам Госпаду Богу памалюся і Мацеры Прачыстай пакланюся. Ранняя зараніца, Божая памашчніца, прыступі, памажы (імя) ляк выгаварываць, ляк-перапалохі kaціны, мышыны, авечы, чалавечы, конскі, цыганскі, польскі, валоўскі, брацьеў, сестрын, бацькаў, маткін, радасны, жаласны. Пасылаю я цябе, ляк, на мхі, на балоты, там табе сплываць і ў (імя) ляку не бываць, касцей не ламаць, душы не марыць, сэрца не знабіць, жывата не пушыць. Я са словам, Бог с помашчью.

*3 разы.*

### Ад порчы

Ішла Божья Матушка чэраз мост. Ёй насустрач Мікалай-угоднік, Ілья-прарок, Іоан-багаслоў. – Куды ідзеш, Божья Матушка? – Іду ўмываць нервы, прадуваць вочы і горач выганяць з раба Божага (імя), з яго галавы, з рук, з ног, з жывата, з сэрца, з печэні, з зелені, з лезёнкі, з маткі, з яічнікаў, з мачэвога пузыра, з шыі, з пазваночніка, з сініх жыл, з краснай крові. Спасіцеся з крэстом, спасіцеся над нечыстай сілай пабедзіць. Выходзьце, нячыстыя духі, на ўсе чатыры стараны. Амінь! (*3 разы*). Выйдзі, нячысты дух, з раба Божага (імя) з галавы, з рук, з ног, з жывата, з клетак, з сэрца, з селезёнкі, з жалудка, з печэні, з маткі, з яічнікаў, з пазваночніка, з усяго арганізма. Ідзі, боль, туды, дзе трава не расце, дзе сонца не грэе, дзе вецер не вее, ідзі ў бездну на дно. Амінь. (*3 разы*).

Не я лячу, не я загаворваю, а Божья Матушка. Яна лечыць, умывае, загаворвае, Госпада Бога на дапамогу заве з ангеламі, з архангеламі, з нябеснымі сіламі, з Гасподняй зарою, з вячэрняй звяздою. Міхаіл Архангел ішоў з неба, нёс на галаве жыватворны крэст. Паставіў гэты крэст на каменны мост і агарадзіў жалезнымі штыкамі, запер 33-мя замкамі і ўсё пад адзін ключ. І аддаў гэты ключ Прысвятой Багародзіцы. Ніхто не адкрывае, ніхто раба Божага (імя) не іспорціць. Дзень хажу пад красным солнышкам, ноч пад ясным месячыкам. Чорт-сатана, атайдзі ад раба на тысячу палей, дзе скот не гуляе, дзе людзі не ходзят. А тут – святая дарожэнька на святом духам агарожана. Госпадзі, спасі і зберажы раба Божага (імя). Амінь! (*3 разы*).

### Ад разлучніцы

Ранкам паўстае сонца краснае, а як ноч, то прыйдзёт луна нежная. Сонца краснае – распрэкраснае, луна нежная – безмяцежная. І нікогда оні не встрэчаюцца, удваіх, разам не яўляюцца. Так і сужаны мой хай з (імя) не встрэчаецца, нікогда хай з нею не злюбіцца. Як сказала я, так і збудзецца.

### Ад рожы

Рожа, рожа, ты не прыгожа, ідзі ты на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на ніцыя лозы, на сцюдзёныя росы, на быстрыя воды. Я цябе словам убіваю.

### Ад сглазу

З вуліцы вадзіца, з младзенца ліхавіца. Ад каго ўзялося, таму перадалося. Хто са злобаю калючаю, таму слязою гаручаю. *(Гаворачы замову, умываюць дзіця і зліваюць ваду на падлогу ці на зямлю).*

Па галоўцы светлай, па спінцы прамой, па жывоціку беламу, па ножкам рэзвым яечка катаецца, зглаз да хвор на яго матаецца, збярэцца ўся немач да крупіцы, хто наслаў яе, таму вараціцца, хто заставіў младзенца мучыцца, той ад порчы злым жгутом скруціцца.

*Гаворачы замову, трэба катаць па целу дзіцяці курынае яйка. Потым кінуць яго ў агонь, каб яно згарэла, ці разбіць яйка на скавараду і зажарыць да чарнаты.*

## Адсушка

На моры, на акіяне, на востраве Буяне стаіць столб. На том сталбе стаіць дубовая грабніца, у нёй ляжыць красна дзевіца. Кроў у неё не разгараецца, ножэнькі не паднімаюцца, глазанькі не раскрываюцца, уста не раствараюцца, серцэ не сакрушаецца. Так бы і ў (імя) серцэ не сакрушалася, кроў не разгаралася, сама б не ўбівалася, у таску не ўдавалася. Амінь!

## Ад удару, звіху

Ехаў Хрыстос з нябёс, ехаў на сінем кане, конь спатыкуўся, сустаў астанавіўся. Ішла Божья Маці па сінему мору. На сінем моры лежыць камень. Як таму камню корня не пускаць, выходзь звіх, удар з касцей, з буйной галавы, з гарачай крыві.

## Ад уроку (каровы)

Ішла Прачыстая Матка цераз поле. Ана ішла і крапіву рвала і карові давала, і карову даіла, і за цадзілкі цадзіла. Хто маю кароўку ўракне, той хай свайго гора лізне.

*** * ***

Раннія зараніцы, Божыя памашніцы, прыступіце, памажыце, урокі-прыстрокі выгаварыце: с кошчей, с мошчей, с буйной касці, с гаручэй крыві, с сініх жыл, с карых глаз, с буйной галавы. На моры, на сінім камяні сядзіць сам Гасподзь с Ісусам Хрыстом, з трыма ангаламі. Ані сядзяць, (імя) урокі-прыстрокі выгаворваюць: урошны, прыстрэшны, прысмешны, прыдумны, прыгадны, калючы, балючы.

На моры стаяў дуб, на том дубе 12 какатоў, 12 гнёздаў, у тых гнёздах 12 пташак. Пташкі маі мілыя, любыя, прашу я вас, разнясіце вы ўрокі на быстрыя рэкі, прыгаворы – на вароны, прыдумы – на цёмныя лугі, на крутыя горы, на ніцыя лозы, дзе людзі не ходзяць, сабакі брэшуць, краваці цесовы, пярыны пуховы, сталы засціланы, кубкі наліваны, красные пані п’юць і гуляюць і дрэва ламаюць. У раба Божага (імя) не бываці, касцей не ламаці, душы не мараці і сэрца не знабіці. Я са словам, Бог с помашчью.

## Ад уроку дзіцяці

На сінем моры ў Лукаморы стаіт дуб на 12-ці какатах. На тых какатах – 12 гнёздаў, в тых гнёздах – 12 дзетак. Ёсць дзеткі старшые, есць младшые, ані сідзят і вымаўляюць урокі-прастрокі на тое мора і рассыпцесь на макава зерне. Як тое зерне ніхто не врокне, хто будзе врокаць, кровью глаза залье. Я са словам, Гасподзь с помашчью.

## Ад хвароб жывёлы

Чамярыцы і патніцы, выходзьце з касцей, з машчэй, з бумажнага цела, з рыжае шарсці на мхі, на балоты. Там табе гулянне, буянне. На скаціні рыжай шарсці нету, ні гуляння, ні буяння. Ёсць на свеце 3 цары. Першы – ясен месяц на небі, другі – чорный рак у моры, трэці – серы волк за морам. Як

гэтым царам у кучу не сходзіцца, за дубовыя сталы не садзіцца, чары віна не піць, хлеба-солі не есці, так гэтай болі не балець, не гарэць, у гэтага раба Божага скаціны.

### Ад хлеўніка

Упрашаю хазяіна дамавога, палявога, выгоннага, межавога і самага старэйшага Дзяменція Дзяменціевіча і цябе, Аграсій Аграсіевіч. Прашу я вас, на астаўляйце нас, любіце раба Божага, маіх каней і мілуйце, і прыглядайце, як самі знаеце. Прашу я вас, не астаўляйце нас.

### Ад шалу, бешанства

На моры, на акіяні, на востраве Буяні сядзіць стары сівы дзядок, калінку ламае, сіні агонь прапускае, шал і бешанства выганяе з скаціны, рыжыя шарсціны, з шчырага сэрца, з рацівага жывата, з почнае печані, з двайнога капыта. Паміж крутых гор стаіць там буры вол. Як гэтаму бураму валу век з гэтых гор не выходзіць, каб так шалу-бешанству ў гэтай скаціне не бываць. Амінь!

### Ад ячменю на воку

Каб ячмень сышоў з вока, то калі хто запытае: “Што гэта, ячмень?” або “У цябе ячмень?” – трэба сур’ёзна (без жартаў) адказаць: “Лжэш, прароку, пшаніца на воку!”

### На добрыя роды

Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай Божай Маці пакланюся. Я са словамі – Бог з помашчу рабе Божай (імя) роды адкрываці. Залатые ключыкі, адамкніцеся, царскіе вароты, адчыніцеся, а ты, ангелочак, не ляжы, ножкамі папіхвайся, даверху дабірайся.

### На захаванне кахання

Я святою вадою ўмываюся, золатам выціраюся, а солнышкам адзеваюся, а месячыкам падпярэзваюся, а зоранькамі засцягнуся, я нікога не баюся. Як сонейка і месячык на весь свет свецяць, так штоб і я была на весь свет міла і люба (імя каму). Амінь!

### На захаванне плода

Царскія дзверы адмыкаюцца, мірскія замкі замыкаюцца. Ішла Божа Маці дарогаю, сустракае Ісуса Хрыста: – Куды ідзеш, Божа маці? – Іду ў царкву ключы браці, Еве цела замыкаці, на свет младзенца не пускаці.

### На поспех у судзе

Госпаду Богу памалюсь, Святой Матцы пакланюсь Я са словам, ана з помашч’ю. На вужу еду, гадзюкаю паганяю, суддзям мовы замаўляю. І ляцеў сокал, і сеў на стол. Он зашчэбетаў і суддзям мовы замаўляў, а (імя) ад суда вызваляў.

## На шчаслівую дарогу і шчаслівае вяртанне

Ой, як сокал з гнязда вылятае, дарога далёкая яго ажыдае. Паляціць ён над водамі цякучымі, паляціць над лясамі дрымучымі, паляціць над вострымі кручамі. Хай у дарозе яго мой обераг зашчышчае, штоб горкай вады не пітца, штоб у чужым лесе не заблудзіцца, штоб аб вострыя кручы не разбіцца. Хай памагае яму сонцэ краснае, штоб была дарога яснаю, хай паможэ яму луна нежная і як маці да яго будзе бярэжная. Хай памогуць яму вятры буйныя, хай не буйствуюць, толькі пасвістваюць, штоб крылы яго былі быстрымі, штоб далёкую дарогу ўкарачвалі і да роднага гнязда паварочвалі. Штоб не стаяла гняздо апусцелае, штоб не маялася сям'я асірацелая.

## Паляўнічая

Госпадзі Божа, благаславі і ты, царыца, дапамажы. На кітае-моры лежыт камень, з-пад тайго камня выхадзіла краса-дзевіца с залатымі ключамі, і адчыняла ружжо, і дазваляла біць не па жывому, а па мёртваму. І на векі вякоў. Амінь!

## Прысушка

Пайду я, раб Божы (імя), пад акіян-мора, стану ў край мора. Бачу я, стаіць дуб, ад веку пасажаны, ад веку паражаны. Абгараджу яго жалезным тынам, жалезным варатам. Пад тым тынам, жалезным воротам ляжыць змяя-самаверніца, рассылае красных дзевак на шаўковыя лугі, каб нылі аба мне іх жылкі-паджылкі, гарачае сэрца. Амінь!

## Пры ўваходзе ў новую хату

Хата, хата, штоб на ўсё была багата і на людзей здарова.

*Прагаворваць 3 разы.*

## Салдацкая

На моры, на акіяні, на востраве Буяне стаіць столб. На том сталбе дзве дзевіцы-красавіцы. Ш'юць ані па атласу і па бархату нашай мацеры, Прысвятой Багародзіцы, рызу. Цар нябесны знёс з нябёс крэст булатны наглядаць жывых і мёртвых. Як мёртвые ляжат, не варухнуцца, рот не раскрываюць, вочэй не ўзнімаюць, сэрца не раз'ераюць, рукамі не варухнуць, нагамі не трахнуць. Так бы і раба Божага камандзір рукой не варухнуў, нагой не трыхануў. І будзет маё слова крэпкім, крапчэй белага камня.

## Як першы раз выганяюць карову на пашу

На сінім моры, на лукаморы стаіт дуб, на ім какаты, на этых какатах ляжыт белы камень. Як таго камня ніхто не йме, так і нашае кароўкі ніхто не займе: ні гад паўзучый, ні звер бягучый. Я прашу цебя, упрашваю, святый Юр'е, выходзь са сваімі замкамі, залатымі ключамі. Замкамі зачыняй сваім слугам няверным зубы, губы, первым, срэднім, паследнім, штоб наша кароўка казалася ў полі мятаю, камнем, на даліне купінаю, а ў лясу калодаю,

кустам на дарозе, сокалам. І прашу цебя, Святое Юр'е, Міхаіл, умершага спасіце, зберагіце нашу кароўку. Благапалучна, спакойна, покуль з поля прыдзе.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Матарас Сцепаніды Іванаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

* * *

– Молодзічэ, молодзічэ, добры чоловечэ, ці буваў ты на том свеці?
– Буваў.
– Ці бачыў ты мертвого?
– Бачыў.
– Ці не боляць у ёго зубы?
– Не.
–Нехай не боляць рабу Божому (імя).

* * *

Госпадзі, поможы, Госпадзі, благослові. Іду я із хаты, чэрэз двое дзвярэй, чэрэз усе порогі. Дзверы за собой закрываю, замкі на дзвярах замукаю, ключы з сабою забіраю. Іду я дарогай, з дарогі звярну на сцежку, з тое сцежкі звярну на чыстае поле. Там сем кустоў, а под кустамі сем серых котоў. А под самым седзьмым кустом – чорны кот сядзіць. Кот-коцішчэ, выгрызі ў мяне грыжу. Грыжу стаповую, паховую, коленную, лакцявую, подмышную, сярдзечную, голоўную. Усе іх забяры і з собою нясі.

* * *

Золотнічку, добрый чоловечку, там на месці, у золотом крэслі, стань у кружэчку, ек у еечку. По косцях не ходзі, косцей не ламі, у холад не ўкідай, косцей его не росцірай.

* * *

Ішла пані ў чырвоным каптані, сеяла пшаніцу на белелу камяніцу. Пшаніца не зышла, шоб кроў з раны не пошла. Ек стоіць вода на Іордані, нехай стане кроў у рані.

* * *

Прэчыста Божая Маці, прыступай, памагай (імя) спуд шэптаці. Спуд вуціны, гусіны, курыны, сабачы, конскі, жэрэбячы, коровячы, целячы, мужчынскі, хлопечы, жоночы, дзявочы, поробочы, подручны, водзяны, ветраны, прыстрэчны.

* * *

Прыстрэчэ, добры чоловечэ. Ек от чоловека – то под косу, жонкі – то под серп. Солодке прокоўтні, горке проплюй. По косцях не хадзі, у холод не ўкідай, касцей (імя) не расцірай.

* * *

Святы Мікола, прыступай, помогай (імя) удар выговораці. Тому дубу на пне не стояці, лістом не шумеці, (імя) косцям не балеці.

* * *

*Первое моляцца "Отчэ наш".*

Ехаў цар-воевод на сівом коне. Сустракае сам Господ:

– Куды, Цар, едзеш?

– Еду (імя) такі звіх шэптаці.

Ой, ты, звіх, не будзь ліх, по косцях не ходзі, косцей не ламі, чырвоное крыві не моры. До белого песку, до жоўтого воску.

*І так трэба расказваць 7 раз, шчоб було не до пары.*

* * *

Прэчыста Божа Маці, прыступай, памагай, Божая Маці, урокі выговораці. Урокі, урочышча мужчынскіе, жаночые, паробочые, падручные, водзяные, ветраные, прыстрэчные. Я вас ножэм отрэжу. Прылецелі сорокі, ухопілі ўрокі, понеслі на чорота, на болота, на жоўтые пяска, дзе вецер не вее, дзе сонцэ не грэе.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Валацэвіч Праскоўі Іванаўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Лясько Л.***

* * *

Маладзік, маладзік, якія крутыя ў цябе рогі, дай мне быстрыя вочы і быстрыя ногі. Пытаецца малады ў старога, ці баляць зубы ў нежывога. Калі ў яго забаляць, то шоб і ў мяне забалелі.

* * *

На Ердані рубалі, колы забівалі і колы вынімалі. Вода пробегае, яд процекае. Дай, Господзі, помоч от Господа Бога і от мене.

* * *

Памажы, Госпадзі, выгаварыць грыжу. Прыгаворваю замоўную, насыльную. Ты, грыжа-грыжачка, вазьмі мае казінае ты бародзішча. Я цябе на мельніцу атвяду, на муку змялю, па полю рассею. І як нам муку не сабраць, нам цябе, увара Божага, мілая, не буравацъ. На маладзіку не патрыхайся, на згоду ўлягайся.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Кахно Сцепаніды Афанасьеўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Шруб Г.***

* * *

Ішоў Хрыстос Ісус і Божа Маці па Іорданскай рацэ. У гэтой Іорданской рацэ вода остановіса, малому дзіцяці знос промініса. Ішла бабка лясочкам, подпіралаcа кіёчкам, даставалаcа да раба Божого (імя) знос шэптаці. Мо, на тобе знос, мо, на тобе подуманэ, нагаданэ, нанесенэ. Дай, Госпадзі, помоч от Господа Бога і от мяне.

* * *

Удар, не ходзі, жоўтое косці не ламі, сінёе жылы, чырвоное крові. Дай, Господзі, помоч от Господа Бога і от мене.

*Гаварыць 3 разы.*

* * *

Нядзелечка – Васкрэсенье, прошу цябе, молю цябе. Свяшчоной, крэшчоной (імя) урокі гаворыці: мужчынскіе, жаноцкіе, дзявоцкіе, паробоцкіе, ветраные, земляные, водзяные. Да прыляцелі сарокі, да забралі ўрокі, да понеслі на мха, на болота, на жоўтыя пяскі. А на жоўтом пяску сядзело два собакі. Оны тые ўрокі розвуюць, языкамі розмуюць. А на сінём моры сядзело дзве дзеўкі. Не ўмеюць ні шыці, ні прасці, толькі тые ўрокі разбіраці. Дай, Господзі, помоч от Господа Бога і от мяне.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Марыі Васільеўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Шруб Г.***

## ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

***Кастрыца А.А. Прыкметы і павер'і Жыткаўшчыны***

Мы, людзі стагоддзя гаджэтаў і штучнага інтэлекту, штодзённых тэхнічных удасканаленняў і адкрыццяў, нягледзячы на высокі навуковы ўзровень развіцця грамадства, працягваем аддаваць даніну павагі тым традыцыям, тым ведам, якія доўга напрацоўваліся і ашчадна зберагаліся нашымі папярэднікамі, каб быць перададзеным нам у якасці мудрай спадчыны.

Бясспрэчна, значэнне традыцыйнай духоўнай культуры ў гісторыі развіцця чалавецтва ўвогуле і кожнага народа ў прыватнасці надзвычай вялікае. Як трапна адзначыў У. Васілевіч, "…фальклор з'яўляецца своеасаблівай (хоць, вядома, і вельмі супярэчлівай) мастацкай энцыклапедыяй народнага жыцця – ведаў, вопыту, этыкі і эстэтыкі селяніна" [1, с. 6]. Важнае значэнне ў гэтай "мастацкай энцыклапедыі" належыць прыкметам і павер'ям, якія з'яўляюцца архаічнай з'явай фальклору.

Пад прыкметай, на наш погляд, трэба разумець твор малой формы, у аснове якога знаходзіцца апісанне (згадванне) дзвюх падзей. Адна з гэтых падзей з'яўляецца ўмовай, пры выкананні або супадзенні якой другая падзея атрымлівае расшыфроўку (прадказанне): "*Шмат жалудоў* на дубах – *на*

*цёплую зіму*” (запісана ў г. Тураў ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.). Для прыкметы характэрны такія рысы, як невялікі памер і ўстойлівая структура (часцей адзін складаназалежны ці бяззлучнікавы складаны сказ), аб'ектыўная прычынна-выніковая аснова (пацверджана вопытам назіранняў): “Колы *на Благавешчанне дождж*, то будэ *ўраджай на жыта і грыбы*, а колі *снег*, то *лето* будэ *мокрае*, а колы *цёплае і сухое надвор'е*, то *лето будэ засушлівым*, а *восень ранняя і марозная*” (запісана ў в. Града ад Жукоўскай П М., 1928 г.н.). Павер'е вызначаецца невялікім памерам, наяўнасцю варыятыўнай структуры і грунтуецца на міфалагічных уяўленнях (адсюль строгая рэгламентацыя паводзін): “Калі прыходзіш паглядзець навароджанага, хутка развязвай хустку, каб дзіця хутка пачало гаварыць” (запісана ў в. в. Кольна ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.)). У адрозненне ад прыкмет, дзе роля чалавека зводзіцца толькі да назіранняў і вывадаў, павер'і дэманструюць усё ж такі яе значнасць: чалавек можа ўплываць на ход падзей і пэўным чынам канструяваць жыццёвыя сітуацыі: “Бярэменнай жонцы не можна было ісці за куму, бо дзіця не жыцьме ці яе, ці того, чые дзержыць” (запісана ў в. Хвойка ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.); “Пад скацерць на Каляды лажылі сена, а пад сена трэба было палажыць яшчэ грошы. Гэта для таго каб грошы вяліся ўвесь год, каб не пазычаць, каб усё ў сям'і было добра” (запісана ў в. Боркі ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.). Даволі часта дакладна вызначыць жанравую прыналежнасць гэтых малых фальклорных адзінак амаль немагчыма.

Звернемся да тэкстаў каляндарных прыкмет і павер'яў, зафіксаваных падчас індывідуальных і калектыўных палявых фальклорных экспедыцый на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна. Паводле прымеркаванасці да свят народнага календара, сярод іх можна выдзеліць шэраг тэматычных груп: піліпаўскія (“Ніхто з людзей не назначаў у етае врэмя свадзеб, бо шчытаецца, што на Піліпаўскі пост ваўкі гуляюць свадзьбы. Еслі сыдуцца маладыя, то і будуць жыць як ваўкі – сварыцца будуць” (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Яўгеніі Мітрафанаўны, 1956 г.н.,)), калядныя (“На Каляды абвязвалі “сад” (пладовыя дрэвы), каб зародзіл на другі год. Калі на Раство пойдзе снег і завісне на галле дрэў, будзе год ураджайны і грыбны” (запісана ў в Запясочча ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.)), стрэчанскія (“Еслі на Стрэчанне петух вады нап'ецца, то на Благовешчанне пчолы вуляцяць, значыць, будзе ранняя весна і цёплая” (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.)), масленічныя (“...дзяўкі, пака хлопцы не устануць, стараліся забегчы на тую коўзалку і пусціць першага бліна па той коўзалцы, маслам памазанага, шоб ето скарэй замуж выйсці” (запісана ў в. Чэрнічы ад Юнчыц Марыі Дзянісаўны, 1944 г.н.)), велікодныя (“У Чысты чацвер наводзілі во дворэ парадак, шоб была чысціня вездзе цэлы год. На полі, у агародзі стараліся прыбраць, шоб у агародзі пустозелля не было, шоб мало трэбо було полоць, прыбіраць яго” (запісана ў в. Сямурадцы ад Лой Ганны Пятроўны); “Казалі, хто бітак не пробівае, то не будзе яец і не будзе здароўя ў хаце” (запісана ў в. Пагост ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.)), юраўскія (“Калі пазваляла надвор'е, то на Юр'я выганялі першы раз жывёлу на поле.

Каля падваротніцы клалі замок. Трэба было каб карова цераз яго пераступіла. Рабілі гэта для таго, каб ведзьмы малако не забіралі" (запісана ў в Боркі ад Нямшэвіч Вольгі Давыдаўны, 1937 г.н.), троіцкія ("У окны затыквалі клён, як оберэг, штоб оберэгчы селішчэ. Ідом у цэркву свецім клён. То трэба, як прынясеш з цэркву, пакласці яго за ікону. Эты клён раны лечыць" (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.)), купальскія ("На Купало ішлі по зелья, рвалі от усякіх хвороб. Ходзілі по чарніцы, думалі, шо это лякарство, бо яны святые ў гэты дзень. У цэркві свяцілі зелье. На досвітку купаліса ў рацэ, каб здоровым буць, шчэ козалі, шо на Івана Купального трэба ўмыцца росою, бо чалавек набірае моцы і маладзее" (запісана ў в. Рычоў ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.)), пакроўскія ("После Пакроў ніхто не хадзіў у гароды, ждалі вясны" (запісана ў в. Пухавічы ад Субат Яўгеніі Пятроўны, 1952 г.н.)) і інш.

У адпаведнасці з семантычна-функцыянальнай скіраванасцю, у межах прыкмет, павер'яў, прымеркаваных да свят народнага календара, можна вылучыць наступныя групы:

*апатрапеічныя і лекава-прафілактычныя*: "Сена, што было на покуці і на стале [на Каляды], аддавалі жывёле, каб здаровай была і вялася" (запісана ў в. Кольна ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.); "Пасля прыходу з царквы [на Грамніцы] гаспадар дома на крыж падпальваў таю свечкай валасы на галаве ва ўсіх членаў сваёй сям'і, таму што грамнічныя свечкі грамяць сілу д'ябальскую ў асобе ведзьмаў і чарадзеяў і ахоўваюць ад хвароб галовы" (запісана ў в. Людзяневічы ад Ханені Аляксандры Васільеўны));

*прадуцыравальныя*: "Скарынку з куцці зверху кашы збіралі і аддавалі курам, каб вяліся добра. Перад тым як на стол ставіць куццю з вячэраю, пад палатняную скацерць лажылі сена, а пад тое сена лажылі грошы, каб у хаце цэлы год грошы вяліся" (запісана ў в. Кольна ад Сінкевіч Валянціны Іванаўны, 1924 г.н.); "Калі пеклі печыва ў форме птушак [на Грамніцы], то абавязкова ад некалькіх печаных птушак крышылі курам, каб тыя лепей несліся" (запісана ў в. Буразь ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.);

*прадказальныя (інфармацыйныя)*: "Калі на Саракі быў мароз, то казалі, што яшчэ будзе 40 марозаў" (запісана ў в. Рудня ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.). Што да інфармацыі, якой цікавіўся чалавек, то яна закранала розныя сферы яго жыцця і дзейнасці: *надвор'е* ("Яшчэ, якое надвор'е на Благавешчанне, то такое ж павінна паўтарыцца і на Вялікдзень" (запісана ў в. Рудня ад Пракаповіч Марыі Сцяпанаўны, 1934 г.н.)), *ураджай і дабрабыт* ("Хазяін [на Каляды] выходзіў на вуліцу і глядзеў на неба, калі многа зорак, значыць, будзе многа грыбоў і прыплод у хазяйстві. Калі була мяцеліца, будуць раіцца пчолы" (запісана ў в. Дуброва); "На Пятра вялікая раса і ясны дэнь – быць добраму ўраджаю агуркоў" (запісана ў в. Града ад Жукоўскай П. М., 1928 г.н.), *лёс, падзеі асабістага жыцця* ("Дзяўчаты [на Тройцу] астаўлялі ў лесе вяночкі. А далей ужэ чераз нядзелю прыходзілі ў лес, да ўжэ глядзелі: як чый вяночак засохне, то ето ўжэ нелоўкая прыкмета, ето ўжэ знай, шо ў роду хто-небудзь помрэ. А як вяночак не засохне – роду

жыць доўга і ў роду ніхто не помрэ” (запісана ў в. Сямурадцы ад Лой Ганны Пятроўны); “Колі на помінках вілка под столь упадзе, то еты чаловек скоро помрэ” (запісана ў в. Малешаў ад Точкі Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.) і да т.п.

Шмат у экспедыцыях па Жыткаўшчыне зафіксавана тэкстаў прыкмет і павер’яў, якія даволі арганічна існуюць у межах сямейных абрадаў. *Вясельныя* (“Коровай мясіць не дозволялі ўдаве ці разводной жанчыне. Галоўнай коровайніцай могла быць толькі жанчына, якая жыве ў пары” (запісана ў в. Запясочча ад Сакавай Ганны Іванаўны, 1927 г.н.); “Калі вянчаліса, то рушніка цяглі к прыстолу, шоб дзеўкі замуж ішлі” (запісана ў в. Рычоў ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.)), *радзінна-хрэсьбінныя* (“Бярэменнай жонцы не можна было ісці за куму, бо дзіця не жыцьме ці яе, ці того, чые дзержыць. Як яна будзе на похоронах, то дзіця яе родзіцца мёртвым. Калі ў хату, дзе ё бярэменна, на Куццю зойдзе первым мужчына, то ў той жонкі народзіцца сын, калі маладзіца, то дочка” (запісана ў в. Хвойка ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.)); “Калі ў царкве хрысцяць дзіця, то трэба ўзяць з сабою дзіцячую сподню сарочачку, якую бацюшка нясе да алтару, чытае над ёю малітву. Лічылі, што гэтая сарочачка засцерагае ад няшчаснага выпадку, хвароб” (в. Кругавец)) і *пахавальныя* (“Трэба завешваць зеркало, штоб душа не заблудзіласа, і штоб у зеркалі не застаўса образ покойніка, і штоб ён потым не пугаў остольных” (запісана ў в. Пухавічы ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.)) прыкметы і павер’і адлюстроўваюць спецыфіку сямейнага ўкладу мясцовых жыхароў, іх маральна-этычныя каштоўнасці і побытавую філасофію.

На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна бытуюць таксама прыкметы і павер’і (у іх межах можна вылучыць шэраг тэматычных груп), якія існуюць па-за межамі каляндарных і сямейных абрадаў. Прыгадаем некаторыя з іх:

*прыкметы аб надвор’і*, якія грунтуюцца на назіраннях за раслінамі (“Шмат жалудоў на дубах – на цёплую зіму” (запісана ў г. Тураў ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.), жывёламі (“Колі собака лежыць скручаны, то мороз будзе” (запісана ў в. Малешаў ад Точкі Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.)), разнастайнымі праявамі навакольнага свету (“Калі ранняй вясной бліскае маланка, а грымоты не чутно – лета будзе сухім” (запісана ў г. Тураў ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.));

*прыкметы і павер’і аб ураджаі,* якія ўмоўна можна падзяліць на тэксты-назіранні (“Колы на Якава цёплы вечар і зорыстая ноч, то будэ цёплае лето і добры ўраджай” (запісана ў в. Града ад Жукоўскай П М., 1928 г.н. )) і тэксты-рэкамендацыі (“У першыя дні маладзіка пры паўднёвым ветры патрэбна сеяць горох, тому шо вецер і моладзік спрыяюць доброму росту” (запісана ў в. Града ад Жукоўскай П М., 1928 г.н.); “Калі садзяць картоплі, трэба каб мужчына першы тры картапліны пасадзіў, будуць чыстыя картоплі. Калі садзіць цыбулю, трэба аблізвацца – цыбуля салодкая будзе” (запісана ў в. Кольна ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.);

*прыкметы і павер’і аб гаспадарчым дабрабыце* (“Калі ў гаспадарцы прыплод, нікому нічога не можна даваць з хаты тры дні” (запісана ў в. Кольна ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.);

*правілы-рэгламентацыі і правілы-забароны для розных жыццёвых сітуацый* (“Колі хлопец есць у шапцы, то ў его цешча будзе глухая” (запісана ў в. Рычоў ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.); “У яку ты дарогу едзеш, ідзеш, старайся, каб жанчына не перайшла дарогу, а перайшоў мужчына” (запісана ў в. Кольна ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.); “Неможно обручальнэ кольцо даваць другім мерацъ, бо можно поцерацъ свойго мужа” (запісана ў в. Малешаў ад ад Точкі Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.)), якія адлюстроўваюць правілы мясцовага звычаёвага права, так званыя мясцовыя этыкетныя нормы.

Фактычныя матэрыялы палявых фальклорных экспедыцый дазваляюць сцвярджаць, што прыкмет і павер’яў (і тых, што існуюць у межах абрадаў, і тых, што знаходзяцца па-за іх межамі) у духоўнай спадчыне Жыткаўшчыны даволі многа, паколькі менавіта ў прыкметах і павер’ях найбольш выразна адлюстроўваюцца карціны асабістага, грамадскага, гаспадарчага жыцця чалавека, разуменне ім з’яў навакольнага свету, цікавыя назіранні і трапныя парады, а значыць, тэксты гэтыя будуць існаваць доўга, транслюючы нашчадкам вопыт мудрых продкаў, іх паэтычна-прагматычны светапогляд і філасофскае стаўленне да жыцця.

Спіс выкарыстаных крыніц

1 Зямля стаіць пасярод свету… Беларускія народныя прыкметы і павер’і. Кн. 1 / Уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1996. – 591 с.

**Прыкметы і павер’і**

Шмат жалудоў на дубах – на цёплую зіму.

Вялікія мурашнікі ўвосень – на суровую зіму.

Бярозка распускаецца – сей авёс, сады цвітуць – бульбу, каліна цвіце – грэчку.

Птушкі ўюць гнёзды на сонечнай старане дрэў – на халоднае лета.

Камары таўкуць мак – на пагоду.

Шмат ягад улетку – на халодную зіму.

Кветкі моцна пахнуць перад дажджом.

Ластаўка лятае нізка – на дождж.

Доўгія сасулькі – к доўгай вясне.

Снег хутка тае і хутка бяжыць вада – к мокраму лету.

Калі ранняй вясной бліскае маланка, а грымоты не чутно – лета будзе сухім.

Па халоднай вясне – градабойнае лета.

Дружная вясна – чакай вялікай вады.

Вада разальецца – сена прыбудзе.

Красавік – з вадою, май –з травою.

З бярозы цячэ багата соку – к дажджліваму лету.

Калі ў бярозы лісты з’яўляюцца раней, чым у альхі, лета будзе сухім, а калі ў альхі раней – мокрае.

Калі ў добрую пагоду на муравейніку няма мураўёў – к непагодзе.

Камары і мошкі вельмі кусаюцца – к дажджу.

Пчолы лятаюць паблізу ўльяў – перад дажджом, залятаюць далёка ў поле – к добрай пагодзе.

Шмат майскіх жукоў – чакай засухі.

Перад дажджом рыбы выпрыгваюць з вады і ловяць машкару.

Лягушкі прыгаюць па берагу і днём квакаюць – чакай дождж.

Жаўрукі з ранку не пяюць – будзе дождж ці зусім дрэнная пагода.

Калі пералётныя птушкі ляцяць стаямі – к дружнай вясне.

Журавель курлыкае – цёплую вестку падае.

Салавей пяе ўсю ноч – будзе сонечны дзень.

Ластаўкі прыляцелі – хутка гром загрыміць.

Вялікая раса – к яснаму дню.

Радуга ранкам – к дажджу, вечарам – к добрай пагодзе.

Дождж праз сонца – к нянасцю.

Увечары моцна стракочуць кузнечыкі – к добраму надвор'ю.

Гром у верасні – на цёплую восень, кастрычніцкі гром – к бясснежнай зіме.

Калі ў верасні лісты на дрэвах трымаюцца моцна – зіма будзе позняй.

Калі лісты з дуба ападаюць разам – зіма будзе мяккая, не ўсе адразу – суровая.

У лесе шмат рабіны – восень будзе дажджліваю, мала – сухою.

Восенню шмат павуціны – на сонечную пагоду.

Зіма снежная – лета дажджлівае. Зіма марозная – лета жаркае.

Калі ноччу быў іней, то днём снег не выпадзе.

Іней на дрэвах – на мароз, туман – на пацяпленне.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Смерць – гэта жанчына, апранутая ў белую адзежу. Можа ператварацца ў белага ката.

Калі 13 чысла кожнага месяца або на гадавы празнік за сталом збіраецца 13 чалавек, то самы маладзейшы з іх памрэ.

Калі чалавек цяжка паміраe, то трэба ковянёю падоўбіць столь. Перад смерцю чалавеку заўжды бывае лягчэй.

Нябожчыку абовязкова трэба расшпіліць рамні, распілаваць кольца. Гэта робіцца, каб не было прывідаў.

Калі чалавек перад смерцю ўтаропіцца ў адну кропку, гэта значыць, што ў вочы яму зазірнула смерць, якая заўсёды стаіць ў галаве паміраючага і займае яму дыханне.

Душа чалавека яшчэ сорак дзён ходзіць па зямлі.

Калі ў нябожчыка расплюшчаны вочы, то хутка будзе шчэ адна смерць, але можа быць, што ў яго засталася важная нявырашаная справа.

Мыць нябожчыка запрашаюць заўсёды старых бабулек і абавязкова цотную колькасць.

Калі чалавек перад смерцю накажа, што яму пакласці ў гроб, ці ў што апрануць, гэта трэба абавязкова выканаць.

Трэба ў хаце занавешваць усе зеркалы.

Грэх па нябожчыку вельмі плакаць, бо яму будзе цяжка на тым свеце.

Пасля пахавання трэба пагрэць рукі каля печы, каб смерць анямела і больш не прыйшла ў гэту хату.

***Запісана ў в. Вятчын***
***ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Калі прыходзіш паглядзець навароджанага, то хутка развязвай хустку, каб дзіця хутка пачало гаварыць.

Калі садзяць картоплі, трэба каб мужчына першы тры картапліны пасадзіў, будуць чыстыя картоплі.

Калі садзіць цыбулю, трэба аблізвацца – цыбуля салодкая будзе.

Калі ў гаспадарцы прыплод, нікому нічога не можна даваць з хаты тры дні.

У яку ты дарогу едзеш, ідзеш, старайся, каб жанчына не перайшла дарогу, а перайшоў мужчына.

На Вербную нядзелю свецяць вярбу. Прыходзяць дадому, і, хто ў хаце, таго той вярбой б'юць і прыгаворваюць: "Верба б'е, не я б'ю. Будзь здарова, як вада, будзь багата, як зямля".

Каб кот, прынесены ў дом, не збег, патрэбна абвясці яго за сонцам тры разы кругом дзвюх ножак стала.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Пятровіч Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Людзяневічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Ляўковіч І.***

З царквы колі везлі похрышчанэ дзіця домоў і загубяць крэсціка, то дзіця будзе няшчасліва.

Колі мертвец ляжыць яшчэ ў хаце і ўжэ набракае, то скоро зноў нехто помрэ.

Колі на помінках вілка под столь упадзе, то еты чаловек скоро помрэ.

Шоб молодые жылі богато, іх сажалі на кожух, вывернуты навыворот.

Еслі на свадзьбу дождж пойдзе, то ето добрэ, колі снег – добрэ, бура – плохо.

Неможно нікому даваць спаць на брачнай посцелі, нехто тогды ізменіць.

Неможно обручальнэ кольцо даваць другім мераць, бо можно поцераць свойго мужа.

Калі заходзіш ў чужую хату, дзе жыве незамужняя дзеўка, то на парозі не стояць, бо та дзеўка замуж не выйдзе.

Калі заходзіш у чужую хату і хозяева едзяць, то тому, што прыйшоў, повезе.

Колі собака лежыць скручаны, то мороз будзе.

Певень спевае под вечэр –к перэмені погоды.

Ек заец перэбежыць дорогу, то плохо, ек воўк, то добрэ.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Каб не вельмі сумаваць па нябожчыку, націраюцца супраць сэрца зямлёй з магілы.

Зямля з 7 магіл добрых людзей спасае ад усіх бед.

Троіца Троіцай, а трох свечак на стол не ставяць.

Трынаццаты за стол не садзіцца.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Гулюты Таццяны Рыгораўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

Колы на святога Рыгора выпадзе шэрань, год будэ мокры.

Колы на Фядоса цёпла, вясна будэ ранняя.

Колы на Таццяну сонечна, рана прыляцяць птушкі, а колы ідэ снег, будэ даждлівае лето.

Колы на Яўхіма ў поўдзень сонечна – то будэ ранняя вясна, а колы завіруха – то на всу Масленіцу будэ завіруха (ето цэлы тыдэнь).

На дэнь Аксінні па надвор'ю меркавалі пра вэсну: які дэнь на Аксінню – етака будэ вэсна.

Колы на зіму выпадэ многа снегу – значыць будэ многа хлеба, многа вады і многа травы.

Колы собака качаецца па снезе – до адлігі.

Колы вороны крычаць цэлаю чарадою – да марозу, а летам – да непагоды (будэ дождж).

Колы зорнае небо на Трыфана, вэсна будэ позняй.

Печ робіць потрэбно ў моладзік – будэ цяплей у хаце.

Колы на Стрэчанне вялікі мороз, снег праляжыць шчэ довга, а лето будэ сухое і лагоднае.

Колы на Стрэчанне мяцеліца, быць довгой вэсне.

Колы на Стрэчанне цёпла, вэсна ранняя, а лето нелагоднае і неўрадлівае.

На Стрэчанне сняжок – вэсною дажджок.

На Громніцы адліга – з ураджаю будзе фіга.

Колы капёж на Громніцы, ураджай будэ на пшаніцу.

Колы вэсною першым выляціць чырвоны матылёк, то будэ мядовы год, а колы жовты, то молочны год.

Колы пчала вылеціць з вулля да Благавешчання, то шчэ довгі час будэ холадна і вымярзнуць пасевы.

Колы мышы ўзбіраюцца на стагі, быць вялікай вадзе.

Колы в сакавіку снег задувае, то будэ ўраджай на агародніну, а колы рана пачне раставаць, то довга яшчэ не растане.

Колы птушкі (екі зімуюць) пачынаюць віць гнёзды, пералётныя ляцяць з выраю.

Колы на Фядота мяце снег, то довга не будэ травы.

Колы прыляцяць гракі і адразу садзяцца на гнёзды, быць добрай вэснэ.

Колы на Сымона туман, будэ добры ўраджай на конаплю і лён.

Екія ручаі на «Аляксея» (малыя ці вялікія), етакая ж будэ павадка.

Колы на Благавешчанне дождж, то будэ ўраджай на жыта і грыбы, а колі снег, то лето будэ мокрае, а колы цёплае і сухое надвор'е, то лето будэ засушлівым, а восень ранняя і марозная.

Колы на Фаміным тыдні сонца ў кругах, то год будэ ўраджайны.

На Ірыны дэнь сяўба капусты на расаду.

Колы ольха распусціцца раней за бярозу – год будэ мокры, колы бяроза раней за ольху, то год будэ сухі.

Колы на Якава цёплы вечар і зорыстая ноч, то будэ цёплае лето і добры ўраджай.

У першыя дні маладзіка пры паўднёвым ветры патрэбна сеяць горох, тому шо вецер і моладзік спрыяюць доброму росту.

Колы цвіце чаромха, абавязкова будэ прохлада.

На Пятра вялікая раса і ясны дэнь, быць добраму ўраджаю агуркоў.

Колы на Ганны ранак холодны, то і зіма будэ холодна.

Колы паспяваюць агуркі, час выкопваць часнок.

Фядора– лета канчаецца – восень пачынаецца.

Колы на Міхала дзень цёплы і леціць павуціна, восень будэ добрая і не скора будэ выпадаці снег.

***Запісана ў в. Града***
***ад Жукоўскай Праскоўі Мікітаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Галячанка Ю.***

Бярэменнай жонцы не можна было ісці за куму, бо дзіця не жыцьме, ці яе, ці того, чые дзержыць. Як яна будзе на похоронах, то дзіця яе родзіцца мёртвым.

Бярэменнай не можна ні садзіцца, ні стояць у порозе, бо цяжко будзе адбуваць роды.

Бярэменную не трэба пужаць, бо яна з пуду можа скінуць, а як не, то яе дзіця будзе заікаю.

Каб у сям'і радзіўся первым хлопчык, молодым под ложак подкладалі сякеру.

Калі ў хату, дзе ё бярэменна, на куццю зойдзе первым мужчына, то ў той жонкі народзіцца сын, калі маладзіца, то дочка.

Каб дзіця було здаровым, трэба маладзіцам, якія ў палажэнні, есці тое, на што ё смак.

Бярэменна маладзіца не должна нічога класці за пазуху, бо дзіця будзе злодзеем.

Не трэба біць ногою жывёлу, бо дзіця будзе крыклівае.

Маладзіца ў палажэнні не доўжна пераступаць праз аглоблю, вобруч, дугу, ці што другое крывое, бо дзіця будзе гарбатэ ці з крывымі нагамі.

Калі бярэменна, убачыўшы пажар, возьмецца за твар, то ў дзіцяці на твары будзе радзімае пятно. Калі ж яна спужаецца якога звера і возьмецца за цело без адзежы, то ў дзіцяці будзе радзіма пляма з косамі того ж цвету, што і ў звера.

Бабе не можна нішчыць ластоўчыных гнёздаў, бо дзіця будзе рабое.

Калі бярэменна пераступіць сякеру, у дзіцяці будзе заеча губа.

Не трэба нікого дражніць (ні картавого, ні нямого, ні заіку, ні звяроў), бо й дзіця будзе таке самэ.

Парадзіха распускае ўсе паясы і расшпільвае коўнер у сорочцы. Тое ж робяць баба і жонкі, што остаюцца ёй помогаць.

Дзіця, якое родзіцца ў последнюю квадру, будзе слабое; такое дзіця трэба крысціць на маладзік.

Не можно бабіць той жонцы, што нядаўна прымала інша дзіця. Трэба браць такую, катора з месяц ужэ прымала. Не можно той жонцы бабіць дзяцей, котора шчэ можа свое прывесці.

Калі дзеці ў сем'і не гадуюцца, трэба пазваць за кумоў первых устрэчных, толькі каб не цыганы.

У нядзелю не можна мыць дзіця ці пялёнкі, бо дзіця ўтопіцца.

Не трэба малому дзіцяці даваць глядзецца ў зеркало, бу пужацьмецца й зубкі важко прорэзвацьмуцца.

Калі ў чоловека було несколько дочок, то сватацца трэба було перш да старэйшой.

Сват, ідучы ў сваты, бярэ з собою пляшку горэлкі, котору только тоды п'юць, колі соглосяцца аддаць дзеўку.

Калі ў дарозе хто пяройдзе дарогу, то ў хаце маладых не будзе ладу.

***Запісана ў в. Хвойка***
***ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Колі хлопец есць у шапцы, то ў его цешча будзе глухая.

Калі вянчаліса, то рушніка цяглі к прыстолу, шоб дзеўкі замуж ішлі.

Як молодые ідуць у ЗАГС, то трэба затыкаць іголку за плячыма, шоб не зглазілі і чарку гарэлкі бралі пальцом знізу. Моляцца Богу ад маланкі, і паляць свечы стрэчонскіе, і закрываюць зеркало.

Як пойдзе дождж, то ў калодзец апускалі мак у трапачцы, а пасля дажджу яго вынімалі.

Як везлі молодых, то палілі агонь з соломы, шоб молодые переехалі его, шоб бесы выгнаць.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

### *Каранькова Т.У. Парэміялагічныя скарбы Жыткавіцкага раёна*

Асэнсаванне з’яў навакольнага свету ў прыказках і прымаўках звязана перш за ўсё з жыццём чалавека ў розныя гістарычныя перыяды і эпохі. Варта ўзгадаць выказванне даследчыка У.К. Касько, які адзначаў, што “прыказкі валодаюць вялікай грамадскай каштоўнасцю. Яны даюць мноства звестак пра заняткі, погляды, імкненні, настроі людзей, сведчаць пра светапогляд, культуру. Па прыказках можна вывучаць гісторыю, быт, заняткі і прафесіі людзей” [1, с. 22, 24]. На думку даследчыкаў В.Дз. Ліцвінкі і Л.А. Царанкова, “прыказкі і прымаўкі выразна фармулююць разнастайныя жыццёвыя заканамернасці, правілы і парады ў розных выпадках жыцця, сітуацыях і становішчах, сентэнцыях, перасцярогі ў момант небяспекі, даюць безліч каштоўных павучанняў, звязаных з паводзінамі чалавека, яго працай, узаемаадносінамі з іншымі людзьмі. На іх спасылаюцца як на неабвержную ісціну. Супраць прыказкі не паспрачаешся, бо яна ўвасабляе народную мудрасць” [2, с. 3].

Фактычны матэрыял, які быў сабраны ў экспедыцыі, праведзенай на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, дае магчымасць правесці класіфікацыю прыказак і прымавак па асобных тэматычных групах.

У значнай колькасці запісаных парэмій знайшлі адлюстраванне народныя ўяўленні маральна-этычнай праблематыкі. Адзначым, што прыказкі і прымаўкі адзначанай тэматычнай групы прадстаўлены дастаткова шырока, асабліва ў іх знайшлі яскравае адлюстраванне маральна-этычныя нормы, звязаныя з катэгорыямі “дабро” і “зло”: “*Ад добрага кораня – добры і адростак*” (г. Тураў), “*Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць”* (г. Тураў).

Дабро і зло з’яўляюцца фундаментальнымі паняццямі, на аснове якіх фарміруюцца ўсе іншыя этычныя катэгорыі. З паняццем сяброўства звязаны таксама пэўны спектр маральна-этычных нормаў. Адзначым, што ўменне сябраваць і паважаць людзей, падтрымліваць з імі добразычлівыя адносіны з’яўляецца вызначальнай рысай менталітэту беларускага этнасу, што знайшло адлюстраванне ў тэксце прымаўкі: “*Дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць*” (г. Тураў), *“Не май сто рублей, а май сто друзей”* (в. Вароніна).

Ва ўсе часы развіцця грамадства выражаліся негатыўныя адносіны да такой рысы характару чалавека, як балбатлівасць. Для людзей, якія належаць да названай катэгорыі, характэрна залішняе жаданне пагаварыць. Гэта прыводзіць да непажаданых вынікаў, што і знайшло адлюстраванне ў тэкстах прыказак і прымавак: “*Сама каля печы, а язык за парогам*” (г. Тураў), “*Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш”* (г. Тураў), *“Балбатнёю рук не заменіш*” (г. Тураў), *“Меньш говоры, а больш робі”* (в. Хільчыцы).

У мясцовых тэкстах прыказак і прымавак яскрава ўвасоблены супрацьлеглыя катэгорыі “разумнае – неразумнае”: “*Навука не мучыць, а жыць вучыць”* (г. Тураў), *“Як свае галавы не маеш, дык чужая не дапаможа”* (в. Хільчыцы), *“Волос доўгі, вум короткі”* (в. Хільчыцы), *“Вурос*

*до неба, да дурны, ек трэба”* (в. Хільчыцы), *“Без навукі і лапця не спляцеш”* (в. Відошын), *“Чужым розумам не пражывеш”* (в. Відошын).

Вялікая колькасць прыказак і прымавак прысвечана тэме роднай зямлі. У тэкстах парэмій сцвярджаецца, што самым родным, блізкім і дарагім сэрцу месцам з’яўляецца менавіта тое, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, таму і павінен ён шанаваць, любіць і не забываць свае карані, сваю родную старонку. Аб гэтым трапна гавораць тэксты прыказак і прымавак: *“Родная зямелька, як зморанаму пасцелька”* (г. Тураў), *“Чужая старонка без ветру сушыць”* (г. Тураў), “*Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка”* (г. Тураў), “У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць” (г. Тураў), “*Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне”* (в. Відошын).

У прыказках і прымаўках, зафіксаваных на тэрыторыі раёна, вылучаюцца тэксты, у якіх падкрэсліваецца вызначальная роля працы чалавека на зямлі: *“Адзін працуе цэлы дзень, другі глядзіць, дзе лепшы цень”* (г. Тураў), *“Чалавек без працы, што птушка без крылаў”* (в. Відошын), *“Паміраць збірайся, а жыта сей”* (в. Відошын). Таксама выяўляюцца адносіны людзей да народных свят, па якіх людзі часцей за ўсё арыентаваліся, калі трэба пачынаць працу на зямлі, прагназавалі ўраджай на будучы год: *“На святы Андрей коноплі сей (і кідаюць каноплі ў акно)”* (в. Запясочча), “*Ужо на Міколу падавай, дый вілы пахавай”* (в. Запясочча), *“Калі Калядкі, рабі і сам парадкі”* (в. Пагост), *“Хто перад Калядамі жывёлу добра даглядае, той перад Вялікаднём за хвост не падымае”* (в. Пагост), *“На Каляды ўночы трашчыць, а ўдзень плюшчыць”* (в. Пагост).

Глыбокай пашанай у народзе карысталіся адносіны да хлеба, што выявілася ў тэкстах наступных парэмій: “Хлеб ад зямлі, а моц ад хлеба” (г. Тураў)*. “Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе” (г. Тураў), “Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы” (г. Тураў).

Тэксты прааналізаваных прыказак і прымавак даюць магчымасць зрабіць выснову, што ў іх заключаны вялікі жыццёвы патэнцыял. З дапамогай парэмій народ трапна выражаў свае думкі наконт розных сацыяльна-бытавых падзей. Нездарма народная мудрасць сведчыць: “У прыказцы – праўда светлая” (г. Тураў). Гэта сапраўды так, таму што ў метафарычнай і сімвалічнай форме народ характарызаваў тое, што адбываецца з ім у розныя часы развіцця грамадства.

Вышэйпрыведзеныя матэрыялы пацвярджаюць той факт, што ў трапных і змястоўных прыказках і прымаўках Жыткаўшчыны знайшлі адлюстраванне пэўныя сацыяльныя і сямейна-бытавыя падзеі, маральна-этычныя каштоўнасці, пачуццё любові да роднага краю, павагі да людзей працы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Касько, У. Палескі дзівасіл : Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі са скарбніцы А.К. Сержпутоўскага / У. Касько.–Мінск : Выш. шк., 2005.–383 с.

2. Ліцвінка, В.Дз., Царанкоў, Л.А. Слова міма не ляціць. Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі / В.Дз. Ліцвінка, Л.А. Царанкоў.–Мінск : Універсітэцкае, 1985.–149 с.

Панкова Н.М. ***Мастацкія асаблівасці прыказак і прымавак Жыткавіцкага раёна***

Прыказкі і прымаўкі з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай народнай мудрасці. Зафіксаваны ў іх багаты жыццёвы вопыт беларусаў пададзены ў сціслай даступнай форме. Як слушна заўважае К.П. Кабашнікаў:"Прыказка мае шырокае поле ўжывання, яна адносіцца не толькі да той канкрэтнай сітуацыі, пра якую ідзе гаворка, а да любой падобнай, калі абставіны прымушаюць чалавека актыўна шукаць выйсце, рабіць, здавалася б, немагчымае, для выпраўлення крытычнага становішча, выратавання жыцця, маёмасці, справы і г. д. Каб такога не здаралася, народная мудрасць заклікае да абачлівасці, асцярожнасці, да ўзважаных учынкаў". [1, с.69]

З фальклорнай экспедыцыі па Жыткавіцкім раёне студэнты і выкладчыкі кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі прывезлі даволі разнастайныя запісы, сярод якіх сустракаюцца між іншага таксама прыказкі і прымаўкі, якія і сталі аб'ектам нашага аналізу.

Адразу хочацца адзначыць, што ў парэміях Жыткавіцкага раёна выкарыстоўваюцца многія мастацка-выяўленчыя сродкі і прыёмы.

Асноўнай формай выяўлення вобразнасці ў прыказках і прымаўках з'яўляецца іншасказанне: "Кошка мышцы не таварыш"(г.Тураў), "Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не тухнуць"(г.Тураў), "Пусты колас высока стаіць"(г.Тураў), "Сама каля печы, а язык за парогам"(г.Тураў), "Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш"(г.Тураў), "Смелыя і разумныя два вякі жывуць"(г.Тураў) і інш.

Сустракаецца таксама прамое выказванне: "Горка гарэлка, ды ўсе п'юць, нядобра замужам, да ўсе ідуць" (в. Хільчыцы), "Меньш гаворы, а больш робі" (в. Хільчыцы), "Сено, ек цело, трэба прыбраці" (в. Хільчыцы), "Хто перад Калядамі жывёлу добра даглядае, той перад Вялікаднём за хвост не падымае"(в. Пагост), "Чалавек галодны ні на што не годны" (г.Тураў), "Малыя дзеці – малы клопат, бальшыя дзеці – бальшы клопат"(в. Відошын) і інш. Кожны з гэтых выразаў "мае канкрэтны сэнс, (яго) кампаненты ужыты у прамым значэнні, але ўсё выказванне успрымаецца як афарызм дзякуючы ягонай замацаванасці за пэўнай маўленчай спуацыяй" [2, с.173].

Вельмі часта вобразнасць парэмій ствараецца шляхам ужывання ў іх метафар. Напрыклад, "Чужая старонка без ветру сушыць" (г. Тураў), "У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць" (в. Відошын), "Чужыня – не родная матка, хлеба не дасць" "(в. Відошын), "Сорам не воран, вачэй не выдзерэ" (в.Хільчыцы), "Раждзественскі мароз добра ўшчыпле за нос" (в. Пагост), "Праўда ў вочы коле" (в. Хільчыцы). Як бачым, часта ў прыказкавых выразах назіраецца адухаўленне прадметаў, ім прыпісваюцца характарыстыкі жывой прыроды. Нярэдка ў парэміях для пазначэння людзей з'яўляюцца вобразы

жывёл і птушак: “Кажда жаба свае балото хваліць” (в. Пухавічы), “Кошка мышцы не таварыш” (г. Тураў), “Па кодлу куры губатыя” (в. Вароніна), “Старого вераб’я на мекіні не проведзеш” (в. Хільчыцы).

Акрамя метафар, у прыказках і прымаўках Жыткавіцкага раёна ўжываюцца метаніміі і сінекдахі. Так, у прыказцы “Не ўсё золото, што свеціцца” (в. Пухавічы) назва матэрыялу выступае на месцы вырабаў з яго. Выраз “Сухая ложка рот дзерэ” (в. Хільчыцы) паказвае, як назва посуду выступае эквівалентаам адсутнасці ежы. У прыказках “Чужымі рукамі добрэ только жар загрэбаць” (в. Хільчыцы), “Вочы бояцца, а рукі робяць” (в. Хільчыцы), “Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць” (г. Тураў) назвы органаў і частак цела выступаюць у ролі чалавека, а ў прыказцы “Ані лыжкі, ані міскі, а павесіў тры калыскі” (г. Тураў), слова калыскі выступае для пазначэння колькасці дзяцей у сям’і. Адзіночны лік замест множнага ўжываецца ў парэміях “Набытая мазалямі капейка перацягне лёгкі рубель” (г. Тураў), “Ленцяй за дзело – мазоль за цело” (в. Пухавічы).

Яскравым сродкам выразнасці ў разглядаемых прыказках і прымаўках з’яўляецца антытэза – рэзкае рытарычнае супрацьпастаўленне вобразаў, паняццяў, дзеянняў, звязаных паміж сабой унутраным сэнсам ці агульным уладкаваннем. У якасці супрацьпастаўленняў часта ўжываюцца антонімы: “Дзе стары бурчыць, малады памаўчыць” (г. Тураў), “Анёлам ляцеў, чортам сеў”(г. Тураў), “Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш” (г. Тураў), “У будны дзень згуляць грэх, а ў святы дзень зрабіць не грэх” (г. Тураў), “Як свае галавы не маеш, дык чужая не дапаможа” (г. Хільчыцы), “Сыты по голодному не спогодае” (в. Хільчыцы).

Але такое лагічна дакладнае супрацьпастаўленне не заўсёды характэрна для парэмій. Часта сустракаюцца прыказкавыя выразы, у якіх супрацьпастаўленне з’яўляецца хутчэй сітуацыйным: “Адзін працуе цэлы дзень, другі глядзіць, дзе лепшы цень” (г. Тураў), “Хто высока нос задзірае, той на лбе гуз набівае” (г. Тураў), “Не той багаты, хто мае, а той, хто дбае” (г. Тураў), “Давалі – з кішэні не вымалі” (г. Тураў), “Хто горбам, а хто горлам” (г. Тураў), “Смачны боршчык, да малы горшчык” (в. Хільчыцы), “Не плаціць багаты, а вінаваты” (в. Хільчыцы), “Ек красоту дзелілі, то я спала, а ек сталі шчасце дзеліць, то я ўстала” (в. Вароніна).

Часта антытэза падкрэсліваецца тым, што характар яе размяшчэння ў адпаведных частках сказа аднолькавая (паралелізм): “Дзе гультай ходзіць, там земля не родзіць” (в. Хільчыцы), “У кроўца нема остатка, а ў попа здачы” (в. Хільчыцы), “Вочы бояцца, а рукі робяць” (в. Хільчыцы). Некаторыя прыказкавыя выразы ілюструюць адмоўны паралелізм, пры якім адмаўляецца тоеснасць, аднолькавасць з’яў пры наяўнасці іх падабенства. Звычайна такія парэміі пачынаюцца з не (ні): “Не по коту хвост, не по ямцы лучына, не по казаку дзеўчына” (в. Вароніна), “Ні смерць, ні радзіны не глядзяць ліхое гадзіны”(в. Хільчыцы).

Радзей у парэміях сустракаюцца эпітэты — вобразнае азначэнне прадмета ці дзеяння. Іх функцыю часцей за ўсё выконваюць словы, што ўжываюцца ў пераносным сэнсе:“Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць”(г.

Тураў), “Ціхая вада берагі мые”, “Ні смерць, ні радзіны не глядзяць ліхое гадзіны”, “Волос доўгі, вум короткі” (в. Хільчыцы), “У прыказцы – праўда светлая”(г. Тураў). Аднак сустракаюцца і так званыя дакладныя эпітэты, дзе прыметнікі ўжываюцца ў прамым значэнні:“Без роднай мамачкі заклююць галачкі” (г. Тураў), “Дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць”(г. Тураў), “Горка гарэлка, ды ўсе п’юць, нядобра замужам, да ўсе ідуць”, “Сухая ложка рот дзерэ” (в. Хільчыцы).

Адным з самых распаўсюджаных сродкаў выразнасці ў прыказках і прымаўках Жыткавіцкага раёна з’яўляюцца параўнанні: “Родная зямелька, як зморанаму пасцелька”(г. Тураў), “Чалавек без працы, што птушка без крылаў” (в. Відошын), “Хлопцы растуць, як грыбы, а дзеўкі, як бабкі” (в. Хільчыцы), “Які пень, такі і клін, які бацька, такі і сын”(в. Вароніна), “Сено, ек цело, трэба прыбраці” (в. Хільчыцы), “Чоловек без жонкі, ек без шапкі” (в. Хільчыцы) і інш.

Сустракаецца ў парэміях таксама гіпербала – перабольшванне памераў, моцы, значнасці апісваемага: “Смелыя і разумныя два вякі жывуць” (г. Тураў), “Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне”(в. Відошын), “На Пакрову з’еў карову, на Пятра з’еў вала”(в. Запясочча), “Як памрэ багатыр, то зойдзецца ўвесь мір, а як памрэ беднячок, то адзін поп і дзячок” (в. Хільчыцы), “Вурос до неба, да дурны, ек трэба” (в. Хільчыцы).

Для ўзмацнення эмацыянальнага ўражання ў некаторых выразах назіраецца таўталогія – паўтарэнне адных і тых жа ці аднакаранёвых слоў: “Ад добрага кораня – добры і адростак” (г. Тураў), “Аднаго бацькі і адной маткі няроўныя бываюць дзіцяткі” (г. Тураў), “Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць” (г. Тураў), “З кута ў кут – і вечар тут” (г. Тураў), “Багаты багацей – не чалавек, а сто чарцей” (г. Тураў), “У будны дзень згуляць грэх, а ў святы дзень зрабіць не грэх” (г. Тураў), “У добрага трактарыста любы трактар добры” (в. Відошын), “Малыя дзеці – малы клопат, бальшыя дзеці – бальшы клопат” (в. Відошын), “Ек красоту дзелілі, то я спала, а ек сталі шчасце дзеліць, то я ўстала” (в. Вароніна), “Еслі хочаш жыць у шчасці, надо красці, красці, красці” (в. Пухавічы), “Берэжоного бог берэжэ” (в. Хільчыцы), “Свой своека бачыць здалека” (в. Хільчыцы). Варта адзначыць, што такія паўторы надзвычай узмацняюць сэнсавую завершанасць думкі парэмій.

Даволі часта ў парэміях Жыткавіцкага раёна сустракаюцца ўласныя імёны ў значэнні агульных назоўнікаў, часцей за ўсё іх ужыванне звязана са стварэннем рыфмы ці алітэрацыі: “У няздалай Дар’і заўсёды авар’і”(в. Відошын), “Няма майго Даніла, то і вуліца не міла” (в. Запясочча), “Ніхто не такоў, як Іванко Петакоў” (в. Запясочча) і інш.

Як бачым, прыказкі і прымаўкі – гэта цудоўны па сваёй вобразнасці, дакладнасці думкі і выразнасці сродкаў элемент фальклору. Менавіта дзякуючы вобразнасці, рытмічнай арганізацыі ў сукупнасці з пераносным сэнсам, яны валодаюць здольнасцю да мнагазначнага ўжывання па прынцыпе аналогіі. Акрамя таго, усе элементы парэмій падпарадкаваны галоўнай мэце – дакладна, сцісла і яскрава раскрыць думку, дасягнуўшы яе канцэнтрацыі.

Літаратура
1. Кабашнікаў, К.П. Малыя жанры беларускага фальклору ў славянскім кантэксце/ Нац. акадэм. навук Беларусі. Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы / К.П. Кабашнікаў.–Мн.: Бел. навука, 1998.–218 с.
2. Лепешаў, І.Я. Сітуацыйныя і кантэкстуальныя прыказкі // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы, № 1 (30), 2005.–С. 171–177.

## Прыказкі і прымаўкі

Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.
Без роднай мамачкі заклююць галачкі.
Няма такіх крамачак, дзе б прадавалі мамачак.
Ад добрага кораня – добры і адростак.
Ані лыжкі, ані міскі, а павесіў тры калыскі.
Аднаго бацькі і адной маткі няроўныя бываюць дзіцяткі.
Адно дзіця роджана, а другое суджана. Апошняе дзіцятка – памятка.
Той перамагае, хто ў бядзе са сваёй зямелькі не ўцякае.
Адзін працуе цэлы дзень, другі глядзіць, дзе лепшы цень.
Хто высока нос задзірае, той на лбе гуз набівае.
Беражы зярнятка – пабагацее і твая хатка.
Хлеб ад зямлі, а моц ад хлеба.
Пад ляжачы камень вада не цячэ.
Кошка мышцы не таварыш.
Калі хочаш хлеба мець, то трэба зямельку глядзець.
Дзе сасна не стаіць, а ўсё свайму бору шуміць.
Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не тухнуць.
Не той багаты, хто мае, а той, хто дае.
Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць.
Пусты колас высока стаіць.
Дзе стары бурчыць, малады памаўчыць.
З кута ў кут – і вечар тут.
Сама каля печы, а язык за парогам.
Анёлам ляцеў, чортам сеў.
Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш.
Давалі – з кішэні не вымалі.
Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе.
Госць, не дзьміся, еш, што ў місе.
Хто жыве без запасу, той згіне без часу.
Навука не мучыць, а жыць вучыць.
Дзе радзіўся, там і прыгадзіўся.
Родная зямелька, як змаранаму пасцелька.
Балбатнёю рук не заменіш.
Чужая старонка без ветру сушыць.
Смелыя і разумныя два вякі жывуць.

Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
Набытая мазалямі капейка перацягне лёгкі рубель.
Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
Тады слова серабро, калі справа золата.
У прыказцы – праўда светлая.
Як зварыш, так і з’ясі.
Чалавек галодны ні на што не годны.
Хто горбам, а хто горлам.
Адна бяда не ходзіць, другую за сабою водзіць.
Багаты багацей – не чалавек, а сто чарцей.
Добра багатаму красці, бо ёсць да чаго прыкласці.
За тым і божа, хто пераможа.
Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і суседа прадаваў.
Дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць.
У будны дзень згуляць грэх, а ў святы дзень зрабіць не грэх.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць.
Чужыня – не родная матка, хлеба не дасць.
Гуртам і ў бядзе лягчэй.
Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве – і ў полі не гаснуць.
Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне.
Адным пальцам вузла не завяжаш.
Чалавек без працы, што птушка без крылаў.
Пільнуй гаспадаркі, будуць у гаршку скваркі.
Паміраць збірайся, а жыта сей.
У добрага трактарыста любы трактар добры.
За двума зайцамі пагонішся, ніводнага не зловіш.
Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж.
У няздалай Дар’і заўсёды авар’і.
Малыя дзеці – малы клопат, бальшыя дзеці – бальшы клопат.
Якая матка, такое і дзіцятка.
Бацькоў слухаць – гора не знаць.
Без навукі і лапця не спляцеш.
Чужым розумам не пражывеш.
У вочы – саколю, а за вочы – соллю.

***Запісана ў в. Відошын***
***ад Аліферовіч Аляксандры Піліпаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

На Пакрову з’еў карову, на Пятра з’еў вала.
Без пары – нема травы.
Як будзе Міхайло, у адрыну карову запіхайло.

На святы Андрей коноплі сей (і кідаюць каноплі ў акно).
Няма майго Даніла, то і вуліца не міла.
Ужо на Міколу падавай, дый вілы пахавай.
Ніхто не такоў, як Іванко Петакоў.
Сеў на каня і падаўся да агня.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

Ціхая вада берагі мые.
Добрага вала не выпусцяць з села.
Сорам не воран, вачэй не выдзерэ.
Ні смерць, ні радзіны не глядзяць ліхое гадзіны.
Як свае галавы не маеш, дык чужая не дапаможа.
Грэх у мех – гэта ж больш не грэх.
Бліжэй да сябе кашуля, чым набат.
Хлопцы растуць, як грыбы, а дзеўкі, як бабкі.
Як памрэ багатыр, то зойдзецца ўвесь мір, а як памрэ беднячок, то адзін поп і дзячок.
У рыбака голы бака, а абед панскі.
Смачны боршчык, да малы горшчык.
Хто арэ, а хто баранue – усіх Бог параўнуе.
Горка гарэлка, ды ўсе п'юць, нядобра замужам, да ўсе ідуць.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Белка Кацярыны Пятроўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман Т.***

Які пень, такі і клін, які бацька, такі і сын.
Дзявочая слава як ночку гуляла.
Па кодлу куры губатыя.
Не май сто рублей, а май сто друзей.
Не по коту хвост, не по ямцы лучына, не по казаку дзеўчына.
Не плаціць багаты, а вінаваты.
Не радзіса красным, а радзіса шчасным.
Колькі веровочку не ві, то канец будзе.
Ек красоту дзелілі, то я спала, а ек сталі шчасце дзеліць, то я ўстала.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны,***
***студэнткай Пенчык Л.***

На Калядкі дзеўкі рады, хлопцы семак прынясуць.
Калядкі – добрыя святкі: наеўся, напіўся дый на палаткі.
Надышлі Калядкі, бліны ды аладкі.
Калі Калядкі, рабі і сам парадкі.
Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі.

Як тыдзень да Каляд, пан чэлядзі не рад.

Каляды – хрысціянскія рады.

Хто перад Калядамі жывёлу добра даглядае, той перад вялікаднём за хвост не падымае.

На Каляды ўночы трашчыць, а ўдзень плюшчыць.

Прыйшлі святкі – апалі лісты.

Святое Ражаство радасць прынясло.

Святое Ражаство – людзям прыгажство.

Раждзественскі мароз добра ўшчыпле за нос.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Купрыян Еўдакіі Валер'еўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Зялёнай В.***

За перэбірачку Бог дае балячку.

Гарбатага магіла іспpавіць.

Нейдзе воўк у лесі здох.

Сем пятніц на недзелю.

Не дома, не замужам.

Хто каго любіць, той таго чубіць.

Яблыко от яблыні далеко не падае.

Уступіў у след.

Сколькі воўка не кармі, а ўсё раўно ў лес позірае.

Не ўсё золото, што свеціцца.

Смеецца той, хто смеецца последнім.

Не гавары "гоп", покуль не перапрыгнеш.

После боя рукамі не машуць.

Кажда жаба свае балото хваліць.

І сам не гам, і другому не дам.

Не з'ем, дак надкусаю.

Еслі хочаш жыць у шчасці, надо красці, красці, красці.

Ленцяй за дзело – мазоль за цело.

Екі шоў, такого стрэў.

Чорт чорта найдзе.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Лідзіі Іванаўны, 1955 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Волос доўгі, вум короткі.

На просці боляць косці.

Ек не знаеш броду, не лезь у воду.

Берэжоного бог берэжэ.

На чужы коровай рот не открывай.

З ціха больш ліха.

Ціха вода берэгі муе.

У ціхом болоці і чэрці водзяцца.

Чужымі рукамі добрэ только жар загрэбаць.
Там добрэ, дзе нас нема.
Праўда ў вочы коле.
Вочы бояцца, а рукі робяць.
Сыты по голодному не спогодае.
Сено, ек цело, трэба прыбраці.
Робота – не воўк, у лес не ўцечэ.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Меляшчэні Ксеніі Трафімаўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Кацэвіч І.***

На светого Духа не скідай кожуха.
Вербіць – кажуха турбіць.
От тобе, бабко, Юр'еў дзень.
Меньш говоры, а больш робі.
Чоловек без жонкі, ек без шапкі.
Сухая ложка рот дзерэ.
У kроўца нема остатка, а ў попа здачы.
Відно пана по халявам.
Не ўсегды, ек на Дзеды.
Коб не клін да не мох, то плотнік бы здох.
Свой своека бачыць здалека.
Дзе гультай ходзіць, там земля не родзіць.
Кончыў дзело – гуляй смело.
Старого вераб'я на мекіні не проведзеш.
Вурос до неба, да дурны, ек трэба.
Без труда не вуймеш і рыбу з пруда.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Журко Тацяны Міканораўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Кацэвіч І.***

Яблуко от яблуні далёко не падае.
Ек умрэ богаты, то ўсе село ідзе за ім, а ек беднячок, то поп і дзячок.
До Юр'я сено трэба, шоб було і ў дурня.
На Юр'я коровам подавай і вілы хавай.
Весновы дзень год корміць.
Весною ведро воды – ложка гразі, восенню ложка воды – цэбер гразі.
Ой, церэз гэтые басне, не будзе хлеба по весне.
Коб умеў танчыць, а горэ робіць наўчыць.
От роботы волы дохнуць.
Ека не мужычана, то дрова і лучына.
Екі ні Панцелей, то ў посцелі веселей.
Ноелас корова, ек бочка.
Вот вымя, як цэбер.
Ну й молока дое, ек труба.
Дождж, град, камень з неба, а пастуху пасці трэба.

Як напасеш, так і надоіш.
У корову молоко на езыку.

***Запісы прадстаўлены дырэктарам***
***СДК в. Буразь Дарошка Ганнай Іванаўнай***

**Загадкі**

У белым сарафане,
Пад хусткай зялёнай
Сумуе на паляне
Танклявая Алёнка (бяроза).

Цераз палі, цераз лугі
Спусціліся канцы дугі (вясёлка).

Броўкі беленькія,
А вочкі жоўценькія (рамонкі).

З белай зрабілася бураю,
У печ без скуры пайшла,
А выйшла – са скураю (булка хлеба).

Упоперак рэчкі шчупак нырае,
За ім умомант рака замірае (тканне).

Сам худ, а галава з пуд (бязмен).

Ляжыць грушка ў чырвоным кажушку.
Хто яе ўкусіць, той плакаць змусіць (цыбуля).

Што любіш, таго не купіш,
Чаго не любіш – не прадасі (маладосць і старасць).

Зверху гола, знізу лахмата, цяплом багата (кажух).

Яно без рук, яно без ног, не відна яго і не чутна яго.
А ляціць шпарка яно, не дагоніш яго (час).

У адным доме – сотні жыхароў, а сям’я адна (вулей).

Пасярод двара стаіць гара: спераду – вілы, ззаду – мятла (карова).

Не прадзе, не тчэ, а людзей апранае (авечка).

Аўсом не кормяць,
Пугай не гоняць,

А як араць пачне –
Сем плугоў вязе (трактар).

Ходзіць пад нагамі
Дагары нагамі (муха).

Чырвонае цельца,
Віннае на смак,
Каменнае сэрца,
А завецца як? (вішня)

Набраўшы ўсяго ў запазухі, аж ледзь не пухне –
Вурчыць зіма на кухне (халадзільнік).

Ці бачыў такое суседзе?
Пад дажджом на парашуце пагода едзе (парасон).

Зімою хаваюся,
увесну з'яўляюся,
летам весялюся,
увосень спаць кладуся (рака).

На градзе доўгі, зялёны, а ў бочцы – жоўты, салёны (гурок).

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Не жывое, а дыша (квашня, цеста).

Нагою тупну, жыватком прытупну, касмаціцца, лахмаціцца, голыша вопну (кросны, што холст у старыну рабілі).

Стаіць воўк над кучаю, заткнута ж(опа) анучаю (засланка ў печы).

Белае поле, чорнае семя, хто его сее, той разумнее (ліст і карандаш).

Стаіць поп на масту і крычыць: “Уцекайце, абасцу!” (самавар).

Тры братца пайшлі ў возера купацца, двое купаюцца, а трэці на берагу валяецца (карамысла і два вядра).

Гуд гудзе, свадзьба ідзе, возле дзірачкі васілёчкі, а ў дзірачке свадзьба ідзе (самапрадка).

Зверху чорна ў сярэдку красна, усажу нагу і пракрасна (галошы).

***Запісана ў в. Відошын***
***ад Аліферовіч Галіны Фролаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч М.***

А што гэта за пястунчык, што за кожны пачастунчык патрабуе пацалунчык? (шклянка з вадой)

У лесе расло, на полі пасло, дадому прыйшло, бабамі трасло? (сіта)

Радзіўся я ў цяні, не відзеў ні сонца, ні луны. Дабраліся да мяне людзі, прабілі наскрозь мне грудзі, жалезным абручом падпаясалі, і танчыць сталі. (жорнавы камень)

Прыйшоў Падабай: “Дзяўчына, дай!” Яна ногу падняла, рагоча, яшчэ хоча. (вочап і калодзеж)

***Запісана ў в. Сялко***
***ад Цуцалевіч Мікіты Максімавіча,***
***студэнткай Шырай Н.***

Сеюсь я, как сіта, но не парашок,
Запалзаю ў жыта, но не чэрвячок. (дождж)

***

Сатіць Варвара вышэ амбара, ні ест, ні п’ёт, смотріт у небасвод. (комін)

***

Ах, ты мілы мой Пракоша,
Как меня ты абажал:
То ў прысядку, то ў прыпрыжку,
Абдымал і цалавал. (банны венік)

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Уласавай Марыі Паўлаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Сухей стахей па маёй хаці скача (венік).

***

Хода ходзіць, віса вісіць, віса ўпала, хода з’ела (свінья і жолуд).

***

Сонца-калонца,
У сярэдзіне жывіца.
Хто не ўгадае,
Той не будзе жаніцца (сонашнік).

***

З лесам роўна, да ў лесу не відно (сэрца ў дрэві).

***

Поўная хата вараб’ёў,
Іх нельга адтуль выгнаць (сукі ў сценах).

***

Прыйшоў Мармота ды пытаецца ў Лепеты: “Ці дома Варкота?” (воўк, сабака, кот).

***

Бяжыць воўк, а за ім шэрхне (чаўнок і палатно).

***

Чорная курыца пад плотам клубіцца (гарбуза).

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Мароз Анастасіі Архіпаўны, 1910 г.н.,***
***студэнткай Кошман Т.***

Дуньса не дуньса,
А я на цебе злезу (падушка).

***

Чэраво к чэраву,
І шэрсць, і к шарсці,
І стыд прамо стаіць(пара коней запрэжаных, пасярэдзіне дышло (аглобля)).

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Панчэня Кацярына Аляксееўна, 1941 г.н.,***
***студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.***

Хода хадзіць,
Віса вісіць,
Віса ўпала,
Хода з'ела (кабан, жолуд).

***

Чэрэз морэ дорога,
Коло пупа трывога.
Под ногамі ярмолок (кросна).

***

Прышла мурмота
Под дзедовы ворота,
Путаецца лепеты
Ці поныра дома (воўк, свіння).

***

Чорнэ сукно лезе ў окно (ноч).

***

Накорміш – жыве, а напоіш – умрэ (огонь).

***

Шо сырэ не едзяць і варонэ выкідаюць (ліст лаўровы).

***

Лежыць колода посерэд болота: не гіне, не сохне (язык).

***

Скручаны, зверчаны по хаці скача (венік).

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Шруб Ніны Андрэеўны 1956 г.н.,***
***студэнткай Кацэвіч І.***

## Выслоўі

Любапытнай Варвары нос адарвалі.
Але ж і нарваўся, як немцы на засаду.
Каб табе язык апух, як ты брэшаш.
Дай гурка, яшчэ вып'ю твайго вінка.
Хіба торбачка з мяшэчкам жаніцца будуць.
Вушы развесіў ды і слухае.
Адзін такі маліўся, дык быў паваліўся.
Даў, як зайцу на закуску.
Дастанеш, як у казла малака.
Хварсісты, як певень вясною.
Усё адно, што гарохам аб сцену.
Любіць, як сабака палку.
Каб твае рукі і ногі выраслі на другім месцы.
Еж, пакуль жывеш, а як памрэш, то не ўпрэш.
Хоць гумно згарыць, але і мышэй то лясне.
Не баба, а салдат.
Прайшоў, як конь па градах.
Спіць, як сена прадаўшы.
Надуўся, як капшук.
Надзелася ні к сялу, ні к гораду.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

### *Гаўрыловіч У.М. Легенды і паданні роднай зямлі*

*Урывак з дакументальнай аповесці*
*“На зямлі дрыгавічоў”*

*Гэй, адвечныя курганы,*
*Сведкі прошласці глухой!*
*Кім вы тут панасыпаны?*
*Чыёй воляю-рукой*
*Вы раскіданы па полі,*
*Дзіўных спраў вартаўнікі?*
*Эх, не скажаце ніколі,*
*Што казалі вам вякі!*
*Якуб Колас “Сымон-музыка”*

Шмат цікавых, паэтычных паданняў і легендаў нарадзілася тут, у маляўнічым кутку нашай зямлі. Гэтыя своеасаблівыя помнікі даўніны хвалююць нас сваёй сувяззю з мінулым краю, вобразнасцю і непаўторнасцю. Прычым, як чытач упэўніўся, прачытаўшы папярэднія раздзелы, якраз яны часам і тлумачаць нам некаторыя падзеі, дакументальныя сведчанні пра якія, на жаль, беззваротна згубіліся ў часе. Напомнім жа яшчэ некаторыя.

Са старажытнай Замкавай гарой і замчышчам звязана шмат цікавых паданняў, якія, без сумневу, дастойны пяра гісторыка-раманіста. Адно з паданняў, напрыклад, распавядае, нібыта гару насыпаў сам паўлегендарны вараг Тур – заснавальнік горада. Таму і дагэтуль месцічы завуць яе яшчэ Туравай… Яшчэ пяць стагоддзяў таму тут знаходзіўся ўмацаваны княжаскі замак і чатыры царквы, сярод якіх каменная Свята-Троіцкая. А яшчэ старажылы сведчаць, што тут некалі быў стары падземны ход, які вёў у сад вёскі Буразь (“буйна разіў” на тым месцы князь Тур звяроў), ва ўрочышча Казаргаць (былы старшыня пассавета Арцюшка М.М. быў перакананы, што назвай Казаргаць тураўскія жыхары занатавалі памяць аб перамозе над хазарамі, на градзе (гаці, грэблі) пасярод або цераз балота магла адбыцца пераможная для тураўлян бітва), што ў некалькіх кіламетрах ад гарадка. Баяры, а пазней і панства, кажуць, выкарыстоўвалі гэты падземны ход, каб таемна ад жонак прабірацца ў сад для ўцех з прасталюдзінкамі.

А магчыма і не легенда гэта? Вось што пісала газета “Минская старина” ў 1911 годзе: “Старейший обыватель Турова рассказывал, что в детстве, гуляя на горе, заметил (аршинах в 6 от угла большого барака) в овраге на склоне большого холма длинное и узкое окно в каменной стене, которая в то время была обнаружена. Он пробовал исследовать помещение, освещенное этим окном, при помощи шеста аршин в 6 длиной, но пола не нащупал. Несколько ближе к Струмени один еврей на склоне к оврагу

заметил в почве среди мусора отверстие, и брошенный им камень в эту расщелину упал где-то глубоко в воду”.

Мясцовыя паданні гавораць і аб тым, што Замкавую гару насыпалі шапкамі татары.

Зараз на Замкавай гары нічога няма. Многа таямніц утрымлівае гарадзішча да гэтага часу, а колькі іх навек пахавана ў глыбіні стагоддзяў! Відаць, тут яшчэ адзначым, што першыя раскопкі на тэрыторыі замчышча праводзіліся ў 1827 годзе, разведвальныя шурфы на глыбіню да трох метраў далі шмат знаходак гарадскога абыходжання раннефеадальнага перыяду. Вядомы ў XIX стагоддзі падарожнік-беларус П.Шпілеўскі ў 1859 годзе пісаў, што ў Тураве захаваліся рэшткі сямівежавага замка, абведзенага рвамі і валамі, а гара вышынёй каля 9 метраў (цяпер яна 3 метры), і высыпана яна ўручную. Гэта пацвердзілі далейшыя даследаванні. У 1889 годзе вучоныя ўпершыню сур’ёзна заняліся даследаваннем Замкавай гары, але раскопкі не вяліся. З 1960 года шмат раскопак праводзілася ў Тураве, былі ўскрыты цэлыя плошчы памерам да 300 квадратных метраў. Знойдзена шмат цікавых знаходак. Даследавалася толькі замчышча. Былі ўскрыты рэшткі цагляных сцен, падмуркі і пілястры будынкаў. Да XII стагоддзя адносіцца пабудова, рэшткі якой раскапаны ў 1962 годзе. Тут бачны падмуркі шасціслупнага трохапсіднага храма. Гэта дало падставу адраджэнскім прапановам у канцы XX стагоддзя над падмуркам старажытнага храма пабудаваць новы праваслаўны сабор, устанавіць помнік Кірыле Тураўскаму, узнавіць абарончыя вежы і ўчастак сцяны, каб людзі ведалі, дзе першапачатковыя крыніцы Беларускай праваслаўнай царквы і нашай духоўнасці. Пакуль узведзены толькі помнік Святому Кірыле, магчыма, калі мы духоўна і фінансава пабагацеем, “камяні веры” пакажуць нам правільны шлях. Не пакідаюць надзеі тураўляне на гэта і цяпер.

А яшчэ ў Тураве кажуць і такое…

Стаяла некалі на Замкавай гары Круглая вежа. Высокая і прыгожая. І загадкавая. У чым жа яе загадкавасць? Кажуць людзі, што нібыта пад ёй пачынаўся яшчэ адзін падземны ход, які ў адным напрамку звязваў Тураў з Кіевам, а другі вёў да манастыра, што некалі стаяў побач з Барысаглебскімі могілкамі. Канешне, па-рознаму можна ставіцца да гэтых паданняў, што захавала людская памяць. Магчыма, і на самай справе існавалі некалі падземныя хады. Мне ж у гэтых паданнях бачыцца пэўны сімвал значнасці і велічы Турава, яго сувязі з Кіевам. Нагадаем: калі на кіеўскім прастоле садзіўся бацька, то ў Тураве – абавязкова яго сын… Што ж – і паверыць цяжка, і не даць веры – нельга…

У сярэдзіне XIX стагоддзя тое было. Побач з Замкавай гарой мужыкі аралі зямлю. Раптам адзін селянін вывернуў сахой цагліну. Дзіва якое: цагліна як новая! Паклікаў мужчын, і пачалі яны раскопваць тое месца ўглыб. Нечакана ім адкрылася цагляная сцяна. Го, трэба ж ведаць тураўскага селяніна – у гаспадарцы ўсё спадобіцца! І пачалі сяляне паціху разбіраць на свае патрэбы тую сцяну. Разабралі дагэтуль, пакуль не адкрыўся ім уваход у гару. Трое смельчакоў наважыліся разведаць, куды ж вядзе той ход. Праз

нейкі час яны вярнуліся і прынеслі з сабой невялікі каваны куфэрак. Адчыніць аднак яго не адважыліся, аднеслі мясцоваму святару і сталі на царкоўнай сядзібе чакаць яго слова.

Бацюшка, аднак, доўга не выходзіў з царквы. А калі вярнуўся, быў вельмі ўстрывожаны, чарней ночы, нічога ім не паведаміў пра начынне куфэрка. Але загадаў усім вярнуць забраныя цагліны, залажыць назад ход, і пад пагрозай боскай кары забыцца аб яго існаванні. Сяляне былі набожнымі, паслухаліся свайго бацюшку. Зямлю тую, побач з замчышчам, забралі ў валоданне царквы, а селяніну, які першым знайшоў цагліну, далі надзел зямлі царкоўнай у іншым месцы, ды ў два разы большы, чым ён меў. Да гэтага часу так ніхто і не ведае, што было ў тым куфэрку і чаму быў гэтак устрывожаны іх бацюшка? Ці не было ў тым куфэрку прадвесця нейкага, папярэджання якога, паслання з мінулых вякоў? Хто ведае…

А яшчэ кажуць людзі, што на Замкавай гары праз нейкі час па вясне знайшлі жанчыны жалезныя вароты. Калі адчынілі іх, за імі былі яшчэ адны – драўляныя, аздобленыя прыгожай разьбой. На дзвярах вісеў пудовы замок. Праз шчыліну людзі пабачылі, што за імі стаіць скульптура воіна. Пайшлі жанчыны да святара ў Ільінінскую царкву: што рабіць? Аднак бацюшка забараніў чапаць той замок: адкрыем яго, пачнецца мор, горад памрэ. І ён загадаў зачыніць жалезныя вароты, засыпаць зямлёю і назаўсёды забыцца аб гэтым месцы і аб тым, што бачылі… Аднак – людзі не забыліся, захавалі ў сваёй памяці той выпадак. І цяпер расказваюць сваім дзецям і ўнукам. Ці толькі ўсё ад фантазіі тут?

Загадкавасць і бытаванне легендаў “падпітвае” і тое, што ніхто і ніколі не чапаў другой часткі Замкавай гары. І ніхто не ведае, што яна хавае ў сабе. Толькі людзі з пакалення ў пакаленне перадаюць нібыта там пахавана чараўніца-княгіня, што выратавала горад ад памору. Ёй прыпісваюць такія словы: “Паміраю, але калі спатрэблюся людзям, горад свой я выратую.” Яшчэ кажуць, нібыта тут былі пахаваны памершыя ад чумы, і іх пакой, каб не было якой пошасці, нельга парушыць… Ёсць і такое меркаванне, што там вечным сном спяць тураўскія князі. Дзе тут праўда, а дзе выдумка – цяжка сказаць…

Не пералічыць усіх паданняў, якія нарадзіла старажытная зямля дрыгавічоў пра ўзгаданыя вышэй Барысаглебскія могілкі, што ў полі зроку, за паўкіламетра, ад старажытнага замчышча. Цікавае, напрыклад, паданне пра тое, што некалі на могілках стаяла царква ды … у зямлю зышла. Сённяшнія жыхары Турава пераканаюць любога ў тым, што на гэтым месцы, асабліва ў перадсвяточныя праваслаўныя святы можна пабачыць слуп святла ў форме крыжа, які нібыта выходзіць з зямлі. Тураўляне кажуць, што некалі расступіцца зямля і падымецца на паверхню колішняя царква. Вернецца царква – прыйдзе ў людскія душы свята, а ў дамы – дастатак. І зажывуць усе яны шчасліва і заможна.

Бытуе дагэтуль легенда, што на гэтых могілках супакой знайшлі святыя Барыс і Глеб (хаця ж дакладна вядома, што яны пахаваны ў Кіеве). З невялікім узвышэннем, на якім размяшчаюцца Барысаглебскія могілкі (а яно

акружана балоцістай мясцовасцю), звязаны гістарычныя аповеды аб старажытным манастыры, дзе, мабыць, і быў стоўп Кірылы Тураўскага.

А гэтыя падзеі былі дакладна. У 1909 годзе ў Тураве на Барысаглебскіх могілках адбывалася чарговае пахаванне. Калі капалі яму, на глыбіні 1,4 метра выпадкова заўважылі каменны саркафаг. Так і не ўдалося напэўна высветліць, хто быў у ім. Называліся версіі, што ў саркафагу знаходзіліся астанкі малалетніх князёў Барыса і Глеба, а таксама што ў каменным склепе быў пахаваны тураўскі князь альбо епіскап. Саркафаг быў дастаўлены ў Мінск, але ў 1927 годзе ён самым неверагодным чынам быў знойдзены зноў у Тураве – нібыта вярнуўся… Ён зноў быў завезены ў Мінск, і ў час гітлераўскай акупацыі бясследна знік. Што за гэтай таямнічасцю хаваецца? Толькі час, відаць, здолее адказаць на ўсе пытанні. Пасля, напрыканцы XX стагоддзя, беларускія археолагі адкапалі яшчэ некалькі саркафагаў...

Да сённяшняга дня дакладна невядома, дзе знайшоў свой спачын Кірыла Тураўскі. Тураўляне перакананы: толькі на гэтых жа могілках. На карысць гэтага сведчыць і выпадак, які адбыўся ў 1818 годзе. Пра яго ўзгадваецца ў зборніку “Успаміны аб старажытным праваславіі на Заходняй Русі”(Масква, Сінадальная друкарня, 1867 г.). Пры Петрапаўлаўскай царкве ў Тураве “въ колокольнъ” жыў благачынны пратаіерэй Грыгорый Л. (у публікацыі поўнасцю прозвішча не ўказваецца). “Однажды старецъ, отслужив утреню, вошелъ въ ризницу, чтобы отдохнуть, и усьевшись вздремнулъ. Въ сонном видьніи явился ему св. Кириллъ и запретил хоронить умершую женщину въ той могиль, которую вырыли случайно возле гроба святителя: “Ей не подобаетъ лежать возль меня…”

Выканаў протаіерэй просьбу святога Кірылы, пахавалі жанчыну ў другім месцы. Так свяціцель паказаў месца свайго захавання. Многія ж, калі пра ўсё даведаліся, пачалі пагаворваць, каб адкапаць мошчы Кірылы Тураўскага, каб знайсці ім больш дастойнае месца, а некаторыя пачалі капаць магілы наўзгад, каб адкрыць мошчы святога. І тады “св. Кирилл вторично явился отцу Григорію и запретилъ это дьлать. Разведки прекратились; но народъ съ полною вьерою ждетъ открытія мощей св. Кирилла”.

Пра месца пахавання Кірылы Тураўскага ведалі тураўляне яшчэ на працягу многіх гадоў, а пасля забыліся. Цяпер, побач з мяркуемай магілай святога Кірылы Тураўскага стаіць чатырохметровы драўляны крыж. Як сцвярджаюць месцічы, якраз на тым месцы быў іканастас Барысаглебскай царквы. Побач з крыжам, без пэўных знакаў, бугарок магілы святара. Напярэдадні праваслаўных святаў, звычайна перад вялікаднем, магілка паднаўляецца, вернікі высыпаюць на ёй крыж з пяску, кладуць побач ручнік ці іншы матэрыял, каб можна было апусціцца на калені і памаліцца, а таксама ставяць скарбніцу. Нікому больш у сне ён не прыходзіў, нібы сцвердзіў, што яму ў гэтым месцы ляжаць добра…

Народнае паданне таксама расказвае яшчэ пра аднаго святога, які тут пахаваны. Яго звалі Марцін. Гэта быў стары кухар тураўскіх епіскапаў. Ён цяжка захварэў, і боль быў невыносны. Марцін ляжаў у сваёй келлі і “сльзно молился”, просячы ў Бога смерці. І ў гэты момант да яго з’явіліся святыя

Барыс і Глеб, якія накармілі яго хлебам і напаілі вадою, якую зачарпнулі з калодзежа, які раней быў выкапаны Марцінам на ўскрайку могілак. Пасля чаго здарыўся цуд—хвароба яго пакінула. А вада ў калодзежы тым, раней нясмачная і жоўтая, бо побач было балотца, стала чыстай, крынічнай. І калі яе хвораму падаваў сам Марцін – той адчуваў палёгку і здаравеў. У 2003 годзе на Барысаглебскіх могілках знойдзены Марцінаў калодзеж, у гэтыя дні ён, дзякуючы старанням вернікаў, набывае другое жыццё…

Трэцім святым Тураўскай зямлі стаў свяціцель Лаўрэнцій, пустэльнік Пячэрскі, які прыняў епіскапскую кафедру пасля Кірылы Тураўскага. Святы Лаўрэнцій быў вядомы дарам пазбаўлення ад хвароб. Ён быў дастойным прадаўжальнікам свайго папярэдніка. Пасля смерці цела яго было перанесена ў Кіева-Пячэрскі манастыр и "с честию положено в пещерах, в которых и доселе его чудотворныя мощи пребывают нетленными…"

Тураўскае духавенства і тураўляне ў час сумна вядомай уніі не далі веры каталікам, сказалі іх пасланнікам, што мошчы святых Кірыла і Марціна перанесены ў Кіеў. Аднак на самай справе, відавочна, ніхто іх не пераносіў. Проста людзі баяліся, што лёс захаванняў праваслаўных заступнікаў будзе не лепшым, чым вопыт з мошчамі прападобнага Андрэя прасвітэра Пінскага – пабрыўшы бараду, мошчы Андрэя іезуіты выдавалі за мошчы іезуіта Андрэя Баболіна, забітага казакамі ў мястэчку Янава каля Пінска. Па распараджэнню ўрада, у царстваванне Мікалая І-га, мошчы перанесены ў Полацк, а пасля захаваны па праваслаўнаму абраду. Такім чынам, тураўляне не далі зняславіць астанкі паважаных сваіх святароў.

У Тураве расказваюць і такое. У 30-я гады з цэркваў зрывалі крыжы і знішчалі хрысціянскія святыні. Такі лёс чакаў і старую капліцу на Барысаглебскіх могілках, якую знішчылі ў 1937 годзе. З таго моманту на некаторых людзей нібыта праклятце налажылася… Адзін з тутэйшых мужыкоў Апанас палез на капліцу здымаць крыж, але ўпаў з даху і разбіўся. Праваслаўныя веруючыя перахрысціліся: "Бог пакараў, не трэба было гэта рабіць!" А пасля вайны, прыблізна каля 1947 года, сын таго ж Апанаса капаў на Барысаглебскіх могілках магілу, каб пахаваць сваяка. Раптам рыдлёўка зачапіла нешта цвёрдае—…века дамавіны. Аднак там жа не было ніякіх знакаў на захаванне! Чалавек быў не з палахлівых і адкрыў дамавіну. А там… ляжыць, нібы спіць, прыгожая дзяўчына з доўгімі светлымі валасамі і… зусім голая. І як толькі дзённае святло "дакранулася" сваім позіркам да прыгажуні – цела на вачах рассыпалася... Дзесяткі год тураўляне гадаюць ды да ладу не прыйшлі – нават старажылы не маглі ўспомніць, каб на гэтым месцы некага хавалі. Але ж нехта дадумаўся і да такога: магчыма, гэта адна з тураўскіх князёўнаў, якія загінулі ў дрыгве на Купалле. Вядома і другое: нядоўга пажыў сын Апанаса, які адчыніў дамавіну тую – людзі сказалі, што не даравала князёўна, бо парушыў яе вечны сон…

Чытач небезпадстаўна можа заўважыць: так, легенды – гэта добра. Але ж – гэта толькі легенды. Напісаць і прыдумаць можна шмат чаго. Можа, і так. Думаў гэтак і я. Толькі вось якая асаблівасць: калі ў нейкіх мясцовасцях легенды знікаюць, то тут яны – жывыя. А гэта шмат пра што гаворыць! І гэта

прымушае мяне думаць, што такія падзеі тут былі і напраўду. Ды, як іначай будзеш думаць, калі...

Некалі яшчэ святы Марцін Тураўскі перад смерцю сказаў: “І магілу маю згубіце, але я праз вякі пакажу вам, дзе ляжу і служыць буду…” І раптам, напрыканцы XX стагоддзя, на Барысаглебскіх могілках пачаў “расці” крыж. Ён паступова выходзіць з зямлі і – дзіва!–-вылучае ўнутранае цяпло. За некалькі гадоў ён “падрос” на 10 сантыметраў. Крыж працягвае выходзіць з зямлі. І адразу стаў месцам, да якога пайшлі паломнікі – людзі верaць у яго цудадзейную сілу і дапамогу ад хворасці….

Згодна ўспамінаў мясцовых жыхароў, крыж гэты быў знойдзены адным набожным чалавекам у Прыпяці і быў глыбока закапаны сярод магіл. Як мяркуюць спецыялісты, гэты каменны крыж XII стагоддзя падобны па форме на два вялікія каменныя крыжы, што захоўваюцца цяпер у тураўскай царкве Усіх Святых, якія, паводле другога падання, калі вялікі князь Уладзімір ахрысціў Русь, прыплылі па вадзе супраць плыні з Кіева ў Тураў. Такія ж крыжы ёсць ва Уздзвіжанскай царкве в. Пагост (мясцовы народ называе яго “чэсны” крыж; па розных версіях у час правядзення вялікіх тураўскіх ярмарак, тут “гасцілі” госці, а па другой – у час магутнага росквіту Турава сюды вывозілі памёрлых – вядомы археолаг Побаль знайшоў у гэтых мясцінах старажытныя ўпрыгожванні, якія, лічылася, патрэбны былі памёршым на тым свеце – ад таго і назва вёскі – Пагост). Дарэчы, крыжы на Тураўшчыне сталі “заяўляць” аб сабе часцей і часцей. Зусім нядаўна каменны крыж знойдзены пры рамонце падлогі і капліцы вёскі Сямурадцы (князі і воіны там некалі вайсковую раду трымалі), якая некалі была фарпостам старажытнага Турава з поўдня. Налічваецца на Тураўшчыне больш дзесяці каменных крыжоў, якія знаходзіліся ў Тураве і навакольных вёсках – Пагост, Верасніца, Перароў, Хлупін, Старажоўцы.

Але вернемся да растучага крыжа: тураўляне яго нечаканае з’яўленне цвёрда звязваюць з іменем Марціна, што ён выканаў сваё абяцанне… І такое ж з’яўленне Марцінава калодзежа...

А на Замкавай гары 11 мая 1993 года ўрачыста быў адкрыты і асвечаны помнік Кірыле Тураўскаму (скульптар М.М. Інькоў, архітэктар М. І. Лук’яновіч). “Вялікі Тураўлянін”, з цэглы і медзі, стаіць перад крыжом – дакладнай копіі захаваных ва Усясвяцкай царкве старажытных візантыйскіх сімвалаў – як і многа стагоддзяў назад нясе людзям святло хрысціянства – дабро, любоў і веру. Побач, як і тысячы гадоў назад, вольна нясе свае воды Прыпяць і ўзвышаецца над краем Замкавая гара. Шумяць на ёй дрэвы былога школьнага сада, унізе абапал дарогі – старыя вербы. Яшчэ ў 1937 годзе стаяла тут найпрыгажэйшая на Палессі драўляная царква ў імя святога Іллі-прарока, настаяцелем якой быў пратаіерэй Пётр Кароль. Трагічны лёс напаткаў свяшчэнніка: супрацоўнікі НКУС не далі завяршыць богаслужэнне, арыштавалі яго. Адмовіўшыся зняць свяшчэнніцкі крыж і перайсці на службу да ўладаў, ён быў расстраляны. На месцы ж Ільінскай царквы зараз знаходзіцца пляцоўка дзіцячага садка, прыкладнае месца алтара абазначана драўляным крыжам. Сюды таксама прыходзяць памаліцца вернікі. З другога

боку Замкавай гары стаяла і другая царква, таксама драўляная – Спаса-Праабражэнская, якая згарэла ад абстрэла з савецкага тарпеднага кацера. Калі быў пажар, многія тураўляне бачылі цудоўнае з'яўленне на небе залацістага зззяючага крыжа… Шанаваўся на вуліцы Калініна яшчэ ў даваенныя гады калодзеж, у якім, згодна з паданнем хрысціўся Тур. Цяпер толькі невялікае паглыбленне зямлі нагадвае аб ім. Можна і зараз пачуць аб тым, што Тур-калодзеж татары закідалі немаўлятамі-дзецьмі, пасля чаго нібыта ў ім на працягу сямі гадоў замест вады было жаночае малако…

Не без крыўды даводзіцца канстатаваць, што нават да гэтага часу ў гарадскім пасёлку ніводнай вуліцы не нададзена імя "…другога Златавуста, паче всех воссиявших нам на Руси". У гэтым, канешне, няма віны саміх тураўлян. Гэта сумны вынік панаваўшага ў краіне на працягу дзесяцігоддзяў ваяўнічага атэізму. Памылка мінулых дзесяцігоддзяў, думаецца, будзе хутка выпраўлена.

Рэшткі ж замка і крэпасці на Замкавай гары, якія былі абведзены рвамі і валамі, зніклі яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя. А мясцовыя жыхары вуліцу Калгасную і цяпер называюць Вал, а Лібкнехта – Роў.

Некалі быў у Тураве помнік цару Аляксандру II, але яго таксама напаткала бязрадаснае бяспамяцтва, як і шматлікія цэркаўкі і сінагогі – на пачатку мінулага стагоддзя палову тураўскага насельніцтва складалі яўрэі… Дарэчы, такі лёс напаткаў на пачатку 60-х гадоў і помнік Сталіну – яго ўтапілі у адну з цёмных начэй у Струмені. Ніхто не бачыў – хто і як…

## І Ясельдай рэчку завуць…

Прыгожая легенда пра ўзнікненне рэчкі Ясельды дагэтуль бытуе на Тураўшчыне. Даўным-даўно тое было. Хлебная, рыбная і пчольная, багатая на пушніну была тады зямля, на якой правіў князь Святаполк (*узгадаем: Святаполк – тураўскі князь, які таксама займаў Наўгародскі і вялікакняжаскі прастол у Кіеве, жыў у канцы XI—пачатку XII стагоддзяў*). Аднойчы князь са сваімі ратнікамі быў на паляванні, якое было дужа ўдалым. Але паляўнічых застала ноч, і князь загадаў паставіць свой шацёр на беразе невядомай яму рэчкі. Сярэдначы князь прачнуўся ад дзівосных спеваў, выйшаў з шатра і пабачыў, што недалёка гараць зыркія кастрышчы, хлопцы і дзяўчаты водзяць купальскі карагод. Святаполка нібы нейкая сіла пацягнула да гульбішча – не маладзён, але душу маладую меў князь, і пабачыў там дзеўчыну сінявокую, прыгажосці якой век не бачыў. А звалі прыгажуню Ясяй, ад роду семнаццаці год. Сп'яніла, зачаравала красуня Святаполка, што да ранку, забыўшыся на жонку і род, забавіўся з ёй, ды так і не змог яе пакінуць. Забраў Святаполк сваю Ясечку ў Тураў, у замак свой, а жонку пакінуў і дзетак сваіх, на справы дзяржаўныя забыўся. Ды не драмалі баяры, ўзненавідзелі наложніцу, што жонку законную князеву замяніла. Дайшлі аднойчы да яе чуткі, што баяры звесці са свету хочуць яе каханка – забіць ці атруціць, а пасля і яе. І рашылася любага свайго ўратаваць, а сябе са свету звесці, бо не будзе ёй жыцця, як не стане Святаполка. Стала Яся

каханка прасіць на купальскую ноч завезці ў родную вёску, дзе каханне і шчасце яны ўпершыню пазналі. “Аддам табе каханне да донца”, – прасіла каханка Святаполка. “Добра, – згадзіўся князь. – Хоць дарога няблізкая, але паедзем, любая!..” І ў купальскую ночку вадзілі ля той жа рэчкі карагоды князь Святаполк і Яся і любіліся ў тым жа шатры, як упершыню.

Прачнуўся раннем Святаполк, але не знайшоў сваёй Ясечкі ў шатры, да глыбокай рэчкі вялі яе сляды па жоўтым пяску. Сівы стаў ад гора князь, стаяў і аплакваў сваю каханку. І часта цяпер князь прыязджаў на гэтае месца і клікаў, клікаў сваю Асечку. З тае пары, кажуць людзі, завуць тую рэчку Ясельдай і надта густыя і бялюткія ў летнія ночы там туманы, як валасы Святаполка…

## Тураўскія саркафагі

Гэтае паданне бытуе сярод тураўлян і сёння, пры жаданні, апрацаванае, яго можна знайсці ў розных выданнях. І распавядае пра той час, як адзін з тураўскіх князёў меў трох сыноў і пяцёра дачок. Падраслі сыны, князь вырашыў раздаць ім у спадчыну княства. Старэйшаму – Тураў з землямі, сярэдняму – Пінск, маладзейшаму – Дубравіцу. А што рабіць з дочкамі? Сватаюцца князі розныя: полацкі, менскі, чарнігаўскі, наваградскі, смаленскі, віленскі, магілёўскі...

Склікаў князь баярскую раду.

– За каго аддаваць дачок? – пытаецца. – Аддам дачок замуж– пасаг патрэбны з княства... Параднюся з аднымі князямі, а іншыя на нашыя землі будуць вока мець.

Моцна задумалася рада. Пасля вынесла прысуд: заставацца князёўнам у дзеўках, а каб вельмі не сумавалі, аддаць іх у манастыр.

Князёўны, нічога пра гэта не ведаючы, сваволілі пад наглядам служак у лесе. Старэйшай – Паланеі – было дваццаць гадоў. Маладзейшай – Луцэі – чатырнаццаць. Былі ўсе князёўны прыгожыя, чарнабровыя і стройныя. Дзівіліся людзі мясцовыя і прыезджыя на прыгажосць небывалую тураўскіх князёвен.

У гаі князёўны вянкі плялі, надзявалі адна адной ды ў люстэрка вады глядзеліся. Карагоды з дваровымі дзеўкамі вадзілі. Іх галасы разносілі далёка за раку гукі песень напеўных. Сюды ў гай прыйшоў князь з целаахоўнікамі і паведаміў князёўнам волю баярскай рады. Не пярэчачы, выслухалі яны прысуд і ціха ў нямым паклоне схіліліся. А як князь пайшоў, горка заплакалі, кідаючы вянкі ў Прыпяць.

Сціхлі гоман, песні і смех сясцёр. Шмат дзён яны плакалі і радзіліся, пасля вырашылі на Купалле шукаць папараць-кветку. На Купалле, калі ўсе паснулі і ля палаца засталася толькі варта з алебардамі, князёўны паціху пракраліся з палаца і пайшлі на бераг Прыпяці.

На чоўне пераплылі Прыпяць і ў балотны хмызняк падаліся. Чым далей ідуць, тым горш робіцца. Праводзяць іх у цемры вочы драпежнікаў, чуюцца стогны, галёканне. А як да багны падышлі, тут і зусім блага стала: з купін зрываюцца, у багну правальваюцца. Але ўпарта наперад ідуць. Зайшлі ў

такую глушэчу, дзе яшчэ не хадзіла нага чалавечая, дзе толькі совы крычаць, вадзяныя гады малако з балотных гарлачыкаў п'юць ды вадзянік барадой багну калыша. І тут самай малодшай з іх зрабілася страшна. Схапіла яна сясцёр за рукі, і тым зрабілася боязна.

Але ўбачылі яны наперадзе ззянне. Уздымалася яно над наваколлем. Тады наперад падаліся. Падышлі да кургана вялікага. А на кургане тым асілак з дружынай стаіць, святлом нязнаным свеціцца.

Дзівяцца князёўны. Воіны з кургана сышлі, князёвен акружылі, на курган запрашаюць. Падняліся на курган князёўны, а там баль вялікі—з залатых кубкаў мёд і брагу п'юць. Князёўнам кубкі паднеслі. Тыя выпілі, смаку мядовага не адчулі, але чым далей, тым п'янеюць больш. Пайшлі ў скокі з воінамі. Музыка грыміць, зброя бразгоча, крыкі на балоце чутны...

Доўга ці не тыя скокі цягнуліся, толькі неяк прайшоў хмель у Луцэі. Дзівіцца яна, што трымае воіна за рукі, адчувае сцюжу рукавіц яго жалезных, а вакол – з кургана бачыць – на ўсім балоце вочы звяроў блішчаць. Пазбіраліся яны да кургана, морды пазадзіралі – выюць. А далей за імі нехта ў багне рагоча...

Паглядзела Луцэя на сясцёр, а тыя сабе скачуць, толькі вочы пазаплюшчвалі.

Вырвалася Луцэя ад свайго кавалера, сясцёр за рукі хапае, па імёнах кліча. Сёстры апрытомнелі, да Луцэі збегліся, воіны ўжо князёвен не бачаць: загарэліся ў іх вочы, як у звяроў пад курганам, выхапілі яны мячы і біцца пачалі.

Збеглі князёўны ўніз з кургана, а на курган з усяго балота звяры рынуліся. Воіны іх мячамі сякуць. Звяры курган усыпалі і адзін аднаго разрываць пачалі. Такія тут крыкі і енк пайшлі, што ў князёвен валасы дыбам сталі. Кінуліся яны наўцёкі. Доўга праз балоты прабіраліся, у багне вязлі, адзенне аб хмызняк на шматкі раздзіралі, у рэчках балотных купаліся. Нарэшце выбіліся на палянку, на бераг возера.

На паляне той русалкі, за рукі ўзяўшыся, карагод водзяць. У святле месяца іх мокрыя целы блішчаць, з валасоў доўгіх кроплямі вада сцякае.

– Сёстры нашы прыйшлі! – закрычалі русалкі.

Да князёвен падбеглі, іх распранулі і ў карагодзе закружылі. Пасля ў возера пацягнулі. Скочылі князёўны ў возера, а вада сцюдзёная... Маўчаць князёўны, а русалкі рагочуць, пад ваду ныраць клічуць. Падплыў стары з барадой, мохам аброслай, пытаецца:

– Вы да нас жыць прыйшлі? Ці што шукаеце?

– Папараць-кветку шукаем, – кажуць князёўны.

– Дайце ім кветку, – адказаў вадзянік, зарагатаў і пад вадою знік.

Возера захвалявалася, князёвен і русалак хвалі на бераг выкінулі.

Зноў у карагодзе кружаць сёстры. Цяпер іх ад русалак не адрозніць.

Перанеслі русалкі князёвен цераз возера і па такім зыбуне павялі, што тыя нічога пад нагамі не чуюць.

Убачылі яны на балоце кветкі агністыя і давай іх ірваць. Сарвуць кветку, а з яе кораня масла нейкае чорнае цячэ. Засмуціліся русалкі, плачуць: "Нашу прыгажосць нішчыце!"

Цякуць слёзы ў русалак, зліваюцца ў струмень, і вось утварылася ўжо крынічка на балоце. Князёўны нічога не чуюць і не бачаць, толькі папараць-кветкі рвуць.

Праспяваў балотны певень: "Ку-ка-рэ-ку!" Зніклі русалкі, пабляклі кветкі ў руках сясцёр. Ужо не здаюцца яны самацветамі. Белым колерам квітнее звычайная папараць. Толькі на самым версе каменьчыкі блішчаць.

Агледзеліся князёўны: балота наўкол, непадалёк азёрца масла чорнага, крынічка цячэ, а самі яны голыя... Сцюдзёна зрабілася. Ступіла маладзейшая князёўна ў маслянае азерца ногі пагрэць і—чуе шэпт:

– Уцякай хутчэй!..

– Пабеглі, – кажа Луцэя.

Уцякаюць князёўны. Адшчыкнула каменьчык з кветкі сястра старэйшая—пацямнела адразу, хмары надышлі, бліснула маланка, пярун ударыў, лівень лінуў, і папаўзлі з балота гады шэрыя да князёвен.

Гарыць каменьчык. Бягуць сёстры...

Згубіла каменьчык Паланея – стала зусім цёмна, не відаць, куды бегчы.

Адшчыкваюць сёстры ад ветак каменьчыкі, сабе шлях асвятляюць. Паабрывалі і пагублялі ўсе каменьчыкі з папараць-кветак. Тут ім гады ногі абвілі: не могуць князёўны далей бегчы. Толькі Луцэя бяжыць. Пачуўшы крыкі сясцёр, спынілася і да іх вярнулася. А тых, скручаных па руках і нагах гадзюкамі, багна паглынае.

Доўга бегала вакол сясцёр Луцэя, плакала і галасіла, аж пакуль нейкі гад шэры з купіны ёй на грудзі не скочыў і кругом стана не абвіўся. Павалілася тады і Луцэя, скруцілі і яе гадзюкі балотныя...

Апоўдні спахапіліся ў княжацкім палацы. Сталі ўсюды князёвен шукаць і – не знайшлі... Толькі праз тыдзень удалы дружыннік Базыль, закаханы ў старэйшую князёўну, дабраўшыся ў глухамань балот, знайшоў у багне маладзейшую князёўну. Выцягнуць яе з багны не здолеў і вярнуўся ў палац да князя. Дружыннікі з князем вырвалі ў твані князёвен. Балотныя гадзюкі павыпівалі ў іх кроў. Целы князёвен у палац перанеслі.

Галосіць, млее княгіня... Засумаваў князь, зачыніўся ў пакоях, тры дні нікога да сябе не дапускаў. Пасля загадаў:

– Рабіць князёўнам каменныя дамавіны. У камені перадаць прыгажосць іх!..

Аднекуль, з Оўруча, здалёк, прывозілі прыгожы камень. Шэсць тыдняў рабілі майстры з каменю дамавіны. Князёўны, палітыя змяіным ядам, ляжалі ў палацы як жывыя.

Неўзабаве, калі каменныя дамавіны былі зроблены, князёвен пахавалі па хрысціянскім звычаі ў скляпенні пад храмам. Удалы Базыль, падгаварыўшы малойцаў, збег ад князя на Дняпро, дзе заснаваў казацкую вольніцу.

Хутка княгіня, а за ёй і князь памерлі. Сыны пачалі паміж сабой ваяваць за спадчыну. Княства аслабела і страціла былую славу...

## З зялёнымі вачыма і залатымі валасамі…

Даўно тое было. Жыла недзе каля Турава дзяўчына, з якой параўняцца ў прыгажосці ніхто не змог. Хараство ж і праўда было незвычайнае: вочы – зялёныя, косы – залатыя, як агонь.

Быў у дзяўчыны каханы, але не суджана было стаць ім жонкай і мужам. Бацькі знайшлі ёй жаніха багатага ды нялюбага. Не пажадала прыгажуня зміріцца з такім лёсам, у роспачы пайшла ў лес. Ды зайшла так далёка, што не здолела назад вярнуцца, знайшла там свой вечны спачын. Там жа, дзе краналіся яе валасы, выраслі ярка-жоўтыя кветкі азаліі пантыйскай. Дзіва беларускай прыроды, водар кветак падманлівы, а нектар атрутны. Яна быццам ахоўвае сябе ад чужога дотыку. Лясная прыгажуня, што адзінока расце ў Вятчынскім лясніцтве, узята пад ахову дзяржавы.

## Бяздоннае багацце

У Тураве жыў калісьці князь Яраслаў.

Быў ён багаты і мудры і людзей каля сябе збіраў усё разумных ды моцных.

Неяк князь з гасцямі паехаў на ўловы біць цяцераў і дзікіх вепраў. Многа было ўжо набіта ўсялякай дзічыны, але Яраслаў, якраз калі хацеў даць загад трубіць на збор, убачыў вялізнага старога тура і пагнаўся за ім. Некалькі гартоўных княжых стрэл упілося ўжо ў цела тура, але звер з падвоенай сілай уцякаў ад лаўца. Тады князь пачаў паганяць свайго каня, каб дагнаць тура.

Раптам тур спыніўся і павярнуўся ў бок князя. Конь з разгону наскочыў на тура і зваліўся, прабіты рагамі, прыціскаючы сабою седака. Яшчэ момант, і князь паплаціўся б жыццём. Але на гэтую хвіліну падаспеў загоншчык Ранцэвіч. Ён зняў з сябе світку і накінуў яе туру на вочы ды хутка нажом ударыў звера ў самае сэрца. Тур нежывы рынуў на зямлю. Князь выбавіўся з-пад каня і, дзякуючы загоншчыку, сказаў, каб той прыйшоў у абоз па ўзнагароду.

Калі загоншчык прыйшоў у княжны абоз, Яраслаў паставіў перад ім скрынку з золатам і сказаў:

– Бачыш, многа тут золата, але жыццё даражэй золата, бяры, колькі хочаш.

Загоншчык быў чалавек мудры. Ён узяў кіёк, разгарнуў чырвонцы, каб кіёк упёрся ў дно, і сказаў:

– Праўда, князю, тут многа золата, але ўсё ж такі дно можна дастаць, дык, мабыць, гэта тваё залатое багацце не вечнае, калі-небудзь прыйдзе канец яму. Дый золата больш патрэбна князю, як простаму чалавеку. Дай ты мне, княжа, гэткі дар, каб я ў ім дна знайсці не мог.

Князь задумаўся і кажа:

– Каб я сабраў усё багацце, то і тады дно яму знойдзеш.

Засмяяўся князь, я табе пакажу бяздоннае багацце. – І выйшаў на двор, узяў лавецкі меч і ўвесь усунуў у зямлю. – Вось тваё, княжа, багацце, у якім дна няма: яно больш вартае, чым тыя чырвонцы. Грошы могуць украсці, а гэтае ніхто не ўкрадзе.

Засмяяўся князь, спадабалася яму загоншчыкава мудрасць, і ён кажа:

– Праўду гаворыш, дам табе зямлі на дзесятае пакаленне.

І, зайшоўшы ў шацёр, напісаў князь Яраслаў дарчую грамату мудраму загоншчыку Ранцэвічу на ўсю ваколіцу Вялемічы.

І дагэтуль у Мазырскім павеце, у вёсцы Вялемічы, жывуць Ранцэвічы ў вялікай пашане. У цынкавай трубцы перадаюць яны з роду ў род дарчую грамату князя Яраслава, а паказваючы яе, апавядаюць паданне пра свайго мудрага прашчура.

## Пра што гавораць назвы?

Другое тысячагоддзе шумяць ветры часу над некалі славутым славянскім горадам – у наступным годзе Тураў афіцыйна адзначыць сваё 1025-годдзе. Менавіта 980 год лічыцца афіцыйна годам нараджэння сталіцы аднаго з буйнейшых на той час княстваў усходнеславянскай зямлі. А можа ён намнога старэйшы? Відавочна, што гэта так. Ён быў ужо тады, калі летапісу яшчэ не было. Вось толькі, на жаль, ніякіх іншых дакументаў ці помнікаў, якія б пацвярджалі ўзрост Турава, проста не захавалася. Хіба што назвы – вусны, жывы летапіс гістарычных падзей, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне—мясцін, звязаных з Туравам, сведчаць аб тым, што горад быў ужо задоўга да прыняцця праваслаўя.

## Сляды возера Купа

Дагэтуль тураўляне даліну паміж Туравам і вёскай Дварэц (якая цяпер уваходзіць у склад Турава) называюць Купай. Некалі, як сцвярджаюць старажылы, тут было прыгожае возера, на берагах якога раслі векавыя дубы і густыя вербы. Вада ў возеры была праточнай, дно – чыстым і пясчаным. Як сцвярджаюць легенды, возера было месцам правядзення язычніцкіх свят старажытных тураўлян. Напрыклад, купалляў. У язычнікаў, як вядома, было некалькі купальных свят на працягу года. Гэтым тлумачыцца і захаваная людзьмі праз вякі назва – Купа (месца купання, правядзення купалляў). Пасля прыняцця хрысціянства купаллі былі забаронены, а святасць возера забыта. Але ж куды падзелася тое возера?

Па-першае, што яно сапраўды было нельга падвергнуць сумненням: нават у апошняй чвэрці XX стагоддзя тураўскі калгас “Новае жыццё” браў на месцы былога возера сапрапелі, таўшчыня якіх аказалася каля двух з паловай метраў. І толькі ніжэй быў пясок. Што ж здарылася?

Паводле гіпотэз тураўлян-краязнаўцаў, спачатку сядзіба тураўскіх князёў з дружыннікамі размяшчалася на востраве плошчай каля 0,25 квадратных кіламетраў, дзе цяпер Дварэц. Гэтая мясціна і ў нашыя дні ператвараецца ў востраў у час паводкі. А ў тыя часы, як мяркуецца, вадзяное кальцо вакол гэтага месца было пастаянным і з’яўлялася надзейнай

перашкодай  для "нечаканых гасцей". З поўначы Дварэц амываўся Прыпяццю, з усходу – возерам ( называецца Рэчка), якое часткова захавалася і да нашых дзён, з поўдня – штучным рвом пад назвай Пераадоль, і з захаду – возерам Купа. Возера злучалася з Прыпяццю і Пераадоллю глыбокімі і шырокімі пратокамі, праз якія для сувязі з Туравам былі перакінуты драўляныя масты. Але, трэба адзначыць, што Дварэц не знаходзіўся поўнасцю на востраве. Для гаспадарчых патрэб – прагону жывёлы – быў пакінуты невялікі перашыяк сушы, які абараняўся драўлянай сцяной і брамай. Гэтае месца дагэтуль тураўляне называюць Заградкай. Калі ж была насыпана Замкавая гара і пабудаваны на ёй княжасці замак, Дварэц быў пакінуты. Замест мастоў праз пратокі, якія з часам  разбурыліся, былі насыпаны грэблі. Тут адстойваліся  штучныя паводкавыя воды. З цягам часу паявілася водная расліннасць і возера пачало мялець, на дно выпадаў глей. Пастунова возера і зусім знікла, захавалася толькі яго назва.

**Пераадоль ад "пераадолець"?**

Вядома, што старажытныя тураўляне надавалі вялікае значэнне водным рубяжам абароны. Мелася нават два кальцы водных перашкод: знешняе і ўнутранае. Варожыя напады былі таму прычынай.

Галоўным абарончым рубяжом Турава на аддаленых подступах мог быць штучны глыбокі роў шырынёй 20-25 метраў Пераадоль. Гэтая назва засталася і да сённяшніх дзён.

Невядома,  ці на гэтым рубяжы тураўляне пераадолелі ворага, ці можа назвалі  роў так таму, што ён надзейна абараняў горад ад ворагаў.  Тураўскія краязнаўцы прытрымліваюцца гіпотэзы, што назва ўсё ж ад слова "пераадолець", г.зн. "перамагчы". Хаця ж магчымы і іншы варыянт – вялікая будоўля па стварэнню звыш трохкіламетровага рва была нарэшце пераадолена?

Дакладна невядома і тое, калі пабудаваны роў. Многія навукоўцы прытрымліваюцца думкі, што час будоўлі Пераадолі прыпадае на VII—IX стагоддзе. Пераадоль злучалася з вялікім балотам, якое акружала Тураўскія землі  з поўдня і да захаду. Па балоту паміж Туравам і  вёскай Запясочча працякала невялікая рачулка пад назвай Язда.

Разам з воднымі рубяжамі абароны былі, зразумела, і іншыя абарончыя збудаванні, але дубовыя сцены  да нашых дзён не захаваліся. Мясцовыя легенды сцвярджаюць, што асабліва надакучвалі тураўлянам ваяўнічыя плямёны хазараў, якія жылі за кошт рабавання і грабяжоў. Для зручнасці нападу на Тураў хазары (тураўляне называлі іх "казарамі") замошчвалі балоты, рабілі гаці. Няма цяпер балота, няма цяпер і хазарскай гаці, а назва засталася (пра яе ўжо ўзгадвалася ў нарысе раней) – Казаргаць. Можна думаць, што водныя рубяжы таксама абаранялі ад набегаў на палі старажытных тураўлян дзікіх жывёл, якіх было шмат.

Адразу за Пераадоллю і балотамі пачынаўся лес. Калі лясы пад дзейнасцю чалавека  адступалі, а палі перайшлі на другі бок Пераадолі, тураўляне пачалі шукаць іншыя меры абароны сваіх земляў. Быў у Тураве і

земляны вал. Калі хто з сучасных тураўлян скажа, што ён жыве на валу, то ўсе разумеюць, дзе гэта. Хаця самога валу няма ўжо…

Такім чынам, толькі прыведзеныя некалькі назваў мясцін даюць падставы меркаваць, што старажытны горад існаваў задоўга па першага ўспаміну ў летапісе, да прыняцця праваслаўя.

### Паходжанне назвы вёскі Дзякавічы

Калісь была некая Нікалаеўская вайна. Да асталіся толькі ўдвох мужык з жонкаю, ды і кажуць: "Дзякуй Богу, што мы тут асталіся. Будзем тут жыць і будуць тут Дзякавічы". Ад першага іхняга слова і пайшла назва вёскі.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Чэркас Надзеі Нікіфараўны, 1919 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

### Легенда пра паходжанне назвы возера Чырвонае

Нашэ возеро мее нексолькі названій: возеро Чырвонэ, Князь-возеро, Чорт-возеро. Самая ізвесная легенда і даўняя – это про названіе возера Чырвонае. Даўным-даўно на самай сярэдзіні возера стаяў красівы замок, а вакруг замка була вода, каб разные врагі не маглі падступіцца к замку. На берэгу стояла дзерэўня, у екой жылі слугі князя. І жыў у той дзерэўне малады красівы хлопец, але ж бедны бyў: бацькі не було, а маці адна. От жылі слабо. Хадзіў той хлопец на княжэцкі двор работаць. І вот аднажды ўбачыў ён князёву дочку і сразу палюбіў ее. Дзеўчыні хлопец тожэ понравіўса. Устрэчацца ены не моглі, бо бояліса княза. Але ж доўго хавацца ў іх не получылосо і ўзнаў про іх любоў князь.

Князь быў чалавеком вельмо суровым. І сразу ж прыказаў сваім слугам убіць хлопца.

Адным вечором, як зрабіў хлопец усю работу, начаў перапраўляцца на лодцы ў дзерэўню. Убачылі слугі его і накінуліса з нажамі. Зарэзалі да смерці і ўкінулі ў ваду, а маладая князёўна ўбачыла это ўсё чэрез акно і з гора выскачыла з акна і разбіласа аб камні. І расцеклосо ў той дзень много крыві по водзе, і стала вода красная-красная і шчэ доўгое врэмя не мяняла свайго цвету, як памяць князю пра зло, екее ён прычыніў маладым. А людзі сталі называць з тых пор возеро Чырвонае.

Мо ено і було так, а мо і не. А на самой серэдзіне возера і счас мелко, воды дажэ до колен не дастае. Бачно, што раньшэ быў остраў, а на остраві, наверно, замок. Тэ место так і называецца "замок".

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіча Адама Міхайлавіча, 1952 г.н.,***
***студэнткай Купрацэвіч І.***

Ёсць у нашым раёне два возера – Белае возера і Чырвонае або Князь-возера. Ну, дак, кажуць, што ў старыну на месцы тых азёр было две вёскі, але людзі, якія жылі ў іх, нешта не ўгадзілі Богу, і пакараў ён іх, на месцы гэтых вёсак сталі азёра. Кажуць яшчэ людзі, што гэтыя возеры между сабою маюць

нейкі таемны ход. Вучоныя нейкія спрабавалі памеціць рыбу ў адным возеры, а яна, памечаная, з’яўлялася ў другім.

*Запісана ў в. Відошын*
*ад Агіевіч В.Р., 1926 г.н.,*
*студэнткай Макарэвіч М.*

**Легенда пра Князь-возера**

Іе ў нас коля села озеро Чырвоное, но его ешчэ называюць Князь-озеро. От я тобе і раскажу, чого его так зовуць. Неколі ў булые годы жыў нейкі пан з сем’ёю. Жонка его нешто болела, а потом померла. І остаўса ў іх сын. Маці сільно любіла сына і покінула ему кухор з грошамі. Подрос эты хлопец і полюбіў обукновенну дзеўку. А дзеўка була красівая-красівая. Бацьку это не понравілоса. Ён хоцеў пожэніць его з богатою. І тоды сын уцёк от бацькі з етою дзеўкою. І за тые грошы, што маці покінула, ён построіў замок на озеры. І от неек перэд весною поехаў ён за попом, штоб той повенчаў его з тою дзеўкою. От ён поехаў, а лёд на озеры начаў трэскацца, пойшлі по озеру крыгі і разбурылі ены той замок, а ў ім була та дзеўка – погібла ена. І як прыехаў молоды князь да ўбачыў это, то кінуўса ў озеро і ўтопіўса. Поэтому і зовом Князь-озеро. До сіх пор людзі на серэдзіне озера камні находзяць, там жэ і фундамент іе.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Кудзелька Ю.*

**Легенда пра кветку васілёк**

Молодога хлопца Васіля полюбіла русалка і стала яго зваць за сабою ў падводнае царства. Яна гаварыла яму, што ў вадзе так добра жыць, як і на сушы, е там багато рыбы, богацтва і она яго зробіць вельмі багатым чоловекам. Васіль доўга отказваўся, упіраўся, казаў, шо вон любіць дзеўку земную і не промяняе вольносць земную на падводнэе царство. Тады русалка разгневалася і ператварыла Васіля ў цветка “васілёк”, оставіўшы его на пшанічном полі. З тых далёкіх часоў, ек святкуюць свято Купала, дзяўкі ходзяць па лясах, полях збіраючы цветкі “васілька”, шоб уплясці его ў веночак. Русалка і зара жджэ, шоб кого заманіць з хлопцаў на русальную недзелю у своё падводное царство.

*Запісана ў в.Марохарава*
*ад Ахрамовіч Вольгі Іванаўны,1928 г.н.,*
*дырэктарам РЦФ Лой Г.П.*

**Легенда аб вядзьмарцы Аўдоцці**

У дзерэўні даўно гаварылі, шо Аўдоцця вядзьмарка. Закульгае корова, вол не даецца ў ярмо – Аўдоцця віновата. У кароў стала прападаць малако – зноў Аўдоцця натварыла. Хлопцы вырашылі праверыць вядзьмарку. На Купалле около хлявоў зрабілі засаду. Роўна ў 12 часоў ночы ўбачылі, шо да Клімавага хлява бяжыць рудая сучка і залезла ў хлеў. Тут хлопцы далі волю

рукам, білі сучку колькі хацелі. Назаўтра каля колодзежа бабы гаварылі, шо нехта так моцна пабіў Аўдоццю, шо яна не можа з поліка падняца. Праўда гэта ці не праўда, але калі Аўдоцця памірала, то крычала так, шо прышлося знімаць дошкі са столі, толькі тады вона супакоілася на век вечны. А ў дзерэўні ўсе казалі, шо вона вядзьмарка. От і до сенняшнего ўрэмя ўсе верац і росказваюць про ее.

***Запісана ў в.Беразнякі***
***ад Царыкевіч Іны Васільеўны, 1932 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Г.П.***

**Быль аб Іване, які меў іменешку "Сівец"**

Ето було даўным-даўно, у сяле жыў такі чоловек, звалі яго Іван, а іменешка (клічка) Сівец. Вон говорыў, шо я ўсе на свеці знаю наперэд, я поговору з Богом і вам скажу. Людзі думалі которые, шо можэ ето і праўда, бо вон ходзіў ноч у ноч у капліцу моліцца Богу. Бувало вуйдзе на берэг рэкі Сцвігі, подыме рукі ў гору да й стоіць, шото сам собе под нос бормочэ. Его хата стояла на краю рэкі Сцвігі. Опосля людзям і кажэ, я говорыў з Богом, побачыце шчо будзе: будуць летаць жэлезные птушкі по небу і ўвесь свет будзе поцягнуты жалезным павуціннем. Людзі ўсе думалі, шо ето такее, ніхто не догадваўса і не знаў, шчо ето будуць летаць самалёты і лектрыка будзе проведзена проводамі. І гето так вон говорыў, але хто верыў, а хто не.

А перэд войною ўстановілі каменданскі час, ніхто з села не доўжон вуходзіць, ніхто нікуды, була і голодоўка, людзям трэба ж було шо-небудзь есці. То збіраліса і по рыбу чоўнамі ездзілі ўночы. А "Сівец" ідзе ў капліцу з вечора і бачыць ек хто ідзе за рыбою за рэку і заяўляе коменданту, тые беруць і орыштоўваюць, штраф даюць. І от почуў Стахей Чухутоў, шо "Сівец" заяўляе на тых, хто ходзіць на рыбу і пойшоў з вечора ў капліцу поперэд " Сіўца", стаў за крэст каменны, схаваўса і поджыдае его, колі вон прыдзе. Прыйшоў " Сівец", сеў на коленях і моліцца Богу, і толькі "Сівец" прыклаўса до подлогі, а Стахей хваць его за воротнік (вон буў здоровы) і кінуў у бок метра два от того крэста. Той спужаўса до смерці, а Стахей у еты час побег домоў, так вон і не познаў, хто і шо одкуль узялосо. І з того врэм'я "Сівец" не стаў ходзіць у капліцу моліцца Богу, говорыць з Богом перэстаў і не стаў продаваць коменданту своіх людзей.

***Запісана ў в.Пагост***
***ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны,1941 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Г.П.***

**Легенда "Сцепанішына гора"**

Было гэта даўным-даўно, як гаворац старыя людзі сяла. Жыла ў мястэчку жанчына, якую звалі Сцяпаніха. Калісці клічкі давалі ў селе так, як звалі чолавека, а ее зваўса Сцепан.. І разам з ёю жылі дзве дочкі, да такіе хорошые на від, шой вочэй не оторваць от іх. Чорные косы булі ў іх до самого поеса, фігурные дужэ, а вочы сініе, сініе, ек небо. Чоловек Сцепанішын і бацька пайшлі на войну, а вона з дочкамі робіла з ранку і

довечора: сеялі, пололі, сено косілі, грэблі, а адным словам, жылі разам з людзьмі. Церэз дзярэўню праходзіў шлях, і путнікі часта астанаўліваліса ў селе на ночлег, отдыхаць з дарогі. Кожнаму было месца ў Сцяпаніхі і ўсе здзіўляліса хороству яе дочок, а найбольш іх горопошносці.

Час ішоў, нічым не змрочваючы жызнь Сцяпаніхі. Але чэрэз шлях ішлі не толькі з дабром. З паходу поверталіса казакі. Прослухаўшы пра дачок Сцяпаніхі, яны прышлі да яе, шоб тая оддала дачку да іх на родзіну. Гэта было як гора, як здзек. Слёз пралілося ў этай хаце – адзін Бог святы ведае. Дочкі, як і маці, не змаглі пакарыцца казакам. Узловаўшыся на эта, яны забралі дачок сілаю і растралялі на гары. Боль і горэ мацер быў бязмежны. Похаваўшы дачок, яна некалькі дзён не сыходзіла з могіл і чэрэз час памерла ад гора там жа. Людзі пахавалі Сцяпаніху разом з дочкамі, пасадзілі тры берозкі, на іх развесілі маніста дачок і маці. Вельмі доўга пра этае гора не змаглі забыцца людзі, і ў іх памяці казакі осталіся злоснымі людзьмі.

Прайшло багато врэмья з того часу і доўга яшчэ дзеўкі знаходзілі маніста дачок і Сцяпаніхі. Няма тых людзей, хто бачыў, хто чуў, але ж легенда осталася, як і гора, якая так і называецца – Сцепанішына.

***Запісана в.Новыя Мілевічы***
***ад Сачыловіч Марыі Андрэеўны, 1930 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Г.П.***

## Легенда пра возера “Чырвонае”

Жыў раней каля возера князь, у якога было многа дачок і адзін сын.

Калі сын вырас, надышоў час яго жаніць. І тут здарыўся адзін выпадак. Некалькі гадоў таму назад узяў у старага князя адзін чалавек у арэнду карчму. Усе туды заязджалі перакусіць, адпачыць і далей ехаць. Так і разнеслася пагудка пра карчму, да не столькі пра карчму, як пра карчмову дачку. Вельмі яна прыгажуня была. Здарылася неяк маладому князю міма той карчмы праязджаць. Палюбіў князь дзяўчыну, але бацька не даваў благаславення. Малады князь, каб ніхто не ведаў пра іх сустрэчы, загадаў пабудаваць пасярод возера невялікі палац і там пасяліў каханку. Хутка і сам стаў там жыць. А зіма была вельмі снежная, марозная. Возера лёдам скавала. А як пачалася вясна, крануўся лёд, на возеры ваду падняло і пайшлі па ім гуляць вялізныя крыгі, той палац і разнесла. А князь у гэты час паехаў дамаўляцца аб шлюбу. Даведаўся ён, што ніхто з таго возера не выплыў, выйшаў на высокі бераг, ды і кінуўся ў ваду. Адтуль і назва ад няшчаснага кахання “Чырвонае”.

***Запісана ў в.Дуброва***
***ад Купрацэвіч Таісіі Адамаўны,1930 г.н.,***
***дырэктарам РЦФ Лой Г.П.***

## Легенда “Няшчаснае каханне”

У нашому селе жыў пан і быў вельмі люты, здекваўся з людзей, як мог.

Зваць пана я забула як. У яго була дачка і вельмі хорошая, ек цветок. Коса русая спускаласа ніжэй за спіну, а вочы былі сініе-сініе, ек вода ў рэцэ,

шо процекала коло панского саду. Дочку звалі Ядзяю, а рэку Яздой. По гетой рэцэ пан плавіў лес у Туроў і продаваў купцам з Кіева. Купцы плавілі по Прыпеці ў Кіеў. Ядзя вельмі любіла гуляць у саду, цэлымі днямі ходзіла і спевала, бо ў яе буў хорошы, моцны голас, ек у солоў'я. Однаго разу прыплавілі до панского маёнтка лес. Усе сплаўшчыкі вуйшлі на берэг, дзе іх ждаў пан, подышла і Ядзя. Там буў хлопец-сплаўшчык з Любовіч родом і вон ёй вельмі понаравіўса, вона ему тожэ понаравілаcа. Оны нешчо між собою поговорылі. Пан отправіў сплаўшчыкоў далей у Туроў. Ядзя шчэ доўго стояла на берэзі і гледзела ўслед сплаўшчыкам. А далей воны сталі стрэчацца. Пан доўго нічого не знаў. Одзін раз панскіе слугі подгледзелі, як воны ў саду гулялі, і росказалі пану. Пан загадаў поймаць хлопца і прывесці до его. Слугі поймалі хлопца, збілі і прыцеглі до пана. Ядзя вельмі просіла бацька, шоб не біў мілого і поміловаў, але пан не слухаў дочку. Таточко, пожэні нас бо ў нас будзе дзіця, я его люблю. Бацько после етых слоў шчэ больш озверэў. Загадаў слугам посадзіць Ядзю ў камору і замукнуць, а хлопца ўтопіць у рэцэ. Хлопец у той вечор подарыў Ядзі персня. Вона седзела ў каморы і ўсе любоваласа ім, ні піла, ні ела. Цёмною ноччу хлопца повелі на рэку і ўтопілі, але людзі казалі, шо на тым месцы, дзе кінулі хлопца, зробіўса вір. Колькі его не шукалі, але не знайшлі. Бацько выпусціў Ядзю з каморы, а вона ўся очорнела от гора, помуціліса ее вочы. Старая служанка показала месціну, дзе ўтопілі хлопца, і Ядзя цэлымі днямі седзела на берэзі, говорачы з рэкою. А одзін раз нарадзіласа і прышла на берэг, кінула свойго персня ў воду і прыказала: “ Беры мой персень, мо му так пожэнімса, а твой хай будзе зо мною”, і кінула ў рэку.

*Запісана ў в.Буразь*
*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*дырэктарам РЦФ Лой Г.П.*

## ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

### *Казкі*

Былі людзі дый няверныя.
Дый не верувалі Госпаду Богу,
Дый уверавалі паганаму Цмоку,
Да давалі цмоку штодзень па аброку,
А што нядзелька – па чалавеку.
Прыйшла чарга да самаго цара.
Хоць сам цар ідзі, хоць царыцу вядзі.
Я сам не пайду і царыцу не павяду,
У мяне е дачка-адзіночачка.
– Уставай, панна, прыбірайса,
Дай ідзі ў моры вымывайса.
Стала панна вымываціся,
Ажно плыве дый паганы Цмок.
З яго роту полымя б’е,

З ноздзер іскры сыплюць,
З вушэй дымы свішчуць.
Ажно едзе да святы Юрай
Да на сівом кане.
– Пастой, пастой, Юр’я,
Я цябе пражру.
– Пастой, панна, не лякайса,
Да бяры Цмока за аднаго рога,
Да вядзі Цмока па ўсяму свету
Людзям на павету.
Да няхай людзі пакаюцца,
Не веруюць паганаму Цмоку,
Да ўверуюць Госпаду Богу.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

**Сабака і воўк**

Жылі дзед з бабою. Так, ек от мы з бабою. І буў у іх добры собака. Сцэрэг двор. Дэй от собака постарэў, стаў беззубы. Дай не вартуе ўжэ двора. От дзед з бабою договорыліса, шоб дзед завёў его ў лес, дэй шоб он там загінуў. Оны так і зробілі. Завёў дзед собаку ў лес, прывезаў до дзерэва, дэй пошоў дохаты. Сеў собака, седзіць, жджэ своей смерці. Подошоў к ему воўк. Да кажэ: “Кум, чого ты седзіш?” А той отвечае: “Мене тут хозяін прывязаў, бо я стаў стары, беззубы, дэй хату не вартую”. А воўк кажэ: “Давай перэгрызом вероўку, да ўдвух будомо жыці”. Воўк, ек і собака, буў беззубы. Оны доўго грызлі ету вероўку, пока перэгрызлі. Селі, дэй седзяць. Воўк кажэ на собаку: “Кум, ты йдзі, поймай порося, да поемо”. Собака так і зробіў, пошоў зловіў порося, з’еў, а воўку прынёс косці, дэй кажэ: “Давай мо судзіцца, кому мясо, кому косці, пошлі найдомо собе суддзей”. Воўк пошоў у лес, а собака – у село. “А после тут, на етом месці стрэномоса”, – сказаў воўк. От прышоў воўк і прывёў з собою медведзя і дзікого кабана. Селі і ждуць собаку. Ждалі, ждалі, да ўжэ церпенне кончылосо. Воўк кажэ на медведзя: “Ты залезь на хвою, да гледзі, ці оны не йдуць, ек будуць іці, то скажэш”. Медзведзь седзеў, седзеў, да ек крыкне: “Ідуць!” А воўк путае: “Хто?” – “Однэ”, – кажэ медзведзь, краснэ, да дзержыць хвоста ўверх, а друге рабэ, да тожэ дзержыць хвоста ўверх”. А ето булі кот і певень. Воўк і кажэ: “Давайце вы схаваецеса, а я скажу, шо вы ждалі, ждалі, дэй пошлі”. Так воны і зробілі. Кабан схаваўса ў мох, мядзведзь астаўса на дзерэві, а воўк стаў, дэй стоіць. От прышоў собака, дэй кажа: “А дзе ж твое суддзі?” “А воны, – кажэ, – ждалі вас, дай пойшлі”. Тут у кабана засвербело вухо, он захоцеў почухаць его, дай заворушыўса. Кот подумаў, шо гето вуж под мохом, да ек скочыць на кабана, а той – уцекаць. Петух начаў кукарэкаць, звать ката назад: “Сюды, сюды

ідзі!” А мядзведзь думаў, шо гето на его і полез усё вушэй і вушэй. Галіна обломаласа, мядзведзь упаў і ўбіўса. Так собака перемог воўка.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Леўкавец Мікіты Есіпавіча, 1914 г.н.,***
***студэнткай Кацэвіч І.***

***Дражнілкі***

Буська-клецька,
Знясі мне яечка.

***

Буська, буська-клекатун,
Узяў бабу за каўтун,
Па балоце валачыў,
А ў карыце намачыў.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

***Заклічкі***

Зязюля шэрая,
Скажы мне праўду шчырую:
Колькі год мне пражыці?

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Гаўрыловіч Сцепаніды Цімафееўны, 1919 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Навуць Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Клочка А.***

***Дзіцячыя забаўкі***

Сарока-белабока
По сметнічку скакала,
По сметнічку скакала,
Дзеткам кашку збірала.
Гетому дам, гетому дам,
А гетому не дам:
Дроў не носіў,
Печ не паліў,
Кашкі не варыў,
Нічога не робіў,
Шугі, шугі, шугі..!

***

Кую-кую ножку,
Паеду ў дорожку,
Дорожка крывенька,

Кобылка слепенька.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Кашэвіч Аляксандры Фёдараўны, 1967 г.н.,***
***студэнткай Кацэвіч І.***

***Калыханкі***

Пайдзі, коця, на вулку,
А дзіця ў люльку,
На ката варота,
А на дзіця дрымота.
На ката безгалоўе,
А на дзіця здароўе.
На ката ўсё ліха,
А ты, дзіця, спі ціха,
Ты, коця, не вучы,
А ты, дзіця, спі, маўчы.

***Запісана ў в. Людзяневічы***
***ад Салко Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Шырай Н.***

**Каток**

Баю, баю, люлі, люлі,
Да прыляцелі да дзве гулі.
Сталі гулі вуркаваці, да стала дачушка засынаці.
Сонкі-дрэмыкі ў вачыца,
А здароўеўка – у плечыца.
Да пайшоў коцік у лясочак,
Да загубіў коцік паясочак,
Да плача каточак, нашэ дочы,
Па кутоку – мак-мак,
Пад ступою – дзяк-дзяк.
– Што ты, доча, плачаш?
– Мачыха пабіла, дала крышку хлеба,
А мушка хапіла.
– А дзе тая мушка?
– Пабегла ў слоні.
– А дзе тыя слоні?
– Вада затапіла.
– А дзе тая вада?
– Цвяточкамі парасла.
– А дзе тыя цвяточкі?
– Дзевачкі парвалі.
– А дзе тыя дзевачкі?
– Панічы пабралі.

***Запісана ў в. Буразь***

*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.*

**Калыханкі**

Ой, люлі, люлі,
Полез кот по дулі.
Наеўса, напіўса.
Ды спаць поваліўса
І ўніз спусціўса.

***

Ой, люлі, люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на вороцех
У чырвоных боцех,
Сталі сокатаці,
Дзеток спаці зваці.

***

Ой ты, котко маленькі,
Прынесі Іванку сон солодзенькі,
Дай соночкі ў вочыца,
А здороўечко ў плечыца.

***

Баю-баюшкі-баю,
Не лажыса на краю.
Прыдзе шэранькі ваўчок,
Схопіць цебе за бачок.
Ой, я буду колыхаці,
А мой маленькі Іванко
Будзе спаці.
Ой, люленька ж, дэй люляю,
Наб’ю коціка, налаю,
Штоб коцікі не ходзілі,
Мойго Іванка не будзілі.

*Запісана ў в. Хільчыцы*
*ад Кашэвіч Аляксандры Фёдараўны, 1967 г.н.,*
*студэнткай Кацэвіч І.*

***ГУЛЬНІ***

Вось мы маладымі гулялі ў такую гульню. Браліса маладыя жонкі і дзяўчаты за рукі і ланцужком беглі па вуліцы з песняй:

Сею, сею лён, лён да па камені,
Да па беламу.Сам я іду, каня вяду.
Конь лён топчэ, паганяй, хлопчэ,
То не лён быў, сам шоўк быў:

Знізу карэністы, зверху золоцісты,
Сам шоўк быў, сам шоўк быў.

Прапеўшы гэтую песню, первыя две жонкі браліса за рукі і ўвесь ланцуг пад рукі прабягаў. Паследнія две жонкі зноў браліса за рукі, зноў увесь ланцуг прабягаў і начыналі зноў гэтую песню. І гэтак бегалі па ўсіх вулках і пелі. Яшчэ далучаліса да іх і хлопцы за коней. Вось такая была гульня вясной.

Садзіліса ў лоткі, па возеру ехалі і пелі песню:

– Ой, серая вутка, дзе ты зімовала?
– Ой, там за морэм і за чорным явором дзеток годовала.
– Ой, серая вутка, дай жэ мне однэ.
– Беры собе пару, которых наўгоднэ.

Гулялі ў гульню «Луста». Садзіласа одна жонка на калені, а две паложаць рукі на галаву седзячай. Потым бегаюць вакруг жонкі так, каб не адарваць рукі ад галавы. Хто первы аббяжыць, той адходзіць убок і хутчэй становіцца другая. І гэтак усе дзеўкі. Хто паследні, той садзіцца.

***Запісана ў в.Буразь***
***ад Струк Вольгі Грыгор'еўны, 1949 г.н.,***
***студэнткай Пятрычыц А.***

## НАРОДНАЯ МІФАЛОГІЯ ЖЫТКАЎШЧЫНЫ

*Кастрыца А.А. Новак В.С.* ***Міфалагічныя ўяўленні жыхароў Жыткавіцкага раёна***

У палявых экспедыцыях, праведзеных на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, запісаны ўнікальныя фальклорныя матэрыялы, звязаныя з народным асэнсаваннем веры ў Бога, разуменнем такіх паняццяў, як "рай" і "пекла", спасціжэннем сутнасці міфалагічных уяўленняў пра прыродныя стыхіі, жывёльны, рэчыўны і раслінны свет. Засяродзім спачатку ўвагу на экспедыцыйных запісах звестак пра асэнсаванне біблейскіх падзей. Заслугоўвае ўвагі народная інтэрпрэтацыя праблемы паходжання свету. Калі, напрыклад, паводле сведчанняў жыхароў в. Бялёў, "свет стварыў Бог" (запісана ад Жогаль А.М., 1910 г.н.), то, зыходзячы з разважанняў жыхароў в. Рычоў, "свет узнік ад Евы і Адама" (запісана ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.). Паводле сведчанняў інфармантаў, Бог мае воблік чалавека: "У Бога я веру. Ета такі ж чалавек, як му" (запісана ў в. Боркі ад Юнчыц Ганны Кандрацьеўны, 1935 г.н.). У міфапаэтычным асэнсаванні жыхароў Бог выступае ў ролі найвышэйшай сілы, ад якой многае залежыць у жыцці чалавека: "Еты ж чалавек усё можа: можа і палячыць, і хваробу паслаць, мы ж усе пад Богам ходзім (запісана ў в. Боркі ад Юнчыц Ганны Кандрацьеўны, 1935 г.н.)".

Заўважым, што народныя ўяўленні пра рай і пекла маюць традыцыйны характар і звязаны непасрэдна з тым, наколькі годным было жыццё чалавека: “Калі ж чалавек быў добры, дык ён, канешне ж, у рай пападзе. Рай знаходзіцца на небе, там, дзе Божанька жыве. …а калі плахі быў чалавек, Божанька яго не прымае і душа ягоная лятае між людзьмі, пакуль не выправіцца” (запісана ў в. Лагвошчы ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.). У асобных тэкстах міфалагічных апавяданняў адлюстраваны матыў “Божага суда” над душамі памерлых: “Пасля смерці душы памершых прылятаюць на суд Божы, дзе рашаецца, падуць яны ўніз ці ўзнімуцца ў вырай” (запісана ў в. Малешаў ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.). Невыпадкова мясцовыя жыхары прытрымліваліся ў жыцці і побыце высокіх маральна-этычных прынцыпаў, асабліва імкнуліся не шкодзіць іншым людзям, каб не трапіць пасля смерці ў пекла: ”Баяліся зрабіць якую злоснасць, каб не пасці ўніз” (запісана ў в. Малешаў ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.). Іншы раз лёс дзіцяці маглі прагназаваць ў залежнасці ад таго, як паводзілі сябе яго бацькі. Лічылася, што за іх грахі ў будучым будуць пакутаваць дзеці: “Канешне, лёс вызначаны ў кожнага. Хтосьці будзе гараваць усё жыццё, як дурны. А хтосьці – радавацца жыццю. Калі бацькі нарабілі шмат гора, і пражыўшы жыццё, не паквіціліся за гэта, дык бедным зробіцца дзіця, будзе пакутаваць усё жыццё: такі, мо, лёс” (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.).

“Самая значная частка любой рэгіянальнай або нацыянальнай “народнай Бібліі” – этыялагічныя легенды” [1, с. 12]. У гэтых адносінах цікавасць уяўляюць міфалагічныя апавяданні, у якіх гаворыцца аб стварэнні першых людзей. Аснову найбольш распаўсюджаных ўсходнеславянскіх вераванняў аб паходжанні чалавека складае біблейскі матыў яго “ўзнікнення” з зямлі: “Бог хадзіў па зямлі, яму аднаму было вельмі сумна. Ён вырашыў стварыць чалавека: узяў горсць зямлі і сыпнуў з усёй моцы” (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.).; “Бог саздал зямлю, всё растушчэе на земле, а на шэстой дзень саздал з гліны і пяску первого чэлавека – Адама” (запісана ў г. Жыткавічы ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.). Сярод этыялагічных матываў міфалагічнай прозы Жыткаўшчыны вылучаюцца наступныя: чаму жанчына вымушана ўвесь час працаваць, ці ведалі людзі час сваёй смерці. Што да першага матыву, то ўзнікненне яго абумоўлена неэтычнымі адносінамі жанчыны да чалавека, які аказаўся Богам, што знайшло адлюстраванне ў адным з варыянтаў, запісаным у в. Рычоў: “Бог падышоў да жанчыны, яна жыто жала, і ёй не было калі паказаць Хрыстосу дарогу. Яна паказала дарогу нагою, тады ён сказаў: “Ты будзеш век працаваць, не будзеш ніколі аддыхаць” (запісана ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.). Другі матыў, узнікненне якога звязана з прадчуваннем чалавекам уласнай смерці, з’яўляецца вызначальным у тэксце міфалагічнага апавядання, запісанага ў в. Дуброва: “А етаму чалавеку трэ було ўжэ паміраць, а ў гэты час плот у яго паваліўся ды суседскія куры ў гарод лезуць. Ён і вырашыў плот саломай загарадзіць. Убачыў ета Бог і кажа: “Чаго ета ты плот саломаю гародзіш, ці ён стаяцьме?” А чалавек гаворыць

яму: “От. на мой век хваціць, усё роўна скора памру”. Ну, Бог, канечна, рассердзіўся, і таго разу зрабіў так, штоб людзі не зналі, калі чалавек памрэ, калі іх смерць прыдзе” (запісана ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). У прыведзеных тэкставых фрагментах знайшла адлюстраванне глыбіня народнай філасофіі асэнсавання жыцця, выпрацаваная на працягу шматлікіх стагоддзяў.

Паводле народных вераванняў, “ангел даецца каждому человеку пры нараджэнні” (запісана ў в. Бялёў ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.). Звычайна месцам яго знаходжання з’яўляецца “правае плячо”: “Калі нараджаецца дзіцё, то ў яго з’яўляецца анёл на правым плячы” (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.). Традыцыйнымі з’яўляюцца ўяўленні аб тым, што анёл заўсёды дапамагае чалавеку, знікненне ж яго звязана з непрыманнем Бога: “А знікае ён толькі тады, калі здрадзіць свайму Богу” (запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.).

Таемным святлом зорак былі абумоўлены назіранні мясцовых жыхароў за начным небам. У адных мясцовасцях устойлівай была традыцыя асэнсоўваць зоркі як душы памерлых (“Лічыцца, што зоркі – гэта душы памерлых. Калі памірае чалавек, то на небе загараецца зорка. І людзі глядзеліся ў неба, як бы сустракаліся з душамі” – запісана ў в. Любавічы ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.), у іншых запальванне на небе зоркі звязвалі з нараджэннем дзіцяці (“Каждая зорачка – гэта душа чалавека. Калі зорачка загараецца, то значыць, недзе нарадзілася дзіцятка, а калі падае – то чалавек памёр …” – запісана ў в. Лагвошчы ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.). Паводле сведчанняў Наталлі Савічны Бялко, 1943 г.н., з в. Любавічы, зоркі ўтварыліся з кропель вады ў выніку моцнага ветру: “Раней усё плавала ў вадзе. Зрабіўся моцны вецер. Ляцелі брызгі і кроплі папалі на неба, і етакім спосабам спалучыліся зоркі”.

Каб выклікаць дождж, зыходзячы з мясцовых вераванняў, трэба было кінуць у калодзеж папярэдне ўкрадзены ў суседа гаршчок: “…украсці ў суседа гаршчок, каб ніхто не бачыў. … Потым гаршчок кідалі ў калодзеж, хадзілі вакол калодзежа тры разы і гаварылі словы, заклікаючы дождж” (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Жыхары в. Рычоў верылі, што дождж можна выклікаць, калі кінуць мак у калодзеж: “Каб выклікаць дождж, у калодзеж кідалі мак” (запісана ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.).

Важнае месца ў міфапаэтычных уяўленнях жыхароў Жыткавіцкага раёна займаюць міфалагізаваныя вобразы раслін і жывёл. Даследчыца В.У. Бялова слушна адзначыла, што этыялагічныя “біблейскія” легенды пра расліны распрацоўваюць два асноўныя матывы – гэта благаславенне якой-небудзь расліны (кветкі, травы) за добрую справу (дапамога Ісусу Хрысту, Багародзіцы, святым) або праклянцце за ганебныя паводзіны або шкоду, прычыненую. сакральным персанажам …” [2, с. 200]. У тэксце міфалагічнага апавядання, прысвечаным асіне, гучыць другі матыў – матыў праклянцця: “Гэта паганае дрэва з-за таго, што асіна не пакланялася Хрысту, як іншыя дрэвы” (запісана ў в. Бялёў ад Жогаль А.М., 1910 г.н.). “Крывава-чырвоны”

колер лісця асіны тлумачыцца тым, што на ёй “павесіўся здраднік Іуда” (запісана ў в. Бялёў ад Жогаль А.М., 1910 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў в. Малешаў, у іх вёсцы асцерагаліся, каб “дуб і ёлка коло хаты рослі, бо дуб здороўе забірае, а колі ёлка перэросце хату, то з етой хаты начнуць людзі поміраць” (запісана ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.).

Сціплыя звесткі былі зафіксаваны на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна па міфалогіі жывёльнага і рэчыўнага свету. Напрыклад, паводле народных вераванняў, калі выконвалі абрад уваходзін у новую хату, то “первого кідаюць чорного кота, штоб той усю хворобу з той хаты забраў” (запісана ў в. Малешаў ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.). Вытокі народных уяўленняў пра міфалагізаваны вобраз мядзведзя звязаны з яго паходжаннем ад чалавека, які любіў паласавацца мёдам з чужога дупла, а сам ніякіх намаганняў не прыкладаў: “А каля землянкі расла ліпа і там пчолы булі. Прыйшоў знахар і бачыць, як непрошаны госць яго мёд есць. Прakляў яго знахар і абернуў у мядзведзя” (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.).

Рассыпаная соль на стале, як засведчылі мясцовыя жыхары, прыводзіць да сваркі ў сям’і. Верай у засцерагальныя ўласцівасці солі былі абумоўлены наступныя дзеянні, скіраваныя на прадухіленне негатыўнага ўплыву чужых людзей: “Калі даеш суседзям малако, то трэба ў слоік укінуць шчыпотку солі, каб не прырабілі”; “Калі ў хату прыходзяць людзі (не з сям’і) і пачынаюць хваліць дзяцей і хазяйку, то трэба ўзяць солі (калі яны пойдуць) і тры разы сыпнуць к парогу” (запісана ў в. Вятчын ад Аксёнчыц Зінаіды Іванаўны, 1945 г.н.). У той жа час соль абавязкова клалі “дзецям пад падушку, каб салодка спалі” (запісана ў в. Вятчын ад Аксёнчыц Зінаіды Іванаўны, 1945 г.н.).

Звесткі, запісаныя пра люстэрка, нож, венік, грошы, ніткі, смецце і інш. адлюстроўваюць як характар агульнаэтнічных народных вераванняў, так і лакальныя асаблівасці. Асэнсаваныя матэрыялы па народнай міфалогіі жыхароў Жыткаўшчыны сведчаць пра багацце і высокую маральна-этычную скіраванасць кодэксу жыцця і побыту палешукоў, традыцыйныя веды якіх не ніколі не трацяць сваёй актуальнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларуская “народная Біблія” ў сучасных запісах /уступ. артыкул, уклад. і камент. А.М. Боганевай. – Мінск: Бед. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 166 с.

2. “Народная Библия”: Восточнославянские этиологичекие легенды / Сост. и коммент. О.В. Беловой; Отв. ред. В.Я. Петрухин. – М.: “Индртк”, 2004. – 576 с.

*Паборцава К. В.* ***Народная дэманалогія палешукоў***

Яскравым доказам самабытнасці беларускай міфалогіі з’яўляецца народная дэманалогія, прадстаўленая вобразамі духаў хаты і сядзібы, лесу і поля, воднай прасторы і інш. Як слушна адзначыў У. А. Васілевіч, “багамі і дэманічнымі істотатамі ў беларусаў некалі была напоўненая ўся навакольная

прырода – ад зямных нетраў да недасягальнага Космасу. Фантастычныя істоты насялялі лясы, палі, рэкі, ім знаходзілася месца ў хатах, на гарышчах, у коміне, падпеччы, у лазні, хляве і іншых гаспадарчых пабудовах. На іх ускладалася апекаванне свойскай жывёлаю і палеткамі, яны павінны былі назіраць за ўсімі гаспадарчымі працэсамі і клопатамі селяніна. Іх шанавалі, стараліся задобрыць і разам з тым баяліся, асцерагаючыся пакарання. Адных любілі, другіх ненавідзелі, з трэціх пасмейваліся. Сваіх міфічных антыгерояў народ ствараў паводле сваіх жа чалавечых заганаў і хібаў, не ашчаджаючы самых брудных фарбаў на іх пачварныя партрэты. Ну, а калі чаго ў гэтым жыцці не хапала для каларытнасці сюжэта, абмалёўкі знешнасці ці характару, у ход ішла нястрымная фантазія” [1, с. 17]. Каб пазнаёміцца з асаблівасцямі светапогляду беларусаў-палешукоў, трэба зазірнуць у гэты дзівосны і таямнічы свет народных вераванняў, звязаных з вобразамі народнай дэманалогіі. Як сведчаць палявыя экспедыцыйныя матэрыялы, на тэрыторыі раёна шырока распаўсюджаны міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з персанажамі ніжэйшай міфалогіі, аснову характарыстыкі якіх складаюць такія аспекты, як знешні выгляд, месца жыхарства, функцыянальнасць, спосабы засцярогі ад іх шкоднага ўздзеяння. Напрыклад, з таямнічым вобразам вадзяніка жыхары звязвалі гаспадара воднай прасторы, якога ўяўлялі “старым чалавекам. Он з барадою, цела пакрыта цінай” (запісана ў п. Чырвонае ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў в. Хвойка, “вадзяны – стары, з доўгімі зялёнымі косамі і бородою” (запісана ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.). У тэкстах міфалагічных апавяданняў, запісаных у розных вёсках, вадзянік выступае як шкодная істота, “топіць людзей”. З мэтай засцярогі ад гэтага міфалагічнага персанажа выкарыстоўвалі крыжык, бо “вадзянік топіць тых, шо ідуць у воду без крыжа” (запісана ў п. Чырвонае ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.); “Як ідзеш у воду, трэба перахрысціцца” (запісана ў в. Хвойка ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.).

Найбольшая колькасць звестак зафіксавана пра такі міфалагічны персанаж, як ведзьма. Ведзьма – гэта жанчына, якая “мае вялікія здольнасці перакідвацца ў іншыя істоты – жабу-рапуху, птушку, кабылу, сароку, чорную котку, ласку, а таксама перакідваць, зачароўваць іншых” [2, с. 73]. Цэнтральны матыў у тэкстах міфалагічных апавяданняў, звязаных з гэтым персанажам і запісаных на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, – ператварэнне ведзьмы ў жабу, радзей – у варону: “Ведзьма магла скідвацца кім хоць: жабаю, воронай (запісана ў в. Рычоў ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў в. Лагвошчы, іншы раз “ведзьма можа прэврашчацца ў любога звера іли пціцу” (запісана ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.). Як вынікае з міфалагічных звестак пра ведзьму, зафіксаваных ў п. Чырвонае, то “ана можа ... ператварацца ў маладзіцу” (запісана ад Цімашчэні Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.). Цікавыя звесткі пра паходжанне ведзьмы былі запісаны ў в. Бялёў: з аднаго боку, “ведзьмай становіцца дзяўчынка, народжаная ў трэцім пакаленні па-за шлюбам” , а з другога боку ёю магла стаць і тая жанчына, якой “паміраючая ведзьма

паспела перадаць свае веды" (запісана ад Жогаль Арыны Міхаўны, 1910 г.н.). Варта адзначыць, што ведзьма ў асноўным магла толькі шкодзіць, што знайшло адлюстраванне ў розных лакальных варыянтах міфалагічных апавяданняў. Па-першае, ведзьма магла адбіраць у кароў малако, і гэтаму садзейнічала яе здольнасць да ператварэнняў: "Ведзьма магла ператварацца ў жабу. Вось ператвараюцца і карову ссуць" (запісана ў в. Боркі ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.). Па-другое, шкодная дзейнасць ведзьмы была звязана з жытам, дзе "ведзьмы робяць заломы ноччу голымі" (запісана ў в. Бялёў ад Жогаль Арыны Міхаўны, 1910 г.н.). З мэтай засцярогі, напрыклад, свойскай жывёлы ад звышнатуральнага ўздзеяння ведзьмы, выкарыстоўвалі асінавае палена або шыпшыну: "у адрыне затыкалі шыпшыну і лажылі асінаву палку папярок у адрыне" (запісана ў в. Рычоў ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.). У в. Малешаў, каб пазбавіцца ад шкодных дзеянняў ведзьмы, "ставілі вілкі ў дзвярах" (запісана ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.), а ў в Лагвошчы з гэтай мэтай выкарыстоўвалі крапіву , якой трэба было "вакруг дома аблажыцца" (запісана ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.). У в. Вараніно шукалі траву "баркун", якой "затыкваем у хлеў, каб ведзьма не шла" (запісана ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.), а ў в. Буразь "кідалі мак асвечаны вакруг адрыны" (запісана ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.).

Лясун, паводле народных вераванняў жыхароў, не толькі жыве ў лесе, але і з'яўляецца яго апекуном. Уяўлялі гэту істоту па-рознаму: або ў выглядзе "змрочнага вялізнага велікана з вялізнай барадой", або "любога звера" (запісана ў в. Вятчын ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.), або ў выглядзе дрэва ("сам вялікі, як дзерава, ну, каб добрэ было хадзіць, глядзець усюды") (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Паводле сведчанняў жыхароў в. Малешаў, лясун можа пераўтварацца "часцей у мядзведзя або здаравеннага мужыка" (запісана ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.). Лічылася, што лясун мог і дапамагаць, і шкодзіць. Напрыклад, засцерагае лес ад "паганых духаў"(запісана ў в. Боркі ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.), паказвае людзям тыя мясціны, дзе "многа грыбоў, ягад, пціц і звярэй наганяў ахотнікам насустрач" (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). Сутнасць шкодных дзеянняў лесуна, паводле народных уяўленняў, зводзілася да таго, што ён "блудзіць людзей па лесе" (запісана ў в. Вятчын ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.). Увогуле функцыянальнасць лесуна была абумоўлена паводзінамі людзей у лесе: "Але ён (лясун) карае толькі за нерадзівые паводзіны к чаму-небудзь або за непаважанне да яго лёсу" (запісана ў в. Малешаў ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.). Каб пазбегнуць сустрэчы з лесуном, як адзначалі мясцовыя жыхары, нельга яго злаваць, напрыклад, асцерагаліся, калі "бывае, прыдуць людзі ў лес, крычаць, а не трэба етэ рабіць" (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.).

Авеяны паэзіяй народнага слова і таямнічы вобраз русалкі. "Русалкі ўзнікаюць у выніку ператварэнняў маладых тапельні ці самазабойцаў, дзяцей,

праклятых яшчэ ў мацярынскім улонні, немаўлят, што нарадзіліся мёртвымі, ці загубленых (задушаных, утопленых) адразу пасля нараджэння" [2, с. 434]. Паходжанне русалкі ў мясцовай міфалагічнай традыцыі звязвалі зператварэннем дзяўчат-тапельніц ("Русалкамі маглі стаць незамужнія дзяўчыны ці ,можа, тыя дзевачкі, якія ўтапіліся і іх не знайшлі") (запісана ў в. Сяменча ад Чорнагалоў П. П., 1927 г.н.), дзяўчынак, якія "памерлі нехрышчонымі" (запісана ў в. Кольна ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.), дзяўчат, якіх "праклялі іхнія маці" (запісана ў в. Бялёў ад Жогаль Арыны Міхаўны, 1910 г.н.). Месцам знаходжання русалак, якія асабліва маглі нашкодзіць пасля Тройцы, з'яўляліся і поле, і лес, і вада. Зыходзячы з успамінаў інфармантаў, можна меркаваць, што русалкі маглі і шкодзіць (рабілі ўсё магчымае, каб чалавек заблукаў, або спрыялі таму, каб утапіўся): "Ана збівае путнікаў з дарогі. Калі к ёй хтось падыйдзе, то ана можа забраць к сабе. Ані пакасцяць людзям, бо хаваюць адзежу" (запісана ў п. Чырвонае ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.); "Колісь пужалі, што ў жыце сядзіць з каменнымі цыцкамі русалка і зацягне ў воду, таму і баяліса" (запісана ў в. Буразь ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.).

У пераважнай колькасці запісаў знешні выгляд дамавіка звязаны са старым чалавекам: "Ён стары і маленькі ростам" (запісана ў в. Сяменча ад Чорнагалоў П. П., 1927 г.н.); "Дамавік – гэта старэнькі дзядочак з сядой барадою і сядымі валасамі" (запісана ў в. Кольна ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.); "Такі сівы дзядок, канечна, з доўгай сівой барадой і касамі" (запісана ў в. Дуброва ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.). У адзінкавых тэкстах міфалагічных апавяданняў можна сустрэць зааморфны выгляд гэтай істоты: "У дамавога верылі. ... Сам лахматы, с хвастом" (запісана ў г. Жыткавічы ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.). Лічылася, што дамавік нагадвае гаспадара хаты, таму і "ахраняе дом" (запісана ў в. Боркі ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.). Верылі, што калі ўлагоджваць дамавіка, не крыўдзіць яго, то і ён будзе "добрыя дзела рабіць у хаце. Але, калі дамавога абідзець, ён не будзе даваць спаць і будзе тупаць па сценам" (запісана ў в. Лагвошчы ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.).

Паводле народных вераванняў, апекуном хлява з'яўляўся хлеўнік, які "глядзіць, каб хазяіва добра ўхажывалі за жывёлай" (запісана ў в. Лагвошчы ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.).

Мясцовыя жыхары пра чорта ўзгадвалі як пра "злога духа", у якога "можа абярнуцца малады хлопец, дзед, падарожнік, старац, пан" (запісана ў в. Бялёў ад Жогаль Арыны Міхаўны, 1910 г.н.). Каб засцерагчыся ад шкодных дзеянняў гэтай істоты выкарыстоўвалі траву ("зелье баркун"), пасвечаны мак, крыжык, а таксама "трэба прынесці з цэрквы со свечкой ладана і абкурыць ім хату" (запісана ў в. Бялёў ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.).

Прыведзеныя матэрыялы па народнай дэманалогіі сведчаць пра паэтычнасць светапогляду беларусаў-палешукоў, багацце іх міфалагічных уяўленняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., перакл. і паказ. У. Васілевіча. – Кніга 3. – Мінск: Беларусь, 2012. – 717 с

2. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С.Санько [і інш]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

## Народная міфалогія

Уяўленні пра Бога, сусвет і чалавека

Свет стварыў Бог. Раней яшчэ казалі, што свет трымаецца на рыбах. Зоркі на небе – душы людзей. Нават кажуць, што калі падае зорка, то нехта памірае, а калі загараецца, то нехта нарадзіўся.

У Бога я веру і ўвесь час лічу, што Бог на небе. Свет стварыў Бог за 7 дзён: за першы дзень – свет, за другі дзень – вада, за трэці дзень – суша, за чацвёрты дзень – сонца, луна і зоркі, за пяты дзень – рыб і ракушак, за шосты дзень – жывёлу і чалавека. На сёмы дзень Бог не тварыў нічога, але гэты дзень быў дзень яго. У гэты дзень Бог адпачываў.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Свет узнік ад Евы і Адама. Яны былі ў раю. Хадзілі голые і жылі ў саду. Вось іх падкусіла Сатана. Ева дала адкусіць яблако Адаму, і яны пачалі саромяцца адзін аднаго.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

У Бога я веру. Ета такі ж чалавек, як му. Еты ж чалавек усё можа: можа і палячыць, і хваробу паслаць, мы ж усе пад Богам ходзім.

Калі людзі паміраюць, то на тым свеце тожа жывуць. Мне здаецца, што Бог на тым свеце ўсіх прымае. Мабуць, толькі злых людзей наказвае, а потым усё роўна прымае.

У кожнага чалавека ёсць свой анёл-ахоўнік. Калі дзіця родзіцца, дяк яно родзіцца з анёлам. Анёл зберагае яго, а калі дзіця вырасце і робіць што-небудзь ні так, як трэба, то ён яго можа і кінуць. Тады еты чалавек робіцца нешчаслівы. Тады трэба памаліцца ці к бацюшцы схадзіць.

У зямлі краю няма, яна ж круглая. Калі Бог паявіўся на зямлі, то на небі зорка засвяцілася. Пасля таго і загараюцца новыя зоркі, як чалавек родзіцца новы.

На небе, дзе жыве Бог, знаходзіцца. Рай, а пекла далёка пад зямлёю.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Ганны Кандрацьеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шкрэблік М.***

Вось я веру ў Бога. Ён для мяне ўяўляецца ў вобразе чалавека.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Першых людзей звалі Адам і Ева. Ева з’явілася ад Святога Духа.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Яны былі ў саду (Адам і Ева), у раю. Сатана падкусіла Еву, каб яна ўгасціла Адама яблакам. Ён яго каўтаў і ўдавіўся, вось яно і засталося ў яго на горле.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.,***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Бога самога не бачыла, а Ісус Хрыстос – ето его сын. Дзева Марыя родзіла Хрыста от Духа Светого. Яна не бачыла его. Як Хрыста казнілі, то ён сказаў: “Дзе ж ты, бацько? Заберы мене, бо сільно я нацярпеўся”. І Бог забраў его на небо.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Ніканович Н., Траціннікавай А.***

Бог – гэта чалавек, які жыў і жыве, але яго ніхто не бача. Амаль усе людзі душой верацць у яго.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Свет стварыў Бог за шесць дзён. Шэсць дзён ён вялеў працаваць, а на сёмы – адпачываць.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Лелоевай Ніны Васільеўны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Торап К.***

Усім ведама, от як стварыў Бог чалавека па падоб’і сваім, ну ўсе ж знаюць, ды і “Біблію” чыталі, што называліс яны Адам і Ева. Ета мне яшчэ мая бабуля расказула. Некаторыя гаворацць, што чалавек праізашоў з

абязьяны, а я ў тое не веру. Ну, як ето можа чалавек празайці з абязьяны. Я толькі ў тое і веру, што чалавека саздаў Бог.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Чалавек быў створаны ад Бога. У ім усё добрае ад Бога, а дрэннае ад чорта: п'янка, разбой, курэнне.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Бог саздал зямлю, всё растушчэе на земле, а на шэстой день саздал з гліны і пяску первого чэлавека – Адама. Адам папрасіў у Бога саздаць ему жонку. І Бог з рабра Адама саздаў Еву. З галавы не саздаў, штоб ана не была вышэ мужа, с ног – штоб не была в ногах, а саздаў з рабра, как бы пасередінке.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-н),***
***студэнткайМарціновіч А.***

Бог хадзіў па зямлі, яму аднаму было вельмі сумна. Ён вырашыў стварыць чалавека: узяў горсць зямлі і сыпнуў з усей моцы. І лічыцца, што цела ў чалавека было ад чорта.

Жанчына, па павер'ю, першая грэх зрабіла, і Бог яе пакараў за гэта, таму яна працуе, як вол.

Чула, казалі: "Лепей працуй, чым гавары". У бабы язык як памяло. Можа, і гэта счыталася.

Канешне, лёс вызначаны ў кожнага. Хтосьці будзе гараваць ўсё жыццё, як дурны. А хтосьці – радавацца жыццю. Калі бацькі нарабілі шмат гора, і пражыўшы жыццё, не паквіціліся за гэта, дык бедным зробіцца дзіця, будзе пакутаваць усё жыццё: такі, мо, лёс.

Аднойчы жанчына дала яблык пад яблыняй мужчыну. І тый знянацку падавіўся. Яшчэ "адамаў яблык" называюць кадык.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Ніканові Н., Трацінікавай А.***

Як Ісус Хрыстос быў на зямлі і ішоў па ёй, то падышоў к вялікаму мору. Там хадзіла стада валоў. Хрыстос папрасіў вала, каб яго перавёз праз мора. Той перавёз. Вол пасля працы аддыхае і жуе жуйку. Вось яму Бог і даў аддых.

Потым папрасіў каня, конь яго не перавёз. Тады Бог сказаў: “Ты ўсё жыццё будзеш есці і не наешся”.

Падыйшоў к мужчыне. Мужчына запрасіў яго пасядзець і пакурыць, пасля паказаў яму дарогу. Падышоў да жанчыны, яна жыто жала, і ёй не было калі паказаць Хрыстосу дарогу. Яна паказала дарогу нагою, тады ён сказаў: “Ты будзеш век працаваць, не будзеш ніколі аддыхаць”.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Быў у мяне хлопец вельмі добры. І ў адну ноч, як ён папрашчаўся і пайшоў ужэ, сніцца мне сон. Захожу я ў комнатку маленьку. Убрана яна чысценько, і стоіць пасярэдзіне столік, накрыты белай скацерцью. На століку стаіць вазон аганёк і лежыць кніжка церковная з крестом. І стаіць каля століка сам Гасподзь у белом. Адкрыў тую кніжку і даў пацэлаваць крэст, а цэловаць – это непрыятносць. Гаворыць Бог, што ваш сужэны закацівсі за высокі горы, желтые пескі. Там сонцэ не грэе і луна не свеціць (я патом узнала, што его ўбілі). А патом спрашывае, ці е ў мене падруга. “Ёсць”, – гавару. Сказаў Бог, штоб я её пазвала. Зайшла моя подруга Наташа. Ён бярэ чорную ленту і дае ей, штоб завязала мне на голову і прачытала, што там напісано. А там напісано залатымі буквамі “Міша”. Бог говорыць: “Атламі сабе одну галінку аганька, а одну дай падрузе”. Ён сказаў, што пока я замуж не выйду, то мая падруга не выйдзе, і што замуж я выйду за встречного первого – Мішку.

Вот што сказаў Бог, тое і было.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

Ці ведалі людзі час сваёй смерці?

Кажуць, што раней ведалі людзі, калі наступіць смерць, а цяпера ніхто, кроме Бога, і не знае. Я знаю такі случай, што раней Бог па зямлі хадзіў. От раз ідзе ён па вуліцы і бачыць, што чалавек саломаю плот гародзіць. А етаму чалавеку трэ було ўжэ паміраць, а ў гэты час плот у яго паваліўся, ды суседскія куры ў гарод лезуць. Ён і вырашыў плот саломай загарадзіць. Убачыў ета Бог і кажа: “Чаго ета ты плот саломаю гародзіш, ці ён стаяцьме?” А чалавек гаворыць яму: “От, на мой век хваціць, усё роўна скора памру”.

Ну Бог, канечна, рассердзіўся, і з таго разу зрабіў так, штоб людзі не зналі, калі чалавек памрэ, калі іх смерць прыдзе.

А той чалавек, што саломай плот гарадзіў, пражыў, мо, больш як сто гадоў і яшчэ новы плот гарадзіў.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Зразу людзі верылі, што ім будзе смерць. Яны нічога не рабілі. І калі воны гарадзілі саломаю платы, а Бог сказаў: “Не так! Чалавечэ бедны, ты не знацімеш, калі твой дзень паследні”.

Верым у рай і пекла. Хто грэшны, то пападзе ў пекла, а хто спасённы – у рай. Рай знаходзіцца на небе, а пекла – у зямлі.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Колак Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Гавораць, калі чалавек шчаслівы, любіць, калі не ведае гора, дык ён ды і ўзлётае на ета неба. Можа, ён да раю набліжаецца.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Трацінікавай А.***

Верылі ў пасмяротнае жыццё, у рай, у пекла, бо калі чалавек добры, дык ён узлятаў ў рай. А пекла выглядае як балота, і грэшнікі вазілі там смалу. У пекле грэшнікамі правілі чэрці, прымушалі іх рабіць цяжкія работы.

Да пачатку свету быў рай, цвілі кветкі, спявалі птушкі. Усё выглядала памеркла. Бог убачыў усё гэта і вырашыў зрабіці чалавека.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Трацінікавай А.***

Рай – это сад был, в каторам усяго хватала, была очэнь красіва.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткамі Нікановіч Н., Трацінікавай А.***

Людзі заўсёды верылі ў рай і пекла. Баяліся зрабіць якую злоснасць, каб пасці ўніз.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Пасля смерці душы памершых прылятаюць на суд Божы, дзе рашаецца, падуць яны ўніз ці ўзнімуцца ў вырай.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Я веру ў рай. Калі ж чалавек быў добры, дык ён, канешне ж, у рай пападзе. Рай знаходзіцца на небе, там, дзе Божанька жыве. Людзі даўжны служыць яму ў раю, а калі плахі быў чалавек, Божанька яго не прымае і душа ягоная лятае між людзьмі, пакуль не выправіцца.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Тое, што мы бачым, то е свет.

Высока на небе ёсць вялікі, прыгожы сад – рай, туды попадаюць людзі без грахоў; цьма – там адныя грэшнікі варацца ў катле з кіпучай смалой. Бог змагаўся з нечысцю, але яна жыве сярод нас, таксама на небе ёсць анёлы, яны дапамагаюць Богу.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Лелоевай Ніны Васільеўны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Торап К.***

Ангел даецца каждому человеку пры нараджэнні. Пакідае, як чалавек памірае: Дух – к Богу, а цело – у землю. Чалавек раждаецца, і Бог дае яму судзьбу. Чужы человек прыехаў у дзеревню і папрасівся на ночлег. У тым двары, у які яго пусцілі, должна была жонка родзіць. Эты прыежжы спіць у дварэ на возе. Потым бачыць, як прыйшлі ангелы пад акно, як тая жонка рожала. Советуюцца ангелы, якую судзьбу даць дзіцяці. Одзін сказаў, што як дзіця вырасце і будзе жаніцца, то ўтопіцца ў калодзежы. Этот начлежнік попрасіўся за кума ў іх. Вырос хлопчык і калі женівся, то кум эты прыехаў на свадзьбу, штоб калодзеж забіць. І хлопец не ўтапіўся, але лег на доскі і скончаўся. Это та сама судзьба. От яе нікуды не дзенешся.

***Запісана ў в. Бялеў***
***ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шульга М.***

Калі нараджаецца дзіцё, то ў яго з'яўляецца анёл на правым плячы. Ён дапамагае яму па ўсяму жыццю. А знікае ён толькі тады, калі здрадзіць свайму Богу.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

Адкуль узялася нячыстая сіла?

Колісь жылі сабе людзі і ніякай сілы не зналі. А тады шчэ Бог па зямлі хадзіў, прыходзіў к людзям, як брат родны, вучыў, як трэба на свеце жыць, як адзежу рабіць, скаціну гадаваць. І тут людзі понялі, што каму Бог даў розум, той можа зрабіць, што захоча. Казалі, што яны і самі бы Багі, а Бог таму не даў ім улады, што баіцца, каб яго самога з неба не спіхнулі. Абідзеўся Бог на людзей, дый пайшоў сабе на неба. А людзі начали ўпраўляць усім, гэта

значыць уладу ўзялі над усім: звярамі, пціцамі. А Бог думае сам сабе, што людзі будуць жыць добрэ на землі, калі не будуць камандаваць адзін над адным. А калі захочуць маць уладу адно над другім, то пазнаюць і добрае, і плахое. Пра ета дазнаўся шатан. І начаў ён падбіваць сільнейшых, каб узялі ўладу над слабейшымі. Тые пачалі застаўляць слабейшых работаць над іх хазяйствам і на іх. А тады паслаў Бог ангелаў, каб яны сказалі людзям не слухаць паноў, ды стала яшчэ гаршэй людзям жыць. Тады паслаў Бог другі раз ангелаў на зямлю ваяваць з нячыстай сілай і чэрцямі. Але ізноў нічога не маглі яны зрабіць. І тады Бог паслаў на землю розум, і еты розум начаў расці. Толькі расце еты розум паціхоньку. От як вырасце розум, як сонцэ, тады людзі і пазнаюць адкуль узялась і нечысць, і ўсё плахое на землі.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

На небе была вайна паміж ангеламі. Злых непаслушных ангелаў Бог скінуў на зямлю. Ані і здзелаліся разнай нечысцю, дзелаюць людзям зло.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

У пана была вельмі хароша дачка. Бацькі ее хацелі выдаць замуж, але она ні за кого не хоцела іці. А сама цэлымі ночамі недзі гуляла. І пан прыставіў до ее своіх служкоў, шоб оны за ею наблюдалі. І то ж оны побачылі. Паненка бегла ў поле, а з жыта до ее выходзіў хорошы хлопец, і оны міловаліся до першых пеўнеў. Як толькі певень заспявае, то хлопец знікае. Росказалі служкі про гэтэ пану, і он пошоў до знахоркі. Она сказала, шо той хлопец сам сатана, і трэба дзеўцы, шоб она не бачыла, уплесці ў косы зелье буркун. Маці ўплела ей у косу зелье, колі она спала. Пошла дзеўка на свіданне, хлопец выўшоў з жыта, а до ее не подходзіць. Она до его, а он от ее. І кажэ: “Выкінь буркун, то будзеш, дзеўка, моя”.

Она і туды і сюды, не знае, шо ідзе. А сатана прыняў свой воблік і знік. Паненка пошла замуж і зажыла шчасліво.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Бобрык Тацяны Максімаўны, 1937 г.н.,***
***студэнткай Блоцкай В.***

Хадзіў чорт па зямлі, раззлаваўся на грэшнікаў і ад гэтай злосці плюнуў на зямлю. І на гэтым месцы з’явілася балота.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

Калі памёр чалавек, то яго душа вылятае з яго. Яна жывая. Душа лётае пасярод нас, пакуль памерлы не прадстане перад Богам. Лётае ажно сорак дзён, а потым Гасподзь судзіць яе за грахі.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Пярун

Пярун – ета гром, а можэ, і сіла такая, што камандуе громам і маланкаю. Калі на дварэ гром, дык у нас кажуць, што ета Бог сварыцца, можа яно і так. Яшчэ гавораць, што ён на калясніцы па небі ездзіць, такі сільны з доўгай барадой, калі ён едзе, то і адбываецца гром, а от радуга яго суправодзіць. Ён яшчэ можа паслаць кару на таго, хто нядобры чалавек або з нячыстаю сілаю знаецца. І от яшчэ, калі птіцы прылятаюць з цёплага краю, тады ён ажывае, а на зіму ён замірае.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Балотнік

Балотнік – ето чорт, екі жыве ў болоці. Колісь мой брат пойшоў з соседом у болоцістое месца ля вёскі рыбу ловіць, просёк полонку, наклоніўса к водзе, а ў водзе ему отрозілосо, што глядзяць на его і говораць: “Цебе ўжэ ждуць”. А самі ў чорном з бліскучымі гузікамі. Брат спужаўся і ўцёк. Думаў, шо ў водзе, а оны радом стоялі.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Комар Надзеі Мікалаеўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Вадзянік

Жыве ў водзе. Глаўнэ заняціе – топіць людзей. Як ідзеш у воду, трэба перахрысціцца. Робіцца водзяны з самоўбійц. Пужае рыбу ля рыбацкіх сеток, падпільноўвае купальшчыкаў і цягне за ногі на дно. Вадзяны – стары, з доўгімі зялёнымі косамі і бородою. Як якая дзеўка ўтопіцца, то яе вадзяны робіць русалкаю.

***Запісана ў в. Хвойка***
***ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Усе знаюць, што я добры рыбак, вельмі люблю рыбу лавіць. Багата хто едзе на рэку, а мне і возера нашага хватае. Сколько нам з бабой той рыбы трэба. Так, лаўлю больш для ўдавольствія.

А раз такое было са мной, што і зараз успомніць страшно. Это было летам, года мо 2 тому назад. Пашоў я на рыбу, а ноч ужэ была. Я часто ноч'ю хажу, лучшэ ловіцца, да і хапутны не ўбачыць. У тую ноч цёмно не было, луна свеціла як раз. Пашоў я з настаўкай, накрываю прама з лодкі, пападаецца калі 2-3, а калі і нічога няма. І тут чую шлоп-шлоп, ек бы ідзе хто па вадзе возле берага. Думаю: "Хто это рэшыў у такое врэмя тут брадзіць?" Паварачываюс – і аж абамлеў! Ідзе прамо по водзе, а там глыбіна была ну, метра палтара, два, дзед нейкі медленна так ідзе. І хоць он быў у метрах сарака ад мене, мо меньш, але ж я добра пабачыў, што ён быў у нечым белым, доўгім, і косы белые, доўгія. Госпадзі! Як я перапужаўся! Настаўку ў лодку і хучэй дадому. Проплыў так далековато, павернуўся глянуць, а вон сідзіць ужэ на берэзі, весь белы. Дамоў прышоў чуць жывы. Каб сказаў, што п'яны быў, а то ж не піў. После того ноч'ю на рыбу больш не хажу. Не знаю, хто это быў, хто его ведае. На свеце ўсего хватае. От такі случай быў са мною.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Пашэвіча Міхаіла Пятровіча, 1940 г.н.,***
***студэнткай Анішчык Н.***

Я сама не бачыла, але ж кажуць людзі, што ёсць вадзянік. Ён жыве ў вадзе, балоце і з'яўляецца яго гаспадаром. З выгляду ён як чалавек з валасьмі і барадою, увесь зялёны-зялёны, пакрыты водараслямі і цінай. Кажуць, што ён топіць людзей і цяне іх сабе на дно.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Вадзянік перакідае лодкі.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Плылі на лодцы людзі і на іх напалі мошкі, а одна жонка гаворыць: "Дзе той губаты, шоб мошак отогнаў?" А другая кажэ: "Хочэш побачыць, то побачыш". І тут з воды нешто вылезло і перэвернуло лодку. "Ну шо, пабачыла?" – сказала ддругая.

***Запісана ў в. Малешаў***
***Комар Надзеі Мікалаеўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Вадзянік жыве ў вадзе. Ета стары чалавек. Он з барадою, цела пакрыта цінай. Вадзянік топіць тых, шо ідуць у воду без крыжа.

***Запісана ў п. Чырвонае***
***ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

Ваўкалак

Пярэвороцень, што сам перарабіўса ў воўка. Такі пярэвороцень большы за настояшчэго воўка і сільно крыважэрны. Штоб стаць воўкам, чалавек ідзе ў лес і там утыкае нож у пень і перакульваецца цераз яго. Калі хто-небудзь забярэ гэты нож ці што з адзежы, то такі чалавек ўсю жызнь застанецца воўкам. Ё воўколакі, якім ето подробілі. Такія воўколакі й вуюць не по-воўчы, а як усе стогнуць. Чалавечаго розуму яны не губяць. Могуць гадамі бегаць як воўкі, але на ўсю жызнь ніколі імі не астануцца.

***Запісана ў в. Хвойка***
***ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Ведзьма

Ведзімы – гэта злыя жанчыны. Убачыць можна на Пасху ў 12 часоў, калі званы білі. Ведзьмы стараюцца схапіць вяроўку. Казалі: “О, вось ведзьма хацела схапіцца за вяроўку”.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Акунец Ніны Іванаўны, 1948 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Ляхавічы Жыткавіцкага р-на),***
***студэнткай Бойка Н.***

Ведзьма магла ператварацца ў жабу. Вось ператвараюцца і карову ссуць. Еслі ты пашкодзіш ёй лапу, у той жонкі будзе там калечанне, а еслі галаву – будзе калечаная галава.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Берднік В.***

Ведзьма – гэта злая чарадзейка, якая звязана з нячыстай сілай і надзелена звышнатуральнымі здольнасцямі. Ведзьмы маюць сувязь з людзьмі і з нячысцікамі. Ведзьмы могуць быць ад нараджэння, могуць быць ад прыроды. Ведзьмай становіцца дзяўчынка, народжаная ў трэцім пакаленні па-за шлюбам. Можа быць ведзьмай і жанчына, якой паміраючая ведзьма паспела перадаць свае веды. Ведзьмай станавілася жанчына – супружніца чорта.

Ведзьмы шкодзілі жыту – яны рабілі заломы. Ведзьмы робяць заломы ноччу голымі. Звычайна гэта адбываецца ў Купальскую ноч, на Траецкім тыдні і ў час, калі каласіцца жыта і па ім бегаюць русалкі.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны,***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Была очень красівая дзевушка. З ею гуляў парень. Другая прыраўнавала яго, хацела сама гуляць з нім. А ён гуляў з красіваю. Тая, што

ён любіў, пасла скот. І вот она погоніць скот, а прыгоняе домой сільно замученая. Радзіцелі замячалі, што дочка все сохне да сохне, хоць і берэ з сабою есці. Оны ее спрашываюць, што з ею. Она говорыць, што не знае: "Когда скот стане на стойло, прыходзят ко мне тры хлопцы у шляпах і іздзеваюцца. А ліца у ніх не відно".

Радзіцелі пошлі у церковь, посвецілі біркуна і ўплелі у косу.

Став скот на стойло, радзіцелі стоят сцерегут. Чуюць, едзе как веселле, іграюць, спеваюць у воздухе. Это ехалі черты. Оні б её ўже б прыдушылі, ім надо была душа. Едуць, граюць, крутяцца: "Штоб ні біркун, то ты б дзевка мая".

І паехалі черці. А тую, што наслала іх, задушылі.

***Запісана ў в. Бялеў***
***ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шульга М.***

Было гэта даўно, калі я яшчэ дзеўкаю была. Жылі ж мы тады ў Турові. А случай буў у суседаў нашых – Маркевічоў. Тады не так было, як зарэ ў нас: хата і адрына ў адным дварэ. Тады адрыны стаялі далёка ад хат, туды, к рэке бліжэй. От і кажа раз Іван (сусед): "Не знаю, што робіцца. Кожны вечар закрываю адрыну, як і трэба, а ўтром прыхожу – адкрыта і корова молока пошці не дае". І так колькі ўжэ дней у іх робіцца. От Іван і рэшыў схавацца ў адрыне і пабачыць, хто ее адкрывае. Так і зрабіў. І бачыць: дзето каля часоў дванаццаці адчыняецца адрына, заходзіць нека жонка, бярэ столок, садзіцца і пачынае карову даіць. Ён еле ўтрымаўся, каб біцца к ёй не кінуцца. Вырашыў глядзець, што будзе далей, тым больш і жонка, то была ек бы знакомая. А ана трохі падаіла, устала і ставіць убок столок. А ў гэты міг Іван схапіў сокеру (яна ек раз блізко лежала), да і цяпнуў той жонцы па пальцу, ек яна за столок дзержалася. Тая толькі войкнула да і ходу з адрыны. Яна туды болей ніколі не прыходзіла.

Цераз сколько дней пашоў той Іван у забегалаўку нашу, збіраюцца там мужчыны, выпіваюць, і пачуў, як адзін з іх гаварыў: "Хлопцы, а ці бачылі вы, што Лагезіха ходзіць з рукой заматанай? Мая суседка пытала ў ее, што зрабілася, дык тая кажа, што рубала дровы ды і па пальцу секанула". Вось тут Іван і поняў, каго тая жонка яму нагадвала, тая, што ў адрыне была. Аказваецца, што Лагезісі ён пальца адрубаў, а про ее людзі казалі, што ведзьма яна і недобры чалавек. Чаго шла ў чужую адрыну ноччу? Ясна, што нешта тут нечыста.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Бобрык Вольгі Фядотаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Анішчык Н.***

Ведзьма магла скідвацца кім хоць: жабаю, варонай. Гэта істота, якая дзелае людзям пакасці.

Каб засцерагчы жывёлу ад ведзьмаў, у адрыне затыкалі на Івана Купалу шыпшыну і лажылі асінаву палку папярок у адрыне. Вешчы, якімі прыварожвалі, палілі на перакрыжаванні дарог і не бралі голымі рукамі.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Была ў мяне дружка, а ў яе сястра, старэйшая за яе. Валяй звалі. І ці на Пятра, ці на Купалу, добра не скажу, гуляе маладзёж. Крычаць, крычаць, спяваюць і адкуль не адкуль, стаіць яна. Уся ў белым, косы распушчаныя, доўгія. А ў сястры яе пытаюць, а яна гаворыць, што не можа такога быць, што Валя дома засталася. А назаўтра пытаюць яе, ці была яна там, а яна плача, клянецца, што там не была. А на следуюшчы год, на той жа дзень, ішоў наш Коля, ён быў на свінарніку сторажам. Нёс што-та, ці муку, ці што. А побач саседскі хлеў стаяў. Ён шоў каля плота і глядзіць – дзвер ў суседскім хлеве і яна, Валя, адтуль ідзе. Ён па адзін бок ішоў, яна па другі.Ён хоп за плот і прытуліўся, прыгледжваецца. Ні спужаўся, нічога, прыгледжваецца. Глядзіць, а яна з вядром ідзе да сваёй хаты. Аказваецца, яна хадзіла ў кароў малако красці. Гаварылі пра яе, што яна ведзьма.

Было ў нас яшчэ такое. Памерла жанчына і аставіла дзіця малое. Пра яе гаварылі, што яна ведзьмай была, дык яна кожны дзень хадзіла да дзіця. Яна і агарод выхадзіла, но яе не можна было ўбачыць, сустрэць. Яна яго не карміла, грудзей не давала. А кагда дзіця плача, яна прыходзіла, і яно смяялася, як яна яго забаўляла.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Назаранка Надзеі Мінаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Страха К.***

Чула я гісторыю пра адну вядзьмарку. Адной жанчыне яна прырабіла, каб памёр яе сын. Гэты сын пачаў вельмі часта хварэць, і яна вырашыла схадзіць да гадалкі, каб пагадала. Яна нагадала, што ведзьма ўтыкнула ў падушку прыробленую іголку. І каб адрабіць гэта, патрэбна яе знайсці і прыляпіць глінаю ў печ у самы верх. І тады гэтай вядзьмарцы стане вельмі дрэнна, і яна прыйдзе і будзе прасіць адляпіць гэту іголку. Але гэта жанчына не знайшла гэту іголку, і яе сын памёр.

А яшчэ чула, што гэтая ж ведзьма прырабіла, каб гэтай сям'і дрэнна было. Яна ім падкінула клубок розных нітак прыробленых пад хату. Але жанчына знайшла яго і спаліла.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Чарнушэвіч Алены Пятроўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

На Купальнага Івана ходзяць ведзьмы. Оны ператвараюцца ў жаб, заходзяць у хлеў і адсасваюць у каровы малако. Каб не хадзіла, ставілі вілкі ў дзвярах.

Шоб от ведзьмы ніхто нічого не мог забраць, то она забівала ў парог падкову і ставіла пад стол грэбёнку.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Ведзьма – гэта знахарка, она молоко отбірала. На Купало её ловілі. Ведзьмы бояліс Купального Івана. Ідзе яна не ведзьмой, а скінецца чым-небудзь. Было таке: выйшаў мужык у сені, а там цёмно і нехто корову доіць. Уключыў свет, нікого нема, а выключыў, зноў доіць. Значыць, ведзьма кім-то обернулас і доіла.

Ведзьма ці ведзьмак, шоб побачыць умершых родзственнікоў, нешто говорылі і выходзілі ў 12 часоў ночы на двор і бачылі іх.

Калі ведзьма помірае, то аддае свое знаніе, шоб на тым свеці добрэ было, і покуда не перэдасць, то не помрэ.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Комар Надзеі Мікалаеўны, 1939 г.н.,***
***Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Я ведзьму не бачыла. Але мая маці мне пра яе расказвала. Гэта жанчына такая. Ведзьма можа прэврашчацца ў любога звера ілі пціцу. Яны, гэтыя ведзьмы, зло дзелалі людзям: забірала малако ад каровы, робіць разлад у гаспадарке.

Ведзьмы могуць і людзей пужаць. Каб засцерагчыся ад ведзьм, трэба крапівой вакруг дома аблажыцца. Тады ведзьма не падойдзе бліска.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

На Купального Івана ходзяць ведзьмы. Оны ператвараюцца ў жаб, заходзяць у хлеў і адсасываюць у каровы малако. Каб не хадзіла, ставілі вілкі у дзверах. Шоб от ведзьмы ніхто нічого не мог забраць, то она(ведзьма) забівала ў парог падкову і ставіла пад стол грэбёнку.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Ведзьма – ета чалавек, каторы звязаны з нячыстай сілай. Ана можа прырабляць, лячыць людзей, ператварацца ў маладзіцу, жабу. Гэта бувае на Купальны Іван. І калі дзяўчыны шукаюць папараць-кветку, ана стаіць ззадзі, і, калі хтось павернецца, то ана можа штось дрэннае наслаць на чалавека.

***Запісана ў п. Чырвонае***
***ад Цімашчэня Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

Это обукновенная жэншчына, якая робіць людзям зло.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Ведзьма ходзіць на Івана Купалу да доіць корову, таму шукаем на гэта свята баркун і тою затыкваем у хлеў, каб ведзьма не шла.

***Запісана ў в. Вараніно***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Ведзьма або хлеўнікам яе называлі. Була про яе одна легенда. Зайшла одна молодзіца доіць корову, а там сядзіць жаба і ссе молоко, укусіла свекруву за руку. Таму перад Іваном Купалом у калодзец кідалі мак, каб русалка не папала, і кідалі мак свечаны вакруг адрыны.

***Запісана ў в. Буразь***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Вядзьмак

Кажуць, хто калдуе ці коровам прырабляе, той душу чорту прадаў. У нас одна пачытала кнігу ведзьмароў, а рабіла ўсё не правільна. То ее чэрці попацегалі по ночам по полям да балотам. Об’ездзіла 12 церквей, пока все это кончілось.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шульга М.***

Умелі калдуны прэўрашчацца ў сабак, катоў. На Купалу дзелаліся катамі, сабакамі, кідаліся на людзей. У каровы малако атымалі, смерць чалавеку дзелалі.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Марціновіч А.***

Жывуць у нас і каўдуны. Быў такі выпадак. Сідзелі жанчыны да ночы ў хаце, а на двары стаяла калода з сучком. Раней на калодзе людзі пабачылі завязанае сена. Гэтае сена старэйшая жанчына спаліла на перакростку дарог і занесла на бягучую ваду. А на другі дзень прыйшла да іх жанчына-суседка і ўсё пытала: “Што вы робіце?” Гаспадыня маўчала, таму што адказываць

нельга, іначай чары не сыдуць. І гэтая жанчына, якая прыйшла, і была чараўніца.

Раней людзі звазілі навоз у поле, а вясной, калі сеялі, то навоз развозілі па ўсяму полю і ў ім знайшлі невялічкую ляльку. Гэта значыць, што нейкі чараўнік нейкаму нешта зрабіў дрэннае.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Каўдун – та сама вядзьмарка, якая падчыняецца чорту.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Е тут у нас колдун одзін. Усе людзі про его это кажуць. Да я, як кажуць, на сваёй шкуры его колдуйство іспытала. Это было ў 90-м году. Пошла я ў праўленіе колхоза, трэба было на коня запісацца, шоб картоплі на городзі выбраць. Ешчо з села не вышла, як мене Міша дагнаў, он тожэ туды шоў, пошлі разам. Я хоць і знала этого дзеда і боялас его, але ж мусіла іці. Шлі, говорылі по дорозі. А ек зашлі ў праўленіе, а там людзей сабралос ужэ багато, то вон тры разы громко так сказаў: “От, людзі, шоб вы бачылі, як эта баба бегла!” Я ўжэ поняла, шо беда это, да говору на его: “Да ты шо, Міша? Да дзе ж я бегла? Да мы ж шлі разом з тобою ўсю дорогу”. Але вон не слухаў мене. А на наступны ранок я с кроваці не слезла, так балелі ногі. І от мучаюс я ўжэ 15 год. Екіх толькі лекарстваў не брала, нічого не помогае, хадзіць пошчі не магу. Дачка з Гомеля возіла мене к некай знахарцы, а та пашэптала на воду і кажэ: “Вам зроблено от людзей это. І я бачу, што вельмі дзед сільны, але я папробую з ім пабороцца”. Але ж потым ее дзеці забралі некуды, ту бабу, і я больш з ёй не ўстрэцілас. Так я, мабыць, і помру ўжэ. А ўжэ этого Мішы да бацько быў колдун. Калі он паміраў, то вельмі мучыўся доўго, покуль хомут на его не положылі, толькі тады помер. То это ж ясно, што колдун. А такіе людзі, калі шо знаюць, усегда дзецям сваім перэдаюць свої знанія. От такая беда со мной была.

***Запісана ў. г. Тураў***
***ад Субат Галіны Фядотаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Анішчык Н.***

Кадук

Кадук – ета страшная пачвара. Ета такі чалавек, ні звер, але больш пахожы на звера з вялікай кашматай галавой і шырокаю, ледзь не да вушаў.

Людзі, злуючыся, часам кажуць: “Каб кадук яго ўзяў”, або “Вазьмі яго кадук!..” Кадук не ўсягда бярэ, бо мае сілу толька ў ліхую часіну, што выпадае на ўсходзе сонца, удзень і повнач. Напэвно, людзей зусім не застолося б, каб етая пачвара магла прыходзіць, калі ёй вуздумаецца. Кадук

не мае вулады над чалавекам, а жджэ , калі хтось яго пазаве. І прыбягае ён у такі ліхі час, калі што ні папросіш – усё збудзецца.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Аліфяровіч Тамары Ігнатаўны,***
***студэнткай Жураўлевіч К.***

Кікімара

Кікімары сядзяць у балотах. Гэта нячыстая сіла. Паяўляюцца воны ўвечары. Сабіраюцца, каб гуляць друг з другам. Еслі іх чалавек увідзіць, то яны накідаюцца на чалавека. От ніх нада ўцякаць.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Берднік В.***

Кікімара – ето та, што шуціць, неблагапалучнэ. На неўдачнікоў говорацъ – кікімара.

***Запісана ў в. Малешаў***
***Кошмар Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Лазнік

Пашла маладзіца замуж за старога чалавека. А сама сабе смяецца, што мужык стары, ды называе яго чортам. Радзіла яна сыночка. Аднаго дня пайшла яна ў баню з сынам, а старому мужыку сказала, каб сядзеў ля бані, а яна яму вынесе сына. Памыла яна дзіця, адкрыла дзьверы і кажа мужыку: “Ты, стары чорт, тут?” “Тут” – кажа. “Дык, от малога забяры”. І аддала дзіця, а сама не бачыла, каму дае. А далей мужык кажа, каб дзіця выносіла. Маладзіца кажа: “Якое дзіця, я ж табе яго аддала”. Сталі яны шукаць дзіця, ды не знайшлі. А той, каму яна аддала дзіця, быў стары чорт Баннік. От як, смяялася з мужыка свайго, чортам называла, ды і аддала дзіцё сваё чорту.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Лясун

Лешы жыве ў лясу. Ён асцерагае лес ад паганых духаў. Ён дзелае ўсё толькі харошае. Жыве ў норках.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Берднік В.***

Лясун выглядае змрочным вялізным веліканам з вялізнай барадой. Можа прымаць выгляд любога звера і станавіцца ніжай травы. Часам ён блудзіць людзей па лесе. Каб пазбегнуць гэтага, трэба пераапрануцца шыварат-навыварат. Надзвычай дужы, з корнем вырывае дрэвы.

*Запісана ў в. Вятчын*
*ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.,*
*студэнткай Кудзелька В.*

Тожэ добры дух, ахоўвае лясы, жыве ў лесе. Сам вялікі, як дзерава, ну каб добрэ было хадзіць, глядзець усюды. Стары і ліцо белае, як кара на бярозе, вушы доўгія, каб усё було чуць добра, вочы такія, што блісцяць ноччу. Гаворацьь, што дрэвы валіць, калі злы. Можа пашуціць з чалавекам, калі яму не нравіцца, от дажа заставіць яго папахадзіць па лесу, дажэ на адным месці, а чалавек думае, што заблудзіў. Але ён у асноўным памагае людзям, водзіць у такія мясціны, дзе многа грыбоў, ягад, пціц і звярэй наганяў ахотнікам насустрач. Калі заблудзіць чалавек, то з лесу можа вывесці яго. Канечна, не трэба злуваць яго, бо тады бяда. Бувае, прыдуць людзі ў лес, крычаць, а не трэба етэ рабіць. Зрабіў сваё дзела, назбіраў ягад ды ідзі з Богам.

*Запісана ў в. Дуброва*
*ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,*
*студэнткай Клочка А.*

Раньшэ была корчма, вот эта, дзе абеліск, і ніхто з дзяцей не мог пайсці туды, вот мой бацька ўжо быў, он не меў права туды іці. Там, гаварыў, былі такія мужыкі, што выпівалі і стаканы лопаліся ў руках. І калі дзіця паявілася там, ужэ ўсё, умірала. Гаварылі, што тое месца было загаворана.

Мы як-та пайшлі па ягады, блізка да дзярэўні ў лес. Назбіралі, чуем – недзе каровы мыкаюць, ну мы пайшлі ў тый бок, да дзярэўні. Ходзім, ходзім, і ўсё на одно і тое месца вяртаемся. Гукаліся, гукаліся, а так і не змаглі вярнуцца, так і засталіся ўдваіх начаваць. Наплакаліся, страшна, нібы нехта блізка ходзіць. Назаўтра раненька ўсталі і глядзім, дзярэўня саўсем блізка відна. Вот такое там было месца загаворанае. Нам патом сказалі, што гэта лясун нас не выпускаў і пужаў.

*Запісана ў в. Бялёў*
*ад Назаранка Надзеі Мінаўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Страха К.*

Лесавік той, што гукаем у лесе, то адгукаецца. Калі ночовалі ў лесе, то ноччу моўчалі, шоб лесовік не прышоў.

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,*
*Комар Надзеі Мікалаеўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Кошман А.*

Ён паўнапраўны гаспадар леса: усе жывёлы і птушкі слухаюцца яго. Ён можа пераўтварацца ў каго-небудзь. Часцей у мядзведзя або здаравеннага мужыка. Лешы не столькі шкодзіць людзям, сколькі злосна жартуе. Калі

прыходзілі за грыбамі для сябе, дзяцей да з добрым настроем, дык ён дае знайсці грыбоў столькі, сколькі патрэбна для тваёй задумы.

А калі дрэнны чалавек прыходзе, які ўсё на базар вязе, каб грошай пабольш зарабіць, дык ён злавацца пачынае, можа завесці ў сыры гушчар і пакінуць там яго, каб сам шукаў дарогу.

Аднак да прамой пагібелі лешы чалавека не даводзіць. Як правіла, ён можа туману ў вочы напусціць, каб чалавек збіўся з пуці. Але ён карае толькі за нерадзівые паводзіны к чаму-небудзь або за непаважанне да яго лёсу.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Русалка

Русалкі – ето такія дзеўкі з валасамі да пояса, якія ўтапіліся. У вадзе яны жывуць. Кажуць, што яны і па зямлі хадзіць могуць.

Неяк ішла адна знахарка вечарам дадому і знайшла ў траве красівыя такія бусы, такія празрачныя-празрачныя, як тая сляза. Забрала яна іх, а ноччу прыснілася ёй русалка, якая казала: “Аддай нам нашы бусы”.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Ганны Кандрацьеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шкрэблік М.***

Русалка – гэта жанчынападобная істота. Русалкі могуць быць у вобразе маладой і прыгожай дзяўчыны, можа быць з тулавішчам рыбы, з доўгімі, распушчанымі зялёнымі валасамі.

Русалкамі становяцца дзяўчынкі, памёршыя да хрышчэння, дзяўчаты-тапельніцы, а таксама дзяўчаты, якіх праклялі іхнія маці. Русалкі могуць жыць у полі, лесе і ў вадзе. Вельмі небяспечнымі становяцца русалкі на Русальны тыдзень пасля Тройцы. Тады асцярагаліся купацца, хадзіць у лес, у поле.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Русалкамі становяцца дзеўкі, што ўтапіліся, а таксама някрышчаныя дзеці. Русалкі маюць доўгія распушчаныя валасы. Адзежы яны не носяць. Жывуць яны на дне рэк гуртамі, але ў маі выходзяць на паверхню, водзяць карагоды. Таксама яны гушкаюцца на дрэвах, як на арэлях. Калі ў гэты час хто-небудзь з маладых хлопцаў трапіць да іх, яго заказычуць да смерці.

***Запісана ў в. Вятчын***
***ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Русалкамі маглі стаць незамужнія дзяўчыны ці, можа, тыя дзевачкі, якія ўтапіліся і іх не знайшлі.

***Запісана ў в. Сяменча***
***ад Чорнагалоў П. П., 1927 г.н.,***
***студэнткай Новікавай Г.***

Русалкамі раней былі дзяўчыны, якія пакончылі жыццё самаўбійствам. Жылі ў жыце і вадзе.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Русалка падобна на жанчыну з доўгімі валасамі. Яна маладая і вельмі прыгожая. Русалка адрозніваецца ад людзей тым, што мае хвост рыбы.

***Запісана ў в. Сяменча***
***ад Чорнагалоў П. П., 1927 г.н.,***
***студэнткай Новікавай Г.***

Русалак я не бачыла. Але када мы хадзілі на поле жыта жаць, дык было такое, што тоненька месцамі жыта ляжала к зямле блізенька. Вось тады старэйшыя гаварылі, што эта тут русалкі гулялі ноччу, у жыце.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Назаранка Надзеі Мінаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Страха К.***

Русалкі – гэта абыкнавенныя дзевачкі, што памерлі нехрышчоныя. Жывуць яны ў вадзе. Яны падобныя на рыбу. Чалавечае ў іх толькі рукі, длінныя валасы, есьцека і грудзі. А самае чароўнае ў іх – гэта іх сінія вочы, якімі яны завабліваюць маладых хлопчыкаў. Кажуць, калі хлапец паглядзіць ім у вочы, то больш ніколі і не вернецца.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Русалкі– ето незамужніе дзеўкі, што ўтапіліся.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Маркевіч Таццяны Мікалаеўны, 1982 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Пасля Тройцы нядзеля называлас духовой ці русальной. Сčыталос, шо ў это врэмя русалкі выходзілі з вады, гулялі, бегалі по полю, заманьвалі людзей, шоб іх шчыкатаць. А русалкі, ето утонуўшые дзеўкі, екіе померлі без хрышчэння. Оны все з распушчанымі косамі. На берагу оны спеваюць песні і хто іх пачуе, то того оны зацянуць на дно. Е такі русальчын Велікдзень, на екі не холзілі дзеўкі купацца. А колі ходзілі, то бралі с собой полын, оны (русалкі) его бояцца.

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Клімовіч Веры Ільінічны, 1924 г.н.,*
*студэнткай Кошман А.*

Русалкі, ек жонкі, пейсатые, звязаные з чорцікамі, ены не божэственные, ены як і вадзянік.

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Кошман А.*

Русалка – ета прыгожая дзяўчына, каторая выходзіць з вады. У яе доўгія валасы, а на галаве – вянок з кветак. Ана збівае путнікаў з дарогі. Калі к ёй хтось падыйдзе, то ана можа забраць к сабе. Ані пакасцяць людзям, бо хаваюць адзежу.

*Запісана ў п. Чырвонае*
*ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,*
*студэнткай Макарэвіч Е.*

Обукновенная жэншчына, чорные косы аж блішчаць, а дзе яны жывуць, ніхто не знае. Одна Кубанка, это на ее так говорылі, это жэншчына, расказвала, што бачыла, як у двоіх ці ў чатырох вылезлі з воды, поселі на бережку голе і смеюцца. Каге началі му подыходзіць, а яны у воду боўць і нема іх. І позіралі, позіралі, мо дзе ўбачаць, і ніхто не вуплыў. А ці ены ў самом дзеле бачылі ці не, я ж не знаю. Ну, говорылі, што іе русалкі, обукновенные людзі, настояшчые жэншчыны.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Кудзелька Ю.*

Русалкі – колісь пужалі, шо ў жыце сядзіць з каменнымі цыцкамі русалка і зацягне ў воду, таму і баяліса.

*Запісана ў в. Буразі*
*ад Блоцкай Кацярыны Сцяпанаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

Хатнік

Як гаворацьб дамавік доўжан быць у хаце. Ён ахраняе дом. Калі яго не будзе, то прыйдзе злы дух. Мы дамавіка не бачылі. У хаце ён заўсёды сядзіць на покуці, там, дзе абразы.

Калі чалавек перасяляецца з адной хаты ў другую, дамавік ідзе разам з ім. І зваць яго не трэба, ён сам пойдзе.

Бывае, сядзіш у хаце і тут вдруг пачынаюць трашчаць абоі, як хто іх рве. Эта ўсё дамавік робіць.

*Запісана ў в. Боркі*
*ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.,*

***студэнткай Берднік В.***

З выгляду пахожы на чалавека, напомінае хозяіна хаты. Домовы мае жонку і дзетак. Домовы носіць белую адзежу, часам адзяе і адзежу хазяіна, але хутко скідае. Домовые буваюць добрые і поганые. Поганы домовы скідвае ўсе рэчы з места, шчыкае, а ўночы спрабуе задушыць хазяіна. Добры ж домовы глядзіць за парадкам у хаце. Глядзіць коней і кароў, таму іх трэба старацца купляць одное масці. Любіць ён хазяеў рабацяшчых, неп'юшчых. Не любіць шуму і сваркі, неакуратнасці ў рабоце. Сільно абідчывы. Каб улагодзіць, яго трэба ўгошчаць, ставіць у прыпечак конхветы ў місачцы. Бывае, домовы крадзе ў молодзіц дзяцей, кладзе на іх место палена. Домовы е ўсюды. Шчэ домовы можэ посварыць жонку з яе чоловеком. Цяпер домовыя ўжэ адыходзяць. Як сям'я пераезджае ў другую хату, то домовога зовуць з собою.

***Запісана ў в. Хвойка***
***ад Жураўлевіч Ганны Мікалаеўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Дамавік – ета той, хто асцерагае хату, забоціцца пра тэ, каб у хазяіна ўсё было добра. Жыве ў асноўнам на вышках, а можэ і пад печчу. Шчас яго і не ўбачыш, ён хазяйнічае ноччу, калі ўсе спяць. І яшчэ тое, што ў каждай хаці жыве свой дамавы. Гэты дух добры, забоціцца пра ўсё, засцерагае хату, любіць, штоб усё було ў парадку. Такі сівы дзядок, канечна, з доўгай сівой барадой і касамі. Дамавога трэба яшчэ ўмець задобрыць, бо як разазліцца, то бяды не абярэсся. Можа дажэ пасуду біць ці пераставіць што, калі не так стаіць. Можа і весяліцца і скакаці па лаве або хазяіна ноччу ўшчыпнуць, калі той спіць. Абычна хазяіна папяраджае, калі бяда якая прыходзіць, тады можа крычаць, выць, бувае кукарэкая, стукае ў дзверы. Не любіць, каб у хаці зеркала вісела ці калі кот ляжыць на парозі. От уранні дажэ пеўня штурхае, каб той будзіў людзей.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Дамавік жыве ў шкафчыках. Ён стары і маленькі ростам. Ён не сядзіць ніколі на адным месцы, а бегае па ўсёй хаце. Дамавік вельмі добры, памагае людзям: прыбірае са стала і вяжа. Ён выганяе венікам з хаты нячыстую сілу. А калі ў тую ж самую хату заходзе яшчэ адзін дамавік, то пачынаецца скандал, то людзям ад гэтага становіцца плоха. У яго ёсць шапка з бубончыкамі.

***Запісана ў в. Сяменча***
***ад Чорнагалоў П. П., 1927 г.н.,***
***студэнткай Кацуба У.***

Дамавікоў у мяне не было. Але матка казала, што када малая была, дык калі яны снедалі, дык пасля стол адразу не прыбіралі, бо гаварылі, што дамавы прыйдзе і паснедае.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Назаранка Надзеі Мінаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Страха К.***

Гэта дух, які жыве ў хаце. Жыве ён у хаце пад прыпечкам. З выгляду гэта маленькі чалавечык. Ён з’яўляецца вартаўніком хаты і глядзіць за парадкам.

Дамавік нябачны, толькі ён можа бачыць людзей. Дамавіка патрэбна паважаць, астаўляці яму есці на стале. Яшчэ казалі, што калі пераязджаеш з адной хаты ў другую, то нада пазваць з сабою дамавіка.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Залескай Марыі Іосіфаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Дамавік – гэта старэнькі дзядочак з сядой барадою і сядымі валасамі. Жыве на пячы. Кажуць, есьцека і добрыя, і злыя дамавікі. Добрыя дапамагаюць людзям, а злыя – шкодзяць. І яшчэ кажуць, што яны не любяць вочэнь кошак.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

У дамавога верылі. Гаварылі, што жыве он у сарае, ці даме. Сам лахматы, с хвастом. Бывае, сжывался з хазяінам і нічога плахога не дзелаў. А бывае, сердзіцца, ходзіць стукае, разбівае што-небудзь.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Халязнікавай Матроны Мартынаўны, 1923 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Халочча Чачэрскага р-на),***
***студэнткай Марціновіч А.***

Дамавік жыве дома, прыходзіць ноччу, стукае па сценах, ходзіць па хаце. Каб не пужаў, патрэбна пасвяціць мак і абсыпаць хату.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Дамавы – стары дзед. Жыве ў хаце. Даглядае малых, калі яго папрасіць аб гэтым. Любя малаком частавацца, але толькі свежым. Інагда гуляецца з малымі кацянятамі, а кошка тады злуецца, што дзеці не слухаюцца.

У нас жыве вясёлы, удалы дамавы, яго няслышна і нябачна. Але я слыхала, што на другім канцы дзярэўні прадалі дом, старыя памерлі, а маладым тая хата не патрэбна. Дык новыя хазяі пераехалі туды, зрабілі

рамонт, а печ не маглі распаліць без ахапкі саломы. А потым нажы сталі знікаць. Парэзалі хлеб, нож пакінулі на стале, а на ранку яго не знайшлі. Дасталі новы – тая ж песня. Як толькі не паклалі на месца – так гэты нож як ветрам здувае. І сварыліся муж з жонкай, і друг на друга пальцамі паказвалі, але так і не змаглі знайсці. Абшукалі ўсю хату, і на двары, і ў агародзе – нічога.

Праз паўгода муж з жонкай так рассварыліся, што і разбегліся, дзяцей няма, хату пакінулі.

Прайшоў невялікі час, ну можа год, хата развалілася прама на вачах. Дзеці суседзяй бегалі туды пагуляцца ў пустой хаце. Адзін бег па былой спальні і праваліў пол, нага застрала. Пачалі вытасківаць, выламалі пару досак, а там паўдзясятка паржавелых нажэй. Усе здзіўляюцца, як яны туды папалі?

А я думаю, што ета дамавы іх туды паклаў. Яму не спадобіліся новыя хазяі. І дом хутка развалiўся ад таго, што дамавы зышоў адтуль. Вось як!

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Дамавік е. Яны ў хаце жывуць. Калі іх не трогаць і не абіжаць, то яны будуць добрыя дзела рабіць у хаце. Але, калі дамавога абідзець, ён не будзе даваць спаць і будзе тупаць па сценам. І ў хазяйстве тады нядобра будзе.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Дамавік ёсць у кожнага ў хаце. Он маленькага росту і вельмі рухавы. Дамавік можа аберагаць, а інагда і здзеквацца над людзьмі, можа нават хаваць рэчы.

***Запісана ў п. Чырвонае***
***ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

Штоб паглядзець ці іе ў хаце домовы, то трэба палажыць солодкого. Бо домовы сільно солодкое любіць. І колі его з‘есь, то домовы іе дома. Домовы жыве под веніком. Трэба вымываць усегда порог, бо возле его жыве домовы. Калі ў хаце непорадок, то просяць домового помогці. Домовуй оберэгае дом, колі ён полюбіть якую-небудзь скоціну, то яна будзе аж блішчаць. Сільно ён любіть коней. Домовой іе ў каждой хаце. А колі купляеш хату і перэвозіш вешчы, то трэба і домового забраць з собой. Трэба сказаць: “Домовой, домовой, пойдзём со мной”.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ганны Пархомаўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

Ласіца

Ласіца гоніць карову па хлеву. Шоб она туда не прыходзіла, то засцілаюць лён.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Ласіца бегае па двару, крадзе яйца, калі падбяжыць пад карову, то будзе краснэ молоко. Поганы зверок, маленькі.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.,***
***Комар Надзеі Мікалаеўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Хлеўнік

Хлеўнікам называлі дамавіка, які жыве ў сараі, у хлеўчыку. Ён даглядае жывёлу: кароў, коней, свіней. Глядзіць за парадкам у сараі.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Залескай Марыі Іосіфаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

У хляве ёсць хлеўнік. Ён такі малы і старэнькі. Адзёжа ў яго цёмная такая, штобы не відна была гразь. Хлеўнік даглядае скаціну: і свіней, і каровак с конікамі. Яшчэ інагда і грыву каню заплятае. Глядзіць, каб хазяіва добра ўхажывалі за жывёлай. Калі добра будзе ў хазяйстве, то хлеўнік людзям не дзелае плоха. Але калі яму нешта не нравіцца, то можа і скаціну пагубіць.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Хлеўнік жыве ў хляве, адбірае малако ў жывёлы.

***Запісана ў п. Чырвонае***
***ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

Цмок

Гэта з’ява праходзіла з самога сатварэння свету, як була яшчэ зямля не свечана і людзі нехрышчоныя. Да і людзі, і сам цар не верылі ў Бога, а верылі ў ліхога Цмока. І давалі Цмоку ў дзень па аброку по цэламу чалавеку. І цераз некаторое врэмя прышла пара і да самаго цара. І думае цар: “Хоць сам ідзі, хоць жонку аддай. Жонку аддаць – не будзе з кім жыць. Самому ісці – царом не быць”. Була ў цара адна дачка. Одна дачка одзенёшэнька. Пайшоў цар да яе і кажэ: “Уставай, панначко, убірайся і ў вянчальнае плацце наражайся. Ідзі к сінему мору. Там панічэ купаюцца да цябе, молодзеньку красавіцу,

дажыдаюцца”. Паслухалася бацьку і пайшла к сінему мору, а там нідзе нікого-нікогусенько, і нідзе нічого-нічогусенько. Прыглядзелася панна, аж бачыць – посрэдзі мора змея плыве. У её з ноздрэй огонь сапле, а з вушэй іскры лецяць. Тая панна так спужалася, што аб серые камні разбівалася. У гэтэ врэмя ехаў светы Юрый на сівом коне і кажэ: “Постой, панно, не пужайся, аб серы камень не разбівайся. Беры з косы шаўковы коснік і повежы змею за крутые рога, да ведзі Цмока к бацьку і мацеры во двор”. І панна отвечает: “У іх ужэ позамукано, кругом двора сторожа стояць, на ўсіх дзверах замкі вісяць”. Светы Юрый отвечае панні, шо тые замкі поотмукаюцца і сторожа поотступаюцца. Прывела панна Цмока к бацьку і мацеры. І ето прышла смертна пора до самого цара і он ужэ от смерці не откупіўся і не отхрысціўся, хоць і быў самы багаты.

***Запісана ў в. Вароніна***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны,***
***студэнткай Пенчык Л.***

Чорт

Чорт можа паявіцца ў вобразе страшнага чалавека, ката – у любым вобразе можа паявіцца. Гэта ж нячыстая сіла. Вот вецер сільна дуе – значыць радам чорт. Я скажу, што ад чорта можна зясцярэгчыся толькі малітваю. Чорта нельзя ўспамінаць. Эта ліхая сіла.

Даўно неяк дзяўчына гуляла з хлопцам. Яны моцна любілі адзін аднога. Але раптам хлопец той памер. І вот чорт перавярнуўся ў гэтага парня і пачаў хадзіць за яго дзеўкай. І вана пачала сохці. Яе маці сказалі, штоб яна ўпляла ў касу сваёй дачкі буркун і тою (зелле такое). Маці ўпляла. Дзяўчына пайшла на свіданне к чорту і ён сказаў: “Распляці буркун і тою, то будзеш мая”. А яна сказала: “Не распляту”. Тады чорт сказаў так: “Тады ўсё, ты больш не мая”.

Вот така была гісторыя.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Васіліны Рыгораўны, 1948 г.н.,***
***студэнткай Берднік В.***

Чорт – ён такі касматы, з рагамі і капытамі, і хвастом, вельмі хітры, любіць шкодзіць людзям, паскудствы розныя робіць. Можа станавіцца чалавекам, або людзі абучаныя ўсё роўна могуць убачыць яго хвост і рогі. Любіць ён маладых дзевак губіць, падманваць.

Было гэта даўно. І была ў нас вельмі прыгожая дзеўка, такая красівая, што ўсе хлопцы на яе глядзелі. А яна ж такая непрыступная, гордая – усім “нет” да “нет” у атвет. І вось неяк паграбалі мы сена на полі, сабраліся дахаты, як гэтая дзеўка кажа: “Ідзіце, я вас потым даганю”. Ну мы і пайшлі. І на другі дзень тое ж самае. Потым яна сваёй падружцы сказала, што хлопца добрага знайшла, прыгожага такога, добрага. Спадабаўся ён ёй. І так доўга яна з ім заставалася. А яго ніхто не бачыў. А потым сталі ўсе заўважаць, што стала бледная дзеўка, пахудзела, асунулася, ходзіць неяк не так – страшна яе

мамцы стала, пазвала яна бабку-шаптуху. Тая паглядзела на дзеўку і адразу сказала: “Чорт у яе суджаны”. Спыталі ў дзеўкі, а яна маўчыць – налажыў, значыць, чары на ёй. Так яе доўга бабка лячыла. Праўда, яна ўсё роўна потым маўчала ды маўчала, рэдка размаўляла значыць. Мы ўсе збярэмся ў клубе, гуляем, а яна ў старонцы стаіць. І замуж так і не выйшла.

***Запісана ў в. Боркі***
***ад Юнчыц Ганны Кандрацьеўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шкрэблік М.***

Чорт – гэта злы дух. Чортам можа абярнуцца малады хлопец, дзед, падарожнік, старац, пан. Чорт ніколі не прымае жаночай знешнасці. Чорт можа абярнуцца жывёлай, птушкай ці прадметам. Чэрці – гэта былыя анёлы, якіх скінуў Бог на зямлю. Чорт не можа знаходзіцца ў тых месцах, дзе растуць лён, каноплі ці пшаніца, таму што з іх вырабляюць алей і прасфоры, якія пастаянна ў царкве.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Чорт – гэта пачвара з свінячай мордай, рагамі і хвастом, чорная і калматая. Плодзіцца вельмі хутка і жыве часцей у балоце. Жыве таксама ў пекле. Перод людзьмі можа паяўляцца ў розных выглядах. Часам прымае выгляд памёршых знаёмых. У час варожбы з’яўляецца дзяўчыне ў вобразе нарачонага. Служыць знахарам і ведзьмам, але пасля смерці забірае іх душы.

***Запісана ў в. Вятчын***
***ад Хаменка Вольгі Сцяпанаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька В.***

Чэрці маглі ператварацца ў каго хочаш. Еслі віхр круціўся, то кажуць, што это чорт круціць. Тады надо даць дулю з левае рукі. А еслі пападзеш у віхор, то можэ і чалавека паваліць. Баіцца чорт зелья біркун. Не падходзіць чорт да крэста. Баіцца таксама свячонага маку. Трэба абсыпаць ім хату і тады не будзе прыходзіць. Каб ізбавіцца ад яго, трэба прынесці з цэрквы со свечкой ладана і абкурыць ім хату. Кажуць, што чэрці жывуць як мужчыны. Яны могуць зацягнуць жанчыну между двух алешын, але родзіць яна не можа.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Купрацэвіч Емяльяны Міхайлаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Шульгой М.***

Чорт – гэта анціхрыст, які робіць дрэнныя рэчы. У яго ёсць сваё царства. Гэта царства ён хацеў падараваць Хрысту, калі будзе дружыць з ім.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў Брэсцкай вобл.),***

***студэнткай Матарас Н.***

Была ў нас бабка Просья, дык гаварылі, што ў яе хаце водзяцца чэрці. Мы тады дзеці былі, такога не знаплі. Патом, як тая бабка ўмерла, мы ля яе плота гулялі ў лапту, туды мяч упаў, і мы баяліся лезці туда, баяліся, што чэрці там сядзяць. Казалі, што яны лахматыя, хвастатыя, у красных сапагах там бегаюць.

Гаварылі, што чорт любіць здзеквацца з людзей, і тое, што чорт – гэта давераны дзявала. Я яго ніколі не бачыла.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Назаранка Надзеі Мінаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Страха К.***

Гэта злы дух, звязаны з нячыстаю сілаю. Ён падобны на чалавека. Усё цела яго пакрыта шэрсцю. Ён мае хвост калматы, рогі, капыты, ногці, а нос яго як ў свінні. Людзям прыносіць толькі зло і няшчасці. Баіцца чорт крыжыка пасвяцонага.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Шляга Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Быў чорт, якога звалі Віхор. А казалі так таму, што калі ён злаваўся на грэшнікаў, то ўвесь надуваўся, узвіхрываўся. І ў яго прычоска была ў выглядзе віхра. Чым болей ён узлаваўся, тым большым віхор быў, ажно па зямліцы цягаўся.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н.,Трацінnікавай А.***

Чорт – ето той самы дзьявал, шо врэд людзям робіць, начальнік над нячыстымі.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Вольгі Ляванаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткамі Кошман А., Сінілы А.***

Чорт – гэта такая пакасць, якая ўначы ходзе па вуліцах і заглядвае ў акенцы. Таму і гавораць, што нельга клікаць “чорта на нач”.

Калі ён бачыць, што ў хаце сварацца, ён тады іх яшчэ больш пачынае зліць, каб яны гаварылі такія злосныя словы, аб каторых дажа не думалі.

Чорт увесь чорны, таму і ходзе толькі ноччу, каб яго не відаць было.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Чорт – ён такі маленечкі, увесь чорны, гарбаты, з маленькімі вочкамі, як у казы, і з рожкамі. А замест ног капыцікі. Чорт вездзе лятае. Вось калі яго успомніш благім словам, дык ён тут як тут. Ён злы, плоха людзям дзелае. Да і не толька людзям. Можа і жывёле плоха здзелаць. Чорт прыходзіць да тых, хто за сабой нейкі грэх мае. Калі Чорт у хаце паселіцца, то людзям нядобра будзе. Дзе Чорт, там Дамавіка няма. Ён яго зжывае. А дзе Дамавіка няма, там і парадку не будзе. Вось так.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Эту гісторыю расказвала мне ешчэ мая маці про своего бацьку, это значыць дзеда моего. Звалі его Сцяпан. Вельмі хорошэ Сцяпан на скрыпцы іграў. І от раз на Рэздво позвалі его ў суседню вёску Чэрнічы поіграць на свято. Пойшоў он, а маці его казала, коб ноччу толькі дамоў не шоў. Іці трэба было церэз болото. Это зарэ поосушалі да сухо, а раней болото было. Поіграў он там, трэба дамоў ужэ іці, а ноч на дварэ, цёмно вельмі, але ж што зробіш, трэба – значыць трэба. Ідзе он праз болото это, глядзь, а там перад ім пара коней стоіць і тры паны на возу. Ён пазнаў, шо это былі паны, бо тады шляпы ніхто окром іх не носіў. Пазвалі тые пане его з собой, пошоў он за імі. Прышоў у некіе хоромы, столы кругом накрытые, людзі моўклівые стояць. Попросілі его поіграць. Іграў он, а оны гулялі. І тут петухі закрычалі первые і ў ту жэ мінуту ўсё пропало, зноў стоіць вон серод болота, але ж ужэ і село свое відно, это там значыць петухі крычалі. Прышоў он дамоў і расказаў усё, шо з ім было. А маці ему і кажэ: "Ох, сынок, это ты іграў на веселлі нечыстой сілы, у это ўрэмя воны спраўляюць свої свадзьбы. Лучшэ бы ты не ішоў домоў церэз болто. Дай, Бог, штоб усё добрэ было".

Не знаю, праўда было ці не, але так казалі.

***Запісана ў в. Старажоўцы***
***ад Рай Галіны Іванаўны, 1945 г.н.,***
***студэнткай Аніщчык Н.***

Чорт як і ведзьма – ета нячыстая сіла. Он увесь чорны, з рагамі, капытамі. У яго доўгі хвост, жывуць па балотах. Он паявіўся, калі Бог стварыў першага чалавека, і нячыстая сіла ўдыхнула ў чалавека сваю сілу. Калі пярун грыміць, ета значыць, он пускаець стрэлы ў чорта, а той перабегвае з месца на месца, чапляецца да людзей. Шчэ чорт баіцца крыжа. І каб засцерагчыся ад яго, трэ прачытаць малітву.

***Запісана ў п. Чырвонае***
***ад Цімашчэні Ганны Парфёнаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Макарэвіч Е.***

Чорт, колісь була легенда, як улюбіцца ў дзеўку і ходзіць к ёй. Яна сохне і сохне, умірае, і ніхто не знае, чаго яна ўмірае. Ёй посоветовалі, шоб у косу ўпляла буркуна і тоя, расце ў жыце. І от ён прыйдзе к ёй, она должна з

малітвою зробіць круга вокруг себе. Прыходзіць ён, кажа: “Коб не буркун і тоя, то ты б була моя”. Так ён яе кінуў і стала дзеўка попраўляцца.

***Запісана ў в. Буразі***
***ад Блоцкай Кацярыны Сцяпнаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з птушкамі

Бусел

Птушка, якая прыносіць шчасце, спрыяе сямейнаму дабрабыту і дзетанараджэнню. Верылі, што шчасце будзе садзейнічаць тым, на чыім падвор’і бусел зрабіў гняздо. Бог ператварыў чалавека ў бусла за тое, што ён не выканаў Божага загаду.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Чаму буслоў нельга крыўдзіць?

Некалі даўно Бог хадзіў па зямлі. Вельмі нравіласа яму зямля, бо была красівая, вада была чыстая ў рэках. Толькі многа рознага нячыства развялось, гадзюк. Узяў Бог вяліку торбу і сабраў усю гэту нечысць. Утаміўся ён, бо нялёгка було зрабіць ета. А хацеў ён ту торбу ў балота закінуць, толькі не асілеў падняць. Убачыў ён чалавека, што сена касіў. Папрасіў яго торбу занесці, толькі сказаў не развязваць па дарозі. От ідзе еты чалавек, дай пазірае ўсё на торбу. Вельмі захацелася яму паглядзець, што там ляжыць. Развезаў яе, ды астаўбянеў з страху. Усе гады зноў паўпаўзалі. Засердзіўся Бог, павесіў яму торбу на плячо і прыказаў усё тое сабраць. Як злавіў чалавек жабу, той зразу стаў буслом. З таго разу і дыбае бусел па лузе з чорнаю торбай. Бог патом пажалеў яго, паслаў яму жонку і дзяцей і разрашыў жыць у сяле разам з людзьмі, каб не забуўся, што род яго начынаўся з чалавека. Людзі знаюць пра ета. Таму трэба берагці буслоў, як родных, бо грэх таму, хто пакрыўдзіць бусла.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Варона

Кажуць, што зязюля падклала вароне сваё яечка, а тая і не замеціла яго. І от калі вывеліся дзіценяты, то з аднаго яйца вылупіласа дзюбатае дзіцё. Варона любіла яго больш за ўсюх, добрэ карміла і даглядала, лучэ за тых дзяцей. А калі вырасла зезюліна дзіця, то паспіхала ўсіх тых з гнязда. Вернулась варона, а яно і на яе кідаецца. Вырвалася варона, паляцела, села на дзерава ды і крычыць: “Кат!”, “Кат!”

От з таго дня яна і не пяе, як усе пціцы, а каркае.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***

***студэнткай Клочка А.***

Верабей

Гэта праклятая птушка, таму што сваім цырканнем ён выдаў Хрыста.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Зязюля

Птушка-прадсказальніца, азначае адзіноцтва, няшчаснай жаночай долі. Зязюля – гэта дзяўчына, якая выйшла замуж за вужа, у згодзе з ім жыла 5 год, у іх нарадзілася 3 дзяцей. Потым дзяўчына паехала наведаць маці, а злыя людзі забілі вужа. Дзяўчына прыехала і не дашукалася, да й стала зязюляй.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Гісторыя пра зязюлю

Некалі ў пціц быў свой цар Кук, які бараніў іх ад драпежнікаў. І от случылась беда: некуды згінуў цар. Шукалі, ждалі ды і не маглі найці. Патом сабраліcь усе ў чараду і начала дамаўляцца, як жыць далей. І вырашылі яны найці свайго цара. А от хто выправіцца ў дарогу, у кожнага сваё гнездо. І вырашылі яны выправіць зязюлю. Спужалася зязюля, што трэба так далёка лецець і адразу знесла яйцо, дый кажа, што ў яе тожа ёсць свой клопат. А ўсе пціцы сагласілісь выседзець яечка і выгадаваць яе птушанятка. Зязюля падхапілась, паклала сваё яечка ў чужое гняздо і паляцела шукаць князя. І зараз лётае і ўсё не можа дазвацца яго. А за ета ўсе пціцы гадуюць яе дзіця.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Колі зязюля крычыць “ладкі”, то нехта памрэ радам.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Певень

Колі певень на Стрэчэнне под капяжом нап’ецца воды, значыць, будзе цёплая вясна.

**Запісана ў в. Малешаў**
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Пчала

Азначае ўрадлівасць, пладароддзя, прадаўжэння роду. Пчала выступае на баку Бога, супраць злога духа.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Гісторыя аб паходжанні пчол

Стварыў Бог чмялёў, а ад іх няма мёду, воску. Прыходзіць ён да чорта, у якога булі пчолы. Угасціў чорт Бога мёдам. Богу мёд панравіўся і папрасіў ён у чорта пчол у замен на чмялён. А чорт не саглашаецца. Тады Бог пачаў расхвальваць чорта і папрасіў адну маленькую пчолку. Чорт падумаў і сагласіўсь. А Бог узяў пчалу і падуў на яе, і зрабілась яна пчалінай маткай. Пчолы ўсе паляцелі за ёй. З таго часу ў Бога ёсць мёд і воск, а чорт ні з чым астаўся.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Жывёльны свет

Воўк

Носьбіт зла. Лічыўся пажыральнікам чарцей. Калі воўк нападаў на статак хатняй жывёлы, то пасля гэтага будзе ўдача.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Гісторыя аб паходжанні ваўка і алешыны

Бог стварыў усё жывое на свеце. А чорт зрабіў дзеравянага ваўка, вялікага, як конь. Прынёс яго Богу ды пытае, ці добра будзе? Бог паглядзеў дай кажа: “Вельмі вялікі”. Тады чорт зрабіў ваўка, як жарабя і зноў паказвае яго Богу. А Бог зноў неўспадабаў. Тады чорт выстругаў ваўка большага за сабаку. На еты раз успадобіў Бог яго тварэнне і воўк ажыў. А чорт як гыркне ад радасці: “Кусі Бога!”. А Бог сваё: “Кусі чорта!”

Кінуўсь воўк на чорта, а той уцякаў ды зачапіўсь за дзве алешыны. А алешыны выпрасталісь і раздзерлі чорта, як жабу. От паетаму, калі дзярэш на алешыне кару, то па ствалу цячэ такое краснае, ета і ёсць чортава кроў.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Заяц

Жывёла, звязаная з нячыстай сілай, бядой, хваробай і смерцю. Сустрэча з зайцам прадвяшчае бяду, няўдачу. Сон аб зайцу прадвяшчае жаніцьбу.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны,***

***студэнткай Мацкевіч А.***

Каза

Жывёла, якая азначае ўрадлівасць, дабрабыт, дастатак, плоднасць. Каза ахоўвае засеянае поле, якое знаходзіцца ў апошніх нязжатых каласах.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Гісторыя аб паходжанні казы

Усе на свеці стварыў Бог: і коні, і авечкі, і каровы. І ўсё ета жывое, боскае. А чорт зрабіў казу. Зрабіў, а ажывіць не можа. Як толькі папхне, каб ішла, а яна падае. Глядзеў на ета Бог і ажывіў казу. З таго козы і не выміраюць на зямлі, а пахожыя на свайго бацьку-чорта: і барада такая, і хвост, і вочы.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Конь

Конь – верны і надзейны памочнік чалавека, увасабленне сілы, надзейнасці і дабрабыту. Існуе звычай – маленькага хлопчыка стрыглі і садзілі на каня. Гэта падрыхтаванне на прыналежнасць да мужчыны.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Кот

Колі ўсяляюцца ў новую хату, то первого кідають чорного кота, шоб той усю хворобу з той хаты забраў.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Мядзведзь

Раней людзей жыло мала і лавілі яны пціц і звяроў у лесе, збіралі ягады, грыбы ды й жылі сабе. Пчол многа тады була, і вяліся яны вездзе. Хто першы найдзе дупло, таму і служылі пчолы. Хазяін абвязваў дзерава вероўкай, і ніхто не маў права чапаць яго. А жыў тады адзін чалавек і дужа быў гультай, а любіў смачна паесці. Сам не шукаў дупло, а крадком выдзіраў другія, ды яшчэ жаліўся, што цяжка на дрэва лезці. І от дазнаўся гэны чалавек, што недзе ёсць такі знахар, які робіць так, каб лягчэй було мёд даставаць. Пайшоў ён да знахара. Ідзе па лесе, бачыць – дзерава стаіць, абвязанае вяроўкай, выдраў ён соты з мёдам і далей ідзе. І так рабіў ён з кожным дзеравам, пакуль не дайшоў да зямлянкі, дзе жыў знахар. А знахара

якраз і не було. А каля зямлянкі расла ліпа і там пчолы булі. Прыйшоў знахар і бачыць, як непрошаны госць яго мёд есць. Пракляў яго знахар і абернуў у мядзведзя.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Рак

Быў час, калі на зямлі была толькі адна ноч. І прышоў Бог, і вернуў на неба сонце. Патом сазваў усіх, хто аслеп і даў вочы. Паследні прыпоўз рак і не паздароваўся з Богам, бо ўтаміўсь па карчах блытацца. А ў Бога больш воч і не засталося, падаў яму Бог ком. Рак памацаў яго клюшнямі, а там маленькія вочы асталіс, рак выкінуў іх на землю, а сам павярнуўся і папоўз. Разгневаўся Бог і прылепіў яму вочы абы куды і загадаў: “Калі не трэба табе вочы, то будзеш поўзаць хвастом наперад, а глядзець назад.

Так яно і ёсць.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Сабака

Неяк стрэліся чалавек і чорт. Яны хаваліс ад дажджу пад дзеравам. Ну, чалавек і кажа чорту, каб той трохі далей адышоў. Толькі ўспеў чорт адысці, як у тое места, дзе стаяў чорт, гром ударыў. Чорт начаў дзякаваць чалавеку, ды й сказаў яму прыйсці назаўтра пад ета дзерава з сваім лучым прыяцелем. Прыйшоў чалавек дамоў ды й думае, хто ж яго лепшы прыяцель, як не жонка. Прыходзіць ён у назначанае места з жонкай. Чалавек еты зразу заснуў. А чорт прыбег, ды й кажа жонцы: “Забі свайго мужа, а за ета я дам табе грошаў”. Жонка падумала, да й сагласілась. Чорт прынёс ёй нож. Як толькі яна замахнулась над мужам, каб убіць яго, чорт разбудзіў чалавека, да й кажа: “От, ты думаў, што жонка твой лучы прыяцель, а яна радзі грошаў хацела забіць цябе. А ў цябе ж ёсьцека лучэйшы прыяцель за жонку. Заўтры прыходзь з ім і я ўзнагароджу цябе.

Увесь дзень думаў мужык, каго ўзяць з сабой, ды не мог прыдумаць.

Пайшоў, значыць, ён сам. А за ім сабака прычапілась. Хацеў чалавек яе прагнаць, ды перадумаў. Прышоў, сеў пад дзерава і зноў заснуў. У поўнач прылятае чорт. Сабака пачуў нячыстага духа, ды й начаў гаўкаць. Праснуўся чалавек і поняў, што сабака лучы яго друг. Чорт даў мужыку золата, і яны разышліс.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Прыродныя стыхіі і з’явы

Агонь

Першы агонь прыйшоў к нам з маланкай. Як ударыў гром, дык загарэўся курэнь і людзі прыбеглі адусюль, пахапалі вуглі і перахавалі ў сваіх зямлянках. Але агонь патух. А жыў адзін калеснік, які тачыў верацёны, і ён папробаваў на верацяне вышпульваць ясеневым клінком, а не нажом. Застругаў ясеневы клінок і прыставіў да верацяна, прыжаў і пачаў шморгаць туды-сюды, пакуль дым з верацяна не пайшоў, а патом і іскры пасыпаліс. Тады людзі, у каго застаўся агонь ад маланкі, патушылі яго і завялі свой агонь і сталі лепей жыць.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Першае, аб чым я ўспамінаю, калі гавараць пра агонь, гэта свята Купалля, энергія, якая дапамагае ачысціцца, зноў паверыць у каханне.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Гром і маланка

Існавала такая легенда: маладую, вельмі прыгожую дзяўчынку звалі Маланка, яна очень кахала хлопчыка, які таксама любіў яе. Але яна здзеквалася над ім, уцякала ад яго, а ён бег за ей.

Па легендзе сказваецца, што калі блісне маланка, гэта яна, уцякаючы ад яго, улыбалася яму. А еты хлапчук пасля яе улыбкі крычаў ёй: "Пачакай!"

Так яно і ёсць: спачатку блісне маланка, а потым грыміць гром.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

Дождж

Трэба была, калі ноччу ўсе спяць, выйці на вуліцу і ўкрасці ў суседа гаршчок, каб ніхто не бачыў. Раней гаршчкі вешалі на плот. Потым гаршчок кідалі ў калодзеж, хадзілі вакол калодзежа тры разы і гаварылі словы, заклікаючы дождж.

***Запісана ў в. Дуброва***
***ад Купрацэвіч Ганны Міхайлаўны, 1922 г.н.,***
***студэнткай Клочка А.***

Каб выклікаць дождж, у калодзеж кідалі мак.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Зоркі

Лічыцца, што зоркі – гэта душы памерлых. Калі памірае чалавек, то на небе загараецца зорка. І людзі глядзеліся ў неба, як бы сустракаліся з душамі. Самыя ярчэйшыя зоркі – душы тых, што нядаўна памёр.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Traціннікавай А.***

Раней усё плавала ў вадзе. Зрабіўся моцны вецер. Ляцелі брызгі і кроплі папалі на неба, і етакім спосабам спалучыліся зоркі.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Бялко Наталлі Савічны, 1943 г.н.,***
***студэнткамі Нікановіч Н., Траціннікавай А.***

Каждая зорачка – гэта душа чалавека. Калі зорачка загараецца, то значыць, недзе нарадзілася дзіцятка, а калі падае – то чалавек памёр і паляцеў у рай ці ад.

***Запісана ў в. Лагвошчы***
***ад Сінілы Ганны Яўгеньеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Сінілы А.***

Зямля

Зямля круглая і стаіць на трох кітах, якія ляжаць у вадзе. Складаецца з неба, вады, паветра. Зямля круглая як шар, а на вярху зоркі, яны рухаюцца вакол яе.

Зямля мае край – гэта за гарызонтам, там, дзе сонца заходзіць, там канчаецца зямля. Край свету – гэта той свет, там рэкі абрыў. Неба – гэта безвоздушнае прастранства, там няма жызні. Неба далёка. Будавалі лествіцу, каб туды дабрацца, але яе не хапала. Зоркі – гэта фанары гараць. Бог запальвае фанарыкі.

***Запісана ў г. Жыткавічы***
***ад Лелоевай Ніны Васільеўны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Торап К.***

Месяц

Ёсць маладзік – малы месяц, а далей палучаецца поўны, а далей робіцца гніла квадра, а потым стара. Расці ад змены квадры.

Калі ёсць пляма, то яна абазначае, што брат убіў брата, адрубіў яму галаву (галавасек). Пачырванелы месяц абозначае мароз, холад.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1935 г.н.***
***(раней пражывала ў Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай Матарас Н.***

Раслінны свет

Алешына

Дрэва, якое звязяна з нячыстай сілай. Яе не выкарыстоўваюць у якасці будаўнічага матэрыялу, а ўжываюць толькі як паліва.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Асіна

Гэта паганае дрэва з-за таго, што яе пракляў Бог па той прычыне, што асіна не пакланялася Хрысту, як іншыя дрэвы. На асіне павесіўся здраднік Іуда, таму лісце восенню становіцца крывава-чырвоным. Гэта напамін пра няправедную кроў Іуды.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Вярба

Дрэва, якое ўплывае на жыццяздольнасць і здароўе, засцерагае ад няшчасця і хвароб.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Ёлка

Неможно, шоб дуб і ёлка коло хаты рослі, бо дуб здороўе забірае, а колі ёлка перэросце хату, то з етой хаты начнуць людзі поміраць.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Вольгі Лявонаўны, 1927 г.н.***

Іван-ды-Мар’я

Калісь дзяўчына кахала хлопца, але бацькі не дазвалялі ім жаніцца. Тады яны ўцяклі з хаты. Беглі, беглі і ператварыліся ў кветку. Адсюль і назва такая – Іван-ды-Мар’я.

***Запісана ў в. Бялёў***
***ад Жогаль Арыны Міхаўны***
***студэнткай Мацкевіч А.***

Рэчыўны свет

Легенда пра віно

Сыну бога Зеўса Вакху патрэбна было зрабіць вялікі шлях. На сваім шляху ён убачыў маленькую былінку і вырашыў узяць яе з сабой. На шляху былінка пачала сохнуць, і ён змясціў яе у птушыную костку, якую знайшоў побач. Але так як шлях быў вельмі доўгім, а былінка расла, то ёй для росту патрэбна было большае месца. І Вакх гэтую былінку з птушынаю косткаю змясціў у ільвіную костку, якую таксама знайшоў на дарозе. Але і ільвіная

костка, як і раней птушыная, зрабілася малой для гэтага парастка. Тады гэты парастак разам з птушынай і ільвінай косткамі ён змясціў у аслінную костку. Гэты парастак вырас вельмі вялікім з салодкімі пладамі. Гэта быў вінаград, з якога Вакх навучыўся рабіць віно. З таго часу і павялося: пасля першай чаркі чалавек спявае, як птушка, пасля другой – моцны, як леў, пасля трэцяй – дурны, як асёл.

***Запісана ў в. Крэмнае***
***ад Субат Марыі Еўдакімаўны, 1933 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

Соль

Нельга рассыпаць соль – будзе сварка ў сям'і.

Калі даеш суседзям малако, то трэба ў слоік укінуць шчыпотку солі, каб не прырабілі.

Калі ў хату прыходзяць людзі (не з сям'і) і пачынаюць хваліць дзяцей і хазяйку, то трэба ўзяць солі (калі яны пойдуць) і тры разы сыпнуць к парогу.

Соль нельга раздаваць чужым людзям, каб не зглазілі і чаго не прырабілі.

Соль клалі дзецям пад падушку, каб салодка спалі.

***Запісана ў в. Вятчын***
***ад Аксёнчыц Зінаіды Іванаўны, 1945 г.н.,***
***студэнткай Жураўлевіч І.***

Валасы

Я чула, што валасы с рашчоскі нельга выкідаць, бо потым галава будзе балець. Калі я была малая, мне тлумачылі гэта тым, што мыш, ці птушка возьме пучок тваіх валос і знясе іх к сабе ў норку, ці гняздо, і яны не будуць ведаць адпачынку, а ўмест з імі будзе балець і твая галава. Таму лепей свае валасы збіраць у каробачку ці газетку, а потым спаліць у печы.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Венік

Венік заўсёды ставяць каля парога, а мятуць ад парога.

На наваселле заўсёды бяруць у новую хату стары венік.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Грошы

Грошы не можно даваць з рук у рукі, трэба, шоб адзін положыў на стол, а другі ўзяў тоды.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***

***студэнткай Кошман А.***

Калодзеж

Ваду ў калодзежы патрэбно глядзець, каб туды анічога не кідалі, каб яна была чыстай і свежай.

На ноч заўсёды надо закрываць калодзеж, бо, кажуць, што ўляціць туды нячыстая сіла.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Чарнушэвіч Алены Пятроўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Люстэрка

Поколотое зеркало ў хаце не дзержаць, бо ето к несчасцю.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Ніколі нельга ставіць люстэрка насупраць люстэрка, яно з'яўляецца магічным крышталем.

Нельга, каб свяча гарэла насупраць люстэрка.

Ніхто не ведае, што знаходзіцца там унутры. Там можа знаходзіцца і настрой (часцей дрэнны), і душы нашых продкаў. Незнарок жа пакрываюць люстэркі хусткай, калі памірае чалавек у гэтай хаце. А для чаго? Каб яго душа не пасялілася ў люстэрке і не шкодзіла.

Лепш зпазаранку ўмыцца дажджавой вадой або снегам, паглядзець у люстэрка і ўлыбнуцца, каб яно ўлыбнулася вам у адказ.

Люстэрка павінна бачыць толькі добры ваш настрой, тады ўсё будзе добра, а калі сварыцца насупраць люстэрка, дзе бачна ваша атражэнне, то гэту энергетыку яно надоўга захавае і ў вас нічога не будзе атрымоўвацца, як вы таго жадаеце.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Давыдавай Вольгі Аляксандраўны, 1957 г.н.,***
***студэнткай Яфімавай Г.***

Нельзя глядзецца ў разбітае зеркала – гэта к няшчасцю.

Нельзя перад люстэркай есці, бо з'ясі красату.

Нельзя глядзецца ў зеркала пасля 12 гадзін ночы, бо ўбачыш пачвару.

Нельзя глядзецца, калі маланка, бо ўбачыш сябе ў старасці.

Нельзя паказваць дзіця да года ў люстэрка, бо будзе прыробленікам.

Калі люстэрка разбіваецца – гэта да няшчасця.

Трэба закрываць у хаце люстэрка, калі нябожчык. Бо калі хто-небудзь пачабыць нябожчыка ў зеркале, то сустрэча можа быць хуткай.

Нельзя глядзецца ў люстэрка долга, бо яно забірае моц і прыгажосць.

На зеркале можна гадаць.

***Запісана ў в. Вятчын***

***ад Аксёнчыц Зінаіды Іванаўны, 1945 г.н.,***
***студэнткай Жураўлевіч І.***

Колі ўпадзе нож, то прыдзе мужчына, ек вілка, то жанчына.

Нож не можна на столе на ноч остоўляць, дома сварка будзе тоды.

***Запісана ў в. Малешаў***
***ад Кошман Надзеі Мікалаеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Кошман А.***

Не трэба нож астаўляць на стале – будзе сварка.

Нож нельга пераступаць, бо ў далейшым могуць дзеці нарадзіцца без рукі ілі нагі.

Нож дапамагае і кароўцы. Калі кароўка не стаіць, калі доіш, а брыкаецца. То трэба палажыць на банку з цадзілкай два нажы накрыж астрыём уверх. Потым працадзіць малако.

Нож патрэбна, калі ідзеш куды-небудзь, утыкнуць у вугалок дзвярэй – ад злых пачвар.

Дапамагае нож і лішаю. Калі ў чалавека лішай, нада ўзяць нож (вечарам, калі на вокнах з’явіцца пот), правесці па сцяклу акна знізу ўверх і таксама зверху ўніз, памазаць лішай. І так 3 разы.

Нож лажылі на зямлю, калі выганялі карову на пашу – гэта засцерагала кароўку ад злых людзей.

З нажа кушаць нельзя – будзеш злой.

Нельга ў кружку з малаком суваць нож, бо адрэжаш малако.

***Запісана ў в. Вятчын***
***ад Аксёнчыц Зінаіды Іванаўны, 1945 г.н.,***
***студэнткай Жураўлевіч І.***

Ніткі

Шыць на сабе нельзя, бо, кажуць, што свой розум зашываеш. Патрэбно зняць адзежу.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Чарнушэвіч Алены Пятроўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Парог

Праз парог нічога нельга перадаваць, таксама і здаровацца, бо будзе дрэнна чалавеку.

***Запісана ў в. Кольна***
***ад Чарнушэвіч Алены Пятроўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Бярдзічавец С.***

Смецце

Каб у хаце было добрэ, трэба смецце, калі вымятаеш, месці к ковеням, а не к порогу.

*Запісана ў в. Малешаў*
*ад Точка Вольгі Паўлаўны, 1952 г.н.,*
*студэнткай Кошман А.*

Стол

Стол – гэта тое месца, дзе людзі ўжывалі ежу, таму на яго нельга ні садзіцца, нічога нельга лажыць з вопраткі на яго. На стале нічога не астаўлялі. Ён павінен заўсёды быць чыстым.

*Запісана ў в. Кольна*
*ад Чарнушэвіч Алены Пятроўны, 1929 г.н.,*
*студэнткай Бярдзічавец С.*

Перш чым пабудаваць хату, гаспадар абавязкова выбіраў добрае места. Па стараму павер’ю на ноч ставілі чыгунок з павуком. Калі той за ноч віў у чыгунку павуцінне, значыць, месца добрае, калі не – месца лічылася дрэнным і хату не будавалі тут. Таксама сыпалі зерне на зямлю і накрывалі сявенькай. Калі зерне за ноч становіцца вільготным, значыць, цёплае месца, калі не, то будавацца нельга, бо ў хаце заўсёды будзе халодна. Не бралі для будоўлі жылля дрэў, вывернутых ветрам ці навальніцай. Самымі добрымі і спрыяльнымі месяцамі для валкі дрэў лічыліся сакавік і красавік, таму што дрэва набірала моцы. Калі пачыналі будаваць хату, гаспадар абавязкова клаў пад кожны вугал манетку. Першы і апошні вянок у хаце абавязкова “абмывалі” (гаспадар частаваў будаўнікоў чаркай гарэлкі).

Вялікае значэнне ў хаце мае печ, яна абагрывае, у ёй варацць ежу, на ёй спяць, лечацца ад хваробы. Пры закладванні печы гаспадар частаваў печніка і ўсіх астатніх, хто дапамагаў яе рабіць. Рабілі печ талакою, пры першым запальванні агню ў печ сыпалі зерне ў знак таго, што да сценак не будзе прыліпаць сажа. Ушанаванне печы дайшло і да нашага часу: перад Вялікаднём падбельваюць печ і гавораць, што такое “задабрэнне” нясе ў хату спакой і цеплыню.

На тураўскай зямлі быў такі звычай: кума пасля прыходу з царквы, перш чым перадаць хрышчонае дзіця маці, абносіла яго тройчы вакол слупа печы, прыказваючы:

– Каб хросністак так любіў хату, трымаўся яе – як я трымаю яго вакол слупа печы.

Таксама важнае месца ў хаце займае парог, з якім звязана шмат вераванняў, звычаяў, абрадаў. Кажуць, у гэтым месцы, дзе парог, жывуць душы продкаў. Вось, напрыклад, не пераступаючы парога хаты, моўчкі пасядзець перад дарогаю, забараняецца вітацца ці даваць што-небудзь цераз парог. Нельга сядзець на парозе – каб не быць адзінокім. Да парогавай магіі звяртаюцца таксама розныя варажнікі, знахары, таму акрапляюць вадой свяцонай ці асыпаюць асвяцоным макам ад злых духаў, знахараў.

Свята “уводзін”, як і вяселле, мае шэраг цікавых рэтуалаў. Перш чым увайсці ў новую хату, гаспадар пускаў ката праз парог, кідаў клубок нітак і, трымаючы за кончык ніткі, з вобразам іконы ўваходзіў у хату. За гаспадарамі

ішлі поп і госці, якія прыносілі падарункі. Тыя, хто быў запрошан на "уваходзіны", клалі грошы на печ, хлеб – на стол, зерне – на лаўку, каб жылі ў дастатку. Гаспадыня абавязкова асыпала асвячоным макам кожны куточак у хаце і ў першую чаргу парог. Госці жадалі гаспадарам добрага жыцця ў хаце, напрыклад:

– Каб у дамочку, у садочку, у хлявочку, у полечку
Усё радзіла і пладзіла,
Каб добры людзі і пад каменем разжываліся,
А ліхія, каб і на добрай раллі не раслі.

У гэты дзень гаспадыня рыхтавала шмат ежы для частавання ўсіх запрошаных на "уваходзіны". У новай хаце спявалі песні, танцавалі, жартавалі, на ложках клалі жалезны прадмет – каб у сям'і нарадзіўся сын. Жартавалі і давалі парады гаспадарам, спрабуючы моц ложка. "Уваходзіны" праходзілі ў святочным настроі.

***Запісана ў в. Старажоўцы ад Жукоўскай Параскі Мікітаўны, 1907 г.н.,***
***Чэчка Паланні Кляменцьеўны, 1901 г.н.,***
***студэнткамі Толкач М., Дзяйкун М., Рымашэўскай Н.***

## ПАЗААБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Ой, у полі, полі, бяроза стояла.
А на той бярозе зязюля кукавала,
А на той бярозе зязюля кукавала.
А то ж не зязюля, гэто родна маці,
Котора ўпроўляла сыночка ў салдаты,
Котора ўпроўляла сыночка ў салдаты:
– Ой, ідзі, сыночку, ідзі отслужыса, да й не ворочайса,
Церэз тры годочкі дэ й назад верніса,
Церэз тры годочкі дэ й назад верніса.
От проходзіць годзік, от проходзіць другі,
На трэйці годочок едзе мой сыночок,
На трэйці годочок едзе мой сыночок.
Едзе мой сыночок без правой ножэнькі,
Молоду невестку ведзе за ручэньку,
Молоду невестку ведзе за ручэньку:
– Ой, ці ж рада, мамко, ой, ці рада мною,
Ой, ці рада мною, моею жэною,
Ой, ці рада мною, моею жэною?
– Ой, рада, сыночок, шо своя дзяціна,
Только я не рада, шо ліха годзіна,
Только я не рада, шо ліха годзіна.

***Запісы прадстаўлены дырэктарам***
***СДК в. Буразь Дарошка Ганнай Іванаўнай***

***

Молодая Галенько на воз сядае,
Выйшаў яе браценько да ключоў путае:
– Ой, Галенько, сястрыцо, дзе ключэ дзела?
– Паглядзі, брацейко, дзе я сядзела,
Я сядзела, брацейко, у новай каморы,
Повесіла ключэ на новом прыборы.

***

Ой, у лузе, лузе каліна стояла,
А на той каліне зязюля кавала.
Зязюля кавала, усю праўду казала,
Што ўсім салдатам перемена стала.
А мне, маладому, служыці самому,
Конік вараненькі, сам маладзенькі,
Сяду, дай паеду ў зялёну дуброву,
У зялёну дуброву, дзеўкам на размову.
Дзеўчыно-рыбчыно, адчыні камору,
Адчыні камору – еду на размову.

А я не адчынюса, бацька баюса,
Сцялю белу пасцельку – спаці лажуса.
Дзевоча вера, як на вадзе пена,
А хлопеча праўда, як на вадзе цацка,
Хлопеча праўда на дно патонае,
А дзевоча вера наверх выступае.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Марыі Марцінаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

**Зайшло сонца за ваконца**

Зайшло сонца за ваконца,
За вішнёвенькі садок.
Прыдзі, мілы, чарнабрывы,
Прыдзі хаця на часок.
Прыдзі, мілы, чарнабрывы,
Раскажу табе я сон.
Сон пра цябе, сон пра мяне,
Сон пра нашую любоў.
Любоў наша дарагая
І разлука цяжала.
Як мы з табой любіліся,
Сухія дубы развіліся,
А цяпер мы перасталі,
Той сырыя паўнывалі.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Макарэвіч Тамары Трафімаўны, 1940 г.н.,***
***студэнткай Карась А.***

**У нядзелю п’ю**

Я ў нядзелю п’ю, п’ю,
У панядзелак сплю, сплю,
У аўторак снапоў сорак
Пшанічэньку жну, жну.
У сераду вазіла, у чацвер малаціла,
У пятніцу веяла, а ў суботу мерала.
У нядзелю прадала,
Прагуляла, прапіла.
Слава табе, Госпадзі,
Што й да ладу давяла.
Да работы – не я,
І работа – не мая.
З хлопцамі пагуляць –
То ахвота мая.

***Запісана ў в. Пухавічы***

*ад Купрацэвіч Таццяны Мікалаеўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Карась А.*

### Ой, аралі хлопцы ніву

Ой, аралі хлопцы нівы,
Паламалі ярмо.
– Заплаці мне, дзяўчынонька,
Што я хадзіў дармо.

– А я табе, казачэнька,
Плаціла, плаціла,
Цалаваў маё лічэнька,
Я не пярэчыла.

То пры сонцы, то пры зорах,
То пры месячыку
Цалаваў маё лічэнька
Мілы казачэнька.

Хай завянуць тыя кветкі,
Што рана расцвілі,
Хай не знаюць шчасця людзі,
Што нас разлучылі.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Шараевіч Таццяны Сцяпанаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Карась А.*

### У нядзелю рана

У нядзелю рана-рана
На базар я сабралась.
Разбудзіла свайго мужа,
Павяла яго прадаць.
– Пакупайце чалавека,
Ён у мяне дарагі,
Ён не курыць і не п’е,
І жаночых ног не б’е.
Доўга ждаць не давялося.
Падышла ка мне адна,
Сотні тысяч заплаціла,
З сабой мужа павяла.
Усяго ж я накупляла
І прыехала дамоў.
Толькі ноч паначавала,
Як вярнуўся муж радной.
Не саветую, жанчыны,

Пакупаць чужых мужчын.
Уцячэ да сваёй жонкі –
Ты астанешся ні з чым.

**Арына**

Край сяла стаяла хата,
Нахілілася яна.
У той хаціне жыла Арына,
Адзінокая ўдава.
Ужэ прашло чатырэ года,
Как забралі Васіля.
Засталася маць Арына,
Адзінокая ўдава.
Усе людзі ёй казалі:
"Скора прыдзе твой сынок".
Яе сэрца адчувала,
Што ў баю загіне ён.
Как-та вечарам цямненька,
Як заснула ўсё сяло,
Хтось пастукаў паціхоньку
У Арыніна акно.
А Арына падыходзіць
Ды пытае: "Хто такі?"
Ён стаяў на двух кастылях
І без правае рукі.
А Арына адчыняе
Ды пытае: "Адкуля?"
Дажэ маці не пазнала
Свайго сына Васіля.
А бывала, он з гармошкай
Весяліў увесь народ,
А цяпер ён, бедны Вася,
Не выходзіць з-за варот.
Край сяла стаяла хата,
Нахілілась над сялом.
Засталася маць Арына
З сваім сынам Васілём.

**Ляцеў воран**

Ляцеў воран цераз сад зялёны,
Стаў калінушку кляваць.
Любіў барын красную дзявіцу
І не думаў яе браць.
Яна, шэльма, яго атравіла,
Начала яго пытаць:
– Скажы, мілы, мілы разлюбезны,

Дзе мне цябе пахаваць?
– Пахавай жа, міла разлюбезна,
У вішнёвенькім саду.
Да выкапай, міла разлюбезна,
Глубокую магілу.
Да пасадзі, міла разлюбезна,
Чырвоную каліну.
Будуць дзеўкі каліну ламаці,
Будуць мяне ўспамінаць:
– Ці не таго казака магіла,
Што дзяўчына атравіла?

### Ой, у дуброве

Ой, у дуброве, каля дарожкі
З мілым гулялі да самай ночкі.
Мы там гулялі, мы там хадзілі,
Аб нашым шчасці ўсе гаварылі.
Што нарабіла гэта каханне?
Мы прагулялі аж да світання.
Салоўка ціўкаў, раса апала,
І развітання пара настала.

### Сама садзік я садзіла

Сама садзік я садзіла,
Сама садзік я садзіла,
Сама буду паліваць.
Сама мілого любіла,
Сама буду забываць.
Ах, што ето за садочек,
За зялёненькі такі.
Ах, што ето за мальчішка,
Разбессовасны такі.
– Ты не плач, дзевіца,
Ты не плач краса,
Ён прызыв адбудзе,
Возьме замуж за сябе.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Папок Надзеі Іванаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Карась А.***

### Я каліну-маліну ламала

Я каліну-маліну ламала,
Свайму міламу вячэру гатавала.
Вот вячэра мая дакіпае,
А мой мілы на парог наступае.

– Сядзем, мілы, з табой на парозе,
Раскажы, што ты чуў у дарозе.
– Чуў я, міла, такую навіну,
Што ты маеш малую дзяціну.
– Гэта, мілы, навіна такая,
Што ў мяне ёсць дзяціна чужая.
Начавалі цыганы на лаўцы
Ды пакінулі дзіця на мураўцы.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Шараевіч Таццяны Сцяпанаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Карась А.*

**Закавала зязюленька**

Закавала зязюленька
Цераз сад летучы,
Заплакаў казачэнька
Ад дзяўчыны ідучы.
Прыйшоў жа ён дадому,
Не сказаў нікому.
Сеў ён на скамейку,
Схіліўся нізенька.
– Чаго, сыну Васіленьку,
Чаго зажурыўся?
– Бадай жа я, мая мамка,
На свет не радзіўся.

**Зашумела дубровушка**

Зашумела дубровушка,
Ды заплакала ўдовушка.
Яна плача, плача да рыдае,
Да на біты шлях паглядае.
Бітым шляхам хлопцы едуць
Ды майго мілаго каня вядуць.
– Ой, ты, конь мой, сівы, белагрывы,
Да скажы праўду, дзе мой мілы.
– Ой, твой мілы біты ляжыць
Ды ў правай ручцы ружжо дзяржыць,
А левою росу набірае
Ды па сэрдэньку палівае.
Тая раса халодная,
Доля мая няшчасная.

**Устану я ранюсенька**

Устану я ранюсенька,
Умыюся бялюсенька.

Шчэ сонейка не ўзышло,
Маё лічко расцвіло.
Ой, пайду я ў лес па сено,
Маё лічко зарумянело.
Ой, ці брала, ці не брала,
Васілёчка паўстрачала.
– Васілёчка, сэрца маё,
Навяжы сена вязак двое.
Ён у вязкі падвязае
Ды на мяне падмаргае.
– Не дам лічыко цалаваці,
Паднясі сена да хаты.
А як любіш, не жартуеш,
Каля хаты пацалуеш.
За работу ён бярэцца,
Нясе сена, спіна гнецца.
Сена нясе, памагае.
Хай жа сватоў засылае.

**Пад вішняю, пад дубчыкам**

Пад вішняю, пад дубчыкам,
Там стаяла дзяўчына
З сваім любчыкам.
– Ой, дзяўчына мая, ты красавіца.
Красата мне твая, ой, не нравіцца.
Бо твая красата не раждзённая,
А твая красата, ой, навядзённая.
Ты, дзяўчына мая, кінь ты красіцца.
Буду я цябе любіць, ой, прыду сватацца.

***

Ой, рэчанька бяжыць,
Лужа высыхае.
А ці піць, а ці жыць –
Кожны саменько рашае.
Хто там вуліцай ідзе
І васьмёркі пішэ?
Накаўтаўса “Белых рос”
Прымачок наш Міша.
Охну, да охну,
Я па табе сохну.
Сохну і вяну,
Як на цябе я гляну.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Макарэвіч Тамары Трафімаўны, 1940 г.н.,***

*студэнткай Карась А.*

**А каліна не вярба**

Ой, на гары вецер дуў,
У мяне мілы ўсю ноч быў.
Чаравічкі дараваў,
Мяне ў лічыко цалаваў.
А каліна, а каліна не вярба.
Я дзяўчына, я дзяўчына малада.
Біла мяне маці зранку,
Што парвалі хлапцы ўбранку,
А я ўбранку залатаю,
Пайду з мілым пагуляю.
Сячы мяне, рубай мяне
І за Грыца аддай мяне.
Я за Грыцам сакачу,
Як не пусціш, то ўцяку.
А я ў цябе ўдалася,
А мне бабка расказала,
Як да таткі ты ўцякала.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Агіевіча Васіля Міхайлавіча, 1938 г.н.,*
*студэнткай Карась А.*

**Ой, цямно, цямно**

Ой, цямно, цямно,
У туман упаў.
– Добры вечар, дзеўчына,
Бо я яшчэ не спаў.
Я не спаў, не спаў
І не буду спаць.
Ой, дай жа мне, дзеўчына,
Павячэраці.
– Я не тапіла,
Я не варыла,
Яшчэ ўчора з вечара
Рыбку жарыла.
Рыбку жарыла,
Юшку варыла.
А для цябе, сэрдэнька,
Прыгатовіла.

*Запісана ў в. Пухавічы*
*ад Шараевіч Таццяны Сцяпанаўны, 1939 г.н.,*
*студэнткай Карась А.*

## Сіроцкая песня

Ні кашоны ўсе даліны
І ўсе сенажаці.
Пытаецца сын у мацеры:
– Каторую браці?
Ці тую, багатую, што хораша ходзіць,
Ці тую, сірацiначку, што ў поле робіць?
– Багатая, харошая, ідзе ў карчму піці,
А бедная сірацiначка йдзе ў поле рабіці.
Багатая, харошая, ідзе з карчмы, плача,
А бедная сірацiначка ідзе з поля й скача.
Багатая, харошая, прапіла ўсе грошы,
А бедная сірацiначка працуе да ночы.
Ні кашоны ўсе даліны
І ўсе сенажаці.
Пытаецца сын у мацеры:
– Каторую браці?

## Выйду на падвор’е

Выйду на падвор’е,
Дый стану на порозе.
Ляжыць мае горэ,
Ляжыць на дорозе.
Прыехала міліцыя,
Вокруг его стала.
Моё п’янэ горэ
З сабою зобрала.
Далі майму мілому
Дваццаць п’яць сутак,
Забралі адзежаньку
Дый знялі абутак.
Сядзі, сядзі, мой міленькі,
Сядзі, мой харошы,
Чакай перадачку,
Як я ў цябе грошай.
Сядзі, мой міленькі,
Пока я не прыйду.
Можа, цябе чэрці схопяць,
А я замуж выйду.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.*

***Ой, не расці, укропе***

Ой, не расці, укропе,
Ой, не расці, укропе,

Па майму агароду,
Па майму частаколу.
Ой, не хадзі, стары,
Ой, не хадзі, стары
Да мяне, маладое,
Да мяне, харошае.
Бо я цябе, стары,
Бо я цябе, стары,
З малых гадоў не любіла,
З малых гадоў не любіла.
Бо я твае сляды,
Бо я твае сляды,
Камнем закачвала,
Камнем закачвала.
Бо я з свае хаты,
Бо я з свае хаты,
Дымочкам выкурвала,
Дымочкам выкурвала.

***

Хлопец пашэнку пахае,
Ой-ой-ёй,
У яго сошэнка крывая,
Ой, божа ж мой.
У яго сошэнка крывая,
Ой-ой-ёй,
У яго жонка не такая,
Ой, божа ж мой.
Даў я жонцы тры капейкі,
Ой-ой-ёй,
Каб купіла хлеба-солі,
Ой, божа ж мой.
Хлеба-солі не купіла,
Ой-ой-ёй,
На базары заблудзіла,
Ой, божа ж мой.
А ні ложкі, а ні міскі,
Ой-ой-ёй,
А ў хаце тры калысці,
Ой, божа ж мой.
Мая жонка знакаміта,
Ой-ой-ёй,
Памарана ззадзі світа,
Ой, божа ж мой.
Хлопец здуру ажаніўся,

Ой-ой-ёй,
Навек жонкай падавіўся,
Ой, божа ж мой.

***Запісана ў в. Бярэжцы***
***ад Вянчура Марыны Васільеўны, 1902 г.н.,***
***студэнткай Мудабіравай Г.***

***

Ой, што ето да за свет настаў,
Штобы брацейко к сестре
Ходзіць не стаў,
А хоць прыйдзе, той не ночуе.
А хоць і ночуе, той ранейко ўстае.
Сястрыца ж мое ўжэ ж пое, доя,
Ужэ поеду ў далёкія края.
Ой, брацейко ж мой,
Як іедзеш і домой,
То бяры ж і мою долю з сабою,
Бо доля моя нешчаслівая,
Кажды дзень оцец прыйдзе ж мене б’е.
Ой, сестра моя, пойдзе ж я туда,
Дзе рэчка ж бяжыць,
Дзе дубок стоіць,
Там, сястра ж моя,
Буду долю я топіць.

**Маці чакала сына**

Гляну я ў акенцэ – ідзе мой сыночак,
Уставіла маці на столе мядочак.
Прыйшоў мой сыночак, прыйшла моя дзяціна,
Будуць у мяне госці, уся моя родзіна.
– Налівайце чаркі мне і майму сыну,
А я яго ж попутаю пра яго жанчыну.
– Сынку, ты, мой сынку,
Я хочу ўсё знаці,
Хто цябе мілейшы: цёшча ілі маці?
– Цёшча мне мілейша, жонку мне радзіла,
Жонка наймілейша – сына народзіла.
А ты, мая маці, прошу выбачаці,
Як будзе сварыцца, той ужо носаты.
Адзін сын маёрам, другі – пракурорам,
А маці ночуе ў сына пад заборам.
– Сыны мае, сынкі, сыны, галубочкі,
Жэлаю вам імеці не сыноў, а дочкі.

***

Зайдзі, месяц, зайдзі, ясны,
За мою камору,
Я з своею міленькою трошку поговору.
Не разрешае бацько, маці цебе, бедну, браці,
Адпраўляюць на Украіну,
Багату шукаці.
– Едзь, едзь к мілай на Украіну,
Бо я заўтра ўмру.
Як прыедзеш з Украіны,
Зробіш мне труну.
Едзе мілы з Украіны,
Ва ўсе звона б'юць,
Ужэ яго міленькаю
Да гробу вязуць.
Стоіць бацько,
Стоіць маці, насмехаецца,
Зачым, зачым наш сыночак убіваецца.
– Ты не есць у мене бацько,
А ты есць отчым,
Зачым з міленькою навек разлучыў?

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Краснік Надзеі Сцяпанаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Ашогравай І.***

***

Ой, у лузе, лузе каліна стояла,
А на той каліне зязюля кавала.
Зязюля кавала, усю праўду казала,
Што ўсім салдатам перемена стала.
А мне, маладому, служыці самому,
Конік вараненькі, сам маладзенькі,
Сяду, дай паеду ў зялёну дуброву,
У зялёну дуброву, дзеўкам на размову.
Дзеўчыно-рыбчыно, адчыні камору,
Адчыні камору – еду на размову.
А я не адчынюса, бацька баюса,
Сцялю белу пасцельку – спаці лажуса.
Дзевоча вера, як на вадзе пена,
А хлопеча праўда, як на вадзе цацка,
Хлопеча праўда на дно патопае,
А дзевоча вера наверх выступае.

***Запісана ў в. Верасніца***
***ад Мажака Марыі Марцінаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

***

Не сварыся, матка мая,
Што прыходжу я ля поўначы.
Ці сварыся, не сварыся,
То ты мене не навучыш,
С кім люблюся – поберуся,
І ты мене не разлучыш,
Бо я роду не абыякого,
Люблю хлопца разудалого,
Люблю хлопца молодзецкого.

***

Шкода тобе, мой сыночку,
Радзіўшыся, не прадаўшыся,
Ходзіць твая міленькая
З хорошымі абняўшыся.
Няхай ходзіць, няхай ходзіць,
Няхай ходзіць, абнімаецца,
Бо я знаю по натуры,
Што ёй даром не мінаецца,
Нагаечка дубовая
Кругом плечак абвіваецца.

***

Цішыня ў начной во цьме глубокой,
Посвешчоная луна.
С прелесной дзевкой чернобровой
Прашчаўся малец молодой.
Прашчайце, кудрі завітыя,
Прашчайце, волосы русыя,
Прашчайце, глазкі голубыя,
Прашчай, красавіца мая.
Куда ўезджаеш, мой галубчык,
Но Бог з тобой, шчаслівы пуць,
Сваіх радных ты не забудзеш,
Прашу і мене не забудзь.
Ой, выйду, з гора брошуся ў мора,
Пускай волною понесёт,
Цябе ўкрадут, а мне не скажут,
Далече ўедзеш от меня.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Жураўлевіч Ганны Сяргееўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

Взышоў, взышоў месяц,
Схаваўся за хмару,
Шукала матуля сваёй дочцы пару,
Шукала, шукала багатага сына,
А дочку кохае бедна сіраціна.
Кохае, кохае, дай думае браці,
Не мешай любові, родненькая маці,
Дазволь, дазволь, маці, мне с нім пакахацца.
– Не дазволю, доню, тобе з бедным знацца.
Зайшоў, зайшоў месяц,
Схаваўся за хмару,
Не найшла матуля сваёй дочцы пару.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Пасажу каліну ў полі,
Ты, каліна, зеляней на прыволлі,
Ты расці, мая каліна,
Хай любуецца табой вся даліна.
На каліну, на зялёну,
Ды зязюля па вясне прылятала,
Мне зязюля кукавала,
Каб каліну я вясной заламала.
Я каліну заламала,
Пад калінай вясной начавала,
Пад калінай начавала,
Маладога казака цалавала.

***

Ой, у полі, пры даліне,
Дзе не скошана трава,
Там стаялі з каліны,
Нахілілася адна.
Ой, падружка, дорогая,
Што я тобе попрошу,
Поміры мене з міленькім,
А я тобе заплачу.
Ой, подружка, дорогая,
Як жа буду я мірыць?
Ой, як гляну на его,
Моё серцэ заболіт.
Ой, у лесе, пры даліне,
Дзе ўжэ скошана трава,

Там стаялі аж тры пары,
Разлучалася адна.

***

Ой, пад мостам, мостам
Траўка расце ростом,
Люблю я, люблю таго кавалера,
Што высокі ростам.
Не сама я люблю, любіць яго маці,
Дзе мы стаялі, у садзе размаўлялі,
Два слядочкі сталі.
Каб я гэта знала, раней маці ўстала,
Сарвала, сарвала в садзе васілёчак,
След пазамятала.
Ой, Божа ж мой, Божа, што я нарабіла,
Сваему, сваему роднаму дзіцяці
Долю разлучыла.
Ой, пад мостам, мостам
Травка зеленее,
Люблю я, люблю таго кавалера,
Што ўсіх веселее.

***

Ой, поганю волы ў чужое поле,
Не пайду я за старога,
Бо барада ўколе.
Да пайду я за того,
Што кучары в'юцца,
Ён на мяне кіўне, маргне,
А я засмеюся.
Мыла дзева сені
Ды засмяялася.
Ішла маці вады брацi
Да й здагадалася:
– Ой, чого ты, доню,
Чого смяешся,
Полюбіла казачэнька
Дай не прызнаешся.
Ой, ты, доню, моя доню,
Чого пасцель мята?
– Ой, мамоньку, моя,
Бо яшчэ не заслата,
– Ой, чого ты, доню моя,
Чого ты стала бела?
– Ой, ты, мамонька моя,

Бо молоко ела.
– Ой, ты, доню, чого сыта стала?
Ой, ты, мамка мая, наелася сала.
– Ой, ты, доню моя,
Чого цесна світа?
– Ой, ты, мамонька моя,
Бо не на мяне шыта.

***

Стоіць, стоіць у сцепі хаціна,
Вецер крышу шэлесціць,
Там маці дочку разважае,
Дачка зажурана сядзіць.
– Не плач, не плач ты, дачка родная,
Ты ў мене ружачка адна,
Не ждзі казака молодого,
Яго на свеці ўжо няма.
Усе хлопцы пажаніліся,
А ты каго ўсё ждзёш да ждзёш?
Дзяўчаты замуж павыходзілі,
А ты чаго замуж не ідзёш?

***

Дарую брычку золотую,
Дарую пару вараных,
Дарую мілага другого
І гавару яго любіць.
Не хочу брычкі залатой,
Не хочу пары вараных,
Не хочу мілага другога,
Не хочу старога забыць.

***

Полем еду, песні пою,
Разлівайся, лужа,
Сватай мяне, казачэнька,
Люблю цябе дужа.
– Коб ты была багатая
Да шчэй хорошэнька,
Узяў бы цябе за ручаньку,
Повёў да баценькі.
– Коб я была багатая
Да шчэй хорошэнька,
Наплявала б я на цябе,
На твае баценька.

Полем еду, песні пою,
Разлівайся, лужа,
Сватай мяне, казачэнька,
Люблю цябе дужа.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Ці я ў лузе не травіца расла,
Ці я ў лузе не зялёнай была?
Мене ўзялі, пакасілі,
І ў станочкі палажылі,
Така доля мая.
Ці я ў лузе не каліна цвіла,
Ці я ў лузе не чырвонай расла?
Мене ўзялі, паламалі,
І ў пучочкі павязалі,
Така доля мая.
Ці я ў полі не травіцай росла,
Ці я ў полі не харошай росла,
Мене ўзялі, пакасілі,
І ў стажочкі палажылі,
Така доля мая.
Ці я ў полі не пшанічкай расла,
Ці я ў полі не ядронай была,
Мене ўзялі, пазжыналі,
І ў снапочкі павязалі,
Така доля мая.
Ці я ў мамкі не дачушка была,
Ці я ў мамкі не прыгожай расла?
Мене бедную ўзялі за нелюбага аддалі,
Така доля мая.
Ой, чаму ж мне не ўтапіцца было,
У харошага не влюбіцца было,
Быстры рэчкі павсыхалі,
А харошых разабралі,
Така доля мая.

***

Ажаніўся стары дзед,
Узяў ён дзеўку 20 лет.
Ой, да, ой, да, ой, да-да.
Сталі класціся ўжо спаць,
А старога не відаць,

Адзываецца ён з печы –
Я пагрэю сабе плечы.
Пагрэй плечы, пагрэй спіну,
А я выйду на хвіліну.
Толькі дзверы адчыніла,
Тут чакае хлопец мілы.
Цалаваліся на ганку,
Дзед на печы спаў да ранку.

***

Ці не быстрая рэчка ваду замуціла,
Чаму смутная, невясёлая,
Ці матуля пабіла?
Ваду не муціла, матуля не біла,
Спамінаць буду, праклінаць буду,
Каго верна любіла.
Пайду я да броду, да броду па воду,
Ой, стану ж я і пагляжуся я
Ці з харошага роду.
Роду харошага, на лічко прэкрасна,
За ліхім мужам, за няўдаліцай,
Мая доля няшчасна.
Каб я гэта знала, што замужам ліха,
Я б сядзела бы, бульбу ела бы ў матуленькі ціха.
Коні, коні мае, кані вараныя,
Даганяйце вы, запыняйце лета мае маладыя.

***

Быў у мяне муж сінявокі,
І паехаў у край ён далёкі.
Ночанька цёмна, а зорачка ясна,
Яка мая доля няшчасна.
Гаварылі людзі, соседзі,
Ко мне бацька з маткаю едуць,
Я іх не ждала, всю ночку проспала,
Ворота позакрывала.
Бацька з маткай едуць да едуць,
У людзей пытаюць, пытаюць:
– Як наша дочка з малымі дзеткамі
На чужбіне прожывае?
Гаварылі людзі, соседзі,
Ко мне міленькі у госценькі едзе.
Я яго ждала, усю ночку не спала,
Варота поаткрывала.
А мой мілы едзе да едзе,

Ён маіх варот не мінае.
Ночанька відна, а зорачка ясна,
Яка мая долечка шчасна.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Кацярыны Аляксееўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Цераз поле да сцяжэнька,
Ішла мілая п’яненька.
– Дзе ты, міленькая, была,
Што про дому забыла?
– Ой, была я на рыначку,
Да піла я гарэлачку.
Каб ты, сынку, да быў добры,
Ты б ізбіў бы да бізун доўгі,
Прыгатовіў бы дубінку
Да на жончыну спінку.
– Ой, за што мне яе біці,
Яна ўмее ўсё рабіці:
І запаліць, і згатуе,
І зо мною поночуе,
А под утро пацалуе.
Няхай, мілая, п’е і гуляе,
Толькі розум няхай мае.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Жураўлевіч Ганны Сяргееўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Взышоў месяц, ясны зоры,
Узяў мяне неўдаліца, разліў мае слёзы,
Слёзы мае гарачыя марна прападаюць,
Як упадуць у сіне море – море папаўняюць,
Упадуць на белы камень – камень прабіваюць.
Да іе ў мене два брацейкі, у госцях не бываюць,
Селом едуць, не заедуць, на лесі ночуюць,
Яны маю горку долю цераз людзі чуюць.
Дрова рубяць, агонь кладуць, вячэру гатуюць,
Вячэраем, – пані браці – няма сястры ў хаці.

***

Ой, умру я, умру на цэлыя тры дні,
Ці не выведаю з мілага праўды.
– Ой, уставай, міла, пшаніца паспела.

– Ой, нехай паспела, я жаці не буду,
Я ўчора ўмерла, то й ляжаці буду.
– Ой, устань жа, міла, цяляты рыкаюць.
– Ой, нехай рыкаюць, я доіць не буду.
Я ўчора памерла, то й ляжаці буду.
– Ой, уставай, міла, дробны дзеткі плачуць,
– Ой, не плачце, дзеткі, шчэ я не ўмірала,
Я з вашэго бацькі праўды выведала.
Не балело ў міло ні спіна, ні косці,
А ляжала я з вялікай злосці.

***Запісана ў в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Надзеі Іванаўны, 1915 г.н.,***
***студэнткай Чэркас Н.***

***

Ой, лётала зязюленька
Да па сенажаці.
Путала соловейка:
– Як цябе зваці?
– Зові, зові, зязюленько,
Як сваго звала,
Будзе табе, зязюленько,
От пташок слава.

***

Ой, вошчэчку мало,
На свечку не стало.
Да лецемо, пчёлонькі,
У чужые бороонькі.
Прынясе мо вошчэчку,
Там Коленька на свечэчку.

***

На вуліцы мокра,
На ганачку суха,
Выйдзі, выйдзі да мяне,
Мая харашуха.
Ехаў да цябе я
Цераз чыста поле,
Сустрэў многа дзевак
У зялёнай дуброве.
Адна дзеўка Ганна,
Другая Мар’яна,
А ты – лепшая за іх,
Мая ты кахана.

Пакуль гаварылі –
Каня прытамілі,
Я паеду да каханай –
Здаравенькі былі.

***

У агародзе верба расла (2 р.),
Там гуляла дзеўка красна.
Она красна, шчэй красіва (2 р.),
Яе доля нешчаслівa.
Яе доля нешчаслівa (2 р.),
Няма таго, каго любіла.
Няма яго, дый не будзе,
А хто мяне любіць будзе?
А нас людзі разлучылі,
Штоб мы ўпары не хадзілі,
А мы ўпары хадзіць будзем,
І друг друга любіць будзем.

***

Пасаджу каліну ў полі (2 р.).
Ты, каліна, зеляней на прыволлі (2 р.),
Ты расці, расці, каліна,
Залюбуецца табой уся даліна,
На каліну зеляную.
Ды зязюля па вясне прылятала,
Мне зязюля нагадала,
Каб каліну я вясной заламала.
Я каліну заламала,
Пад калінай ночку начавала,
Казака маладога цалавала.

***

Чырвона каліна ў лузе стаяла,
Чаму смутная невясёлая
Са мной размаўляла.
Ці ж я не такая?
Як тая, другая.
Я й, харошая, я й, прыгожая,
Толькі доля ліхая.
Прыйду я ў камору –
Ні хлеба, ні солі,
Гараваць я буду, праклінаць буду
Сваю горкую долю.
Ці ж не такая,

Як тая, другая.
За ліхім мужам, за недбайніцай,
Я навек запрапала.

***

Где ты, где ты, Галочка, ходила,
Что твою головоньку побелила?
Я ходила, батюшка, в вишнёвый сад,
На мою головоньку весь цвет упал,
Чтоб меня Василенько не познал.
Не познае Василенько по цветку,
То познае Василенько по следку.

***Запісана ў в. Любавічы***
***ад Матарас Кацярыны Іванаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Нікановіч Н.***

***

Колі эты месяц,
Колі эты месяц да за хмару зайдзе,
Колі эты вечар да павечарэе,
То на маім сэрцы да павесялее,
Тогда мой міленькі да да меня прыйдзе.
– Адчыні камору ко мне чулай маці,
Як я буду з казаком размаўляці.
– Казаче, казаче, ці любіш ты ж мене?
– Дзеўчыначка, люблю, любіць буду.
Скажу табе праўду,
Враць табе не буду.
– Казаче, казаче, што з гэтага выйдзе,
Скоро ў мене дзяцінaчка будзе.
– Калі будзе хлопец, будзем годоваці,
Калі будзе дзеўка велю растраляці,
Каб не была шэльма такая як і маці.

**А ў полі бяроза …**

А ў полі бяроза,
А ў полі кудрава.
Пад той жа бярозай дзяўчына гуляла,
Бярозу ламала, у пучэчкі вязала,
У пуч вязала, на Дунай брасала.
Плыві ж ты, бяроза, да маго краю,
Раскажы ж, бяроза, як я пражываю.
Як я пражываю, шчэ й пары не маю.
Выйду за ворота – болота, чарота,
Выйду за другія – траўка зелянее.

**На стале стаяць цветочкі…**

На столе стояць цветочкі.
Расцвітаюць хорошо,
Дзе ж поехаў мой міленькі
Шыбко очень далеко.
Я ўсю ноченьку не спала
Да 12 часоў.
У першую часіну заснула,
Сніцца бо мне мілы мой,
Сняцца яго карі глазкі,
Цёмно-русы волоса,
Сніцца, шэпча мне на ўхо:
– Я люблю, мілая, цебя.
Еслі любіш, то прызнайся,
Да адкрой сваю любоў,
А не любіш, то дай
Душе моей покой.

***

Ой, капуста, да й расада…
Ой, капуста, да й рассада,
Чарнявая дзеўчына мне досада.
Я не піў бы, ды не еў бы,
Да на тую чарнявую паглядзеў бы,
Паглядзеў бы, да не мушу.
Паспаліла чарнявая душу, сэрца,
Сэрца, душу, шчэ й не мушу.
Сама села на крылечко, да й пытае:
– Ці ты п'яны, ці напіўся,
Што ў мяне нехорошу ўлюбіўся.
Я не п'яны, не напіўся,
Я ў твае разгаворчыкі ўлюбіўся.

***Запісана у в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч Я.Н., 1926 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

***

Цішыня во цьме глубокой…
Цішыня во цьме глубокой,
Посвешчоная луна.
С прелесной девкой чернобровой
Прошчаўся малец молодой.
– Прошчайце, кудры завітыя,
Прошчайце, волосы русые,

Прошчайце, глазкі голубые,
Прошчай, красавіца мая.
– Куда ўезджаеш, мой голубчык,
Но бог с тобой, счаслівый пуць.
Своіх родных ты не забудзеш,
Прошу і мене не позабудзь.
Ой, выйду з гора, брошуся ў мора,
Пускай волною понесёт, цябе ўкрадут,
А мне скажут: «Далече ўедет от меня».

**Талочныя песні**

Ой, пойду я да на толоку,
На толоцы да й усе хлопцы,
Да смяюцца з мене хлопцы,
Што я ў тоўстай ды й сорочцы.
Ой, пойду я да домовочкі,
Да надену я сорочечку,
Да тоненькую, да беленькую.
І к папер'і да й беленькой.

***

Не сварыся, матка мая…
Не сварыся, матка мая,
Што прыхожу я ля поўначы.
Ці сварыся, не сварыся,
То ты мене не навучыш,
С кім люблюся, поберуся,
Ты мене разлучыш,
Бо я роду не абыякого,
Люблю хлопца разудалага,
Люблю хлопца молодецкого.

***

Шкода тобе, мой сыночку…
Шкода тобе, мой сыночку,
Радіўшыся, непрадаўшыся,
Ходзіць твоя міленькая з хорошімі абняўшыся.
Няхай ходзіць, абнімаецца,
Бо я знаю по натуры,
Што ёй даром не мінаецца.
Нагаечка дубовая кругом плечак абвіваецца.

***Запісана ў г.Тураў***
***ад Дзедавец Н.А., 1930 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

**Жартоўныя песні**

Мяне маці неўзлюбіла,
Мяне маці неўзлюбіла,
Два гароды нядзяліла,
Два гароды нядзяліла.
Адна дыня парадзіла,
Як павезла прадаваць,
Да не знала, што казаць.
Пака людзі цану далі,
Хлопцы з возу дыню ўкралі.
Ой, вы хлопцы, добрыя людзі,
Што ж цяпер мне дома будзе?
Покуль цеста замясіла,
Свіння дзверы прокусіла,
Покуль дзверы залатала,
Свіння цеста паглытала.
Пад прыпечкам свінкі рыюць,
А сабакі ложкі мыюць,
Куры хату подмятаюць,
Хлопцы ў окна заглядаюць.
Не глядзіце, няма за шчо,
Хоць хароша, да неўдачна.

**Рэкруцкая песня**

Ішлі хлопцы дарогаю…
Ішлі хлопцы дарогаю,
Пазапылены глаза,
Озірнуцца ім нельзя –
Зірнуліся назад,
А там стаяло дзевок рад,
А цяпер нам не да вас,
Беруць у салдаты нас,
Беруць сына ў салдаты
Да на 25 гадоў.
На 26-ы год
Прыході-ка, сын, домой.
Прыхожу да сяла,
Стоіць крутая гора,
Прыхожу до ворот
І пытаю, дзе мой род.
Оцец-маці ўмерла,
Сестра замуж пошла.
Остаўся адзін брат.
Той холостой, неженат.
– Чаго, брат, не женішся,

На кого надеешся?
Ці на денюшкі беден,
Ці на девок не годен?
– Я на денюшкі багат
І на девушек казак.

*Запісана у в. Пагост*
*ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,*
*студэнткай Крапіўка А.*

**Ой, у бору абед вару…**

Ой, у бору абед вару,
Пад коранем воду бяру,
Пад коранем воды трошкі,
Тром голубцам не напіціся.
Бедна мая да галовенька,
Няма к каму прыхіліціся.
Прыхілюся я к дубочку,
Той дубочак мне не бацюхно.
Вецер гоніць, гальё ломіць,
Дубок і зо мною не заговорыць.
Прыхілюся я к бярозцы,
То бярозка мне не маточка.
Вецер гоніць, гальё ломіць,
Бярозка зо мною не заговорыць.
Прыхілюся я к яварцу,
То яварэц мне не браточак.
Вецер гоніць, гальё ломіць,
Явар са мною не заговорыць.
Прыхілюся я к лешенцы,
Лешенька мне не сястрыца.
Вецер гоніць, гальё ломіць.
Лешенька со мною не заговорыць.

***

У саду пры доліне
Громко пеў салавей,
А я мальчык на чужыне
Пазабыў усіх людзей,
Пазабыў, пазабросіў
С маладых юных лет,
Сам остаўся сіротою,
Шчасця, долі мне нет.
Ой, куда я не поеду,
Ой, куда я не пойду,
Я родного уголочка

Для сябе не знайшоў.
Ой, знайшоў уголочак,
Да тожа не свой.
На мяне ўсе прызіраюць
І для ўсіх я чужой.
Як памру я, похороняць,
Похороняць мяне, і родныя
Знаць не будуць, дзе могілачка моя.
Над моею могілою
Ніхто слёз не пролье,
Толькі ранняю порою
Соловейко пропое.
Пропое і просвішча
Да й зноў уляціць,
А сірочая могіла
Одінокая ляжыць.

***

Сіне морюшко глыбока
Да й не відно ў моры дна.
Жыву я ад маменькі далёко,
Да не відзіла гора,
Да не відзіла гора.
Зачем ты, мая мамка,
Мяне ў пятніцу родзіла.
Усім на долечку ўдзяліла,
А мою долечку згубіла.
Каму месяц, каму ясны,
Мне ноченька і туман,
Каму жізнь развесела,
А мне горечко да й печалі.

***

Ночка цемна, шчэ й цемна…
Ночка цемна, шчэ й цемна,
Там журылася вдова,
Што міленькага няма,
А мой мілы на Дону,
Я да яго побягу.
Кругом Дона обошла,
Мілого не нашла.
Только нашла магілу міленькага.
Устань, мілы, не ляжы,
Да й дадому прыходзі.
Цябе дома дзеткі ждут,

Мне спакою не даюць.

*Запісана у в. Пагост*
*ад Жураўлевіч Г.С., 1927 г.н.,*
*студэнткай Крапіўка А.*

***

Взышоў месяц,
Ясны зоры.
Узяў мяне , неўдаліцу,
Разліў мае слёзы.
Слёзы мае гарачыя
Марна прападаюць,
Як упадуць у сіне море,
Море напаўняюць.
Упадуць на белы камень,
Камень прабіваюць.
Да і ў мене два брацейкі
У госцях не бываюць...

*Запісана у в. Пагост*
*ад Чэркас Н.Н., 1919 г.н.,*
*студэнткай Крапіўка А.*

**Ці небыстрая рэчка ваду замуціла…**

Ці небыстрая рэчка ваду замуціла,
Чаму смутная, невясёлая, ці матуля пабіла?
Ваду не муціла, матуля не біла.
Спамінаць буду, праклінаць буду,
Каго верна любіла.
Пайду я да броду, да броду па воду,
Ой, стану ж я і погляжу я,
Ці з харошага роду.
Роду харошага, на лічко прэкрасна,
За ліхім мужам, за няўдаліцай
Мая доля няшчасна,
Каб я гэта знала,
Што замужам ліха,
Я сядзела б, бульбу ела б
У матуленькі ціха.
Коні мае, коні, коні вараныя,
Даганяйце вы, запыняйце
Мае годы маладыя.

***

Ой, пойду я цемным лесом,
Наломаю лому.

Завёў мяне дурны розум
На чужу старонку.
На чужой староне
Солнышко не грее,
Кроме маменькі родной
Ніхто не пожалее.
Сорву я з ружы кветку,
Ды пушчу на воду.
Плыві, плыві з ружы кветка,
Шчэ да й маго роду.
Плыла, плыла з ружы кветка,
Да стала кружыцца.
Вышла маці воду браць
Ды стала дзівіцца:
– Ой, чаго ты, з ружы кветка,
Так рано совяла,
Ой, чаго ты ,моя доню
Така стара стала?
– Оставіла мяне, мамка,
Дрова і перына,
Яшчэ к тому оставіла
Няверна дружына.

***Запісана у в. Дзякавічы***
***ад Рагалевіч К.А., 1929 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

***

Ой, да мне не спіцца, не ляжыцца,
Сон галоўкі не бярэ.
Пашоў бы я да дзяўчыны, да не знаю, дзе жыве.
Прасіў бы я таварыша, той таварыш завядзе,
Но той таварыш крашэ мяне, он дзяўчыну атаб’е.
“Не журыса, мой таварыш, у мяне крашэйша е.”

***

Сцелюць мост і маставыя, кала мілае двара.
Ішоў мілы па масточку, мосцік праваліўса.
І мой мілы ў рэчку ўпаў.
“Ох вы, хлопцы-рыбалоўцы, закідайце невада,
Ды й паймайце ж майго мілаго, бо халоднае вада.
Як мой мілы жывы будзе, усім падаркі падару,
А як мёртвы будзе, быстру рэчку праклену.
Бо дай жа ты, быстра рэчка, травою зарасла,
Як ты майго мілага за сабою панясла”.

***

Ой, у лузе коліна ўвесь луг закрасіла.
Ой, не дай мне Бог і не судзі мяне Бог.
Не даў і не судзіў, каго я верна любіла,
Пайду я тудой, кудой раньшэ хадзіла,
Ці не ўвіжу, ці не ўстрэну, каго раньше любіла.
Не ўстрэла яго, а ўстрэла яго мацер.
Як мой мілы ў дарозі, то памажы яму, Божэ,
А як у дзеўцы на пасцелечцы, то пакарай его , Божэ.
Ці я не такая, як тая другая,
І харошая і прыгожая, толькі доля такая.

## Пісьмо салдату

Лецінант послі жаркого боя
Опісал всё подробно домой.
"Дорогая жэна, я околечен :
Нет ногі, нету правой рукі".
Меня это пісьмо огорчіло,
Я не знаю, што больше пісать,
Мне пошоў дваццаць пяты годочок,
Я могу танцеваць і плесаць.
Ты пріедеш домой околеченый,
Будеш вечно в постелі лежать.
Под нізом я увідел коракуль,
Віжу подчерк совсем–то не той.
"Мілый папенька, маму не слушай,
Пріезжай поскорее домой.
Я буду тем рада, зная,
Што мой папа жівой!"
Знаю я, што служіл за Отчізну,
За Отчізну страны і сем'і.
Што бы дочка родная
Нікогда не відала войны,
Без печалі, без горя жыла.

***Запісана ў в. Запясочча***
***ад Русай Ганны Іванаўны, 1928 г.н.,***
***студэнтам Русым Ю.***

## Грымата

На вуліцы грымата,
На вуліцы грымата,
Грымата, грымата,
Жонка мужа прадала,
Жонка мужа прадала,
Прадала, прадала,

Жонка мужа прадала,
Жонка мужа прадала,
Тры капеечкі ўзяла.
Тры капеечкі ўзяла,
Тры капеечкі ўзяла
Да й купіла тры кані,
Да й купіла тры кані,
Да й купіла тры кані,
Заарала ўсе палі,
Заарала ўсе палі,
Заарала ўсе палі,
Паклікала ўсіх людзей,
Паклікала ўсіх людзей, усіх людзей.
Людзі чарку выпілі,
Людзі чарку выпілі, выпілі, выпілі.

**Ой, пусці, маці, да й на рацэ гуляць**

Ой, пусці, маці, да й на рацэ гуляць,
Ой, лі, ой, люлі, да й на рацэ гуляць.
Да й на рацэ гуляць, да й селязнёў ждаць.
А то й не селязні, да й не касыя,
Там два малайцы, абодва халастыя.
А яны ішлі, шлі да й астоновіліся,
Да й за одну дзевачку й пасварыліся.
Ай, вы не біцеся, ай, не сварыцеся,
Ой, па-харошаму да й разыйдзіцеся.
Ой, аднаму таму я дастануся.
Да я дастануся, да й хлопцу брываваму,
Да й хлопцу брываваму, да й кучараваму.

**Да ярылася пчолачка**

Да ярылася пчолачка,
Пчолачка, пчолачка
У вяршэлку сосанкі.
Там летала ластаўка,
Ластаўка, ластаўка
З-пад белага каменя,
Каменя, каменя,
З-пад сінега возера,
Возера, возера.
– Папытайцеся, дзевачкі, у ластавачкі,
У ластавачак, у ластавачкі,
Да што ў Турове робіцца,
Робіцца, робіцца?
Семсот малайцоў жэніцца,

Жэніцца, жэніцца,
Семсот дзевачак замуж ідзе,
Замуж ідзе, замуж ідзе.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Аўдзейчык Любові Ягораўны, 1955 г.н.,***
***студэнткай Івановай Т.***

Пейце, людзі, гарэлочку,
А вы, гусі, воду.
Ох, як цяжко бедной жыці ж
Да й без свойго ж роду.
Вышывала я, вышывала я
Сінім шоўком сорочку.
Даровала я, даровала я
Вышыванку сыночку.
Дэ й пойшоў жэ он,
Срэдзі буры і грому,
Не знайшоў жэ он
Дорожэнькі к дому.
Не знайшоў жэ он
Не дорожкі, ні сцежкі.
Слёзы мацеры затуманілі
Шоўком шыты мерэжкі.
Мой саколіку,
Мой жураўліку,
Необлетана пташка.
Не дождус цебе,
Не прыклічус я,
Ох, як сэрдэньку мацеры цяжко.
Вышывала я, вышывала я
Сінім шоўком сорочку,
Даровала я, даровала я
Вышыванку сыночку.

***

Мене мілы біў,
Чуць мене не ўбіў:
Прыв’езаў ніткой,
Біў соломінкой,
Чуць мене не ўбіў.
А я з того зла
Спаці легла.
Ўстала раненько,
Ўмылась беленько,
Да й поснедала.
З’ела поўтора вола,

Дзесець овечок,
Кашы горшчэчок –
Голодна была.
Выпіла я
Поўтора ведра:
Ведро гарэлкі,
Спірту поўмеркі –
Не п’яна была.
Горкою ішла,
Коніка вела.
За грыву дзержала,
На хлопцоў маргала,
Оха-оха-ха.

***

В огородзі рута-мята несажоная,
Плачэ тая дзеўчынонька заручоная.
Выбралася, прыбралася, на рынок пойшла,
А на рынку п’юць гарэлку ўсе тры молойца.
Одзін дзержыць за ручэньку, другой за рукаў,
Трэйці стоіць, серцэ боліць: любіў да не ўзяў.
Бодай жэ ты, дзеўчынонька, не людзям, не мне,
Бодай жэ ты, дзеўчынонька, серэнькой земле.
В огородзі рута-м’ята несажоная,
Плачэ тая дзеўчынонька заручоная.

***

Ішоў Господ лесом-бором,
Сустрэў дзеўку молодую.
Ты дзеўчына молодая,
Да й жэ мне воды напіцца.
Моя вода нечышчона,
Лесом бором порушона.
Твоя вода очышчона,
А ты дзеўка согрэшона.
Дзевець сыноў народзіла,
Усе ў Дунаі потопіла.
Цепер, дзеўко, не лекайса,
Ідзі ў цэркоў споведайса.
Стала дзеўка споведацца,
Стало цело расподацца.
Ее сыны мертвы сталі,
Грэшнэ цело подобралі.
Грэшнэ цело подобралі,
Да й под цэркоў закопалі.

Ты думала, наша маці,
Шо нас цепер тут не будзе,
А мы стоім прэд тобою,
Як усе жывые людзі.

*Запісана ў в. Пагост*
*ад Панчэні Кацярыны Аляксееўны, 1941 г.н.,*
*студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.*

***

Ой, там на горы, на горы крутой
Ходзіло-блудзіло пару голубей.
Оны ходзілі, любоваліса,
Сізымі крыльямі обнімаліса.
Одкуль узяўса охотнік-стрэлец,
Убіў-разлучыў пару голубей.
Узяў голубку, узяў под полу,
Прынёс додому, пусціў до долу.
Насыпаў пшонца ёй по коленца,
Наліў водзіцы по сізы крыльца.
Голубко, ты еш, голубко, ты пі,
На круту гору плакаць не ходзі.
Голубка не есць, голубка не п’е,
На круту гору плакаць она йдзе.
Нема голуба сізокрылого,
Нема мілого чорнобрывого.

***

Маці свойго сыночка ў армію ўпраўляла.
Ой, ідзі, сыночку, дай не огінайса,
Чэрэз тры годочкі назад ворочайса.
Нема сынка годзічок, нема его другой,
На трэці годочок едзе мой сыночок.
Ой, ці рада, мамонько, ой, ці рада мною,
Ой, ці рада, мамочко, моею жэною.
Ой, рада, сыночку, рада я тобою,
Толькі я не радая твоею жэною.
Ой, наліла сыночку солодкого м’ёду,
Молодой невехночкі зеленого яду.

***

Ой, за гаем-гаем зелененькім,
Там дзеўчына брала лён.
Там дзеўчына брала лён,
Ой, за гаем зелененькім
Брала ўдоўка лён дробненькі.

Она брала, вубірала,
Тонкі голос подавала.
Тонкі голос-голосочок
Чэрэз Васілёў садочок.
А там Васіль сено косіць,
Тонкі голос перэносіць.
Тонкі голос-голосочок
Чэрэз Васілёў садочок.
Кінуў косу ў травоньку,
А сам пошоў додомоньку.
А сам пошоў додомоньку,
Схіліў на стол головоньку.
– Чого, сынку, ты думаеш,
Чого не п’еш, не гуляеш?
--Позволь, маці, удоўку браці,
То я буду піць, гуляці.
–Не позволю ўдоўку браці,
Ўдоўка ўмее чароваці.
Очарыла мужа свойго,
Цебе, сынку, нема й чого.
А сын мацер не послухаў,
Сеў на коня дэ й поехаў.
–Ой, едзь, сынку, дорогою,
Шоб твой конік стаў горою.
Шоб твой конік стаў горою,
А ты, сынку, дубіною.
Ой, там маці жыто жала,
Под дубочком ночовала.
Под дубочком ночовала,
На дубочку лісце рвала.
Не рві, мамко, лісця з мене,
Тобе будзе грэх за мене.

***

У полі березонька кудрава стояла,
Дай, она брала, брала вубірала,
Ўсю доліну ўсцілала.
Усю даліну ўсцілала,
Да нема того, хлопца молодого,
Которого любіла,
Которого любіла.
Да полюбіла хлопца молодого,
Цепер людзі смеюцца.
Цепер людзі смеюцца,
Да й ужэ тому хлопцу молодому

Два кандалы куюцца.
Два кандалы куюцца,
Да й оны ковалі, праўды не казалі.
Назад ручкі з’езалі.
Назад ручкі з’езалі,
Дэ й повелі того хлопца молодого
Шчэ й бітымі шляхамі.
Шчэ й бітымі шляхамі,
Да стоіць дзеўка, ой, да ў воротах,
Обліласа слёзамі.
Обліласа слёзамі,
Да не плач, дзеўко, не плач молодая,
Не будзь тобе за мною.
Не будзь тобе за мною,
Да не зваці тобе мене чоловеком,
А мне цебе жоною.

***Запісана ў в. Перароў***
***ад Лоўгач Мальвіны Рыгораўны, 1926 г.н.,***
***студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.***

***

Ой, прала б я кудзеліцу, голоўка болiць.
Ой, пойду я до карчомкі гарэлочкі піць.
Як поехаў мой міленькі на поле й ораць.
Я за тую кудзеліцу да й под лаўку м’яць.
Лежыць моя кудзеліца да й надуласа,
А я прыйшла із карчомкі да й напіласа.
Ек прыехаў мой міленькі з поля й ораці,
Дый путае дробных дзеток, дзе мамка була.
Татулейко, бацюленько недзе не була,
У той хаці на кроваці цэлы дзень спала.
Брэшэш, мілы, брэшэш, мілы, не праўда твоя,
Учора піла за корову, цепер за вола.
Учора піла за корову, цепер за вола.
Ето ж тобе, мой міленькі, што ў цебе жыла.

***

Ой, дубе, ты дубе,
Дубе зелененькой,
Што й на тобе дубе
Два голуба гудзе.*
А трэйця зязюлька
По саду жаркочэ,
Любіў козак дзеўку,
А цепер не хочэ.*

Пойду я ў садочэк,
Сорву я лісточэк.
Дэ й понакрываю
Міламу следочэк.*
Штобы роса не ўпала,
Пташкі не будзілі,
Штоб мойго мілого,
Другі не любілі.*
Другі не любілі,
Дэ й не чаровалі,
Несалёну рыбку
З вечора давалі.*
Вечэрай, мой мілой,
Дэ й не сомневайса,
Кідай свою жонку
Со мною кохайса.*
Кідай свою жонку,
Шчэй дзеточок двое,
Яшчэ дзеток двое,
Чэрнявы й обое.*
Дзецей порубаю,
Жонку растрэляю.
З тобою, коханко,
У саду погуляю.*

***

Ой, у полі озерэчко,
Там плавало ведзерэчка,
Соснова клёпка,
Да дубовое донцэ,
Не влекайса, мое серцэ.*
Онэ плавало порою,
Трое суток із водою.
Выйдзі, дзеўчына,
Выйдзі, любчына,
Поговорым мы з тобою.*
Ой, рада б я выходзіці,
З табой, мілой, говорыці.
Лежыць нелюбай
На правай ручке,
Да й боюса разбудзіці.*

*паўтараецца два разы

***

Ой, на полі, на ролле,*
Ой, там ходзілі жураўлі ж.
Ёны ходзяць, говорaць:*
–Ой, перва ролля – жыто жнеш,
Ой, перва ролля – жыто жнеш,*
Ох, а другая – скот пасеш.
З первай жонкай дзеткі маў,*
Ох, а з другою розогнаў.
Йдзеце, дзеткі, служыці,*
Ох, я к мачусі ходзячы.
Однэ пошло до попа,*
Ой, а друге до дзьяка,
А трэйцее до пана,*
Ой, што мачуха погана.
А ў недзельку раненько,*
Ой, нешто ў лесе гукае ж.
Нешто ў лесе гукае ж,*
Ой, бацько дзеток шукае.
Йдзеце, дзеткі, додому,*
Ой, бо мне трудно самому.
Жыві-жыві, татко, сам,*
Ой, нашчо другу мацер взяў.
*паўтараецца два разы

***

Ой, по крутой сцежке,
По крутой дорожке,
Шчэй по крутой горэ*.
Ой, погібае цело,
Солдацкое бело
На чужой стороне.*
Ой, ніхто не заплачэ,
Ой, ніхто не затужыць,
Ох, ні маці, ні оцец.*
Ой, только зажурыўса,
Только засмуціўса
Брат-товарыш его.*
–Ой, товарыш-товарыш,
Ты мой родны брацец,
Наверно ж, я помру.*
Ой, товарыш-товарыш,
Ты мой родны брацец,
Здзелаш мне труну.*
–Ой, товарыш, товарыш,
Ты мой родны брацец,

Где ж я клёна возьму?*
–Ой, товарыш-товарыш,
Ой, мой родны брацец,
Гдзе схороніш міня?*
–Ой, у вішнёвом содочку,
На жоўтом песочку,
Шчэ й под рокітою.*
Ох, рокіта зелёна,
Лісцейко шыроке,
Шчэ й похіліласа.
Да й похіліласа,
Ой, а дзе ж тая пара,
Што ў венцу стояла,
Дэ й розлучыласа.*
Ой, дзе ж моя мамка,
Што глыбока ямка,
Дэ й не свідзімся.
*паўтараецца два разы

***

На германской земле, да й нішто ні росце,
Да й нішто ні росце, только трава кустава.*
А под тым жэ кустом солдат убітой лежыць,
Солдат убітой лежыць, он жэ раняной.*
А ў его ў головах стоіць крэст золотой,
А ў его ў ногах стоіць конь вороной.
Ой, ты, конь, ты мой конь, ты не стой надо мной,
Ты ж не стой надо мной, над моею ж головой.
Да й бежы ж, сівой конь, к моей маменьке ў двор,
К моей маменьке ў двор, дэ й к жоне ж молодой,
Ды й скажы, сівой конь, усю праўдоньку ёй:
Нехай мене не жджэ, нехай замуж ідзе,
Бо ўжэ молодой ожэніўса на другой.
Ожэніла меня ж пуля буйстрая,*
Повеньчала меня сабля войстрая.
Як веселье було, з пулемёта рэвло,
На веселы булі все попы да дз’які.
А за сваху була мацъ– сырая земля,
А невеста була мацъ– сырая земля.
*паўтараецца два разы

***Запісана ў в. Перароў***
***ад Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н.,***
***Цяслюк Марыі Іванаўны, 1943 г.н.,***
***студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.***

## Жыто ў полі

Жыто ў полі, жыто ў полі,
Людзі рассеялі.
У хаце маці з сваім сынам
Ціха размаўлялі.
Жыто, маці, жыто, маці,
Жыто не палола,
Як ту дзеўку не любіці,
Яна чарнаброва.
Жыто, сынку, жыто, сынку,
Жыто – не пшаніца.
Як ту дзеўку не любіці,
Яна – чараўніца.
Жыто, маці, жыто, маці,
Жыто–каласочкі.
Як ту дзеўку не любіці,
У яе чорны вочкі.
Жыто, сынку, жыто, сынку,
Жыто пора жаці.
Як ту дзеўку верна любіш,
Трэба яе браці.
Жыто ў полі, жыто ў полі,
Жыто ўсе пажалі,
А ў нашому сяле
Трэці дзень гулялі.

## Ой, пайду я, выйду

Ой, пайду я, выйду,
Выйду в тое поле,
Дзе краса дзяўчына
Лён кудравы поле.
Лён кудравы поле,
Голасна спявае,
Песняю чароўнай
Сэрца закранае.
Ой, пайду я, выйду
Яром на нізіну,
Павяду пагонем
Дужую машыну.
Павяду машыну,
Пры дарозе стану,
Паслухаю песню,
На дзяўчыну гляну.
Сонца на закаце.

Блізка вечарынка.
Ой, скажы кудою
Пойдзеш ты, дзяўчынка.
Ці каля дубровы,
Ці каля пшаніцы.
Павяду да дому
Цябе, чараўніца.

### Чаго вада каламутна

Чаго вада каламутна,
Чаго дзеўка така смутна.
Я не смутна, не сярдзіта,
Бо з вячора была біта.
Біла маці мяне ўночы
За Іванка кары вочы.
Шчэ й казала: буду біці,
Каб Іванка не любіці.
А я Іванка так шаную,
Дзе пабачу, там цалую.
Ой, Іванка, сэрца маё,
Няма крашэ, як нас двое.
Мамка мая даражэнька,
Як ты была маладзенька,
Ты любіла майго татку,
А я люблю свайго Іванку.
Цячэ вада каля млына,
Мамка мая, я невінна.
Мы з Іванам спараваны,
Як арляты маляваны.

### Мой міленькі перапіў

Мой міленькі перапіў,
Чарку лішнюю хапіў.
Вось дык гора, вось дык ліха.
Чарку лішнюю хапіў.
Усю ноч мяне катаў,
Спаць хвілінку не даваў.
Вось дык гора, вось дык ліха,
Спаць хвілінку не даваў.
Раніцаю сеў за стол,
Я паставіла расол.
Вось дык гора, вось дык ліха,
Я паставіла расол.
Збан расолу літраў пяць,
Асушыў, не можа ўстаць.

Вось дык гора, вось дык ліха,
Асушыў, не можа ўстаць.
Ой, жывот, ой, неўтрываць,
Трэба ж доктара пазваць.
Вось дык гора, вось дык ліха,
Трэба ж доктара пазваць.
Пакуль доктар падаспеў,
Мой міленькі адубеў.
Вось дык гора, вось дык ліха,
Мой міленькі адубеў.
Везлі мілага хаваць,
Стала слёзы праліваць.
Вось дык гора, вось дык ліха,
Стала слёзы праліваць.
А завезлі за сяло
І мне стала весяло.

**Дробна драбніца, дробна драбніца**

Дробна драбніца, дробна драбніца,
Дробны дождж ідзе.
Ой, сабралася бедна галота
Ды гарэлку п’е.
П’ём гарэлку, п‘ём налівку,
Шчэ й будзем піць віно,
А хто з нас, браццы, будзе смяяцца,
Будзем біць таго.
Ой, прыйшоў дзядзька, дзядзька багаты,
Насміхаецца.
Ой, за што, за што бедна галота
Напіваецца.
Ой, ты не смейся, дзядзько багаты,
Ты не смейся з нас,
Ты вазьмі, дзядзько, чарку гарэлкі,
Выпі ты за нас.
Рад бы я выпіць, рад бы я выпіць,
Рад бы закусіць.
Сто рублей маю, сто рублей маю,
Недзе размяніць.
У цябе сотні, а ў нас драбніцы.
Ты не смейся з нас,
Ідзі ты к чорту, ідзі ты к чорту,
К чорту ідзі ад нас.
Адзін за рукі, другі за ногі,
Трэці ў шыю б’е.
Ой, не ідзі, не ідзі, дзядзько багаты,

Дзе галота п’е.

**Адправіла маці сына на ліхую вайну**

Адправіла маці сына на ліхую вайну,
Пасадзіла дубочак яна ў тую вясну.
Той зялёны дубочак пад акенцам расце,
Маці сына чакае, а сынок не ідзе.
Тую цёмную ночку правяла не адна,
Успамінаючы тую, ту ліхую вайну,
Што забрала сыночка, не вярнуўся з вайны.
Яго сінія вочы, як той лён малады.
Кожну раніцу маці да дубочка ідзе,
Нібы з сынам вітаецца і размову вядзе.
Палівае слязамі той дубочак яна,
Успамінае пра сына, што забрала вайна.
І вясна наступае, за лісточкам лісток,
І дзянёчкі счытае, можа прыйдзе сынок.
60 год прамінула, як дубочак расце.
Маці сына чакае, а сынок не ідзе.
Пазірае на ціхі, на той вогненны шлях,
Як у той 41-ы адпраўляла сынка.
І нікому ніколі не паверыць яна,
Што сыночак загінуў, што забрала вайна.

**Жыта жала, жыта жала**

Снапочкі вязала.
Жыта жала, жыта жала,
З кім стаяла, размаўляла,
Праўды не казала.
***Прыпеў:***
Іграй, іграй, іграй гармонік,
Шырэй расцягайся!
А хто ў дзеўках застаецца,
То просім, не кайся.

Ой, ты дзеўка, дзяўчынонька,
Дзеўка чапурненька.
Адзін кіне, другі возьме,
Ты йшчэ маладзенька.
***Прыпеў.***

Жыта жала, жыта жала,
Снапочкі насіла.
Вышла замуж за такого,
Каго я любіла.

## Я ў сярэду радзілася

Я ў сярэду радзілася,
Кажуць людзі – гора.
Не ідзі, дзеўка, за старога
Барадою коле.
Я пайду за маладога,
Што не мае вуса.
Ён на мене кіўне, моргне,
А я засмяюса.
Я мяла хату, мяла сені
Да засмеялася.
Выйшла маці ваду браці
Да й дагадалася.
–Чаго доню, чаго міла,
Чаго ты смяесся,
Палюбіла чарнявога
Да не прызнаесся.
–Ой, хіба я.
Хай я рассыпалася.
Ой, яка б я дурна была,
Каб я прызналася.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

## У нядзельку пораненько

У нядзельку пораненько
Дробен дожджык закурыўса,
Сын на мацер посварыўса.
–Ідзі, маці, упроч од мене,
Цепер будуць госці ў мене.
Будуць кумы-побрацімы
І суседы поблізкія.
Пошла маці горанькамі,
Обліўшыся слёзанькамі.
Яшчэ маці з гор не выйшла,
Як сыночка бяда найшла.
Яго хатка загорэлас,
Старша дочка захворэла.
Яго хата догорае,
Старша дочка помірае.

Сынок мацер наганяе,
Ой, вярніса, мая маці,

Цяпер будзеш старша ў хаці.
Будзеш у хаточцы сядзеці,
Моіх дзеток гледзеці.
Маці серцэ сокрушыла,
Сыну хату потушыла,
Старшу дочку полячыла.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Казак Надзеі Архіпаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

**Ой, дайце мне гітару**

Ой, дайце мне гітару,
Сама сябе развесялю,
А вот паверце, очы кары,
Как я мілого люблю.
Крэпко мілого любіла,
І так жэ он мене любіл,
Но мы хоцелі павенчацца,
Но кто-то нас не допусціл.
Не хацела его маці
Мяне невестай называць,
І строго сыну прыказала,
Шоб от любові атказаўс.
І строго сыну прыказала,
Шоб от любові атказаўс.
А сын упал в досаду,
На год в чехотцы пролежал.
І пры концы своей он смерці,
Родную мац в посцель позвал.
–Позволь, позволь, мамко, жаніцца,
Позволь красавіцу ўзяць.
Быць можэ, шчасце совершыцца,
Быць можэ жыць останусь я.
А маці сыну отвечае:
–Сыночек, позно, нет когда.
А сын упаў в большую досаду,
І закрыў глазкі навсегда,
У нядзельку пораненько
Сходзіло сонцэ ў аблака.
На ту зелёную могілу
Прыйшла красавіца ў слязах,
Кругом могілы абхадзіла
І от могілы не отышла.
Склоніла голову на камень
І Богу душу отдала.

## Ой, там, на гары, на крутой

Ой, там, на гары, на крутой,
Там сядзело пару голубей.
Оні седзелі, любоваліса,
Своімі крыльцамі абдымаліса.
Откуль узяўса охотнік-стралец.
Убіў пару галубей.
Галубка ўбіў, а голубку забраў,
Узяў пад палу, занёс дадому.
Насыпаў пшанца, аж па каленца,
Наліў вадзіцы, аж па крыліцы,
Галубка мая, чаго ж ты така,
Вадзіцы не п’еш, пшанца не еш,
На крутые горы ўсё плакаць ідзеш.

***

Цячэ рэчанька, невялічанька,
Скочу-пераскочу.
Ой, отдай мяне, мамачко,
Як отдавала і прыказвала,
У гасцях не бываці,
Ой, як прыйдзеш ты, мая дочанько,
То і выжану з хаты.
Цярпела гадок, цярпела другі,
Трэйці не сцярпела.
Скінулася я рабой зязюлькай,
У госці паляцела.
Лесам ляцела – галлё ламала
Белымі крыламі.
Полем ляцела – поле аблівала
Дробнымі слязамі.
Заляцела я да й у бацькоў сад.
Да і стала каваці,
А маці сядзіць каля акна,
Рушнічка ўшывае,
Меншы браток на парозе
Ружжэ заражае.
Позволь, мамочко, позволь, родная,
Ту зязюльку ўбіці,
Яна не куе, не дае нам жыці.
Не позволю, сын, ту зязюльку ўбіці,
Бо той зязюльцы, як і нашай дачцэ
На чужыне жыці.

*Запісана ў в. Рычоў*
*ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,*
*студэнткай Матарас Н.*

**У огородзі верба росла**

У огородзі верба росла,
Там стояла дзеўка росна,
Она красна дэ й красіва,
Она красна дэ й красіва.
Её доля нешчасліва,
Её доля нешчасліва,
Нема того, шо любіла,
Нема, дэ й не будзе,
Нема, дэ й не будзе.
Ой, хто ж мене любіць будзе,
Злые людзі разлучылі,
Злые людзі разлучылі,
Каб мы ў пары не хадзілі.
А мы ў пары ходзіць будзем,
Мы друг друга любіць будзем.

**Ой, у лузе, пры дарозе**

Ой, у лузе, пры дарозе,
Каліна стояла.
Васілёва родна маці
Коня наповала.
Конь воды не хочэ піце,
Конь на воду дуе,
Бо вон знае, бо вон чуе,
Дзе Васіль ночуе.
А Васіль свою дзеўчыну
Под окном чакае,
Та дзеўчына з болью ў сэрцы
Его прогоняе.
–Ой, Васілю, серцэ мое,
Не ходзі до мене,
Ты богаты, а я бедна,
Не возмеш ты мене.
–Ой, хоць возьму, хоць не возьму,
Дай хоць погляжу,
Лічко бело, бровы чорны,
Як я растануся.

**Багачка**

Засватай, сыночак, богачку,

Богачка не то што бедна,
Она прыведе валоў пару,
Дэ й шчэ вороного коня.
Он вывел богачку в садочок,
Богачка довольна была,
А там вдалі за рэкою,
Спевае міленька моя.
Он кінуў богачку в садочку,
І сам он на голос пошоў,
Но голоса больше не стало,
І цело плыве за водою.
Он выценул цело на берег,
По целу сцекала вода,
На ей было белое плацье,
Круг шеі обвіта коса.
–Раступіцеса, родные людзі,
Ой, дайце міленьку обняць,
Последні разок поцэлую,
Бо будуць яе ўжо хаваць.

***Запісана ў в. Вараніно***
***ад Лузай Марыі Уладзіміраўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

**Запрагу я валы крутарогі**

Запрагу я валы крутарогі
Дэ й поеду араць краі-дарогі.
Наару я поля, да шырокого,
Дэ й посею хмелю, дэ й высокого.
Нароблю ж я піва, дэ й солодкого,
Для свойго роду да долёкого.
По богату сяструпару коней пошлю,
А по бедну ўдоўку наказ накажу.
Шой богата сястра парою коньмі едьме,
А бедная ўдоўка пешком ідзе,
Шой богата сестра за столом сядзіць,
А бедная ўдоўка за дзвярамі стоіць.
Шой богатая сястра мед, гарэлку п’е,
А бедная ўдоўка горкі слёзы лье.
–Ці я ў цябе, братко, не родзіна,
Шо я ў цебе стою за дзвярыма.
Не прышла ж, братко, к тобе обедаць,
А прышла брацейка отведаці.

**За горамі горы высокі**

За горамі горы высокі,

За горамі сонцэ горыць.
Поехаў мой мілы далёка,
По мілому серце боліць.
Поехаў далёка-далёка,
Далёка яму сторона,
Не забувай, мілы, про мене,
Шо я остаюса сама.
Однажды заходжу я ў святліцу,
А свёкор чытае пісемцо:
–Ідзі, невестушка, послушай,
Шо пішэ цебе мілы твой.
Он пішэ, шо любіць другую,
Даўно он цябе позабыў,
–Даўно б я его позабыла,
Но жаль, шо дзеціна мала.
Ай, лю-лі, ай, лю-лі, дзеціно,
Засні-ка, ты, спаць,
Я пойду і сяду за столік
І буду запіску пісаць.
Пісала, пісала запіску
І кончыла запіску пісаць.
Прыедзь, прыедзь, мілы додому,
Мене мілу поховаць.
Чатыры коробочкі спічок
Холодной водой разліла,
Запіску на стол положыла
І выпіла отравы до дна.
Отрава, тровіла ты мене,
Любоў моя дорогая,
Чого ж ты мене довела.

***

Сіне морушко глыбоко,
Не відаць у моры дна.
Выйшла замуж, край далёко,
Дэ й соўяла, як трова.
Воскресенье, маць-старушка
Усіх суседзей собрала,
За помешчыка седого
Дочку замуж отдала.
А ў помешчыка седого
Много золота, срэбра.
А ў парнішкі молодого
Толькі сэрцэ і душа.
А помешчыка седого

Не могу я полюбіць,
А парнішкі молодого
Не могу я позабыць.
Выйдзі, мамонько, послушай,
Утром рано на росе,
Не твоя лі дочка плачэ
В чужодальней стороне.
Не того я горко плачу,
Шо чужая сторона.
А того я горко плачу,
Прошла молодость моя.
Прошла молодосць моя,
Як з гарачой трубы дым.
А я сохну і страдаю
Своім сэрцэм молодым.

***

Зайдзі, месяц, зайдзі, ясны,
Зайдзі за калор.
Я з своею міленькою трошкі поговору.
Ой, не хочэ моя маці
Цебе бедну браці.
Едзь жэ, сынку, на Украіну
Богату шукаці.
Як поедзеш на Украіну,
Я заўтра ўмру.
Прыедзеш з Украіны,
Зробіш мне труну.
Еду, еду з Украіны,
Усе звоны б’юць.
Ужэ мою міленькую ховаці везуць.
А подхожу до гроба,
Лопнула труна.
Стоіць мілы над могілою
Чорны, як зямля.
Оступецес, добры людзі,
Дайце хоць обняць.
Хоць нежывую поцэлую,
Бо будуць ховаць.
Стоіць бацько ў вороцях, усмехаецца,
За кім, за кім мой сынок убіваецца.
Ці ў мене родны бацько?
Ці ты ў мене отчым?
Шо ты мене з міленькою
Навек розлучыў.

Не я ж цебе розлучыў,
Розлучыла маці,
Не схоцела, мой сыночок,
Яе бедну браці.

***

Ой, на полі, на ралле,
Там ходзілі жураўе.
Оны ходзяць, говорацъ:
Рання ралля лепшая,
А позня горшая.
Там хлопцы говорацъ,
Перша жонка лепшая,
А другая горшая.
С первой жонкоў дзеткі маў,
А з другою розогнаў.
Дзеце, дзеткі служыці,
Ой, як мачумсі годзіці.
Однэ пошло, пошло до попа,
А другое – до дзяка.
Трэце пошло до пана, бо мачоха погана.
У нядзельку раненько нешта ў лесе гукае.
Бацько дзеток шукае:
–Ходзець, дзеткі, додому,
Бо скучненько самому.
–Жыві, баця, жыві сам,
Хорошую жонку не ўзяў,
Хорошую, молоду,
Да не мамоньку родну.

***Запісана ў в. Хільчыцы***
***ад Казак Надзеі Архіпаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

**Салдацкая песня**

Добрэ таму ісці ў салдаты,
У каго е бацько і маці,
А ў мяне, малайца,
Няма мацер і айца,
Толькі адна сястрыца,
Дэ й та плачэ і журыцца.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Андрэйкавец Марыі Іванаўны, 1941 г.н.,***
***студэнткай Матарас Н.***

**Частушкі**

А я с міленькім стаяла
Пад жалезным мосцікам,
Он пашол, а я сказала:
“Абезьяна с хвосцікам”.

***

У меня ухажора два –
Табурэтка і балда.
Табурэтка ходзіт рэдка,
А Балда, так заўсягда.

***

Маю мілку сваталі,
Мяне пад лаўку пряталі.
Я пад лавачкай ляжу,
Мілку за нагу дзяржу.

***

І ў лодке вада,
І пад лодкай вада.
Дзеўкі юбкі замачылі,
Перавозчыку бяда.

***

Самалёт ляціць,
Да с памідорамі,
А дзеўкі па лесу,
Да с ухажорамі.

***

Ой, падружка дарагая,
У нас міленькі адзін,
Ты раўнуеш, я раўную,
Давай лучша прададзім.

***

Грай, гарманіст,
Штобы было жарка.
Ты не з нашага сяла,
Мне цябе не жалка.

***

Прыязжалі мяне сватаць
Пад сярэбранай дугой.
Пака пудру налажыла,

Так уехалі к другой.

***

На уліцу не пускают,
Запіраюць на замок.
Мілы ключык падбірае,
Ходзіць кожны вечарок.

***

Паўстрэчаў на берагу,
Рыжага цялёнка.
Аказалась – мая мілка,
А на ёй – дублёнка.

***

І на юбцы кружава,
І на кофце кружава.
Неужэлі я не буду
Інжынерава жана?

***

Халадзільнік мы купілі –
Для хазяйства проста клад.
На нач яйца палажылі,
Утрам выграблі цыплят.

***

Як мілёнка ні ругаю –
Яго довады адны:
То кагосьці праважаюць,
То зарплатныя дзянькі.

***

Стары ножніцы тупы,
Новыя наточаны.
Тыя б мацеры маўчалі,
У каторых дочэры.

***

У забора я стаяла,
Тут суперніца прайшла.
Тваё шчасце, абезьяна,
Што я камень не знайшла.

***

Усе прыйшлі, усе прыйшлі.
Усе на лаўкі селі.
Маего-та дарагога,
Верна, воўкі з’елі!

***

Самавары закіпелі –
Дзеўкі замуж захацелі,
Ну, а хлопцы не бяруць,
Дзеўкі голасам равуць.

***Запісана ў г. Тураў***
***ад Струк Ганны Цімафееўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Аксёнчык Ж.***

Я частушок много знаю
І на курсах не була,
Развесёлую такую
Мене мама родзіла.

Балалаечка мая,
Ручка разрысована.
Хоць сама я некрасіва,
Но зато весёлая.

Ой, спасібо табе, мама,
Што весёлу родзіла.
Ці мне горэ, ці беда,
Но я весёла зоўсегда.

***Запісана ў в. Перароў***
***ад Лоўгач Мальвіны Рыгораўны, 1926 г.н.,***
***студэнтамі Цалка П., Тульжанковай М.***

**Прыпеўкі**

Ой, пара нам тарапіцца
І праграму начынаць.
Пра новую перэстроечку
Будзем пець і прыпяваць.

***

Перастройка, перастройка,
Усіх нас перастроіла.
У магазіне-то пусто –
Очэрэдзь пастроіла.

***

Я спявала і спяваю,
І спяваць мне хочэцца.
Палучыла дзве візіткі –
Паміраць не хочэцца.

***

Я спявала і спяваю,
Каб дабрацца да Крымля,
Каб дабавілі гарэлкі
І дабавілі віна.

***

Ой, падруга дарагая,
Мы з табой не прападзём,
Як гарэлкі не дабавяць,
Самагону наганём.

***

Ой, падруга дарагая,
Мы не будзем унываць,
Па сто п’яць рублёў бутылку
Самагонкі прадаваць.

***

Ой, падруга дарагая,
У перастройку добра жыць:
Да канца нашае жызні
Будзем босыя хадзіць.

***

Ой, падруга дарагая,
Чаго ты турбуесся?
Як не будзе чаравікаў –
У лапці мы абуемся.

***

Ой, спасіба Гарбачову!
Он нам добра дапамог.
Дэфіцытныя тавары
У чорны рынак увалок.

***

Я нідзе не працавала,
Дзяцей пяцера ў мяне.
Ой, спасіба Гарбачову!

Даў ён пенсію і мне.

***

Ой, спасіба Гарбачову,
Што не даў пачаць вайны,
Што не пала кроў на землю
З нашай роднай дзетвары.

***Запісана ў в. Рычоў***
***ад Рыдзецкай Вольгі Андрэеўны, 1939 г.н.***

Сербіяночку танцую,
Прошу не смяяцца,
Мае каріе глаза
Стыду не бояцца.

***

Ой, і тупну ногой,
І прытупну другой,
Усе чатыры кавалера
Заківалі головой.

***

Ой, не смейцеся, ребята,
Што я з песні збілася.
Я на курсах не была,
На песні не вучылася.

***

Самалёт ляціць ўсё кругом, кругом,
Понаравіўся мне хлопец з золотым зубом.
З золотым зубом мне не парочка,
Ён – кулацкі сын, я – пралятарачка.

***

Самалёт ляціць, крыла бумажныя,
Поверьце, дзевачкі, дзяла няважныя.

***

А Семёновна, трава зяленая,
Поверьце, дзевачкі, дзяла змянёны.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Чэркас Н.Н., 1919 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

Ох, я пела, пецць умела,

Пецъ ахотніцай была,
За мілага не папала,
Многа гора прыняла.

***

Знаю, знаю, дзе калодзец,
Но не знаю, дзе вада,
Знаю, знаю, дзе мой мілы,
Но не знаю, дзе судьба.

***

Каб я знала молода,
Дзе мне замужам бываць,
То б свекрухе памагала
Я капусту паліваць.

***

Мілы мой, мілы мой,
Скажы мацеры сваёй,
Не была, не буду вашэй,
Скажы мацеры сваёй.

***

Дорогой мілёночак,
Цвецік агурэчны.
Палюбіла б я тебя,
Да ты недалгавечны.

***

Палюбіла б я такога,
Што ў яго няма нічога,
А ні світкі, ні кажушка,
Не прыстане мая душка.

***

Што ж ты, міленькі наделаў,
Сад зелёный порубіў,
Лучше б ты мене зарэзаў,
Чем другую полюбіў.

***

Выкапаю слуп высокі
Да павешу там ключі,
Ці не зломіць міл галоўкі,
Да другое ідучы.

***

Сіні човен воды повен
Ані не покапаў.
Пайшоў мілы да другой,
Штоб ён увесь век плакаў.

***

Ой, не стой, не стой ля варот моіх,
Не пойду с тобой, бо праважаў другіх.

***

Мае каріе глаза,
Шчэ й курносенькі насок.
Не расказывай мне казок,
Пацалуй мяне разок.

***

Кацярына, не ідзі ў поле,
Бо там цябе казёл сколе.
Кацярына не паслухала,
Чыста поле пацялухала.

***

Кацярына, не давай хлопцам,
Кацярына, затыкай ключ'ям.
Кацярыне захацелася,
Тое ключ'е разляцелося.

***Запісана ў в. Пагост***
***ад Жураўлевіч Г.С., 1927 г.н.,***
***студэнткай Крапіўка А.***

***

Мой міленькі кучаравы,
Вельмі нелагодны.
У калгасе ёсць баран,
На яго падобны.

***

Баявая я дзяўчына,
На падножцы ехала.
Беражыце дзеўкі хлопцаў,
Адбіваць прыехала.

***

Ты не дуй, падруга, губы,

Ты і так губатая.
Твой мілёнак мяне любіць,
Я не вінаватая.

***

Брыгадзіру гаварыла,
Стыршыне яшчэ скажу.
Не дадзіце ўхажора,
Я з калгаса выхаджу.

***

Гарманіст у мяне прыгожы,
Акуратненькі насок,
Восем курочок садзіцца
І десяты петушок.

***

На окошке два цветочка
Голубой да синенький.
Никто нашей любви не знает,
Только я и миленький.

***

Говорят, што я мала.
Я мала да удала.
Вчера самага высокого
Да слёз я довела.

***

А ў калхозном нашэм клубе
Мягкія дарожкі,
А на поле замерзае
Сто гектар картошкі.

***

Я ў калгасе звеневая,
Баявая, смелая,
І на сене запеваю,
І ў рабоце першая.

***

Брыгадзіра падманула,
Стыршыню я падвяла,
На работу не хадзіла
І стаханаўкай была.

***

У мілочка майго
Залаты характер.
Чуць затронеш яго –
Загудзе як трактар.

***

Майго міленькага маці
Любіць дзевак выбіраці.
Каб такую выбрала,
Штоб ёй вочы выдрала.

***

Усе прыйшлі, усе прыйшлі
На лавачкі паселі,
А майго мілёначка,
Напэўна, мышы з’елі.

***

Ой, чые–то валы
У край-мора хадзілі.
Гэй, гэй, ці не таго парня,
Што мы ўтрох любілі.

***Запісана ў в. Пухавічы***
***ад Купрацэвіч Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.,***
***студэнткай Кудзелька Ю.***

**_Кручэнка Т.В._ Пісьменнік, зачараваны Палессем**

Згадваецца, як гадоў 20 таму назад рэдакцыя "Гомельскай праўды" аб'явіла літаратурны конкурс імя Івана Мележа. Шмат самых розных аўтараў удзельнічалі ў ім, былі і даволі вядомыя ў рэгіёне, з вытрыманымі па змесце і форме творамі. Аднак ніводзін так арганічна не ўпісваўся ў рэчышча творчасці знакамітага пісьменніка-земляка як Уладзімір Гаўрыловіч. Тады многія члены журы прыйшлі да высновы: проза творцы сапраўды палеская, ёй перадаецца каларыт зямлі, людзей, у ёй пульсуе непадробная любоў да свайго роднага куточка — Жыткаўшчыны. Уразілі сюжэтныя лініі, мова. На той час выпускнік філалагічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага адпрацаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў роднай школе і ўзначальваў Бялёўскую. Чарговым жыццёвым этапам стала работа галоўным рэдактарам жыткавіцкай раённай газеты "Новае Палессе".

Стваралася пісьменніцкая арганізацыя рэспублікі, якую ўзначаліў вядомы пісьменнік і грамадскі дзеяч Мікалай Чаргінец. І калі ўстала пытанне, хто ж здольны ў новых умовах прыняць кіраўніцтва нешматлікім тады (чалавек 13) абласным аддзяленнем ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі", 23 снежня 2005 года большасцю галасоў абралі Уладзіміра Гаўрыловіча. І гэта, гледзячы з пазіцый сённяшняга дня, быў 100-працэнтна правільны выбар.

Можна сказаць "Шчырае дзякуй!" журналісту і пісьменніку, які стала працуючы ў родным райцэнтры, маючы салідны калектыў адзінаверцаў, дасягнуўшы поўнай акупляемасці выдання, узяў на сябе клопат кіраўніцтва яшчэ адным творчым калектывам, а пазней і зрушыўся з сям'ёй са свайго роднага гнязда ў Гомель. Нам давялося быць у рэдакцыі раёнкі, увачавідкі адчуць плён кіраўніка. Яго клопат, каб і апасля калектыў годна працягваў працу.

У абласным цэнтры Уладзіміру Мікалаевічу прапанавалі ўзначаліць калектыў гарадской газеты "Гомельскія ведамасці". Перыядычна нашы пісьменніцкія сходы праходзілі ў зале рэдакцыі. І тут мы былі сведкамі, як па-гаспадарску аднаўляюцца памяшканні, ствараюцца ўмовы для творчай працы журналістаў і тэхнічных работнікаў. Уладзімір Гаўрыловіч, як той лакаматыў, па-паляшуцку трывушча цягнуў за сабой два калектывы.

Сталася так, што напачатку гомельскага перыяду жыцця творца, яго сям'я, родныя людзі перажылі шмат скрушных пакут і перажыванняў. І гэта застанецца на сумленні тых, хто мае да таго дачыненне. Савет абласнога аддзялення пісьменніцкай арганізацыі Гомельшчыны заставаўся побач з Уладзімірам Мікалаевічам і ў гэты час, і калі ён трапіў у аўтакатастрофу і з пераломам шыйкі бядра працяглы час лячыўся ў бальніцы "хуткай дапамогі", і калі страціў сваю любую матулю Яўгенію Ігнатаўну.

Перажытае, выпакутаванае ў гэты час яшчэ стане асновай новых твораў пісьменніка. Сёння ён аўтар 16 кніг прозы — "Споднія яблыкі"(1999), "Забранае шчасце"(2001), "Глыбокія карані" (2001), "На мяжы"(2003), "Плата за каханне" (2007), "Вяртанне" (2008), "Анёлак мой, анёлак" (2014), "Цяпло

маладзіка” (2014), а таксама зборнікаў публіцыстыкі “...Дзе над горадам лунаюць буслы (2000), “Крокі па роднай зямлі” (2005), “Запрашэнне” (Швейцарыя, 2007) і іншых.

У 2010 годзе выйшлі ў свет два тамы выбраных твораў Уладзіміра Гаўрыловіча. Ён з’яўляецца ўкладальнікам і шыкоўнага фаліянта “Тураўская рапсодыя”. Многія з кніг пісьменніка ёсць у маёй уласнай бібліятэцы з аўтографамі аўтара.

Адзін з маіх любімых раманаў — “Цяпло маладзіка”. Ён вельмі шырокі па прасторы і часе: падзеі адбываюцца і ў сучаснасці, у 21-м стагоддзі, аднак розныя акалічнасці, жыццёвыя абставіны звяртаюць галоўных герояў да перажытага ў Вялікую Айчынную вайну.

Вельмі яркая завязка рамана: у палескую вёску Пралескі прывозяць гуманітарную дапамогу з Германіі. Дзве сястры, ужо састарэлыя бабулі, не спяшаюць атрымаць гэтую нямецкую дапамогу. Асабліва Ганна. Яна так распавядае Вользе:

“ — Я так думаю: прымаем дапамогу — значыць, даравалі. А я не магу ім, Волька, дараваць. Не магу! Вось — мая памяць! Усе сцены ў партрэтах нябожчыкаў завешаны. І памру — не змагу. Шмат у мяне гэтых прычын... Ты, як хочаш, ідзі адна. Ідзі, калі хочаш. Я не пайду. Мне і зараз — баліць... Мне што — за бацькоў сваіх закатаваных — пасылку атрымаць?...”

У ваенныя гады Ганна з Вольгай былі падпольшчыцамі, дапамагалі партызанам на Палессі. Аўтар узнаўляе падзеі, праз якія прайшлі не толькі многія з яго землякоў, але і родныя яму людзі. Глыбокае пранікненне ў чалавечыя лёсы, псіхалогію патрыятызму і здрадніцтва, на мой погляд, ставяць раман упоравень з шамякінскім “Вазьму твой боль”. Абодва творы вельмі яскрава перадаюць гэтую, на генетычным узроўні, балесную, адчувальную кожным нервам, страту кожнага трэцяга...Прагалы, якія ёсць у кожнай беларускай сям’і, пошукі прапаўшых без звестак, якія працягваюцца і сёння.

Пры ўсім тым, раман “Цяпло маладзіка” — еўрапейскі. І не толькі таму, што шэраг сюжэтных ліній звязаны са Швейцарыяй. У частках твора, якія распавядаюць пра каханне беларуса Ігара Косціча да швейцаркі Мерыям, аўтару ўдаецца ўпэўніць чытача: для сапраўднага кахання не існуе межаў, што гэтае пачуццё валодае чалавекам як ніякае іншае. Так выпісаць дыялогі , рамантыку спатканняў, безумоўна, можа чалавек, які перажыў сам сапраўднае каханне.

У рамана пазітыўная канцоўка, што дае чытачу надзею. А яе ў наш час адшукаеш далёка не ў кожным літаратурным творы.

У пачатку аднаго з самых палескіх, на мой погляд, раманаў –рамана “Забранае шчасце” Уладзімір Гаўрыловіч вельмі паэтычна ўзнаўляе касьбу:

*Стаяў самы поўдзень лета. У паветры разліваўся смачны пах абвялай травы, ён паволі, лена плаваў, казытаў у носе...*

*Каса шохала звонка, спеўна, спачатку ішла лёгка. Але ўжо праз гадзіну-дзве з кожным пракосам весці яе было ўсё цяжэй і цяжэй — чым бліжэй да балота, тым большала вады. У вочы, у твар касца хмараю*

*навальвалася назойлівая камарэча, і не было калі яе сагнаць. Як убіралася ў сілу сонца, навала гэтая трохі пасоўвалася да блізкага дробнага лесу, рудога чэзлага хмызняку.*

*Сонца прыкметна вышэла і вышэла. Хутка ўжо напякло добра-такі ў плечы, шыю, рукі. Каса, адчувалася, з кожным узмахам станавілася важкай, хоць трава — бачыў касец — радзела, бралася на шорсткую асаку, заўважна горшала.*

*Нарэшце малады касец, чарнявы высокі хлопец, давёўшы пракос да канца, змогся. Ён спыніўся, каб перавесці дыханне. Зрэбная сарочка набрыняла потам, прыліпала да спіны — неададраць. Намоклі вышэй каленяў і штаны — вада ўжо падступала да лытак, — адна толькі выгода: прыемна халадзіла ногі.*

Безумоўна, напісана так, што міжволі праводзіш паралелі з «Подыхам навальніцы» Івана Мележа.

У асобе Уладзіміра Гаўрыловіча мы маем не толькі цудоўнага пісьменніка, публіцыста, але і яркага кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі, у якой зараз амаль 60 чалавек. А гэта ўжо немалы калектыў, улічваючы, што кіраваць творчымі людзьмі, мякка кажучы, не зусім проста. Але ў Уладзіміра Мікалаевіча цудоўная жыццёвая школа. Ён вырас у шматдзетнай сялянскай сям'і, дзе змалку прывучыўся да працы. 12-гадовым хлапчуком застаўся без бацькі, і як малодшы ў сям'і рос пад непасрэдным уплывам роднага дзядулі па мацярынскай лініі, старшыні калгаса, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Ігната Адамавіча Буякевіча. Яго аповяды пра перажытае на вайне, несумненна, жывуць у сэрцы. Праз 72 гады пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, пасля доўгіх пошукаў і перапіскі з самымі рознымі інстанцыямі, пісьменніку ўдалося дэталёва ўзнавіць і лёс свайго дзядулі Васіля Гаўрыловіча, па лініі бацькі. Яго імя ў сёлетнім маі занесена на мемарыяльную пліту ў вёсцы Бахмутава Ржэўскага раёна Калінінскай вобласці, дзе пахавана больш за 7 тысяч салдат. Чырвонаармеец Васіль Ігнатавіч Гаўрыловіч загінуў смерцю храбрых 30 жніўня 1942 года пры абароне вёскі Добрая.

Пра гэта пісьменнік напісаў у артыкуле "Два дзяды, адна перамога", змешчаным у рэспубліканскім выданні "Беларускі час" (№№18-19), дзе працуе уласным карэспандэнтам па Гомельскай вобласці. Згадваецца, як выступаючы на з'ездзе Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў Маскве восенню 2016 года, Уладзімір Гаўрыловіч расказваў пра акалічнасці лёсаў двух родных людзей, двух салдат Айчыны, якія цесна перапляліся з лёсамі расіян. Трапіўшы ў палон, у аўстрыйскі канцлагер, Ігнат Буякевіч дзяліўся апошнім з рускім палонным, і вясною 1945 года меў аддзячнасць — той, у званні палкоўніка, ужо ў Балгарыі, адшукаў яго, тады сапёра 108-га спецыяльнага батальёна... Дзяліўся пісьменнік і радасцю, удзячнасцю пошукавікам Расіі: у дні з'езда атрымаў запрашэнне наведаць брацкую магілу дзядулі Васіля на Ржэўшчыне. "У Вялікай Айчыннай вайне ваявалі абодва мае дзяды. Ад бацькі маёй маці Ігната Адамавіча Буякевіча я ведаю, што тады вельмі многае значыла еднасць людзей розных нацыянальнасцей, якія

складалі адзіны савецкі народ”, — падкрэслівае аўтар артыкула “Два дзяды, адна перамога”.

Уладзімір Гаўрыловіч шмат робіць для развіцця творчых і чалавечых кантактаў з пісьменнікамі братняй Расіі. Ажыццёўлены шэраг праектаў з Бранскай пісьменніцкай арганізацыяй, а таксама пісьменнікамі Таганрога, Краснадарскай краявой пісьменніцкай арганізацыі. Вынікам сталі зборнікі перакладаў з беларускай і рускай моў, выдадзеныя ў Расіі, удзел пісьменнікаў Гомельшчыны ў фестывалях у Трубчэўску на Браншчыне, а таксама ў Няклінаўскім раёне Растоўскай вобласці. І адпаведна, сустрэчы з калегамі-расіянамі ў нашым рэгіёне, на Славянскіх літаратурных дажынках, якія праводзяцца штогод.

Творчы чалавек — ва ўсім творчы. Так і Уладзімір Мікалаевіч. Менавіта яму належаць ідэі абласнога літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага, які вырас у аднайменную абласную літаратурную прэмію, конкурсаў “Праваслаўе — мая надзея”, “Захаваем свет разам” і шматлікіх іншых. Старшыня пісьменніцкай арганізацыі заўжды ў курсе жыцця сваіх падапечных, падтрымлівае творчыя намаганні, спрыяе выхаду новых кніг. Ён пастаянны ўдзельнік творчых літаратурных вечарын, прэзентацый, якія праходзяць у бібліятэках вобласці. Часты госць на роднай Жыткаўшчыне, не парывае сувязей з землякамі.

Уладзімір Гаўрыловіч з’яўляецца лаўрэатам шэрагу міжнародных, рэспубліканскіх і абласных літаратурных прэмій. Выдатнік друку Беларусі, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі дзяржаўнымі, грамадскімі ўзнагародамі.

30 жніўня Уладзімір Мікалаевіч адзначыць 50-годдзе. Паўвека — гэта поўдзень жыцця, і ёсць час зрабіць падсумоўку зробленага, каб, крыху перадыхнуўшы, рушыць у другую палову веку з надзеяй, што многае яшчэ можна паспець зрабіць для сябе і людзей. Ведаем, што празаік піша новы раман, а таму жадаем збыцця гэтай творчай задумы, ажыццяўлення ўсіх творчых памкненняў, жыццёвых мэт.

Паўвека — гэта толькі Лета жыцця, і да Восені яшчэ вельмі далека. Крочыць упэўнена і надалей!

### *Мельнікава Л.Г.* **Захавальнік народнай спадчыны**

Імя Міколы Котава – фалькларыста і балетмайстра – добра вядома ў Беларусі. Калі ў 1964 годзе, пасля заканчэння дзесяцімесячных курсаў харэографаў пры Гомельскім абласным доме народнай творчасці, ён прыехаў працаваць у Тураўскі гарадскі дом культуры Жыткавіцкага раёна, там быў невялікі танцавальны гурт. Маладому балетмайстру давялося пачынаць сваю дзейнасць са стварэння новага калектыву. Дапамагло тое, як мяркуе Мікалай Конанавіч, што ён сам вельмі любіў танцаваць. З дзяцінства гэту любоў ён пераняў ад маці, якая амаль да старасці была першай танцоркай на вечарынах, святах, вяселлях. Невыпадкова, што і Мікалай стаў актыўным удзельнікам мастацкай самадзейнасці ў Рэчыцы, дзе жыў да пераезду ў Тураў. Прайшоў курсы, тэорыю харэаграфіі, практыку ў танцавальным

калектыве Гомельскага палаца культуры чыгуначнікаў, якім кіраваў народны артыст Беларускай ССР А. Рыбальчанка.

За актыўную прапаганду харэаграфічнага мастацтва і высокае выканаўчае майстэрства ансамбль танца “Прыпяць” Тураўскага гарадскога дома культуры атрымаў ганаровае найменне “народны”. Цікава, што праз год пасля прыезду Мікалая Кананавіча ў Тураў створаны ім ансамбль удзельнічаў у справаздачным канцэрце мастацкай самадзейнасці Беларускай ССР ў Маскве. Там і прыйшоў першы поспех: калектыў быў адзначаны бронзавым медалём ВДНГ СССР.

Надышоў час, калі Мікалай Котаў адчуў, што ён здатны да чагосьці большага, чым адзін танцавальны калектыў, няхай нават знакаміты. Ды і сябры з Мінска неаднойчы запрашалі на працу. Так у 1998 годзе ён апынуўся ў сталіцы.

Першым мінскім экзаменам на сталасць была праца балетмайстра-пастаноўшчыка Беларускай дзяржаўнай філармоніі з ансамблем “Свята”.

Пры Мінскім абласным навукова-метадычным цэнтры Мікалай Котаў стварыў народны ансамбль песні і танца “Кола”. Паспрыяла творчаму росту Котава цеснае супрацоўніцтва з Беларускім саюзам фалькларыстаў.

Папрацаваў Котаў і як педагог-рэпетытар у Беларускай акадэміі мастацтваў, універсітэце культуры, у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, Дзяржаўным цырку. Знаходзіў час, каб наведаць агульнаадукацыйныя і школы-інтэрнаты, дапамагчы фальклорным гуртам. Удзельнічаў у падрыхтоўцы тэлеперадач “Залатыя ключы”, “Спявай, душа народная“, “Запрашаем на вячоркі”, звязаных з народнай харэаграфіяй.

Няўрымслівы таленавіты чалавек заўсёды ў творчым пошуку. Таму і стварыў у 1996 годзе ў Мінску з дапамогай беларусаў Амерыкі першы на Беларусі тэатр абрадавага фальклору пад назвай “Бераг белых буслоў”.

Зараз Мікалай Кананавіч – кіраўнік тэатра фальклору “Матуліна хата” сацыяльнага цэнтра Маскоўскага раёна г. Мінска.

Ён таксама аўтар кніг, у якіх змешчаны сцэнарыі, падрыхтаваныя на аснове фальклорна-этнаграфічных традыцый: “Закукуй, зязюленька”, “Ад “Прыпяці” да “Матулінай хаты”, “Традыцыі беларускага народа”, “Сцэнічныя абрады”, “Народныя гульні, карагоды і танцы” і іншыя.

У гушчы народнага жыцця заўсёды было і ёсць незлічонае мноства яскравых самабытных талентаў. І Мікола Котаў – адзін з іх.

***Котаў М.К.* Сцэнарый веснавога абраду “Юр’е” (паводле запісаў ад мясцовых жыхароў вёсак Любавічы і Пагост)**

На сцэне няма нікога, толькі з-за кулісаў чуваць галасы.

Першы: Юр’я, устань рана,
Юр’я, умыйся бела.
Жаночы голас: Юр’я, прычашыся,
Юр’я, прыбярыся.
Першы: Юр’я, вазьмі ключы,
Юр’я, ідзі ў поле.
Жаночы голас: Юр’я, адамкні зямлю,
Юр’я, выпусці расу.
Разам: Раса на кароўкі, трава на конікі.

Аркестр іграе лірычную музыку, а з-за кулісаў выходзяць тры дзяўчыны з вялікім караваем. Яны ўпрыгожваюць каравай кветкамі. З розных бакоў з-за кулісаў да іх выходзяць удзельнікі свята. Двое хлопцаў з граблямі, на якія дзяўчаты прывязваюць фартухі, адзін – чырвонага колеру, а другі – зялёнага. (Усё падрыхтавана да таго, каб пачаць вясновы Юр’еўскі карагод, каб прасіць добрага ўраджаю).

Карагод пачынае дзяўчына з караваем. Яна абходзіць спачатку ўсіх прысутных, якія кланяюцца караваю. Потым хлопцы з рушнікамі становяцца адзін (з зялёным фартухом) наперадзе. а другі (з чырвоным) ззаду карагода. З песняй яны абходзяць поле, кланяюцца зямлі – абрадавы карагод “Хай жыта родзіць”:

Ото ж карагод, ото ж вялікі,
Зарадзі, Божа, жыта ды на новае лета.
Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць,
А дзе не бывае, то там улягае.

Ото ж карагод – усе дзяўчаты напярод,
А хлопцы за намі, маргаючы вачамі.
Ото ж карагод, ото ж вялікі.
Зарадзі, Божа, жыта ды на новае лета,

Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць,
А дзе не бывае, то там улягае.
Ото ж карагод, ото ж вялікі.
Ото ж карагод, ото ж вялікі.

Дзяўчына: Дзе наша Юр’е хадзіла,
Там наша жыта ўрадзіла,
А дзе наша Юр’е юравала,
Там наша жыта красавала.

У час, калі гаворыць вядучы, дзяўчына кладзе каравай на невялічкі столік ля авансцэны, а хлопцы ставяць з двух бакоў сцэны граблі.

Аркестр іграе вясёлую мелодыю, танцоры на пярэднім плане сцэны танцуюць, а ўсе прысутныя танцуюць у розных месцах сцэны. Танцуючы, яны паціху сыходзяць са сцэны.

На сцэне салістка спявае песню “Ой, выйду я на вулічку”:

Ой, выйду я на вулічку, бычкі бушуюць,
Юр’я, Юр’я, бычкі бушуюць.
Бычкі бушуюць, бо вясну чуюць,
Юр’я, Юр’я, бо вясну чуюць.

Загулі рэчкі, ляды паплылі,
Юр’я, Юр’я, ляды паплылі.

Зачарнела зямліца, бо пааралі.
Юр’я, Юр’я, бо пааралі.

Завесялела дуброва, птушкі спяваюць,
Юр’я, Юр’я, птушкі спяваюць.

Зазелянела даліна, кветкі зацвілі,
Юр’я, Юр’я, кветкі зацвілі.

Ой, выйду я, выйду кветкі збіраці,
Юр’я, Юр’я, кветкі збіраці.

Кветкі збіраці, вяночкі віці,
Юр’я, Юр’я, вяночкі віці.

Вяночкі віці, Юр’я спяваці,
Юр’я, Юр’я, Юр’я спяваці.

Падчас апошняга куплета песні з-за кулісаў выходзіць купка ўдзельнікаў свята з посцілкай, у якой ляжыць розная ежа. Яны падыходзяць да авансцэны, кладуць усё на сцэне і, хто стоячы, хто седзячы – ядуць.

Адзін з удзельнікаў быццам бы крышыць хлеб па полі і прыгаворвае:

А гэта па зялёную травіцу,
На здраёвую вадзіцу,
На лён, на пшаніцу,
На ўсялякую пашніцу.

Гучыць мелодыя танца “Юрачка”.

Танец можа выконваць адзін юнак – “Юрачка”, астатнія пляскаюць у ладкі ці прытанцоўваюць.

Пасля танца за кулісамі чуваць “стрэл” пастуховай пугі (ён гучыць некалькі разоў) і на сцэне з’яўляюцца два пастухі.

Першы пастух: Юр’я прыйшла,
Кароўка травічку знайшла.

Некалькі ўдзельнікаў аббіваюць пастухоў вербачкай і частуюць іх – на Юр’я першы дзень выганялі кароў на пашу.

Гучыць музыка прыпевак. Салістка запявае:

Гарманіст, ану давай –
Весялей нам заіграй.
Заспяваю я прыпеўкі –
Ты за мною падпявай.

Не забуду гэта свята,
Не забуду гэты дзень –
Па ўсяму сялу музыкі
Вандравалі цэлы дзень.

У садочку на дубочку
Птушачкі спяваюць.
Ой, як нашы музыканты
Весела іграюць.

Я скакала, драпацела –
За старога не хацела,
Бо ў старога барада,
А я – дзеўка малада.

Як не пець мне, як не граць,
Як мяне Святланай зваць.
З гарманістам пад руку
Й сёння ўвечары пайду.

Выконваючы прыпеўкі, салістка заігрывае з музыкамі, усе прытанцоўваюць.

Потым усе збіраюцца ў адным куце сцэны (як па краі поля), бяруцца за рукі, становяцца ў адзін ланцужок (двое бяруць граблі з фартухамі і адыходзяць назад, у цэнтр сцэны. Усе ўдзельнікі свята "Юр'я" аббягаюць яшчэ раз поле – то змейкай, то прытопваючы, выходзяць у вароты, якія робяць юнакі з грабляў, і адзін за адным ідуць за першую правую кулісу. Юнакі з граблямі выходзяць апошнімі – яны завяршаюць гэты абрад.

Гучыць голас:

Будам Юр'я юраваць –

Ураджай вялікі ждаць!

У той момант, калі ўсе аббягаюць поле, гучыць песня ў выкананні трыа вакалістаў. Напрыканцы песні на авансцэну выходзяць юнакі з граблямі і дзяўчына з караваем і кланяюцца.

Заслона.

*Гаўрыловіч У. М.* **Нарысы**

**Кабета з “Лісапетам”**

*Гэта паляшучка і сёння працягвае здзіўляць публіку*

*Некалькі гадоў назад інтэрнэт-прастору літаральна ўзарвала песня “Лісапет” у выкананні жыхаркі Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці Лідзіі Пятрычыц падчас міжнароднага фэсту “Покліч Палесся”. Паляшучка і сёння працягвае выступаць фестывалях.*

...У актавай зале Гомельскага аб’яднання прафсаюзаў яблыку няма дзе ўпасці – у разгары абласны міжгаліновы аматарскі фестываль мастацкай творчасці. Выступаюць працаўнікі сельскагаспадарчай галіны. Іх праграма, паводле рэжысёрскай задумкі, нагадвае гогалеўскую “Ноч перад Калядамі”. У ролі Салохі – старэйшая салістка фальклорнага ансамбля народнай песні “Верас” Верасніцкага цэнтра традыцыйнай культуры Жыткавіцкага раёна Лідзія Пятрычыц. Яна, здаецца, жыве на сцэне, чытаючы маналогі аб жаночай долі і згадваючы перыпетыі вясковага жыцця. Зала прафсаюзаў літаральна скаланаецца ад смеху і гучных апладысментаў.

Так было і на нядаўніх здымках праграмы “Я магу” на тэлеканале АНТ, і на апошніх рэспубліканскіх “Дажынках”, дзе паляшучка выконвала песню пра “Запарожац” – працяг вядомага “Лісапета”. Спявачцы апладзіравалі лепшыя хлебаробы краіны. Увогуле, гумарыстычныя творы салісткі калектыву нікога не пакідаюць абыякавымі.

**Усё ў мяне ад мамы**

Нарадзілася Лідзія Савічна на беразе хуткаплыннай Прыпяці, у прыгожай тураўскай вёсачцы Верасніца. Там вучылася, туды, атрымаўшы прафесію настаўніка, вярнулася на працу, нарадзіла і выхавала дзяцей, вывела на шырокі прастор жыцця сотні вучняў; больш за паўстагоддзе спявала разам са сваімі землякамі. Не пакінула гэты занятак і сёння.

Ветэран педагагічнай працы жыве ў маленькай бацькоўскай хаце. Тут надвячоркам і гутарым пра яе лёс.

– Я з трэцяга класа ўдзельнічала ў школьнай самадзейнасці, – распавядае Лідзія Савічна. – У вёску тады якраз маладыя настаўніцы прыехалі. Яны арганізавалі школьны хор, куды прымалі ўсіх дзетак. З сольнай песняй першы раз на сцэну выйшла ў пятым классе, а ў дзявятым удзельнічала ў калгаснай самадзейнасці. Для мяне песні ўсё, гэта маё жыццё. Цягне мяне да спеваў, не ведаю, чаму. Мабыць, душа спявае. І ад маці, канечне, перадалося: матуліны браты ўсе без выключэння музыканты, на ўсіх інструментах умелі іграць. Тады ж прастольныя святы ў вёсках правілі. На Уздзвіжанне, 27 верасня, да нас збіралася радня з усіх вёсак. Прыходзілі скрыпачы, гарманісты, барабаншчыкі. Сядуць вось тут, пад вокнамі, – і песні, музыка да глыбокай ночы...

**Калі спявалі ўсе**

Вялікая сіла – калгасная самадзейнасць. Тады людзі спявалі ўсюды: у полі, у лесе, на фермах, на вуліцы... Калі Лідзія Пятрычыц пачала працаваць у школе пасля інстытута, даяркі запрасілі яе на ферму: маўляў, хочам спяваць, а ніякай арганізацыі няма. І дзяўчына 7 гадкоў бегала на ферму, адшуквала песні, распытвала бабулек, ладзіла рэпетыцыі.

– Праз нейкі час нас запрасілі ў клуб, бо людзі і з сяла пажадалі далучыцца, – згадвае суразмоўца. – То ж была весялуха – выйдзем, песняка як дадзім, душа нанава нараджалася! Такія былі галасы, божанька мой!

**Трэба любіць сваё**

Выступалі неяк артысты “Вераса” разам з іншымі калектывамі перад прафесарамі-фалькларыстамі з Мінска. Пасля канцэрта гледачы ўсе як адзін прыйшлі за кулісы да верасніцкіх артыстаў і сказалі: усе няблага паказалі праграму, але “Верас” – найлепшы. Дзеля такой ацэнкі, пераканана Лідзія Савічна, і трэба працаваць, нягледзячы на настрой і надвор’е:

– Куды б нас ні пазвалі – ідзём. І на дажынкі, і на зажынкі. Аднавілі нават мясцовы вясельны абрад. Сапраўдных вясельных песень сёння ўжо нідзе не спяваюць, а мы пастараліся зрабіць “рэанімацыю”, і нашы маладыя цяпер адчуваюць повязь з продкамі. А без повязі хіба ж мы будзем як народ? Трэба шанаваць і любіць сваё, і будуць нашы людзі больш шчаслівымі.

Самадзейная спявачка клапоціцца аб тым, каб традыцыя спеваў не сышла ў нябыт. Вучыць гэтаму майстэрству і моладзь, што прыходзіць у калектыў. Піша і выконвае свае прыпеўкі, якіх, кажа, ужо з добры том назбіралася.

**Асаблівыя апладысменты**

Штогод вераснёўцы прывозяць шмат дыпломаў і падзяк з розных фестываляў і конкурсаў. Падзеяй года ў фальклорным мастацтве ў свой час прызналі выступленні Лідзіі Пятрычыц і “Вераса” арганізатары і ўдзельнікі свята гумару “Аўцюкі”, а таксама міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый “Покліч Палесся”. Тое выступленне таленавітай палескай спявачкі і жартаўніцы высока ацаніў і кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Даспадобы яму асабліва прыйшлася песня “Лісапет”: «Больш за ўсё на свеце люблю я ездзіць на лісапеце. І гэта праўда: і ў клуб, і ў сяльпо, і ў тураўскія далі – усюды жму я на педалі...»

Мая гераіня не згодная з меркаваннем аб тым, што росквіт народнай песні мінуў:

Скажу шчыра: калі б такіх людзей, што прагнуць гэтым займацца, больш падтрымліваць, то многае можна захаваць. З жывымі традыцыямі, як мне бачыцца, у нас праблемы. Цяпер больш увагі скіравана на платныя паслугі. Зразумела, грошы патрэбны ўстановам культуры, але каб у пагоні за грашыма не выкінуць і “дзіця” на сметнік... Чаму б працу культработнікаў не ацэньваць яшчэ і па колькасці захаваных традыцый?

**Песня гадкі прыбаўляе**

Нагадваю Лідзіі Савічне пра гады: можа б, лішні раз пасядзелі, адпачнулі?

Усміхаецца толькі ў адказ:

– Правільна кажаце, даражэнькі. Бывае, і здароўе падводзіць, але ж жаданне спяваць перамагае і хваробы, якія прыкідваюцца. У непагадзь і сапраўды пасядзець бы, бо да клуба ісці далёка, але не, спяшаюся на рэпетыцыю – жанчынкі ж мае прыдуць. Мы ўжо як адна сям'я – гэтак здружыліся за дзесяцігоддзі. Часам і так збяромся ў нядзельку, на прызбе ці ў хаце – сумна ж проста так сядзець. І ўсе размовы пра песні. Думаю, яны нам, старым, і гадкі прыбаўляюць.

Зімуючы неяк у сына ва Украіне, артыстка склала верш "Край мой сельскі". Добрыя радкі атрымаліся. Напявала сама сабе, каб не забыць, а вярнуўшыся ў Верасніцу, пайшла адразу да акампаніятара, каб падабраў мелодыю. Ён хлопец здольны – з ходу падхапіў. Так нарадзіўся не адзін твор. А самая любімая песня Пятрычыц – "Жывы будзем – не памром".

**І паехала Каляда з канца ў канец…**

*Сусветную вядомасць набыла палеская вёска Пагост дзякуючы захаванню калядных традыцый*

Адметны беларускі фальклор і народныя традыцыі, якія прайшлі праверку часам і захавалі, нягледзячы на былыя забароны, сваё зачараванне і спрадвечнасць, становяцца ўсё больш цікавымі для свету і прыцягваюць у Беларусь гасцей. Цягам апошніх гадоў нямала іх перабывала ў палескай вёсцы Пагост, што ў Жыткавіцкім раёне. Сусветную вядомасць і прызнанне яна набыла яшчэ ў 2010 годзе.

А адбылося гэта дзякуючы тэлеканалу CNN: ён назваў вёску, якая на працягу стагоддзяў размяшчаецца ў добрым суседстве з беларускай Амазонкай — Прыпяццю, адным з дзесяці лепшых зімовых месцаў у свеце для святкавання Каляд і Новага года. А яе суседзямі ў рэйтынгу былі Лондан, Нью-Ёрк, Бостан, Зальцбург, Ганконг. І – гэта невыпадкова.

Калядныя святкаванні ў Пагосце – традыцыя шматвекавая. І, відавочна, злучаная з важнымі падзеямі ў гістарычным мінулым. Тут мэтазгодна згадаць Тураўскае княства: менавіта ў Пагосце спыняліся ўсе госці тураўскіх князёў, і месцічы ўмелі іх прымаць гасцінна ды сябе, зразумела, паказаць. Відавочна, быў загад князя хораша весяліць яго гасцей. Бадай, і гэта толькі адна з прычын, аднак, вядома, асновы традыцыйнай культуры (свае абрады тут выконваюцца на працягу каляндарнага года!) унікальнага кутка Беларусі яшчэ і да гэтага перыяду былі, карані яе вельмі і вельмі глыбока схаваны ў мінулых тысячагоддзях. Увогуле ж, надта працавіты і таленавіты народ тут жыў спрадвеку. А таму і не магла знікнуць, як бы ні выкаранялася рознымі рэфарматарамі, і яго традыцыйная культура.

Дарэчы, у гэтым цвёрда перакананна 73-гадовая пагастчанка Кацярына Панчэня. Колькі сябе памятае бабулька — спявала з маленства, як і ўсе яе родныя, блізкія, суседзі. Цяжкае жыццё пражыла, распавядае, як сама і стагі

клала, і ўсю мужчынскую работу рабіла, самой прыйшлося падымаць дзяцей, а потым, так распарадзіўся лёс, і ўнукаў. Але, што б ні здаралася, цвёрда выконвала тое, што завяшчалі дзяды і прадзеды, — свае традыцыі, абраднасць. І другіх заклікала іх трымацца. Яны ды вера дапамагалі ёй жыць. Нядаўна, кажа, вось з бальніцы вярнулася. Надта цяжкая хвароба была, але выкарабкалася. Вярнулася ў сваю хатку – і зноў заспяваць захацелася. Перакананa: засталася жыць, бо не ўсё завершана на крузе жыцця, не ўсё яшчэ зроблена...

Кацярына Аляксееўна 35 гадоў была гаспадыняй мясцовага ачага культуры. Дзякуючы энтузіязму таленавітага арганізатара і спявачкі далёка за межамі раёна добра ведаюць тутэйшых спевакоў і танцораў. Яе сэрца аддадзена народнаму гурту “Міжрэчча”. Нават і зараз, калі яна на заслужаным адпачынку, нягледзячы на нездароўе, з народнымі песнямі і абрадамі, родным калектывам не расстаецца. Ёсць і яшчэ адна прычына: мастацкімі кіраўнікамі там працуюць блізкія ёй па духу людзі – нявестка Наталля Марозава і яе каляжанка Святлана Смалянец, хочацца перадаць моладзі ўсё творчае багацце, накопленае спявачкай. Так і атрымліваецца, што па-ранейшаму вакол жанчыны (ды і ў яе хаце, што нагадвае этнаграфічны музей – кабета дагэтуль сама тчэ, вышывае, ды, дарэчы, традыцыйна выпякае пшанічны хлеб – у краме такой смакаты не купіш!), гуртуюцца землякі, для якіх песня – сэнс жыцця.

А калядаваць у Пагосце пачынаюць у першую Куццю, з 7 студзеня, потым, на шчодры вечар, – 13 студзеня, калі адзначалася другая Куцця. Гулянні, распавядае Панчэня, праводзяцца для таго, каб у новым годзе ў хатах быў дабрабыт, распужаць злыя сілы і прыцягнуць шчасце і багаты ўраджай.

Кацярына Аляксееўна згадвае, як раней надзвычай хараша пагастчане на Ражство хадзілі па вёсцы і насілі царкоўны звон, гукі якога паведамлялі пра свята. Разам са святаром спявалі псалмы-калядкі, у якіх услаўлялі Ражство Хрыстова, а ў клубе ладзілі сцэнкі на біблейскую тэматыку. Усе маладзіцы — у вышываных палескіх строях, якія надаюць святу своеасаблівы каларыт. На гэтае свята ў Пагосце быў традыцыйны кірмаш — прыязджалі сваякі, гасцявалі, святкавалі. Дарэчы, усе, што дарылася ў хатах, тут ніколі не лічылася (на жаль, сёння замяняюць абрад камерцыйным інтарэсам!) заробкам. Так, энтузіясты на наступны дзень пасля калядавання ішлі разам у царкву і на ўсе грошы, якія ахвяравалі гаспадары, набывалі свечкі, замаўлялі службы дзеля шчаслівага жыцця ўсёй вёскі. І цяпер у Пагосце гэтая традыцыя захоўваецца.

Зусім іначай святкуецца тут шчодры вечар. Калядоўшчыкі абавязкова вадзілі з сабою Казу: лічылася, што з дапамогаю гэтай жывёлы можна выгнаць са двара нячысцікаў, а таксама разлічваць у наступным годзе на добры прыплод жывёлы ў гаспадарцы і плённы здабытак ураджаю з сялянскай нівы. Бо як спяваецца ў песнях калядоўшчыкаў, “...дзе Каза топ-топ, там жыта сем коп”. Сярод персанажаў чароўнага вечара і казачныя

Мядзведзь, Воўк, нават Буслік… Калядаваць у Пагосце выходзяць як моладзь, так і людзі пажылога ўзросту, якія ведаюць шмат абрадавых песень.

А пярэдадзень Вадохрышча завяршае калядныя святкаванні. У гэты вечар улагоджвалі Мароза (каб палагоднеў, не выстуджваў занадта сялянскія хаты, сцішыў свой нораў), якога тройчы клікалі есці куццю. Пасля запрашэння ўсёй сям'ёй садзіліся вячэраць. У гэты вечар пагосцкія незамужнія дзяўчаткі варажылі на суджанага.

...Цудоўнае надвор'е на праваслаўнае свята Палессі: і марозна, і снежна. У хаце Кацярыны Панчэні сабраліся яе каляжанкі: усе прыгожа апранутыя, у квяцістых хустках. Па абедзе разам выйшлі з хаты. Наперадзе неслі васьміканцовую зорку, якая сімвалізуе сабой тую самую віфлеемскую зорку, што абвясціла людзям аб нараджэнні сына Божага. І па зімовай, утаптанай сцежцы адзін за другім накіроўваюцца да чарговай сядзібы, да кожнага ганку немалой вёскі Пагост. Не прапускаюць нікога: людзі ж потым крыўдуюць, калі які двор мінаюць. Чакаюць гаспадары, каб надзяліць добрых калядных веснікаў рознымі пачастункамі. А тыя хораша спяваюць пад вокнамі старыя песні, у якіх перадаюцца падзеі тых дзён, калі з'явіўся на свет Ісус Хрыстос.

– А як будзе здароўе і божая падтрымка, то наймем і падводу, і гарманіста, у грывы коней упляцем рознакаляровыя стужкі, упрыгожым фурманку, пакрыем зверху квяцістымі, саматканымі посцілкамі, і – наперад, несці радасць людзям у суседнія Чэрнічы, Тураў і Жыткавічы, – адзначае на развітанне Кацярына Панчэня. – У гонар Каляды раней ладзілі ў клубе і агульнавясковыя святы, у якіх прымаў удзел і стары, і малы, таму свята аб'ядноўвала. Цяпер, на жаль, няма таго размаху і энтузіязму. Моладзь сёння, на жаль, лёгка адмаўляецца ад свайго, захапляецца чужымі традыцыямі. Затое гасцей, якія цікавяцца нашай абраднасцю, пабольшала. Нядаўна прыязджалі нават з Ноўгарада прадстаўнікі сістэмы адукацыі...

Дзякаваць Богу, падумаў я, што ёсць носьбіты спрадвечнай культуры, якім за ўсё баліць. Можа, дзякуючы ім у зорным небе нам, беларусам, засвеціць больш ярчэй шчаслівая зорка? Туды ж, у зорнае неба, у адказныя моманты жыцця ўздымалі вочы нашы продкі. Думаю, яны ведалі, што рабілі.

***Энтузіясты культуры***

**Неспакойнае сэрца Ганны Лой**

Замест уступу

Чарговая сустрэча з песеннай творчасцю гераіні гэтага нарыса адбылася літаральна мінулым нядзельным надвячоркам. У вёсцы Бялёў, з якой мяне парадніў лёс, маім землякам зрабіў выдатны канцэртны падарунак народны ансамбль народнай песні "Сваты" раённага цэнтра фальклору. І як заўсёды на сцэне была яна—душа выдатнага калектыву: вось – спявае разам з усімі, вось – іграе ролю прытворна хворай бабулі ў сцэнцы, а вось пад акампанемент Васіля Каральца сольна заводзіць: "Гэй, мой конік вараны!..", "Играй, гормонь, гормошка милая…"

Сяджу з аднавяскоўцамі ў клубнай зале, у якой напачатку было холадна, і разам з імі хутка забываюся на гэтую акалічнасць: ад станоўчых эмоцый і энергетыкі калектыва і яе вядучай спявачкі становіцца надта цёпла, хораша, утульна ўсім! Вось што робіць сапраўднае мастацтва! А зала тым і занята, што ўзрываецца апладысментамі, аддзячвае за цудоўнае выканальніцкае майстэрства.

Я ж у гэтыя хвіліны згадваў нашу (надарылася гады два таму) сумесную паездку ў Швейцарыю. Наплыло на памяць выступленне ў міністэрстве культуры, дзе цудоўным спевам паляшучкі і таленту музыкі Васіля Каральца, мала сказаць, цёпла апладзіравалі чыноўнікі і дзеячы культуры гэтай горнай краіны.

Думаю: колькі ж было ў гэтай жанчыны сцэнічных і канцэртных пляцовак? Наўрад ці яна лічыць. Ці злічыш усе кропелькі вады, што напаўняюць магутную раку? За імі – цэлае жыццё чалавека, якога пазначыў Бог талентам, працавітасцю, ініцыятыўнасцю, энергічнасцю, настойлівасцю, верай у справядлівасць і дабро. І мне вельмі хочацца, як удзячнасць за сапраўдны талент, расказаць пра гэтага незвычайную творчую асобу, чалавека, перакананы – апазнавальнага ўсімі жыхарамі раёна. Бо, нягледзячы на здраднікі-гады, на хваробы і жыццёвыя няскладнасці (жыццё ёсць жыццё!) ўсё ж такая, як у маладосці – заражае ўсіх сваёй захопленасцю фальклорнымі традыцыямі, нашымі беларускімі і агульнаславянскімі народнымі шадэўрамі. І вось у каго б нам, маладзейшым, павучыцца. Як несці ў народ, прапагандаваць сваё – мастацтва, мову і чалавечую чысціню. Павучыцца, як незаўважна робіць справу свайго жыцця простая жанчына, Ганна Пятроўна Лой…

**З вялікага спеўнага роду**

Сямурадцы – старажытная палеская вёска – яе радзінны куток. Сюды Ганніна сэрца імкнулася заўсёды і ў радасныя, і ў горасныя хвіліны жыцця.Тут дзяўчына выхоўвалася працавітымі, добрымі, вясёлымі бацькамі, жыццё якіх было цесна звязана з працай у тагачасным калгасе імя XXII з’езда КПСС. Маці, Марыя Сяргееўна, шчыравала паляводам, а бацька, Пётр Савіч, быў ездавым. Але што б ні здаралася, гучалі гэтыя песні ў хаце Клімовічаў. Гаспадыня што б ні рабіла: ці гатавала вячэру, ці прала, ці ткала, заўсёды спявала. А ёй часта падпявалі і дзеці, асабліва дачка Аня. Спяваў і гаспадар. І як ні стамляліся пасля працоўнага дня, аднак заўсёды знаходзілі час і быў такі настрой, каб заспяваць песню.

Як кажуць у народзе – яблыка ад яблыні далёка не коціцца. Усе рысы бацькоў: працавітасць, любоў да роднай зямлі, да людзей, якія на ёй жывуць, любоў да песні і народнай творчасці сфарміраваліся ў характарах іх дзяцей – дачок Ганны і Валянціны, сына Уладзіміра.

Яшчэ некалькі гадоў таму ў бацькоўскую хату можна было хадзіць, як у музей. Тканыя посцілкі, ручнікі, вышываныя сурвэткі, вязаныя абрусы – усё прыцягвала ўвагу. Сюды нават завітвалі вядомыя фалькларысты, этнографы і мастацтвазнаўцы. Быў у гасцях у Клімовічаў і мой універсітэцкі

настаўнік-фальклярыст Васіль Ліцвінка, які запісаў у свой час ад Марыі Сяргееўны Клімовіч некалькі дзесяткаў абрадавых песень.

Цяпер, лічы, такі ж музей у прасторным доме Ганны Лой і яе мужа Мікалая Аліфяровіча, у Жыткавічах. І бацькі чацвёрты год жывуць разам з дачкой. Пастарэлі ж, ім трэба клопат і увага. Паклікала ў свой час бацькоў Ганна да сябе: на вачах пры родным дзіцяці лепш пачувацца будуць. Згадзіліся яны, пераехалі. Жывуць разам, дружна. Сюды прыязджаюць з Гомеля Валянціна з сям'ёй, яна цяпер дырэктарка камерцыйнай гомельскай фірмы, і Валодзя з Людзяневічаў, дзе працаваў кіраўніком, а цяпер настаўнікам мясцовай школы. Збіраюцца разам і дзеці з унукамі Ганны Пятроўны. Усе разам успамінаюць мінулае, радуюцца за сённяшняе, што жывыя ўсе, здаровенькія. А гэта нямала для сённяшняга жыцця. І – заспяваюць разам! Яшчэ ж як заспяваюць!

…Гучыць адна з любімых песень – "У зялёную дуброву", якую яшчэ спявала бабуля Ганны. Шчыміць сэрца, калі ёй, Ганне Пятроўне Лой, наплывае на памяць маладосць, калі першая думка аб стварэнні сямейнага ансамбля нарадзілася неяк сама сабой. Збяраліся тады ўсе разам у хаце бацькоў: брат Валодзя, сястра Валя, Ганна з дачкой Надзеяй і сынам Жэнем, заводзілі песню, потым другую. А Ганна, якая вучылася на завочным аддзяленні Магілёўскага культасветвучылішча, давала родным нейкія парады, рэплікі. Тады ніхто і не думаў, што гэта і ёсць самыя сапраўдныя рэпетыцыі. Потым, калі зразумелі, што атрымліваецца няблага, Ганна і рэпертуар падабрала. Спачатку сямейны ансамбль выступіў на сцэне сельскага клуба, дзе яна працавала загадчыцай. А потым, як і фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Сцвіжанка", якому было прысвоена званне «народны», выступаў на абласным, рэспубліканскім тэлебачанні…

Разам яны такія шчаслівыя! Так, фактычна фенаменальная з'ява для нашай рэчаіснасці – сямейны ансамбль…

Падаецца загадкай нават тое, як знаходзяць агульную мову паміж сабой прадстаўнікі розных пакаленняў. Вучоныя, карыстаючыся лічбамі, сцвярджаюць, што інстытут сям'і ў сучасным грамадстве перажывае жорсткі крызіс. Дзеці не разумеюць бацькоў, а тыя – дзяцей. Разводзяцца маладыя і сталыя мужы і жонкі, бацькі-алкаголікі адмаўляюцца ад уласных дзяцей, а дзеці "забываюцца" пра сваіх старых бацькоў. Стварыць і захаваць сваю сям'ю, жыць у міры і згодзе з дзядамі і ўнукамі – справа, аказваецца, не такая ўжо і простая.

У сям'і Ганны Пятроўны таксама былі і ёсць свае праблемы, цяжкасці, непрыемнасці. Жыццё цяпер няпростае для ўсіх. Зрэшты, калі яно было простае і лёгкае для працоўнага чалавека? Але песня – дапамагае жыць, адкрывае яго новыя грані, настройвае на добры лад, адрывае ад будзёнасці…

**Яе спадарожніца—песня народная**

Ці збіралася Ганна Пятроўна ўсё сваё жыццё прысвяціць фальклору і песні?

– Ды не! Я адносілася да гэтага, як да захаплення, і толькі так! – адкажа яна вам.

І згадае, як разам дзяўчатамі-аднагодкамі, сабраўшыся надвячоркам каля чыёй-небудзь хаты на ўтульнай вясковай лавачцы, спявалі ў Сямурадцах. Прасілі дзяўчаткі і Аню праспяваць любімую песню. Яна з захапленнем выконвала іх просьбу. Слухаць яе было – вялікая радасць. Ужо тады дзяўчына неяк умела згуртаваць, аб'яднаць вакол сябе моладзь. З ёй нікому і ніколі не было сумна. Хоць і не думала – не гадала, што гэтыя здольнасці спатрэбяцца ёй у будучай прафесіі, якую не адразу выбярэ сваім розумам і сэрцам.

А было ж у яе біяграфіі і такое: пасля заканчэння школы падалася ў горад, у Мінск. Тут паступіла на вучобу ў прафтэхвучылішча пры камвольным камбінаце. Вучылася, не ленавалася, хоць і адчувала, што не яе гэта справа. У сны прыходзіў родны дом, бацькі, сябры, якія нікуды не паехалі – засталіся працаваць у родным калгасе. А больш за ўсіх чакаў Ганну адзін малады прыгожы хлопец. Калі ён прапанаваў аднойчы стаць яго жонкай, усе яе сумненні наконт таго, пераязджаць у Сямурадцы ці працягваць вучобу ў Мінску, рассеяліся нібы той летні няўстойлівы туман.

Вучылішча яна так і не закончыла, пайшла замуж за Мікалая, вярнулася ў родную вёску. Працаваць яна стала прыёмшчыцай малака. Потым адно за другім нарадзіліся дзеці. Спачатку сын, а затым дачка…

Месца яе працы было ў памяшканні сельскага клуба. Ганна спачатку з цікавасцю сачыла за рэпетыцыямі самадзейных артыстаў, а потым і сама пачала ўдзельнічаць у іх. Яе зацікавіла, захапіла клубная справа. І часам прыходзіла ў галаву думка: ці змагла б яна справіцца з гэтай работай?

– Памятаю, расказвае Ганна Пятроўна, – што калі выслабанілася месца загадчыка, я паехала ў раён і стала прасіцца, каб мяне прынялі на новую пасаду.

У аддзеле культуры аднесліся да яе просьбы спачатку вельмі скептычна: маўляў, які з гэтай дзяўчыны культработнік.? Ні спецыяльнай адукацыі, ні ўяўлення аб клубнай рабоце яна не мае. І ёй адмовілі. Але праз нейкі час яна дабівалася свайго, даказала, што справіцца з абавязкамі загадчыцы клуба.

І… пачала сваю работу на новай пасадзе з канфлікту з калгасным кіраўніцтвам. А разгарэўся ўвесь сыр-бор вакол прыёмнага пункта, таго самага, дзе Ганна працавала раней. І тады, і цяпер, калі стала загадчыцай клуба, не падабалася ёй, што ў ачагу культуры прымаюць малако ў насельніцтва. – Не месца тут прыёмнаму пункту, – даводзіла ў сваіх спрэчках з начальствам. І дабілася свайго – перанеслі ўсё-такі пункт у іншае месца.

Старэйшыя жанчыны пасля таго канфлікту спачатку крыўдавалі на Ганну, заяўлялі, што нага не ступіць больш у клуб. Разважалі паміж сабой: "І як такая ўпартая будзе працаваць загадчыцай клуба, як з людзьмі паладзіць?"

Але з цягам часу вяскоўцы перайначылі свае меркаванні аб Ганне, змянілі гнеў на літасць. Новая загадчыца не цуралася ніякай працы. У

гарачую пару корманарыхтоўкі для грамадскай жывёлы выходзіла разам з іншымі калгаснікамі на сенажаць, гэтак жа, як і яны, завіхалася на праполцы буракоў. Ну як было не прыняць Ганну ў сваю кампанію, не заспяваць разам з ёй песню і не згадзіцца на яе прапанову прыйсці ў клуб на рэпетыцыю.

І прыйшлі, і паказалі Ганне, на што здатныя. Успомнілі старадаўнія, шчымлівыя мелодыі і словы песень, якія спявай яшчэ дзядулі і бабулі аб нялёгкім сялянскім лёсе. Спявалі і новыя песні. Любімы занятак усё больш і больш прыцягваў да сябе. Ганна стала адшукваць і выконваць новыя народныя песні, зацікавілася старажытнымі абрадамі.

– Працуючы з людзьмі, я адчувала, што не хапае ведаў, што трэба абавязкова вучыцца, – распавядае Ганна Пятроўна. – Таму і вырашыла паступіць на завочнае аддзяленне Магілёўскага культасветнага вучылішча. А ўсё лічу, што гэта адбылося ад любові да песні, якую я атрымала ад маці…

Трэба сказаць, што Ганна Лой шырока разгарнула работу па актывізацыі культурнага адпачынку працаўнікоў вёскі. Новая загадчыца клуба не хацела мірыцца з тым, што ў танцавальнай зале кураць, прыходзяць п’яныя… Пачала наводзіць парадак. Ды ці толькі адны танцы павінны быць у сельскім клубе?

Яна змагла сабраць вакол сябе такіх жа ўлюбёных у народную песню жанчын і стварыла самадзейны калектыў – фальклорна-этнаграфічны ансамбль, якому самі ўдзельнікі далі назву “Сцвіжанка”. З цягам часу пасля доўгіх рэпетыцый была складзена першая праграма. З ёю калектыў выступіў перад працаўнікамі мясцовага калгаса. Бурныя апладысменты сведчылі аб вялікім поспеху канцэрта. Аднак кіраўнік ансамбля добра разумела – спыняцца на дасягнутым нельга. Неабходна адшукваць новыя песні, творча апрацоўваць іх, павышаць выканаўчае майстэрства. Наперадзе была вялікая праца.

Настойлівасць і творчы пошук далі свой плён. Праз нейкі час самадзейных артыстаў добра ведалі і любілі не толькі ў нашым раёне. Найбольшую радасць прынесла тое, што «Сцвіжанка» была ўдастоена запісу па абласному тэлебачанню і атрымала высокую ацэнку тэлегледачоў. Аб гэтым сведчылі сотні пісьмаў, падзяк, якія прыйшлі пасля выступления ў Сямурадскі сельскі клуб. Калектыў неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі раённага аддзела культуры.

А Ганна – клубны работнік у поўным сэнсе гэтага слова. Ініцыятыўны, энергічны, напорысты, настойлівы ў дасягненні пастаўленай мэты. Зрушыліся справы да лепшага і ў плане рамонту клуба, увагі кіраўніцтва гаспадаркі да праблем работнікаў культуры.

У сельскім клубе старанны культработнік арганізавала шмат змястоўных мерапрыемстваў, якія становяцца традыцыйнымі. Людзей сумленных, працавітых удзельнікі мастацкай самадзейнасці славілі і словам, і песняй. А п'яніцам і гультаям не давалі спуску. Агітбрыгада клуба «прысвячае» ім свае спецыяльныя выпускі-выступленні. А загадчыца клуба тады была прызнана пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва, якое

разгарнулася сярод работнікаў культуры ў мінулым годзе, яе фотаздымак занесены на раённую Дошку гонару.

Але з радасцю ад поспехаў на працы прыходзіла і жыццёвае расчараванне – некалі шчаслівы сямейны карабель даў такую трэшчыну, праз якую выратаваць яго не было ніякай магчымасці. Гэта было сапраўды нялёгкае жыццёвае выпрабаванне, з якім яна, як ні цяжка, справілася. І тады прымаецца цяжкае, але кардынальнае рашэнне – Ганна разышлася са сваім першым мужам.

**Шчасце на новы лад**

Яна не схіляе галавы перад жыццёвымі праблемамі: забраўшы дзяцей, перабралася ў Жыткавічы. Кіраўніцтва аддзела культуры райвыканкама запрасіла яе на пасаду дырэктара раённага цэнтра фальклору. Яна аддае ўсю сваю душу новай працы, і дасягае выдатных вынікаў – цэнтр фальклору становіцца самай сапраўднай скарбніцай духоўнасці Жыткаўшчыны.

Тут, у Жыткавічах, Ганна Лой змагла пабудаваць новы сямейны карабель. Са сваім мужам Міколам Аліфяровічам Ганна пазнаёмілася дзякуючы песні.

– Неяк прыехалі мы з сямейным сваім калектывам выступаць, – з усмешкай распавядае яна. – І тут высветлілася, што ў майго бацькі недзе згубіліся боты і кашуля. Пра нашу бяду даведаўся малалы хлапец, які таксама прыехаў з нейкім самадзейным ансамблем на канцэрт. Прыйшоў і даў бацьку сваю вопратку, каб той змог выйсці на сцэну…

Так яны стварылі сям’ю. Мікалай адначасова стаў і ўдзельнікам сямейнага ансамбля, які на той момант ужо быў вядомы не толькі ў раёне, але і ў вобласці, рэспубліцы.

Выдзелены сям’і стары дом капітальна адрамантавалі. Мікола, інжынер па спецыяльнасці, працаваў на маторабудаўнічым заводзе, зрабіў у ім усё на гарадскі лад, каб былі ўсе выгоды. Цяпер дырэктар цэнтра фальклору і народнай творчасці ў Жыткавічах Ганна Лой і яе муж Мікола жывуць цяпер куды больш цывілізавана, чым іх бацькі. Хоць жывуць па-гарадскому, але трымаюць сваю гаспадарку…

Праца ў цэнтры фальклору (а ён дзейнічае з 1992 года, і ўвесь гэты час ім нязменна кіруе Ганна Пятроўна Лой), захапіла жанчыну поўнасцю: яна збірала і рэстаўравала старажытныя абрады. Дзеля гэтага трэба было аб’ехаць шмат вёсак раёна, пазнаёміцца з цікавымі народнымі майстрамі, запісаць песні, вывучыць абраднасць.

– Многа было сабрана матэрыялу, экспанатаў, нават музей удалося адкрыць. На жаль, не захаваўся ён, але работа не прайшла дарэмна… – кажа кіраўнік унікальнага цэнтра.

І гэта так. У цэнтры за гэтыя гады сабраны ўнікальныя звесткі, якія не даюць згінуць бясследна матэрыяльным і духоўным каштоўнасцям таленавітых палешукоў.

Ганна Пятроўна Лой спрычынілася і да стварэння клуба аматараў народнай творчасці “Вечарына” – члены клуба займаюцца выяўленнем

новых і цікавых прапагандыстаў і вынакаўцаў народнай песні, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Такія пошукі ў населеных пунктах раёна ператвараюцца ў сапраўдныя святы. Калі б выдаць толькі друкаваным словам усе напрацоўкі, то, відаць, не хопіць і некалькіх тамоў для гэтага. Але галоўнае, мабыць, тое, што праводзімыя цэнтрам фальклору мерапрыемствы і конкурсы трывала ўвайшлі ў жыццё раёна, у іх прыцягваецца моладзь і дзеці. А ўсяго пры цэнтры фальклору працуе трынаццаць фарміраванняў. А колькі цікавых знаходак знойдзена разам з кіраўніком народнага ансамбля народнай песні "Сваты" Васілём Каральцом!

– Прыкра тое, што многае робіцца толькі на энтузіязме… – кажа мая гераіня. – А гэта не заўсёды добра.

Гэта яе думка пра развіццё народных рамёстваў. І не толькі. Ёй баліць за многія пачынанні, якія могуць толькі нарадзіўшыся загінуць, калі мы – ад кіраўнікоў ад культуры да простых людзей – будзем дбаць толькі пра матэрыяльны бок справы. Забываючы сваё прадвызначэнне – шанаваць і захоўваць нашу агульную спадчыну, якая цэментуе нашу незалежную Беларусь.

**Падрастае маленькая "зорачка"**

У Ганны Лой сын і дачка, чацвёра ўнукаў. Яна старалася прывіць усім любоў да роднага і дарагога, што складае паняцці душа народа і род. І гэта ў яе, дзякуючы падтрымцы мужа Мікалая, бацькоў, атрымалася. Дачка Надзея – таленавітая жанчына, спявае з маці дуэтам у сямейным ансамблі. Яна ж майстар вышыўкі крыжыкам. І сваю дачушку Аляксандру захапіла да гэтай справы. Дзяўчынка стварыла нямала выдатных палотнаў, якія ўжо экспанаваліся на розных выставах.

А нядаўна Аляксандра была ўганаравана і як юная баяністка. Майстэрства і настойлівасць дзяўчынкі прывялі яе да перамогі ў рэгіянальным фэсце гарманістаў "*Грай*, гармонік" (горад Ельск, 2007 год). У тым жа годзе Аляксандра стала лаўрэатам чацвёртага абласнога фэсту-конкурсу "Мой *сябра* – баян". Вучаніца Жыткавіцкай дзіцячай школы была адзначана прэміяй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта за творчыя дасягненні і высокае выканальніцкае майстэрства. Гэта для сям'і была вельмі вялікая радасць. Асабліва для бабулі – яна і прывучыла дзяўчынку з ранніх гадоў да музычнай традыцыі сям'і. З пяці гадоў Аляксандра задзейнічана ў ансамблі, які так і завецца – "Сямейны ансамбль Ганны Пятроўны Лой"…

– Саша самастойная, старанная, усё гарыць у яе ў руках – натура творчая, – радуецца бабуля. – Ёй усё цікава: і баян, і вышыванне, і спевы, і пляценне. Нядаўна яна прадстаўляла свае творы кіраўніку вобласці, і яму яны вельмі спадабаліся.

Што ж, няхай у шчасці расце прадаўжальнік сямейных традыцый Лой. Няхай будзе такой жа таленавітай, ініцыятыўнай, энергічнай, настойлівай у дасягненні пастаўленай мэты, як і яе бабуля.

*...Пасля канцэрта я падзякаваў Ганне Лой за выдатны канцэртны падарунак.*

*– А ці Вам на самай справе спадабалася? – крыху засяроджана перапытала яна.*

*– Канешне. Вашы песні не могуць не крануць... Глядзіце ж, як мае землякі апладзіравалі...*

*– Значыць, у нас атрымалася. Дзякуй Богу... – усміхнулася яна мне, ласкава, сардэчна, крыху супакойваючыся.*

*Божа, толькі цяпер я зразумеў адну дэталь: яна і цяпер хвалюецца перад кожным выхадам на сцэну. І будзе, мабыць, хвалявацца заўсёды. Кожнае выступленне расцэньвае як творчы экзамен. Для сябе, для калег. Што ж, гэта яе жыццё. І ўсё яе хвалюе, бо, перакананы, гэта дзеяч культуры ў поўным сэнсе гэтага слова. Няхай жа яе творчае жыццё будзе як мага больш доўгім і шчаслівым, а здароўе прыбаўляецца год ад году.*

**Каб багацела жыццё!**

***На працягу стагоддзяў веснавы абрад “Карагод” на свята Юр’я (у праваслаўнай хрысціянскай традыцыі – Дзень святога Георгія Перамаганосцы) 6 мая ладзіўся некалі ва ўсіх вёсках сучаснай Жыткаўшчыны, але ў жывой традыцыі да нашых дзён захаваўся толькі ў прыпяцкай вёсцы Пагост. Навукоўцы па назве тэрыторыі бытавання назвалі абрад “Тураўскі карагод”. Як этнічная адметнасць мясцовых жыхароў, у 2004 годзе ён першым у Беларусі ўзяты пад ахову дзяржавы як аб’ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны.***

Традыцыя правядзення абраду склалася яшчэ ў час засялення гэтых зямель аб’яднаннямі плямён дрыгавічоў, затым Тураўскага княства (X—XVI стагоддзі), калі гэтыя асаблівасці замацаваліся агульнасцю тэрыторыі і звычаяў. Цяпер носьбітам абраду з’яўляецца толькі адзін фальклорна-этнаграфічны гурт вёскі Пагост. Ён створаны ў 1980 годзе, з 2006-га носіць найменне “народны”. Стварыла яго выдатная спявачка, захавальніца традыцыйнай культуры роднай вёскі —Кацярына Панчэня. У 1995 годзе калектыў узяў сабе назву “Міжрэчча” — ад геаграфічнага становішча вёскі, размешчанай пры ўпадзенні ракі Сцвігі ў Прыпяць.

Кацярына Аляксееўна распавядае:

— Пачынаецца падрыхтоўка да свята з папярэдняга дня, калі хаты і двары прыбіраюцца, а людзі рыхтуюць святочнае адзенне. У абрадзе “Карагод” вельмі важна, каб удзельнічалі дзяўчаткі-падлеткі, якія далучаюцца да гурта дарослых жанчын. Напярэдадні свята у адной з хат выпякаем вялікі, упрыгожаны, як на вяселле, каравай, які называецца, як і сам абрад, “карагод”, робім для яго ўпрыгожання папяровыя кветкі, а дзяўчаты плятуць для сябе вяночкі з барвінку. Раніцай 6 мая збіраемся ў той жа хаце і ўпрыгожваем хлеб-карагод (у яго ўторкваем тры галінкі пладовага дрэва, якое ўжо расцвіло, разгалінаваныя яшчэ на тры галінкі. Так, на кожнай павінна быць тры парасткі з кветкамі — усяго дзевяць. Столькі месяцаў

працягваецца цяжарнасць жанчыны. Гэтым абрадам ушаноўваецца ўрадлівасць зямлі. Усё гэта адбываецца пад спевы спецыяльна прымеркаванай абрадавай песні. Потым граблі перавязваюцца зялёным фартухом, ён сімвалізуе цнатлівасць дзяўчыны, а граблі — працу.

— Ролю Ваяводы звычайна выконвае абраны і запрошаны з вечара самы паважаны ў вёсцы мужчына, — распавядае Кацярына Аляксееўна. — Ваяводзе перадаём абрадавы каравай, запалім уторкнутую ў карагод свечку і затым выходзім на вуліцу…

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла некалькі гадоў запар быць у Пагосце падчас унікальнага абраду. Цікаўлюся: а, можа, цяпер нешта будзе нанова, нешта змянілі?

— Гэта немагчыма. Традыцыя паўтараецца ў такой жа дакладнасці, як і ў мінулыя дзесяцігоддзі, — адказвае абрадніца. —Вельмі важна яго правесці так, як рабілі нашы дзяды. І сёлета шэсце з абразом Прысвятой Багародзіцы, караваем і граблямі з фартухом выйдзе з хаты і пройдзе праз сімвалічныя «вароты», створаныя з рушнікоў, з прытанцоўкамі і прыпеўкамі накіруецца да поля за сяло, каб «праславіць Юр'е» і папрасіць у Бога благаслаўлення «на буйнае жыта, на цёплае лета».

Традыцыйна ўсю працэсію ўзначальвае мужчына, які нясе ікону, упрыгожаную ручнікамі. Затым жанчыны нясуць ручнік, хлопцы — 5-прамянёвую зорку (рода-племянны знак), за ёй — абрадавы хлеб (яго нясе ваявода), потым нясуць зялёны фартух на граблях, следам — шэрагам, узяўшыся пад рукі, ідуць дзяўчаты, за імі — хлопцы, а потым — усе, хто хоча паглядзець, як будуць карагодзіць на полі.

Падыходзячы да поля, абраднікі сціхаюць і прыпыняюцца. Потым праз «вароты з рушнікоў» праходзяць у жытняе поле, дзе адбываецца самы ўрачысты момант галоўнага карагода, калі кожная жанчына вядзе за руку дзяўчынку. Тут Кацярына Панчэня альбо нехта з самых сталых жанчын вёскі праводзяць малітоўнае асвячэнне поля з азімінай, аддаюць яму “даніну” (закапваецца скарынка хлеба ў зямлю), а дзяўчаты разам з жанчынамі і бабулямі водзяць кругавы карагод, у сярэдзіне якога стаяць хлопцы і мужчыны з асноўнымі атрыбутамі абраду.

Гурт спявае запар некалькі старых абрадавых песень, што прыйшлі ад дзядоў. У адной з іх такія радкі: “Ой, выйдзем на поле ды паклічам Бога адмукнуць зямліцу, выпусціць расіцу”. Жанчыны галасна заклікаюць: “Ой, дай, Божа, на жыцечка і пшаніцу род, а на статачак плод! Дай людзям на здароўе! На полі — капамі, у гумне — стагамі, на таку — умалотам, у засеку — умольна, у дзяжы — падыходна, у печы — узросла, на стале — укройна!” Галасна гучаць на полі і такія просьбы: “Юр’я, устань рано, паезжай у поле, адмукай зямліцу, выпускай расіцу! Пусці расу на ўсю вясну і густую, і частую, і цёплую, і мокрую, і на ўвесь свет, на кожны цвет!”

Тройчы на полі прамаўляецца: “Хрыстос уваскрос!”. Адказаўшы яму тройчы “Ваісціну уваскрос!”, месцічы зноў пачынаюць вадзіць карагод. І ў гэты момант адна з дарослых жанчын здымае зялёны фартух з грабляў і чапляе ўжо чырвоны. Гэта азначае, што дзеўка гатова да дзетанараджэння, як

і сама зямля да будучага ўраджаю. Павадзіўшы карагод, з поля выходзяць такім жа парадкам, як і заходзілі — праз “варотцы”, утвораныя з ручніка.

Затым абраднікі вяртаюцца назад у вёску. Адтуль па вуліцах ідуць з вясёлымі песнямі і музыкай, спыняючыся каля кожнай хаты і пытаючыся дазволу карагод павадзіць. Атрымаўшы яго, водзяць той жа карагод, што і на полі, і жадаюць: каб быў на жыта род, на статак плод — людзям на здароўе. Усё адбываецца надзіва весела. Пасля здзейсненага абраду гаспадары частуюць абраднікаў: тут, кажа мая дарадца, гэта называюць Юр’еўскім валачобніцтвам.

Дарэчы, у гэты дзень першы раз выганяюць кароў у поле — на юр’еву расу — з замовамі, магічнымі ахоўнымі дзеямі. Карова — карміліца сям’і, яна ж забяспечвае ўрадлівасць глебы. Раней на Палессі зямлю апрацоўвалі валамі — пра гэта сведчаць тэксты песень і такая этнаграфічная рэч, як ярмо, што захоўваецца не толькі ў музеі, але і дагэтуль у некаторых гаспадароў.

Звычайна, распавядае Кацярына Панчэня, у цэнтры вёскі праходзяць святочныя гульні, танцы, карагоды. Пачынаецца гэтая, гульнёвая частка, з традыцыйных карагодаў: “Проса”, “Дрэма”, “Бабуся”, “Рэпка”, цяпер нярэдка тут ладзіцца і фальклорны фестываль, на які прыязджаюць гурты з усяго Палесся. А яшчэ кожнае свята ў Пагосце суправаджаецца пэўным арыгінальным меню…

Заўважу: не палюбіць пагосцкіх жанчын — галоўных гераінь унікальнага абраду — немагчыма. Яны захавальніцы многіх мясцовых рамёстваў і промыслаў, маюць свае калекцыі тканых і вышываных вырабаў, і ўсё гэта этнаграфічнае багацце прадметаў побыту з вялікім хваляваннем паказваюць усім цікаўным. Так тут жылі стагоддзямі: шануючы продкаў, трымаючыся звычаяў дзядоў, перадаючы ўсё гэта маладым.

Важна і тое, што цікавасць да падзеі расце год ад году: як у мінулыя гады, так і сёлета датыкнуцца да старажытнай абраднасці, што ідзе ад самых каранёў, чым жылі яшчэ не зусім забытыя прадзеды, прыедзе шмат людзей. І не толькі з Беларусі. Аказваецца, вельмі прыцягальныя звычаі ды сімвалы, якія спрадвеку мелі вялікае значэнне. Шкада толькі, што паважаць, пераймаць і захоўваць сваё роднае мы часта пачынаем толькі тады, калі яно на мяжы знікнення.

## Матэрыялы па фальклорнай спадчыне Жыткавіцкага раёна з архіваў установы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”, Жыткавіцкага раённага цэнтра фальклору

***Глушэц І.В., Мельнікава Л.Г. Даследавацъ і захавацъ***

Палессе – край, багаты на народныя песні. Тэрыторыя Жыткавіцкага раёна, якая адносіцца да нацыянальнага парка “Прыпяцкі”, не з'яўляецца выключэннем. У гэтым чаргговы раз перакакала фальклорная экспедыцыя, арганізаваная ўпраўленнем культуры Гомельскага аблвыканкама, установай “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”, аддзелам культуры Жыткавіцкага райвыканкама ў маі 2011 года. Экспедыцыйнае даследаванне здзейснена вядучымі метадыстамі ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” Людмілай Генадзьеўнай Мельнікавай, Ірынай Валер’еўнай Глушэц, дырэктарам Жыткавіцкага раённага цэнтра фальклору Ганнай Пятроўнай Лой. Падчас экспедыцыі было запісана 80 песень без уліку тэкставых варыянтаў. З іх каля 30 – абрадавых.

З каляндарна-абрадавых удалося зафіксаваць 10 калядных песень, што сведчыць пра добрую захаванасць каляднага абыходнага абраду (у дадзенай мясцовасці – з «казой»), магчыма, дзякуючы яго маляўнічасці і ўзнёсламу настрою. Прыклад шчадроўкі запісаны ў в. Перароўскі Млынок ад старэйшай яго жыхаркі Настассі Адамаўны Баран:

*Колядзін, колядзін,*
*А я ў бацька одзін,*
*По колено кожушок.*
*Дайце, цёця, пірожок,*
*А на пірожок сала,*
*А на сала коўбасу,*
*А я додому понясу.*

Наступны жанр каляндарных песень, зафіксаваных удзельнікамі экспедыцыі, – веснавыя загуканні. Паўсюдна захаваліся ў памяці носьбітаў варыянты песні «Гу, весна, гу, красна», а таксама «Ой, весна, весняночка», якую нам праспявала Настасся Баран з Перароўскага Млынка:

*Ой, весна, весна, весняночка,*
*Ой, чыя ж то дочка Мар’яночка?*
*За воротамі короўку пасла,*
*Назбірала горшчок масла,*
*Горшчок масла, горшчок сыра,*
*Да ўсіх хлопчыкоў запросіла:*
*– Ешце, хлопчыкі, ды й мочайце,*
*А на гарэлочку пробачайце.*

На Вялікдзень у вёсцы Хлупін ёсць звычай праведваць сваіх хросных – хадзіць «у волочобное». Аб гэтым расказала старэйшы носьбіт фальклорных традыцый Сцепаніда Іванаўна Торчык, якая яшчэ і добра спявае:

*Ой, лецела стрэла дый у конец села,*
*Хі я, хмелю, ды й у конец села.*

*Ды й убіла стрэла сына молойца.*
*Да ніхто к целу не прыступіцца.*
*Прыступіласа Анна Йваноўна,*
*Й узела цело дэ й на ручэнькі,*
*Обнесла цело кругом цэркоўкі.*
*Сама цэркоўка откріваецца,*
*Само целочко й у во гроб легло.*
*Прылетае да тры пташэчкі:*
*Што одна пташка – то мамка его,*
*А друга пташка – то сестра его,*
*А трэйця пташка – то жона его.*
*Ой, маці плачэ з веку до веку,*
*А сестра плачэ з году до году,*
*А жона плачэ з вечора до дня.*
*Ек мамка плачэ, то й рэкі цекуць,*
*А сестра плачэ – то й озёрушка,*
*А жона плачэ – ні калюжэчкі.*

Тут даволі цікава правесці паралелі з песнямі абраду «Ваджэнне і пахаванне стралы», якія спяваюць жыхары вёсак Казацкія Балсуны і Ірыноўка, што на Веткаўшчыне:

*А ў садзіку пад ігрушаю,*
*Ой, лёлі-лёлі, пад ігрушаю.*
*Там ляжыць цела, як папер бела.*
*А ніхто к таму целу не прыступіцца.*
*Прыступілася стара бабачка,*
*Стара бабачка, яго мамачка,*
*Яго мамачка ўзяла на ручанькі,*
*Панясла цела да й у цэркаўку.*
*Самі дзверачкі адчыніліся,*
*Самі свечачкі запаліліся,*
*Самі кніжачкі зачыталіся.*

*Ой, шла страла да ўдоль сяла,*
*Ой, ой, люлі, да ўдоль сяла.*
*Убіла страла добра моладца.*
*Па том моладцу некаму плакаць:*
*Матка старэнька, сястра маленька,*
*Жана молада возле горада.*
*Ідзе мамка плача – там калодзежы,*
*Дзе сястра плача – там руч'і бягуць,*
*Дзе жана плача – там расы няма.*

Яўнае падабенства тэкстаў, запісаных у Жыткавіцкім і Веткаўскім раёнах, дае падставу меркаваць, што абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» калісьці мог быць распаўсюджаны і на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся.

Выклікае цікавасць зафіксаваны ў вёсцы Хваенск веснавы карагод, які пачынаецца тыпавым напевам «крывы танец», а працягваецца тыпам «проса»:

*А ў крывого танца да не вуведом конца.*
*Зелёная рутонька, жоўты цвет.*
*– А мы просо сеелі, сеелі.*
*– А мы каня вупусцім, вупусцім.*
*– А мы каня забером, забером.*
*– А мы каня вукупім, вукупім.*
*– А мы дзеўку забером, забером.*

Яго зберагла ў сваёй памяці Галіна Чарнушэвіч. Можна меркаваць, што даўней гэта былі розныя карагоды, але з цягам часу, і, ўлічваючы, што інфарматары маглі нешта забыць, тэксты аб'ядналіся.

Падчас экспедыцыі таксама ўдалося запісаць ад Антаніны Чыжык з вёскі Хлупін некалькі жніўных песень, у тым ліку жартоўнага зместу:

*А я ў полі жыто жала,*
*Ў мене дома шкода стала,*
*Што свекруха с печы упала…*

З сямейна-абрадавых зафіксавана 13 песень вясельнага цыклу, якія выконваліся на заручынах для сватоў, а таксама каравайныя. Вясельную песню праспявалі жыхаркі вёскі Перароў Эвеліна Забеліч і Аляксандра Туравец:

*Клёновая да лісцінонька,*
*Клёновая да лісцінонька,*
*Куда цебе ветрык вее?*
*Ці в луг, ці в доліну,*
*Ці в луг, ці в доліну,*
*Ці назад на клёніну?..*

Больш за ўсё на даследаванай тэрыторыі ўдалося запісаць пазаабрадавых песень (каля 40). Цікавыя і варыянты найбольш распаўсюджаных сюжэтаў, адзін з якіх прадставіла Эвеліна Забеліч:

*Ой, пойду я в лес по дрова, нарубаю лому,*
*Зав'ёў мене дурны розум на чужу, на чужу старонку,*
*Зав'ёў мене дурны розум на чужу, на чужу старонку.*
*На чужой жэ сторононьке сонейко не грэе,*
*Нету маменькі родное, ніхто, ніхто не жалее,*
*Нету маменькі родное, ніхто, ніхто не жалее…*

На цяперашні час на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, якая адносіцца да Прыпяцкага запаведніка, шырока распаўсюджаны песенны фальклор. Больш за ўсё фіксуюцца пазаабрадавыя песні, а з абрадавых – калядныя, з каляндарна-абрадавага цыклу і вясельныя – з сямейна-абрадавага.

**Умоўныя абазначэнні:**

( ) – у круглых дужках пададзены дадатковыя галосныя пры агаласоўцы зычных, на фаршлагавых гуках,

[ ] – у квадратных дужках прыводзяцца тыя склады тэксту песень, якія пры спяванні не вымаўляюцца.

* – зорачка ў канцы радка азначае яго паўтарэнне пасля кожнай страфы ці паўтарэнне рэфрэна з другой паловай папярэдняга радка.

( 2 р.*) – азначае аналагічнае паўтарэнне радкоў у наступных строфах.

У паэтычных тэкстах песень і ў гутарковай мове інфарматараў захаваны лексічныя і асноўныя фанетычныя асаблівасці мясцовага дыялекту.

"У" на месцы літаратурна-нарматыўнага "ў" ставіцца ў тых выпадках, калі ў рэальным гучанні на яго прыпадае асобны склад; "ў" на месцы літаратурна-нарматыўнага "у" ставіцца ў тых выпадках, калі ў рэальным гучанні яно не з'яўляецца складаўтваральным.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка. – Мінск, 1999.

2. Новак, В.С. Абраднасць і паэзія «пахавання стралы» / В.С. Новак. – Гомель, 2002. – 270 с.

## Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Азяраны

### Каляды

– *Ці былі ў вас Каляды? З казой, з мядзведзем хадзілі? Як упрыгожваліся?*

– Ходзілі, ходзілі, дажэ мы все ходзілі. Ну, медведзя робілі маску, медведзя на голову, потом кожух наверх одзевалі, выворачвалі мехом наверх і медведзь тупаў. Ходзілі. Потом буська робілі, дзюба с буськой, он клюкал ходзіл, одзевался белою простынею, там, мужык ці жэншчына. Козу робілі, это ўжэ на Новы год водзілі козу, робілі козіну голову з дзерева, рожкі і одзевалі наверх што чорнае, шубу яку, ну і от эта коза ў хату войдзе і спявалі, прыспеўвалі.

– *А якія словы на Каляды гаварылі, калі хадзілі з казой або з мядзведзем?*

– "Пане гаспадарэ, разрешыце песню проспеваць?", "Добры вечар, пане гаспадарэ, разрешыце песню проспеваць." А яны говораць: "Спевайце". Калі проспевалі, то даюць сало, грошы, коўбосу, это на Новы год, на Рождзество, не только на Новы год, і начінают спяваць. Поспяваюць, потанцуюць с гормошкою.

– *Казу вадзілі і на Каляды, і на Стары Новы год?*

– Не, на Рождзество не, только на Новы год.

– *А на Стары Новы год?*

– "Звезду" носілі.

– *А колькі канцоў зорка мела?*

– Пяць.

– *Як праходзіла гэта шэсце з "зоркай"?*

– Дзеці ідуць раньшэ, это ж зіма, то ўжо часов в 5 цямнее, і дзеці бягуць па хатах, а потом, попозжэ, часоў у восем, собірáлісь мы, ходзілі взрослые.

– *З зоркай?*

– Да.

– *Песні спявалі?*

– Да.

– *Адкажыце, калі ласка, ці былі якія прыкметы на Каляды або на Стары Новы год?*

– На Рождзество, калі туман вялікі падзёт, будзе многа чернікі.

– *Якія былі варожбы?*

– Гадалі на Новы год на зеркалах. Я гадала, гадала на зеркале: сказалі ўзяць талерку, поставіць на стол два зеркала: с одной стороны і с другое. Запаліць. Бумага должна быць не тонка, потолшче. Наклалі тое бумагі, тая бумага як стала гарэць, а тая талерка як лопне, мы парозбегаліс, хто куда, дык і в зеркале пакуль гэтая бумага гарыць, то покажэцца суждзеный, хлопец,

які табе возьме замуж. Но мы паўцекалі і не даждаліс хлопца. А я молода шчэ тожэ была, да кажуць, шо трэба было на Раждзество ўмясці смецце, і ў якім вуглу загаўкае сабака, у той бок і замуж пойдзеш.

– *Так і атрымалася?*

– Не. Дрова бралі ахапкаю, прыносілі ў хату дрова, счітаеш іх по парам, значыць, будзеш у пары. Под кровацью ставілі кружку з водой, а на кружку лучыненку, тады прысніцца табе той, хто цябе праз гэтую кладачку перавядзе, ён будзе твой суждзеный. Бумажкі мяшалі, да цянулі імяны тыя. А то блінцы пяклі.

## Грамніцы

– *Распавядзіце, калі ласка, што рабілі на Стрэчанне, 15 лютага?*

– Когда свечі грамнічные пріносілі в хату, да это, говорацъ, от грозы добра свечка етая. Прыносілі і за ікону яе ставілі.

– *А калі навальніца?*

– Калі была граза, запальвалі свечку, і яна стаяла, предохраняла дом от грозы.

– *А са свечкай не абходзілі? Проста ў хаце запальвалі?*

– Да.

## Соракі

– *Як у вас называлася свята Соракі?*

– Сорак святых.

– *А што рабілі ў гэты дзень?*

– У гэты дзень палкі перакідалі цераз хату. Маці пекла сорок такіх, сухарікі.

– *Колькі палак перакідвалі?*

– Сорок палок. Шоб кошкалі яйца колісь. Ну, качкі дзікіе несутся на болотах, ходзілі на болото. Да шукалі ў кусціках яйца. І пеклі кресцікамі і колосікамі печіво.

## Гуканне вясны

– *А калі вясну клікалі, то на ўзгоркі сабіраліся?*

– Перед Постам, перад Пасхай была "Гу, вясна". Начінается от "Гу, вясны", ужэ потом пост пошол. Варылі яечкі, пяклі піражкі. Заварачвалі і дзе на стог сена залазілі, а то дзе горка, на горку залазілі і спевалі.

– *Прыходзілі на горку і што далей?*

– Пріходзілі, роскладвалі пірожкі, яйца. Потом бралісь за рукі, ходзілі кругом стога, а одного человека на верху сажалі, і он подпрыгівал, а мы вокруг сена спявалі. После садзілісь і білі яйцо. Потом злазілі і начіналі кушаць.

## Вялікдзень

– *Перад Вялікаднем ці спявалі стрэльную песню?*

– До Пасхі нікто ні спяваў, ні танцоваў. Валачобнікі ходзілі.

– *Як гэта адбывалася?*

– З 12 часоў ходзілі. У платочок хросная маці положа пірожочка, тры, чатыры або п’яць яец і ўгошчае, дае сыту піць, там у каго е, а то зробяць настоечку, чарніц поставяць. Давала маці хросна пірожка домой, яйцо, угошчала, конфеты дае. Зараз і конфеты, і шоколодкі, а раней нічога не было.

## Юр’е

– *Ці вадзілі карагоды?*

– Карагоды вадзілі на Юр’я, 6 мая. Раньшэ хадзілі на поле з фартухамі. Выбіралі хату і там збіраліся. Зранку збіраліся і выпякалі каравай. Рано спякуць каравай, а часов в одзінаццаць на поле ідуць.

– *Як упрыгожвалі каравай?*

– Веткі бралі с дзеревьев, обматывалі, обкручівалі.

– *А колькі ветак было?*

– Трі. Не было что – ленточкі с бумагі, красілі бумагу, бурака, краску разную і такіе робілі стужачкі, шышачкі пяклі з цеста. Як розочкі затыкалі на каравай, ішлі па дзеревне. Неслі в фартухах каравай.

– *Якія песні спявалі?*

– “Да Юрэй, маці кліча”.

– *Фартухі якога колеру былі?*

– Красного.

– *Хто у пачатку калоны стаяў?*

– Старэйшая.

– *А ікону Святому Георгію неслі?*

– Не.

– *Старэйшая жанчына граблі несла?*

– Граблі, а потым каравай. Ішлі і спявалі песні.

– *А карагод па полі вадзілі па сонцу?*

– Да, браліся все за рукі, каравай сам в средзіне, а кругом все ходзілі.

– *У адзін бок?*

– Ну, ворочелісь.

– *Што знаходзілася ў цэнтры кола?*

– І граблі, і каравай в средзіне етого круга.

– *А каравай падымалі?*

– Да, і граблі.

– *Мянялі фартух?*

– Не.

## Троіца

– *Што рабілі на Троіцу? Як у вас называлі такое свята?*

– Троіца. Святая Троіца і всё. Украшалі зеленью, клёном, яір, берёзок нарвалі, букеты нарвем, украшалі клёнам. Помыюць пол, накідаюць берёзок, букеты.

– *Ці былі спецыяльныя траецкія песні?*

– Пелі все подряд.

– *А куды потым дзявалі тыя бярозкі?*

– Как высыхалі расценія, то выбрасывалі. Букетов нарвём полевых цветов і ўкрашалі.

## Купалле

– *Ці клалі вогнішчы на Купалле?*

– Костры вечором клалі. І хлопцы, і дзеўкі перапрыгвалі цераз косцер.

– *А старыя?*

– Старые не ходзілі.

– *Ці шукалі папараць-кветку?*

– Не, боялісь. Гадалі: шчэ глаза платком закрывалі, і дзевчата, і хлопцы стояць, і с закрытымі глазамі шукалі: кого обнял, то твой суждзены будзет.

– *Ці рвалі лекавыя расліны?*

– Рвалі. Еслі свадзьбы долго няма, у нас колодзец і крюк, чтобы браць воду, і кралі еты крюк в другу дзеревню. Значіт, пачынаецца пара свадзеб. Это на Купалье.

## Жніво

– *Як рабілі летнія святы – дажынкі, зажынкі? Раскажыце пра бараду.*

– Ну, зжыналі поле ды оставлялі, у кучу сажнуць, а потом яе свяжуць снопочком, цвятамі украсяць і ленточкамі, і хлеб туды ложаць.

– *Гэта барада?*

– Это борода.

– *Чым плацілі?*

– Хлебом, монетой, сноп які ставілі, штоб урожайносць была.

– *Сноп куды ставілі?*

– В хаце ў людзей старых стоял.

– *Калі былі калгасы, куды яго ставілі?*

– В колхозе стоял і в сельсовеце стоял. Жэншчіны серпом вручную жалі. Нажыналі два-трі снопа. Дзе жыто, дзе ячмень. Стоял в колхозе, в конторе, возілі на выставку.

## Галавасек

– *Ці адзначалі раней у Азяранах жаніцьбу коміна?*

– Не.

– *Галавасек быў?*

– Свято е такое, но ў нас его не праздновалі.

– *А што гэта было?*

– Было давно, раньшэ была земля, у кого большэ землі, той богатый. І брат с братом не подзелілі после родзіцелей ету землю, і одзін брат другому отрубіл голову.

– *І на небе гэта было бачна?*

– Было відно. Это Головосек в сенцябре.

## Вяселле

### Сватанне

– *Як у вас сваты прыходзілі?*

– Я ў 57-м ішла замуж. В сваты пріходзіл мужык мой і маці яго.

– *А хросныя?*

– Не было.

– *З якімі словамі?*

– Воны прыйшлі. Свекруха: "От прыйшлі к вам, хочом, шоб Нінка ішла за Адамка". Он ужэ работал тракторістом. Договарівалісь. У меня сватов не было. Маці яго не хоцела, шоб он мене брал, он з Бурка, а я с Озеран. Он прішол, взял мяне, пошлі в сельсовет, взялі подружку і распісалісь.

– *Ці былі змовіны?*

– У меня старшая сестра ішла замуж і ў ей мама говоріла: "Шукаем, кажуць, што тут дзе-то цёлачку прадаюць. У вас е, дык мы к вам прыйшлі, шоб вы нам продалі". Ну, свадзьбу договарівалісь.

### Запоіны

– *Што было далей?*

– Я ходзіла на запоіны. Я брала і хросных, і сестру, і брата – всех. На каждый вугал трэба па бутылцы гарэлкі, пірог, сало абязацельно. Дагаворваліся, калі то свадзьба. Пыталі: "Чаго вы к нам завіталі?" – "Да, гавораць, бярозка ў вас расце." – "А не заламаеце яе?" – "Не, будзем берагці." Береглі добрэ, да не ўбереглі.

### Першы дзень вяселля

– *Першы дзень вяселля як праходзіў?*

– Первый дзень рабілі ў маладое свадзьбу.

– *Як гэта было?*

– Мы заехалі, мы ўжэ яе забіралі, да забралі. Да прівезлі.

– *Выкуп быў?*

– Выкупае. Яе захавалі. Ён шукае, ужо найдзе. Ды вжэ загадвае: "Дружкі, хто сколько грошай заплаціл за яе?"

– *А дзе нявеста хавалася?*

– У хаце сваёй.

– *Яе жаніх знаходзіў?*

– Находзіл. Да ўжэ ж за стол сядалі, не пускалі.

– *Дзе сустракалі нявестку з сынам?*

– Во дворе, у входа во двор.

– *Хто з імі побач стаяў?*

– Все: і маці, і бацько, і хросные, обсыпалі жытом, шоб быць богатымі, і жэніха. У меня сын жэнілся і в цэркву ездзілі венчацца. Пріехалі, прівезлі невестку, то я накрылася кожухом. С танцамі там сёстры, брацья вышлі, сталі на пороге дома і сталі корміць мёдом невестку. Наберу ложку і до рота, да і назад. Мёдом корміць обязацельно – шоб не вдова была, сладко жыць. Потом чаркі выносілі, обсыпалі молодых жытом, і в хату. Повелі с іконамі в хату, посадзілі на покуце, накрывалі стулья кажухом, шоб багатымі былі. Потым трэба, каб свякруха сняла вянка у нявесткі. Перепоі. Убірае хросны тарелку, накрывае полоценцем, і он ходзіт і налівают у две чарачкі, становляць на ту ж тарелку. Налівают і говорят, каб перапівалі. Коровай дзелят. На тарелочку кусочек коровая і две чаркі. Вызвал мяне бацька: "Перапіваю вам шчасця, долю, упіваю чарачку. Уручаю падарачак і беру каравая кусочек".

– *Каравай бралі хустачкай?*

– Да. А потом свякруха снімае с невесты вяночка і надзяе на яе хустку. Она ўжэ не дзевка, будзе молодзіца – снімаю молодзечы, а надзеваю жаночы.

– *Колькі дзён працягвалася вяселле?*

– Два дні. Ешчэ на треці дзень пріходзят.

## Другі дзень вяселля

– *Што на другі дзень рабілі?*

– На второй дзень молода встала, мамке его помогала, воды пріносіла.

– *У вас пераапраналіся на другі дзень вяселля? Хадзілі драць курэй?*

– То ў нас такее не. Это на Палесьі. Я ходзіла замуж туды. Да ўжэ ж дзень гулялі. А далей на другі дзень попередзеваліса, пошлі да накралі курэй.

– *А тут, у Азеранах?*

– Не. В Озеранах нема.

– *Так, а што вы рабілі на другі дзень?*

– Вупівалі, да спевалі, да гулялі. А я ішла ў Сіманічы замуж. Наварылі боршчу, да з грыбамі, там жэ ж Полесье, там жэ ж грыбы. Вжэ на другі дзень пошлі поперэдзеваліса, пошлі ж тых курэй накралі у суседаў, ну, ўсе село мо обходзілі, я не знаю. Прінеслі тых курей, і зубамі іх рве тае пер'е.

– *Жывое?*

– Ну, покруцілі мо тых курей, чорта іх знае. Шуткі такіе ў іх. Там цэлую недзелю оны гуляют.

– *Ці вялі маладых у першую ноч у клець?*

– Клець была возле хаты.

– *Як яна выглядала?*

– Клець – это такой домік отдзельный, там і кроваць была, молодые там отдзельно і зімой спалі. Ставялі дзежку, як она на яе ступіць і перайдзе, значыт, она чэсна, дзевственніца, еслі обойдзе дзежку, значыт, не дзевка. Калі переспят ноч, то ўжэ свекруха гледзела посцель.

## Русалка

– *Ці пужалі вас бацькі русалкай? Што пры гэтым гаварылі?*

– Возле ракі самое жывем і маці не пускала. Мы малы. Маці ж на работу ідзе, шоб мы в реку не шлі: "Там, доченько, така сядзіць жэншчіна, така кудлата, выйдзе, ухопіць, а я буду пераживаць і плакаць". Русалка была злая.

– *Ці бачылі яе?*

– Не, нічога не бачыла.

– *А ў вас русалка маладога ці сталага ўзросту была?*

– Маці казала, что жэншчіна.

– *А прыгожая ці страшная?*

– Она не казала. Казала, што ўхопіць.

## Ведзьма

– *Ці былі павер'і пра ведзьм?*

– О, ведзьмы былі. Пересыпаюць маком дорогу, дзе ходзяць коровы. І ўсе каровы пройдуць, а хто ведзьма-хозяйка, у той карова понюхае і будзет прыгаць, перепрыгвае етот мак. Значіт, та хозяйка – ведзьма. Як не ведзьма-хозяйка, так та корова як ідзе, так і пошла, а вжэ як что-то знае, та корова понюхае і прыгае.

## Дамавы

– *А дамавічкі былі?*

– Няма, е яка казка, што е дамавы, а дзе ён, мы не знаем.

– *Малады ён ці старэнькі?*

– Мы яго не бачылі.

– *А як даведацца, што гэта менавіта ён?*

– Мой сын ожэнілся і далі ему кварціру. І ў іх у тым доміку был дамавы. На том месце, дзе зараз гэты дом, на фронце шмат салдат забіла. І временамі то свет потухне, то лампочку побье, то целевізор включіт. І невестка вельмі боялася. Мы попов приводзілі і молітву чіталі, і свяцілі хату. І она іногда, дажэ средзі ночі прібегала к нам, так боялась.

– *Што можна зрабіць, каб дамавы стаў лепш адносіцца да вас?*

– На столе обезацельно, чтоб еда была на ноч.

## Аброчныя крыжы

– *Ці ставілі прыдарожныя крыжы?*

– Стоялі на перекрёстку кресты, на ніх вешалі рушнікі, фартух, і хусточкі, і кресцікі. Обряд такой был, как оберег.

## Выклікание дажджу

– *Што рабілі, калі дождж доўга не ішоў?*

– Сыпалі в колодзец мак свечаный.

– *У колькі калодзежаў?*

– В каждый колодзец на хуторе. От сколько е колодцев у нас, у каждый сыпалі мак. Свеченый мак.

– *Ці забівалі вужа?*

– Убіла ужа, вешала на галінку, і шол дождзь. Шо то такое трошкі было.

– *А чаму менавіта вужа?*

– Не знаю.

## Назва вёскі

– *Ваша вёска называецца Азяраны. Чаму такая назва?*

– Много озёр. Озеро там, озеро там.

– *А як называюцца?*

– Белое озеро.

– *А чаму яно белае?*

– Там вода бела і цветы густые тые растут белые. Раньшэ посредзі дзеревні было озеро. Да, два озеры.

– *І дзе яны зараз?*

– Е і зараз.

– *Якія назвы яны маюць?*

– Большэ названій нет.

## Чоўны

– *Як у човен ўвайсці, каб не перавярнуцца?*

– Осторожно. Нос, падаеш коленямі, переступаеш, і там сідзенія. Нос передній і нос задній, і дошчачкі. Спередзі гребе чоўн, а тут сідзеніе і можно посадзіць дзевку, жэну, кого хочеш. На сухом одзін піхне і сам влазіт.

– *Як у лодку?*

– Как лодку.

– *А вы ездзілі?*

– Я ездзіла. Я свойго человека посадзіла, а он упал у реку. В човне одно весло.

*Запісана ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н., Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н., Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., ураджэнак в. Азяраны*

## Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Пераpoў

### Каляды

– *Як праходзілі калядныя святы ў вашай вёсцы?*

– Ходзілі молодзейшые за нас. З вечора ў восем. Молодзёж хадзіла і дзеці. Цыганямі, да-да. То 6-го. Як прыходзілі:

"Пане-господаре, позвольце праспяваць!"

На 14-е тожэ хадзілі. З 13-го на 14-го. Молодзёж да дзеці ходзілі. Шчэдрэц. Ну так і коза ходзіла, і цыгане.

Куццю варыма. Гэта з 13 на 14, а з 6 на 7, шостага не, а 7-га ходзяць па хатах і спяваюць. Наражаюцца, коза, да. У меня дажэ рогі вісяць з казы. Абматвалі бліскучай бумагаю. Мужчына наражаецца казой. Наражаюцца на 13, 14 – гэта Шчодры, а 7 толькі ходзяць песні спяваюць пад акном. Мужчыны хусткі надзяюць, юбкі, каб не пазналі, і цыганкамі. З 6 на 7-е каза не ходзіць. На Раждзество ходзяць маладыя і старыя, толькі спяваюць, а так не наражаюцца.

Са славамі: "Пане-гаспадаре, дазвольце спяваць!" Потым оні ідуць на крыльцо з-пад акна, і гаспадар выносіць, хто што мае: сало, грошы, но большынство выносяць грошы. Раньшэ было: пампушкі, сала дасць, калбасы. Стары Новы Год называўся Шчэдрэц. Вечарам 13 хадзілі. Варылі куцью. Берём накрываем стол і ставім эту куцью. Падходзім к акну, не етыя, а дзе сонца. Падходзіш, стучыш і гаварыш: "Мароз-мароз, хадзі куцью есці!" (3 разы). Даўжно быць 12 страў, да 13-ці, 13-я – куцья. Ну, і сядаеш вячэраць. Свечку запаліш, "Отчэ наш" перамовіш і молісся. Ну, і ў дзвер стукаюць, зайдуць у хату. Знаем, што будуць ідці, уключаем свет у надвор'і, у калідоры ўключаем свет, штоб коза не заблудзілася. І прыходзяць, спяваюць.

Ну, і прыглашаем за стол. Некаторыя сядаюць, а некаторыя гаворац: "Дайце нам з сабой". Віна даём ці гарэлкі, закуску, грошы.

На Новы год дзеўкі гадалі. Дзеўкі куплялі сабе новыя чулкі, колісь не было штаноў етых, надзевалі чулка на левую нагу, другога чулка лажылі пад галаву. Гэта я рабіла тожэ колісь. Лажысся спаць і кажаш: "Дай, Божа, знаць, з кім у пары стаць". І вот мне прысніўся сон.

Кажуць, на Шчадрец хто первы прыдзе ў хату, еслі жэншчына – не к благапалучыю. Но еслі прыйдзе мужчына ў хату на Шчадрэц, утром яшчэ, то гэта ўдачны будзе год і безбалезненны. І гэта праўда. У прошлом ці позапрошлом году ко мне первай прыйшла жэншчына, і я ўвесь год страдала.

Ну, і тожа, кажуць, не даюць нічога з хаты. Ну, вот вы прыйшлі ка мне: "Дай мне там, Рыгораўна, рубля чатыры на буханку хлеба!" Колісь свет не дасць. Нікогда ў жызні ніхто не дасць. А цяпер мы не разбяраемся. А цяпер есць. Ну, кажуць няможно даваць у гадавой празнік. А так даюць.

Цыганямі не наражаліся, фартукі адзявалі белы.

## Грамніцы

– *Што рабілі на Грамніцы?*

– Ні робяць нічога на Грамніцы пятнаццатого, у цэркву ездзім у Хваенск. Робім крэсны ход. Свецяць етыя свячы. От і бацюшка кажа: “Надо запаліць на празнікі”. І от гром грыміць, надо запаліць. Прывезлі грамнічныя свечы, паставіла. Як гроза – і іх запальваю.

## Соракі

– *Як сустракалі Соракі?*

– Пеклі сорак птушак. Сорок з цеста расчыняем курочкі, як мы кажам.

Палкі перакідывалі чэраз хату на Соракі. Сама лічна перакідывала. Колісь жа мы, не было гэтага хмызняка, пазарастала ўсё. Колісь выйдзеш з хаты – Хваенск відно было.

Мы маладыя былі, ў сена хадзілі. Надо было найці 40 яец. Находзіла. Дамоў бралі, яішніцу дзелалі.

Сорак святых называецца. По народнаму – Сорокі.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

## Вялікдзень

– *Што было ў Вялікдзень?*

– Я вам раскажу. У нас по дзерэўне ідуць хросные, хрышчэннікі ідуць к хроснай мацерь з валочобніком. Обменьваюцца яічкамі, пірагом. Это з году ў год е. Дае маці пірага, яйца, і я іду к хроснай маці. Я вот несла 5 яічак і пірога, а она ложыць сем. На два яічка большэ ложыць. Ну, і ўгашчэнне робіць, подарочка даст.

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

## Юр’е

Мы хадзілі на Юр’е, ето 6-го мая. Ходзілі кругом дзерэўні, ікону нясуць. Ходзім, усё сяло. Вадзілі карагод на Юр’е. Ідом кругом поля.

Крэсцікі пяклі такія. Потом выгоняем корову. Поўнае вядро вады, ложам яйцо, штоб не ўцякала. І штоб корова перайшла праз гэта. Да, пераходзіла. Такіе слова гаварылі:

Господзі, спосі мою худобінку!
На Юр’еў хросы,
На Мікольеў заводзь,
Дзе росу выпівае,

Дзе траву даядае.
Скаціночка моя
Днём под солнышком,
Ноччу под месяцэм,
Под вечэрнімі зорамі.
Усімі всемі Бож'імі словамі
От гада лютого,
От звера бягучого,
От человека лукавого
І от д'явола проклятого.

Это Юр'еў дзень, корову выгонялі на хроснай нядзелі, пяклі цеста. А хросная нядзеля – гэта перад Паскай. І маці вынімае цесто, робіць крэсціка і ложыць аддзельна на сковородку. А ў Юр'е выгоняюць худобіну і даюць гэты крэст. І свячоной водой акрапляюць корову. І кажаш: "Ідзі траўку шчыпаць з рагою, а дамоў прыходзі з…" Як там, з малаком, як там у рыфму не ўкладваецца. Только ложылі тапора, дзе там дзвер начынаецца. Ведро вады стаўляюць. Яйцо ложуць.

"Выгоняю цябе, худобіну, на пашчу,
Спасі цябе Бог! І штоб вярнулася здаровая додому".

І ўсё. Маці так гаварыла.

## Троіца

– *Якія звычаі, рытуалы звязаны з Троіцай?*

– Троіца дзень не меняе, а чысло меняе. Клён рубалі, на вокна вешалі, на дзверы там, по дворах. Троіца – это наш прыстольны празнік. Хадзілі, утыркалі ў могілкі каля крыста, там каля памятніка ўтыкалі.

На Троіцу ідом на кладбішчэ, ламаем клён і ставліем там умершым. А дома первым образом на ікону галінкі ложыш клёна і па ўсім угалкам. У сарай затыкаеш на дзвяры. Проста кала крыста за аградай утыкаем. Гэта с продкаў у нас. У нашай дзярэўні на Троіцу прыстольны празнік. Сабіраецца ўся радня. Гуляем тры дні.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

## Купалле

– *Якія ўспаміны звязаны ў вас з Купаллем?*

– З седзьмога, да сонца, на Купалу сабіралі травы. Лечэбныя травы: зверабой, васілёк галубой, рамашку збіралі на полі, маць-і-мачыху. І затыкалі на чардаку ці то ў сараі, штоб яны высыхалі. І ўжо знімалі, запарвалі і пілі. І ліпу рвалі. Эта на Купалле.

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

**Жніво**

*– Што можаце сказаць пра жнівеньскія святы?*

– Зажыналі, ну, зажалі там, зрабілі крэста. Кожны перахрысціцца. А потом, як дожынкі, дожынкі ўжэ робілі венка. Несом к колхозу ў контору. Перавязывалі красным.

Зажыналі жыто, первого снопа. Ну, начынаем жаць, кагда расы няма. Пазаўтракаюць жанчыны і ідуць у поле. І вот да первого снопа прыходзіць прэседацель колхоза, як дажынкі.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

**Памінальны дзень**

*– Як паміналі нябожчыкаў?*

– Памінальная была пятніца перад Дзмітрыем. Палілі свечку, накрываем стол вечарам. Ставім блюдзечка, ложку, вілку. Што ясі, на стол нагатовіў, усё панямножку. Перамалюсь “Отче наш” і гавару: “Родственнікі-покойнікі, прыходзьце на ужін”. І ўсё. І поужіналі, рано встaлі, пазавтракалі. Таксама ў тарэлачку дабаўляем і выносім на вішню. Выкідываем угору. Да пцічкі паядзяць. У кого ўтопленікі, насілі на ваду. Но жэлацельно не до пары. Сем, пяць (кол-во блюд).

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

**Вяселле**
**Сватанне**

*– Як вас сваталі?*

– Прыходзяць сваты, сядаюць. Хросны яго бацька, маці, свякруха там. Прыходзілі: “Добры дзень! Добры вечар! Добра здароўя! А мы ішлі і чулі, што ў вас прадаецца цёлачка. Можы, можна ў вас купіць?” Сасваталі.

Прыходзілі сватаць мяне бацька яго, жаніха, брат, хросная маці і цётка. Прыйшлі: “Мы чулі, што вы прадаеце цяліцу”. А маці кажа: “У мяне цяліца яшчэ маладая, выпусток”. Ну і што, прыйшлі з хлебам, гарэлку прынеслі. Пазвала я сваю хросную маці, цётку, бацькаву сястру. Селі, засваталі. І вяселле через 2 недзелі было.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

## Запоіны

*– Што было далей?*

– Гэта ж тое ж самое запоіны. Даруць падаркі на запоінах, абвязвала рушнікамі палатнянымі з зубамі. А хросная мацер яго на плацье дала штапель, да і того не было. Это ў нас сваты прыходзяць, а замовіны… Это одно самое.

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

## Першы дзень вяселля

У нядзелю началі. У 10 часоў прыйшлі яны к нам, потом забралі туды, павялі мяне к жаніху. Коровая пякла хросная маці.

Коровая наражалі, ставілі з вішні галінку красівую, штоб яна была кучаравенька. У гэту галінку рабілі кветкі, кветкі з бумагі, самі, дружкі. Чытаюць “Отчэ наш”, молюцца і сажаюць на лапаці коровая того.

І абменьвалі туды з маем короваем. А он з своім короваем прыходзіў. Перш дзеліць коровая яго родня, потом тая родня. І абсыпалі мяне хмелем і жытам. Стаялі радам і ўверх пасыпалі. Хросная маці сыпала.

Водзілі вокруг стала. Да, 3 раза. Кожух вывернулі, да посадзілі.

*– Як каравай дзялілі?*

– Коровай дзялілі:

–Еду-еду, ні дорогі, ні следу,<br>
Дзе тут нашо молодого.<br>
Ёсць там бацька, маці,<br>
Трэба коровай забраці.

Хросны бацька бярэ рушніка, закрывае полоценцем тарэлку. І етого, ложаць туды копейкі под ніз, на тарэлочку. Нашых молодых есцеко бацько і маці – подходзяць коровая дзецям роздаці. Бацько прыходзіць, отрэзалі, наліваюць румочку. Хто сколько можэ, выпье. Ну, шо мне маці перапіла? Чыгунчыка, дзве ложкі, дзве вілкі і кострульку, всё.

*– Трэці дзень вяселля самы цікавы?*

– Ніякага трэцяга дня нема. На другі дзень пошлі – перазовы. Тая беседа сюды прышла, тая – сюды. Там пірогі, там тые нешчасные пампушкі.

Свякруха прыглядовала, глядзела на пасцель.

Свадзьбу адгулялі, і ўжо чэраз нядзелю ідуць у госці к дзеўцы.

## Вясельныя пажаданні

Дарылі, ў каго што ёсць – каровы, авечкі, козы.

Дару вам каробачку медзі, каб дзеці былі, як мядзведзі!

Перапіваю рошчу, каб зяць цэловал цёшчу.

Пожеланія молодому:

Перадзевай серого зайца,

Шоб стаялі добра яйца.
А молодой говорылі:
Перапіваем шчасце, долю, век долгі.
Куру-квактуху, шоб невестка поцэловала свякруху.
Эток гаворылі. Потом:
А зяць перапівае палена,
Шоб зяць поцэловаў цёшчу ў колено.
Дзежку жыта, шоб молода была нябіта.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

## Хрэсьбіны. Бабіна каша

Вару кашу ў гаршчочку, кідаю туды пшана, намочу, змою. Звару тую кашу. Бяру грошы з сабою, малому бяру падарка ці малой, а як хлопчык, то мужчынскае бярэш. Заходзіш, ужэ начынаецца. На стулья селі, спяваюць, сідзяць. А потом начынаюць кашу біць. Первым б’е кум кашу, а кала кума стаіць касір і кажа: “Бабіна каша столькі стоіць, кладзі грошы. Бабіна каша большэ стоіць”. Ну, і кум дабаўляе. Ну, кум палажыў, па закону трэба, штоб пабіў кашу. Ну, ужо баба ложыць, кума ложыць. Кум вымае грошы і кажа: “А баціначкі сколькі стояць?” І зноў траячку дабаўляе. Ну, надо, штоб кум пабіў кашу, баба ўсё роўно не паб’е. І яшчэ на кашу хто шчо пакладуць. Да чуць бокам павярнуць і стук об край стала.

Мяне бралі ў каляску, вязлі і: “О, то баба кашу нам прывезла!” Да я бутылку дала ім за то, што пракаталі мяне па вуліцы.

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

## Выкліканне дажджу

*– Калі дажду не было, што рабілі?*

– Адна прадзе, адна снуе, адна тчэ. І, это, такі рушнік, за дзень мы это его. За эты рушнік, ікону, і кругом поля ідом адзін раз па сонцу. У нас крэст, навек он тут стоіць, і на эты ўжэ крэст этаго рушнічка вешаем. А Бог знае, ці так Бог нам даваў, ці ў Бога попросілі – пашоў за ноч дождждык.

Ужа забівалі. Невялікі, но дождж шоў. Граблямі забіла вужа, да граблі паламала. На любую галінку, на кусціка вешалі.

Ходзілі у дзевяць калодзезеў, бралі з усходу сонца і кідалі свячоны мак. Прасілі Бога, штоб даў дажджа. Ткалі наметкі і на краста вешалі. За дзень нада была. Ішоў дождж. Вужа ўбівалі, вешалі на любы куст, штоб пайшоў дождж.

## Забабоны

*– Якія ведаеце забабоны?*

– Жэншчына бярэменная ў празнічок не дзелае ўжо нічога.

Бярэменнай, кажуць, няможно стаяць на парозе. Я вот прышла бярэменная, я доўжна перайсці ў хату, пераступіць парог, штоб не стаяць на парозе доўга. Кажуць, як будзе рожаць, штоб дзіця доўго, а так будзе зразу ідці.

У мяне, гаварылі, хата ў іх гарэла, а маці іх: “Ой!” Узялася за шчаку. Так у сына шчака ўся была красна-сіняя. В самом дзеле.

Запісана ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў.

## Паходжанне назвы вёскі Перароў

*– Чаму ваша вёска такую назву атрымала?*

– Гэта я магу сказаць. Гэта расказывала пакойная маці. У нас за ракою быў шлях, цяпер няма дарогі, шчас у Жыткавічы аўтобус ходзіць. І прыехаў, дапусцім, брат к брату ў госці на Акцябрскую, у нас тожэ прэстольны празнік, і цэрковь Дзмітрыеўская ў нас у Перарове. Тут пераехаў і яго ж устрэціць, а он стоіць па той бок рова. Так расказывала мая пакойная маці. Да кажа, гукае: “Брат, перавязі мяне”. А лодка ж то на рацэ, а трэба ж у гэты роў увайці, кілометр мо ці менш ці больш, я не знаю. Той крычыць: “Добірайся, як можы”. А той крычыць: “Я не могу, роў”. А роў, летам вада халодная, глыбокі. Ну, і так адзін крычаў “роў”, а другі “Перароў”. Так і застолося, о такая легенда.

Там Урочышчэ радам е – то колісь дзяды нашы, прадзеды ставілі вулья колодочные. Вяроўкамі сцягвалі вулей. Хмель сыпалі.

## Ведзьма

*– Якія былі вядзьмарскія павер’і?*

– І гэта было. У сарай замыкалі на Купалінаго Івана, штоб ведзьма не ўлезла. Ну, выгналі тавар, кароў. Очарадзь ідзе па шляху. Той тавар як узбунтаваўся. І што такіе, што такіе? Там бачылі, крэст стоіць у дзірэўне? Од того крэста до цэнтра ніток с кацюшкі, чорныя кацюшкі. І так шлях перакрылі, і так шлях перакрылі. І ўсе як узбучыліся людзі: “Уб’ём ведзьму! Захацела малака чужого!” А не знаюць жа хто, толькі дагадкамі. Да пашла Зіначка пакойная, да ніткі гэтыя парвала і дамоў забрала. А для чаго, што?

## Дамавы

*– Ці водзяцца ў каго-небудзь дамавыя?*

– У мяне дамавы. Сяджу, плету наскі. І сяджу там коло стала. Із сарая прыбяжыць да мяне малае, белае. У кожнай хаце яно ёсць, но я яго не бачу.

Он не злой, он хорошы. Он просто жывёць. Раз у кожнай хаце пахороннік, значыць, ёсць і домовой. Он зашчышчае от плохіх глаз, но я не ошчушчаю. Вот он мне прэсніцца добры, апавешчае мне. Прыдзе з своей хозяйкой первой.

## Загадкі

*– Якія загадкі памятаеце?*

– Стаіць гай, дзеўка дай. Дзеўка дала, ногу падняла. – Проківа (крапіва). Раньшэ ж ходзілі босіком, выходзілі на росу, штоб ногі былі здаровыя.

Віса вісіць, хода ходзіць. Віса ўпала, хода з'ела. – Кабанчік і жолуд.

Стоіць корова, дзірка готова. Прышоў бук, у дзірку стук. – Калодзец.

## Замовы

*– Як наконт замоў?*

– Я золотніка одного говорыць умею. Вот як забаліць жывот і панос робіцца. Я сабе лягу, сабе пашапчу. Перамолюсь "Отчэ наш", так і начынаю:

Первым разком,
Лепшым часком.
Господу Богу помолюса,
Прачыстай Божай Мацеры поклонюса.
Прачыстая Бож'я Мацер, поможы,
Прыступі золотніка поможы.
Золотніцэ-золотніцэ,
Пуповэ чоловечэ (пуп жэ),
Не ломай ты белыя касці,
Не разгоняй чырвоныя крыві,
Не ломай ты сінія жылы.
Под грудзі не подпірай,
Чэлюсці не закрывай.
Стань на свае месцечко
На залатом касцечку.
Там табе і печэнне, і ядзенне.
Подтрусіш, на спіну ляжаш, умнеш трохі. (І так дзевяць раз.)

## Русалка

*– Ці пужалі вас бацькі русалкай і іншымі істотамі?*

– Нас пужалі: "Не ідзіце ў жыто!" А там васількі етыя. "Дзеці, не ідзіце ў жыто! Там русалка сядзіць, цыцка каменная – дасць, і вы памраце! Маладыя".

## Пужайло

Я знаю, што крэста вымалі, а крэст у землю пайшоў, не нашлі. Ой, як мне прырубіла, ходзяць, шукаюць бабоў, разгадваюць. Моя мама расказвала, што обязацельно кало цэркві пужало. У нас такая традыцыя была – ў васкрэсенье ўсе к параходу. Там ужо гульні, танцы, песні. От, она кажа, дом, баранчык скача. Поскокаў-поскокаў і дзе дзеўся? Няма! Казала мама: “Пужайло было, пужайло”.

Запісана ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў, Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы.

## Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Перароўскі Млынок

### Каляды

*– Што памятаеце пра калядныя святы?*

– Каляды ходзілі, гулялі. Як сцямнее, часоў у шэсць, сем. І старшыя ходзілі, і ўсе ходзілі. Хто хоча погуляць, повесяліцца, то пойдзе, пошукае:

Добры вечар, пане-гаспадар,

Позвольце песню проспяваць!

Ці так коляду даць.

Хто согласен, то молодые, дзеткі на дворы спеваем, хто хочуць – у хату позовуць. Да спяваюць у хаці. Да даём, хто што мае.

А як жа! Маскі робілі. Назбіраюць у старых бабок юбкі якія, кожуха надзеюць, закрываюць ліцо, штоб не позновалі. Вырэзваюць, хто якія можа: хто мядзведзя, хто якую лясу, а хто выражэ якое марлі, да памажа вочы тутако сажаю.

Коза просіла: "Дайце, хозяін, сала, штоб коза ўстала!"

Это на Рождзество, а коза ето 14-го ўжэ, на Шчэдрэц.

Куццю дзелалі. На Стары Новы год гэтак было ўсегда, штоб было 12 страў на стале. Выдумляеш усякія блюда, штоб на стале былі: кісель, каша, куцця гэта, борщч, бліны. Усё гэта наварвалі і ставілі на стол, на подностульніцу. І ў подностульніцу цягаем мы сено.

Опрэдзелялі, як у саду большая навісь от снега, то будзе хорошы ўроджай.

Як я была ўжо ўзрослай, так, кажуць, трэба бегці, набраць не шчытая дроў, положыць под печку, да перашчытваць. Як дроў, што ты прынясла, ўсім пара е, то будзе табе пара. А яко непарны, значыць, без пары будзеш. От такіе прыдумлялі.

Вечэром хату выметалі і тае смецце собіралі. Нясеш на вуліцу і слухаеш, у якой стороне собакі брэшуць. Знай, адтуль твой суджаны прыйдзе. От такіе выдумкі былі, як я была ўзрослай.

У дзецтве ходзілі Коляду под окно і прасілі дазволу паспяваць.

### Грамніцы

*– Што трэба было рабіць на Грамніцы?*

– Запаліць свечку (грамнічную) як то грыміць. Ваканіцы закрывалі, штоб не ўбег у хату гром.

### Соракі

*– Ці пяклі на Соракі птушачак? Што яшчэ рабілі ў гэты дзень?*

– Пяклі, пяклі птушачкі. Пяклі сорок пцічак на Сорокі. Дак нельга спаць, надо рано ўстаць, да до сонца нада сорок палок череexcept хату перакінуць. Елі еты пцічкі. Для закона, як мы кажам, для закона етыя пцічкі.

## Гуканне вясны

*– Як гукалі вясну?*

– Это было: ужэ яйка бяруць етае, собіраюцца дзеткі на копы. Дзеткі собіраліся, да гуртом спяваюць, стараюцца. Лезуць на той копьяк, на той стожок горкою лезуць. Той лезе, той ужо каціцца, падае на дол. І крычаць песні.

*– Яйкі з сабой бралі?*

– Да, это ўжэ яечко звараць. А ето яечко з'ядалі дзеці. Хто на стоге, той копе строшчыць, а хто бурляе, хто куды. Хто богаты, то бурляе, а ў кого няма, той стараецца ухопіць тэе яйцэ. Хопіць да з'есці.

*– А што азначае "бурляе"?*

– Это "кідае" по-дзерэвенскі.

*– А калі гукалі вясну?*

– Ето только вясною на первы дзень Велікодня.

## Вялікдзень

Волочобныя ходзілі. Обычно посылаюць младчого ў сям'і. Ужэ даюць узялок, пірожок, яічка там, што е. Да ідзеш к хроснай маці ці к хроснаму бацьку. Там цябе ўжо почастуюць і обратно дадуць гасцінец зноў.

А я вот у другого дня Паскі сама ходзіла до кума. Пірожок узяла, яічок, калбаскі, пляшачку віна і ходзіла к куму. Куму ўжо тожэ гадоў пад дзевяносто. На другі дзень Вялікодня, у понедзельнік ходзілі.

## Страла

*– Ці спявалі вясной песню са словамі "пушчу стрэлу"?*

– Это весной. Гром жэ грыміць по весне. "Стрела" – это свечка.

*– А чаму яе па сялу пускаюць?*

– Як она будзе лецеці – будзе гром грымець. Шоб гром не грымеў. От што.

## Юр'е

*– Што ў вас рабілі на Юр'е?*

– Воду корове давалі, сено давалі, шоб она поіла первое, як упускаеш ее на двор. Як я ўжэ была хозяйкою – іду ў сарай, откріваю ворота, ложу цэпочок, еечко. І шоб она, як ідзе, да не рострошчыць ее, шо переступіць. Это ўжэ жэлаем, шоб она ў цэлносці прыходзіла навек, неповрэждзёная. Шоб перешла, шоб як цэпочок – однэ за однэ цянецца, так шоб короўка цянуласа ў свой сарай, хлевец еты.

*– Ці давалі карове з'есці печаны хрэсцік?*

– Гэта пеклі і корове давалі. На Крэшчэнье пеклі крешчыка. Короўку ўгонялі, ў торбачку бралі с собой хлеб і эты крешчык с собою, которы лежаў ужэ засохшы. І прынесеш того крешчыка за сад і розмочваеш, корове даеш.

## Троіца

*– Якія ўспаміны ў вас звязаны з Троіцай?*

– Тройца – это ў нас з векоў кермаш. Тры дні ўжэ гуляюць – песні, пляскі – село гудзе. А цепер отмерло ўсё.

*– Ці бралі раней на Троіцу клён?*

– І цяпер. От молодзёж, хлопчыкі едуць у лес. Хто лісапед возьме, хто сам сходзіць, прынесе, і ўжэ по суседам, бабкам нямоглым прыносяць галінку клёна. Такі закон, шоб был у дворэ, у хаце. Обычно от я затыкаю голінкі за ікону, і за іконкою он вісіць, той клён. Посохне, то тогды я его храню.

## Духаў дзень

– Пару прыбіралі да водзілі, да жэнілі. О, шо робілі. На Духа. Прыбіралі в одзежу, у якую за стол саджаюць на венец.

*– Гэта сапраўднае вяселле?*

– Не, не, так это, смешкамі ўсе ўроблялі. І танцовалі, і спевалі, веселье спевалі. Як веселье это.

*– А што было з гэтай парай потым?*

– Прайшло этае, да разышлісь. Погулялі, поседзелі, повішчалі, попішчалі, да хто куды пошлі, да і ўсё. Пошуцілі, да і ўсё.

## Жніво

*– Ці памятаеце жніво?*

– Я толькі знаю, як я зажынала. Остоўляла несколько колоскоў на полі, да і завязывала красной трапочкою.

## Жаніцьба коміна

*– Ці была раней у вашай вёсцы "жаніцьба коміна"?*

– Жанілі коміна: обматывалі хмелем і гарбузнікамі кругом обсыпалі. Коміна обматывалі.

*– А што такое комін?*

– У печы, от, як палім у печы – комін, кудой дым проходзіт кверху. Посвет – свеціць комін эты. Лучыну кладом, там такая плецёнка, такі кошык сплецены, і там горыць огонь, на том посвеце горыць огонь. Посеред хаты, як у кого. Прокручвалі трубочку, шоб усім садзіцца ж прасці было место. О такую жэсцяную трубу туды ў столю ўвакручвалі, а тут унізу таке шыроке, от бы, як мы говорым, спадніцы-плесероўкі раздуваюцца, танцуюць дзеўкі

колісь, таке круглэ. А потым ужэ кругом вісела так на двох драцінках такая плецена сетка, як кошык сплецены. Клалі лучынку і палілі, і відно было. Одна вродзе згорыць, другую кладом. Відно – пралі і ткалі кросна.

*– Калі гэта рабілі?*

– Як начынаецца осень, як начынае цямнець, так і палім. У сенцябрэ, як цямнела. Первый раз, як запальваеш на посвеці, зарэ становляцца кругом, беруць зернета, да обсыпаюць. Цветамі ўкрашалі і семечкамі абсыпалі, і ўсё. Кажнэ ў сваёй хаце, сваей сям'ёй. Як почэпіць этого ж коміна, так это й робяць – обсыпаюць семечкамі і хмелем надо ж обкруціць.

Весной ужэ скідаюць посвета.

## Вяселле

### Сватанне

*– Як праходзіла сватанне?*

– Прыйшоў 25 кілометраў з другой дзярэўні. Прыйшоў хлопец з арміі ў нашу дзярэўню адтуль гуляць. Он прыехаў са своімі родственнікамі: мама, брат родны, хросны, хросная прыехалі вечаром. І я з ім пойшла, своіх родственнікаў бліжніх позвала і собраліся за столамі.

"Добры вечар, добрага здароўя! Мы чулі, што ў вас е цёлочка на продажу." Ну, а бацькі отвечаюць: "Е. Як согласныя, купляйце!" У нас былі запоіны етыя на Покрову, а потом Піліпаўка была. Ну, прыехалі, попілі гарэлку яны і паехалі домоў. Ужо после Крышчэння было свадзьба. У цэркву мы не ездзілі, з хаты ў хату толькі. Нікога нішто, прыехалі ў хату, ды за стол. Бацько з хлебам обходзіў машыну мой, перад адпраўкою мяне к жаніху, тры разы.

### Першы дзень вяселля

А я того помню, мене бабка-суседка навучыла: "Ты возьмі еечко, шоб у цебе було". А як жо сохраніць его, тэе еечко? Не знаю, дзе его дзержала, пока застоллі була. "Як заедзеш, ідцімеш ў хату, як токо порог переступіш, то шоб ты тэе еечко вупусціла у хату". Сырое, цэлое, да. Пусці ў хату еечко, шоб цэленьке було. Пока не перелезла порог, попусці еечко шоб.

Коровай хросная обычно росчыняла, пекла.

Дзелалі вянкі на свадзьбу. На том жа вянку прывязана фата з марлі. Як завязуць нявесту свякрухе, да сядзіць яна за сталом. Да свякруха прыходзіць або хросная маці, знімае фату, як свякруха-ўдова, знімае вянка, адзявае. Пока ешчо із-за стала не вылезлі, пока за столом, знімаюць.

### Вясельныя пажаданні

Дару курочку-квахтуху, штоб нявестка поцеловала свякруху.

Такія прымаўкі:

І даем венок цыбулі, штобы жонка мужыку ніколі не давала дулі.

Дарую ту цяліцу, которая скача з печы на поліцу. А вы спаймайце, да пользу майце.

## Другі дзень вяселля

На другі дзень, а мо і на трэці, прыдумлялі так. Наражаліся хто ў кого. Рабілі молодую, молодого. Молодого з молодою платком звяжуць, штоб ня кідаў.

## Хрэсьбіны

*– Як адбывалася знакамітая “бабіна каша”?*

– Розбіць горшка, заплаціць за горшка. І кашу покрышыць – усе бярыце. От, ставляць кашу, кладзе кума дзеньгі, кладзе кум. Правяраюць, у кого больш. Кума менш положыла, кум больш. Абратно зноў дабаўляе кума, і кум тожэ дабаўляе. А кум жа ні хоча, штоб ён быў ніжэ кумы. Кум стараецца положыць больш, кума ўжо не ў сілах больш ложыць. Тады кум бярэ яго, розбівае горшка, і на тарэлачкі гэтую кашу ставяць. У тарэлках разложаць по кусах, і ложкамі.

## Забабоны
## Цяжарнасць

*– Ці верыце ў забабоны?*

– І як я вышла замуж, токо ўвайшла ў палажэнні. І мне хто сустракаецца, ўсе смяецца: “Марыя, ты ўжо ў палажэніі”. Так, а я і не знаю. Пятна сходу робяцца, пятна. У мяне е дочка ў Маскве, і ей перадалося ад мяне. Аднажды іду чэраз лес, ужо замужняя была. Сустракаю жэншчыну з нашай дзярэўні. “Куда ты ідзеш?” Кажу: “У Перароў”. “А чыя ты?” А я кажу: “А я не знаю, хто вы”. А яна атвячае: “А я знаю, чыя ты. Ты Паўла Халоўского”. “Як вы знаеце?” “А ты похожа на бацька, кажэ. І твой бацька ў молодосці, як маці тобой была ў положэніі, да курыў, да на мацер пускаў дым. І от у цябе смаглае, чорнае пашло”. І маім дзецям перайшло.

## Народная медыцына

*– Ці выкарыстоўвалі для лячэння клён, што рвалі на Троіцу?*

– Вродзе кажуць, помагае, як які нарыў. Да прыкладую, розмочваю тую клянову лісцінку і прыкладаю к ране, і она выцягвае, ну як сказаць, тое загнаенье, та лісцінка. Здымі, і на ёй поўно этого загнаенья – выцягвала. Прыстройвалісь ужэ людзі к нечаму.

Вот летом то рвум подарожнічок. Тожэ размочваеш, як ека рана – прыложваеш ту лісцінку.

## Назва вёскі

*– Чаму Перароўскі Млынок мае такую назву?*

– Дзярэўня так называецца – колісь е рэчка паўз самае сяло ідзе. І на ёй быў млын построен колісьці, яшчэ да вайны. Я тока знаю, што спуск быў такі, што закрывалі, а потом адкрыюць, да бягіць вада. І адтуль, з Полесья, лес плавілі. Кажуць, што на рэчкі быў млын. І гэта вода гоняла. І так як млын. І назвалі Млынок. Млын, да, мельніца.

## Выклiканне дажджу

*– Што трэба рабіць, каб пайшоў дождж?*

– Вужа ўб'ём, да не одного, а несколько шчэ. Потом вешаем на дзерава любое, на любой плот. І дождж шоў.

Сабіраліся ў одной квартыры. Сядзелі, ткалі полотно. Вечарам сабіраліся вячэраць. Я прасіла ў мамы пшона і груш на компот. І як доткалі, кажны рукой дзержыцца і кругом сяла обходзіць. Кругом села обошлі з тым полотном, што за дзень наткалі. Потом это полотно ў цэркоў. Была ў нас копліца. Адному старыку прыснілося, што трэба копліцу з дуба, што не пілой, а сякерамі. А потом як обошлі, усе людзі, хто ўчаствау у гэтым, ішлі вячэраць. Я на той вячэры была.

Маком обсявалі колодцы. Кругом, па сонцу. У кожным хозяін свого.

## Русалка

*– Ці расказвалі ў вас пра русалку, дамавога?*

– Я своіх дзецей пугала: "Ня йдзі туда!" О то за селом, як росце рож, ходзілі рваць васількі да веночкі вілі, то тожэ пужала: "Не йдзі, Олько, бо там жа русалка цябе ўхопіць". Шо русалка там ходзіць, да цебе возьме. Абычно – у мене одна с песят восьмого году е, да ў ее белые волосы, длінные былі – до пояса, то кажу, от як она нечэсаные: "От, як русалка, – кажу, – як русалка, роспусціла этыя!" Значыць, о така та русалка, а му ж та яе не бачылі. Страшная, да ўхопіць цябе. Пойдзеш туда, да цебе ўхопіць она.

## Дамавы

Дамавы ў етом году ў сяле ходзіць, да постуквае. Быў у адном вуглу, потым у другі вугол пойдзе. Яго ніхто не бачыў жэ. Кажуць, ён кого полюбіць, а кого не любіць, то ў ту хату не пойдзе.

## Вячоркі

*– Што памятаеце пра вячоркі?*

– Только одно ў памяці, ходзілі на вячоркі прасці кудзелю. Я к своему дзеду, і другая дзеўка к тому дзеду і кажа: "Дзед, пошлі туды, на кухню". Яна

ўзяла з печы сажы да обмазала того дзеда. Во было смеху. Ён не бачыў, што яна ему робіла, было цёмна. Зрабіла клоўна з дзеда.

Запісана ад Бабарыка Марыі Паўлаўны, 1931 г.н., Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., ураджэнак в. Перароўскі Млынок

## Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Хваенск

### Каляды

*– Што адбывалася на калядныя святы?*

– Хадзілі з казой, седзьмога чысла хадзілі. Дзеці хадзілі і ўселякія – і дзеці, і старыя на Новы год. “Добры вечар, пане-гаспадар! І наце вам снуп на сто куп.” Дак гэта я забылася, ці то на Новы год, на чэтырнаццатое января, ці то на Раждмаство. А на чэтырнаццатого, то гэто ўжо і з мядзведзем хадзілі. Кажуха бралі, кажуха пераварачвалі і ў гэта нараджаліся. Вот это ходзілі.

Ну, а на гэтую ідуць спяваць на Новы год, то ў вакно ці ў дзверы:

“Добры вечар, пане-гаспадары,

Дазвольце песню заспеваці!

Наце Вам снуп на сто куп.”

Носяць калос’е і даюць па колоску.

### Гуканне вясны

*– Як гукалі вясну ў Хваенску?*

– Весну гукалі, пеклі пірога, яйца варылі. Ішлі на сено і на сене там гукалі: “Гу, вясна-красна!” Называлася гуканне вясны. Усе – і маладзёж, і дзеці. У каждого своя компанія. Больше, меньше – хто як. Это гуканне вясны. Кажуць, масленніца туды яко то пераходзіць ужэ. Устрачаюцца, кажуць, вясна з зімой. Вясну гукалі, карочэ гавора, у последнюю нядзелю поста. Перад постам последнюю нядзелю.

### Соракі

*– Што трэба было рабіць на Соракі?*

– На соракі пеклі сорок бобікаў із цеста. Як мая маці, яна наробіць бобікаў 40 штук. Кругленькія, бобікі называюцца. Яшчэ на гэтыя бобікі такія крэсцікі паробяць. Іх пеклі. Потом, як выгоняюць у первы дзень карову, от іх бралі з сабою на пастбішчэ. І вот іх з сабою бралі, карове давалі. Перабрасывалі палкі, сорак палак. Сорак палак перакідаць, штоб ідці да дзікіх утак, казалі “кошкаць”. Штоб, это, яічко было. Кошкаць – эта шукаць.

### Вербніца

– Вот на вярбу свецяць вярбу, ложаць за образ і короўку выгоняюць. Бяруць вербу і вербой б’юць па заду, па галаве.

### Юр’е

Цяпер жа, дзевачкі, нічого. Калісьці хадзілі, это ж Юр’е, Боже мой. Хадзілі да спявалі, это шэстого мая. У поле ідуць – зялёны на граблях, зялёного нясуць фартуха. А па сялу ходзяць– ужэ вішнёў. А ў поле па жыту

ходзяці і спявалі. У дзярэўні это ўжэ для людзей, а то для поля. Я просто не магу вам аб’ясніць, я знаю, што зялёны – гэта для таго, што ў поле зелень. Вадзілі карагод, хадзілі кружком так. Хлопцы насілі граблі. У Борках хадзілі. На 7 апрэля, Благавешчанне, тожэ хадзілі, бралі за рукі і спявалі.

Всегда серпа ложыш, як каровы выгоняеш. Карова пераходзіць, каб нікакая ведзьма там нічого.

## Троіца

*– Ці адзначалі Троіцу?*

– На Троіцу, эт я знаю, што етыя бяруць, сразу шукаюць буркун, тою шукаюць обезацельно. Ідуць у цэркву і свецяць. Абычно клён, березу, аір. Пахучае зілле. Гэтым зіллем кідаюць по палу, у акна. За образу сабе наложаць.

## Русалка

*– Ці чулі вы што-небудзь пра русалку, ведзьму?*

– Сказалі, русалка з длінннымі косамі і ўсягда ў жыце сядзіць, з воды вылазіць і ідзе ў жыта. Ловіць дзяцей і зашчыкаціць. Кажу на дзяцей: “Не ідзіце купацца, таму што там русалка сядзіць!” Высокая такая, косы длінныя, за касамі яе невідно – ці яна старая, ці яна маладая.

## Ведзьма

– Людзі былі такія ў нас дзеравенскія. Хадзілі ў цэркву на Паску і абычно этая, которые ведзьмы, которые молоко цяглі, оны обязацельно, еслі воздвігаюць, значыць, первые выдвігаюць Ісуса Хрыста. Вот это мо ў два часы ночы ім обязацельно трэба папа ўзяць, аны хватаюцца за рызы этые. Но там іх адкідаюць, вот, а ім усё адно трэба. Ну, як пачынаюць, бацюшка кажа: “Ісус Хрыстос”. Вот это на Паску. Но это я знаю, ето з даўнего. Ім, наверно, гэтак трэба. І людзям прырабляюць, людзі сохнуць. Постоянно проціву затыкалі ў дзвер, мо на Троіцу, мо на Івану Купалу.

## Комін

*– Як праходзіла жаніцьба коміна?*

– Не было жаніцьбы коміна. Я гэтага не помню. Але дзеўкі збіраліся вокруг коміна і пралі кудзелю, вышывалі. Сабіраліся мо 20 чалавек на кудзелю эту.

Запісана ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі, Яфрэмавай Тамары Рыгораўны, 1954 г.н., ураджэнкі в. Хваенск.

## Вяселле
## Сватанне

*– Як хадзілі ў сваты?*

– У сваты прыходзіў абычно хросны бацька, жаніх. От я не знаю, свой бацька ці ходзіў, но хросны абязацельна. От, яны прыходзяць, сядзяць, туды-сюды. Потом кажуць: “Нам сказалі, што вы прадаеце цялушку. Вот мы хочам купіці”. Вот яны і згаваруюцца.

Сватацца – хросна маці, хросны бацька, жаніх і свой бацька. Захадзілі ў хату: “Добры вечар”. Прыдумаюць: “Заблудзіліся, да вот пераначаваць. Да, кажуць, што вы целушку продаеце, да мы купіць хочам”. Во такіе во слова. Ну, запоіны называлісь тагда.

## Каравай

*– Ці рабілі каравай?*

– Каравай, конешно же, дзелалі. Абычно пячэ хросная маці, каторая жыве ў пары, бо еслі разводная ці ўдава, то не пякуць каравая.

Раней я знала, як унасілі тую воду да ўлівалі. Абычно каравай пякуць і штоб ведро із груш. Ну, штоб харошы каравай быў такі, запечаны. Раньшэ і ў нявесты каравай, і ў жаніха каравай. З жаніховым караваем едзем к невесцы. Во, это обязацельно. Прывозяць гэтого каравая к этой невесцы. І тут етого бяруць хросного бацько і получаюць етого каравая.

Уся роўна, штоб гэты каравай у хлопца быў вышэй, во.

## Вясельныя пажаданні

*– Што жадалі маладым?*

– Дару кважтуху, каб маладая пацэлавала свякруху.

Двое дваенят, трое траенят і семеро под ногі. Дзянка і Тараса, і хваціць з вас.

Сколько куточков у хаце, штоб было столько дзіцяці.

Шоб былі маладые багатые, як зямля, бягучые, як вада і сільныя, як гром.

## Першы дзень вяселля

Кажух выварачывалі, садзілі маладых. Мед даюць ім. Галава ў платочку была. Раньшэ хадзілі вакруг стала, 3 разы абходзілі. Вадзілі хросным бацькам. Не знаю, ці невесты, ці жаніха.

## Другі дзень вяселля

Карочы гавара, на другі дзень прыходзіць свякруха. Здымае з нявесткі фату і завязвае хустку да кажа: “Пасадзілі пад паліцаю, радзілі маладзіцаю”.

Было 2 дня. Было і ў нас раньшэ. Было і кур лавілі, скублі да па ўсіх раскідалі. Тую куру скублі да пер'я разбрасывалі. Скублі да зварылі кур'ю ўху з яе. Мо, на другі дралі, я ўжо забылася. Перадзяваліся ў мужчыны, у штаны кукурузіну, ды так і хадзілі па хаце, дурачыліся, да. Карочы гавара, кто як уваходзяць, возьмуць маладую да вязуць дамоў, то ўходзіць родны бацька і з жытом абходзіць 3 раза і абсыпае.

## Вусны бытавы расказ

*– Ці памятаеце якія-небудзь мясцовыя казкі, цікавыя расповеды?*

– Жыў, цяпера леснікі жывуць у селе, а раньшэ леснікі жылі па лясах. Вот, его жонка была берэменна. От, ці это байка, я раскажу. У іх была наймічка. Ну, бярэменна, роджае ана семеро дзіцей, і ўсе семеро – хлопцы. Шо ж, прыедзе он, поглядзіць, што столько дзіцей, ана ложыць етыя дзеці, ну, скажэм, у кашэль, коробку такую. Нясе і ідзе ў болото топіць. Устрачае он етую бабу:

– Што ты нясеш?

– А нічого.

– Ну, покожы, што ты нясеш!

Вон туды – тыя ж дзеці. Ана расказала. Он кажа:

– Давай мне, а ты ідзі дамоў і не кажы, што са мною ўстрэцілася, штоб это было между намі. Только маўчок.

І завёз он тыя дзеці і здаў у горад у дзецкі дом. От, жывуць тыя дзеці, он іх абяспечвае, он іх, карочы гавара, штоб усе жылі. Ну, а з гэтым адным пістуночкам ужо цацкаецца. Стала 18 год етым хлопцам. Он кажа на яе:

– Знаеш шо, будзе ў нас узаўтра, вялікае будзе сабыціе, будзе многа гасцей.

А тым хлопцам купіў усім касцюмы адзінакавыя, і гэтаму купіў такога касцюма, як і тым. Ана ўжо ў етой комнаце, потом прыехалі тыя хлопцы. І сталі ўсе чыста ў рад, а гэтага паставіў пасярэдзіне. А кажа на ее:

– Ідзі поглядзі, каторы твой!

Она вышла. Як поглядзела, ды й загаласіла:

– Это ўсе мої!

А он пры ўсіх, там жа, пры гэтых хлопцах і расказвае, што так і так, маці хацела вас унічтожыць.

– Екую кару ёй зробіце?

І ўводзіць два жарабцы.

– От так, бярэце ці самі, ці, мо, прыслугі і раздзярыце.

От такая, ці это казка, ці это быль...

Запісана ад Чарнушэвіч Валянціны Васільеўны, 1941 г.н., Яфрэмавай Тамары Рыгораўны, 1954 г.н., ураджэнак в. Хваенск, Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі.

## Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Хлупін

### Каляды

– *Калі адзначалі Каляды?*

– С шэстого на седзьмое, і в ноч на седзьмое гулялі.

– *Як у вас называлі – “Каляды” або “Шчодры”?*

– Каляды. Шчодры – это на Новый год. С 7 января Каляды, а потом ужо 14 у Хлупіне прыстольны празднік быў.

– *Як хадзілі на Каляды?*

– Ходзілі старікі і дзеці. Я мало участвовала, раза трі. Собіралісь жэншчіны і ходзілі, цыганамі наряжалісь і шлі по хатам, перед Калядамі. Цыганамі наряжалісь і тогда, і тогда.

– *Прыкметы памятаеце?*

– Жэлалі счасцья, урожаю.

– *Былі прыкметы калядныя?*

– Не было. Дровы бралі тыя, кідалі – будзеш у пары.

– *Гадалі?*

– Да, гадалі. Носілі палены в хату – замуж. Еслі пару прінесла, хорошо, еслі не хватае пары, так гадалі.

### Шчодры

– У нас престольный празднік считается с 13 на 14.

– *“Шчодры” былі?*

– Да.

– *Хто збіраўся – дзеці, дарослыя?*

– Дзеці. Цемнее – і дзеці ходзілі по хатам.

– *Ці ўпрыгожваліся?*

– Наряжалісь. І козу дзелалі.

– *Вадзілі “казу”?*

– Да. Козы былі, но нашы не рабілі. В Хлупіне кажух повыворачвалі, звязвалі тыя кускі.

– *Цыганамі апраналіся?*

– Да.

– *Што гаварылі?*

– “Добры вечар, шчодры вечар…”, зерном посыпалі.

– *Дзе?*

– В хаце.

– *Пасыпалі праз плячо?*

– Ну, да.

– *Тры разы?*

– Да.

– *Якія прыкметы шчадроўскія, калядныя памятаеце?*

– У нас было такое. Куццю варылі. І на Каляды, і на Шчодры куццю ставілі посредзіне стола. Трі куцці было. От куццю варылі, ставілі, сена наложвалі на покуць в уголку. У этом сене потом ставілі куццю, накрывалі, а потом вечером ставілі на стол. На стол тожэ засцілалі сена, засцілалі скацерць, ложылі вечеру вжэ і куццю, і когда окно вжэ открывалось, открывалі окно, звалі: “Мароз, мароз, хадзі куццю куціяваць!” От такое, потом смотрелі на звёзды – еслі звёзд багата, значіт, ранній ячмень удастся. Еслі нету звезд, родзіцелі запомiналі, что ячмень ранній не ўдастся. На другу куццю смотрелі і на трецью так жэ звалі. І тожэ просілі: “Мароз, мароз, ідзі куццю куцяваць!”

– *Як рабілі куццю?*

– Куццю дзелалі із ячменя. Яго сушылі, потом в ступе таўклі, абпалвалі, каб выпала ета шалуха, і замачвалі, шоб добра таўклося, а потом обсушвалі. Ясная крупа была – цэлые крупінкі, і с этого варілі. Первая куцця была скоромная, не жырная – ні молока, ні мяса, ні масла. Вторая куцця – маці 12 страў гатовіла: і арэхі, і падсолнухі, і грушы, і яблыкі, шоб скоромна всё было, а на другі дзень усё можна было есці.

– *На Новы год маліліся?*

– Я знала двенадцаць молітв, забыла только. “Отче наш” знаю.

– *Гадалі?*

– Гадалі. Ставілі два зеркала серед ночі – одно спередзі, другое сзадзі. Кто в зеркало одно глядзіт, а посторонніе в другое глядзят сзадзі, і покажэтся суждзеный. Ілі посторонніе смотрят, ілі в том зеркале покажэтся, ну, я то не гадала.

Запісана ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна, Торчык Сцепаніды Іванаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Хлупін, Ярмоленкі Міхаіла Іванавіча, 1959 г.н., ураджэнца в. Хлупін, дырэктара Хлупінскага сельскага дома культуры.

## Вяселле
## Сватанне

– *Як замуж пайшлі? Ваш муж быў з Хлупіна?*

– Да, а я с Судзібора. Началісь колхозы, началі обкладваць богатых людзей. Мы жылі на хуторе, а бацька мой прімак был. У нас было шчэ дзевяць кароў, две пары валоў, пара быкоў, двое коней, ну, і поле было у хутора. Вокруг всё было, і сенокос. Рядом всё. І тоды сказалі, что колхозы открылі. А колхоза шчэ не было, там колхоза – обклалі такім заданнем, што моглі сослаць нас. Потому што невозможно – продай усё, ды отдай дзеньгі. А бацька мой решыл так: еслі мы не выполнім етого заданія, нас сошлюць. Да й ён забраў трі каровы, пару валоў, пару коней, одного оставіл цетцы,

остальные бабушке той, і переехалі в трідцаць первом году в Судзібор. Тут ужэ был колхоз, а колхоз был такі, як комуна – усё аддалі, усё дзелілі по душам.

– *Як вас муж сасватаў?*

– Ён прыехаў туды, в дзеревню, сам хлупінскі.

– *Сватоў прысылаў?*

– Дзядзькі яго і он сам. Отца не было, на войне загінул.

– *Вы былі з мамай?*

– Да, с мамой, сёстры.

– *Дзявочнік быў?*

– Дзевочкі собіралісь, мої подругі. Готовілі, парні пріносілі водку, отмечалі, а потом гулялі.

## Першы дзень вяселля

– *Ці былі змовіны, запоіны?*

– Нічего не было. Война была, как гулялі? Ну, чего, пріехалі вечарам, тут дзесяць кілометров до Судзібора. Пріехалі, за стол посадзілі, побылі, подзелілі каравай, потом шчэ посідзелі і поехалі.

– *Як каравай дзялілі?*

– То з нашэй семьі каравай нарязае. Соседзі пріходзілі – бярэ каравай абламывае, благодаріт і подарок дае. На тарелке с полоценцем.

– *З якімі словамі адбывалася дзяльба каравая?*

– Не помню, там не было обязацельных слов, там кто як прыдумае.

– *Вас сасваталі, а пасля прыехаў жаніх з родзічамі?*

– Да.

– *Адзін вечар быў?*

– Да. Зерном ужэ сыпалі тут, в Судзіборе зерном не обсыпалі.

– *А што было?*

– Пріехалі, здзелалі застаў соседзі, кто хоцел. Выносілі стол, ложылі хлеб на стол і всё: “Не пусцім, выкупайце!”.

– *А чым расплачваліся?*

– Водкой і закуской. Потом пропускалі.

– *З іконамі сустракалі? Значыць, прыехаў жаніх і вы адразу селі за стол?*

– Да. Посадзілі за стол, потом погулялі і селі обратно за стол і подзелілі каравай, всё. І забіралі ікону, выносілі.

– *Вы гатавалі пасаг?*

– Да.

– *Як вас сустракалі ў Хлупіне?*

– Осыпалі зерном. Слезлі с подвод, подышлі к порогу, там нас обсыпалі зерном. Нешто ж давалі – сыту.

– *Што такое сыта?*

– Сладкая вода. І всех у хату звалі.

– *А ікону заносілі ўперад, вас з іконамі сустракалі?*

– Нет, мою ікону.

– *А сустракалі бацькі?*

– Маць і оцец.

– *Ці пераапраналіся мужчына ў жанчыну, а жанчына ў мужчыну?*

– Переодзевалісь.

– *Першы дзень быў там у вас, а другі, трэці – тут, правільна?*

– Да.

– *На трэці дзень кім апраналіся?*

– І цыганкамі, і нішчімі. Веселілісь.

– *Як называўся трэці дзень?*

– Цыгане.

– *Мужчына пераапранаўся ў жанчыну-цыганку, а жанчына – у мужчыну?*

– Да.

– *І што яны рабілі?*

– Там іх пріглашалі за стол, гулялі, танцевалі, пелі. Етые цыгане – как свадзьба, то веселее.

– *А на вяселле вянок вілі?*

– Цветочкі всякіе дзелалі в венкі. Бралі бумагу крашэную і вот так дзелалі цветочкі: бралі ртуць, от камочак дзелаеш на проволочку, ету ртуць помочеш, вона бліскуча.

– *Дзе ртуць бралі?*

– В цермометре. Фата з марлі была.

– *Доўгая?*

– Як у каго.

– *На другі дзень хустку апраналі?*

– Да, сестра мужа платок одзяе, а вянок снімае.

## Хрэсьбіны. Бабіна каша

– *Раскажыце, калі ласка, пра "бабіну кашу".*

– Кресціны. Баба кашу пріносіт породзільніце.

– *З чаго каша?*

– С пшэна. Кашу не ставят на стол, а обманную кашу ставят. Ну, вродзе каша, но не каша – там морковь. Кум должэн выкупіць кашу. Ету кашу зноў ставят на стол і зноў абманну, а потом ставят настояшчую.

– *Ці таргаваліся кум з кумою? Калі кум больш паложыць, значыць, чыя каша?*

– Куміна. Он будзет біць кашу, еслі кума, то кума, а еслі посторонній большэ всех положыт, то он её і забірает.

– *Так і білі?*

– Да. Потом елі.

## Паходжанне назвы вёскі Хлупін

– *Чаму вёска называецца Хлупін?*

– Вода от берега хлюпае. Раньшэ называлось Хлюпіно. Мне сказалі: “А это там хлюпае всегда”.

## Дамавы

– *Дамавы ў вас ёсць?*

– Был когда-то. Домовой меня звал ноч’ю.

– *Мужчынскім ці жаночым голасам?*

– Мужскім.

– *Старэнькі?*

– Не знаю. Сказалі набраць воду ў кружку, еслі будзе зваць, ты ліні в двері, і всё. Трі раза лінуць. І не стал зваць.

– *А чаму думаеце, што дамавы?*

– А хто большэ?

## Талака

– *Ці сабіраліся ў вёсцы рабіць талакой?*

– Талакою ў нас, мы цепер, а особенно ўчасток сеяць, то одному посею, потом другому, дома рабілі.

– *А восенню таксама?*

– Колі пріходзілось, тоды дзелалі, просо мялі толокою, от. копны носяць в хату ілі в гумно, якое і ногамі мялі, босымі ногамі просо мялі. Толокою і цеперь так сеюць.

Запісана ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі
в. Судзібар Петрыкаўскага раёна.

## Выклiканне дажджу

– *Калі была засуха, што людзі рабілі?*

– Вызывалі дождзь давно. Собірались жэншчіны, пріносілі пряжу в хату і прялі лён. Тут жэ основалі, тут жэ навявалі на кросны – наметкі. С наметкамі ходзілі вокруг креста трі раза, гдзе перекрёсток.

– *Вешалі, і ішоў дождж?*

– Калі шол, а калі – не.

– *Вужа ўбівалі?*

– Нет.

– *Ці кідалі што-небудзь у калодзеж?*

– Бросалі мак в дзевяць колодцев. Кідалі гладышкі в колодзец, не в трі, а в дзевяць, тыя, на ўліце. А мы дзевяць колодцев обыдзем, сыплем. На следушчій дзень ужэ дождзь ідзе.

*– Як прыпыніць навальніцу?*

– Палілі свечку і Богу моліліcь.

*– Дома маліліся?*

– Да. Ходзілі вокруг дзеревні Хлупін мужчіны, за імі следы заметалі.

Запісана ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна, Торчык Сцепаніды Іванаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Хлупін.

**Абрадавыя песні**

**Ой, рано-рано**

Ой, рано, рано куры попелі,
Светы вечор, ды й добры вечор!*
Ешчэ нараней Ніночка ўстала,
Ніночка ўстала, косу чэсала,
Косу чэсала, на рады клала,
На рады клала, у цэркву ішла,
У цэркоўку ішла, трі свечы несла,
Светы вечор, дэ й добры вечор!
Добрым людям на здароўе!

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Ой, ў леску-леску**

Ой, ў леску, ў леску на жоўтом песку,
Светы вечор, ды й добрым людзям.*
Седзела пава, пер'е збірала,
Пер'е збірала, ў рукавец клала,
З рукаўца брала, веночок віла.
А за той венок – ды й пошла ў танок.

Запісана ў в. Хлупін ад Торчык Сцепаніды Іванаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Хлупін.

**Ой, на морі, на сінёму**

Ой, на морі, на сінёму,
Шчодры вечор добрым людзям!*
Там ластоўка купаласа,
Купалася, ўмываласа,
Прышла домоў хваліласа:
– Ой, татонько, ой, мамонько,
Я бачыла чудо чудно –
Там ластоўка купаласа.
– Эта, доню, не ластоўка,
Эта, доню, Бож'я ж Маці.
Шчодры вечор добрым людзям!
На здороўе!

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Ой, на моры да на сінём**

Ой, на моры да й на сінём,
Шчодры вечор, Васілею!
Там ластоўка купалас.
То не ластоўка – красна дзеўка.
'Не купалас, умывалас,

До святого дня прыбіралас,
До святого дзенька, до Васілейка.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Валянціны Васільеўны, 1941 г.н., Яфрэмавай Тамары Рыгораўны, 1954 г.н., ураджэнак в. Хваенск, Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Ой, конь бежыць**

Ой, конь бежыць, земля дрыжыць,
Конь дарожку чуе,
Конь дарожку чуе.
Ой, Бог знае, Бог ведае,
Дзе Васіль начуе.
Ой, начуе Васілёчак
В лузі пры дарозь[і],
В лузі пры дарозі.
Прывязав ён канечэнька
Да белай берёз[ы],
Да белай берёзы,
А сам пашов да дзеўчыны
Не п’яной, цверёз[ы].

Запісана ў в. Хлупін ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна

**Коза**

– Шчодры вечор, добры вечор! Дозвольце козу спеваць!
– Пожалуста!
Начынаюць:
– Сею-сею, повеваю,
Коноплю посеваю,
Господару хаты дабра жэлаю,
Здароўя, доўгіх гадоў жыцця!
Ну, і тут начынаюць спеваць козу:
Го-го-го, коза, го-го-го, шэра,
Поворачвайся, не забувайся,
Нізко господару ды й роскланяйся.

Вот эта коза ўжэ начынае танцоваць. Подходзіць: “Э-э-э!”, тымі рогамі господару кланяецца. І ўпадзе да й лежыць, ногі выцягне.

Тут козанька ўпала, ўпала да і пропала.
Дайце козе сала, шоб каза ўстала,
А на рожэнькі – два пірожэнькі,
А на хвосцічок – сала кусочок.

От ужэ ты хочш не хочш, ці цебе пірог цэлы, ці цебе булочкі – на два рогі ложыш эту дайку, даеш і сала. А потом:

А ты, козанька, не гаспадынька.
Потом ужэ:
Дзе коза туп-туп, там жыто сем куп,

Дзе коза ногой, там жыто копой,
Дзе коза рогам, там жыто стогам.

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**Гу, весна**

Гу, весна, гу, красна,
Шо ж ты нам прынесла?
Ці па пірожэчэчку,
Ці по еечэчку,
Ці кусочок сала,
Ці брусочок сыра,
Ці кусочок масла?
Гу, весна, гу, красна,
Шо ж ты нам прынесла?

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Ой, весна, весняночка**

Ой, весна, весна, весняночка,
Ой, чыя ж то дочка Мар’яночка?
За воротамі короўку пасла,
Назбірала горшчок масла,
Горшчок масла, горшчок сыра,
Да ўсіх хлопчыкоў запросіла:
– Ешце, хлопчыкі, ды й мочайце,
А на гарэлочку пробачайце.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., ураджэнкі в. Перароўскі Млынок

**Лецела стрэла**

Ой, лецела стрэла ды й у конец села,
Хі я, хмелю, ды й у конец села.*
Ды й убіла стрэла сына молойца.
Да ніхто к целу не прыступіцца.
Прыступіласа Анна Йваноўна,
Й узела цело дэ й на ручэнькі,
Обнесла цело кругом цэркоўкі.
Сама цэркоўка откріваецца,
Само целочко й у во гроб легло.
Прылетае да тры пташэчкі:
Што одна пташка – то мамка его,
А друга пташка – то сестра его,
А трэйця пташка – то жона его.
Ой, маці плачэ з веку до веку,
А сестра плачэ з году до году,
А жона плачэ з вечора до дня.

Ек мамка плачэ, то й рэкі цекуць,
А сестра плачэ – то й озёрушка,
А жона плачэ – ні калюжэчкі.

Это на Паску. Езжаем, от у нас озеро, да на лодках, да як заспеваем етыя песні…

Запісана ў в. Хлупін ад Торчык Сцепаніды Іванаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Хлупін

**А ў крывога танца**

А ў крывого танца да не вуведом конца.
Зелёная рутонька, жоўты цвет.*
– А мы просо сеелі, сеелі.
– А мы каня вупусцім, вупусцім.
Шоб на просо, да шоб конь проса поеў.
– А мы каня забером, забером.
– А мы каня вукупім, вукупім.
– А мы дзеўку забером, забером.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Да Юрэй, маці, ключэ**

Да Юрэй, маці, ключэ, да подай, маці, ключэ,
Да на жыто, на пшэніцу, да на ўсяку пашніцу.
Дзе корогод ходзіць, там Бог жыто родзіць,
А дзе не бывае, там жыта ўлегае.
Ох, то ж корогод, сам Бог наперод!
Дзе корогод ходзіць, там Бог жыта родзіць.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Хорошуха да сажаласа**

Хорошуха да сажаласа,
Неўдалуха да осталаса.
Хорошухі да загон кратчэ,
Неўдалухі да дзіця плачэ.
Неўдалуха ззаду плачэ.
Хорошуха зажаласа,
А неўдалуха осталаса, да плачэ.
Неўдалухі загон, шо не зжала,
А неўдалухі дзіця плачэ.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., ураджэнкі в. Перароўскі Млынок

**А я ў полі жыто жала**

А я ў полі жыто жала,
Ў мене дома шкода стал[а],
Што свекруха с печы ўпала.
Бо ж ана здурела, што й с печы паляцела,

А можэ ана скруціласа, што с печы скаціласа.

Запісана ў в. Хлупін ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна

**А я прала**

А я прала под дымком, под дымком,
Добрэ жаці холодком, холодком.
А я жала да хапу, хапу,
Да й нажала я ж копу, копу.

Запісана ў в. Перароў ад Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы

**На заручынках былі**

На заручынках былі,
Мёд, гарэлку пілі,
Гарэлачка саладзенькая,
А дзевачка маладзенькая.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Выкацілі медавую бочку**

Выкацілі, выкацілі медавую бочку,
Вусваталі, вусваталі ў пана свата дочку.
Ды й пасадзім, ды й пасадзім на новом вазочку,
Ды й повезом, ды й повезом да сваго дамочку.
Ды й паложым, ды й паложым на новой криваці,
Шо захочам, то і зробім з вашаго дзіцяці.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Ой, у нашого ж свата**

Ой, у нашого ж свата (2 р.)
Да хорошая ж хат[а]:
Печ его побелёная, (2 р.)
Сваха наша ўхвалёнай[я].

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**Хваліласа коровайніца**

Хваліласа коровайніца,
Шо вяліка да работніца,
Шо ў ее сем сарочак:
– Адна на мне, а дзве ў прамне,
А чатыры да ў кудзелі.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Наша печка рогочэ**

Наша печка рогочэ – (2 р.*)
Коровая ёна ж хоч[э],
А прыпечок заліваецца –

Коровая дожыдаецц[а].

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**С-под белого да березнічку**

С-под белого да березнічку (2 р.*)
Сівы конь да й убегай[ець].
Да не сам жэ ён бежыць,
На нём Андрэйка седзіць.
Он коніка да погоняе,
Вон с коніком да розмоўляе:
– Ой, коню мой, коню,
Да несі ж мене ж додому.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Сядзьмо, мамко, повечэраймо**

Сядзьмо, мамко, повечэраймо, (2 р.*)
Вечэраймо, подзелімос[а].
Тобе, мамко, будня ж сенцэ,
А мне, мамко, усе полоценц[э].

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Каменная печэнька**

– Каменная печэнька (2 р.*),
Вечор горыш, да не выгорыш,
Вечор горыш, да не выгорыш,
Каменейко да не роспаліш.
– Молодая Лідонько,
Вечор седзіш, да не заплачэш,
Вечор седзіш, да не заплачэш,
Свою мамку да не розжаліш.
– Заплачу, мамонько,
Ек я пойду по застольейк[у].
Коскою да й обоўюса,
Слёзочкамі да й обольюса.
Слёзкі мое дробненькі,
Годы мое молодзенькі.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Клёновая да лісціонька**

– Клёновая да лісціонька, (2 р.*)
Куда цебе вет(ы)рык(ы) вей[е]?
Ці в(ы) луг, ці в(ы) доліну,

Ці назад на к(а)лёнін[у]?
– Молодзенька Марынка,
Куда цебе мамко й оддай[е]?
Ці в(ы) людзі, ці в(ы) татары,
Ці в турэцкую ж земь[лю]?
– Там земелька корэністая,
Там семейка норовістай[я]:
Оны будуць вечэраці,
А я буду ж плакаць[і],
Кос(ы)камі да й опусчуса,
Слёз(ы)камі да й обольюс[а].

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**Пазаабрадавыя песні**

**Ой, пойду я ў лес по дрова**

Ой, пойду я ў лес по дрова, нарубаю лому,
Зав'ёў мене дурны розум на чужу старон[ку].
На чужой жэ сторононьке сонейко не грэе,
Нету маменькі родное, ніхто, ніхто не жалее.
Ой, сорву я з ружы кветку да й пушчу на воду:
– Плыві, плыві, з ружы кветка, ды й до мойго ж роду.
Плыла, плыла з ружы кветка, ды й стала кружыцца.
Выйшла маці воду браці, ды й стала дзівіцца:
– Ой, чэго жы з ружы кветка на водзе сов'яла,
Ой, чэго ж ты, моя доню,така стара стала?
– Остарыла ж мене, мамко, дрова да лучына,
А шчэ к тому ж, моя мамко, неверна дружына.
Остарылі ж мене, мамко, дробненькіе дзеткі,
Што не прала, не качала свекрусі сарочкі.
Боліць моя головонька, нечым обвязаці,
Обвяжу я й головоньку шолковым платочком.
А той шолковы платочок голоўку не звяжэ,
А той сівы голубочок роду не накаж[э].

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**Ой, пойду я, гукаючы**

Ой, пойду ж я, гукаючы, (2 р.*)
Шчасця ж, долю шукаюч[ы].
Отгукнулас моя доля
По той бок сінего ж мора:
– Плыві, дзеўка, за водою,
А я ззаду за тобой[ю].
Да й прыплывум к бережэчку,
Да й сядомо ж на песочк[у].
Да й сядомо ж на песочк[у],
Да й вушчыпном по лісточ[ку].
– Нехай татко не журбуе,
Мне посагу ж не готуй[е].
Поцірала ж я посагу
Пуд зелёным явором.
Пуд зелёным явором,
Ды з молодым козаком.

Запісана ў в. Перароў ад Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнкі в. Перароў

**Ой, ў полі бероза кудрава стояла**

Ой, ў полі бероза кудрава стояла,
А на той берозі зеўзюля ковала. (2 р.*)
Ой, то не зеўзюля, а родная маці,

Котора ўпраўляла сына воеваці:
– Ой, ідзі, сыночку, да й не забоўляйса,
Черэз два годочкі назад зворочайса.
Нема сынка годзік, нема сынка другі,
Й а на трэці годзік едзе сын мой любый:
– Ой, ці рада, мамочко, ой, ці рада мною,
Ой, ці рада, мамочко, моею жэною?
– Ой, рада я, сыночку, рада я табою,
Только я не рада твоею жэною.
Посаділа сыночка ды й коло прыстола,
Молоду невесточку ды й коло порога.
Поставіла сыночку солодкого мьёду,
Молодой невесточке – зеляного ёду.
Сын віна не п’е, под коніка лье,
А отрутоньку – на половінку,
А отрутоньку – на половінку:
– Поховай, мамко, в одну жы могілку.
– Схаваю сынка да й у цэркоўкі,
А невестачку – побока цэркоўкі.
Вырос жэ з сынка зелёны явор,
А з невесточкі – бела й бероза.
Ой, рослі, рослі, да й повіліса,
Поверх цэркоўкі да й счэпіліса.
Ой, вуйшлі людзі дзіва й гледзеці.
– Ой, Божэ, Божэ, што ж я зробіла,
Шо двое дзеток да й отруціла?

Запісана ў в. Перароў ад Забеліч Эвеліны Рыгораўны, 1942 г.н., Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнак в. Перароў

**Як я жыла ў бацюхна**

Як я жыла ў бацюхна
Да восемнаццаць лет,
Восемнаццаць лет.
Полюбіла й пареня
Да й у дваццаць пьяць лет,
Й у дваццаць пьяць лет.
Такого й красівого,
Што й у дзереўні ж нет.
Вуйшла за воротечка,
Й а каляска ж бежыць,
Каляска й бежыць.
Й а й у той калясоццы
Да мой мілой седзіць,
Мой мілой седзіць,
Да чужую ж нелюбую
Да за ручку ж дзержыць,

За ручку й дзержыць.
Й а ж твоя мілесенька
Да за возом бежыць,
За возом бежыць:
– Постой, постой, міленькой,
Да роспрошчаёмса,
Роспрошчаёмса,
Да на золотэ ж колечко
Да й обменяёмса.
– Ой, рад бы я, міленька,
Да цебе ж й обождаць,
Цебе й обождаць –
Вороные конічкі
Да не могу й удзержаць.

Запісана ў в. Перароў ад Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы

**Мацерь моя**

І мацерь моя родзімая,
Да зачэм мене й спородзіла,
Зачэм жэ мене й спородзіла,
Ой, да малолетнюю жэніла?
І малолетнёю жэніла.
Ой, да жонка й, шэльма ж, не злюбіла,
І жонка й, шэльма, не злюбіла,
Ой, да шчэ й болезні ж прыключыла.
І й от болезні ж зелье знаю,
Ой, да от любові ж поміраю.

Запісана ў в. Перароў ад Махла Лідзіі Яўгеньеўны, 1932 г.н., ураджэнкі в. Хільчыцы

**Ой, дума моя**

Ой, дума й моя, дума,
Ой, дума ж моя, дума
Звела козака з ума,
Звела козака з ума, (2 р.*)
З велікого розума –
Не под муслі жонку ўзяў,
Бо да ее Бог прыняў.
Бо да ее Бог прыняў,
То б я пошоў між дзеўкі,
То б я й пойшоў між дзеўкі,
Між чырвоные ягоды.
Усе дзеўкі як дзяўкі,
Одна дзеўка ні така.
Одна дзеўка ні така –
Ў ее русая коса.

– Ў мене русая коса –
Пойду ў рэчку ўтоплюса.
– Не топісь, дзеўко дурна,
Бо й холодная вода.
Бо й холодная й вода –
Мне, дзеўко, цебе шкода.

Запісана ў в. Перароў ад Голад Надзеі Трафімаўны, 1942 г.н., ураджэнкі в. Перароў

**І сюды гара**

І сюды гара, і туды гара,
Паміж тымі горачкамі ўсходзіла заря. (2 р.*)
Ой, то ні заря – дзеўчына малада
С маленькімі ведзеркамі за вадой ішла.
Дзеўчына ат вады, казак да вады:
– Пастой, пастой, дзеўчынанька, дай каню вады.
– Ох, рада б я стаць, каню вады даць,
Мае босенькіе ножкі – холадна стаяць.
– Дзеўчына мая, седай на каня,
Да й і паедам чыстым полем да майго двара.
– А ў твайму двару нічэво нема,
Только стаіць дуб зелёной прывезаць каня.
А ў твайму двару нічэво нема,
Только стаіць куст каліны, да і тая не цвіла.

Запісана ў в. Хлупін ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна

**Ой, валы мае**

Ой, валы мае да половые, чаго ву ж да не арэце?
Ой, лета мае молодзенькіе, чаго марне йдзеце?
Ой, коб тым волам аратай добры, то ораў бы і нааpаўса,
А мне, маладой, дружына верна, то б жыла я, нажыласа.
Ой, паплыў, паплыў мілы мой Днепром да за ціхаю вадою,
Шапачкі не зняў, добры дзень не даў, не выгаварыў са мною.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**За гарамі, за морямі**

За гарамі, за морямі галубы летаюць,
Не вазнаці, не згадаці, как гада мінаюць. (2 р.*)
– Ой, вы, хлопцы, мае хлопцы, хлопцы маладые,
Запрегайце, хлопцы, коні, коні вараные,
Запрегайце, хлопцы, коні, коні вараные,
Я паеду даганяці годы маладые.
Как дагнала свае годы на кленовым мосці:
– Верніцеся, мае годы, хоць да мене в госці.
– Ой, не верномсь, твае годы, да й да цебе в госці,

Трэба было шанаваці нас па маладосці.
Ой, не спіла, ой, не з'ела, гарно не схадзіла.
Через цебе, мой міленькі, годы пагубіла.

Запісана ў в. Хлупін ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна

**Ой, с-под горкі**

Ой, с-под горкі, с-под крутое голубы ж летаюць,
Ох, як жал(ы)ко лет молодых, што оны мінаюць. (2 р.*)
– Ой, вы, хлопцы, хлопцы ж молодые,
Запрагайце, хлопцы, коні, коні вороные.
Як догнаў я лета свое ў зелёном барвінку:
– Вернецеса, лета ж мое, хоць на 'дну недзельку.
Як догнаў я лета свое ў зелёному жыці:
– Вернецеса, лета мое, будзем добра жыці.
Як догнаў я ж лета свое й на высоком мосці:
– Вернецеса, лета мое, хоць до мене ў госці.
Не вернуцца моім летам, бо нема нічого.
Надо лета шановаці, як сердэчка й свого.

Запісана ў в. Хваенск ад Скрыгалоўскай Любові Іванаўны, 1926 г.н., ураджэнкі в. Хваенск

**Ой, зелёнэ жыто**

Ой, зелёнэ жыто, зелёнэ, хорошые госці й у мене.
Ой, зелёнэ жыто на руну, хорошые госці до ладу. (2 р.*)
Ой, зелёнэ жыто, зелёнэ, хорошые госці й у мене.
Ой, зелёнэ жыто за селом, хорошые госці за столом.
Не махай, Романе, рукою, я не лягу спаці с табою,
А я лягу спаці с казаком под зелёным явором.
С-под явора вецер не вее, под явором сонцэ не грэе,
Под явором дробны дождж ідзе, моя мілка замуж ідзе.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., ураджэнкі в. Перароўскі Млынок

**Ох, п'е чумак, п'е**

Ох, п'е чумак, п'е, в его грошы е,
Ох, за ім, за ім его родна маці горкі слёзы лье. (2 р.*)
– Ох, сыночак мой, дзеціна мая,
Ой, покінь, покінь гарэлачку піці, бо проп'еш коня.
– Ох, мамко моя, не покіну я,
Ох, не покіну гарэлочку й піці, бо солодкая.
– Ох, сыночок мой, дзеціна мая,
Ой, покінь, покінь дзеўчыну любіці, бо сведзе с ума.
– Ох, мамко моя, не покіну я,
Ох, не покіну дзеўчыну любіці, бо й хорошая.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., Бабарыка Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н., ураджэнак в. Перароўскі Млынок

**Косів козак сено**

Косів козак сено, ек була погода,
Плакала дзевчына, ек була молода. (2 р.*)
Плакала, плакала, шчэ й з лічка змарнела,
Наверно, дзевчына веночка жалела,
Веночка жалела, шчэ й родные рэчы,
Роспусціла косы на ўсе свое плечы.
Косу роспусціла, жалю ж наробіла:
Ой, жалю, мой жалю, велікі печалю.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Ходзіць пава по берегу**

Ходзіць пава по берегу, ёна перье губіць.
Не верь, дзеўко, козачэньку, што ён цебе любіць. (2 р.*)
Ой, хоць і любіць, хоць не любіць, с тобою спаць не ляжэ.
Одзін вечор поговоріць, а другой роскажэ.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Бабарыка Марыі Паўлаўны, 1931 г.н., ураджэнкі в. Перароўскі Млынок

**Ой, вы, очы, мое очы**

Ой, вы, очы, мое очы, прывыкайце спаці,
Бо ўжэ мой міленькі думае кідаці.
Шо ў парня жонка, яшчэ дзеток двое,
Яшчэ дзеток двое, чэрнявы абое,
Яшчэ дзеток двое, чэрнявы абое.
Втапіла галоўку ў сінее морэ,
Втапіла галоўку, да нечым звезаці,
А каго ж любіла – трэба забываці,
А каго любіла – трэба забываці,
А каго не знала – то ў параньцы стала.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

**Ой, бацько да маці**

Ой, бацько да маці, што ж я наробіла,
А парэнь жонаты, а я полюбіла. (2 р.*)
А ў парэня жонка, шчэ й дзеточок двое,
Шчэ й дзеточок двое, чэрнявы обое.
Жонку зарубаю, дзецей понаймаю,
С тобою, коханко, всегда погуляю.

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., Бабарыка Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н., ураджэнак в. Перароўскі Млынок

### Ой, у лесі

Ой, у лесі на дубочку
Калыхала дзеўчынонька сына й дочку.
Калыхала і плакала:
– Ці я ў цебе, родна мамка, пагуляла?
Не гуляла, не даросла,
Пасадзіла куст каліны – дэ й усохла.
Пасадзіла с цветочкамі,
Асталаса дзеўчынонька з дзеточкамі.

Запісана ў в. Хваенск ад Чарнушэвіч Галіны Міхайлаўны, 1937 г.н., ураджэнкі в. Боркі

### Ой, мамочко, чорноморец

Ой, мамочко ж, мамочко, чорноморец
Вувьёў ж мене босеньку й на морозец. (2 р.*)
Вувьёў ж мене босую ды й путае:
– Ці е ж, дзеўко, мороз, ці не мае?
– Ох, німа ж марозіку, только роса.
Простояла дзеўчына ўсю ноч боса.
Полюбіла ж, мамочко, у жупані –
Я думала й, мамочко, буду пані.
Я ж думала, мамочко, пановаці,
А прышлосо бедненькой гороваці,
Зелёное жыцечко ў поле жаці.
Ох, жала я жыцечко ды й на ніві,
Повесіла ж люлечку на каліні.
Ох, будзе ж ветрычок повіваці,
Будзе ж мое дзіцітко колыхаці.
Да будзе ж соловейко шчэбетаці,
Будзе мое дзіцітко засынаці.

Запісана ў в. Хваенск ад Скрыгалоўскай Любові Іванаўны, 1926 г.н., ураджэнкі в. Хваенск

### Морэ, сіне морэ

Морэ, сіне морэ от гаю до гаю,
Усе жонкі да обед несуць, а мое немае. (2 р.*)
Пусціў волы да на дуброву, сам пошоў додому,
Прыйшоў мужык да й додому, жонкі дома нету.
– Дзеткі мое дробненькіе, дзе вашая маці?
– А нашая маці пошла ў лес по дрова,
А нашая маці пошла ў лес по дрова,
Ды й сказала: “А вы, дзеткі мое, бувайце здоровы,
Дзеткі мое дробненькіе, бувайце здоровы.
Дзеткі мое дробненькіе, пойду по каліну”.
Ды й сказала: “Дзеткі мое, я ўжэ вас покіну”,
Ды й сказала родна маці: “Я ўжэ вас покіну.”

Запісана ў в. Перароўскі Млынок ад Баран Настассі Адамаўны, 1920 г.н., Бабарыка Марыі Міхайлаўны, 1931 г.н., ураджэнак в. Перароўскі Млынок

**По-над лугом зелененькім**

По-над лугом зелененькім (2 р.*)
Брала ўдова лён дробненькі. (2 р.*)
Она брала, убірала,
Тонкі голос подавала.
Тонкі голос, голосочок
Чэрез Васілёў садочок.
Ох, там Васіль сено косіць,
Тонкі голос переносіць.
Кінуў косу ж на покосу,
А сам пошоў до домонькі.
За дубовы стол садзіўса,
Цяжко, важко зажуріўса:
– Позволь, маці, ўдову браці,
Тогда будом піць, гуляці.
– Не дозволю ўдову браці,
Ўдова ўмее чароваці.
Счаровала мужа свого,
Прічаруе сына ж мого.
–А я чароў не боюса,
Да й на ўдове ожэнюса.

Запісана ў в. Хваенск ад Скрыгалоўскай Любові Іванаўны, 1926 г.н., ураджэнкі в. Хваенск

**Выправіла маці**

Выправіла маці сына ў салдаты,
Молоду невехну ў поле лён убраці. (2 р.*)
Когда ўпраўляла, строго прыказала:
– Не вуберэш лёну, то й не йдзі й додому.
Она брала, брала, брала, убірала,
До белого свету тополею стала.
Прішоў сынок додому ды й говорыць маці:
– Ой, мамонько, мамо, ой, шо то ж за дзіво,
Шо й на нашом полі вуросла й тополька?
– Бері, сын, тапорік, да ідзі ў поле,
Да ідзі ў поле, ды рубай тополю.
Рубнуў раз – ажно кроў канула,
Рубнуў другі –мьясо й показалос.
– Мілы ж мой, міленькой, не рубай тополькі,
Это ж не тополька, это твоя жонка.
Усе ж наробіла твоя родна маці.
– Ох, мамочко ж, мама, шо ж ты наробіла,
Шо ты ж мене з мілой навек розлучыла.

Запісана ў в. Хваенск ад Скрыгалоўскай Любові Іванаўны, 1926 г.н., ураджэнкі в. Хваенск

**Ой, аддалі маладу**

Ой, аддалі маладу да ў вялікую семью,
А веліка семья ўся вечэраць посела, (2 р.*)
А веліка семья ўся вечэраць посела,
А мене, маладу, посылаюць по воду.
Я ж па воду пашла, крінічэньку не нашла,
А криніцу нашла, зачэрпнула полведра,
Я ж крініцу нашла, зачэрпнула полведра,
А до дому ішла, то слезамі доліла.
Я прыйшла до сеней, сама стала ля дзвярэй,
Дэ й паслухаю я, што говорыць семья.
А веліка семья навучае мужыка:
– Чого жонку не б’еш, чого волю ёй даеш?
– А за што мне ее біць, вона ўмее ўсё робіць:
І купіць, і варыць, і са мною гаварыць,
І чытаць, і пісаць, і по садзіку гуляць.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Ой, на поле, на ролье**

Ой, на поле, на ролье, (2 р.*)
Ой, там ходзілі журавлі.
Оны ходзяць, говорацъ,
Ой, которая ролля лепша:
– Перва ролля лепшая,
Ой, а другая горшая.
– С первой жонкой дзеткі маў,
Ой, а с другою розогнаў.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Лецев воран**

Лецев воран чэрез сад зелёной,
Ды й стаў каліну клеваць,
Ды й стаў каліну клеваць.
Любів козак молоду дзеўчыну,
Ды й не думаў ее брацъ,
Ды й не думаў ее брацъ.
Дзеўка парня, парня й отравіла,
Ды й стала его пытаць,
Ды й стала его пытаць:
– Скажы, скажы, друг мой разлюбезной,
От чого ж ты заболеў,

От чого ж ты заболеў?
Ці атрута, ці от той любові,
Ці от любушкі сваей?

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Зайшоў, зайшоў месяц**

Зайшоў, зайшоў месяц за цёмную хмару,
Выбірала маці своёй дочке пару. (2 р.*)
Шукала, шукала, богатого сына,
А дочку кохае бедна сіроціна.
Кохае, кохае, ды й думае браці –
Не мешай любові, родненькая маці.
– Дозволь, дозволь, маці, з бедным покохацца.
– Не дозволю, доню, з сіроціной знацца.
Зайшоў, зайшоў месец за цёмную хмару,
Не найшла матуля своёй дочке пару.

Запісана ў в. Азяраны ад Ярэміч Вольгі Парфёнаўны, 1940 г.н.; Аліфіравец Ніны Васільеўны, 1937 г.н.; Ярмоліч Лідзіі Мікалаеўны, 1945 г.н., Зуевіч Марыі Мікалаеўны, 1948 г.н., ураджэнак в. Азяраны

**Калыханкі**

**Ай, люлі, пашлі коцікі**

Ай, люлі, люлі, люлі,
Пашлі коцікі ў гулі,
А Маруську забулі.
Ай, люлі, люлі, люлі,
Спі, Маруська маленька.

Запісана ў в. Хлупін ад Чыжык Антаніны Рыгораўны, 1923 г.н., ураджэнкі в. Судзібар Петрыкаўскага раёна

**Ай, люлі**

Ай, люлі, засні спаць.
Одна маці, бацькоў пьяць.
Маць одна і та дурна!

Запісана ў в. Перароў ад Туравец Аляксандры Пятроўны, 1930 г.н., ураджэнкі в. Перароў

## *Саскевіч М.А.* Абрадавыя звычаі

*(на тураўскай гаворцы)*

Ек Іісус Хрыстос родзіўса, то корову і волы не з‘елі сено, а покінулі, шоб дзіця хавалосо, а коні елі да ўсе з‘елі. То ўжэ Бог даў коням есці і не наесціса, то конь дзень і ноч грызе.

Перэд Роздвом у Погосці пірогі пеклі, і коляднікам. З звездою ходзілі колядннікі под вокна, свечка ў ёй, звезда ўсякого цвету, нараджана. Звоночок у іх, звоняць, ек под вокно подыйдуць. До старого Нового года ходзілі кажын вечор. З одного села ў друге. Спевалі: “Дзева сына народзіла і ў яслях схороніла”.

Роздвена песня ці страдна — шо на Роздво спевалі. Шоб град не побіў городы, поле, на чэцвёрты дзень Роздва, Паскі, Тройцы не робілі, на годовуе с‘ята.

Сено на стол клалі перэд Новум годом старым, на Шчэдрэц. Ек вечэраць, то сено клалі. Тонкі слоёк сена под скацерць. Вечэраюць, повечэралі — сеніны вуцягвалі, екі лён поросце. Перэночуе сено — рано прымалі. Коровам ёго.

Наварыць куцье, у міску кладзе мед у водзе ці солодка вода, пірог на місцы, ходзяць, стукаюць. “Хто там стукаеў” “Сам Бог з куціцою, місіцою, з хлебом”. Виходзіць хозяін з пірогом, зове ў хату. У хаці накормяць. Ек яма, то: “Да сам чорт місіцу розбіў і куціцу розліў. Картоплі вубраў да закрыў”. Жэрэб‘ята запрагаюць у сані да дзецей у сані саджаюць, шчэдрыкуюць.

Мужчыны особно ходзілі колядоваць, іх песне йначчые. На Шчэдрэц, ек зайдуць под вокна, спеваюць:

Добры вечор, пане–господар!

Наце сноп на сто коп.

Ці можна заспеваць песнюў

З колоскамі ходзілі. Колоскі кралі, бувало, ек своіх нема ці мало. З чужое сцірты цягалі. Хозяін, ек і побачыць, не вельмо крычаў. Да колоскі шоб не до пары — тры, п‘яць ... шоб не одзін. За колоскі хлеб ці грошы ці пірога давалі хозяёва.

З звоночком, буськом і козою ходзілі.

У сад ідзе к яблуні, кажэ: "Дзерэво, здрыгніса — Іісус Хрыстос народзіўса". Помалу поворушыць яблуню да обоўяжэ соломою, жытнёю. Шоб яблука родзіліса.

На Андрэя з вішэнь розок вуломае дзеўка дзве, напішэ свого хлопца, у пляшку ці еку гладышку стаўляе, і бумажка. Да ек росцвіце на Шчэдрэц, за того хлопца замуж пойдзе.

На Крэшчэнне вурубаюць з лёду крэста, обольюць бурачным соком, ленты з бумагі ўсякого цвету на ёго, крэстоў з бумаг на крэста (зелёна, сіня, красна бумага). Дзеўкі на берэзі постануць нараджаные, шоб хлопцы з лёду бачылі. Хлопцы вугледзяць да ў сваты йдуць. Посвеціць поп воду ў полонцы да людзі набірають — у пляшкі, глёкі.

На любе с‘ято казалі: "От добрэ, шоб мужчына прыйшоў".

Колісь од Роздва до Крэшчэння ніхто ў сваты не йдзе. Да ўжэ на берэзі вугледзяць дзеўку да коўценуць тое воды да ўжэ йдуць у сваты хлопцы.

Іван Крэсціцель — усім с‘ятам проводзіцель (20 студзеня — М. С.).

Двое чоловек і птушкі по пары ў коўчэг, дуб по-нашому. Чоловек кажэ на птушку: "Леці, леці туда, мо нешчо відно будзе". Полецела птушка да вербінку побачыла да прылецела да кажэ: "Да там некі дубчык з воды бачно". То прыплулі людзі туды да стала спадаць вода да розвеліса людзі.

Чэцвёрта од початку поста субота — хрэсна субота, за ею похвальна субота, вербна (лазорова) субота, белы тыздзень, красна субота (суботнік — чырвона субота). Посвечану вербу несуць на могліцы і затыкають на могілках. У велікодны пост поп тры не- дзелі не даваў спеваць, до крэстопоклонной недзелі. Але дзеўкі шлі к Сцвізі, к Озеранам, спевалі.

З цёрну венок на Хрыста, гвозды ўбівалі. Цыган украў пяты гвозд, шо голову хоцелі прыбіць. То трэ цыгана дарыць.

Хрыста жыды сказнілі, шо похрысціўса ў нашу веру, за етэ катовалі.

Хрыста клічуць — прымають плашчэніцу, спевае поп: "Не рыдай, Маці, над гробом". У дванаццаць кругом цэркву ходзілі. У час ночы, на другі час Хрыста клікалі.

Помаленьку ўлезе поп. Жонкі, шо шэпчуць, за попа хапають, а вон ідзе. Улезе ў цэркоў, тры раз ціхо: "Хрыстос увоскрэс". То ўсе за ім крычаць: "Хрыстос увоскрэс!" Да за руку ек здороўкаюцца да цолуюцца з своімі, з суседамі.

Два кошэле еды свеціць, ек чуць віднее. У дном порося начыненэ.

Паска ў цэркві веліка, на ёй крэст з бумагі, велікі. У ту недзелю розрэжуць да людзям. Пускалі на Паску дзецей звоніць на звонніцу, боўконяць дзень тые дзеці.

Колісь жонкі толькі на могліцы на Паску, на могілы еду свечану клалі, а мужчыны коло цэркву ў біткі гулялі.

Велікдзень колісь — недзелю, серэд недзелі не шылі, не пралі, не ткалі.

Ноўскі велікдзень ... У Турові на пяты дзень Велікодня помінаюць небожчыкоў, у чэцвер, з попом, "мірскіх велікдзень" у іх кажуць. На Полессі і обеды несуць да едзяць там на Ноўскі велікдзень. У Погосці не велі попа, поміналі на перву дзень Велікодня.

Гробніца, дзе плашчэніца, до Ўознесення стояла, от Паскі на шостой недзелі ў чэцвер.

У пост і на Велікдзень "бабусю" спевалі. На селе круг, душ 15, у серэдзіні "бабуся" — жонка, палка за кудзелю, прыўяжэ шчоцінку, прысядзе да ўродзі ек прадзе. Чотыры жонкі хочуць к "бабусі" у круг, а етые не пускаюць. Тые спеваюць, шо "бабусі" гарэлкі дадуць, боршчу, кашы, пампушок, кіселю, а етые: "Му бабусі не дамо ... Му ... поп‘ёмо ... поемо"**.**

Ек Оўдоля замуж, стара Навечыха прынесла перэд веселлем у кошэле окуне, поподпекала, пляшку гарэлкі, пірога. Ек Просся замуж за Яшкіна, кашы короўячое ёго маці прынесла.

Под коровай, ек сажаць у печ, сыплюць жыто.

На Полессі — дзежка, ек ногою ступае молода, то чэсна. Хведор К-ц з Озеран браў, то дзежку коло воза поставілі, Хведор ногою пхнуў ее, то казалі: "Хведор у хутбола гуляе".

Дождж на веселле — добрэ. Волі Бурдэліхі маці ў Чэрнічы замуж шла да дождж шоў, то казалі: "Од дождж ідзе — будзе шчасліва". Аж тры годы прошло да чоловек ее помер.

Завівалі косы молодой ... подсмальвалі.

Тройца ў понедзелок і ў оўторок і ў недзелю, тры дне. Клён ломаюць да ўтыкаюць. Сем недзель после Велікодня да на восьму Тройца.

Русаўные розыгры — на ... дзень Тройцы.

На Купалного Івана сонцэ купаецца, усякімі цветамі — голубее, жоўтэ, зелёнэ, сіне...

Шэпталі, шоб вороб‘е просо не пілі і шоб соўнешнікі не поўпівалі. І ніткою обво- дзілі просо.

На Іллю одзін чоловек наняў п‘яць жонок. Гром убіў двух волоў. То чоловек наняў роботнікоў, зробілі гроб, ім ведро гарэлкі. Гроб у цэркву под плашчэніцу. На Іллю больш не робіў. Косцянко, брыгадзер у Погосці даўно, на Іллю ногу сунуў у молоцілку да больш ніколі на Іллю не робіў.

Колісь, ек дождж доўго нема, то з попом по полю ходзілі. Дзве корогі велікіе, дна чорна, друга чырвона.

Колісь на с‘яту Прачысту 28–го аўгуста жменю пшэніцы, колосы, з‘яжуць і жменю жыта з‘яжуць, у цэркві посвецяць, з‘яжуць да ек посеюць озімуе, заборонуюць, кладуць бороду на заборонованы загон. Ек засеўкі.

Колісь, шоб беды не було, кругом села воламі оборуць, жонкі ў одну хату под вечор зберуцца да ек сонцэ зайдзе — прадуць, на цэўкі навіваюць, ткуць, корункі вяжуць, прышываюць — шоб тры рушнікі до сонца кончыць. Да ўжэ з імі, з корогамі по селу ўдзень. До войны так шлі по селу — аж заец дорогу перэбег. То далей не пошлі, сказалі: "Ужэ нічого не поможэ". Да церэз тры дне село згорэло.

Шоб лён родзіў, громнічну свечку, ейцэ ў семена.

На Здвіжэнне пост: пампушкі ў чорніцы, мак, у масло коноплянэ мочалі. Боршч з грыбамі, каша пшоняна з олеямі.

На Здвіжэнне ярмолок колісь. З Петрыкова чоботы ў коробах, у ларках цукеркі, з Турова жыды розопнуць шо-небудзь, полешукі — грыбу сушоные. Плацілі грошыма.На поклон Чэсному крэсту шлі. Начэпляюць на ёго хвартукоў, рушнікоў, скацерцей, хусток, полотна. Полешукоў к нашой мацер дзве хаты наеждало, поўно.

## ПРА АБРАДЫ РАСКАЗАЛІ

*Карась Сямён Рыгоравіч, 1905 г.н.,*
*Карась Анастасія Адамаўна, 1909 г.н.,*
*Герман Вусціма Рыгораўна, 1907 г.н.*

## РОЗДВЕНА ПЕСНЯ

Ой, пане–Іване,
Ці спіш, ці лежыш,
Ці думу думаешў

Одзені шубку,
Вуйдзі на вулку
Да й послухай жэ,
Шо ў хмары гудзе —
Прачыстая йдзе,
Тры роі ведзе.

Одзін роічок —
Ясны месечок,
Другі роічок —
Яснэ сонейко,
Трэці роічок —
Дробны дожджычок.

Чым восхваліцца
Ясны месечокў
Еу я зыйду
Рано з поўночы —
Восхваліцца

Купец у дорозі,
А звер у лесі.

А чым восхваліцца
Яснэ сонейкоў
Ек я зыйду
На Роздво рано,
Возрадуецца
Увесь мір хрышчоны
Дый Народжоны.

А чым восхваліцца
Дробен дожджычокў
Ек я пройду
Раннёю весною
(Тры раз у мае),
Возрадуецца
Жыто, пшэніца
І ўсяка пашаніца.

Дай, Божэ, шоб за год дождалі
Дый на той год спевалі (давалі).

*Карась Сямён Рыгоравіч, 1905 г.н.*

ПОСТОВА ПЕСНЯ

(і на Паску вельмі, і после Паскі недзелю)

Володар–володарэчку,
Йшчо з-за ворот клічэў
Панскіе служэчкі
Да йдуць ворот одмукаці
Да ключоў враці
Да вуллёў одчыняці
Да будуць меду доставаці
Да будуць дзевочок частоваці,
Шоб ішлі танцоваці.

ПОСТОВА ПЕСНЯ

(і на Велікдзень)

Ой, суседочкі, мое голубочкі,
Ці не бачылі мое бабусі на торгахў
Ой, хоць бачылі, хоць не бачылі, —
Не скажомо.
А му гарэлкі наберем,
Свою бабусю позовом.
А му гарэлку поп‘ёмо,

Вашой бабусі не дамо.
А му боршчыку наварымо,
Свою бабусю посадзімо.
А му боршчыку поемо,
Вашой бабусі не дамо.

*Далей про кашу, пампушкі, кісель спеваюць.*

*Герман Вусціма Рыгораўна, 1907 г.н.*

## ПОСТОВА ПЕСНЯ
(перэд Паскою)

Весна–весняночка,
Чыя ето дочка Мар‘яночкаў
Шо за вороцьмі корову пасла
Да назбірала горшчок маслаў
Горшчок масла, горшчок сыра
Да ўсіх хлопчыкоў запросіла:
“Ежце, хлопчыкі, да ўбачайце,
На горэлочку пробачайце”.

## ПОСТОВА ПЕСНЯ
(і на Паску)

А ў городзі под вербою
Стояць коні над водою.
Ой, венчэ наш, венчэ,
Зелёненькі барвенчэ,
Ой, трава–трава шоўкова,
Цебе коні потоптали,
Цебе гусі пошчыпаліў

А мене коні не топталі
І гусі не шчыпалі
Да й потопталі мене тые дзевонькі,
Шо ў панчошках шоўковенькіх,
У чэрэвічках козловенькіх.

*Карась Анастасія Адамаўна, 1909 г.н.*

*Запісаў М. А. Саскевіч у 1984—1990 гг.*

***Багамольнікава Н.А.*** **Тапанімічнае багацце Жыткавіцкага краю**

*Напоіць Брагін брагай хмельнай –*
*І ўявіш ты Хойнікі ўжо*
*Ля хвойніку,*
*ля Ельска – ельнік,*
*А каля Жыткавіч – жыты.*
М. Аўрамчык

У кожнай краіне, у тым ліку і Беларусі, маецца вялікая колькасць уласных назваў, ці онімаў,якіх на сённяшні дзень ужо немагчыма падлічыць. Сярод онімаў вылучаецца значны клас, які абазначае ўласныя назвы геаграфічных аб’ектаў. У навуцы такія найменні прынята называць тапонімамі (ад грэч. *topos* ‘мясцовасць, месца’ і *onyma* ‘імя, назва’), а сукупнасць назваў – тапаніміяй. Безыменных аб’ектаў амаль не існуе. Любая геаграфічная назва мае сваё паходжанне, гісторыю, значэнне. Ва ўласных найменнях захоўваюцца каштоўныя звесткі пра мінулае і сучаснае жыццё насельніцтва краіны.

Надзеждзін М.І. пісаў аб тапонімах, што “назвы – мова зямлі, а зямля ёсць кніга, дзе гісторыя чалавецтва запісана ў геаграфічнай наменклатуры”. Гэта сапраўды так. Тапонімы не толькі маюць мэту вылучаць адзін аб’ект, дапамагаць адрозніваць яго ад іншых, г.зн. адрасную функцыю, але і нясуць аб аб’ектах пэўную інфармацыю, што закладзена ў іх утваральных асновах.

Узніклі тапонімы ў глыбокай старажытнасці і захоўваюць разнастайныя паняцці, звязаныя з найбольш важнымі, ключавымі сферамі жыцця народа. Так, семантыка (значэнне) асноў онімаў адлюстроўвае асаблівасці навакольнага ландшафту і тапаграфіі мясцовасці, раслінны і жывёльны свет, матэрыяльную і духоўную культуру насельніцтва, яго моўныя кантакты з іншымі этнасамі і г. д.

Мы разгледзім, аб чым паведамляюць нам уласныя назвы населеных пунктаў, ці айконімы (ад грэч. *oikos* ‘жыллё’ і *onyma* ‘імя), і асобныя назвы водных аб’ектаў, або гідронімы (*hudor* ‘вада’ і *onyma* ‘імя, назва’), што знаходзяцца ў Жыткавіцкім раёне.

Сучасны раён размешчаны на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся ў вялікай нізіннай раўніне. Самая значная блакітная артэрыя раёна – рака Прыпяць – прымае тут да сябе воды прытокаў Сцвігі, Свінавода, Случы, Скрыпіцы і Навуці. Уздоўж рэк шмат пясчаных узгоркаў, дзюн. Найбольш буйныя азёры раёна носяць назвы Белае і Чырвонае.

У Жыткавіцкім раёне знаходзяцца на дадзены момант 109 населеных пунктаў, з якіх 2 маюць статус гарадоў (Жыткавічы і Тураў), а астатнія адносяцца да сельскага тыпу (вёскі, пасёлкі) [1, с. 173].

У колькасных адносінах самую вялікую групу складаюць айконімы, асновы якіх матываваны ўласнымі найменнямі людзей: імёнамі, прозвішчамі, мянушкамі. Адзначаны прынцып намінацыі тлумачыцца старой сістэмай сельскай гаспадаркі і такой яе характэрнай прыкметай, як раздробленае

землеўладанне. Адантрапанімічныя айконімы гэтага тыпу ўвекавечылі прозвішчы, імёны, мянушкі ўладальнікаў зямель і іх састаўных частак, двароў, дворышч, імёны галавы роду або сем'яў, што мелі да ўзнікнення аб'ектаў пэўнае дачыненне. У прыналежных субстантываваных прыметніках-айконімах на прыналежнасць указваюць суфіксы*–оў* (*-ёў*),*–аў,–ёва* (*-ова),–ын* (*-ін,–іна*): вв. ***Бранісла ў***, ***Брынёва***, ***Малешаў***, ***Марохарава***; вв. ***Вароніна***. Адзначаныя суфіксы прыналежнасці маглі ўскладняцца суфіксам*–ка*: в. ***Дзедаўка***.

Больш падрабязна спынімся на такіх онімах гэтай групы, як Ленін і Тураў.

Назву ***Ленін*** можна суаднесці, на першы погляд, з псеўданімам У.І. Ульянава, праўда, такі падыход будзе аматарскім. У айканіміі мадэль называння *ў гонар знакамітых людзей*, у тым ліку і У.І. Леніна, сапраўды прадуктыўная. Толькі на Гомельшчыне адзначаецца 9 онімаў у яго гонар: вв. ***Леніна*** ў Дуравіцкім с/с Буда-Кашалёўскага р-на, Ленінскім с/с Добрушскага р-на, Бярозаўскім с/с Калінкавіцкага р-на; п. ***Ленiндар*** у Насовіцкім с/с Добрушскага р-на; п. ***Ленінец*** у Дублінскім с/с Брагінскага р-на; п***. Ленінск*** у Малажынскім с/с Брагінскага р-на; пп. ***Ленінскі*** ў Хракавіцкім с/с Брагінскага р-на, Чабатовіцкім с/с Буда-Кашалёўскага р-на, Балатнянскім с/с Рагачоўскага р-на. Але ў дадзеным выпадку іх аб'ядноўвае толькі сугучча. Прыведзеныя назвы ўзніклі ў савецкі перыяд, ***Ленін*** жа ўпершыню ўзгадваецца як мястэчка ў 1568 г., што “вырасла” з урочышча, дзе размясціўся маёнтак, [2, с. 119] і адказвае, хутчэй за ўсё, на пытанне *чыйў*

Найменне аднаго з найстаражытнейшых беларускіх гарадоў ***Турава*** (упершыню, як вядома, узгадваецца пад 980 г.), цэнтра ў XI – XII стст. Турава-Пінскага княства, і на сённяшні дзень дакладна не ўстаноўлена. У тапанімічнай літаратуры маецца некалькі версій тлумачэння айконіма. Так, па адной з іх, горад быў заснаваны паплечнікам князя Рагвалода варагам *Турам*. Па іншай, імя *Тур* у старажытных славян да з'яўлення кананізаваных імён было вельмі папулярным, асабліва сярод прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. Аб наяўнасці адзначанага імя ў славян сведчаць прозвішчы тыпу Тур, Тураў, Туронак, Турко і інш. У якасці ўласнага імя магла анімізавацца назва буйной дзікай жывёліны – *тура*, татэмічнага культа ўсходніх славян як сімвала сілы, магутнасці, улады [3, с.373-374]. Старажытныя славяне верылі, што элементы прыроды навакольнага асяроддзя адносяцца да іх добра ці кепска, верылі ў магічную сілу слова і былі ўпэўнены, што жывёльны і раслінны свет, розныя з'явы прыроды, назвы якіх узяты ў якасці імён, становяцца іх апекунамі. У дахрысціянскі перыяд практычна любы агульны назоўнік мог быць выкарыстаны як уласнае асабовае імя. *Тур* з'яўляецца і імем язычніцкага бога-грамавержца. Ёсць меркаванне і аб узнікненні назвы ад былой рэчкі Тур, што ў старажытнасці была прытокам Прыпяці, а цяпер “пад гэтай назвай выступае частка амаль замытай ілам і пяском пратокі з р. Сцвіга ў Прыпяць…” [2, с. 74]. Сапраўды, “рачныя”, айконімы фіксуюцца ў тапаніміі, але яны ўтвараюцца звычайна пры дапамозе суфікса*–ск*, які

прынята  называць тапанімічным, параўн. Віцебск, Друцк, Пінск, Полацк, Чачэрск. У такім выпадку паселішча павінна гучаць, як *Турск*.

Аднак большасць айконімаў гэтага тыпу намінацыі ў сваёй структуры мае топафарманты*–ічы,–ыцы*: вв. ***Буйкавічы***, ***Грычынавічы***, ***Гулевічы***, ***Дзякавічы***, ***Залюцічы***, ***Іёвічы***, ***Кажановічы***, ***Любавічы***, ***Людзяневічы***, ***Ляхавічы***, ***Палосцевічы***, ***Пухавічы***, ***Сцяблевічы*** (Вялікія і Малыя), ***Хільчыцы***, ***Цімашэвічы***, ***Юркевічы***. Самі ж прозвішчы паходзяць як ад уласных, так і ад агульных імёнаў. Напрыклад, сучасная назва г. ***Жыткавічы*** тлумачыцца як утварэнне ад прозвішча, у аснове якога знаходзіцца апелятыў *жыта* [4, с. 124]. Але першасны яго варыянт гучаў ***Жидковичи*** (у 1500 г. упершыню ўпамінаецца як маёнтак, затым на карце “Беларусь в конце XYI в. – сяло), і быў матываваны імем *Жыдка*, скарочанай формай славянскіх складаных імёнаў *Жидослав, Жидимир, Жидислав*, дзе лексема *жиди, жидо* значыла ‘ждаць, чакаць’ [3, с. 167]. Змена напісання, відаць, – пазнейшы вынік асіміляцыі па глухасці.

Такія айконімы прадстаўляюць самую прадуктыўную беларускую айканімічную мадэль і з’яўляюцца па значэнні блізкімі да родавых назваў, у аснове якіх знаходзіцца калектыўнае імя, прозвішча або імя-мянушка другога пакалення. Сярод асноўных прычын узнікнення онімаў на*–ічы* лічыцца, як мы адзначалі вышэй, спадчыннасць як самая важная крыніца землеўладання. Асобныя назвы ў Жыткавіцкім рэгіёне паўтараюцца і адрозніваюць памеры аб’ектаў (***Вялікія Сцяблевічы*** – ***Малыя Сцяблевічы***) ці ўказваюць на адносны час узнікнення (***Залюцічы*** – ***Новыя Залюцічы***, ***Мілевічы*** – ***Новыя Мілевічы***), утвараючы палярызацыйныя пары.

Спарадычную мадэль утварэння айконімаў даследаванай групы фіксуе адзінкавая ў раёне назва в. ***Сяменча***, у якой суфікс*–ча* дадаецца да асновы ўласнага імя *Сямён* і з’яўляецца, мяркуецца, вынікам сцяжэння або субстантывацыі прыметніка тыпу Сяменчына (зямля).

Найменні вв. ***Старушкі***, ***Сукачы*** таксама сведчаць, што паселішчы заснаваны на калектыўных пачатках (напрыклад, *старушкамі*, асобамі ж. полу ва ўзросце; патомкамі *Сукача*).

Назвы паселішчаў утвараюцца і ад іншых класаў онімаў. Утварэнні ад гідронімаў  поўнасцю паўтараюць структуру  матыватара: вв. ***Белае***, ***Поўчын***, ***Чырвонае***  (ад адыменных азёр), в. ***Навуць*** ( ад адыменнай рэчкі). Водныя аб’екты здаўна служылі чалавеку прыкметнымі арыенцірамі мясцовасці, сродкам зносін, крыніцай харчавання. Людзі сяліліся паблізу іх, таму пасяленні і атрымлівалі назвы бліжэйшых водных аб’ектаў.

Самі айконімы таксама могуць з’яўляцца базай для ўтварэння свайго ж класа: вв. ***Наваленін***  (ад в. *Ленін*), п. ***Грабянёўск***і (ад в. *Грэбень*), п. ***Хваенск*** (ад адыменнай вёскі). Другасныя онімы сведчаць аб узнікненні населеных пунктаў паблізу матыватараў.

Актыўна задзейнічана ў якасці ўтваральных асноў айконімаў у Жыткавіцкім раёне і апелятыўная лексіка розных лексіка-тэматычных груп. Найбольш актыўнымі пры ўтварэнні выступаюць назвы расліннага свету, у прыватнасці, назвы: а) дрэў: *бяроза* (вв. ***Беразіна***, ***Беразнякі***), *вяз* (***Вязаў***

*Лес*), *граб* (в. ***Грабава***), *ель* (в. ***Ельна***), *хвоя* (вв. ***Хваенск, Хвойка***); б) агульных лясных масіваў: *бор* 'хваёвы ці сасновы лес на высокім месцы, на сухім грудзе' (вв. ***Баравая, Боркі, Князь-Бор, Хісцецкі Бор***), *дуброва* 'дубовы ці змешаны лісцёвы лес, гай' (вв. ***Доўгая Дуброва***, ***Дуброва***); травяністых раслін і кустоўя: *верас* (в. ***Верасніца***), *каліна* (в. ***Калінаўка***), *чарот* (в. ***Чарацянка***). Як бачна з фактычнага матэрыялу, айконімы адлюстроўваюць такую адметнасць мясцовасці, як наяўнасць лісцёвых і хваёвых лясоў.

Прадуктыўна матыватарамі найменняў выступае геаграфічная тэрміналогія, што сведчыць аб найбольш характэрных асаблівасцях рэльефу мясцовасці. Жыткавіцкі край у старажытнасці – край балот, вакол якіх раслі дрымучыя лясы. Людзі сяліліся на ўзвышаных месцах, якія ў мясцовасці называліся *відока* 'віднае з усіх бакоў, адкрытае, высокае месца' (в. ***Відошын***, магчыма, і ад *відоліца* 'на відавоку, на адкрытым месцы'), *востраў* 'месца, якое абцякае вада' (в. ***Востранка***), *града* ' узвышша, прадаўгаваты ўзгорак сярод балота, паміж ручаёў, на лузе, які ніколі не заліваецца вадой' (в. ***Града)***, *грэбень* 'невялікае прадаўгаватае ўзвышша, грыўка' (в. ***Грэбень***), на берагах водных аб'ектаў (в. ***Бярэжцы***). Ёсць указанне на характар глебы: вв. ***Буразь*** (бурая зямля, залежы бурага вугалю), ***Пясчанікі*** ( пясчаная неўрадлівая глеба), в. ***Крэмнае*** (ад *крэмень*). Адносна апошняга наймення маецца і іншая думка: *крэмнае* – субстантываваны прыметнік ад ст.-бел. *крэм* 'дрэва, прыдатнае для бортнага пчалярства' [3, с. 208]. Наша ж меркаванне вынікае з археалагічных дадзеных рэгіёна, у якім, як адзначаюць гісторыкі, падчас раскопак былі знойдзены крамянёвыя сярпы і іншыя крамянёвыя прадметы [2, с. 21–22].

Паселішчы ўзнікалі і побач з воднымі аб'ектамі, тыпы якіх матывавалі айконімы: *возера* (п. ***Азёрны***, в. ***Азяраны***), манс. *келяй* 'балота' (в. ***Келі***), рэг. *пласток* 'сажалка' (в. ***Пласток***), і паблізу лясоў: в. ***Лагвошчы***, раней ***Лагвішча*** (мясц. *лагво* 'логава', г.зн. у бліжнім лесе вадзілася шмат звяроў). Каля сучаснай вёскі ***Бялёў*** маецца сетка меліярацыйных каналаў, у тым ліку Найда-Бялёўскі канал. У такім выпадку можна канстатаваць, што тэрыторыя ў старажытнасці была забалочанай, парослай нізкім беразняком, белым мохам, падвеем, белай пушыцай. Каларыстыка "белай" мясцовасці праявілася ў прыродным выражэнні. Прарыў вады, патока прэзентуе айконім ***Перароў***.

Сяленне ***Кольна*** вядома з 16 ст. як шляхецкая ўласнасць і паходзіць, думаем, ад апелятыва *калена* 'круты паварот ракі, дарогі'. Каб дабрацца з Жыткавіч да Чэрніч у цяжкіх ландшафтных умовах, людзям прыходзілася ў дадзенай мясцовасці рабіць паварот, калена (цяпер, дарэчы, паблізу існуе прамая дарога). Жучкевіч В.А. бачыць у аснове лексему *кола*, г. зн. калёсная дарога [4, с. 169]), што таксама асабліва не пярэчыць матывацыі. У матэрыялах для геаграфіі і статыстыкі Расіі падаецца наступнае апісанне тагачаснай мясцовасці жыткавіцкага краю: "Улетку прабрацца ад адной вёскі да другой можна толькі на пары прывучаных да гэтых жудасных дарог валоў і то з дапамогай вопытнага праваднікa. Вясной ж і восенню вада выходзіць з берагоў балот, ручаёў і рэчак, далёка разліваецца ўбакі і зусім спыняе гэтыя

слабыя зносіны. Мясцовасць лясістая, нізкая, балоцістая, з вельмі слабым скатам на поўдзень…” [2, с. 118].

На размяшчэнне аб’ектаў у прасторы ўказваюць назвы-арыенціры: вв. ***Заброддзе, Загацце, Загорбашша, Замошша, Запясочча***, г.зн. размешчаныя за *бродам, гаццю, гарбом* (*горб* ‘невялікая пакатая горка; высокі ўзгорак’), *мохам, пяскамі*, уздоўж чаго-небудзь (в. ***Подаўж***), уверсе чаго-небудзь (в. ***Вільча***) (*вільчык* ‘верх, верхавіна чаго-небудзь).

Сярод бяскрайніх лясоў, балот і пясчанікаў ва ўмовах лясіста-балоцістай мясцовасці людзі шукалі прыдатных для распрацовак мясцін: астравоў, *палянак* (в. ***Палянка***). Прыгодныя для пасялення месцы адлюстроўваюць назвы вв. ***Вятчын*** (думаем, ад *ветка* ‘зручнае месца ўбаку ад чаго-небудзь), ***Найда*** (знойдзена прыдатнае месца).

Утваральныя асновы наступнай групы айконімаў звязаны з працоўнай дзейнасцю чалавека. Найменні сведчаць, што тагачаснае насельніцтва займалася земляробствам, таму падсечна-агнявым спосабам сярод лесу распрацоўвала дзялянкі: вв. ***Карчаватка*** (ад *корч*), ***Пасека*** (*пасека* ‘выкарчаваныя дзялянкі лесу’, ’поле на месцы выкарчаванага лесу’, ’пчэльнікі’), в. ***Рыдча*** ( ‘перарытая рыдлёўкамі зямля’), в. ***Хачэнь*** (ад *хатава* ’навіна, новыя землі, на якіх жадаюць пасяліцца’). Знаходкі ў раскапаных археолагамі курганах, гарадзішчах указваюць на тое, што падсечная сістэма была рана заменена на ворыўную. “Ворыўныя палі пакутуюць ад навакольных высокіх густых лісцёвых лясоў. Усе ворыўныя палі раскіданы паміж сенажацямі, зараснікам і лясамі. Авёс, проса, бульба добра ўдаюцца, жыта – у вельмі сухія гады. Саду няма і не можа быць па прычыне мокрай мясцовасці і падглебы, насычанай вадой...” (З матэрыялаў для геаграфіі і статыстыкі Расіі [2, с.118-119 ]).

Жыхары акрамя земляробства займаліся бортніцтвам, борці ставілі на дрэвах у лесе: вв. ***Бечы*** (літ. bite ‘пчала’), в. ***Пасека***; дзерлі лыка і плялі лапці: вв. ***Лутоўе*** (ад *лут* ‘палоскі кары маладой ліпы, вярбы, вязу’), в. ***Пасталы*** (мясц. *пасталы* ‘лапці’); некаторыя старажылі: в. ***Старажоўцы*** (вёска вядома з 16 ст. у складзе ВКЛ і была адным з пунктаў абароны, заставай старажытнага Турава ад ворагаў).

Адзіным помнікам аб саветах тураўцаў з’яўляецца найменне в. ***Сямурадцы*** (тады ***Семирадцы***). Мясцовасць, па гістарычных дадзеных, знаходзілалася непадалёку ад Уладыкавых палёў і была цэнтрам старажытнага Турава, яго багацейшай часткай. Тут пад старшынствам *семирадцев*, або суддзей, праходзіла рада старажытных тураўцаў. Ад рады ішла галоўная вуліца да замка, насыпы якога і цяпер знаходзяцца сярод сучаснага Турава. Дарога ад ***Семирадцев*** у Тураў захавалася і лічыцца вучонымі следам галоўнай вуліцы старажытнага Турава [2, с. 116]).

У лесе размяшчаліся буды (*буда* ’прадпрыемства, на якім буднікі выпальвалі драўляны вугаль, выраблялі паташ, гналі дзёгаць, смалу’): вв. ***Буда, Буды, Бячанская Буда, Хлупінская Буда***. Некалькі назваў вёсак уключаюць даволі распаўсюджаную лексему *рудня*, што абазначае ‘дробнае прадпрыемства, на якім раней здабывалі балотную жалезную руду ці плавілі

з яе прымітыўным спосабам жалеза’: вв. ***Вятчынская Рудня***, ***Рудня***. Паселішчы, што ўзнікалі па суседству з былымі *руднямі*, і называліся Рудня. Такія шматлікія назвы сканцэнтраваны на Палессі, багатым залежамі чырвонага , бурага жалезняку і балотных руд. На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна археолагі знайшлі крыцы (глыбы; камякі балотнай жалезнай руды), шлак, рэшткі домніц, жалезныя прылады працы.

Характар спажывецкага промыслу выяўляецца ў айконімах, матываваных лексемай *млын* ‘ пабудова, на якой адбываўся размол збожжа’: вв. ***Млынок***, ***Перароўскі Млынок***. Вадзяныя млыны ўзводзіліся на невялікіх рэчках, паблізу якіх узнікалі паселішчы. Састаўныя найменні арыентуюць на месцазнаходжанне буд, рудняў, млыноў каля вёсак, указаных азначальнымі кампанентамі – адноснымі прыметнікамі. Аб рознага роду дзейнасці палешукоў гаворыць айконім ***Яміцы*** ( у *ямах* захоўвалі ўраджай збожжавых культур, прыпасы ежы, вялілі мяса ці рыбу, выраблялі смалу, дзёгаць, здабывалі гліну, соль, карысныя выкапні, абпальвалі посуд і інш. Ямы служылі для палявання на звяроў, часовага жытла чалавека і для яго вечнага спакою [5, с. 279]).

Асновы айконімаў ***Пагост*** і ***Сялко*** засведчылі старажытныя тыпы пасялення. Старажытнасць лексемы *пагост* на Беларусі пацвярджаецца прастатой структуры, у беларускай тапаніміі ўсе Пагосты не суправаджаюцца азначальнымі кампанентамі. Увогуле *погост* па паходжанні – старажытнае ўсходнеславянскае слова. Першаснае значэнне яго зафіксавана як *погостити* ‘пабыць у гасцях’, ‘наведаць які-небудзь пункт з мэтай збору даніны ці куплі-продажу’. Але з цягам часу ў старарускай мове змест пастаянна мяняўся: ‘стан для князёў, месца прыпынку для гасцей ‘, ‘адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка сельскай абшчыны’, ‘тып пасялення’, затым ‘паселішча з царквой, могілкамі, дамамі і землямі царкоўнай абслугі’, ‘некалькі вёсак, што ўваходзяць у адну акругу’. У стараўкраінскай мове слова ўжывалася ў значэнні ‘сельская абшчына з самакіраваннем’. Беларускія Пагосты ўзнікалі на ўзвышаных месцах, у сутоках рэк, паўтараючы такім чынам схему заснавання старажытных гарадоў, цэнтраў, таму, відаць, значэнне звязана з сельскай абшчынай, яе адміністрацыйным, рэлігійным ці гандлёвым асяродкам [3, с. 259–260].

***Сялко*** –невялікае па памерах паселішча, сёлы ж да рэвалюцыі былі цэнтрамі навакольных вёсак з царквой або адміністрацыйнымі будынкамі.

Беднасць тагачаснага населенага пункта захоўвае назва в. ***Хлупін***, дзе руск.-цслав. *хлупа* азначала ‘бяда, нястача, беднасць, галеча’ [6, с. 22]. Да квалітатыўных, мяркуем, адносіцца і назва в. ***Ацкаванае***, што ўяўляе сабою субстантываваны дзеепрыметнік ад дзеяслова *ацкаваць* (*цкаваць* ‘напускаць сабак на каго-небудзь; нацкоўваць’; перан. ‘не даваць спакою, мучыць нападкамі, праследаваць’[6, с.250]). Населены пункт быў заснаваны перасяленцамі з суседніх вёсак, і, відаць, яны не адразу знайшлі агульную мову з іншымі жыхарамі.

Назва в.***Чэрнічы*** (раней ***Черницы***, ад уст. *чарніца* ‘манахіня’) сведчыць аб духоўнай культуры тагачаснага насельніцтва. Вёска ўзнікла на

манастыршчыне старажытнага Турава-варварынскага дзявочага манастыра. Гэта быў першы жаночы манастыр у Літве, сучасны св. Кірылу і, мяркуецца, ім жа заснаваны [2, с. 116].

У савецкі час ўзніклі п. ***Западны*** (матывуецца кірункам свету), вв. ***Знаменка*** (былая Слепцы, з-за немілагучнасці назва была перайменавана ў 1958г.) і ***Чырвоная Зорка*** як сімвалы савецкай эпохі, ці назвы-мемарыялы.

У айканімічнай лексіцы назіраецца з’ява варыянтнасці, “згодна якой для абазначэння, функцыянавання і дэфініцыі аднаго і таго ж геаграфічнага аб’екта ўжыта некалькі найменняў-варыянтаў” [7, с. 128]. Іх называюць яшчэ ў тапаніміі алонімамі (тэрмін з грэч. мовы абазначае ‘іншае,球рознае імя’). Алонімы з’яўляюцца рознымі мадыфікацыямі аднаго і таго ж аб’екта, яго фанетычнымі, фанетыка-семантычнымі, арфаграфічнымі, акцэнтнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі варыянтамі, што адрозніваюцца паміж сабой асобнымі гукамі, марфемамі, арфаграмамі, сродкамі выражэння граматычных значэнняў. Адзін з такіх варыянтаў замацоўваецца афіцыйна ў якасці асноўнага, нарматыўнага, астатнія ўжываюцца ў мове жыхароў як ненарматыўныя (рэгіянальнае ўжыванне). Апошнія звычайна захоўваюць адметнасці мясцовай гаворкі або першасныя назвы аб’ектаў. У жыткавіцкім айканіміконе названая з’ява таксама мае месца: вв. ***Борк***і – ***Борак*** (тут і далей першай падаецца афіцыйная назва) ; ***Брынёва – Брынёў***; ***Бячанская Буда – Буда***; ***Буды – Буда***; ***Відошын – Відошына***; ***Вязаў Лес – Бераг***; ***Грабава – Грабаў***; ***Дуброва – Дуброва Вятчынская***, ***Дуброва Вечынская***; ***Дзякавічы – Дзяковічы***; ***Знаменка –Слепцы***; ***Іевічы – Ёвічы***, ***Іовічы***; ***Крэмнае – Крэмна***; ***Малешаў – Малы Малешаў***, ***Малішаў***, ***Мелешаў***, ***Мелішаў***, ***Малешава***, ***Малішава***; ***Мілевічы – Старыя Мілевічы***; ***Наваленін – Наваленіна***, ***Новае Леніна***; г. ***Тураў – Туроў***; в. ***Хісцецкі Бор – Хасцецкі Бор***, ***Хрысцецкі Бор***; п. ***Хваенск – Майдан***; вв. ***Чырвоная Зорка – Красная Зорка***; ***Яміцы – Яміца***.

Цікавасць выклікаюць і назвы водных аб’ектаў краю.

Назвы буйных рэк узніклі ў глыбокай старажытнасці і менш за ўсё паддаюцца ўплыву часу, амаль не змяняюцца, а калі і ёсць змены, то яны ў значнай ступені зацямняюць іх першапачатковы змест і семантыку. Таму першасная семантыка большасці вялікіх рэк да гэтага часу не ўстаноўлена і выклікае ў даследчыкаў спрэчкі.

Няма адзінай думкі і наконт назвы самай буйнай ракі рэгіёна ***Прыпяці*** (старая форма ***Припеть***). Прапануюцца наступныя гіпотэзы: ад славянскага *ниспадать*, гэта значыць ‘прырака, прыток’ (Прыпяць – адзін з прытокаў Дняпра); грэч. *potamos* са значэннем ‘пакаты, рака’; усходнебалт. тэрміна са значэннем ‘прыпаўднёвая’, што ў многіх лінгвістаў выклікае сумненне; старажытнаруск. і беларускага тэрміна *припечь* ‘пясчаны бераг ракі, які не зарос кустоўем, тое, што і пляж’. Асобныя (Жалязняк І.М., Рогалеў А.Ф.) бачаць у аснове гідроніма і яго прытока Пціч старажытную частку *пц*, *пьт*, г. зн. “пят”, “пет”, “пят” са значэннем ‘пашырэнне, расцяканне, распаўсюджанне’ і прыстаўку–*пры* або храналагічна ўзводзяць назву да інд.-еўр. перыяду ( **pet* ‘хутка рухацца’). Аднак у вярхоўі рака мела найменні ***Стаход*** (рака ў сто хадоў, параўн. Стадол), ***Струмень***. Тэрмін *струмень*

сведчыць аб дынаміцы ракі, якая цячэ ў забалочанай мясцовасці, струменіцца. Адзначаецца таксама, што і ў тураўскай зоне, лясістай, з дрыгвянымі балотамі, была распаўсюджана менавіта гэтая назва [9, с. 11–12]. Як нам бачыцца, другаснае ўтварэнне ад ін-.еўр. кораня **pet* са значэннем ‘пашырацца’ найбольш дакладна матывуе гідронім Прыпяць (спачатку струменілася па розных рукавах, а затым па цячэнні ўніз пашыралася). Цікава, дарэчы, што ў межах Славіі ў Прыпяці ёсць родзічы па структуры ў цэлым і па асобных элементах: у Чэхіі гара ***Прыпет*** (успомнім старую форму Припеть), у гідраніміі іншых славянскіх зон – рр. ***Гнілап'яць***, ***Гнілап'ятка***, ***Пят***, ***Іпапет***, ***Чарнапет***, ***Яполоть***.

Рака ***Навуць***, левы прыток Скрыпіцы, бярэ пачатак у 3,5 км на паўночны захад ад аднайменнай вёскі. Нам бачыцца ў сэнсе асновы накірунак ракі, цячэнне скіравана да р. Вуць.

Аб дрэннай якасці вады ў рацэ сведчыць гідронім ***Свінавод*** (правы прыток Прыпяці).

Сэнсавае значэнне матывавальнай асновы левага прытока Прыпяці ***Скрыпіца*** і падобных ёй па структуры ў розных мясцовасцях неаднолькавае, найчасцей гэта старая вярба, ніцая вярба, што расце па берагах рэк і “скрыпіць, рыпіць” , на Жыткаўшчыне і *скрыпель* ‘губа’ , ‘грыб на пнях’ [т.5, 50].

Лексема *лука* ‘выгіб, калена , паварот ракі’ (параўн. рус. излучина, бел. злуч, злучына) утварае шырока распаўсюджаныя нават за межамі Беларусі тапонімы, у тым ліку і гідронім ***Случ*** на Гомельшчыне (левы прыток Прыпяці).

У аснове скарочай назвы ракі ***Сцвіга***, правага прытока Прыпяці, (калі поўная форма ***Ставіга***) знаходзіцца, на думку Жучкевіча В.А., тып воднага аб'екта *стаў* ‘сажалка’. Але найменне на сённяшні дзень таксама застаецца гіпатэтычным. Даследчык Рогалеў А.Ф., напрыклад, вылучае аснову фіна-угорскага паходжання са значэннем ‘чорная рака’ [8, с. 184–185].

Балоцістая рэчка ***Яма*** ўпадае ў Князь-возера. У гідронімах лексема *яма* абазначае ‘прыроднае паглыбленне ў зямлі; нізіна’.

Беларуская тапанімія асабліва багата на “каляровыя” назвы, у прыватнасці, “белыя”. Лексікаграфічнымі крыніцамі зафіксаваны 43 ***Белыя*** азёры – з іх адно знаходзіцца ў басейне Прыпяці на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна – , 4 ***Белыя*** рэчкі і шмат структурна ўскладненых ад'ектываў тыпу Бель, Беліца і інш. Утваральная аснова ***белы*** поліфункцыянальная і ў кожнай мясцовасці можа абазначаць розныя прыкметы геаграфічных аб'ектаў. Паходжанне “белых” рэк, азёр, крыніц звычайна тлумачыцца белым колерам вады ў вадаёмах, набытым ад берагавых мелавых адкладаў, якаснымі паказчыкамі вады (светлая, празрыстая) у вадаёмах з пясчаным дном у адрозненне ад чорных вадаёмаў на тарфяніках. Аднак прыродныя характарыстыкі могуць быць і іншымі: дно топкае, тваністае; берагі балоцістыя, на якіх расце беразняк, белы мох і іншая расліннасць, мець сімвалічнае значэнне, асабліва ў крыніцах (вада ў вадаёме “свяшчэнная, святая”) [3, с. 13–14].

Жыткавіцкі край багаты на легенды. Так, Князь-возера мае варыянтныя найменні Жыд, Чырвонае (Чэрвонае).

Згодна з легендай, Алялькевіч, адзін з князёў Слуцкіх, узненавідзеў брата і затачыў яго ў пабудаваным на возеры замку. Замак ад вады разрушыўся, і князь загінуў, а водны аб’ект сталі называць ***Князь-возера***.

Назва ***Жыд*** мае дзве версіі. Па адной з іх, у возеры вадзілася шмат кашэрнай рыбы, якую ўжываюць у страву яўрэі: шчукі, акуні, яршы. Другая распавядае аб замку на возеры, у якім жыла фаварытка аднаго з Радзівілаў, яўрэйка па нацыянальнасці, і якая загінула, як і князь [2, с. 105–106].

Наступнае паданне падкрэслівае наяўнасць у возеры вялікай колькасці чырвонай рыбы, адсюль і ***Чырвонае*** (***Чэрвонае***).

Легенды легендамі, але і па сённяшні дзень існуючыя на вялікай прасторы возера сваі сведчаць аб наяўнасці ў старажытнасці сапраўды якіхсьці пабудоў.

Як бачна нават з прыведзенага фактычнага матэрыялу, Жыткаўшчына – гістарычна надзвычай багаты край. Ніводная геаграфічная назва не ўзнікла выпадкова, сама па сабе. Акрамя адраснай функцыі ў найменнях захоўваецца яшчэ і пазнавальны патэнцыял. Гэта своеасаблівыя каштоўныя скарбонкі слоўнага багацця папярэдніх эпох. Тапонімы Жыткавіцкага раёна распавядаюць аб мінулым і сучасным жыцці насельніцтва, яго занятках, духоўнай і моўнай спадчыне, старонках геаграфіі і гісторыі краю. У складаных умовах пражывання асноўным заняткам людзей было земляробства, рыбалка, бортніцтва, сплаў лесу.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гомел. вобл.: нармат. давед. / Н. А. Багамольнікава [і інш.]; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2006. – 382 с.

2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жыткавіцкага р-на / Рэд.–укл. В. Ф. Феранц; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: Ураджай, 1994. – 767 с.

3. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск: Литература и Искусство, 2008.– 416 с.

4. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск: Изд. БГУ, 1974. – 448 с.

5. Казлова, Р.М. Айканімія Беларускага Палесся. Генезіс назваў: манаграфія. Вып. 1 / Р.М. Казлова; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 320 с.

6.Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / гал. рэдакцыя БелСЭ; пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча (К. Крапівы). Т. 5, кн.1: С – У [рэд. М.Р. Суднік]. – Мінск: гал. рэд. БелСЭ імя П. Броўкі, 1983. – 663 с.

7. Багамольнікава, Н.А. Тапанімія Гомельшчыны: структурна-семантычная характарыстыка : манаграфія / Н.А. Багамольнікава; навук. рэд. А.А. Станкевіч; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2008. – 242 с.

8. Рогалеў, А.Ф. Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А.Ф. Рогалеў. – Гомель: Барк, 2008. – 216 с.

9. Багамольнікава, Н. А. Гідронімы басейна ракі Прыпяць: структурна-семантычныя тыпы матывацыі [Тэкст ] / Н. А. Багамольнікава. – Гомель: ГДУ, 2004. – 195 с.

10. Тураўскі слоўнік у 5 т. / АН БССР, Ін-т Мовазнаўства імя Я. Коласа. Т.5: С – Я / [склад. А. А. Крывіцкі, Г. А. Цыхун, І. Я. Яшкін і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987 – 423 с.

***Воінава А. М., Палуян А. М.* Лексіка вясельнага абраду ў гаворках Жыткавіцкага раёна**

У наш час, у эпоху глабалізацыі і інтэграцыі, усе больш актуальнай становіцца праблема захавання індывідуальнасці асобных народаў – у першую чаргу праблема захавання нацыянальных моў і культуры. У сувязі з гэтым павышаецца цікавасць даследчыкаў да вывучэння традыцыйнай культуры, абраднасці, у тым ліку і праз вывучэнне гаворак беларускай мовы, лексічная сістэма якіх адлюстроўвае і сам абрад, і склад удзельнікаў таго ці іншага абрадавага дзеяння, а таксама захоўвае найменні сакральных прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў традыцыйнай абраднасці.

Гістарычна абрад выступае як адна з самых спецыфічных этнічных характарыстык. Ён фіксуе заведзены парадак жыцця ў выглядзе ўстойлівых моўных, дзейсных, прадметных кодаў. Пры гэтым кожны абрад можа быць прадстаўлены як пэўны тэкст, як пэўная паслядоўнасць дзеянняў, рытуальных маніпуляцый з прадметамі-сімваламі.

У сямейна-абрадавай лексіцы найбольш колькаснай з'яўляецца лексіка вясельнага абраду як аднаго з самых важных комплексаў сямейнай абраднасці. Даследчыкі этнаграфіі параўноўваюць усходнеславянскае вяселле нават не са спектаклем з вялікай колькасцю дзеючых асоб, а з "вясельнай містэрыяй", з шэрагам містычных дзеянняў, аб'яднаных у адно цэлае. "У вясельнай містэрыі пануе хор, прынцып двух хароў, якім адпавядаюць два роды – род жаніха і род нявесты. Гэта спаборніцтва двух родаў складае старажытны, яшчэ паганскі экзагамны пласт вясельнага абраду", – сцвярджае вядомы этнограф Дз. К. Зяленін [1]. У фальклоры беларусаў захаваліся паслядоўныя, са шматлікімі складнікамі вясельныя цырымоніі, а ў слоўніку ўтрымліваецца вялікая колькасць адпаведных абрадавых лексем. Вясельная лексіка беларускіх народных гаворак уяўляе сабой непаўторную моўную спадчыну, якая прыйшла да нас ад старажытнасці і перадае нам духоўныя памкненні і маральныя скарбы продкаў.

У складзе вясельнай лексікі можна вылучыць наступныя тэматычныя групы:

1. <u>Найменні вясельнага абраду і яго складовых частак</u>: ***вяселле, веселье***: *Родня наша ўжэ говорыла про веселье* [2, с. 244]; *Вяселле начынаецца ў суботу.* Дуброва; ***свадзьба:*** *Увечары пачыналі гуляць свадзьбу* [2, с. 244]; *У гэты дзень дагаварваліся пра дзень свадзьбы.* Кольна.

Вясельны абрад пачынаецца са ***сватаў, сватання, заручын***: *Перш чым ажаніцца, хлопец знаходзіў сабе нявесту. І тут ужэ начынаецца сватанне.* Вароніна; *Першым было сватанне (заручыны) – ішлі сватацца ў любы дзень тыдня.* Запясочча; *У сваты звычайна хадзілі ў нядзелю ці ў святы.* Рычоў; *У сватах людзей не сабіраюць, толькі бацькі дзяўчыны і хлопца.* Буразь.

Падчас сватання асаблівая ўвага надавалася ахоўным мерам, накіраваным на папярэджанне суроку: выбіраўся вячэрні час, вялася завуаліраваная гаворка, абавязкова прысутнічаў момант куплі-продажу: *У сваты да дзеўкі хадзілі позна вечарам… Калі згоду дадуць, то ідуць ужо*

*днём, і людзей з імі тады больш.* Кольна; *Напярэдадні сватоў звычайна пілі свечаную ваду. Перад ад'ездам у сваты сватоў благаслаўлялі, жадалі поспехаў. Сваты ў маладой звычайна адразу ў хату не заходзілі, а выдавалі сябе за купцоў і гаварылі: "Наш купец – ваш тавар".* Рычоў; *У сваты ішлі вечарам, каб меней людзей бачыла, а то людскія вочы бываюць ліхія. Бацька, зайшоўшы ў хату, пытаўся: "Ці прадаеце вы цялушкуў Нам людзі казалі, што ў вас ёсць на продаж. Мы будзем купляць". Бацька дзяўчыны адказвае, што ёсць, купляйце, калі згаворымся ў цане: "Мая цялушка не цельная, не дойная, я за яе хачу вялікі выкуп". Бацька хлопца: "Ну, колькі загадаеце, столькі дадзім".* Буразь.

Калі бацькі і іх дачка згаджаліся на шлюб, то адбываліся ***запоіны, заручыны***. У адных вёсках гэта былі два асобныя абрады (спачатку запоіны, а пасля заручыны): *Першым было сватанне (заручыны) – ішлі сватацца ў любы дзень тыдня. Дагаварываліся пра пасаг маладой. Калі згаджаліся, то на стол ставілі бутылку гарэлкі, а праз тыдзень – ужо яе пілі і гэта былі запоіны.* Запясочча; *Іх* [заручын] *задача – заручыцца згодай радні жаніха і радні нявесты на шлюб. Тут ужэ канкрэтна замацоўваюць згоду, дагаворваюцца пра ўсі падробнасці вяселля.* Вароніна; *А ўжэ ў ту суботу ўвечар у ее запоіны. Запівалі дзеўку. Людзей не багато було, роднейшые которые.* Крэмнае; *На заручыны прыглашалі больш людзей, чым на запоіны. Усе яны былі сведкамі згоды з двух бакоў. Маладыя абменьваліся кольцамі. После заручын ні аб якіх адмаўленнях нашчот шлюбу не магло і быць. Заручыны спраўлялі ў суботу.* Вароніна; у іншых – адзін: *А дале булі запоіны (ці хто заве заручыны). На запоінах договорваліса колі робіць вяселле. Пілі, гулялі.* Запясочча; *После запоін дзяўчына шчыталася засватанай, запітай.* Вароніна; *Калі бацькі дзеўкі давалі згоду сватам, то потым ужо праводзілі заручыны, або запоіны. На заручыны звалі бліжнюю радню. Ужо на запоінах маладая давала радне маладога падарункі. У гэты дзень дагаварваліся пра дзень свадзьбы.* Кольна.

На Жыткаўшчыне вядомы перадвясельны абрад ***"прымярэнне сарочак"***, звязаны выключна з жаніхом і яго роднымі: *После запоін ішлі к маладому мераць сарочкі. Бралі хросну мацер і хроснага бацькі жонку і ехалі. Мералі маладога, абмяралі дзверы, окны, мералі, сколько рушнікоў трэба павесіць у хаце.* Пагост; *На першую брачную ноч абавязкова шылі новае бяллё для маладых. Гэта перадвясельны абрад. Маладыя пасля запоін ішлі мераць сарочкі, бралі хроснага бацьку і маці, якія абмервалі маладога. Таксама абмервалі і для свякрові сарочкі. Яшчэ абмервалі дзверы, вокны. Для маладога шылі ўсё: і бяллё, і штаны, і сарочкі. На першую брачную ноч малады павінен адзець усё новае бяллё. Шылі сарочкі з палатна. Гэта быў перадвясельны абрад, які тычыўся толькі маладога.* Старажоўцы.

Перад вяселлем дзяўчаты абавязкова праводзілі ***дзявочы вечар, зборную суботу***: *У зборную суботу збіралі кветкі для вянка, плялі яго. Таксама ў гэты дзень плялі касу нявесце.* Рычоў; *Перад вяселлем у суботу вечарам у маладой сабіраліся яе падружкі на дзявочы вечар. Гэта было прашчанне нявесты з сваім дзявоцтвам, з падружкамі.* Вароніна; *Зборная*

*суботанька настае, / Зялёна рутонька на столе, / Дзевочка дружыну збірае* Любавічы.

У суботу перад вяселлем адбываецца абрад выпечкі караваю – ***саджаюць каравай, каравай пякуць***: *Да суседачкі мілыя,/ Да прыходзьце ка мне,/ Да к маему дзіцяці,/ Каравай саджаці.* Жыткавічы; *У п'ятніцу строяцца кажнэ к своёй беседзі. Вараць, пякуць. П'ятніца-почынальніца, казалі. А субота ето ўжэ каравайніца. Коровай пякуць.* Крэмнае.

Пасля выпечкі каравай упрыгожваюць – ***украшаюць, радзяць, сад робяць***: *Коровай украшаецца вылепкамі з цеста і зробленымі з бумагі цветамі.* Малешаў; *Да ўжэ радзяць коровая, сад роб'яць. Розкі нарадзяць лентамі, бумагою крашэнаю. Шышэчкі з бумагі крашэнае воўязваюць, до розок ніткамі прывязваюць. Да растрыкаюць тры розкі по боках у коровай. Лентою красною обоўяжуць іх разом. Которые, то дну розку ў цэнтры, то ета з тройма ролцамі, а дзве по боках, то етые з двойма. І лентою одноею обоўязвалі. А як жэ! Баранкі на красну горпінку, да кругом коровая обоўяжуць.* Крэмнае.

Непасрэдна вяселле звычайна пачыналася ў нядзелю. Адным з важных момантаў вясельнага абраду быў ***пасад****: Пасад – гэта благаславенне жэніха і нявесты на шлюб, пажэланні ім шчаслівага жыцця. Хросная маці бярэ нявесту за руку, абводзіць яе вакруг дзяжы 3 разы і садзіць на дзяжу… На дзяжу сажалі толькі тых маладых, якія былі яшчэ дзяўчынамі. Перад вяселлем дзеўкі прызнаваліся ва ўсём. У адваротным выпадку пасад мог бы наклікаць на будучую сям'ю бяду.*

*У доме маладога адбываецца пачці што тое ж самае. Малады кланяецца ўсім, хто прысутнічае на этым абрадзе. Патом яго сажалі на дзяжу і падстрыгалі. Бацькі благаслаўлялі яго.* Вароніна.

Затым жаніх з раднёй едзе да нявесты–***поезд***: *Пасля малады са сваёй раднёй едуць да маладой. Бярэ маршалак раджаны каравай і выносіць з хаты. Едуць коньмі ці машынай, а калі блізка ў сяле, то пешшу. Гэта ўжо называюць поезд едзе да маладой.* Бураззь.

А нявесту так проста не аддаюць, яе трэба выкупіць – адбываецца ***выкуп, торг, таргі***: *Ставілі стол і малады павінен даць выкуп за нявесту, а дзеўку тым часам хавалі. Пасля выкупа заходзіў малады ў хату.* Рычоў; *Дружкі маладой паставілі стол і не пускаюць маладога да маладой у хату, ідуць таргі.* Бураззь; *Выкуп праводзяць у дзверах, паставіўшы ў дзверах стол, дружка з другом таргуюца. Дружка доўжна ўзяць ек больш грошэй і ўсего, шо ў іх е. Прыдумваецца багато разных прычын, шоб выцягнуць грошы.* Малешаў.

Узаконьванне шлюбу называлася ***рэгістрацыя***: *Потом, колі ўжэ выкупілі молодых і госці едуць у сельсавет на рэгістрацыю і сразу ў цэркву на венчанне.* Малешаў. ***Вянчанне, венчанне, вянец*** праводзілася раней абавязкова, зараз – па жаданні*: А ў нядзелю ідуць ці едуць к вянцу. Кончылоса венчанне, молода цягне рушнік до дзьвярэй, каб дзеўкі ішлі замуж, не заседжваліся доўга.* Запясочча.

Адным з самых цікавых з’яўляецца ***абрад дзялення каравая*** і звязаны з ім ***перапой***: *Недзе ў сярэдзіне вяселля дзялілі каравай. Каравай заўсёды дзяліў сват.* Кольна; *Каравай прыносяць у хату, у гэты момант іграе музыка. У хаце маладой каравай дзяліўся паміж яе раднёй, а ў маладога – паміж яго. У гэты момант адбываўся перапой: сват разрэзваў каравай на кускі і запрашаў гасцей на каравай. Гэта перапой.* Вароніна.

Вядомы ў Жыткавіцкім раёне абрад **пярэзвы, пярэзаў**. Ён праводзіцца на другі дзень вяселля, у панядзелак: *Бацькі за дачкою да жаніха не ехалі, а іх прыходзілі запрашаць у панядзелак ісці да сватоў к сваёй дочцы. Вось гэтая бяседа у панядзелак і называлася пярэзвы.* Вароніна; *Расходзяцца ў нядзелю вясельныя. У панядзелак пасылаюць жонку ад молодой будзіць маладых. Саджаюць яе за стол, частуюць, потым ідзе воно домоў. А от молодого ідуць маршалкі к родным молодой, нясуць пірога і бутылку. Сажаюць іх за стол, абвязваюць рушнікамі. Ідуць к молодому маршалкі. Ім таксамо даюць пірога, бутылку. Молоды ідзе зваць радзіну молодой. Гето пярэзвы называюцца.* Запясочча; *У панядзелак радню маладэе прыглашаюць у пярэзаў.* Жыткавічы.

Але ў некаторых вёсках – праз тыдзень, і тады носіць назву як **пярэзвы**, так і **пірагі**: *Пасля таго, як пройдзе тыдзень пасля вяселля, госці маладога (яго родныя) ехалі да маладой, а яе госці – да маладога. Гэта называлася пярэзвы.* Кольна; *Праз нядзелю госці збіраюцца зноў – на пярэзвы, каб праведаць маладых.* Дуброва; *Яго спраўлялі цераз нядзелю пасля вяселля. Первую нядзелю ішлі да мацеры маладое, а цераз тыдзень ішлі ўжэ к маладому. Але самыя глаўныя пірагі былі ў мацеры маладое, таму што зяць ехаў у госці. Калі дачка чэсная, значыць зяць купляе падарка харошага цешчы, а як не, то прывозіў хамута. Патом абменьваліся пірагамі: зяцева маці вязе свахі свае пірагі, а гэтая цешча пяке свае пірагі. На пірагі звалі сугубо родзічаў.* Пагост; *На другую нядзелю пасля вяселля робяць “пірагі”. Маладая едзе да маці. Рыхтаваўся стол. Там елі, пілі, спявалі песні (невясельныя). Затым маладая зноў ехала да маладога.* Рычоў.

2. <u>Найменні ўдзельнікаў вясельнага абрада</u>. Зафіксаваныя лексемы з’яўляюцца як агульнаўжывальнымі, так і характэрнымі менавіта для дадзенага рэгіёна. Самыя часта выкарыстоўваемыя лексемы ў вясельным абрадзе – ***маладыя, маладая, малада, молоды, молодое, нявеста, жаніх***: *У молодое ў косе лента* [2, с. 244]; *Молоды под руку молоду да ў цэркоў* [2, с. 245]. *Молодая дае кожному подарок. Бацькоў молодого падпаразаюць ручнікамі. Брат маладое падводзіў маладу да маладога.* Пухавічы; *Нявеста кідае цукеркі*. Дуброва; *Зайца павінен выкрасці жаніх.* Рычоў.

Пры падрыхтоўцы да вяселля значная роля адводзілася жанчынам, якія выпякалі каравай – *коровайніцам, коровайным: Ек не ўдова, то хросна маці за старшу коровайніцу... То ўжэ за столы саджаюць коровайных. После песню коровайну заспеваюць коровайніцы.* Крэмнае.

***Сват і сваха*** з’яўляюцца абавязковымі і ўплывовымі ўдзельнікамі вяселля ад сватання да святкавання шлюбу: *Галоўнай асобай у сватанні быў старшы сват.* Вароніна;

На вяселлі ганаровымі гасцямі, безумоўна, станавіліся ***сваты, бацькі, маці хросная, хросны бацька, хросныя***: *Каравай пеклі некалькі замужніх жанчын. Самая глаўная – маці хросная.* Пухавічы; *"Благаславі, оцец, маці каравай падымаці!"... Першых вызываюць бацькоў маладых, потым хроснага бацьку і ўсю радню.* Жыткавічы;

Аднак не менш значную ролю выконвалі ***дружкі***: *Каравай дзеліць дружок (з радні маладога).* Пухавічы; *Дружкі нявесты ідуць устрачаць дружкоў маладога. Кожная дружка чапляе цвяткі.* Жыткавічы.

На тэрыторыі Жыткавіцкага раёна часта сустракаюцца лексемы ***маршалак, маршал***: *З кладоўкі каравай выносіў старшы маршалак.* Кольна; *Калі маршалкі апраналі маладую, маршалы са стараны жаніха насміхаліся над імі.* Рычоў.

На Жыткаўшчыне вядомы і такія ўдзельнікі вяселля, як ***пастух***: *Запрашаюць "пастуха", надзяюць торбу, кладуць туды 2-3 пірагі. Ён вядзе свадзьбу.* Жыткавічы; ***зывальнікі***: *У суботу ішлі зывальнікі. Пара: мужык і жонка. От молодого звалі родню молодога, а от молодой – родню молодой. Потым пара молодой ідуць к молодому, а молодого к молодой і кажуць: "На хлеб, на соль, просім на вяселле".* Запясочча; ***паляўнічы***: *Паляўнічы са стрэльбай падводзіць два разы падстаўных нявест. Паляўнічы хваліць падстаўную маладую. Госці яе не прымаюць, даюць паляўнічаму чарку гарэлкі і просяць найці ім іхнюю нявесту.* Малішаў; ***пасцельніцы, кубельнік***: *Звязваюць у кухар пасцель. Выбіраюць пяць пасцельніц. Дружкі купляюць у "кубельніка"* пасцель. Жыткавічы; ***свяцёлка, мічалка***: *У маладога свяцёлка (дзяўчына, якая дзержыць свечку).* Буразь; *Мічалка – гэта дзеўка з рукі маладога, якая на вянцы дзяржыць свечкі.* Запясочча; ***прыданыя*** (радня маладой): *Прыданыя павінны сарваць гэтага дзеда і адвезці на печ гаспадыні вяселля.* Дзякавічы; ***вясельныя***: *Расходзяцца ў нядзелю вясельныя.* Запясочча; ***завіца***: *Увaходзяць у хату гаспадыня з гаспадаром і раяцца паміж сабой, што патрэбна ўжо ісці зваць на пярэзвы і будзіць маладых патрэбна, а няма ні хроснай, ні завіцы (завіца – сястра гаспадара). Прыходзіць завіца і раяцца, што патрэбна ісці зваць на пярэзвы.* Вароніна.

Абавязковымі асобамі на вяселлі ў Жыткавіцкім раёне былі ***падстаўныя жаніх і нявеста***: *На першы дзень вяселля робяць двух падстаўных. Жанчыну малога росту апранаюць у адзенне жаніха, а мужчыну высокага ў адзенне нявесты. У той момант, калі маладыя падыходзілі да хаты жаніха, іх сустракалі падстаўныя жаніх і нявеста. Яны з маладымі жартавалі, маладому падстаўлялі яго падстаўную нявесту, а нявесце падстаўнога жаніха.* Дзякавічы.

3. Найменні прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў вясельным абрадзе. Гэтыя прадметы выступаюць як своеасаблівы код, які мае самыя разнастайныя функцыі. Самы значны прадмет у вясельным абрадзе – ***каравай***, у якім пераплятаюцца мужчынскі і жаночы пачатак і які з'яўляецца сімвалам шчаслівага лёсу: *Калі каравай удаваўса, то лічылі, што гэта на шчасце. Было многа радасці, калі каравай намнога вырастаў. Каравай – гэта хлеб. А хлеб – гэта сімвал шчасця, дабрабыту, сімвал жызні. Прысутнасць*

*каравая на вяселлі азначала пажаланне шчасця і дабрабыту маладой сям'і.* Вароніна.

З хлебам, пірагамі звязана роля маладых у будучай сям'і: *Колі вертаюцца з венчання, то едуць сразу до невесты, дома жду маці і бацько. Перэд порогом маці і бацько дзержаць пірог, маладые доўжны ўкусіць еты пірог, так узнаюць, хто будзе больш командоваць у хаці.* Малешаў.

Абавязковымі прадметамі вясельнага абраду, з дапамогай якіх зычылі маладым шчасце, багацце, добрую долю, былі ***зерне, жыта, хлеб-соль, канфеты, мёд, сыр***: *Маці абходзіла вясельны картэж тры разы, абсыпаючы ўсіх зернем. Пасля вянчання бацькі сустракаюць маладых хлебам-соллю..* Пухавічы; *Калі пад'яжджаюць да маладога, маладая сыпле ў бакі канфеты. Маці выносіць хлеб з мёдам і сырам. Калі ідуць цераз парог, маладая сыпле жыта па хаце і кладзе хлеб.* Дуброва;

Фукцыю згоды, яднання выконваюць такія прадметы, як ***ручнік, рушнік***: *Маладая выносіць маладому рушнік з хлебам і солью. Дуброва; Звязвалі маладых ручніком.* Рычоў; *Маладая перавязвае рушнікамі ўсіх родзічаў маладога, якія прыйшлі на запоіны.* Бураззь; ***жыта, палатно, пояс***: *Калі сваты ўжо збіраюцца ісці дамоў, дзяўчына дае свайму хлопцу ў падарак бутылку, поўную жыта. Яна завёртвае яго ў кусок палатна і завязвае поясам сваёй работы.* Вароніна.

***Рушнік, пояс*** выступалі ў якасці абярэга: *Потом усё, шо сопровождало молодых у час веселля, маці згортвала ў рушнік і перэвязвало красным поясам – оберэгом. Колі веселле заканчвалос, то ўсё гета хавала ў скрыню, робілос етэ для шчаслівого семейного жыцця.* Малешаў.

Функцыю ачышчэння, абярэгу выконваў ***агонь***: *Перад тым як ехаць, перад первым возам запальвалі вязку саломы. Коні далжны былі пераскочыць чэраз агонь. Эту рабілася для таго, штоб сваркі і калатня асталіса пазадзі.* Вароніна.

Абрадавае значэнне мела і лексема ***стол***, якая выкарыстоўвалася як сімвал згоды, злучэння: сесці за стол 'пагадзіцца'. Паказальна тое, што абрад застолля завяршае кожны этап вясельнага абраду: сватаўство, заручыны, вянчанне, вяселле: *Сват даставаў з-за пазухі хлеб і бутылку гарэлкі і ставіў іх на стале. После гэтага маці дзяўчыны ставіла на стол закуску і сваю бутылку гарэлкі.* Вароніна; *Пасля таргоў заходзяць у хату і сваты запрашаюць садзіцца за сталы.* Бураззь; *Стаяць сталы накрытыя абрусамі, відаць, што тут было вяселле.* Вароніна.

Аднак неабходна адзначыць, што стол адначасова выступае і сімвалам мяжы: сталом перагароджваюць дарогу да нявесты: *Прыйшлі к дзеўцы. Выносяць і становяць стол у варотах. Сустракаюць маладога з яго раднёю. Выпілі, патаргаваліса, пусцілі ў двор.* Жыткавічы.

Абрадавую семантыку 'мяжа' атрымліваюць лексічныя адзінкі, якія ў працэсе рытуалу набываюць функцыю перашкоды, напрыклад, ***парог***: *Малады должэн быў перанесці маладу цераз парог, бо парог – мяжа паміж смерцю і жыццём.* Пухавічы.

Сімвалічнае значэнне ‘нязгода’ меў ***гарохавы вянок****: Тады падружкі дзеўкі надзявалі на хлопца гарохавы венок.* Пухавічы.

Абавязковымі прадметамі на вяселлі былі ***платок, платочак*** (каб не браць грошы голай рукой): *Маладой даюць платка, каб лажыць тое, што дараць. У свата талерка, абвязаная платком.* Жыткавічы; *Малады бярэ молодую платочком за руку, а іх вядзе маршалак, таксама платочкам вакол стала на покуцці.* Буразь; ***свечка***: *У час вянчання таксама глядзяць, штоб у час не патухла свечка ў маладога ці ў маладой, то той раньшэ ўмрэ. І, наогул, глядзяць як гараць свечкі.* Вароніна. Дарэчы, на Жыткаўшчыне вядомы абрад **“зразання свечак”**: *Тады бацька маладой бярэ хлеб і зразае верх, робіць 2 дырочкі, у якія ўсоджваюць свечкі. Свечкі ўпрыгожваюць кветкамі. Потым свечкі абгортваюць ручніком ці матэрыяй і падаюць запаленыя свечкі сваццёлцы, якая іх дзержыць усё вяселле. З гэтымі свечкамі ехалі да вянца, калі хто вянчаўся. Гэтыя свечкі бераглі ўсё жыццё. Іх свяцілі ў царкве на Стрэчанне і запальвалі, калі грымела і бліскала, каб гром не ўдарыў у хату. Пасля зразання свечак падводзілі маладую да жаніха.* Буразь.

Сімвалічнае значэнне мелі такія прадметы, як ***дзяжа****: Калі маладая, калі пераступае да наступае на дзежку – яна чэсная, калі абойдзе – грэшная. У такі момант ставілі тую дзежку, што замешвалі хлеб.* Рычоў; ***красны каснік***: *Красны каснік на бутылцы – гэта сімвал таго, што зберагла маладая сваю дзявочасць. А калі маладая не зберагла сваёй дзявочасці, то склалі б хамут на шыю свасі (маці нявесты).* Вароніна.

Сімвалам багатага жыцця выступалі ***кажух, падушка***: *Пасля выкупа маладых саджаюць на кажух.* Буразь; *Маладыя ідуць да дзвярэй. Іх сустракае маці маладога ў кажусе, вывернутым шэрсцю ўверх.* Жыткавічы; *На воз, на каторым маладыя паедуць дадому, клалі падушкі.* Вароніна.

5. <u>Найменні элементаў касцюма маладой</u>: ***белэе плацце***: *Дзеўкі адзеваюць невесту ў белэе плацце.* Малешаў; ***фата:*** *А фату на голову доўжна адзець толькі дружка молодой.* Малешаў; ***вянок***: *Венка молодой робілі. Скруцяць дроціну. З бумагі і ўсякого цвету, шышкі зробяць да на яе чэпляюць. Ленты чырвоные, вішнёвые, голубовые.* Крэмнае; *Дзяўчаты вілі вянкі, а галоўнае – вянок для маладой. Вянкі сімвалізавалі дзявочую чыстату, маладосць.* Вароніна; ***лента*** (сімвалізуе шлях: дзяўчына пераходзіць у іншы статус)**,** ***цвяты***: Венок *на ее голове з цветамі да лентамі, богато лентоў. У косу одзін коснік уплеталі, на обручэ коснікі доўгіе ўсякого колеру – чырвоные, вішнёвуе. У молодое ў косе лента.* Тураў; ***пояс***: *Тут маладой завязваюць красны пояс, каб не наговорылі і даюць свечану соль.* Малешаў; ***хустка, головушка***: *Даўно колісь венка не було. Хустку заўязвалі – два рогі на шыі і два – на лоб, гузом.* Тураў; *Хустка веліка назад заўязана, церноўка колеру ўсякого, только не чорного, поверх вянок. А даўно колісь головушка на голове обруч з берэсніцы наметкаю об’ўязаны.* Тураў; ***фартух, хвартух***: *Сразу ж после падзелу каравая маці жэніха падходзіць да молодох, знімала з невесты фату і завязвае ёй хустку і фартух – сімвол жаночай долі. Фату хавала і не давала нікому мераць.* Малешаў; *Хвартух к плаццю красны, вішнёвы, зялёны, сіні, екі буў з паскамі.* Тураў; ***кохта, сподніца***: *На ёй кохта*

*з рукавамі, назад зашпільваецца. Сперэду шытые брыжкі, сподніца з паскамі краснымі, усякімі. Сподніца колерыста, вішнёва ці голубова, ці зелёна, ці ека там. З сукна, бывало, да важка.* Тураў; ***боцінкі, чэрэвікі:*** *На ногах боцінкі з вусокімі каблукамі ці чэрэвікамі з халяўкамі на шнурках.* Тураў.

Народныя святы і абрады з'яўляюцца праяўленнем традыцыйнай культуры беларусаў, таму ў генетычных адносінах амаль уся лексіка належыць да агульнаславянскага лексічнага фонду. Гэта такія лексемы, як *вяселле, сватанне, каравай, вянок, заручыны, маладыя* і інш. [5]. Большасць найменняў, звязаных з даследуемай тэматыкай, з'яўляюцца матываванымі. Матываванасць слова – гэта суаднесенасць вытворнага слова з тым, ад якога яно ўтворана, пры якой сэнс і структура першага слова могуць быць растлумачаны шляхам звароту да сэнсу слова, ад якога ўтворана. Словы з матываваным лексічным значэннем, маюць "унутраную" форму.Унутраная форма слова – семантычная і структурная суаднесенасць складаючых слова марфем з іншымі марфемамі дадзенай мовы; прыкмета, пакладзеная ў аснову намінацыі пры ўтварэнні новага лексічнага значэння слова [3, с. 248]. Даследчыкі па фармальным крытэрыі вылучаюць фанетычную, марфалагічную, семантычную і марфолага-семантычную разнавіднасці матываванасці. Фанетычная матываванасць рэалізуе выяўленчыя або ацэначныя патэнцыі таго, хто абазначае прадмет ці з'яву. Астатнія віды матываванасці зводзяцца  да асноўнага – семантычнай матываванасці, якая можа быць ці не можа быць выражана марфалагічна [5, с.24].

У аснове канцэпцыі матываванасці моўнага знака ляжыць ўяўленне пра безумоўны прыярытэт свядомага над бессвядомым ў маўленчай і моватворчай дзейнасці. У.У. Лявіцкі адзначае, што матываванае слова аказваецца больш жыццяздольным, чым нематываванае. Слова, матываванае фанетычна і семантычна, з'яўляецца больш устойлівым, чым слова, матываванае толькі адным са спосабаў. Пры гэтым, пры суадносінах нематываванага і нематываванага слова другое часта выцясняе першае [4, с.24].

Самым пашыраным тыпам матывацыі найменняў, звязаных з вясельнымі назвамі, з'яўляецца намінацыя паводле працэсуальнай прыкметы. Лексічным матыватарам такіх найменняў з'яўляюцца назвы разнастайнага дзеяння. Вялікая колькасць зафіксаваных з'яўляюцца суфіксальнымі ўтварэннямі

ад **дзеясловаў** для абазначэння працэсуальнай прыкметы: *сватанне, перапой, заручыны, выкуп, торг,  пасад, запоіны, пярэзвы;*

**назоўнікаў**. Апісваемыя намінатыўныя адзінкі ўтвараліся пераважна суфіксальным спосабам ад асновы назоўніка: *пасцельніца, головушка, каравайніца, кубельнік, маршалак.*

Амаль не сустракаюцца сярод вясельнай лексікі назвы, утвораныя шляхам асноваскладання і складанасуфіксальным спосабам:  *маладажоны.* Некаторыя найменні з'яўляюцца субстантываванымі назвамі: *хросны, малады, маладая, паляўнічы, вяселеныя, прыданыя.*

Зафіксаваны на тэрыторыі Гомельскага рэгёна і складаныя назвы:

прыметнік + назоўнік: *дзявочы вечар, белэе плацце, гороховы вянок, зборная субота;*

назоўнік + назоўнік: *злучэнне маладых, зразанне свечак; прымярэнне сарочак;*

дзеяслоў + назоўнік: *дзяліць каравай, расплесці касу, саджаць каравай, выкупіць нявесту, сад рабіць (украшаць).*

Сярод абрадавай вясельнай лексікі сустракаюцца адзінкавыя запазычанні з розных моў: з нямецкай: *маршал, фартух*; лацінскай: *рэгістрацыя*; стараславянскай*: жаніх, нявеста* [5].

Такім чынам, абрадавая лексіка сямейных абрадавых тэкстаў, якая да сённяшняга часу шырока функцыянуе на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, з'яўляецца крыніцай інфармацыі аб народнай культуры і вызначаецца багатай і складанай сістэмай лексічнай сродкаў, варыянтнасцю і разнастайнасцю сродкаў з іх семантычнымі і граматычнымі асаблівсцямі, з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай культуры беларусаў, у якой захаваны старажытныя моўныя з'явы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Зеленин, Д.К. Восточнославянская этнография / Д.К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. –511 с.

2. Вяселле на Гомельшчыне. Фальклорна-этнаграфічны зборнік / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца і рэдагаванне І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.

3. Термины и понятия лингвистики: Лексика. Лексикология. Фразеология. Лексикография: Словарь-справочник – Назрань: ООО «Пилигрим». Т.В. Жеребило. 2011

4. Левицкий, В. В. Виды мотивированности слова, их взаимодействие и роль в лексико-семантических изменениях // Материалы семинара по проблеме мотивированности языкового знака. – Л., 1969. С.24

5. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: В 4-х т.: пер. с нем. и доп. О.Н. Трубачёва [Текст] / под ред. и с предисл. Б.А. Ларина / М. Фасмер – М.: Прогресс, 1986-1987

## ***Бобрык У.А.*** **Прозвішчы Жыткавіцкага раёна адапелятыўнага паходжання**

Лексічны склад беларускіх прозвішчаў надзвычай багаты і разнастайны. Паходжанне многіх беларускіх прозвішчаў матываванае. Аналіз семантыкі і структуры прозвішчаў – цікавая, каштоўная і цяжкая справа, што прызнаецца многімі антрапанімістамі.

Прозвішчы адапелятыўнага паходжання ў беларускай мове складаюць прыкладна каля паловы ўсіх прозвішчаў. Вядомы антрапаніміст М. В. Бірыла адзначае, што "з пункту погляду гісторыі мовы адапелятыўная антрапанімія з'яўляецца захавальнікам, кансервантам лексікі папярэдніх эпох, дае матэрыял для больш глыбокага вывучэння гістарычнага слоўніка, моўных узаемасувязей" [2, с. 4]. Згодна з гэтым у якасці матываваных асноў для

ўтварэння прозвішчаў магла выкарыстоўвацца лексіка, якая адлюстроўвае самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа і акаляючай яго рэчаіснасці – быт, заняткі, становішча ў сям'і і грамадстве, фізічныя, разумовыя і маральныя якасці, пачуцці, сацыяльны ўклад, жывёльны і раслінны свет і інш. У гэтым сэнсе антрапонімы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі, з'яўляюцца кладоўкай гісторыка-культурнай спадчыны, даюць каштоўны матэрыял для вывучэння агульнай гісторыі народа. Пры ўтварэнні прозвішчаў Жыткавіцкага раёна выкарыстоўвалася лексіка разнастайных семантычных груп; аднак сваёй прадуктыўнасцю вызначаюцца наступныя:

Прозвішчы, суадносныя з назвамі прафесій, родам заняткаў, сведчаць пра разнастайнасць прафесій у Беларусі. З развіццём грамадства некаторыя прафесіі знікалі, а разам з імі страціліся і іх назвы, што ляжалі ў аснове прозвішчаў, тым не менш іх этымалогія ў большасці застаецца празрыстай. Прозвішчы, суадносныя з назвамі прафесій, роду заняткаў або выконваемага дзеяння, уяўляюць сабой каштоўную крыніцу для вывучэння гісторыі мовы і культуры. Гэта ў нейкай ступені энцыклапедыя нашага грамадства:

Алейнік < 'той, хто робіць алей' [2, с. 20], Баярын < баярын 'радавіты дваранін, буйны памешчык' [6, с. 42], Буднік < буднік 'рудакоп' [2, с. 64], Валовіч < рус. валовик 'паганяты валоў', укр. воловик 'пастух валоў' [2, с. 80], Васкабойнік < 'чалавек, які перапрацоўвае на продаж воск' [1, с. 87], Віннік < 'прадавец віна' [2, с. 87], Ганчар < ганчар 'той, хто вырабляе гліняную пасуду' [2, с. 101], Гарбар < 'той, хто займаецца апрацоўкай і вырабам шкур' [7, с. 29], Гаршкалеп < майстар 'рамеснік, які вырабляе з гліны пасуду і іншыя рэчы' [7, с. 26], Грэнадзёр < 'салдат або афіцэр адборных (па высокаму росту) пяхотных і кавалерыйскіх часцей' [7, с. 89], Гутнікаў < гутнік 'рабочы, які працаваў на гуце' [7, с. 101], Дзегцярык < дзегцяр 'той, хто гоніць дзёгаць' [7, с. 178], Драгун, Драгуновіч < драгун 'салдат або афіцэр некаторых кавалерыйскіх часцей, здольных весці бой і ў спешаным страі' [7, с. 194], Дубовік < рэг. 'рулявы на лодцы плытагонаў, якая называецца 'дуб''; рус. дубовик 'лодачнік, перавозчык' [139], Дуднік < укр. 'дудар' [2, с. 139], Жалязняк, Жалязняковіч < жалязняк 'гандляр жалезам' [1, с. 87], Кавалевіч, Каваленя, Кавалеўскі, Кавалец, Кавальчук < каваль 'рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу' [7, с. 570], Казак < рус. рэг. казак 'батрак, які наймаўся на год на працу'; на Русі ў 15-17стст. – вольны чалавек з прыгонных сялян, халопаў, гарадской беднаты, якія ўцякалі на ўскраіны дзяржавы – Дон, Запарожжа, Яік [7, с. 574], Калеснікаў, Калесны < калеснік 'майстар, які вырабляе колы, калёсы' [7, с. 586], Каплан < у каталіцкай і англіканскай цэрквах – свяшчэннік пры капліцы або дамашняй царкве [7, с. 629], Катляроў, Катлярчук < катляр 'майстар, які вырабляе катлы' [2, с. 192], Коваль < каваль 'рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу' [7, с. 570], Кравец, Краўцоў, Краўчук, Краўчэня < кравец 'спецыяліст па шыццю адзення' [7, с. 719], Кузнец < рус. 'каваль' [2, с. 227], Купчанка, Купец < уст. 'пакупнік' [7, с. 757], Кухарчук < кухар 'повар' [2, с. 236], Кучараў < кучар 'фурман, рамізнік, вазніца' [2, с. 236], Кушнер, Кушнярчук, Кушняровіч < кушнер 'рамеснік, які вырабляе шкуры на футра і

шые з футра' [7, с. 765], Лазебнік < рэг. лазебнік 'лазеншчык' [2, с. 242], Лакіза < укр. лакиза зневаж. 'лакей' [2, с. 243], Лаўніковіч < ст. бел. лавник 'сотнік, падпарадкаваны вайту' [2, с. 247], Майстровіч, Майстрэнка < майстар 'спецыяліст у якой-небудзь галіне вытворчасці' [8, с. 86], Маскалец, Маскаль < ст. бел. маскаль 'падданы Маскоўскай дзяржавы'; рэг. 'салдат' [2, с. 277], Меднік < 'рабочы, які займаецца вырабам або рамонтам медных рэчаў' [8, с. 132], Мельнік, Мельнікаў, Мельнічэнка < мельнік 'уладар млына або работнік у млыне' [8, с. 166], Музыкін < музыкант 'той, хто іграе на якім-небудзь інструменце' [8, с. 179], Мыслівец < рэг. 'паляўнічы з гончымі сабакамі' [2, с. 290], Мясніковіч < мяснік [2, с. 293], Налівайка < укр. наливайко 'налівальшчык, той, хто налівае' [2, с. 296], Падкуйка < ад падкаваць 'той, хто падкоўвае' [2, с. 306], Панамароў < панамар 'царкоўны служка' [5, с. 98], Папко, Папок < поп 'свяшчэннік' [9, с. 19], Пекарскі < пекар 'хлебапёк' [9, с. 153], Пільшчык < 'рабочы, заняты пілаваннем' [9, с. 256], Прасолаў < прасол рэг. бел. 'скупшчык мяса і рыбы для продажу ў розніцу' [2, с. 332], Руднік < 'той, хто здабывае ці плавіць руду' [2, с. 354], Рыбалка < рэг. рыбак 'рыбалоў' [2, с. 356], Слесарчук, Слесарэвіч < слесар 'рабочы, спецыяліст па ручной апрацоўцы, зборцы і рамонту металічных вырабаў' [10, с. 201], Стражэвіч < страж рус. 'ахоўнік' [2, с. 392], Стралец < стралец 'стралок', рэг. 'паляўнічы' [2, с. 392], Сядзельнік < рэг. 'сёдзельнік; майстар, які робіць сёдлы' [10, с. 124], Ткачук < ткач 'рабочы, майстар, які вырабляе тканіну на ткацкім станку' [10, с.490], Трапец, Тропец < рус. трепец 'трапальшчык лёну' [2, с. 413], Царанок, Царык < цар 'тытул манарха ў Расіі, Балгарыі, Сербіі; асоба, якая мае гэты тытул' [11, с. 228], Шабельнік < 'майстар, які вырабляе шаблі' [2, с. 459], Шаўчук, Шаўчэнка, Швец < рэг. 'сапожнік, шавец' [2, с. 473], Шкляр < шкляр 'рабочы, які ўстаўляе шкло' [11, с. 368], Штукар < 'артыст; майстар, вынаходнік; выдумшчык, жартаўнік' [11, с. 403], Ярыга < рус. устар. 'ніжэйшы служыцель паліцыі, пасыльны' [2, с. 500].

Бандзюк < рэг. 'бандыт' [2, с. 40], Белавус, Белавусаў [2, с. 50], Бялец, Бялко, Беляноў < белы [2, с. 51], Высоцкі < высокі [2, с. 91], Галаванаў, Галавач, Галавей 'галаваты' [96], Гарбуноў, Горб, Горбаль, Горбач, Горбель < горб [2, с. 114], Голец, Голік, Голікаў < голы [2, с. 113], Глушань, Глушчэня, Глушын, Глушэвіч < рэг. 'глухі' [2, с. 111], Губанаў, Губар, Губараў < рэг. 'губач, губаты' [2, с. 119], Глазуноў < глазін 'зіркасты' [7, с. 58]; глазун 'разява, гультай' [3, с.79], Даўгулеў < даўгуль 'высокі чалавек' [2, с. 127], Зубараў < зубар 'зубаты' [2, с. 161], Зуеў < зуй рэг. 'рослы хлопец з паводзінамі дзіцяці, недарэка' [2, с. 161], Караткевіч < кароткі [2, с. 187], Касабуцкі < рэг. касабуцкі 'касавокі' [2, с. 190], Кірбай < кірг. кирбаи 'быць заморышам' [2, с. 202], Кіслоў, Кіслюк < кіслы [2, с. 203], Клепусевіч < літ. klepus 'задзіра, задзірака' [2, с. 205], Корзун < рус. карзун 'без пярэдніх зубоў, шчарбаты' [2, с. 214], Краснік, Красніцкі < красны 'прыгожы, чырвоны' [2, с. 218], Краськоў < рэг. краско 'чырванашчокі здаровы чалавек' [2, с. 218], Круковіч, Крукоўскі < рэг. крук 'скупец, скупы чалавек' [2, с. 219], Крутаў < круты [2, с. 220], Круцікаў < рус. крутик 'абманшчык, ашуканец' [2,

с. 221], Крыванос, Крывы, Крывіцкі < крывы [2, с. 222], Кудласевіч, Кудлач < кудлас ‘кудлаты, кудлач’ [2, с. 226], Кудрэвіч < рэг. кудры ‘кучаравыя валасы’ [2, с. 226], Кулявец < кулявы рэг. ‘кульгавы, храмы’ [2, с. 230], Курыла, Курылец, Курыловіч < рус. курила, курилка ‘п’яніца, гуляка’ [2, с. 235], Кучур < рус. кучурый ‘курносы, кірпаты’ [2, с. 237], Лобан < рус. лобан ‘чалавек ці жывёліна з вялікім ілбом’ [2, с. 239], Лунеў < лунь ‘сівавалосы чалавек’ [4, с. 123], Лысенка < лысы [2, с. 260], Мазурэнка < мазур ‘мурзаты, замурзаны’ [2, с. 267], Малоў < малы [2, с. 271], Марголін, Маргун < маргаль ‘маргун’ [2, с. 275], Мамонаў < мамон рэг. ‘глухі чалавек’, ‘маўклівы чалавек’ [2, с. 273], Махнач < рэг. ‘махнаты чалавек’ [2, с. 280], Набокін < рус. набокий ‘крывабокі, касабокі, нахільны на адзін бок’ [2, с. 294], Паршута < ‘той, хто мае паршы, паршывы’ [2, с. 316], Пацярайла < ‘той, хто губляе’ [2, с. 319], Піскун, Піскуноў < піскун ‘той, хто часта пішчыць’ [9, с. 477], Піткевіч < пітко ‘той, хто п’е’ [2, с. 325], Пішчук < ад пішчаць г.зн. ‘той, хто пішчыць’ [2, с. 325], Пузевіч < пузаты ‘пузан’ [2, с. 337], Рослік < рослы [2, с. 352], Рудак, Рудакоўскі < рудак рэг. ‘чалавек з рудымі валасамі’ [2, с. 353], Рудкоўскі < рэг. рудзька ‘руды, рыжы чалавек’ [2, с. 354], Руды, Рудэнка < руды [2, с. 354], Румас < рума рэг. ‘плакса, румза’ [2, с. 355], Русы < русы [2, с. 355], Салохін < салоха рэг. ‘прастак, дурань’ [2, с. 363], Стракач < рус. стрекач ‘той, хто апякае, жаліць, жыгае’ [2, с. 392], Субат < субат ‘чалавек, які чым-небудзь у суботу стаў вядомым’ [2, с. 396], Суздалеў < суздаль рэг. ‘сухі, танклявы чалавек’ [2, с. 397], Сядун < сядун ‘малы, нізкага росту чалавек’ [2, с. 403], Сяўрук < рус. севрюк ‘пануры, хмуры чалавек; буркун’ [2, с. 405], Сечка < ‘той, хто сячэ’ [2, с. 405], Тамілаў < рус. томило ‘той, хто томіць каго-небудзь’ [2, с. 408], Танковіч, Танчынскі < тонкі [2, с. 412], Хілько, Хількевіч < хіла ‘хілы, слабы, хваравіты’ [2, с. 430], Храпун, Храпунскі < храпун ‘схільны да храпу, які храпе ў сне’ [11, с.213], Ціханчык < ціхан ‘ціхі, ціхоня’ [2, с. 438], Цішкевіч, Цішко, Цішкоў, Цішкоўскі < укр. тишко ‘ціхоня’ [2, с. 439], Чаравака < ‘той, у каго вялікае чэрава; пузаты’ [2, с. 446], Чарнагалоў, Чарнышкоў, Чарнышэвіч < рус. черныш ‘смуглы, чарнявы чалавек’ [2, с. 448], Шарпіла < ‘той хто рве, раздзірае’ [2, с. 468], Шаціловіч < шаціла рэг. ‘той, хто шатаецца, ходзіць без справы, бадзяга’ [2, с. 472], Шырай < рус. ширяй ‘шыракаплечы, дзябёлы чалавек’ [2, с. 492].

Словы, што абазначаюць жывёльны і раслінны свет, у кожным раёне могуць валодаць сваёй спецыфікай, якая тлумачыцца як мясцовымі прыроднымі ўмовамі, так і асаблівасцямі мясцовых гаворак. У складзе сучасных прозвішчаў Жыткаўшчыны даволі часта сустракаюцца словы, матываваныя назвамі жывёл, птушак, насякомых

Асёл, Бабёр, Баброў, Баланчук < балан укр. ‘белы вол’, тат. болан ‘алень’, башк. рэг. ‘алень; лось з адначасовым указаннем на масць’ [2, с. 37], Баран, Баранаў, Барсук, Белка, Бобр, Бобрык, Бугай, Быкаў, Бычкоў, Бычкоўскі, Валовіч, Валошын < валах ст. бел. ‘конь’, рус. валах, валух ‘пакладаны баран’, ‘пакладаны бычок’ [2, с. 80], Волк, Волкаў, Волчак, Воўк, Ваўкоў, Зайчык, Казёл, Казлоў, Казлоўскі, Козел, Козка, Каток, Катовіч, Кот, Котаў, Коцік, Каняшкін, Кунько, Кунец, Куневіч, Куніч < рус., укр. ‘куня,

куніца’ [2, с. 230], Куран < рус. ‘індык’ [2, с. 232], Куцько < рус. кутя, кутька ‘шчаня’ [2, с. 237], Ласка, Ласко < ‘невялікая драпежная жывёліна з тонкім гібкім целам’ [8, с. 23], Ліс, Лісавец, Лісіцкі, Лісовіч, Лось, Мядзведзеў, Медзвядзюк, Пацук, Рак, Раковіч, Собаль, Стрыгач < рус. стрига ‘конь’ [2, с. 393], Шчур, Шчурко < рус. щур ‘вуж, пацук’, укр. ‘пацук’ [2, с. 488]; Арлоўскі, Варабей, Вараб’еў, Варона, Варановіч, Воранаў, Верабей, Голуб, Голубеў, Галубіцкі, Гусак, Жураў, Жураўлевіч, Жураўскі, Зуеў < зуй рус. агульная назва невялікіх кулікоў [2, с. 161], Кажан, Кажаноўскі < кажан ‘лятучая мыш’ [2, с. 167], Казадой < назва птушкі [2, с. 168], Канаплянік < абл. ‘верабей’ [7, с. 611], Касач < ‘цецярук-самец’ [7, с. 656], Круковіч, Крукоўскі < рэг. ‘крук, воран’ [2, с. 219], Кулік, Кулікоў, Лебедзеў, Лебядзінскі, Лушчык < укр. лущ ‘назва птушкі’ [2, с. 259], Наседкін < наседка ‘квакуха’ [2, с. 297], Певень, Пеўнеў, Пугачоў < пугач ‘драпежная начная птушка атрада соў’ [9, с. 515], Сакалоўскі, Саколік, Салавейка, Сарока, Сарокін, Філін, Чыжык, Чэчык < укр. чечик ‘назва птушкі’ [2, с. 438], Шпакоўскі, Шчур рус. щур ‘(птушка) стрыж’ [2, с. 488]; Акунец, Карась, Карасёў, Карасюк, Карпук, Лінкевіч, Лінковіч, Шчука; Здрок < рэг. ‘авадзень’ [2, с. 159], Комар, Павук, Хрушчоў.

Сярод адапелятыўных прозвішчаў сустракаюцца найменні, у аснове матывацыі якіх ляжыць месца жыхарства асобы. Напрыклад:

Асавец < з в. Осава, Осаў, Асаўцы [2, с. 24], Барысавец < з г. Барысаў, Белавец < з в. Белае, Бялова [2, с. 50], Брынявец < з в. Брыні, Брынёва, Брынеў [2, с. 62], Дабрадзеравец < з в. Добрае Дзерава [2, с. 123], Дзедавец < з в. Дзяды, Дзедава, Дзедаўка [2, с. 128], Жукавец < з в. Жукі, Жукава [2, с. 148], Жыткавец < з г.п. Жыткавічы, Засінец < з в. Засінцы, Лісавец < з в. Лісава, Лісы [2, с. 253], Міхнавец < з в. Міхна, Міхнавічы, Міхнаўка, Панкавец < з в. Панкі, Панкова [2, с. 313], Паўчынец < з в. Поўчын, Паляшук < з в. Палессе, Пінчук < з г. Пінск [2, с. 324], Радкавец < з в. Радкорва, Радкаў, Радкоў, Радкі [2, с. 346], Ракавец < з в. Ракі, Ракава, Ракаў [2, с. 348], Случак < з г. Слуцк [2, с. 382], Туравец < з г. Тураў [2, с. 418], Цішкавец < з в. Цішкі, Цішкова, Цішкаўка [2, с. 439].

Багаты фактычны матэрыял дае нам магчымасць сцвярджаць, што самай прадуктыўнай матывацыйнай базай для ўтварэння прозвішчаў Жыткавіцкага раёна з’яўляецца адапелятыўная лексіка, якая прадстаўлена разнастайнымі лексіка-семантычнымі групамі. Рашаючымі фактарамі іх утварэння і ўжывання з’яўляецца народная назіральнасць. Нельга не пагадзіцца з Ул. Юрэвічам, які слушна адзначае: ”як пабагацелі б мы, каб больш даследавалі паходжанне беларускіх імён і прозвішчаў, традыцыйных мянушак, усяго народнага іменаслоўя, каб мелі, нарэшце, поўны збор антрапонімаў, носьбіты якіх жывуць на Беларусі і з’яўляюцца жывым помнікам” [12, с. 211].

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Суперанская, А.В. Современные русские фамилии / А.В. Суперанская, А.В. Суслова; под. ред. Ф.П. Филина. – Москва: Наука, 1981. – 176 с.

2. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія 2 : Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.

3. Весловский, С.Б. Ономастикон. Древние имена, прозвища и фамилии./ (С.Б. Веселовский. – Москва: Наука, 1974. – 382 с.

4. Федосюк, Ю.А. Русские фамилии: Популярный этимологический словарь / Ю.А. Федосюк. – Москва: Детская литература, 1980. – 239 с.

5. Унбегаун, Б. Русские фамилии / пер. с англ. / Б. Унбегаун / общ. ред. Б. А. Успенский. – Москва: Прогресс, 1989. – 443 с.

6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.1. А-В. – Мінск, 1977. – 608с.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.2. Г-К. – Мінск, 1978. – 768 с.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.3. Л-П. – Мінск, 1979. – 672 с.

9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.4. П-Р. – Мінск, 1980. – 768 с.

10. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.5, ч.1. С-У. – Мінск, 1982. – 663 с.

11. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы .Т.5, ч.2. У-Я. – Мінск, 1984. – 608 с.

12. Юрэвіч Ул.Слова жывое, роднае, гаваркое … / Ул. Юрэвіч. – Мінск, 1988. – с.

Спіс умоўных скарачэнняў

абл. – абласное
бел. – беларускае
кірг. – кіргізскае
літ. – літоўскае
рус. – рускае
рэг. – рэгіянальнае
ст.бел. – старабеларускае
тат. – татарскае
укр. – украінскае
устар. – устарэлае

Спіс прозвішчаў

АБАРБАЛАЎ
АБАРЭВІЧ
АБРАМЧУК
АБУХОВІЧ
АВЕРЫН
АГАРКАЎ
АГІЕВІЧ
АДАМОВІЧ
АЗАРАЎ
АЙБІНДЗЕР
АЙНБІНДЗЕР
АКАНАЎ
АКАНІН
АКІНЧЫЦ
АКСЕНЕНКА
АКСЁНЧЫК

АКУЛІЧ
АКУНЕЦ
АЛАЕВІЧ
АЛЕЙНІК
АЛЕКСІЕВІЧ
АЛЕКСІЕЎСКІ
АЛІФЕРАВЕЦ
АЛІФІРАВЕЦ
АЛІФЯРОВІЧ
АЛІШЭЎСКІ
АЛЬВІНСКІ
АЛЬТШУЛЬ
АЛЬФЕРКА
АЛЬШАНСКІ
АЛЯКСЕЕВІЧ
АЛЯХНОВІЧ
АМЯЛЬЧЫШЫН
АНДРОСІК
АНДРЭЕЎ
АНДЫК
АНЗЕНБЕРГ
АНІСКОВІЧ
АНІСЬКОВІЧ
АНОШКА
АНТАНОВІЧ
АНШТЭЙН
АРАХОЎСКІ
АРДЫНСКІ
АРЛОЎСКІ
АРЦЮХОВІЧ
АРЦЮШКА
АРЭШКА
АСАВЕЦ
АСЁЛ
АСІПЕНКА
АСІПЧУК
АСКЕРКА
АСОКІН
АСОЎСКІ
АСТАШЭЎСКІ
АСТРОЎСКІ
АТАМАНЧУК
АТЛІВАНАЎ
АЎДЗЕЕЎ
АЎДЗЕЙЧЫК
АХОЦЕНКА
АХРАМОВІЧ
АЧАКОЎСКІ
АЧАНОЎСКІ
АЧАПОЎСКІ
АЧАРОЎСКІ

БАБАРЫКА
БАБЕНКА
БАБЁР
БАБКІН
БАБРОЎ
БАБУНОЎ
БАГАЙ
БАГДАНАЎ
БАГЕР
БАЖЫТАЎ
БАЖЭНКА
БАЗОН
БАЗУН
БАЗЫЛЕВІЧ
БАКУЛОВІЧ
БАКУН
БАКУНОВІЧ
БАЛАНЧУК
БАЛБУК
БАЛБУЦКІ
БАЛДЗЕНКА
БАЛІЧ
БАЛКОЎСКІ
БАЛОБАН
БАНДАРАВЕЦ
БАНДАРЭВІЧ
БАНДЗЮК
БАНДУРА
БАРАБАШ
БАРАВІК
БАРАВЫ
БАРАДЗІН
БАРАН
БАРАНАЎ
БАРКОЎСКІ
БАРОВІЧ
БАРОДЗІЧ
БАРОЎСКІ

БАРСУК
БАРТАШЭВІЧ
БАРУН
БАРУХІН
БАРЫСАВЕЦ
БАРЫСАЎ
БАРЫСЕВІЧ
БАСАРАНОВІЧ
БАХНО
БАШКЕВІЧ
БАШУНОВІЧ
БАШЫН
БАЯРЫН
БЕК
БЕЛАВЕЦ
БЕЛАВУС
БЕЛАВУСАЎ
БЕЛАГАЛОВІК
БЕЛАШЫЦКІ
БЕЛЕР
БЕЛКА
БЕЛЯНОЎ
БЕМБЕЛЬ
БЕРАЗОЎСКІ
БЕРДНІКОВІЧ
БЕРНАТ
БЕРНІКОВІЧ
БЕРТАШ
БЕЦІК
БЕЧЫК
БІБІК
БІГАЙДАРАЎ
БІКША
БІРУЛЬ
БІРУЛЯ
БІРЧЫКАЎ
БІЧКА
БЛОЦКІ
БОБКА
БОБР
БОБРЫК
БОГУШ
БОДНІЧ
БОЖЫК
БОЙКА
БОНДАР
БОНДАРАЎ
БОРДЗЮГ
БОРТАЛЬ
БОХНА
БРАДОЦКІ
БРАЙЛОЎСКІ
БРАТКОЎСКІ
БРУЙ
БРУКВА
БРУКШТУС
БРЫНЯВЕЦ
БРЭГМАН
БУБЛІС
БУБНОВІЧ
БУГАЙ
БУГУК
БУДА
БУДЗІШЭЎСКІ
БУДНІК
БУЖАН
БУЖАНАЎ
БУЗІНА
БУЙКА
БУЙКО
БУКЦІН
БУКЧЫН
БУРАК
БУРАЧОК
БУР'ЯК
БУТ-ГУСАІН
БУЯКЕВІЧ
БЫКАЎ
БЫСТРЭНКА
БЫХАН
БЫЧКОЎ
БЫЧКОЎСКІ
БЫШ
БЯГУН
БЯДЗЕШКА
БЯЛЕЦ
БЯЛКО
БЯЛЯЙ
БЯЛЯНІК
БЯЛЯНЧЫК

БЯЛЯЎСКІ
БЯРДЗІЧАВЕЦ
БЯРДОЎ
БЯРКОВІЧ
БЯРЭЗІН

ВАЙСБЛАТ
ВАКАЛЮК
ВАЛІШЫЦКІ
ВАЛОВІЧ
ВАЛОШЫН
ВАЛЫНЕЦ
ВАЛЮШЫЦКІ
ВАНЮК
ВАРАБЕЙ
ВАРАНОВІЧ
ВАРВАНОВІЧ
ВАРВАНСКІ
ВАРОНА
ВАРУЖЭНЕЦ
ВАРШАЛ
ВАСІЛЕВІЧ
ВАСІЛЕНКА
ВАСІЛЕЎСКІ
ВАСКАБОЙНІК
ВАСЯНОВІЧ
ВАТКЕВІЧ
ВАШКОЎ
ВАЯНЕЦ
ВЕЛЕШТ
ВЕНЦЫК
ВЕРАБЕЙ
ВЕРАШЧЫНСКІ
ВЕРТАЛЬ
ВЕРШУК
ВЕЦІК
ВІДЗЯЙЛА
ВІЛЕШЫН
ВІННІК
ВІТВІНОВІЧ
ВІШНЕЎСКІ
ВОЛК
ВОЛКАЎ
ВОЛЧАК
ВОРАНАЎ
ВОТЧЫЦ
ВОЎК
ВОЎКАЎ
ВЫГАНСКІ
ВЫСОЦКІ
ВЫХАДЦАЎ
ВЯЗАРКА
ВЯЛІЧКА
ВЯНГУРА
ВЯРШВОЎСКІ
ВЯРШЧУК
ВЯСНОВІЧ
ВЯЧОРКА

ГАВОРСКІ
ГАЙКЕВІЧ
ГАЙКО
ГАЛАБАРОДЗЬКА
ГАЛАВАНАЎ
ГАЛАВАЧ
ГАЛАВЕЙ
ГАЛАТА
ГАЛАЎ
ГАЛЕНЯ
ГАЛЕЦ
ГАЛІНЕВІЧ
ГАЛІНОВІЧ
ГАЛІНСОН
ГАЛІСОН
ГАЛІЦКІ
ГАЛОТА
ГАЛОЎЧЫК
ГАЛУБІЦКІ
ГАЛЬБЕЦКІ
ГАЛЯЧАНКА
ГАМОЛКА
ГАНАНАЙКА
ГАРАВЫ
ГАРАДЗЕЦКІ
ГАРАНЬКОЎ
ГАРАЦКЕВІЧ
ГАРБАР
ГАРБУЗ
ГАРБУЗА
ГАРБУНОЎ

ГАРДЗЕЙЧЫК
ГАРДЗЮК
ГАРШКАЛЕП
ГАРЭЛІК
ГАТЧЭНЯ
ГАЎРЫЛЕНКА
ГАЎРЫЛОВІЧ
ГВАЗДЗЮКЕВІЧ
ГЕЙФМАН
ГЕЙХМІН
ГЕЛЬФАНД
ГЕРАСІМОВІЧ
ГЕРМАН
ГЕРЦМАН
ГЕРШТЭЙН
ГІНЗБУРГ
ГІРВІЧ
ГІТЭЛЬМАН
ГЛІЗЕР
ГЛІМЕР
ГЛІНСКІ
ГЛОЗМАН
ГЛУШАНЬ
ГЛУШЧЭНЯ
ГЛУШЫН
ГЛУШЭВІЧ
ГОЛАД
ГОЛАС
ГОЛЕЦ
ГОЛІКАЎ
ГОЛІН
ГОЛУБ
ГОЛЬДМАН
ГОЛЬЦАЎ
ГОНІКМАН
ГОРАЎ
ГОРБ
ГОРБАЛЬ
ГОРБАТ
ГОХЛЕР
ГРАБОЎСКІ
ГРАД
ГРАМАДСКІ
ГРАМАК
ГРОМ
ГРУДНІЦКІ
ГРУШКО
ГРЫБ
ГРЫБШТЭЙН
ГРЫВА
ГРЫГАРЭВІЧ
ГРЫГОР'ЕЎ
ГРЫЦУК
ГРЫЧЫНА
ГРЫШЧАНОК
ГРЫШЧЭНЯ
ГРЭНАДЗЁР
ГРЭЧЫЦ
ГУБАНАЎ
ГУБЕРМАН
ГУДУН
ГУК
ГУЛАКАЎ
ГУЛЕНКА
ГУЛЮТА
ГУРНІК
ГУРСКІ
ГУРЫН
ГУРЭВІЧ
ГУСАК
ГУТНІКАЎ
ГУЦІН
ГУШЧЭНЯ

ДАБАСЕВІЧ
ДАБРАВОЛЬСКІ
ДАБРАДЗЕРАВЕЦ
ДАВІДОВІЧ
ДАВЫДЗЕНКА
ДАВЫДОВІЧ
ДАЛМАТОВІЧ
ДАМАШКЕВІЧ
ДАМБРОЎСКІ
ДАНІЛЕВІЧ
ДАНІЛКІН
ДАРАФЕЕЎ
ДАРАФЕЙ
ДАРОШКА
ДАШКЕВІЧ
ДВАРАКОЎСКІ

ДВОРЫН
ДЗЕВАНОЎСКІ
ДЗЕДАВЕЦ
ДЗЕМІДЗЮК
ДЗЕМІДОВІЧ
ДЗЕМЯНЧУК
ДЗЕРАЗОВІЧ
ДЗЕРБАН
ДЗЕРБЯНЁЎ
ДЗІДЗЮК
ДЗМІТРЭНКА
ДЗЯГЛЕВІЧ
ДЗЯГЦЯРЫК
ДЗЯДКОЎСКІ
ДЗЯНІСАЎ
ДЗЯТКОЎСКІ
ДОВАЛЬ
ДОМНІЧ
ДОРФМАН
ДРАБОВІЧ
ДРАГУН
ДРАГУНОВІЧ
ДРАЕР
ДРАНЕЦ
ДРУК
ДРЫНЕЎСКІ
ДУБІЦКІ
ДУБОВІК
ДУБОЎСКІ
ДУБРОВІН
ДУБЯНЕЦКІ
ДУДЗІЧ
ДУДНІК
ДУТКО
ДУХАН
ДЫРДА
ДЫТМАН

ЁВІЧ
ЕЛАЕВІЧ
ЕЛІСЕЕЎ
ЕРАМЕЕВІЧ
ЕРАМЕЙЧЫК
ЕРМАКОВІЧ
ЕРМАЛОВІЧ
ЕРМАЧЭНКА
ЕЎХІМОВІЧ
ЕФІМОВІЧ

ЖАГЛЮК
ЖАЛЕЗКА
ЖАЛЬЧУК
ЖАЛЯЗНЯК
ЖАЛЯЗНЯКОВІЧ
ЖДАНОВІЧ
ЖОГАЛЬ
ЖУК
ЖУКАВЕЦ
ЖУКАЎ
ЖУКОЎСКІ
ЖУР
ЖУРАЎ
ЖУРАЎЛЕВІЧ
ЖУРАЎСКІ
ЖУРКО
ЖУРОВІЧ
ЖЫБАРТ
ЖЫБУРТ
ЖЫБУРТОВІЧ
ЖЫГАР
ЖЫДЗЕЦКІ
ЖЫЛАН
ЖЫЛЬКО
ЖЫРЧУК
ЖЫТКАВЕЦ
ЖЫТКЕВІЧ
ЖЭЛДАК

ЗАБЕЛІЧ
ЗАБРОДСКІ
ЗАБРОЦКІ
ЗАВІН
ЗАГАЛЬСКІ
ЗАГОРАЦ
ЗАГОРНЫ
ЗАГОРСКІ
ЗАЙЧЫК
ЗАКАВЕЦКІ
ЗАЛЕЎСКІ
ЗАМЖЫЦКІ

ЗАНКЕВІЧ
ЗАНЬКО
ЗАПЯСОЦКІ
ЗАРУЦКІ
ЗАРХІН
ЗАРЭЦКІ
ЗАСІНЕЦ
ЗАХАРАЎ
ЗДРОК
ЗЕЛІН
ЗІНГМАН
ЗІНКЕВІЧ
ЗІНОВІЧ
ЗІНЧУК
ЗНАВЕЦ
ЗОХНА
ЗУБ
ЗУБКО
ЗУЕЎ
ЗУМЕР
ЗЫНОВІЧ
ЗЯМЛЯНІК

ІВАНІС
ІВАНОЎ
ІВАНОЎСКІ
ІВАШКЕВІЧ
ІВІНСКІ
ІГНАЦЕНКА
ІЗРАІЛІЦІН
ІЛЕВІЧ
ІЛЬЕНЯ
ІНКІН
ІСАЕЎ

КАВАЛЕВІЧ
КАВАЛЕНЯ
КАВАЛЁЎ
КАВАЛЕЎСКІ
КАВАЛЕЦ
КАВАЛЬЧУК
КАВЕРЫН
КАДОЛІЧ
КАЖАН
КАЖАНОЎСКІ
КАЗАДОЙ
КАЗАК
КАЗЁЛ
КАЗЁЛАК
КАЗІНЕЦ
КАЗЛОЎ
КАЗЛОЎСКІ
КАЗУНОЎ
КАКОРА
КАКОЦКІ
КАЛАТОВІЧ
КАЛАЦЭЙ
КАЛЕСНІКАЎ
КАЛЕСНЫ
КАЛМІНАЎ
КАЛОСЬКА
КАЛОШЫЦ
КАЛПАНІЦКІ
КАЛЬКО
КАЛЬЦОЎ
КАЛЮЖНЫ
КАМІНСКІ
КАНАНОВІЧ
КАНАНУЧАНКА
КАНАПАЦКІ
КАНАПЛЯНІК
КАНДОРА
КАНТАР
КАНТАРОВІЧ
КАНЯШКІН
КАПА
КАПЛАН
КАПЛІЧ
КАРАБА
КАРАБЛІН
КАРАЛЁЎ
КАРАЛЕЦ
КАРАСЁЎ
КАРАСЬ
КАРАСЮК
КАРАТКЕВІЧ
КАРЗО
КАРНЕЙЧЫК
КАРНІЕВІЧ
КАРНЯЙЧУК

КАРОБАЧКА
КАРОБЧАНКА
КАРОЛЬ
КАРОТКІ
КАРОЎЧАНКА
КАРПАЎ
КАРПУК
КАРУБКА
КАРЧЭЎСКІ
КАСАБУЦКІ
КАСАК
КАСАКОВІЧ
КАСАЧ
КАСІНЕЦ
КАСПЯРОВІЧ
КАСЦЮК
КАСЦЮКЕВІЧ
КАСЦЯНКА
КАСЮК
КАСЯНКОЎ
КАТВІЦКІ
КАТЛОЎ
КАТЛЯРОЎ
КАТЛЯРЧУК
КАТОВІЧ
КАТОК
КАЎБОВІЧ
КАЎНАЦКІ
КАХНО
КАЦ
КАЦУБІНСКІ
КАЦЭВІЧ
КАЧАНОЎСКІ
КАШПЕЙ
КАШЭВІЧ
КВЯТКОЎСКІ
КЕЛЬМАН
КЕРАЗЬ
КЕСЛЕР
КЕЦКА
КІБ
КІЗЮК
КІРАЙЧУК
КІРБАЙ
КІРШУНОЎ
КІРШЭЎСКІ
КІРЫЕВІЧ
КІРЫЛЮК
КІРЭЙЧЫК
КІСЛОЎ
КІСЛЮК
КІЦУРА
КІЯХОЎСКІ
КЛЕПУСЕВІЧ
КЛЕЎЖЫЦ
КЛЕЦКІН
КЛІГЕР
КЛІМЕНЯ
КЛІМОВІЧ
КЛІМЧУК
КЛОЧКА
КЛЯВА
КЛЯПАЦКІ
КЛЯЦУН
КНЫШАЎ
КОВАЛЬ
КОЗЕЛ
КОЗІНЦАЎ
КОЗКА
КОЛАС
КОЛЬКА
КОМАР
КОНАНАЎ
КОНАНКА
КОНДЗІК
КОНІК
КОНЫШАЎ
КОПАЦЬ
КОРБУТ
КОРЖ
КОРЗУН
КОС
КОТ
КОТАЎ
КОХНА
КОЦІК
КОЧКА
КОШМАН
КРАВЕЦ
КРАМЕНСКІ

КРАСІЛЬШЧЫК
КРАСНІК
КРАСНІЦКІ
КРАСЬКОЎ
КРАЎЦОЎ
КРАЎЧУК
КРАЎЧУНІН
КРАЎЧЭНЯ
КРУКОВІЧ
КРУКОЎСКІ
КРУТАЎ
КРУЦІНСКІ
КРЫВАНОС
КРЫВІЦКІ
КРЫВЫ
КРЫЦКІ
КРЫЧЭЎСКІ
КРЭС
КУБЛІЦКІ
КУВІК
КУДЗЕЛЬКА
КУДЗІЧ
КУДЛАСЕВІЧ
КУДЛАЧ
КУДЛІЦКІ
КУДРЭВІЧ
КУЗЁМКА
КУЗНЕЦ
КУЗЬМІН
КУЗЬМІНСКІ
КУЗЬМІНЫХ
КУЗЬМІЧ
КУКСА
КУЛАКЕВІЧ
КУЛЕШ
КУЛІК
КУЛІНШ
КУЛЯВЕЦ
КУНДА
КУНЕВІЧ
КУНЕЦ
КУНІЧ
КУНЬКО
КУПРАЦЭВІЧ
КУПРЫЯНОВІЧ
КУПЧАНКА
КУРАКІН
КУРАН
КУРБАН
КУРЦ
КУРЦАЎ
КУРЫЛА
КУРЫЛЕЦ
КУРЫЛОВІЧ
КУСІК
КУФЦІКАЎ
КУХАРЧУК
КУЦЬКО
КУЦЭВІЧ
КУЧАРАЎ
КУЧЫН
КУЧЫНСКІ
КУШНЕР
КУШНЯРУК
КУШНЯРЭВІЧ

ЛАГОДЗІЧ
ЛАГУН
ЛАЗАРЧУК
ЛАЗАРЭВІЧ
ЛАЗЕБНІК
ЛАЗІЦІНСКІ
ЛАЗІЦКІ
ЛАЗОЎСКІ
ЛАЗУТА
ЛАЗЮК
ЛАЙТХМАН
ЛАЙХТМАН
ЛАКІЗА
ЛАМАН
ЛАМАН
ЛАМДЗІН
ЛАНДЗІН
ЛАПКО
ЛАСКА
ЛАСКО
ЛАСОЎСКІ
ЛАТОЦІН
ЛАТУХА
ЛАТЫШКЕВІЧ

ЛАЎНІКОВІЧ
ЛАХВІЧ
ЛАХМАН
ЛАЦЯНКОЎ
ЛЕАНОВІЧ
ЛЕБЕДЗЕЎ
ЛЕБЯДЗІНСКІ
ЛЕВІН
ЛЕГЧЫН
ЛЕМЕШ
ЛЕСЬКА
ЛЕЎКАВЕЦ
ЛЕЎШЫН
ЛЁША
ЛІНКЕВІЧ
ЛІНКОВІЧ
ЛІННІК
ЛІПІНСКІ
ЛІПНІЦКІ
ЛІПСКІ
ЛІС
ЛІСАВЕЦ
ЛІСІЦКІ
ЛІСОВІЧ
ЛІТВІН
ЛІТВІНКА
ЛІТВІНОВІЧ
ЛІЎШЫЦ
ЛІФНЕР
ЛІФШЫЦ
ЛІХОТА
ЛІЦВІНЕНКА
ЛІЦВІНКА
ЛІШКЕВІЧ
ЛОБАН
ЛОЙ
ЛОМАН
ЛОПУХ
ЛОСЬ
ЛОЎГАЧ
ЛУЗАЙ
ЛУК'ЯНОВІЧ
ЛУКАШОК
ЛУКАШЭВІЧ
ЛУНЦЭВІЧ
ЛУЦКІ
ЛУЦКО
ЛУЧЫНОВІЧ
ЛУШЧЫК
ЛЫСЕНКА
ЛЬВОВІЧ
ЛЮБІМАЎ
ЛЮДВІКЕВІЧ
ЛЮЛЬЕЎ
ЛЯБЁДКІН
ЛЯБЕДЧАНКА
ЛЯВІЦКІ
ЛЯЛЬЧУК
ЛЯМБОВІЧ
ЛЯСЬКО
ЛЯЎКОВІЧ
ЛЯЎШЭВІЧ
ЛЯХАВЕЦ
ЛЯШКЕВІЧ

МАЖАКА
МАЖАРКА
МАЖЭВІЧ
МАЖЭЙКА
МАЗЕЙКА
МАЗУЛЕНЯ
МАЗУРЭНКА
МАЙСЕЕЎ
МАЙСКІ
МАЙСТРОВІЧ
МАЙСТРЭНКА
МАЙСЮК
МАЙШУК
МАКАРЭВІЧ
МАКОЎСКІ
МАКСІМЧУК
МАКСІМЧЫК
МАКУХ
МАЛАНІН
МАЛАЎ
МАЛЕЦ
МАЛІНОЎСКІ
МАЛОЎ
МАЛОЧКА
МАЛОЧНІК

МАЛЬКЕВІЧ
МАЛЬЦЭВІЧ
МАМАЙКА
МАМОНАЎ
МАРГОЛІН
МАРКВАРТ
МАРКЕВІЧ
МАРКОЎСКІ
МАРКУЛЕВІЧ
МАРОЗ
МАРТЫНАЎ
МАРТЫНОЎСКІ
МАРУСЕВІЧ
МАРУСІЧ
МАРХОТКА
МАРЦІНКЕВІЧ
МАРЦІНОВІЧ
МАРЦІНОЎСКІ
МАРЧАНКА
МАРЭНКІН
МАСАЛЫГА
МАСКАЛЕЦ
МАСКАЛЬ
МАСКАЛЬЧУК
МАСЛА
МАСЛАЎ
МАСЛАЎСКІ
МАСЛЁНЫ
МАСЛО
МАСЛЮКЕВІЧ
МАТАРАС
МАТВЯЕЦ
МАТОХ
МАЎШОВІЧ
МАХНАЧ
МАЦАР
МАЦАРОЎ
МАЦВЕЕЦ
МАЦВЕЯНЕЦ
МАЦКЕВІЧ
МАЦУК
МАЦУКЕВІЧ
МАЦЭВІЧ
МАЦЮКЕВІЧ
МАЦЮНІН
МАЦЮШЫН
МАШЫЛАЎ
МАШЫНСКІ
МЕДЗВЯДЗЮК
МЕДНІК
МЕКАНЕЎСКІ
МЕКЛІН
МЕЛЬНІК
МЕЛЬНІКАЎ
МЕЛЬНІЧЭНКА
МЕЛЯШЧЭНЯ
МЕНКІН
МЕРАР
МЕРКУЛЬ
МІГДАЛОВІЧ
МІЛЕВІЧ
МІЛІЧЭНКА
МІЛЬНЕР
МІЛЯШЧЭНЯ
МІНІЧ
МІНКЕС
МІНЧАНКА
МІНЧУК
МІРАНОВІЧ
МІРАЧОЎ
МІРОНАЎ
МІСЕНКА
МІСКІЧ
МІСНІЧ
МІСЮК
МІТВАН
МІХАЙЛАЎ
МІХАЙЛОЎСКІ
МІХАЛКОВІЧ
МІХАЛЬСКІ
МІХАЛЬЧАНКА
МІХАЛЮК
МІХЕЙШЫН
МІХНАВЕЦ
МІЦКЕВІЧ
МІЦЮРЫЧ
МІШАЛАЎ
МЛЫНЧАК
МУЗЫКІН
МУКЕЛЬ

МУЛЮК
МУРАВІН
МУРАМЦАЎ
МУРАЎНІК
МУРАЎЧЫК
МУРАШКА
МУСІК
МЫСЛЕНКА
МЫЧКО
МЯДЗВЕДЗЕЎ
МЯЛЕШКА
МЯСНІКОВІЧ
МЯТЛУШКА
МЯШКОЎСКІ

НАВІЦКІ
НАВУМОВІЧ
НАДЭЛЬМАН
НАЗАРЧУК
НАЙДЗІН
НАЛІВАЙКА
НАРЭЙКА
НАСЕДКІН
НАСУКОВІЧ
НЕВЯРКЕВІЧ
НЕКРАШЭВІЧ
НЕСІН
НІКАНОВІЧ
НІКІФАРАЎ
НІКІЦЕНКА
НІКІЦІН
НІЦЭВІЧ
НОВАК
НОВІК
НОВІКАЎ
НОСАН
НЯБОРСКІ
НЯМЧЭНЯ
НЯМШЭВІЧ
НЯМШЭВІЧАЎ
НЯРОНСКІ
НЯЎСТРОЕЎ

ОСІПАЎ

ПАВУК
ПАГРАНОЎСКІ
ПАДДУБНЫ
ПАДЗЕРСКІ
ПАДКУЙКА
ПАЖЫГАН
ПАЙК
ПАКАВЕЦ
ПАЛІВІЧ
ПАЛІШЭЎСКІ
ПАЛОЗНІК
ПАЛУБЕЦ
ПАЛХОЎСКІ
ПАЛЯШУК
ПАНАМАРОЎ
ПАНАЎ
ПАНКАВЕЦ
ПАНЧЭНЯ
ПАПАЛАМАЎ
ПАПАРЭВІЧ
ПАПКО
ПАПОК
ПАРХІМОВІЧ
ПАРХОМАЎ
ПАРХОМЕНКА
ПАРШУТА
ПАСТОЕЎ
ПАЎЛОВІЧ
ПАЎЛЮК
ПАЎЛЮКЕВІЧ
ПАЎЛЮЧАНЕЦ
ПАЎЧЭНЕЦ
ПАХОНЧЫК
ПАЦЕРАЙЛА
ПАЦУК
ПАЦЫЕЎСКІ
ПАШКЕВІЧ
ПАШКОЎСКІ
ПАШЭВІЧ
ПЕКАРСКІ
ПЕРАШЧУК
ПЕРКІН
ПЕРНІНАЎ
ПЕРШТУК
ПЕТРУШКЕВІЧ

ПІГІН
ПІЛЬКЕВІЧ
ПІЛЬШЧЫК
ПІНЧУК
ПІСЕЦКІ
ПІСКУН
ПІСКУНОЎ
ПІТКЕВІЧ
ПІТУЛЕЎСКІ
ПІШЧУК
ПЛАПАНОВІЧ
ПЛАПАШАЎ
ПОБАЛЬ
ПОНТА
ПРАВІЛА
ПРАКАПОВІЧ
ПРАКОПЧЫК
ПРАПОЛЬСКІ
ПРАСОЛАЎ
ПРАХАРЭНКА
ПРАЦЭНКА
ПРОСТАК
ПРЫБІЧ
ПРЫКОТА
ПРЫЛУЦКІ
ПРЫТУЛЕНЕЦ
ПРЫШЧЫК
ПРЫШЧЫЦ
ПТУШКА
ПТУШКО
ПУГАЧОЎ
ПУЗЕВІЧ
ПУПАРЭВІЧ
ПУПЕНКА
ПУХАВІЦКІ
ПЫЛЬСКІ
ПЫРКО
ПЫШНЯК
ПЯСЕЦКІ
ПЯТРОЎСКІ
ПЯТРУК
ПЯТРЫЧЫЦ
ПЯЦЮШКІН
ПЯШЭВІЧ
РАБІННІКАЎ
РАБІНОВІЧ
РАБІРОХ
РАБЦЭВІЧ
РАГАВІЦКІ
РАГАЛЕВІЧ
РАГОЖЫН
РАДАВЕЦ
РАДЗІВОНАЎ
РАДЗЬКО
РАДКАВЕЦ
РАДКЕВІЧ
РАДЧЭНЯ
РАЕЎСКІ
РАЖАЛОЎСКІ
РАЗАНОВІЧ
РАЙ
РАЙНОЎСКІ
РАЙХМАН
РАК
РАКАВЕЦ
РАКОВІЧ
РАМАНАЎ
РАМАНЕНКА
РАМАНІН
РАМАНОВІЧ
РАМАНОЎСКІ
РАМАНЮК
РАНЧЫНСКІ
РАПАПОРТ
РАПЧЫНСКІ
РАСАДА
РАСЦЕНЕС
РАФАЛОВІЧ
РАЦІН
РАШАН
РОСЛІК
РУБІН
РУБІНШТЭЙН
РУБІС
РУБНІЧ
РУДАК
РУДАКОЎСКІ
РУДКОЎСКІ
РУДНІЦКІ

РУДНІЧ
РУДЫ
РУДЭНКА
РУЖАНІН
РУМАС
РУНКЕВІЧ
РУНЦ
РУСЫ
РУТО
РУШКІН
РЫБАЛКА
РЫБІНСКІ
РЫДЗЕЦКІ
РЫКЛІН
РЫМАШЭЎСКІ
РЫШКІН
РЭВУС
РЭЗ
РЭЙНГОЛЬД
РЭМЕЗ
РЭУТ
РЭХЦІК

САВАСЦЕНЯ
САВІН
САВІЦКІ
САВІЧ
САВОНАЎ
САДОЎСКІ
САКАЛОЎСКІ
САКОВІЧ
САКОЛІК
САКУЛА
САЛАВЕЙКА
САЛАМАХА
САЛАМОН
САЛЕЙ
САЛЕЙНІКАЎ
САЛКО
САЛОХІН
САМАЙЛОВІЧ
САМЕЦ
САМОЖЫН
САМОНЧЫК
САНАК
САНЕЦ
САНОЦКІ
САНСКІ
САНЮК
САПАНОВІЧ
САРНОЎСКІ
САРОКА
САРОЧАНКА
САСКЕВІЧ
САСКО
САСНЕВІЧ
САСНОЎСКІ
САСЬКО
САТНІК
САЎКОЎ
САЎЧУК
САЎЧЫН
САЎЧЫЦ
САХАРАЎ
САЧАВІЦА
САЧЫЛОВІЧ
СВЯРКОЎСКІ
СВЯТОШЧЫК
СЕВЕРАНЧУК
СЕВЯРЫН
СЕГАЛОВІЧ
СЕГЛІН
СЕМЯНЧУКОЎ
СЕМЯНЮК
СЕРАДА
СЕРГАВІЦКІ
СЕРГІЕВІЧ
СЕЧКА
СІВУХА
СІВЫ
СІДАРОК
СІЁМКА
СІНІЛЫ
СІНКЕВІЧ
СІРАЧ
СКАВІНСКІ
СКАЛАЗУБ
СКАРГОЎСКІ
СКРЫГАЛОЎСКІ
СЛАЎКІН

СЛЕСАРЧУК
СЛЕСАРЭВІЧ
СЛУПСКІ
СЛУЦКІ
СЛУЧАК
СМІРНОЎ
СНІЦЭВІЧ
СОБАЛЬ
СТАНКЕВІЧ
СТАРГОЎСКІ
СТАРОБІНСКІ
СТАТКЕВІЧ
СТАХІЕВІЧ
СТАХОЎСКІ
СТАЦУРА
СТАЮХІН
СТАЯНОЎСКІ
СТОКАЛАС
СТРАЖЭВІЧ
СТРАКАЧ
СТРАЛЕЦ
СТРАХ
СТРАХА
СТРУК
СТРУКОЎСКІ
СТРЫГАЧ
СТРЫЧАК
СТУДЗЯНЕЦ
СУБАТ
СУДНІК
СУДОМЕНКА
СУЗДАЛЕЎ
СУЛІМ
СУЛКОЎСКІ
СУХАЎ
СУХАЧОЎ
СУШКЕВІЧ
СУШЧЫК
СУШЧЫКАЎ
СУШЫЦКІ
СЦЕПАНЕНКА
СЦЯМКОЎСКІ
СЦЯПАНАЎ
СЫРАВАЦКІ
СЫРАМАХА
СЯДЗЕЛЬНІК
СЯДЛОЎСКІ
СЯДУН
СЯМАШКА
СЯМЁНАЎ
СЯНЬКО
СЯРГЕЙЧЫК
СЯСНЕЎ
СЯЎРУК

ТАБАШКІН
ТАБОЛІЧ
ТАБУЛА
ТАЛАКОВІЧ
ТАЛЕНЯ
ТАЛЯЛІН
ТАЛЯНІН
ТАМІЛАЎ
ТАНЕНЯ
ТАНКОВІЧ
ТАНЧЫНСКІ
ТАРАСЮК
ТАРГОНСКІ
ТАРЛЕЦКІ
ТАРУЦІС
ТАРЦАН
ТАТАРЧУК
ТАТУР
ТАЧЫЛА
ТАЧЫЛІН
ТКАЧУК
ТОЛКАЧ
ТОМАЛЬ
ТОПЧЫК
ТОРЧЫК
ТОЎКАЧ
ТОЧКА
ТРАДЧЫК
ТРАПЕЦ
ТРАФІМОВІЧ
ТРАХІМОВІЧ
ТРОПЕЦ
ТРУСАЎ
ТРУХАНАВЕЦ
ТРУХАНОВІЧ

ТРУШКОЎ
ТРЫЗНА
ТУНЕЎ
ТУРАВЕЦ
ТУРЦЭВІЧ
ТХАРУК
ТЫЧЫНА
ТЫШКЕВІЧ

УГЛІК
УГЛОЎ
УКОЛІН
УКРАЖЭНКА
УЛАДЗІМІРАЎ
УЛАСЕВІЧ
УЛЬЯНОВІЧ
УНІНСКІ
УРБІЦ
УС
УСЕВІЧ
УТКІН
УЧКУРНІС

ФЕДАРОВІЧ
ФЕДАРОЎСКІ
ФЕДАРЭНКА
ФЕЛЬДМАН
ФЕРАНЦ
ФЕШЧАНКА
ФІЛАТАЎ
ФІЛІН
ФІЛІПАЎ
ФІЛІПОВІЧ
ФІНЬКО
ФІРЫСОВІЧ
ФІСЮК
ФІШАР
ФЛАРХЯНОВІЧ
ФЛАТ
ФЛЕЙТМАН
ФЛЁРКА
ФРАЛОЎ
ФРУНКІН
ФРЫДМАН
ФУТОРЫН

ФЯДКОВІЧ
ФЯДОСАЎ
ФЯЦІСАЎ

ХАЗАН
ХАЛАДОВІЧ
ХАЛЕЦКІ
ХАМЕНКА
ХАМІЦЭВІЧ
ХАМЛЮК
ХАНЕНЯ
ХАНЕЦКІ
ХАРЫТАНОВІЧ
ХАХЛОЎ
ХАЦЯНОВІЧ
ХАЦЯНОЎСКІ
ХАЧЫНСКІ
ХЕЙНІЧ
ХІЛІНСКІ
ХІЛЬКО
ХІЛЬМАН
ХІНІЧ
ХЛЯБЦЭВІЧ
ХМЕЛЬ
ХМЯЛЬНІЦКІ
ХОМЧАНКА
ХРАПУН
ХРАПУНСКІ
ХРУШЧОЎ

ЦАЛЬКО
ЦАЛЯНЧУК
ЦАРАНОК
ЦАРЫБКА
ЦАРЫК
ЦАРЫКЕВІЧ
ЦВАСМАН
ЦВІРКО
ЦВІТОВІЧ
ЦЕЛЯНЧУК
ЦЁМКІН
ЦЁМЧЫН
ЦЕНЦ
ЦЕПЛЕНЬКІ
ЦЕРАШАТАЎ

ЦЕРАШКЕВІЧ
ЦЕРАШЧУК
ЦЕРЦАЎ
ЦІКЛІК
ЦІМАШЧЭНЯ
ЦІМАШЭВІЧ
ЦІТОЎ
ЦІХАНЧЫК
ЦІШКЕВІЧ
ЦІШКО
ЦІШКОЎ
ЦІШКОЎСКІ
ЦУБА
ЦУБІНСКІ
ЦУКРОВІЧ
ЦЫГІКАЛА
ЦЫК
ЦЫКЛІК
ЦЫРЫБКА
ЦЫРЫПКА
ЦЫТЛІН
ЦЮСІК
ЦЯРЖНО
ЦЯРЛЕЦКІ
ЦЯРУШКІН
ЦЯРЭНЯ
ЦЯСЛЮК

ЧАКМЯНЁЎ
ЧАПЛІЕЎСКІ
ЧАРАВАКА
ЧАРБУХОЎСКІ
ЧАРНЕЦКІ
ЧАРНУШЭВІЧ
ЧАРНЫ
ЧАРНЫШКОЎ
ЧАРНЫШЭВІЧ
ЧАРНЯЎСКІ
ЧОПЧЫЦ
ЧОРНАГАЛОЎ
ЧОРНЫ
ЧУДНЕР
ЧУМАКОЎ
ЧЫГЕР
ЧЫЖЫК
ЧЫКІДА
ЧЫРЭЦ
ЧЫШЧЭНЯ
ЧЭДЗІН
ЧЭНЧЫН
ЧЭПІК
ЧЭРКАС
ЧЭРНІКАЎ
ЧЭЧКА
ЧЭЧЫК

ШАБЕЛЬНІК
ШАКАЛЯН
ШАМШЭНЯ
ШАПІРА
ШАРАЕВІЧ
ШАРПІЛА
ШАРЭНДА
ШАУР
ШАЎГЕНЯ
ШАЎРЭЙ
ШАЎЧУК
ШАЎЧЭНКА
ШАХЛЕВІЧ
ШАЦІЛОВІЧ
ШАЦІРА
ШАШЛОВІЧ
ШВАРЦ
ШВАРЦМАН
ШВЕД
ШВЕЦ
ШВОРАБ
ШКАТУЛА
ШКЛЯР
ШКОДА
ШКРЭБЛІК
ШКУДУН
ШКУРКО
ШЛІХТАЎ
ШЛЫК
ШЛЯГА
ШЛЯПЕНКА
ШЛЯПІНТОК
ШЛЯПІНТОХ
ШЛЯХЦІН

ШНАЙДМАН
ШОСТАК
ШПАКОЎСКІ
ШПАНЬКО
ШПІЛОЎСКІ
ШРУБ
ШТУКАР
ШУБ
ШУЛЕРАЎ
ШУЛЬГА
ШУЛЬМАН
ШУЛЯКОЎСКІ
ШУСТЭР
ШУСТЭРМАН
ШУСЦЕРМАН
ШЧАКАТОВІЧ
ШЧАРБІНА
ШЧУКА
ШЧУР
ШЧУРКО
ШЫЛА
ШЫЛКО
ШЫЛЬКАРТ
ШЫЛЬКРЭТ
ШЫНГАРОЎ
ШЫРАЙ
ШЫРЧАНКА
ШЫРЫН
ШЫФМАН
ШЫШ
ШЭЎЧЫК

ЭПШТЭЙН
ЭСМАНТОВІЧ
ЭФМАН

ЮЗВЮК
ЮЗІК
ЮЗЮК
ЮЛЕВІЧ
ЮНЧЫЦ
ЮРЧАНКА
ЮХНЕВІЧ
ЮШКЕВІЧ

ЯГЕЛА
ЯКАВЕНІЧ
ЯКАРЭВІЧ
ЯКІМЦАЎ
ЯКІМЦОЎ
ЯКУБОЎСКІ
ЯКУБЧЫК
ЯКУШАЎ
ЯКУШЭВІЧ
ЯНКОЎСКІ
ЯНОВІЧ
ЯНЦЭВІЧ
ЯРАФЕЕЎ
ЯРАШ
ЯРАШЭВІЧ
ЯРМАШ
ЯРМОЛЕНКА
ЯРМОЛІНСКІ
ЯРМОЛІЧ
ЯРОЦКІ
ЯРОШЫК
ЯРЫГА
ЯРЭМІЧ
ЯЎСЕЕНКА
ЯХНІЧ
ЯХНО
ЯЦУНОЎ
ЯЦУШКЕВІЧ

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

Прапанаваная чытачам кніга ўключае фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ў розныя гады студэнтамі і выкладчыкамі ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, архіўныя матэрыялы ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”, раённага цэнтра фальклору пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жыткавіцкага райвыканкама, а таксама асобныя літаратурна-публіцыстычныя матэрыялы.

Традыцыйная духоўная спадчына Жыткавіцкага раёна – гэта надзвычай самабытныя і багатыя звесткі па розных каляндарных і сямейных абрадах і звычаях, сярод якіх варта адзначыць Каляды, Гуканне вясны, Тройцу, Юр’е, Купалле, Жаніцьбу коміна, вяселле, хрэсьбіны і інш. Найбольшую цікавасць выклікаюць успаміны жыхароў Жыткаўшчыны пра юраўскі карагод, абрад “Жаніцьба коміна”, траецкі абрад ваджэння куста, вясельныя і радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі, міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з жывёльным, раслінным і рэчыўным светам, персанажамі ніжэйшай міфалогіі. У народнай памяці ўстойліва захоўваецца ўнікальны від мастацтва – замовы, які арганічна яднае магію слова і дзеяння.

Фактычны матэрыял кнігі, над якім праведзена неабходная тэксталагічная праца, адлюстроўвае багатую палітру маўленчай культуры жыхароў Жыткаўшчыны. Аўтары-укладальнікі прадставілі фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, захоўваючы асаблівасці мясцовай гаворкі жыхароў, аднак у асобных выпадках палічылі важным пакінуць у кнізе і тыя звесткі, якія былі нязначна адкарэкціраваны асобнымі збіральнікамі, каб не страціць цэласнага ўяўлення пра багацце мясцовых фальклорных традыцый.

Над раздзеламі гэтага выдання плённа працавалі выкладчыкі кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі філалагічнага факультэта доктар філалагічных навук, прафесар В. С. Новак, кандыдаты філалагічных навук, дацэнты А. А. Кастрыца, С. А. Вяргеенка, А. М. Палуян, асістэнт Н. М. Панкова, аспірант ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” Г. П. Іванова, магістр філалагічных навук Т. У. Каранькова, выкладчыкі кандыдаты філалагічных навук, дацэнты кафедры беларускай мовы Н. А. Багамольнікава, А. М. Воінава, У. А. Бобрык і прафесар кафедры рускай і сусветнай літаратуры доктар філалагічных навук В. К. Шынкарэнка, супрацоўнікі ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” І. В. Глушэц і Л. Г. Мельнікава, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, празаік У. М. Гаўрыловіч, члену савета Гомельскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, Т. В. Кручэнка, заслужаны работнік УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”, журналіст Т. М. Дубяк.

Словы шчырай удзячнасці хочацца адрасаваць мясцовым жыхарам – носьбітам духоўнай спадчыны роднай зямлі, шчырым, зацікаўленым у захаванні народных традыцый і перадачы іх наступным пакаленням, а таксама руплівым збіральнікам залацінак народнай творчасці і іх

захавальнікам, фальклрысту, балетмайстару М.К. Котаву, былому дырэктару Жыткавіцкага раённага цэнтра фальклору Г.П. Лой, якая была ўганаравана высокай узнагарадой за асабісты ўклад у захаванне і развіццё традыцый беларускай нацыянальнай культуры, былому загадчыку Пагосцкага сельскага клуба К.А. Панчэні, настаўніцы Пятрычыц Л.С., кандыдату фізіка-матэматычных навук, сакратару праўлення грамадскага аб'яднання "Тураўскае навукова-асветніцкае таварыства", М.А. Саскевічу, усім работнікам устаноў культуры і адукацыі раёна.

Прапанаваная кніга "Пад песні задуменныя Палесся" (Народная духоўная культура Жыткаўшчыны) – своеасаблівая энцыклапедыя народнай мудрасці палешукоў, самабытнасці іх мыслення, непаўторнага паэтычнага ўспрымання і глыбіннага асэнсавання навакольнага свету.

**Содержание**

**ГАЙКЕВИЧ Д.С. НАШЕ БОГАТСТВО - ЛЮДИ…....................................................................7**

**ДЕМИДЕНКО О.М. ЛЕГЕНДАМИ ОВЕЯННЫЕ КРАЙ ...................................................9**

**СОЛОПОВА О.В., ГОЛОД К.М., КОЗОПОЛЯНСКАЯ А.В. МЕЖНАЦИОНАЛЬНЫЙ ПРОЕКТ «ВЕРА И ВЕРНОСТЬ» -..................................................................................11**

**КАЛЕНДАРНО-ОБРЯДОВЫЙ ФОЛЬКЛОР...............................................................14**

Новак В.С. Локальные особенности календарно-обрядового фолькора Житковичского района ..........................................................................................14

*Зимние обряды, обычаи и песни.......................................................................31*

*Весенние обряды, обычаи и песни.....................................................................99*

*Летние праздники, обычаи и песни .................................................................160*

*Осенние праздники, обычи и песни .................................................................186*

**СЕМЕЙНО-ОБРЯДОВАЯ ПОЭЗИЯ .............................................................................205**

Новак В.С. Традиции семейной обрядности Житковичского района ......................205

*Родильно-крестинные обряды и песни.............................................................216*

*Свадьба.......................................................................................................227*

*Похоронная обрядность и плачи ....................................................................365*

**ЗАГОВОРЫ ...................................................................................................................374**

Вергеенко С.А. “Сбереги, Боже, ниву трудовую…” (Специфика реализации сельскохозяйственных практик на Житковщине).............................................374

*Заговоры .....................................................................................................380*

**ПРИМЕТЫ И ПОВЕРЬЯ.................................................................................................423**

Кострица А.А. Приметы и поверья Житковщины .................................................423

*Приметы и поверья........................................................................................427*

**ПОСЛОВИЦЫ И ПОГОВОРКИ.......................................................................................433**

Караньковa Т.У. Паремиологические сокровища Житковичского района ............433

Панкова Н.М. Художественные особености пословиц и поговорок Житковичкого района .................................................................................................................435

*Пословицы и поговорки...................................................................................438*

*Загадки .........................................................................................................443*

*Притчи .........................................................................................................447*

**ЛЕГЕНДЫ И ПРЕДАНИЯ ...............................................................................................448**

Гаврилови В.М. Легенды и предания родной земли ................................................448

**ДЕТСКИЙ ФОЛЬКЛОР .................................................................................................465**

Сказки ..................................................................................................................465

Дразнилки ............................................................................................................467

Заклички ..............................................................................................................467

Детские потешки...................................................................................................467

Колыбельные ....................................................................................................468
Игры ................................................................................................................469

**НАРОДНАЯ МИФОЛОГИЯ ЖИТКОВЩИНЫ .............................................................470**

Кострица А.А. Новак В.С. Мифологические представления жителей
Житковичского района .......................................................................................470
Поборцева К. В. Народная демонология полешуков .......................................473
*Народная мифология*.........................................................................................*477*

**ВНЕОБРЯДОВАЯ ПОЭЗИЯ ..................................................................................518**

***КРУЧЕНКО Т.В.* ПИСАТЕЛЬ, ЗАЧАРОВАННЫЙ ПОЛЕСЬЕМ..................................579**

***МЕЛЬНИКОВА Л.Г.* ХРАНИТЕЛЬ НАРОДНОГО НАСЛЕДИЯ ...................................582**

***КОТОВ М.К.* СЦЕНАРИЙ ВЕСЕННЕГО ОБРЯДА “ЮР’Е” (ЗАПИСАНО СО СЛОВ МЕСТНЫХ ЖИТЕЛЕЙ ДЕРЕВЕНЬ ЛЮБАВИЧИ И ПОГОСТ)..................................584**

***ГАВРИЛОВИЧ В. М.* ОЧЕРКИ ..............................................................................587**

**МАТЕРИАЛЫ ПО ФОЛЬКЛОРНОМУ НАСЛЕДИЮ ЖИТКОВИЧСКОГО РАЙОНА ИЗ АРХИВОВ УЧРЕЖДЕНИЯ «ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР НАРОДНОГО ТВОРЧЕСТВА», ЖИТКОВИЧСКОГО РАЙОННОГО ЦЕНТРА ФОЛЬКЛОРА.......................................................................................................601**

Глушец I.В., Мельникова Л.Г. Исследовать и сохранить.............................601
*Старинные народные праздники и обряды, мифологические представления жителей деревни Озераны*...........................................................................*605*
*Старинные народные праздники и обряды, мифологические представления жителей деревни Переров* ...........................................................................*613*
*Старинные народные праздники и обряды, мифлогические представления жителей деревни Перековский Млынок* ...................................................*622*
*Старинные народные праздники и обряды, мифологические представления жителей деревни Хвоенск*...........................................................................*629*
*Старинные народные праздники и обряды, мифологические представления жителей деревни Хлупин*.............................................................................*633*

**ОБРЯДОВЫЕ ПЕСНИ ............................................................................................639**

**ВНЕОБРЯДОВЫЕ ПЕСНИ.......................................................................................646**

**КОЛЫБЕЛЬНЫЕ.....................................................................................................656**

***САСКЕВИЧ Н.А.* ОБЯДОВЫЕ ОБЫЧАИ (на туровском говоре)..............................656**

***БОГОМОЛЬНИКОВА Н.А.* ТОПОНИМИЧЕСКОЕ БОГАТСТВО ЖИТКОВИЧСКОГО КРАЯ .........................................................................................662**

***ВОИНОВА А. М., ПОЛУЯН А. М.* ЛЕКСИКА СВАДЕБНОГО ОБРЯДА В ГОВОРАХ ЖИТКОВИЧСКОГО РАЙОНА.............................................................................672**

***БОБРИК У.А.* ФАМИЛИИ ЖИТКОВИЧСКОГО РАЙОНА .......................................680**

**ПОСЛЕСЛОВИЕ.....................................................................................................703**

## Змест

**ГАЙКЕВІЧ Д.С. НАША БАГАЦЦЕ – ЛЮДЗІ… ....... 7**

**ДЗЕМІДЗЕНКА А.М. ЛЕГЕНДАМІ АВЕЯНЫ КРАЙ ....... 9**

**СОЛАПАВА А.В., ГОЛАД К.М., КАЗАПАЛЯНСКАЯ А.В. МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРАЕКТ “ВЕРА І ВЕРНАСЦЬ” ....... 11**

**КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫ ФАЛЬКЛОР ....... 14**

Новак В.С. Лакальныя асаблівасці каляндарна-абрадавага фальклору Жыткавіцкага раёна ....... 14

*ЗІМОВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ ....... 31*

*ВЕСНАВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ ....... 99*

*ЛЕТНІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ ....... 160*

*ВОСЕНЬСКІЯ СВЯТЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ ....... 186*

**СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ ....... 205**

Новак В.С. Традыцыі сямейнай абраднасці Жыткавіцкага раёна ....... 205

*Радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні ....... 216*

*Вяселле ....... 227*

*Пахавальная абраднасць і галашэнні ....... 365*

**ЗАМОВЫ ....... 374**

Вяргеенка С.А. “Зберажы, Божа, ніву трудавую…” (Спецыфіка рэалізацыі сельскагаспадарчых практык на Жыткаўшчыне) ....... 374

*Замовы ....... 380*

**ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР’І ....... 423**

Кастрыца А.А. Прыкметы і павер’і Жыткаўшчыны ....... 423

*Прыкметы і павер’і ....... 427*

**ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ ....... 433**

Караనькова Т.У. Парэміялагічныя скарбы Жыткавіцкага раёна ....... 433

Панкова Н.М. Мастацкія асаблівасці прыказак і прымавак Жыткавіцкага раёна ....... 435

*Прыказкі і прымаўкі ....... 438*

*Загадкі ....... 443*

*Выслоўі ....... 447*

**ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ....... 448**

Гаўрыловіч У.М. Легенды і паданні роднай зямлі ....... 448

**ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР ....... 465**

Казкі ....... 465

Дражнілкі ....... 467

Заклічкі ....... 467

Дзіцячыя забаўкі ....... 467

Калыханкі........468
Гульні........469

**НАРОДНАЯ МІФАЛОГІЯ ЖЫТКАЎШЧЫНЫ........470**

Кастрыца А.А. Новак В.С. Міфалагічныя ўяўленні жыхароў Жыткавіцкага раёна ........470

Паборцава К. В. Народная дэманалогія палешукоў........473

*Народная міфалогія........477*

**ПАЗААБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ........518**

***КРУЧЭНКА Т.В.* ПІСЬМЕННІК, ЗАЧАРАВАНЫ ПАЛЕССЕМ........579**

***МЕЛЬНІКАВА Л.Г.* ЗАХАВАЛЬНІК НАРОДНАЙ СПАДЧЫНЫ........582**

***КОТАЎ М.К.* СЦЭНАРЫЙ ВЕСНАВОГА АБРАДУ “ЮР’Е” (ПАВОДЛЕ ЗАПІСАЎ АД МЯСЦОВЫХ ЖЫХАРОЎ ВЁСАК ЛЮБАВІЧЫ І ПАГОСТ)........584**

***ГАЎРЫЛОВІЧ У. М.* НАРЫСЫ........587**

**МАТЭРЫЯЛЫ ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ СПАДЧЫНЕ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА З АРХІВАЎ УСТАНОВЫ “ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ”, ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁННАГА ЦЭНТРА ФАЛЬКЛОРУ........601**

Глушэц І.В., Мельнікава Л.Г. Даследавяць і захаваць........601

*Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Азяраны........605*

*Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Перароў........613*

*Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Перароўскі Млынок........622*

*Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Хваенск........629*

*Старадаўнія народныя святы і абрады, міфалагічныя ўяўленні жыхароў вёскі Хлупін........633*

**АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ........639**

**ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ........646**

**КАЛЫХАНКІ........656**

***САСКЕВІЧ М.А.* АБРАДАВЫЯ ЗВЫЧАІ........656**

***БАГАМОЛЬНІКАВА Н.А.* ТАПАНІМІЧНАЕ БАГАЦЦЕ ЖЫТКАВІЦКАГА КРАЮ........662**

***ВОІНАВА А. М., ПАЛУЯН А. М.* ЛЕКСІКА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ Ў ГАВОРКАХ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА........672**

***БОБРЫК У.А.* ПРОЗВІШЧЫ ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНА АДАПЕЛЯТЫЎНАГА ПАХОДЖАННЯ........680**

**ПАСЛЯСЛОЎЕ........703**

Научное издание

# История диаспор и миграций.
# Бюллетень Лаборатории истории диаспор исторического факультета МГУ имени М.В. Ломоносова
# №4(7) август 2017 года

*Труды исторического факультета МГУ, вып. 94*
*Серия II Исторические исследования, 49*

Подписано в печать 07.09.2017
Формат 60×90 $^{1}/_{16}$. Гарнитура QuantAntiqua.
Печать РИЗО. Уч.-изд. л. 19,5. Тираж 300 экз.

Ордена «Знак Почета»
Издательство Московского университета
12009, Москва, ул. Б. Никитская, 5/7

Отпечатано в отделе оперативной печати
исторического факультета МГУ
119991, Москва, Ломоносовский проспект, д. 27, корп. 4,
МГУ имени М. В. Ломоносова